# РУСКАЕ САВЕЦКАЕ АПАВЯДАННЕ



том 2

# РУСКАЕ САВЕЦКАЕ АПАВЯДАННЕ

У ДВУХ ТАМАХ

## ТОМ 2

*З рускай мовы*

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ
ЛІТАРАТУРА»
1988

ББК 84 Р7-44
Р 88

Рэдкалегія:

СЕРАФІМ АНДРАЮК
ЯНКА БРЫЛЬ
ВАСІЛЬ БЫКАЎ
ВІКТАР КАВАЛЕНКА
ІВАН НАВУМЕНКА
ІВАН ПТАШНІКАЎ
БАРЫС САЧАНКА (укладальнік)
ЯН СКРЫГАН
ІВАН ШАМЯКІН

Во второй том вошли рассказы М. Шолохова, А. Твардовского, С. Антонова, Ю. Нагибина, В. Белова, В. Шукшина, В. Астафьева, В. Распутина и др. Напряженный пульс времени, пристальное внимание к человеку и его месту в жизни, моральный облик советского народа — всегдашняя тема, которую разрабатывают русские советские прозаики.

$$\text{Р}\ \frac{4702010200-029}{\text{М}\ 302(03)-88}\ 145-87$$

ISBN 5-340-00363-9 (т. 2)
ISBN 5-340-00361-2

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1988.

## Міхаіл Шолахаў

# ЛЁС ЧАЛАВЕКА

*Яўгеніі Рыгораўне Лявіцкай,*
*члену КПСС з 1903 года*

Першая пасляваенная вясна была на Верхнім Доне па рэдкасць дружная і напорыстая. У канцы сакавіка з Прыазоўя падзьмулі цёплыя вятры, і праз двое сутак ужо скрозь агаліліся пяскі левабярэжжа Дона, у стэпе набраклі забітыя снегам лагчыны і яры, узламаўшы лёд, шалёна загулялі стэпавыя рэчкі, і дарогі зрабіліся амаль што непраезныя.

У гэты прыкры час самай бездаражы мне давялося ехаць у станіцу Буканаўскую. І адлегласць невялікая — усяго нешта каля шасцідзесяці кіламетраў,— ды адолець іх аказалася не так проста. Мы з таварышам выехалі да ўсходу сонца. Пара сытых коней, у струну нацягваючы пастронкі, ледзь валакла цяжкую брычку. Колы па самыя калодкі правальваліся ў мокры, перамешаны са снегам і лёдам пясок, і праз гадзіну на баках і сцёгнах коней, пад тонкімі рамянямі набадраў, паказалася белая мыльная пена, а ў ранішнім свежым паветры востра і п'янліва запахла конскім потам і нагрэтым дзёгцем ад шчодра намазанай конскай збруі.

Там, дзе было вельмі цяжка коням, мы злазілі з брычкі, ішлі пехатой. Пад ботамі хлюпаў размяклы снег, ісці было цяжка, але па абочынах дарогі ўсё яшчэ трымаўся, крышталем паблісквагочы на сонцы, тонкі лядок, і там прабірацца было яшчэ цяжэй. Толькі гадзін праз шэсць мы адужалі адлегласць у трыццаць кіламетраў, пад'ехалі да пераправы цераз рэчку Ялапку.

Невялікая рачулка, якая сям-там перасыхала ўлетку, насупраць хутара Мохаўскага ў забалочанай, зарослай алешнікам пойме разлілася на цэлы кіламетр. Перапраўляцца трэба было на хісткай пласкадонцы, якая магла ўзяць не больш за трох чалавек. Мы адпусцілі коней. На тым баку ў калгаснай пуні нас чакаў старэнькі, накінуты там яшчэ зімой «віліс», які шмат чаго перабачыў на сваім вяку. Удвух з шафёрам мы асцерагаючыся селі ў трухля-

вую лодку. Таварыш з рэчамі застаўся на беразе. Толькі адштурхнуліся, як з гнілога днішча ў розных месцах фанатанчыкамі заструменіла вада. Падручнымі сродкамі канапацілі ненадзейную пасудзіну і вычэрпвалі з яе ваду, пакуль не даехалі. Праз гадзіну мы былі на тым баку Ялапкі. Шафёр прыгнаў з хутара машыну, падышоў да лодкі і сказаў, беручыся за весла:

— Калі гэтае праклятае карыта не разваліцца на вадзе — гадзіны праз дзве прыедзем, раней не чакайце.

Хутар раскінуўся далёка ўбаку, і каля прычала стаяла такая ціша, якая бывае ў бязлюдных мясцінах толькі ў глухую восень і напрадвесні. Ад вады патыхала вільгаццю, даўкай гаркотай гнілога алешніку, а з далёкіх прыхапёрскіх стэпаў, зацягнутых бэзавай смугой туману, лёгкі ветрык прыносіў адвечна малады, ледзь улоўны пах зямлі, што нядаўна вызвалілася ад снегу.

Непадалёку, на прыбярэжным пяску, ляжаў паваленм пляцень. Я сеў на яго, хацеў закурыць, але, сунуўшы руку ў правую кішэню ватоўкі, з вялікім жалем выявіў, што пачак «Беламору» быў зусім размоклы. У час пераправы хваля плюхнула цераз нізкі борт лодкі, па пояс абдала мяне каламутнай вадой. Тады мне пра папяросы не было калі думаць, кінуўшы весла, давялося хутчэй вычэрпваць ваду, каб лодка не патанула, а цяпер, горка паракаючы на свой недагляд, я беражліва выцягнуў з кішэні раскіслы пачак, прысеў на кукішкі і пачаў па адной раскладваць на плятні мокрыя парыжэлыя папяросы.

Быў поўдзень. Сонца грэла, як у маі. Я спадзяваўся, што папяросы хутка высахнуць. Сонца гэтак прыпякала, што я пашкадаваў ужо аб тым, што надзеў у дарогу салдацкія ватовыя штаны і ватоўку. Гэта быў першы пасля зімы па-сапраўднаму цёплы дзень. Добра было сядзець на плятні вось так, аднаму, цалкам скарыўшыся цішы і адзіноце, і, зняўшы з галавы старую салдацкую вушанку, сушыць на ветрыку мокрыя пасля цяжкага весладання валасы, бяздумна сачыць за белымі, купчастымі воблакамі, што праплывалі ў бляклай сіні.

Неўзабаве я ўбачыў, як з-за крайніх двароў хутара выйшаў на дарогу мужчына. Ён вёў за руку маленькага хлопчыка, якому было, мяркуючы па росце, гадоў пяцьшэсць, не болей. Яны стомлена брылі ў кірунку да пераправы, але, параўняўшыся з машынай, накіраваліся да мяне. Высокі, сутулаваты мужчына, падышоўшы да мяне блізка, сказаў прыглушаным баском:

— Здароў, браток!

— Добры дзень.— Я паціснуў пададзеную мне вялікую чэрствую руку.

Мужчына схіліўся да хлопчыка, сказаў:

— Павітайся з дзядзькам, сынок. Ён, відаць, гэтакі самы шафёр, як і твой татка. Толькі мы з табой на грузавіку ездзілі, а ён во гэтую маленькую машыну ганяе.

Гледзячы мне проста ў твар светлымі, як небачка, вачыма, ледзь-ледзь усміхаючыся, хлопчык падаў мне ружовае, халоднае ручаня. Я лёгенька патрос гэтае ручаня, запытаўся:

— Што ж гэта ў цябе, стары, рука гэтакая халодная? На дварэ вунь якая цеплыня, а ты мерзнеш?

З дзіцячай даверлівасцю малы прытуліўся да маіх каленяў, здзіўлена прыўзняў бялявыя броўкі:

— Які ж я стары, дзядзька? Я ж хлопчык, і я ж не мерзну, а рукі халодныя — бо снежкі ляпіў.

Бацька зняў са спіны абвіслы рэчавы мяшок, стомлена сеў поруч са мной і сказаў:

— Бяда мне з гэтым пасажырам! Праз яго і я падбіўся. Шырока ступіш — ён ужо на подбег пераходзіць, вось і май ласку да такога пехацінца прыстасоўвацца. Там, дзе мне трэба раз ступіць,— я тры ступаю, гэтак і ідзём з ім не ў лад, як конь з чарапахай. А тут за ім яшчэ якое пільнае вока патрэбна. Абы адвярнуўся, дык ён па лужыне ўжо тупае або ільдзінку адломіць і смокча замест цукеркі. Не, не мужчынская гэта справа з такімі пасажырамі падарожнічаць, ды яшчэ паходным парадкам.— Ён памаўчаў крыху, пасля запытаўся: — А ты што ж, браток, свайго начальства чакаеш?

Мне было няёмка расчароўваць яго, што я не шафёр, і я адказаў:

— Даводзіцца чакаць.

— З таго боку пад'едуць?

— Але.

— Не ведаеш, ці хутка падыдзе лодка?

— Гадзіны праз дзве.

— Нішто сабе. Ну, што ж, пакуль адпачнём, спяшацца мне няма куды. А я іду міма, бачу: свой брат шафёр загарае. Дай, думаю, зайду, перакурым разам. Аднаму ж і курыць і паміраць моташна. А ты багата жывеш, папяросы курыш. Падмачыў іх, значыцца? Ну, браце, тытунь сыры, што конь стары, нікуды не варты. Давай лепей майго моцнага закурым.

Ён дастаў з кішэні летніх штаноў зеляпковага колеру скручаны ў трубку маліпавы шаўковы абшарпаны кісет, разгарнуў яго, і я паспеў прачытаць вышыты ў куточку надпіс: «Дарагому байцу ад вучаніцы 6-га класа Лебядзянскай сярэдняй школы».

Мы закурылі вельмі моцнага самасаду і доўга маўчалі. Я хацеў быў запытацца, куды ён ідзе з хлопчыкам, якая патрэба гоніць яго ў такое разводдзе, але ён апярэдзіў мяне пытаннем:

— Ты што ж, усю вайну за баранкай?

— Амаль усю.

— На фронце?

— Але.

— Ну, і мне там давялося, браце, паспытаць гора па ноздры і вышэй.

Ён паклаў на калені вялікія цёмныя рукі, згорбіўся. Я збоку зірнуў на яго, і мне стала нешта не па сабе... Ці бачылі вы калі-небудзь вочы, быццам прысыпаныя попелам, поўныя такой непазбыўнай смяротнай тугі, што ў іх цяжка глядзець? Вось такія вочы былі ў майго выпадковага субяседніка.

Выламаўшы з плятня сухую пакрыўленую галінку, ён з хвіліну моўчкі вадзіў ёю па пяску, маляваў нейкія мудрагелістыя фігуры, а пасля загаварыў:

— Іншы раз не спіш уначы, глядзіш у цёмнае пустымі вачыма і думаеш: «Завошта ж, жыццё, ты з мяне так надзекавалася? Завошта гэтак знявечыла?» Няма мне адказу ні ў цямноце, ні пры ясным сонейку... Няма і не дачакаюся! — І раптам спахапіўся: ласкава падштурхоўваючы сынка, сказаў: — Ідзі, любы, пагуляй каля вады, каля вялікай вады хлапчукам заўсёды якая-небудзь забава знойдзецца. Толькі, глядзі, ногі не прамачы!

Яшчэ як мы моўчкі курылі, я, крадком разглядаючы бацьку і сынка, са здзіўленнем адзначыў сам сабе адну дзіўную, на маю думку, акалічнасць. Хлопчык быў апрануты проста, але дбайна: і ў тым, як сядзеў на ім падбіты лёгкай, пошанай цыгейкай пінжачок з доўгім крыссем, і ў тым, што маленькія боцікі былі пашыты з разлікам надзяваць іх на ваўняную шкарпэтку, і вельмі гладкае шво на разадраным каліссі рукаве ў пінжачку,— усё сведчыла пра жаночы клопат, умелыя матчыны рукі. А бацька выглядаў інакш: прапаленая ў некалькіх месцах ватоўка была неахайна і груба зацыравана, лапік на вынашаных, зеляпковага колеру штанах не прышыты як след, а хут-

чэй прыкіданы шырокімі мужчынскімі шыўкамі; на ім былі амаль новыя салдацкія чаравікі, але тоўстыя ваўняныя шкарпэткі папраядала моль, і да іх не дакраналася жаночая рука... Яшчэ тады я падумаў: «Або ўдавец, або кепска жыве з жонкай».

Але вось ён, правёўшы вачыма сынка, глуха пакашляў, зноў загаварыў, і я пачаў уважліва слухаць.

— Спачатку жыццё маё было звычайнае. Сам я з Варонежскай губерні, тысяча дзевяцьсотага года нараджэння. У грамадзянскую вайну быў у Чырвонай Арміі, у дывізіі Кіквідзе. У галодны дваццаць другі год падаўся на Кубань, гнуць спіну на кулакоў, таму і ўцалеў. А бацька з маці і сястрычкай дома памерлі з голаду. Застаўся адзін. Сваякоў — як ветрам размяло,— нідзе нікога, аніводнай душы. Ну, праз год вярнуўся з Кубані, хаціну прадаў, паехаў у Варонеж. Спачатку працаваў у цяслярскай арцелі, потым пайшоў на завод, вывучыўся на слесара. Неўзабаве ажаніўся. Жонка ў дзіцячым доме выхоўвалася. Сіротка. Добрая мне натрапілася дзяўчына! Спакойная, вясёлая, дагадзіць умела і разумная, не мне раўня. Яна з маленства зазнала, пачым фунт ліха, можа, гэта і пазначылася на яе характары. Збоку глянуўшы — не такая ўжо яна была прыкметная, але ж я не збоку на яе глядзеў, а ў твар. І не было для мяне прыгажэйшай і больш жаданай за яе, не было на свеце і не будзе!

Прыйдзеш з работы стомлены, а іншы раз і злосны, як чорт. Не, на грубае слова яна табе не нагрубіяніць у адказ. Ласкавая, ціхая, не ведае, дзе цябе пасадзіць, стараецца, каб і з малым дастаткам салодкі кавалак табе згатаваць. Глядзіш на яе — і адпускаецца сэрца, а пасля абнімеш яе, скажаш: «Даруй, любая Ірынка, нахаміў я табе. Разумееш, з працай у мяне сёння не ладзілася». І зноў у нас мір, і ў мяне спакой на душы. А ты ведаеш, браток, што гэта значыць для работы? Раніцай я ўстаю як утрапёны, іду на завод, і любая работа ў мяне ў руках кіпіць, як сама робіцца! Вось што гэта значыць — мець разумную жонку-сяброўку.

Даводзілася калі-небудзь пасля палучкі і выпіваць з таварышамі. Калі-небудзь бывала і так, што ідзеш дадому і такія выкрунтасы нагамі выробляеш, што збоку, пябось, і глядзець страшна. Цесная табе вуліца, ды і гэдзе, не кажучы ўжо пра завулкі. Хлопец я быў тады здаровы і дужы, як д'ябал, выпіць мог шмат, а дахаты заўсёды дабіраўся на сваіх нагах. Але здаралася іншы раз і так, што

апошні перагон ішоў на першай хуткасці, гэта значыць па карачках, аднак жа дабіраўся. І зноў жа — ні табе папроку, ні крыку, ні скандалу. Толькі пасмейваецца мая Ірынка, ды і то асцярожна, каб сп'яна не пакрыўдзіўся. Разуе мяне ды шэпча: «Лажыся да сцяны, Андрэйка, а то сонны зваліцца з ложка». Ну, я, як мех з аўсом, павалюся, і ўсё паплыве перад вачыма. Толькі чую праз сон, што яна па галаве мяне ціхенька гладзіць рукой і шэпча нешта ласкавае, шкадуе, значыць...

Раніцай яна мяне гадзіны за дзве да таго, як ісці на працу, падыме, каб я размяўся. Ведае, што я на пахмеллі нічога есці не буду, ну, дастане агурок салёны або яшчэ што-небудзь лёгкае, налье гранёную шкляначку гарэлкі. «Апахмяліся, Андрэйка, толькі больш не трэба, мой любы». Дык хіба ж можна не апраўдаць такога даверу? Вып'ю, падзякую ёй без слоў, адтымі вачыма, пацалую і пайшоў на працу, як міленькі. А каб сказала яна мне, калі я п'яны, слова насуперак, крыкнула ці насварылася, дык я, далібог, і на другі дзень напіўся б. Так і бывае ў тых сем'ях, дзе жонка дурная; нагледзеўся я на такіх хлюндраў, ведаю.

Неўзабаве дзеці ў нас пайшлі. Спачатку сынок нарадзіўся, праз колькі год яшчэ дзве дзяўчынкі... Тут я ад таварышаў адкалоўся. Усю палучку дадому нясу, сям'я стала даволі вялікая, не да выпіўкі. У выхадны куфель піва вып'ю і на гэтым стаўлю кропку.

У дваццаць дзевятым годзе захапіўся я машынамі. Вывучыў аўтасправу, сеў за баранку на грузавік. Пасля ўцягнуўся і не захацеў вяртацца на завод. За рулём нібыта весялей мне было. Так і пражыў дзесяць гадоў і не заўважыў, як яны прайшлі. Як у сне прайшлі. Ды што дзесяць год! Папытай у любога чалавека ў гадах, ці заўважыў ён, як жыццё пражыў? Нічога ён не заўважыў! Мінулае — вунь як той далёкі стэп у смузе. Раніцай я ішоў па ім, усё было ясна навокал, а прайшоў дваццаць кіламетраў, і вунь зацягнула ўжо стэп смуга, адсюль і не разбярэш — лес там ці быльнік, ралля ці сенажаць...

Працаваў я гэтыя дзесяць год і дзень і ноч. Зарабляў добра, і жылі мы не горш за людзей. І дзеці радавалі: усе трое вучыліся на выдатна, а большы, Анатоль, такі здольны быў да матэматыкі, што пра яго нават у цэнтральнай газеце пісалі. Адкуль у яго ўзяўся такі вялізны талент да гэтай навукі, я і сам, братка, не ведаю. Толькі вельмі да душы мне гэта было, і ганарыўся я ім, яшчэ як ганарыўся!

За дзесяць год сабралі мы крыху грошай і перад вайной паставілі сабе хату на два пакоі, з каморай і калідорчыкам. Ірына купіла дзве казы. Што яшчэ больш трэба? Дзеці кашу ядуць з малаком, дах над галавой ёсць, апранутыя, абутыя, значыць — усё ў парадку. Толькі пабудаваўся я няўдала. Адмералі мне пляц па шэсць сотак непадалёк ад авіязавода. Каб была мая халупа ў іншым месцы, можа, і жыццё павярнулася б іначай...

А тут вось яна — вайна. На другі дзень павестка з ваенкамата, а на трэці — калі ласка ў эшалон. Праводзілі мяне ўсе мае ўчацвярых: Ірына, Анатоль і дочкі — Настулька і Волечка. Усе дзеці трымаліся як след, малайчыны былі. Ну, у дачок, не без таго, паблісквалі слязінкі. Анатоль толькі плячыма пацепваў, нібы ад холаду, яму на той час ужо семнаццаты год ішоў, а Ірына мая... Такой я за ўсе семнаццаць гадоў нашага сямейнага жыцця яе ні разу не бачыў. Уночы ў мяне па плячы і на грудзях кашуля ад яе слёз не высыхала, а раніцай тая самая гісторыя... Прыйшлі на вакзал, а я ад жалю глядзець на яе не магу: вусны ад слёз распухлі, валасы з-пад хусткі выбіліся, і вочы мутныя, няўцямныя, як у чалавека, што не ў сваім розуме. Камандзіры абвяшчаюць пасадку, а яна прыпала да маіх грудзей, рукі на маёй шыі сашчапіла, і ўся трымціць, як падсечанае дрэва... І дзеці яе ўгаворваюць, і я — нічога не памагае! Усе жанкі з мужамі, з сынамі размаўляюць, а мая прытулілася да мяне, як ліст да галінкі, і толькі ўся калоціцца, а слова вымавіць не можа. Я і кажу ёй: «Вазьмі ж сябе ў рукі, любая мая Ірынка! Скажы мне хоць слова на развітанне». Яна і гаворыць і за кожным словам усхліпвае: «Родненькі мой... Андрэйка... не пабачымся... мы з табой... болей... на гэтым... свеце...»

У мяне самога ад жалю сэрца на кавалкі разрываецца, а тут яна яшчэ з такімі словамі. Павінна была б разумець, што мне таксама нялёгка з імі расставацца, не да цешчы на бліны сабраўся. Злосць мяне тут узяла! Сілком я разняў яе рукі і лёгенька штурхнуў у плечы. Штурхнуў быццам лёгенька, а сілы ў мяне было процьма; яна падалася назад, разы тры ступіла і зноў да мяне ідзе дробнымі крокамі, рукі выстаўляе, а я крычу ёй: «Ды хіба ж гэтак развітваюцца? Што ты мяне раней часу жывога хаваеш?!» Ну, зноў абняў яе, бачу, што яна як не ў сабе...

Ён на паўслове абарваў свой расказ, і ў пачаканай цішыні я пачуў, як у яго ў горле нешта клякоча і булькае. Чужое хваляванне перадалося і мне. Скоса зірнуў я на

расказчыка, але ніводнай слязінкі не ўбачыў у яго быццам мёртвых, пагаслых вачах. Ён сядзеў, папура схіліўшы галаву, толькі вялікія, бязвольна апушчаныя рукі дробна дрыжалі, дрыжаў падбародак, дрыжалі цвёрдыя вусны...

— Не трэба, дружа, не ўспамінай! — ціха сказаў я, але ён, мабыць, не чуў маіх слоў і, нейкім велізарным намаганнем волі перасіліўшы хваляванне, раптам сказаў хрыпатым, дзіўна змененым голасам:

— Да самай смерці, да апошняй маёй гадзіны, паміраць буду, а не дарую сабе, што тады яе адштурхнуў!

Ён зноў надоўга змоўк. Спрабаваў скруціць цыгарку, але газетная папера распаўзалася, тытунь сыпаўся на калені. Урэшце ён усё ж такі сяк-так зрабіў самакрутку, некалькі разоў прагна зацягнуўся і, пакашліваючы, казаў далей:

— Адарваўся я ад Ірыны, узяў яе твар у далоні, цалую, а ў яе вусны — як лёд... З дзеткамі развітаўся, бягу да вагона, ужо на хаду ўскочыў на падножку. Цягнік крануўся з месца ціха-ціха; праязджаць мне — паўз сваіх. Гляджу, дзеткі мае асірацелыя ў купку збіліся, рукамі мне махаюць, хочуць усміхацца, а не выходзіць. А Ірына прыціснула рукі да грудзей; вусны белыя, што крэйда, нешта яна імі шэпча, глядзіць на мяне не міргне, а сама ўся наперад хіліцца, нібы хоча ступіць проці моцнага ветру... Такая яна і ў памяці на ўсё жыццё засталася: рукі прыціснуты да грудзей, збялелыя вусны і шырока адплюшчаныя вочы, поўныя слёз. Больш за ўсё такая яна і ў снах мне сніцца... Навошта я тады яе адштурхнуў? Сэрца дасюль, як прыгадаю, нібы тупым нажом рэжуць...

Фарміравалі нас пад Белай Царквой, на Украіне. Далі мне «ЗІС-5». На ім і паехаў на фронт. Ну, пра вайну табе няма чаго расказваць, сам бачыў і ведаеш, як яно было спачатку. Ад сваіх пісьмы атрымліваў часта, а сам крылаткі рэдка пасылаў. Бывала, напішаш, што, маўляў, усё ў парадку, памаленьку ваюем, і хоць цяпер адступаем, але хутка збяромся з сілаю і тады дамо фрыцам прыкурыць. А што яшчэ можна было пісаць? Моташны быў час, не да пісаніны было. Ды, прызнацца, і сам я не ахвочы быў на жаласных струнах іграць і цярпець не мог гэтакіх сліпявых, якія кожны дзень, дарэчы і недарэчы, жонкам і каханкам пісалі, соплі па паперы размазвалі. Цяжка, бач, яму, цяжка, глядзі, што і заб'юць. І вось ён, сука ў штанах, скардзіцца, спагады шукае, сліпявіцца, а таго не хоча

ўразумець, што гэтым разнянічасным кабетам і дзецям, таксама як і нам, не соладка даводзілася ў тыле. Уся дзяржава на іх абаперлася! Якія ж гэта плечы нашым жанкам і дзецям трэба мець было, каб пад такім цяжарам не сагнуцца? А вось жа не сагнуліся, выстаялі! А такі хлюст, мокрая душонка, напіша жаласнае пісьмо — і працавітую жанчыну як касой падкосіць. Яна пасля гэтага пісьма, гаротніца, і рукі апусціць, і работа ёй не ў работу. Не! На тое ты і мужчына, на тое ты і салдат, каб усё стрываць, усё вынерпець, калі патрэба змушае. А калі ў табе бабскай закваскі болей, чым мужчынскай, дык надзявай спадніцу ў зборкі, каб свої худы зад фалдамі прыхаваць пышней, каб хоць ззаду на бабу быў падобны, ды ідзі буракі палоць ці каровы даіць, а на фронце ты такі не патрэбен, там і без цябе смуроду шмат!

Толькі не давялося мне і году паваяваць... Два разы за гэты час быў паранены, але абодва разы лёгка: адзін раз — у мякаць рукі, другі — у нагу; першы раз — куляй з самалёта, другі — асколкам снарада. Дзіравіў немец мне машыну і зверху і з бакоў, але мне, браце, шанцавала ў першым часе. Шанцавала-шанцавала, ды і давяло да ручкі... Трапіў я ў палон пад Лазаванькамі ў маі сорак другога года праз такі няскрутны выпадак: немец тады здорава наступаў, і засталася адна наша стодваццацідвухміліметровая гаўбічная батарэя амаль без снарадаў; пагрузілі маю машыну снарадамі па самую завязку, і сам я на пагрузцы працаваў так, што гімнасцёрка да лапатак прыкіпала. Трэба было вельмі спяшацца, таму што бой набліжаўся да нас: злева нечыя танкі грымяць, справа страляніна ідзе, наперадзе страляніна і, як кажуць, пачало пахнуць смажаным...

Камандзір нашай аўтароты пытаецца: «Праскочыш, Сакалоў?» А тут і пытацца не было чаго: там таварышы мае, можа, гінуць, а я тут чухацца буду? «Ды якая гаворка! — адказваю яму.— Я павінен праскочыць, і баста!» — «Ну, кажа,— смалі! Цісні на ўсе застаўкі!»

Я і націснуў. Колькі жыву, гэтак не ездзіў, як той раз! Ведаў, што не бульбу вязу, што з гэтым грузам трэба асцярожна ехаць, але якая тут можа быць асцярога, калі там хлопцы з пустымі рукамі ваююць, калі дарога ўся наскрозь артагнём прастрэльваецца. Прамчаў кіламетраў шэсць, зараз мне ўжо на прасёлак заварочваць, каб прабрацца да лагчыны, дзе батарэя стаяла, а тут гляджу — маці родная! — пяхотка наша і справа і злева ад грэйдэ-

ра па чыстым полі чэша, і ўжо міны рвуцца ў іх парадках. Што мне рабіць? Не паварочваць жа назад? Цісну як мага хутчэй! І да батарэі застаўся які-небудзь кіламетр, павярнуў я ўжо на прасёлак, але дабрацца да сваіх, брацс, мне не давялося. Відаць, з дальнабойнай цяжкі паклаў ён мне каля машыны. Не чуў я ні выбуху, нічога, толькі ў галаве ўсё роўна як нешта трэснула, і больш нічога не памятаю. Як застаўся я жывы тады — не разумею, і колькі часу праляжаў метраў за восем ад кювета — не ўцямлю. Ачомаўся, а падняцца на ногі не магу: галава ў мяне торгаецца, усяго калоціць, як у ліхаманцы, у вачах цёмна, у левым плечуку нешта рыпіць і хрускае, і ўсё цела гэтак баліць, нібы мяне двое сутак узапар білі чым зарвуць. Доўга я па зямлі на жываце коўзаўся, але сяк-так устаў. Але ўсё ж ніяк не ўразумею, дзе я і што са мной здарылася. Памяць зусім адбіла. А зноў легчы баюся. Баюся, што лягу і больш не ўстану, памру. Стаю і хістаюся з аднаго боку ў другі, як таполя ў навальніцу.

Калі ачухаўся, прыйшоў да памяці і агледзеўся як след — сэрца як хто абцугамі сціснуў: вакол спарады валяюцца, што я вёз, непадалёк мая машына, ушчэнт разбітая, ляжыць коламі дагары, а бой — бой ужо ззаду ад мяне ідзе... Гэта як?

Няма чаго грэх таіць — вось тут ужо ў мяне ногі самі па сабе падкасіліся, і я паваліўся як зрэзаны, бо зразумеў, што я ўжо — у акружэнні, а па праўдзе сказаць — у палоне ў фашыстаў. Вось як яно на вайне бывае...

Ох, браток, нялёгкая гэта справа зразумець, што ты не па сваёй волі ў палоне. Хто гэтага на сваёй скуры не паспытаў, таму не адразу ў душу ўедзеш, каб да яго па-чалавечы дайшло, што значыць гэтая штука.

Ну вось, значыць, ляжу і чую: танкі грымяць. Чатыры нямецкія сярэднія танкі на поўным газе прайшлі паўз мяне туды, адкуль я са спарадамі выехаў... Ці лёгка гэта было перажываць? Пасля цягачы з гарматамі пасунуліся, палявая кухня праехала, потым пяхота пайшла, не густа, так, не болей за адну бітую роту. Пагляджу, пагляджу на іх краем вока і зноў прытулюся шчакой да зямлі, вочы заплюшчу: моташна мне на іх глядзець, і на сэрцы моташна...

Думаў, усе прайшлі, прыўзняў галаву, а іх шэсць аўтаматчыкаў — вось яны, тупаюць метраў за сто ад мяне. Гляджу — зварочваюць з дарогі і адразу да мяне. Ідуць

моўчкі. «Вось,— думаю,— і смерць мая на падыходзе». Я сеў — не хочацца лежачы паміраць, пасля ўстаў. Адзін з іх, не дайшоўшы колькі крокаў, плечуком таргануў, аўтамат зняў. І во як дзівосна чалавек прыдуманы: ніякай панікі, ні сардэчнай боязі ў гэтую хвіліну ў мяне не было. Толькі гляджу на яго і думаю: «Зараз дасць па мне кароткую чаргу, а куды будзе біць? У галаву ці ўпоперак грудзей?» Усё роўна як мне гэта не адзін чорт, якое месца ён у маім целе прастрочыць.

Малады хлопец, з сябе ладны такі, чарнявы, а вусны тонкія, ніточкай, і вочы прыжмурвае. «Гэты заб'е і не задумаецца»,— разважаю сам сабе. Так яно і ёсць: ускінуў ён аўтамат — я яму проста ў вочы гляджу, маўчу,— а другі, яфрэйтар, ці хто, старэйшы за яго гадамі, можна сказаць пажылы, нешта крыкнуў, адапхнуў яго ўбок, падышоў да мяне, гяргеча па-свойму і руку маю ў локці згінае, мускул, значыць, мацае. Абмацаў і кажа: «О-о-о!» — і паказвае на дарогу, на захад сонца. Тупай, маўляў, рабочая скацінка, працаваць на наш райх. Гаспадарлівы быў, сукін сын!

Але чарнявы прыгледзеўся да маіх ботаў, а яны ў мяне добрыя былі з выгляду, паказвае рукой: «Здымай». Сеў я на зямлю, зняў боты, падаю яму. Ён іх з рук у мяне проста-такі вырваў. Раскруціў я анучы, падаю яму, а сам гляджу на яго спадылба. Але ён закрычаў, пачаў лаяцца па-свойму і зноў за аўтамат хапаецца. Астатнія рагочуць. З тым па-мірнаму і адышлі. Толькі гэты чарнявы, пакуль дайшоў да дарогі, разы тры азірнуўся на мяне, вачыма бліскае, як ваўчаня, злуецца, а чаго? Усё роўна як я з яго боты зняў, а не ён з мяне.

Што ж, браток, дзецца мне не было куды. Выйшаў я на дарогу, вылаяўся страшэннымі кучаравымі варонежскімі мацюкамі і падаўся на захад, у палон!.. А хадок тады з мяне быў нікудышні, за гадзіну па кіламетру, не болей. Ты хочаш наперад ступіць, а цябе з аднаго боку ў другі кідае, водзіць па дарозе, як п'янага. Прайшоў крыху, і даганяе мяне калона нашых палонных, з той самай дывізіі, у якой я быў. Гоняць іх чалавек дзесяць нямецкіх аўтаматчыкаў. Тої, што наперадзе калоны ішоў, параўняўся са мною і, не кажучы благога слова, наводмаш хлабыснуў мне ручкай аўтамата па галаве. Калі б я зваліўся — ён прышыў бы мяне да зямлі чаргой, але нашы падхапілі мяне на ляту, уцягнулі ўсярэдзіну і з паўгадзіны вялі пад рукі. А калі я ачомаўся, адзін з іх шэпча: «Божа

цябе барані падаць! Ідзі з апошніх сіл, а то заб'юць». І я з апошніх сіл, але пайшоў.

Як толькі сонца села, немцы ўзмацнілі канвой, на грузавіку падкінулі яшчэ чалавек дваццаць аўтаматчыкаў, пагналі нас паскораным маршам. Цяжка параненыя папы не маглі паспяваць за астатнімі, і іх прыстрэльвалі на дарозе. Двое паспрабавалі ўцякаць, а таго не ўлічылі, што ў месячную ноч цябе ў чыстым полі чорт ведае дзе ўбачыш, ну, вядома, і гэтых пастралялі. У поўнач прыйшлі мы ў нейкае напалову спаленае сяло. Начаваць загналі нас у царкву з разбітым купалам. На каменнай падлозе — ні жменькі саломы, а ўсе мы без шынялёў, у адных гімнасцёрках і штанах, так што падаслаць ані нічога. На некаторых нават і гімнасцёрак не было, адны бязевыя споднія кашулі. У большасці гэта былі малодшыя камандзіры. Гімнасцёркі яны паздымалі, каб іх ад радавых нельга было адрозніць. І яшчэ артылерыйская прыслуга была без гімнасцёрак. Як працавалі каля гармат паўраздзетыя, так і ў палон трапілі.

Уночы паліў такі вялікі дождж, што ўсе мы прамоклі наскрозь. Тут купал знесла цяжкім снарадам ці бомбай з самалёта, а тут дах увесь пасечаны асколкамі, сухога месца нават у алтары не знойдзеш. Так усю ноч і праспоўдаліся мы ў гэтай царкве, як авечкі ў цёмным катуху. Сярод ночы чую, як нехта кратае мяне за руку, пытаецца: «Таварыш, ты не паранены?» Адказваю яму: «А табе што трэба, браток?» Ён і кажа: «Я — ваенны доктар, можа, магу табе чым-небудзь памагчы?» Я паскардзіўся яму, што ў мяне левае плячо хрускае, і распухае, і жахліва баліць. Ён цвёрда гэтак кажа: «Здымай гімнасцёрку і споднюю кашулю». Я зняў усё гэта з сябе, ён і пачаў руку ў плячы прамацваць сваімі тонкімі пальцамі, ды гэтак, што мне ўваччу цёмна стала. Скрыгаю зубамі і кажу яму: «Ты, відаць, ветэрынар, а не чалавечы доктар. Што ж ты на балючае месца гэтак ціснеш, бессардэчны ты чалавек?» А ён усё мацае і злосна так адказвае: «Твая справа — маўчаць! Таксама яшчэ гаворку тут разводзіш. Трымайся, зараз яшчэ больш забаліць». Ды пасля гэтага як тузане маю руку, ажно чырвоныя іскры ў мяне з вачэй пасыпаліся.

Ачуўся я і пытаюся: «Ты што ж робіш, фашыст няшчасны? У мяне рука ўся патрушчаная, а ты яе гэтак ірвануў!» Чую, ён засмяяўся ціхенька і кажа: «Думаў, што ты мяне стукнеш праваю, але ты, аказваецца, спакойны хлопец. А рука ў цябе не патрушчаная, а выбіта была,

вось я яе па месца і паставіў. Ну, як цяпер, лягчэй табе?» І сапраўды, чую па сабе, што боль адступаць пачаў. Падзякаваў я яму шчыра, і ён далей пайшоў, паціху пытаецца: «Параненыя ёсць?» Вось што значыць сапраўдны доктар! Ён і ў палоне, і ў цямноце сваю вялікую справу рабіў.

Неспакойная гэта была ноч. Да ветру не пускалі, пра гэта старшы з канвою папярэдзіў, яшчэ калі папарна ў царкву нас заганялі. І як на грэх аднаму багамольнаму з нашых прыспічыла па патрэбе выйсці. Цярпеў ён, цярпеў, а потым заплакаў: «Не магу,— кажа,— апаганіць святы храм! Я ж веруючы, я хрысціянін! Што мне рабіць, браткі?» А нашы, ведаеш, які народ? Адны рагочуць, другія лаюцца, трэція розныя жартоўныя парады яму даюць. Развесяліў ён усіх нас, а скончылася гэтая мітрэнга вельмі нават блага. Пачаў ён грукаць у дзверы і прасіць, каб яго выпусцілі. Ну, і дапрасіўся: даў фашыст скрозь дзверы, на ўсю іх шырыню, доўгую чаргу і багамольца гэтага забіў і яшчэ трох чалавек, а аднаго цяжка параніў, пад раніцу той скапаў.

Забітых склалі мы ў адно месца, паселі ўсе, прыціхлі і задумаліся: пачатак не вельмі вясёлы... А крыху счакаўшы, загаварылі паціху, зашапталіся: хто адкуль, з якой вобласці, як у палон трапіў; у змроку таварышы з аднаго ўзвода або знаёмыя з адной роты пагубляліся, пачалі адзін аднаго паціху гукаць. І чую я побач з сабой такую ціхую гаворку. Адзін кажа: «Калі заўтра перад тым як гнаць нас далей нас выстраяць і будуць выклікаць камісараў, камуністаў і яўрэяў, дык ты, узводны, не хавайся! З гэтае справы ў цябе нічога не выйдзе. Ты думаеш, калі гімнасцёрку скінуў, дык за радавога палічаць? Не выйдзе! Я за цябе адказваць не буду. Я першы пакажу на цябе! Я ж ведаю, што ты — камуніст, і мяне агітаваў уступіць у партыю, вось і адказвай за свае справы». Гэта гаворыць бліжэйшы да мяне, які побач са мной сядзіць з левага боку, а з другога боку ад яго чыйсьці малады голас адказвае: «Я заўсёды падазраваў, што ты, Крыжнеў, кепскі чалавек. Асабліва калі ты адмовіўся ўступаць у партыю, спасылаючыся на сваю непісьменнасць. Але ніколі я не думаў, што можаш зрабіцца здраднікам. Ты ж скончыў сямігодку?» Той ляніва гэтак адказвае свайму ўзводнаму: «Ну, скончыў, а што з гэтага?» Доўга яны маўчалі, потым, чую па голасе, узводны ціха гэтак кажа: «Не выдавай мяне, таварыш Крыжнеў». А той засмяяўся ціхенька. «Таварышы,— кажа,— засталіся за лініяй фронту, а я та-

бе не таварыш, і ты мяне не прасі, усё роўна выдам цябе. Свая сарочка да цела бліжэй».

Змоўклі яны, а мяне калоціць усяго ад такой падлюжнасці. «Не,— думаю,— не дам я табе, сукінаму сыну, выдаць свайго камандзіра! Ты ў мяне з гэтае царквы не выйдзеш, а выцягнуць цябе, як падлу, за ногі!» Толькі крыху развіднелася — бачу: побач са мной ляжыць на спіне мардаты хлопец, рукі за галаву заклаў, а каля яго сядзіць у адной кашулі, абняўшы калені, хударлявы такі, кірпаценькі хлопец, вельмі бледны ў твары. «Ну, думаю, не падолее гэты хлапчына такога дужага каня. Давядзецца мне яго канчаць».

Крануў я яго рукою, пытаюся пошапкам: «Ты — узводны?» Ён нічога не адказаў, толькі галавой кіўнуў. «Гэты хоча цябе выдаць?» — паказваю я на таго, што ляжаў. Ён зноў галавой кіўнуў. «Ну,— кажу,— трымай яму ногі, каб не брыкаўся. Ды хутчэй!» — а сам наваліўся на гэтага хлопца, і замерлі мае пальцы ў яго на горле. Ён і крыкнуць не паспеў. Патрымаў яго пад сабой хвілін колькі, прыпадняўся. Гатовы здраднік, і язык на баку!

Да таго мне стала нядобра пасля гэтага, ажно захацелася рукі памыць, быццам я не чалавека, а нейкага гада паўзучага душыў... Першы раз колькі жыву забіў, і то свайго... Ды які ж ён свой? Ён жа горшы за чужога, здраднік. Устаў і кажу ўзводнаму: «Хадзем адсюль, таварыш, царква вялікая».

Як і казаў гэты Крыжнеў, раніцай усіх нас выстраілі каля царквы, абкружылі аўтаматчыкамі, і тры эсэсаўскія афіцэры пачалі выбіраць шкодных ім людзей. Запыталіся, хто камуністы, камандзіры, камісары, але такіх не аказалася. Не аказалася і сваланты, якая магла б выдаць, бо і камуністаў сярод нас было траха не палавіна, і камандзіры былі і, зразумела, і камісары былі. Толькі чатырох і ўзялі з двухсот з лішкам чалавек. Аднаго яўрэя і трох рускіх радавых. Рускія трапілі ў бяду таму, што ўсе трое былі чарнявыя і з кучаравінкай у валасах. Падыходзяць да такога, пытаюцца: «Юдэ?» Ён кажа, што рускі, але яго і слухаць не хочуць. «Выходзь!» — і ўсё.

Расстралялі гэтых небарак, а нас пагналі далей. Узводны, з якім мы здрадніка прыдушылі, да самай Пазнані каля мяне трымаўся і ў першы дзень не-не ды і націсне мне на хаду руку. У Пазнані нас разлучылі па адной прычыне.

Бачыш, якая справа, браце, яшчэ з першага дня падумаўся я ўцячы да сваіх. Але ўцякаць хацеў так, каб быць пэўным, што ўдасца. Да самае Пазнані, дзе размясцілі нас у сапраўдным лагеры, ні разу не трапіўся мне зручны выпадак. А ў Пазнанскім лагеры падобны выпадак знайшоўся: у канцы мая паслалі нас у лясок каля лагера капаць магілы нашым памерлым ваеннапалонным, шмат тады нашага брата мерла ад дызентэрыі; капаю я пазнанскую гліну, а сам паглядаю навакол, і вось заўважыў, што два нашы вартаўнікі селі перакусіць, а трэці прыдрамаў на сонейку. Кінуў я рыдлёўку ды ціха пайшоў за куст... А пасля — бягом, трымаю проста на ўсход сонца...

Відаць, няхутка яны спахапіліся, мае ахоўнікі. А вось адкуль у мяне, такога схуднелага, сіла ўзялася, каб прайсці за суткі ледзь не сорак кіламетраў,— сам не ведаю. Толькі нічога ў мяне не выйшла з маіх спадзяванак: на чацвёртыя суткі, калі я быў далёка ўжо ад праклятага лагера, злавілі мяне. Сабакі вышукныя ішлі маім следам, яны мяне і знайшлі ў някошаным аўсе.

На досвітку пабаяўся я ісці чыстым полем, а да лесу было не менш як тры кіламетры, я і залёг у аўсе на днёўку. Насасмыкваў зярнят, пацёр іх у далонях, пажаваў крыху і ў кішэні насыпаў пра запас, і тут чую сабачы брэх, і матацыкл трашчыць... Абарвалася ў мяне сэрца, бо сабакі ўсё бліжэй галасы падаюць. Лёг я ніцма і засланіўся рукамі, каб яны мне хоць твар не абгрызлі. Ну, дабеглі і за адну хвіліну спусцілі з мяне ўсё маё рыззё. Застаўся ў чым маці нарадзіла. Качалі яны мяне па аўсе як хацелі, а пад канец адзін сабака стаў мне на грудзі пярэднімі лапамі і меціцца ў горла, але пакуль яшчэ не чапае.

На двух матацыклах пад'ехалі немцы. Спачатку самі білі колькі ўлезе, а пасля нацкавалі на мяне сабак, і з мяне толькі скура з мясам шматкамі паляцела. Голага, усяго ў крыві і прывезлі ў лагер. Месяц адседзеў у карцэры за ўцёкі, але ўсё-ткі жывы... жывы я застаўся!

Цяжка мне, браце, успамінаць, але яшчэ цяжэй расказваць пра тое, што давялося перажыць у палоне. Як успомніш нечалавечыя пакуты, якія давялося перажыць там, у Германіі, як успомніш сяброў-таварышаў, закатаваных там, у лагерах,— сэрца ўжо не ў грудзях, а ў горле б'ецца, і цяжка дыхаць робіцца.

Куды толькі мяне не ганялі за два гады палону! Пау-

Германii аб'ехаў за гэты час: і ў Саксоніі быў, на сілікатным заводзе працаваў, і ў Рурскай вобласці на шахце вугалёк адкочваў, і ў Баварыі на земляных работах горб нажываў, і ў Цюрынгii пабыў, чорт яго ведае, дзе толькі не давялося па нямецкай зямлі пахадзіць. Прырода ўсюды там розная, але стралялі, браце, і білі нашага брата ўсюды аднолькава. А білі богам праклятыя гады і паразіты так, як у нас зроду скаціну не б'юць. І кулакамі білі, і нагамі таптаці, і гумовымі палкамі білі, і розным жалеззем, што пад рукі трапіцца, ужо не кажучы пра вінтовачныя прыклады ды іншае дрэва.

Білі за тое, што ты — рускі, за тое, што на белы свет яшчэ глядзіш, за тое, што на іх, сволачаў, працуеш. Білі і за тое, што не так ступіш, не так зірнеш, не так павернешся... Білі проста каб калі-небудзь ды забіць насмерць, каб захліпнуўся сваёй апошняй крывёю і здох ад пабояў. Печаў жа, мусіць, на ўсіх нас не хапала ў Германii...

І кармілі ўсюды як ёсць аднолькава: паўтараста грамаў эрзац-хлеба напалам з пілавіннем і рэдкая баланда з бручкі. Кіпень — дзе давалі, а дзе і не. Ды што там казаць, мяркуй сам: да вайны важыў я восемдзесят пяць кілаграмаў, а пад восень цягнуў ужо не больш як пяцьдзесят. Адна скура засталася на касцях, ды і косці свае насіць сілы не ставала. А работу давай, і слова не скажы, ды такую работу, што ламавіку і то занадта было б.

На пачатку верасня з лагера пад горадам Кюстрынам перакінулі нас, сто сорак два чалавекі савецкіх ваеннапалонных, у лагер Б-14, непадалёк ад Дрэздэна. На той час у гэтым лагеры было каля дзвюх тысяч нашых. Усе працавалі на каменным кар'еры, уручную дзяўбалі, рэзалі, крышылі нямецкі камень. Норма — чатыры кубаметры ў дзень на душу, заўваж, на такую душу, якая і без таго ледзь-ледзь у целе трымаецца. Тут і пачалося: праз два месяцы ад ста сарака двух чалавек нашага эшалона нас засталося пяцьдзесят сем. Гэта што, браток? Жарточкі? Тут сваіх не спраўляешся хаваць, а тут чутка па лагеры пайшла, нібыта немцы ўжо Сталінград узялі і пруць далей, у Сібір. Адно гора да другога, ды гэтак гнуць, што вачэй ад зямлі не падымаеш, быццам і ты туды, у чужую, нямецкую зямлю просішся. А лагерная ахова кожны дзень п'е, песні гарланяць, радуюцца, цешацца.

І вось неяк увечары вярнуліся мы ў барак з працы. Цэлы дзень дождж ішоў, лахманы на нас — хоць выкручвай; усе мы на халодным ветры адубелі, як сабакі, дрыжыкі

прабіраюць. А абсушыцца няма дзе, сагрэцца — таксама, і да таго ж галодныя — не то што да смерці, а нават яшчэ горш. Але ўвечары есці нам не давалі.

Скінуў я з сябе мокрае рыззё, кінуў на пары і кажу: «Ім на чатыры кубаметры выпрацоўкі трэба, а на магілу кожнаму з нас і аднаго кубаметра за вочы досыць». Толькі ўсяго і сказаў, але ж знайшоўся са сваіх нейкі падлюга, данёс камендапту лагера пра гэтыя мае горкія словы.

Камендантам лагера, ці, па-іхняму, лагерфюрэрам, быў у нас немец Мюлер. Невысокага росту, дзябёлы, белабрысы і сам увесь нейкі белы: і галава белая, і бровы, і вейкі, нават вочы ў яго былі белазорыя, лупатыя. Па-руску гаварыў як мы з табою, ды яшчэ на «о» націскаў, быццам сам з Волгі. А мацюкацца быў майстар — жах! І дзе ён, пракляты, толькі і вучыўся гэтаму рамяству? Бывала, выстраіць нас перад блокам — барак яны гэтак называлі,— ідзе перад строем са сваёй зграяй эсэсаўцаў, правую руку трымае на адлёце. Яна ў яго ў скураной пальчатцы, а ў пальчатцы свінцовая пракладка, каб пальцы не пашкодзіць. Ідзе і б'е кожнаму другому ў нос, кроў пускае. Гэта ён называў «прафілактыкай ад грыпу». І гэта кожны дзень. Усяго чатыры блокі ў лагеры было, і вось ён сёння першаму блоку «прафілактыку» наладжвае, заўтра другому і гэтак далей. Акуратны быў, гад, без выхадных працаваў. Толькі аднаго ён, дурань, не мог зразумець: перад тым, як ісці руку прыкладваць, ён, каб распаліць сябе, хвілін дзесяць перад строем лаецца. Ён мацюкаецца як толькі можа, а нам ад гэтага лягчэй толькі робіцца: словы ж нашы, прыродныя, нібы ветрыкам з роднага краю павявае... Каб ён ведаў, што яго лаянка — нам адна прыемнасць, то на-руску напэўна не лаяўся б, а толькі на сваёй мове. А адзін мой прыяцель, масквіч, злаваўся на яго страшна. «Калі ён лаецца,— кажа,— я вочы заплюшчу, і быццам у Маскве, на Зацэпе, у піўной сяджу, і да таго мне піва захочацца, што ажно галава кружыцца».

Дык вось гэты самы камендант на другі дзень пасля таго, як я пра кубаметры сказаў, выклікае мяне. Увечары прыходзяць у барак перакладчык і з ім два вартавыя. «Хто Сакалоў Андрэй?» Я адгукнуўся. «Марш за намі, цябе сам лагерфюрэр патрабуе». Зразумела, навошта патрабуе. На распыл. Развітаўся я з сябрамі, усе яны ведалі, што на смерць іду, уздыхнуў і пайшоў. Іду па лагерным двары, на зоркі пазіраю, развітваюся і з імі, думаю: «Вось і адпакутаваў ты, Андрэй Сакалоў, а па-лагернаму — нумар тры-

ста трыццаць першы». Неяк шкада стала Ірынку і дзетак, а пасля жаль гэты ўтаймаваўся, і пачаў я збірацца з духам, каб зірнуць у дзірку пісталета бясстрашна, як і палежыць салдату, каб ворагі не пабачылі ў апошнюю маю хвіліну, што мне з жыццём расставацца ўсё-ткі цяжка...

У камендантскай — кветкі на вокнах, чысценька, як у нас у добрым клубе. За сталом усё лагернае начальства. Пяць чалавек сядзяць, шнапс глушаць і салам закусваюць. На стале ў іх пачатая здаравенная бутля са шнапсам, хлеб, сала, мочаныя яблыкі, адкрытыя бляшанкі з рознымі кансервамі. Умомант агледзеў я ўвесь той пачастунак, і — не паверыш — так моташна мне зрабілася, што пацягнула на ваніты. Я ж галодны, як воўк, адвык ад людскай ежы, а тут столькі дабра перад табою... Сяк-так перамог моташнасць, але вочы адвёў ад стала цераз сілу.

Проці мяне сядзіць п'яныаваты Мюлер, з пісталетам забаўляецца, перакідвае яго з рукі ў руку, а сам глядзіць на мяне і не міргне, як гадзюка. Ну, я рукі па швах, стаптанымі абцасамі прыстукнуў, голасна дакладваю: «Ваеннапалонны Андрэй Сакалоў паводле вашага загада, гер камендант, з'явіўся». Ён і пытаецца ў мяне: «Дык што ж, рус Іван, чатыры кубаметры выпрацоўкі — гэта зашмат?» — «Так точна,— кажу,— гер камендант, зашмат».— «А аднаго табе на магілу хопіць?» — «Так точна, гер камендант, яшчэ як хопіць, нават застанецца».

Ён устаў і кажа: «Я зраблю табе вялікі гонар, зараз сам расстраляю цябе за гэтыя словы. Тут нязручна, хадзем на двор, там ты і распішашся».— «Воля ваша»,— кажу яму. Ён пастаяў, падумаў, а пасля кінуў пісталет на стол і налівае поўную шклянку шнапсу, кавалачак хлеба ўзяў, паклаў на яго скрылёк сала і ўсё гэта падае мне і кажа: «Перад смерцю выпі, рус Іван, за перамогу нямецкай зброі».

Я ўжо быў з яго рук і шклянку ўзяў і закуску, але як толькі пачуў гэтыя словы — што агнём мяне апякло! Думаю сабе: «Каб я, рускі салдат, ды стаў піць за перамогу нямецкай зброі?! А сяго-таго ты не хочаш, гер камендант? Адзін чорт мне паміраць, дык праваліся ты разам са сваёй гарэлкай!»

Паставіў я шклянку на стол, закуску паклаў і кажу: «Дзякуй за пачастунак, але я не п'ю». Ён усміхаецца: «Не хочаш піць за нашу перамогу? У такім разе выпі за сваю пагібель». А што мне было траціць? «За сваю пагібель і збаўленне ад пакут я вып'ю»,— кажу яму. З гэтым узяў

шклянку і за два глыткі спаражніў яе, а да закускі не дакрануўся, далікатна выцер вусы далоняй і кажу: «Дзякуй за пачастунак. Я гатовы, гер камендант, хадзем, распішаце мяне».

Але ён глядзіць, уважліва так, і кажа: «Ты хоць закусі перад смерцю». Я яму на гэта адказваю: «Я пасля першай шклянкі не закусваю». Налівае ён другую, падае мне. Выпіў я і другую і зноў закускі не чапаю, на адвагу б'ю, думаю — хоць нап'юся перад тым, як на двор ісці з жыццём расставацца. Высока ўзняў камендант свае белыя бровы, пытаецца: «Чаму ж не закусваеш, рус Іван? Не саромейся!» А я яму сваё: «Прабачце, гер камендант, я і пасля другой шклянкі не прывык закусваць». Надзьмуў ён шчокі, фыркнуў, а пасля як зарагоча і праз смех нешта хутка гаворыць па-нямецку, мусіць, перакладае мае словы сябрам. Тыя таксама зарагаталі, засовалі крэсламі, паварочваюцца да мяне мордамі і ўжо, прыкмячаю, іначай на мяне глядзяць, нібы лагодней.

Налівае мне камендант трэцюю шклянку, а ў самога рукі калоцяцца ад смеху. Гэтую шклянку я выпіў урасцяжку, адкусіў маленькі кавалачак хлеба, рэшту паклаў на стол. Захацелася мне ім, праклятым, паказаць, што хоць я і з голаду гіну, але душыцца іхняй падачкай не збіраюся, што ў мяне ёсць свая, руская годнасць і гонар і што ў скаціну яны мяне не ператварылі, як ні стараліся.

Пасля гэтага камендант стаў сур'ёзны з выгляду, паправіў у сябе на грудзях два жалезныя крыжы, выйшаў з-за стала без зброі і кажа: «Вось што, Сакалоў, ты — сапраўдны рускі салдат. Ты адважны салдат. Я — таксама салдат, і паважаю дастойных праціўнікаў. Страляць я цябе не буду. Да таго ж, сёння нашы доблесныя войскі выйшлі да Волгі і цалкам авалодалі Сталінградам. Гэта нам вялікая радасць, а таму я велікадушна дарую табе жыццё. Ідзі ў свой блок, а гэта табе за адвагу»,— і падае мне са стала невялікі боханчык хлеба і кавалак сала.

Прыціснуў я моцна хлеб да сябе, сала ў левай руцэ трымаю і да таго разгубіўся ад такога нечаканага павароту, што і дзякуй не сказаў, зрабіў налева кругом, іду да выхаду, а сам думаю — засвеціць ён мне зараз паміж лапатак, і не данясу хлопцам гэтых харчоў. Не, абышлося. І на гэты раз смерць мяне абмінула, толькі халадком пацягнула ад яе...

Выйшаў я з каменданцкай яшчэ як трэба, а на двары разабрала. Уваліўся я ў барак і ўпаў на цэментаваную

падлогу, нічога не памятаючы. Разбудзілі мяне нашы яшчэ ўпоцемку: «Расказвай!» Ну, я ўспомніў, як было ў каменданцкай, расказаў ім. «Як будзем харчы дзяліць?» — пытаецца мой сусед па нарах, а ў самога голас дрыжыць. «Усім пароўну»,— кажу яму. Дачакаліся досвітку. Хлеб і сала рэзалі суравой ніткай. Дасталося кожнаму хлеба па кавалачку з карабок ад запалак, усе крошкі ўлічвалі, ну, а сала — сам разумееш — толькі губы памазаць. Але падзялілі без крыўды.

Неўзабаве перакінулі нас, чалавек трыста самых дужых, на асушку балотаў, пасля ў Рурскую вобласць на шахты. Там і прабыў я да сорак чацвёртага года. Пад гэты час нашы ўжо амаль што скруцілі Германіі шыю, і фашысты перасталі грэбаваць палоннымі. Неяк выстраілі нас, усю дзённую змену, і прыезджы обер-лейтэнант гаворыць праз перакладчыка: «Хто служыў у арміі ці да вайны працаваў шафёрам — крок наперад». Выйшла нас сем чалавек былой шафярні. Далі нам абшарпаныя спяцоўкі, накіравалі пад канвоем у Патсдам. Прыехалі туды, і параскідалі нас каго куды. Мяне накіравалі працаваць у «Тодту» — была ў немцаў такая шарашкіна кантора па будаўніцтве дарог і абарончых аб'ектаў.

Вазіў я на «опель-адмірале» немца-інжынера ў чыне маёра арміі. Ох, і тоўсты ж быў фашыст! Маленькі, пузаты, як ушыркі, так і ўвышыню аднолькавы, з шырокім задам, як спраўная баба. Спераду ў яго над каўняром мундзіра тры падбароддзі вісяць, і ззаду на шыі тры таўшчэзныя складкі. На ім, я так прыкідваў, не менш за тры пуды чыстага тлушчу было. Ходзіць, пыхкае, як паравоз, а жэрці сядзе — будзь здароў! Цэлы дзень, бывала, жуе ды каньяк з біклагі пацягвае. Калі-нікалі і мне ад яго перападала: у дарозе спыніцца, кілбасы нарэжа, сыру, закусвае і выпівае; калі ў добрым гуморы — і мне кавалак кіне, як сабаку. У рукі ніколі не даваў, не, лічыў, што гэта нізка для яго. Але як бы там ні было, а з лагерам не параўнаеш, і пакрысе падобным на чалавека я станавіўся, памалу, але пачаў папраўляцца.

Тыдні са два вазіў я свайго маёра з Патсдама ў Берлін і назад, а пасля паслалі яго ў прыфрантавую паласу на будаўніцтва абарончых рубяжоў супроць нашых. І тут я са сну зусім выбіўся: цэлымі начамі думаў, як мне да сваіх, на радзіму ўцячы.

Прыехалі мы ў горад Полацк. На досвітку пачуў я першы раз за два гады, як грыміць наша артылерыя, і ве-

дасш, браток, як сэрца забілася? Нежанаты яшчэ хадзіў да Ірыны на спатканні, і то яно гэтак не стукала! Баі ішлі на ўсход ад Полацка ўжо кіламетраў за васемнаццаць. Немцы ў горадзе злосныя сталі, нервовыя, а таўстун мой усё часцей напіваўся. Удзень за горадам з ім ездзім, і ён распараджаецца, як умацаванні будаваць, а ўночы адзін п'е. Апух увесь, пад вачыма мяшкі вісяць...

«Ну,— думаю,— чакаць болей няма чаго, прыйшоў мой час! І трэба не аднаму мне ўцякаць, а прыхапіць з сабою і майго таўстуна, ён нашым спатрэбіцца!»

Знайшоў у руінах двухкілаграмовую гірку, абкруціў яе абціральным рыззём, на выпадак, калі давядзецца ўдарыць, ды каб крыві не было, кавалак тэлефоннага провада падняў на дарозе, усё, што мне трэба, старанна падрыхтаваў, схаваў пад пярэдняе сядзенне. За два дні да таго як развітаўся з немцамі, увечары еду я з запраўкі, бачу — ідзе п'яны, як гразь, нямецкі унтэр, за сцяну рукамі трымаецца. Спыніў я машыну, завёў яго ў руіны і вытрас з мундзіра, пілотку з галавы зняў. Усю гэтую маёмасць таксама пад сядзенне сунуў і хуценька змыўся адтуль.

Раніцай дваццаць дзевятага чэрвеня загадвае мой маёр везці яго за горад, у кірунку Тросніц. Там ён кіраваў пабудовай умацаванняў. Выехалі. Маёр на заднім сядзенні спакойна дрэмле, а ў мяне сэрца як не выскачыць з грудзей. Еду я хутка, але за горадам збавіў газ, пасля спыніў машыну, вылез, азірнуўся: далёка ззаду дзве грузавыя цягнуцца. Дастаў я гірку, адчыніў шырэй дзверцы. Таўстун адкінуўся на спінку сядзення, пахропвае, нібы ў жонкі каля боку. Ну, я яго і цюкнуў гіркай у левую скронію. Ён і галаву адкінуў. Для надзейнасці я яго яшчэ раз стукнуў, але забіваць насмерць не захацеў. Мне яго жывога трэба было даставіць, ён нашым павінен быў шмат чаго параскazваць. Дастаў я ў яго з кабуры «парабелум», сунуў сабе ў кішэню, манціроўку ўбіў за спінку задняга сядзення, тэлефонны провад накінуў на шыю маёру і моцна завязаў на манціроўцы. Гэта каб ён не з'ехаў набок, не зваліўся пры хуткай яздзе. Зараз жа напяў на сябе нямецкі мундзір, пілотку, ну, і пагнаў машыну проста туды, дзе зямля гула, дзе бой ішоў.

Нямецкі пярэдні край праскокваў між двух дзотаў. З бліндажа аўтаматчыкі выскачылі, і я знарок збавіў ход, каб яны бачылі, што маёр едзе. Але яны крык узнялі, рукамі махаюць — маўляў, туды ехаць няможна, а я нібы

не разумею, падкінуў газку і пайшоў на ўсе восемдзесят. Пакуль яны апамяталіся і пачалі біць з кулямётаў па машыне, дык я ўжо на нічыёй зямлі паміж ямкамі пятляю не горай за таго зайца.

Тут немцы ззаду б'юць, а тут свае ашалелі, з аўтаматаў мне насустрач строчаць. У чатырох месцах ветравое шкло прабілі, радыятар кулямі пасеклі... Але вось ужо лясок над возерам, нашы бягуць да машыны, а я ўскочыў у гэты лясок, дзверцы адчыніў, паваліўся на зямлю і цалую яе, і дыхаць мне няма чым...

Малады хлопец, на гімнасцёрцы ў яго зялянковыя пагоны, якіх я ў вочы яшчэ не бачыў, першы падбягае да мяне, зубы скаліць: «Ага, чортаў фрыц, заблудзіўся?» Ірвануў я з сябе нямецкі мундзір, пілотку пад ногі кінуў ды кажу яму: «Любы ты мой губашлёп! Сынок даражэнькі! Які я табе фрыц, калі я прыродны варонежац? У палоне я быў, ясна? А цяпер адвяжыце гэтага япрука, што ў машыне сядзіць, вазьміце яго партфель ды вядзіце да вашага камандзіра». Здаў я ім пісталет і пайшоў з рук у рукі, а ўвечары апынуўся ўжо ў палкоўніка — камандзіра дывізіі. На той час мяне і накармілі, і ў лазню звадзілі, і дапыталі, і абмундзіраванне выдалі, так што з'явіўся я ў бліндаж да палкоўніка, як і належыць, душой і целам чысты і ў поўнай форме. Палкоўнік устаў з-за стала, пайшоў мне насустрач. Пры ўсіх афіцэрах абняў і кажа: «Дзякуй табе, салдат, за дарагі гасцінец, які прывёз ад немцаў. Твой маёр з яго партфелем нам даражэйшы за дваццаць языкоў. Буду хадайнічаць перад камандаваннем, каб падаць цябе да ўзнагароды». А я ад гэтых яго слоў, ад ласкі моцна хвалююся, губы дрыжаць, не слухаюцца, толькі і мог з сябе выціснуць: «Прашу, таварыш палкоўнік, залічыць мяне ў стралковую часць».

Але палкоўнік засмяяўся, паляпаў мне па плячы: «Які з цябе ваяка, калі ты на нагах ледзь стаіш? Сёння ж накірую цябе ў шпіталь. Падлечаць цябе там, падкормяць, пасля гэтага дадому да сям'і на месяц у адпачынак з'ездзіш, а калі вернешся да нас — пабачым, куды цябе прызначыць».

І палкоўнік, і ўсе афіцэры, што ў яго бліндажы былі, душэўна развіталіся са мной за руку, і выйшаў я адтуль страшэнна расхваляваны, бо за два гады адвык ад людскага абыходжання. І заўваж, братка, што яшчэ доўга я, як толькі з начальствам даводзілася гаварыць, міжволі, па прывычцы, галаву ў плечы ўцягваў, усё роўна як баяўся,

ці што, каб мяне не ўдарылі. Во як адукавалі нас у фашысцкіх лагерах...

Са шпіталя адразу ж напісаў Ірыне пісьмо. Апісаў усё коратка, як быў у палоне, як уцёк разам з нямецкім маёрам. І скажы ты, адкуль гэтае дзіцячае выхвалянне ў мяне ўзялося? Не вытрываў-такі, напісаў, што палкоўнік абяцаў мяне да ўзнагароды падаць...

Два тыдні спаў і еў. Кармілі мяне патроху, але часта, бо калі б далі есці ўволю, я мог бы душой загавець, так доктар сказаў. Набраўся сілы як мае быць, а праз два тыдні кавалка ў рот не мог убіць. Адказу з дому няма, і я, прызнацца, засумаваў. Пра яду і не думаю, няма ў мяне сну, розныя дурныя думкі ў галаве круцяцца... На трэцім тыдні прыйшло пісьмо з Варонежа. Але піша не Ірына, а сусед мой, сталяр Іван Цімафеевіч. Не дай божа нікому такія пісьмы атрымліваць! Паведамляе ён, што яшчэ ў чэрвені сорак другога года немцы бамбілі авіязавод, і адна цяжкая бомба пацэліла якраз у маю хацінку. Ірына і дочкі на той час былі дома... Ну, піша, што не знайшлі ад іх і следу, а на месцы хацінкі — глыбокая яма... Не дачытаў я тады пісьма да канца. У вачах пацямнела, сэрца сціснулася ў камяк і ніяк не адпускаецца. Прылёг я на ложак, крыху адляжаўся, дачытаў. Піша сусед, што Анатоль у час бамбёжкі быў у горадзе. Увечары вярнуўся ў пасёлак, паглядзеў на яму і ноччу зноў пайшоў у горад. Перад тым як пайсці, сказаў суседу, што будзе прасіцца добраахвотнікам на фронт. Вось і ўсё.

Калі сэрца адпусціла і ў вушах зашумела кроў, я прыгадаў, як цяжка расставалася са мной мая Ірына на вакзале. Значыць, яшчэ тады падказала ёй жаночае сэрца, што болей не ўбачымся мы з ёй на гэтым свеце. А я яе тады адштурхнуў... Была сям'я, свая хата, усё гэта ляпілася гадамі, і ўсё зруйнавана ў адзін момант, застаўся я адзін. Думаю: «Ды ці не прыснілася мне мая няскладная жытка?» А ў палоне ж я амаль кожную ноч і з Ірынай, і з дзецьмі гаварыў, падбадзёрваў іх — сам сабе, вядома,— маўляў, я вярнуся, мае родныя, не гаруйце па мне, я — дужы, я выжыву, і зноў мы будзем усе разам... Значыць, я два гады з нябожчыкамі гаварыў?!

Расказчык на хвіліну змоўк, а пасля сказаў ужо іначшым, перарывістым і ціхім голасам:

— Давай, браток, перакурым, а то мяне нешта задышка даймае.

Мы закурылі. У залітым вясновай вадой лесе звонка

пастукваў дзяцел. Усё гэтак жа ляніва варушыў сухія каташкі па алешыне цёплы вецер; усё гэтак жа, быццам пад тугімі, белымі ветразямі, праплывалі ў высокім блакіце воблакі, але ўжо іпакшым здаваўся мне ў гэтыя хвіліны горкага маўчання бязмежны свет, што рыхтаваўся да вялікіх таямніц вясны, да адвечнага сцвярджэння жывога ў жыцці.

Маўчаць было цяжка, і я спытаўся:

— Што ж далей?

— Далей што? — нехаця адазваўся расказчык.— Далей атрымаў я ад палкоўніка месячны водпуск, праз тыдзень быў у Варонежы. Пеша датупаў да месца, дзе кадзесь у сям'ёю жыў. Глыбокая яма, залітая ржавай вадою, вакол быллё па пояс... Глуш, цішыня, як на могілках. Ох, і цяжка ж мне было, брацо! Пастаяў, паплакаў душою і зноў пайшоў на вакзал. I гадзіны заставацца там не мог, таго ж дня паехаў назад у дывізію.

Але месяцы праз тры і мне бліснула радасць, як сонейка з-за хмары: знайшоўся Анатоль. Прыслаў пісьмо мне на фронт, відаць, з другога фронту. Мой адрас даведаўся ад суседа, Івана Цімафеевіча. Аказваецца, трапіў ён спачатку ў артылерыйскае вучылішча; там і спатрэбіўся яго талент да матэматыкі. Праз год выдатнікам скончыў вучылішча, пайшоў на фронт і вось піша, што атрымаў званне капітана, камандуе батарэяй «саракапятак», мае шэсць ордэнаў і медалі. Адным словам, абставіў бацьку з усіх бакоў. I зноў страшэнна загапарыўся ім! Што ні кажы, а мой родны сын — капітан і камандзір батарэі, гэта ж не жарты! Ды яшчэ пры такіх ордэнах. Гэта нічога, што бацька яго па «студэбекеры» спарады і розную іншую ваенную маёмасць возіць. Бацька сваё аджыў, а ў яго, у капітана, усё наперадзе.

I пачаў я па-старэчы марыць па начах: як вайна скончыцца, як я сына ажаню і сам пры маладых жыць буду, цяслярыць і ўнукаў пяньчыць. Адным словам, розныя такія старэчыя развагі. Але і тут выйшла ў мяне поўная асечка. Зімой наступалі мы без перадыху і асабліва часта пісаць адзін аднаму нам не было калі, а пад канец вайны, ужо каля Берліна, раніцай паслаў Анатолю пісямко, а на другі дзень атрымаў адказ. I тут я зразумеў, што падышлі мы з сынам да германскай сталіцы рознымі дарогамі, але цяпер адзін ад аднаго недалёка. Чакаю не дачакаюся, проста-такі прагну той хвіліны, калі мы з ім пабачымся. Ну і пабачыліся... Акурат дзевятага мая, ра-

ніцай, у Дзень Перамогі, забіў майго Анатоля нямецкі снайпер...

У другой палавіне дня выклікае мяне камандзір роты. Гляджу, сядзіць у яго незнаёмы мне артылерыйскі падпалкоўнік. Калі я ўвайшоў у пакой, ён устаў, як перад старшым па званні. Камандзір маёй роты кажа: «Да цябе, Сакалоў»,— а сам да акна адвярнуўся. Пранізала мяне, як электрычным токам, бо адчуў я нядобрае. Падпалкоўнік падышоў да мяне і ціха кажа: «Мужайся, бацька! Твой сын, капітан Сакалоў, забіты сёння на батарэі. Хадзем са мной!»

Хістануўся я, але на нагах устаяў. Цяпер і то нібы праз сон успамінаю, як ехаў разам з падпалкоўнікам на вялікай машыне, як прабіраліся па заваленых абломкамі вуліцах, нібы ў тумане бачу салдацкі строй і абабітую чырвоным аксамітам труну. А Анатоля бачу як вось цябе, браце. Падышоў я да труны. Мой сын ляжыць у ёй і не мой. Мой — гэта заўсёды ўсмешлівы, вузкі ў плячах хлапчук з вострым кадыком на худой шыі, а тут ляжыць малады, плячысты, прыгожы мужчына, вочы прыплюшчаны, быццам глядзіць ён недзе паўз мяне, у невядомую мне далёкую далячынь. Толькі ў куточках вуснаў гэтак навек і засталася смяшынка колішняга сынка, Толіка, якога я калісьці ведаў... Пацалаваў я яго і адышоўся ўбок. Падпалкоўнік прамову сказаў. Таварышы-сябры майго Анатоля слёзы выціраюць, а мае нявыплаканыя слёзы, відаць, на сэрцы засохлі. Можа, таму яно гэтак баліць?

Пахаваў я ў чужой, нямецкай зямлі апошнюю сваю радасць і надзею, грымнула батарэя майго сына, праводзячы свайго камандзіра ў далёкую дарогу, і нібы што ўва мне абарвалася... Прыехаў я ў сваю часць сам не свой. Але тут неўзабаве мяне дэмабілізавалі. Куды ісці? Няўжо ў Варонеж? Нізавошта! Успомніў, што ў Урупінску жыве мой сябра, дэмабілізаваны яшчэ зімой пасля ранення,— ён калісьці запрашаў мяне да сябе,— успомніў і паехаў у Урупінск.

Прыяцель мой і яго жонка былі бяздзетныя, жылі ў сваім доміку на ўскраіне горада. Ён хоць і меў інваліднасць, але працаваў шафёрам у аўтароце, прыладзіўся і я туды. Пасяліўся ў прыяцеля, далі яны мне прытулак. Розныя грузы перакідвалі мы ў раёны, увосень пераключыліся на вывазку збожжа. У гэты час я і пазнаёміўся з маім новым сынком, во з гэтым, што ў пяску гуляе.

З рэйса, бывала, вернешся ў горад, вядома, першым

чынам у чайную перахапіць чаго-небудзь, ну, ясна, і сто грам выпіць ад зморы. Да гэтай шкоднай справы, трэба сказаць, я ўжо быў прыахвоціўся як мае быць... І вось адпаго разу бачу каля чайной гэтага хлопчыка, на другі дзень — зноў бачу. Гэткі маленькі абадранец: тварык увесь у кавуновым соку з наліплым пылам, брудны, што зямля, нечасаны, а вачаняты — як зорачкі ўночы пасля дажджу! І да таго ён мне ўпадабаўся, што я ўжо, дзіва проста, пачаў сумаваць па ім, спяшаюся з рэйса, каб хутчэй яго ўбачыць. Каля чайной ён і карміўся — хто што дасць.

На чацвёрты дзень проста з саўгаса, нагружаны збожжам, падварочваю да чайной. Хлопчык мой там, сядзіць на ганку, ножкамі матляе, і, па ўсім відаць, галодны. Высунуўся я ў акенца, гукаю яму: «Гэй, Ванечка! Садзіся хутчэй на машыну, звяжу на элеватар, а адтуль вернемся сюды, паабедаем». Ён, пачуўшы мяне, скалануўся, саскочыў з ганка, на падножку ўскараскаўся і ціха кажа: «А вы адкуль ведаеце, дзядзя, што мяне Ваня завуць?» І вачаняты шырока расплюшчыў, чакае, што я яму адкажу. Ну, я яму кажу, што я, маўляў, чалавек бывалы і ўсё ведаю.

Зайшоў ён з правага боку, я дзверцы адчыніў, пасадзіў яго побач з сабою, паехалі. Жвавы такі хлапчынка, а раптам чамусьці прыціх, задумаўся і не-не ды зірне на мяне з-пад доўгіх сваіх, загнутых угару веек, уздыхне. Такое малое птушанё, а ўжо навучыўся ўздыхаць. Ці яго гэта справа? Пытаюся: «Дзе ж твой бацька, Ваня?» Шэпча: «Загінуў на фронце».— «А мама?» — «Маму бомбай забіла ў поездзе, як мы ехалі».— «А адкуль вы ехалі?» — «Не ведаю, не помню...» — «І нікога ў цябе тут родных няма?» — «Нікога».— «Дзе ж ты начуеш?» — «А дзе прыйдзецца...»

Закіпела тут у мне горкая сляза, і адразу я вырашыў: «Не будзе таго, каб нам па адным прападаць! Вазьму яго сабе ў дзеці». І адразу ў мяне на душы зрабілася лёгка і неяк светла. Нахіліўся я да яго, ціхенька пытаюся: «Ванечка, а ты ведаеш, хто я такі?» Ён і спытаўся, як выдыхнуў: «Хто?» Я яму і кажу гэтак жа ціха: «Я — твой бацька».

Божа мой, што тут сталася! Кінуўся ён мне на шыю, цалуе ў шчокі, у губы, у лоб, а сам, як тая птушка, звонка і тоненька крычыць, ажно ў кабіне глушна: «Татка, родненькі! Я ведаў! Я ведаў, што ты мяне знойдзеш! Усё роўна знойдзеш! Я ж гэтак доўга чакаў, калі ты мяне знойдзеш!» Прытуліўся да мяне і ўвесь дрыжыць, што травін-

ка пад ветрам. А ў мяне ўваччу туман і таксама ўсяго дрыжыкі б'юць, і рукі трасуцца... Як я тады руль не выпусціў, проста дзіва! Але ў кювет усё-ткі незнарок з'ехаў, заглушыў матор. Пакуль туман у вачах не мінуўся — пабаяўся ехаць, каб на каго не наскочыць. Пастаяў так хвілін пяць, а сынок мой усё туліцца да мяне як мага, маўчыць, уздрыгвае. Абняў я яго правай рукою, паціхеньку прыцінуў да сябе, а левай зрабіў разварот, паехаў назад, на сваю кватэру. Які мне ўжо там элеватар, тады мне не да элеватара было.

Пакінуў машыну каля варотаў, новага свайго сынка ўзяў на рукі, нясу ў хату. А ён як ашчаперыў маю шыю ручанятамі, дык і не адарваўся да самага месца. Прытуліўся сваёй шчакой да маёй няголенай шчакі, як прыліп. Гэтак я яго і ўнёс. Гаспадар і гаспадыня якраз дома былі. Увайшоў я, міргаю вачыма, бадзёра гэтак кажу: «Вось і знайшоў я свайго Ванечку! Прымайце нас, добрыя людзі!» Яны, абое бяздзетныя, адразу сцямілі, у чым справа, замітусіліся, забегалі. А я ніяк сына ад сябе не адарву. Але сяк-так угаварыў. Вымыў яму рукі з мылам, пасадзіў за стол. Гаспадыня капусты яму ў талерку наліла, ды як зірнула, як прагна ён есць, дык і залілася слязьмі. Стаіць каля печы, плача сабе ў фартух. Ванечка мой убачыў, што яна плача, падбег да яе, тузае за спадніцу ды кажа: «Цёця, чаго ж вы плачаце? Тата знайшоў мяне каля чайной, усім радавацца трэба, а вы плачаце!..» А тая — не давядзі бог, яна яшчэ горш заліваецца, проста размокла ўся!

Пасля абеду павёў я яго ў цырульню, пастрыг, а дома сам выкупаў у начоўках, захутаў у чыстую прасціну. Абняў ён мяне і гэтак на руках маіх і заснуў. Асцярожна паклаў яго на ложак, паехаў на элеватар, згрузіў збожжа, машыну загнаў на стаянку ды — пабег па магазінах. Купіў яму штонікі суконныя, кашульку, сандалі і картузік мачальны. Вядома, усё гэта было і не па росце і якасцю нікуды не вартае. За штонікі гаспадыня нават лаяла мяне: «Ты, кажа, з глузду з'ехаў, у гэткую спёку дзіцяці суконныя штаны надзяваць!» І ўмомант — швейную машынку на стол, пакорпалася ў куфры, а праз гадзіну майму Ваню ўжо сацінавыя трусікі былі гатовы і беленькая кашулька з кароткімі рукавамі. Спаць я лёг разам з ім і ўпершыню за доўгі час заснуў спакойна. Аднак уначы разы чатыры ўставаў. Прачнуся, а ён у мяне пад пахай — зашыўся, як верабей пад застрэшша, ціхенька пасопвае, і да таго мне робіцца радасна на душы, што словамі і не выкажаш. На-

ровіш не варухнуцца, каб не разбудзіць яго, а ўсё роўна не вытрываеш — ціхутка ўстанеш, засвеціш запалку і любуешся з яго...

На досвітку прачнуўся — не разумею, чаго мне гэтак душна зрабілася? А гэта сынок мой вылез з прасціны і ўпоперак мяне ўлёгся, раскінуўся і ножкай мне горла прыціснуў. І неспакойна з ім спаць, а вось прывык, сумна мне без яго. Уночы то пагладзіш яго соннага, то валаскі на віхрах панюхаеш, і сэрца адыходзіць, мякчэе, а то ж яно ў мяне скамянела ад гора...

Спачатку ён са мной на машыне ў рэйсы ездзіў, потым зразумеў я, што нядобра гэта. Аднаму мне што? Акраец хлеба і цыбуліну з соллю — і пад'еў салдат на цэлы дзень. А з ім — справа іншая: то малака яму трэба расстарацца, то яечка зварыць, ды і без гарачага піяк нельга. Але ж справа не чакае. Адважыўся неяк, пакінуў яго на гаспадыню, дык ён да вечара слёзы ліў, а ўвечары ўцёк на элеватар сустракаць мяне. Да позняй ночы чакаў там.

Цяжка было мне з ім на першым часе. Аднаго разу ляглі спаць яшчэ завідна, удзень натаміўся я вельмі, і ён — то заўсёды шчабеча, як верабейка, а гэта нешта прыціх. Пытаюся: «Ты пра што думаеш, сынок?» А ён у мяне пытаецца, сам на столь глядзіць: «Татка, ты куды сваё скуранае паліто падзеў?» Ніколі ў мяне скуранога паліта не было! Давялося выкручвацца: «У Варонежы засталося»,— кажу яму. «А чаму ты мяне гэтак доўга шукаў?» Адказваю яму: «Я цябе, сынок, і ў Германіі шукаў, і ў Польшчы, і ўсю Беларусь прайшоў і праехаў, а ты ў Урупінску апынуўся».— «А Урупінск — гэта бліжэй за Германію? А да Польшчы далёка ад нашага дому?» Так і балакаем з ім перад сном.

А ты думаеш, братка, пра скуранае паліто ён так сабе запытаўся? Не, усё гэта не так сабе. Значыць, калісьці бацька яго сапраўды насіў такое паліто, вось яму і запомнілася. Дзіцячая ж памяць — што летняя зарніца: успыхне, на кароткі час асвеціць усё і патухне. Гэтак і ў яго памяць, нібы зарніца, праблiскамі працуе.

Можа, і жылі б мы з ім яшчэ з год у Урупінску, але ў лістападзе здарыўся са мной грэх: ехаў па гразі, у адным хутары машыну маю занесла, а тут карова падвярнулася, я і збіў яе з ног. Ну, вядомая справа, бабы крык узнялі, народу збеглася, і аўтаінспектар тут як тут. Адабраў у мяне шафёрскую кніжку, як я ні прасіў яго злітавацца. Карова падпялася, хвост задрала і пайшла скакаць

па завулках, а ў мяне кніжку адабралі. Зіму прапрацаваў цесляром, а пасля спісаўся з адным прыяцелем, таксама саслужыўцам,— ён у вашай вобласці, у Кашарскім раёне, працуе шафёрам,— і той запрасіў мяне да сябе. Піша, што, маўляў, напрацуеш паўгода па цяслярскай справе, а пасля ў нашай вобласці выдадуць табе новую кніжку. Вось мы з сынком і камандзіруемся ў Кашары паходным парадкам.

Ды яно, як табе сказаць, каб і не здарылася ў мяне гэтай аварыі з каровай, я ўсё роўна падаўся б з Урупінска. Туга не дае мне на адным месцы доўга заседжвацца. Вось ужо як Ванечка мой падрасце і трэба будзе ў школу яго пасылаць, тады, можа, і я ўтаймуюся, асяду на адным месцы. А цяпер пакуль ходзім з ім па рускай зямлі.

— Цяжка яму ісці,— сказаў я.

— Дык ён жа зусім мала на сваіх нагах ідзе, усё болей на мне едзе. Пасаджу яго на плечы ды пясу, а захоча размяцца — злазіць з мяне і бегае ўзбоч дарогі, падбрыквае, як казлянё. Усё гэта, браце, нічога, як-небудзь мы з ім пражылі б, ды вось сэрца ў мяне расшаталася, поршні трэба мяняць... Іншы раз так схопіць і сціене, што белы свет у вачах цямнее. Баюся, што калі-небудзь у сне памру і напалохаю свайго сыночка. А тут яшчэ адно гора: ледзь не кожную ноч сваіх нябожчыкаў дарагіх пачаў сніць. І ўсё болей так, што я за калючым дротам, а яны на волі, на другім баку... Размаўляю пра ўсё і з Ірынай і з дзецьмі, але як толькі хачу дрот рукамі рассунуць — яны ўцякаюць ад мяне, быццам растаюць на вачах... І вось дзіўная справа: удзень я заўсёды моцна сябе трымаю, ад мяне ні ўздыху ні аху не пачуеш, а ўначы прачнуся, і ўся падушка мокрая ад слёз...

У лесе пачуўся голас майго таварыша, усплёскі вясла па вадзе.

Чужы, але цяпер ужо блізкі мне чалавек устаў, падаў вялікую, цвёрдую, як дрэва, руку:

— Бывай, братка, шчасліва табе!

— І табе шчасліва дабрацца да Кашараў.

— Дзякуй. Гэй, сынок, хадзем да лодкі.

Хлопчык падбег да бацькі, прыстроіўся справа і, трымаючыся за крысо бацькавай ватоўкі, дробненька затупаў побач з мужчынам, які шырока ступаў.

Два асірацелыя чалавекі, дзве пясчынкі, закінутыя ў чужыя мясціны васннай навалай нябачанай сілы... Што чакае іх наперадзе? І хацелася б думаць, што гэты рускі

чалавек, чалавек нязломнай волі, вытрывае, і каля бацькоўскага пляча вырасце той, хто, пасталеўшы, здолее ўсё вытрываць, усё перамагчы на сваім шляху, калі на гэта пакліча яго Радзіма.

З цяжкім смуткам глядзеў я ім услед... Можа, усё і абышлося б добра пры нашым расстанні, але Ванечка, адышоўшы некалькі крокаў і заграбаючы кароткімі ножкамі, павярнуўся на хаду тварам да мяне, памахаў ружовай ручкай. І раптам нібы мяккая, але кіпцюрастая лапа сціснула мне сэрца, і я хутчэй адвярнуўся. Не, не толькі ў сне плачуць пажылыя, пасівелыя за вайну мужчыны. Плачуць яны і наяве. Тут галоўнае — умець у час адвярнуцца. Тут самае галоўнае — не параніць сэрца дзіцяці, каб дзіця не ўбачыла, як бяжыць па тваёй шчацэ пякучая і скупая, мужчынская сляза...

*1956*

## Сяргей Антонаў

# ЦЁТКА ЛУША

Праз доўгі час у калгас вярнуліся Гаўрылавы. Яны прыехалі ўсёй сям'ёй: сам Гаўрылаў, жонка, дзве дачкі і нежанаты сын Сашка. У першы ж вечар Сашка Гаўрылаў прагульваўся па вёсцы дачнікам: у пінжаку, без гальштука, чаравікі на босую нагу — і цікаўныя жанчыны ўпотай разглядалі яго з-за фіранак.

На другі дзень дзяўчаты наладзілі вечарынку ў хаце вясёлай разведзёнкі Кацярыны Валахавай. Людзей набілася багата. Кацярыніны малыя блыталіся пад нагамі. Яна крычала на іх і абзывала «самаробкамі». Пагуляць яна любіла і, трошкі падпіўшы, заўсёды спявала песеньку пра тое, што як стане моташна, дык трэба пайсці ў лес: аб пянёчак дубцом стук — тут і з'явіцца дзяцюк. Дзяўчаты смяяліся, але ў Кацярынінай весялосці было нешта горкае, адчайнае.

На вечарынку прыйшоў Сашка — зноў без гальштука і ў чаравіках на босую нагу. Толькі каб усе бачылі, што ён пабываў у Маскве, прышпіліў на пінжак значок сельскагаспадарчай выстаўкі.

Зайшла і Лукер'я Іванаўна, старшыня калгаса,— паглядзець, што за работнік прыехаў у вёску. Гэта была ладная, зграбная жанчына са смелым паглядам разумных цёмна-карых, як моцны чай, вачэй. Хадзіла яна ў ватоўцы, якую насіла па-мужчынску нядбайна, расшпіліўшы каўнер, і ў кірзавых ботах з жалезнымі падкоўкамі. Яна ўмела вадзіць машыны, трактары, класці печы, рубіць у лапу вуглы і прымаць народжаных, і ўсё ў яе выходзіла лёгка, весела.

У канцы вайны ёй было дваццаць гадоў. Мужчын на той час у вёсцы не асталося, і Лушу выбралі старшынёй. З тае пары яна і гаспадарыла дзесяць гадоў запар.

Сашку яна памятала пятнаццацігадовым хлапчуком — тады ён быў ціхі, сарамяжлівы. А цяпер задаецца, робіць выгляд, што яму нудна, гаворыць праз сілу. Толькі Ка-

царына зачапіла яго за жывое сваімі вольнымі размовамі.

І калі пачаліся танцы, Сашка выбраў Кацярыну.

Луша пакрыўдзілася за дзяўчат, асабліва за Насцю. Насці Сашка напэўна падабаўся. Яна старанна рыхтавалася да вечара, лётала па хатах, пазычала пласцінкі, прынесла патэфон, надзела доўгую сукенку з банцікам. Стаяла яна ўся як напятая струна, тугая і моцная, з замiраннем сэрца чакаючы, калі Сашка заўважыць яе і ўбачыць, якая яна. Але Сашка танцаваў з Кацярынай, а Насці толькі і аставалася мяняць пласцінкі. Часам ён падыходзіў, каб сказаць, які танец ставіць, але Насця і ад гэтых слоў загаралася яркаю чырванню.

«Ну, нібыта лямпачка»,— з пяшчотай падумала Луша. І, паклікаўшы Кацярыну, папікнула:

— Чаго ты на ім павісла? Дай іншым патанцаваць.

Кацярына па-свойму зразумела яе словы, адышла да Сашкі, і калі зайгралі кракавяк, ён запрасіў Лушу. Давялося ісці.

Сашка танцаваў не вельмі ўмела, але з імпэтам. Упэўнены, што яму даруюць усё, паводзіўся развязна, бесцырымонна, а жанчыны, разумеючы, што самі вінаватыя, не папракалі яго.

— Ты з Кацярынай не вельмі,— сказала яму Луша.— Глядзі, шафёры ногі пераб'юць.

— А што мне Кацярына,— адказаў Сашка.— Што я, не бачыў гэтакіх, ці што...

«Цяля яшчэ»,— падумала Луша. Але танцаваць ёй падабалася. Сашка ціснуў ёй пальцы, туліў да сябе, і яна не працівілася. Яна зусім забылася пра Насцю і танцавала адзін танец за адным. У яе кружылася ў галаве, спіной яна адчувала неспакойную мужчынскую руку, чула пах здаровага хлапечага поту, і ёй здавалася, што паміж імі ідзе нейкая маўклівая змова, і была рада гэтаму і не рада.

Але калі вечар скончыўся і Сашка прапанаваў праводзіць яе, яна рашуча адмовілася. Яна пайшла адна, незадаволеная сабой, саромеючыся сябе і сваіх паводзін.

Была ціхая, ясная ноч. Месяц свяціў на поўную сілу. Ціхае неба, што сціпла мігцела зорамі, і нерухомыя рабіны з чорным лісцем і яшчэ чарнейшымі гронкамі ягад, і белыя, нібы з крэйды, сцяжыны, якія перасякаліся празрыстымі, пяшчотнымі месяцовымі ценямі, і паласаты туман удалечыні, за сушнямі,— усё было спакойнае, абыякавае, быццам нічога не здарылася.

Луша ішла па соннай вёсцы і думала, што раніца муд-

рэй за вечар, што заўтра ўсё забудзецца і жыццё пойдзе па-ранейшаму. І паступова супакойвалася.

Вёска стаяла пры гасцінцы. Машыны праходзілі часта, душылі курэй. Вечарамі праезджыя шафёры цягаліся па хатах — прасіліся пераначаваць. Некаторыя, смялейшыя, часам увязваліся і за Лушай, калі яна, вось гэтак, як цяпер, ішла па гасцінцы шырокім салдацкім крокам, глыбока ўціснуўшы рукі ў кішэні ватоўкі,— набіваліся на начлег.

— Дома, мусіць, жонка чакае, а ты — начаваць...— звычайна адказвала Луша спакойна-дружалюбным тонам, і чамусьці менавіта гэты тон пазбаўляў смельчакоў усякай надзеі.

Лушы не давялося выйсці замуж. Жыла яна ў сваёй хаце адна.

На палове дарогі Луша ўбачыла Насцю.

Насця ішла другім бокам вёскі, ціхенька, шпарка, каб ніхто не заўважыў, і несла патэфон і чамадан з пласцінкамі.

«Эх, ярачка-даярачка,— падумала Луша,— так і не паскакала ні разу».

Яна дагнала дзяўчыну, узялася за чамадан.

— Давай, данясу.

— Дзякуй, цётка Луша. Я сама.

— Давай.

— Дзякуй. Недалёка ўжо.

Луша разумела, што Насця злуецца на яе, але ўсё ж такі адабрала чамадан і данесла да весніц.

А потым вярнулася дадому, у сваю пустую, не прыбраную з раніцы хату, легла і пачала думаць. Па шашы зрэдку прабягалі машыны, і тады ў хаце трымцела шкло ў вокнах, ледзь чутно, нібы нехта прытрымліваў яго далонню, і сярэбраны след асветленых фарамі вокан павольна паўскос зверху ўніз прапаўзаў па сцяне і згасаў на падлозе. Луша думала: як жа гэта — машына ідзе па роўнай дарозе, а след паўзе зверху ўніз. Так і заснула, не разумеючы, чаму.

Дні праз два Сашка пасварыўся з праезджымі шафёрамі. Луша першая ўбачыла з акна — вось-вось усчанецца бойка. Яна выбегла на вуліцу і схапіла Сашку за руку. Ён быў на падпітку.

П'яная лаянка і грубасці не палохалі Лушу. Пры ёй часцяком лаяліся хто як умеў, і яна не звяртала на гэта ўвагі. Але Сашка лаяцца не стаў і паслухмяна пайшоў у хату. І Луша падумала, што калі ён трапіць у добрыя жаночыя рукі, то з яго можа выйсці слаўны мужык.

— Вось што, Сашка,— сказала яна.— Бярыся за працу. Хопіць табе дурэць.

— Мне паложаны месяц адпачынку. Магу пагуляць.

— На гулянку, значыць, прыехаў?

— Ад сям'і адрывацца не хачў, вось і прыехаў. Ці я ў горадзе не зарабіў бы? Я, калі хочаш ведаць, удвая процi цябе зараблю.

Ён сядзеў, разваліўшыся ў крэсле, і Луша пашкадавала яго.

— Можа, чаю хочаш? — папыталася ў яго.

— Ці я чаю не бачыў?

Потым ён піў чай, а яна глядзела на яго русявы віхор, што тырчаў на патыліцы. І ёй так захацелася прыгладзіць гэты віхор, што яна спалохалася і хуценька сказала:

— Ну, дапівай ды ідзі сабе.

Сашка дапіў шклянку і пайшоў.

Пасля ён заходзіў яшчэ разы тры, ужо цвярозы, але гэтак жа доўга піў чай і хваліўся.

На вёсцы казалі: прываrожвае Луша хлопца. Лічылі гады: яму дваццаць другі, ёй — трыццаты. З сумненнем ківалі галовамі. А стары Гаўрылаў, відаць, на правах будучага свёкра перастаў выходзіць на работу.

«Сама вінавата,— тужліва думала Луша.— Трэба яго адвадзіць».

І неўзабаве надарыўся выпадак.

Нечакана прыехаў нядаўна прызначаны галоўны інжынер МТС з сям'ёй. Кватэру падрыхтаваць яшчэ не паспелі, і Луша прапанавала сваю.

— Я ў хаце толькі пачую,— сказала яна.— Будзьце як дома.

Інжынер і яго жонка былі людзі пажылыя, а сынок у іх быў чатырохгадовы — Свецік.

У першы ж вечар, прыйшоўшы дахаты, Луша не пазнала свайго пакоя. Усё было перастаўлена, пераблытана, стол быў заслапы чужым абрусам, чужыя рэчы стаялі на камодзе.

Давялося прывыкаць жыць у сваёй уласнай хаце. Давялося думаць, дзе пераадзявацца, куды хаваць ад мужчынскіх вачэй сякую-такую адзежыну. Але гэтыя невы-

годы не былі Лушы непрыемныя. На пейкі час у хаце паявіўся гаспадар.

Інжыперавай жонцы было цяжка. Яна ніколі не жыла ў вёсцы і баялася кароў.

Абы-як зварыўшы абед, яна садзілася каля акна і стомлена казала:

— Хоць бы Піліп прыходзіў хутчэй.

Калі прыходзіў муж, яна налівала яму супу, а сама садзілася насупраць і моўчкі глядзела, як ён есць. І Луша ўспамінала, што гэтаксама глядзела яна на Сашку, калі той піў чай.

Пасля абеду муж і жонка гаварылі. Звычайна муж быў чым-небудзь незадаволены і капрызіў з-за драбязы.

Каб не замінаць, Луша ішла да сябе за перагародку. І ёй здавалася, што не ў яе жывуць людзі, а яна наймае ў іх куток.

Сашка заходзіць перастаў; Луша рэдка бачыла яго. Казалі, што ён спрабуе заляцацца да Насці, але тая не хоча сустракацца з ім нібы таму, што баіцца Лушы. Зрэшты, Луша мала ўвагі звяртала на такія размовы. Неўпрыкмет яна ўцягнулася ў чужое сямейнае жыццё, чужы клопат стаў сваім: яна пасябравала са Свецікам і кожную раніцу прыгладжвала яго жорсткі віхорчык на патыліцы. Яна любіла мыць яго рэчы: маленькія штонікі, маленькія панчошкі з пятлічкамі, маленькія стапікі — і крыўдавала, калі маці мыла сама.

А калі ў Свеціка забалеў жывот, абедзве жанчыны збіліся з ног.

Маці часцей пазірала ў акно і казала:

— Хоць бы Піліп прыходзіў хутчэй.

І Луша паўтарала за ёй:

— Хоць бы Піліп Васільевіч прыходзіў хутчэй.

Вечарам на эмтээсаўскім «газіку» прыязджаў інжынер, і хоць ніякай дапамогі ад яго не было, у хаце рабілася спакайней.

Тыдні праз два на сядзібе МТС падрыхтавалі кватэру, і інжынер з'ехаў.

Луша прыйшла ў апусцелую хату, вымыла сподак, які быў за попельніцу, села ў крэсла і заплакала, моцна, наўзрыд, так, што чуваць было на вуліцы.

На другі дзень, ідучы паўз гумно, яна ўбачыла пухлявае, саплівае хлапчаня.

Сама не разумеючы, што з ёй, яна кінулася да яго і

пачала цалаваць да болю. Малы зароў немым голасам, вырваўся і пабег.

Апомніўшыся, Луша спалохана агледзелася. Блізка нікога не было. Тады яна падумала, што хлопчык можа расказаць бацькам, і спалохалася яшчэ болей.

Удзень у кантору прыйшла маці пухлявага хлапчаняці.

— Ты гэта што! — закрычала яна.— Майго мужыка ў МТС не адпускаеш, а іншыя ідуць?!

У Лушы адлегла ад сэрца.

— Хто ідзе? — спыталася яна.

— Ці ты не ведаеш? Сашка Гаўрылаў наймацца збіраецца.

На другі дзень Луша выклікала Сашку ў праўленне.

— Ты што, у МТС хочаш падавацца? — спыталася яна.

— Яшчэ не абдумаў. Пагляджу.

— Значыць, так у цябе: толькі на радзіму вярнуўся і зноў бегчы? Не пусцім. Мужчыны нам самім патрэбныя,— і Луша нечакана пачырванела. З ёй даўно такога не было, яна здзівілася і пачырванела яшчэ больш.

Сашка ўважліва пазіраў на яе.

— Пішы заяву,— гаварыла Луша, пазбягаючы яго погляду.— У калгас прымем. Брыгадай будаўнікоў кіраваць будзеш.

— А рабіць што?

— Знойдзем. Вунь ферма ў Папоўцы — дзірка на дзірцы.

— Паглядзець трэба, што за ферма.

— Была б ахвота. Пойдзем хоць цяпер — пакажу.

— А можа, вечарам?

— Давай вечарам. А то і мне няма калі: у Вазнясенскае трэба, малатарню прымаць... А калі вечарам? — спыталася Луша і зноў пачырванела.

— Гадзін прыкладна ў сем.

— Давай у сем,— паспешна згадзілася яна, разгублена адчуваючы, што дзелавая размова, незалежна ад яе волі, ператвараецца ў прызначэнне спаткання.

— Да цябе зайсці? — спытаўся Сашка.

— Навошта да мяне? — Луша строга ссунула бровы.— Я тут буду, у праўленні.

— Як хочаш,— згадзіўся Сашка.

— А то давай так: выходзь на развілак і чакай. Я напрасткі пайду з Вазнясенскага ў Папоўку. На развілку і сустрэнемся. Нашто мне сюды заходзіць?

— Што за развілак?

— Ці ты не ведаеш? Дзе лес гарэў.

— Добра. Развілак дык развілак,— сказаў Сашка і, адыходзячы, дадаў: — Толькі без спазнення. У сем дык у сем.

У Лушы гарэлі шчокі. Схіліўшыся над паперамі, яна агледзелася па баках, сілячыся ўгадаць, ці зразумеў хто патаемны сэнс яе гаворкі. Стары бухгалтар засяроджана запаўняў ведамасць, а дзяўчына-справавод, павярнуўшыся да акна, налівала чарніла з бутэлькі ў чарніліцу, і твару яе не было відаць.

— Будуць званіць — я ў Вазнясенскім,— сказала Луша і выйшла.

І калі яна праходзіла паўз акно, ёй здалося, што дзяўчына смяецца.

Да Вазнясенскага было кіламетраў з пяць. Луша ішла лясной дарогай. Высока ў небе вісела маленькае сонца. Бялявыя бярозкі-сястрычкі раслі парамі, з аднаго кораня, і ў іхняй чыстай зеляніне, быццам ранняя сівізна, пракідаліся цвёрдыя жоўтыя лісцікі. Луша дайшла да развілка, таго самага, дзе праз чатыры гадзіны была прызначана сустрэча з Сашкам. Тут дарога раздвойвалася: налева — на Папоўку, направа — на Вазнясенскае. Вакол тырчалі чорныя пні, абгарэлыя ствалы бяроз і асінак. І толькі астраўкі маладога падлеску ажыўлялі гэтую глухую, сумную мясціну. «Што тут адбудзецца праз чатыры гадзіны? — падумала Луша, і сэрца яе сціснулася.— Можа, не прыходзіць? Можа, хай застаецца па-ранейшаму — без радасці, затое і без гора. А прыйду — не саўладаю з сабой... Вось і глядзі сама, як лепей».

Лес кончыўся. Адкрылася шырокае поле, свежае ржышча, прысадзістыя мэндлікі жыта, хмары вераб'ёў над імі. На ржышчы, як на далоні, яна ўбачыла ўсе агрэхі сеўбітаў, а вераб'і не горш за аграномаў папярэджвалі, што зерне асыпаецца — даўно пара малаціць. Іншым разам Луша заўважыла б гэта і ўстрывожылася б, але цяпер ішла, нічога не бачачы, і паўтарала сама сабе: «Вось і глядзі сама, як лепей».

Ржышча скончылася, пачалася канюшына, потым зноў іржышча; паказаліся дахі Вазнясенскага, а Луша так і не вырашыла, што лепей.

Яна здалёк заўважыла, што малатарні яшчэ няма.

— Ды што яны, ачмурэлі? — сказала яна ўголас і паскорыла хаду.

Калгаснікі-малацьбіты сядзелі. Рабіць не было чаго: месца пад малатарню падрыхтавана, квадратная пляцоўка ачышчана ад дзёрну, вага прывезена.

— Калі Насцька гэтак будзе перабіраць,— чуўся прапізлівы Кацярынін голас,— дык у дзеўках і астанецца.

— Трэба прыглядзецца,— пярэчыў нехта.— Вунь Васіліса выскачыла замуж. А што за мужык? Сівы, як месяц,— свеціць, а не грэе.

— Які ні ёсць, а ўсё ж муж. Дзешавейшага за мужаў хлеб не знойдзеш.

Ішла звычайная жаночая гаворка. Абмяркоўвалі, ці варта Насці выходзіць за Сашку, абмяркоўвалі горача, быццам гэта толькі ад іх залежала.

Іншы на Лушыным месцы сарваў бы злосць на першым, хто трапіў пад руку. «Чый жа хлеб — ваш ці не ваш? Ноччу дождж паліе — усё прападзе! Прыйшлі б, сказалі, што малатарні няма, чым языкамі мянціць». Але яна нічым не выдала свайго хвалявання, папыталася толькі, ці не праязджаў машынавед, ці не было эмтээсаўскага начальства. Сказалі, што не было.

І Луша пайшла назад, па дарозе рэпеціруючы суровую тэлефонную размову з дырэктарам МТС. Пра спатканне, прызначанае на сем гадзін, яна зусім забылася і толькі каля развілка на хвіліну ўспомніла Сашку, дзяўчыну, якая смяялася за акном, падзівілася з сваіх нядаўніх душэўных пакут і сказала ўголас:

— Бяда не тое, што яна смяялася. Бяда, што ты, даражэнькая, з сябе не смяешся.

Яна вырашыла паведаміць Сашку, што сёння ёй няма калі. Хай прыходзіць у Папоўку заўтра, фермач усё раскажа. «А можна і не паведамляць,— падумала Луша.— Хай прагуляецца. Пасядзіць, пасядзіць і вернецца. Мо ваўкі не з'ядуць».

Каля праўлення стаяў эмтээсаўскі «газік».

Луша ўвайшла ў кантору, убачыла Піліпа Васільевіча і разышлася. Што гэта такое? Прыязджаюць кожны дзень, лаюць, папракаюць, а каб памагчы — дык і няма нікога. Хлеб малаціць трэба — а чым малаціць? Як дзяды — цапамі? Суседняму калгасу яшчэ вунь калі малатарню прыгналі: там старшыня — мужык, яго не абдурыш, а тут жанчына — значыць, калгас пакрыўдзіць можна. З раніцы абяцалі малатарню, вось ужо шостая гадзіна —

а яе няма. Брыгада цэлы дзень лайдачыць. Што гэта такое?

Піліп Васільевіч сядзеў за Лушчыным сталом, пад ходзікамі, і цярпліва слухаў. Калі яна скончыла, ён растлумачыў, што ў суседнім калгасе зацягнулі малацьбу і цяпер дамалочваюць апошнія цэнтнеры. Ён толькі што быў там і загадаў, каб агрэгат, самае позняе, праз гадзіну быў перакінуты ў Вазнясенскае. Потым ён выняў зацухмоленую запісную кніжку, знайшоў таблічку і пачаў папракаць Лушу за марудную вывазку зерня на элеватар.

— І вам не сорамна? — сказала Луша.— Малатарні не далі, а зерне патрабуеце.

— Я ж вас інфармаваў, што малатарня праз гадзіну будзе,— адказваў Піліп Васільевіч.— А графік трэба наганяць. Давядзецца вам мабілізавацца і ўдвая павялічыць вывазку.

Ходзікі паказвалі палову сёмай. Сашка, мабыць, ужо збіраецца.

— Машыны штодня возяць, а больш у нас транспарту няма. На веласіпедзе не павязеш,— сказала Луша.

Піліп Васільевіч падлічыў адлегласць і цэнтнеры, і яго здзівіла, што машыны робяць вельмі мала рэйсаў. Ён выняў карту, пачаў глядзець маршрут. Машыны пятлялі праз Папоўку, і рэйс павялічваўся ці не на дзесяць кіламетраў. Піліп Васільевіч папытаўся, чаму не карыстаюцца простай дарогай.

— А вы б самі разок праехалі той дарогай,— сказала Луша.— Там ніводнага жывога мастка няма.

На ходзіках было без пятнаццаці сем. Сашка, мабыць, ужо ідзе на развілак. «Ехаў бы ты хутчэй»,— падумала Луша пра інжынера.

Але Піліп Васільевіч распачаў выхаваўчую размову пра старшынь калгасаў, якія загадзя не думаюць пра восень і не рамантуюць дарог. Мабыць, у яго было шмат вольнага часу.

— А хто будзе рамантаваць? — абарвала яго Луша.— Нашы бабы яшчэ не навучыліся масты ставіць, а мужыкоў-цесляроў у нас няма. І потым, прабачце, Піліп Васільевіч, мне няма калі.

Яна развіталася са здзіўленым інжынерам і выбегла на двор. Было без дзесяці сем.

«Куды гэта я?» — падумала Луша, каб хоць на хвіліну ашукаць сябе.

Яна шпарка ішла паўз вёску, і яе твар быў прыгожы і злосны.

На дарозе яе перапыніла Насця.

— Чаго табе? — спыталася Луша, не сцішаючы хады.

— Зноў статак на балоціну пагналі. Там адна асака. Яе пасоліш — і то ледзь каровы ядуць, а так і зусім не ядуць. З такой пастаў ці план надоіш?

— Бяры каня, давай да пастухоў. Скажы, каб перагналі. А ў Вазнясенскім паглядзі, ці не прыйшла малатарня.

— А ты куды, цётка Луша?

— Якая я табе цётка? Сказана — і давай!

Насця адстала.

Луша выйшла за сяло і накіравалася да лесу. Сонца садзілася. Было яно ўдвая большае, як днём, і залівала нябёсы халодным малінавым святлом. Аціхлы лес чакаў ночы. З'езджаная дарога ішла пад гару, і ісці было непрыемна — лёгка, быццам нехта супраць волі гнаў наперад і наперад. І Луша ляцела, усёй сваёй істотай адчуваючы гідкую лёгкасць, і на душы ў яе было нявесела.

«Ды што ж такое, на самай справе? — узлавалася яна.— Ці я рабая? Ці не маю права душу сваю адагрэць? Дзесяць гадоў цягну такую гаспадарку, не наем як след, не насплю, два разы на дзень праз тры вёскі па крузе лётаю».

«А што з таго? — пярэчыў ёй нейкі ўнутраны голас.— Каб жа ты калгас у перадавыя вывела, тады справа іншая. Тады б і мужыкоў наехала, і ад жаніхоў адбою не было б. А пакуль, за дзесяць гадоў, толькі Гаўрылавы вярнуліся. Адзін хлопец прыехаў, і таго хочаш да рук прыбраць. А ты старшыня, ты адказваеш за ўсё. І за хамуты, і за разбураныя печы, і за тое, што мужыкоў мала. Перад усімі жанчынамі адказваеш: і перад Кацярынай, і перад Насцяй. Глядзі. Не пахваляць цябе бабы. Цябе паставілі пра людзей дбаць».

«А пра сябе калі!» — амаль не крыкнула Луша. Пачынаўся гарэлы лес, і развілак быў блізка.

Праз хвіліну яна ўбачыла Сашку. Ён сядзеў на пяньку спіной да дарогі і забаўляўся галінкай. Лушы чамусьці ўспомнілася Кацярыніна песенька: «Аб пянёчак дубцом стук — тут і з'явіцца дзяцюк», яна паморшчылася і спынілася.

Сашка яе не заўважаў.

«Зараз падыду,— ліхаманкава думала Луша,— а ён

папытаецца: «Ну, куды поідзем?» — і зірне на мяне шматзначна, як тады ў канторы... А я спакойна скажу: «Ці ў цябе памяць адбіла? Ферму паглядзім — і дадому». І ўсё... І ўсё... І каб ніякага глупства».

Яна сышла з дарогі і спынілася перад ім.

— Чаго позніўся? — спытаўся Сашка.

Яна стаяла моўчкі, апусціўшы галаву.

— А я ўжо дадому сабраўся.

Яна ўсё стаяла, не падымаючы вачэй.

— Дык поідзем, ці што...— сказаў Сашка.— Паглядзім хутчэй, ды мне назад трэба. Бацька сёння імяніны спраўляе.

Ён падняўся, абтрос штаны і пайшоў, забаўляючыся дубчыкам.

І раптам Луша зразумела, што ён і не думаў ні пра якае спатканне, ды і не ведаў, відаць, што тут калгасныя дзяўчаты сустракаюцца з кавалерамі. Проста чалавек сабраўся глядзець ферму разам са старшынёй калгаса — і ўсё. А танцы ў Кацярыны і чаяванне — дурнота падпітага хлопца, на якую даўным-даўно трэба забыцца гэтак сама моцна, як забыўся Сашка, а не строіць на такой драбязе бабскія фантазіі.

Паказваючы дарогу, Луша моўчкі прайшла лес і накіравалася ў Папоўку нацянькі, палянай.

Блякнуць над восень вясковыя палянкі. Летам яны шчодра аздоблены кветкамі — чырвонымі, бірузовымі, белымі, і густое, цяжкае ад мядовых пахаў паветра нерухома стаіць над зямлёй. А цяпер усё патухае: і кветкі, і трава. Зрэдку дзе-нідзе задуменна нахіляе пакамечаныя галоўкі бледна-блакітны, быццам злінялы за лета, званочак, хаваецца ў цяньку малепечкая, сарамлівая незабудка ды адцвітаюць бела-ружовыя, брудпаватыя кашкі, напаўняючы вечаровае паветра ледзь чутным развітальным пахам.

На ферме нікога не было. Луша ўвайшла ўслед за Сашкам і пачала тлумачыць, што трэба зрабіць брыгадзе будаўнікоў. Яна паказала, дзе перакласці падлогу, дзе паправіць шыбы, сказала, што трэба дадаць выцяжных стаякоў, бо кожная карова выпарвае дзесяць кілаграмаў вады за суткі і зімою стаіць такі туман, што нічога не відаць.

— У вас тут за год усяго не пераробіш. У эмтээсе, мабыць, лягчэй,— заўважыў Сашка.

А яна гаварыла, гаварыла, і на вачах у яе стаялі слёзы. Было цёмна, і яна думала, што Сашка не заўважыць.

Але ён заўважыў. Ён узяў яе пад руку і павёў да акна, бліжэй да святла.

— Чаго ты? — спытаўся ён.

Яна не адказвала.

— Лушачка, чаго ты? — спалохана паўтарыў ён.

Луша працяжна ўздыхнула і схіліла галаву на Сашкава плячо. Ён, азадачаны, абдымаў яе і адчуваў, як уся яна, з галавы да ног, уздрыгвала ад ціхага плачу. Было ціха, толькі недзе, далёка-далёка ў лесе, чуўся тупы рытмічны стук, падобны на цюканне сякеры.

— Думаеш, я сапраўды ў эмтээс падамся? — гаварыў Сашка.— Гэта я так. Не пайду я ў эмтээс.

Гук набліжаўся. Стала ясна, што скача конь. Луша адхінулася да сцяны. Конь затупаў побач, пачуўся голас: «Стой, нячысцік!» — і ў варотах паявілася Насця.

— Цётка Луша! — крыкнула яна ў цемнату.

— Ну, чаго табе зноў? — спыталася Луша ненатуральна спакойна, быццам у канторы, калі яе адрывалі ад справы.

— У Вазнясенскім вазоў не хапае. Снапы да малатарні не паспяваем падвозіць. Машынавед сварыцца.

— Я зараз.— Луша насуха, да болю, выцерла вочы і шчокі, як найтужэй завязала хустку і выйшла.— Там Сашка,— сказала яна.— Растлумач яму, што рабіць. Ты даярка, твой і клопат.

Насця стаяла ў нерашучасці.

— Ідзі, не бойся. Ён толькі строіць з сябе. А хлопец надзейны.

Луша ўскочыла ў сядло і кранула каня абцасамі. Конь захроп і памчаўся напрасткі па паляне, прыбіваючы да зямлі рэдкія кашкі і званочкі.

*1956*

## Сяргей Варонін

# РАСКАЗ ПРА КАХАННЕ

Нас было трое: Ларка Колабаў, Косця Марозаў і я. Калі гаварыць, хто з нас траіх прыгажэйшы, дык нам з Ларкам і раўняцца не было чаго да Марозава. Вельмі прыгожы ён быў. На цэлую галаву вышэйшы за нас, зграбны, з блакітнымі, як у дзяўчыны, вачамі і самаўпэўнены, як чэмпіён. Ларка Колабаў з твару быў так сабе, але сэрца меў незвычайнае: усё аддасць, каб толькі памагчы другім, а сам заставаўся ў цяні. Што ж да мяне, дык у вачах дзяўчат я прайграваў побач з Косцем, хоць параўнанне з Ларкам было на маю карысць.

Ніпто не перашкаджала нам сябраваць. Мы любілі спорт: зімою — лыжы, улетку — футбол; любілі вечары ў нашым заводскім клубе, любілі сваю школу пры заводзе, свае станкі, на якіх шмат перапсавалі металу, перш чым навучыліся такарыць...

Аднойчы, гэтак ужо водзіцца, сустрэлася нам дзяўчына. Паліна яе звалі. І да яе мы бачылі дзяўчат, але іх і блізка да Паліны не паставіш. Гэта ўсё роўна што раўняць прыгажуна Косцю з маленькім Ларкам. Паліна толькі што паступіла ў вучылішча, дзе мы былі ўжо трэці год. А праўда ж, хараства словамі не выкажаш, усё адступае перад хараством! Нават Косця, гэты самаўпэўнены дзяцюк, якому скочыць з парголаўскага трампліна — звычайная драбніца, і той збянтэжыўся, калі Паліна, ледзь-ледзь усміхнуўшыся, паглядзела на яго.

Толькі пасля, як яна прайшла паўз нас, ён апамятаўся.

А я адчуў, што ў мяне ў сэрцы з'явіўся светлы куточак, куды ўвайшла гэтая дзяўчына і надоўга там засталася.

Якіх толькі думак не перадумалася! І ўсё пра яе! Адна мара была святлейшая за другую. І ўсё пра яе! У такім святочным настроі нічога не значыла мне прайсці пасля работы пехатою ад «Чырвонага выбаржца» да вуліцы Дзекабрыстаў — паўз Няву, цераз Няву, па Марсавым полі, па доўгай вуліцы Пляханава... І ўсё думаць пра Паліну, у

думках размаўляць з ёю, жартаваць, смяяцца. Уяўляць, што я прыгожы, смелы, што мяне кахаюць...

А сапраўды я не адважваўся і загаварыць з ёю. Толькі з-за свайго станка моўчкі паглядаў у далёкі куток цэха, дзе яна працавала. Часам падыходзіў да яе сяброўкі, непрыгожай дзяўчыны. З тою мне лёгка было гаварыць пра што хочаш. Аднекуль і словы браліся, і жарты. Непрыгожая сяброўка смяялася, і я быў вельмі рады, калі Паліна глядзела на нас. «Няхай ведае, што не гэтакі ўжо я нядарэка,— было ў мяне ў галаве.— Калі ўздумаю, дык і з ёю магу таксама пажартаваць і пасмяяцца...»

Аднойчы ў нашым клубе ішоў спектакль. Мы, вядома, сядзелі ў розных месцах. Яна каля акна, а я каля другой сцяны. Што ўжо там ішло па сцэне, не памятаю. Ды і нецікава мне гэта было. Не цярпелася паглядзець на Паліну, і як толькі пачаўся антракт, я ўсхапіўся з месца і знайшоў яе позіркам. У тую ж хвіліну яна ўстала, паглядзела на мяне. Так — цераз усю залу — мы і глядзелі адно на адно, пакуль зноў не патухла святло. Тое ж самае было і ў другім антракце, і ў наступных, пакуль не скончыўся спектакль. Што магло быць прасцей — падысці да яе, але мне і так было добра. Далібог, я нават не ведаю, ці заўважаў маё каханне Косця. Я не думаў тады і пра Ларку.

І яшчэ не ведаю, як гэта атрымалася, але Паліну накіравалі да мяне ў вучаніцы. Я ажно замёр ад шчасця, калі пачуў пра гэта ад старога майстра Васіля Пятровіча, сухлявенькага старога з мушкецёрскімі вусамі і бародкай.

І вось Паліна прыйшла да мяне. Я пусціў станок на самую шалёную хуткасць — латунь пад разцом завыла сірэнай, дробныя стружкі, як з брандспойта, паляцелі ўздоўж майстэрні. Маё сэрца гатова было выскачыць ад захаплення. «Паліна тут! Са мною! Поруч!» Але мне страшна было на яе глядзець, і я ўсё ніжэй схіляў галаву над станком.

— Ты, можа, растлумачыш мне што-небудзь?

Мне вельмі цяжка было размаўляць з ёю, і гаворка была толькі пра справу, нічога лішняга. Яна вельмі ўважліва слухала, не спускаючы з мяне вялікіх цёмна-карых вачэй, і глыбока ў іх мільгацелі залацістыя зрачкі. Ад гэтых зрачак я нямеў і адварочваўся. Цэлыя гадзіны мог я глядзець на яе рукі, на тое, як яна працуе, і маўчаць. А як канчалася змена, першы выбягаў з цэха, з прахадной, і чакаў на вуліцы, каб потым здалёку сачыць за ёю.

Усё гэта скончылася дрэнна. У адзін дзень я даведаўся, што да яе заляцаецца Косця. Адчуў яшчэ і тое, што Палі-

па пачала глядзець на мяне абыякава. І тады зразумеў, што мяне абмінула каханне.

Было вельмі цяжка, на Косцю я глядзець не мог. Цяпер усе мае думкі круціліся вакол таго, каб прымусіць Паліну схіліцца да мяне. Я прыдумляў шмат планаў, ажно да выкрадання. Але, як і заўсёды, гэта былі толькі мары. На справе я не мог ні на што адважыцца і ўсё часцей адкрываў душу Ларку, а той, як пасля я зразумеў, таксама яе кахаў, ды нават і думаць не пасмеў, каб змагацца за сваё каханне.

Гэтак мінуў год. Вучобу мы скончылі, надышлі канікулы. А як прайшлі яны, вестка, што Косця ажаніўся з Палінай, зусім у роспач увагнала мяне. Потым пачалася вайна з Фінляндыяй, і сярод першых добраахвотнікаў я з лыжным батальёнам пайшоў на фронт. Суровая была гэта маленькая вайна. Усе памятаюць, якія тады стаялі маразы: пагінулі сады, а раненыя замярзалі на снезе за тры хвіліны. Пасталеў я на гэтай вайне, шмат-чаму навучыўся і шмат чаго зразумеў. Але ў сэрцы па-ранейшаму жыла Паліна. Толькі пачуццё неяк аддалілася і ўжо здалёку саграла мяне цеплынёй любага юнацтва — чагосьці незваротнага, нейкіх надзей.

Вярнуўшыся з вайны, я паступіў на другі завод і неўзабаве даведаўся, што Косця кінуў Паліну. Шмат пазней я спаткаў Ларку Колабава. Ён расказаў, што сустракаецца з Палінай, па-ранейшаму кахае яе.

Мінула яшчэ пятнаццаць гадоў. І вось я зноў сустрэўся з ёю. Але не тая, што жыла ўсе гады ў маім сэрцы, а другая — пажылая жанчына, якая пабачыла за жыццё столькі, колькі і я, а можа, і яшчэ болей,— стаяла перада мной. Яна смяялася ад радасці, што мы сустрэліся. Я глядзеў ёй у вочы, яны былі гэтакія самыя вялікія, цёмна-карыя, але глыбока ў іх ужо не мільгацелі зорачкі; бачыў і яе вусны, але не тыя крамяныя, а ўсе ў тоненькіх зморшчынках, і твар яе нібы заслаўся смугой многіх гадоў. І ўсё роўна гэта была Паліна.

Зусім не зважаючы, што наўкол ходзяць людзі, мы — двое пажылых — паводзілі сябе як падлеткі, стаялі пасярод Неўскага, трымаліся за рукі і, перабіваючы адно аднаго, расказвалі ўсё тое, што калісьці таілі ў сабе, пра што трэба было гаварыць тады, а не цяпер. Успомнілі і той клубны вечар, калі я, як паплавок, выскачыў з радоў, і тыя самыя дарагія ў маім жыцці дні, калі яна, схіліўшы галаву, уважліва слухала, як я вучыў яе. Успомнілі нават

тое, як я праводзіў яе, ідучы непадалёк. Яна гэта, аказваецца, таксама ведала. Яна кахала мяне і да гэтага часу ўспамінала, усё шкадавала, што гэтак нядобра ў нас склалася каханне.

Цяпер мы ўжо гаварылі пра ўсё не саромеючыся, нібы мінулыя гады далі нам права нічога не таіць.

Косцю яна не кахала і яго заляцанні прымала толькі таму, што хацела раздражніць мяне, каб я быў смялейшы. А павярнулася ўсё іначай. Ларка Колабаў яе кахаў. Гэтак кахаў, што яна магла быць шчаслівая. У яго ж было вельмі добрае сэрца. І ўсё роўна тое не перашкаджала ёй памятаць мяне, яна ўвесь час жыла надзеяй, што калі-небудзь мы абавязкова сустрэнемся. І мы сустрэліся.

У яе жыцці шмат было горкага. Яна ледзь перажыла блакаду, страціла ўсіх родных. Ларка — любы, добры таварыш — загінуў у вайну. Загінуў па-геройску. Але гэта ўсё было... Усё ў мінулым.

— Ты абавязкова павінен прыйсці да мяне,— сказала яна і на кавалачку газеты напісала свой адрас.

І вось я ў яе. За акном дождж. Відно, як на вуліцы ў святле ліхтара паласуе касы дождж. Часам налятае вецер, і яго пасмы ледзь не плазам падаюць на брук. Позні вечар. У пакоі ўтульна і строга. Усе рэчы патрэбныя — стол, шафа, буфет, ложак, кушэтка і некалькі крэслаў.

— Дык ты і не ажаніўся? — пытаецца Паліна.

— Не, не ажаніўся...

Яна сядзіць побач са мной на кушэтцы, падагнуўшы пад сябе ногі. Цяпер мы ўжо гаворым спакайней, гаворым у роздуме, як вельмі блізкія людзі. Шчыра кажучы, мы заўсёды былі блізкія адно аднаму, і толькі штосьці перашкаджала нам. А цяпер ужо нішто не перашкаджае. Але тут нейкае новае пачуццё прымушае мяне паглядзець на гадзіннік і ўстаць.

— Ну куды ты пойдзеш? — Яна зірнула ў акно.— На двары дождж...

І сапраўды, навошта мне ісці адсюль? Цяпер я дома. Усё, аб чым марыў,— збылося. І раптам сэрца апаноўвае туга: чаму ж гэтак усё атрымалася ў нас? Чаму не зрабіліся мы гаспадарамі свайго жыцця? Чаму мая нясмеласць перамагла каханне? Чаму яе капрыз перамог каханне? Чаму мы гэтак дрэнна абышліся з нашым шчасцем? І мне робіцца нясцерпна шкада і сябе і Паліны, але, каб зберагчы той светлы маленькі куточак у сэрцы, які саграваў мяне, усяляў добрую веру ў чалавека, я пайшоў...

*1957*

# Юрый Казакоў

## АРКТУР — ГОНЧЫ САБАКА

*Памяці М. М. Прышвіна*

### 1

Як з'явіўся ён у горадзе — невядома. Ён прыйшоў аднекуль вясною і застаўся жыць. Ён нікому не назаляў, ні за кім не ўвязваўся і нікому не падпарадкоўваўся — ён быў вольны.

Гаварылі, што яго пакінулі цыганы, якія былі праездам увесну. Дзіўны народ цыганы! Напрадвесні яны выбіраюцца ў дарогу. Адны едуць цягнікамі, другія параходамі, трэція цягнуцца па дарогах на вазах, непрыязна пазіраючы на машыны, якія пралятаюць міма. Людзі паўднёвае крыві, яны дабіраюцца да самых далёкіх паўночных куткоў. Нечакана спыняюцца табарам каля горада, некалькі дзён таўкуцца на базары, мацаюць рэчы, таргуюцца, ходзяць па хатах, гадаюць, крычаць, сварацца, смяюцца — смуглыя, прыгожыя, з завушніцамі, страката адзетыя. Але вось пакідаюць яны горад, знікаюць гэтак жа нечакана, як і з'явіліся, і ўжо болей ніколі не ўгледзець іх тут. Прыйдуць іншыя, але гэтых не будзе. Свет прасторны, а яны не любяць прыходзіць на тыя мясціны, дзе ўжо былі аднойчы.

Такім чынам, многія былі перакананы, што яго пакінулі вясною цыганы.

Другія гаварылі, што ён прыплыў на крызе ў веснавую паводку. Ён стаяў чорны сярод бела-блакітнае крышаніны, адзін нерухомы сярод агульнага руху. А высока ляцелі лебедзі і крычалі: «Клінк-кланк!»

Людзі заўсёды хвалюючыся чакаюць лебедзяў. І калі яны прылятаюць, калі досвіткам уздымаюцца з разліваў са сваім вялікім вясновым клічам «клінк-кланк!» — людзі праводзяць іх позіркамі, кроў пачынае звінець у іхніх сэрцах, і тады яны ведаюць, што прыйшла вясна.

З шоргатам, глуха лопаючыся, ішоў па рацэ лёд, клікалі лебедзі, а ён стаяў на льдзіне, паддзіспуўшы хвост, насцярожаны, няўпэўнены, прынюхваючыся і прыслухоў-

ваючыся да таго, што рабілася навокал. Калі льдзіна падышла да берага, ён захваляваўся, няўдала скочыў, трапіў у ваду, але хутка выбраўся на бераг і, атросшыся, знік між штабялёў лесу.

Так ці інакш, але, з'явіўшыся вясною, калі дні напоўнены сонечным зіхаценнем, звонам ручаёў і пахам кары, ён застаўся жыць у горадзе.

Пра яго мінулае можна было толькі здагадвацца. Мабыць, нарадзіўся ён недзе пад ганкам, на саломе. Маці яго, чыстакроўная сука з пароды кастрамскіх ганчакоў, нізкая, з доўгім тулавам, з вялікім жыватом, калі прыйшла пара, знікла пад ганкам, каб зрабіць сваю вялікую работу патаемна. Яе клікалі, яна не абзывалася і нічога не ела, уся засяроджаная на самой сабе, адчуваючы, што вось-вось павінна здзейсніцца тое, што важней за ўсё на свеце, важней за паляванне і за людзей — яе ўладароў і багоў.

Ён нарадзіўся, як і ўсе шчанюкі, сляпы, адразу ж быў аблізаны і пакладзены бліжэй да цёплага жывата, яшчэ балючага пасля родавых патуг. І пакуль ляжаў ён, прывыкаючы дыхаць, у яго ўсё прыбаўлялася братоў і сясцёр. Яны варушыліся, кракталі і спрабавалі скуголіць — гэтакія ж, як і ён, дымчатыя шчанюкі з голымі жыватамі і кароткімі дрыжачымі хвосцікамі. Хутка ўсё скончылася, усе знайшлі па саску і заціхлі — чулася толькі пасопванне, цмоканне і цяжкае дыханне маці. Так пачалося іх жыццё.

У свой час ва ўсіх шчанюкоў прарэзаліся вочкі, і яны з захапленнем даведаліся, што свет яшчэ большы, чым той, у якім яны жылі дасюль. У яго таксама расплюшчыліся вочы, але яму наканавана было ніколі не ўбачыць святла. Ён быў сляпы, бельмы тоўстаю сіваю плеўкаю закрывалі яго вочы. У яго, сляпога, пачалося горкае і цяжкае жыццё. Яно было б яшчэ больш жахлівае, каб ён мог асэнсаваць сваю слепату. Але ён не ведаў таго, што ён сляпы, яму не дадзена было ведаць пра гэта. Ён прымаў жыццё такім, якім яно выпала яму.

Неяк здарылася, што яго не ўтапілі і не забілі, што было б, вядома, спагадаю ў адносінах да бездапаможнага, не патрэбнага людзям шчанюка. Ён застаўся жыць, сцярпеў вялікія пакуты, якія раней часу загартавалі і зрабілі жорсткімі яго цела і душу.

У яго не было гаспадара, які б даў яму прытулак, карміў бы яго і клапаціўся, як пра сябра. Ён стаў бяздомным сабакам-валацугам, панурым, нязграбным і недаверлівым; у маці, якая выкарміла, хутка не стала цікаўнасці да яго

гэтак жа, як да яго братоў. Ён навучыўся выць, як воўк, доўга, змрочна і тужліва. Ён быў брудны, часта хварэў, гробся на сметніках ля сталовак, часта атрымліваў ногца і палкі па галаву, як і іншыя бяздомныя і галодныя сабакі.

Ён не мог хутка бегаць, ногі, яго дужыя ногі, выходзіла, не патрэбны былі яму. Увесь час здавалася, што ён бяжыць насустрач нечаму востраму і цвёрдаму. Калі ён грызся з другімі сабакамі — а грызся ён многа разоў за свой век,— ён не бачыў сваіго ворага, ён кусаў і кідаўся на шум дыхання, на гырчанне і віск, на шоргат зямлі пад лапамі ворага і часта кідаўся міма.

Невядома, якое імя дала яму маці пасля нараджэння,— маці, нават і сабачая, заўсёды ведае сваіх дзяцей па імёнах. А ў людзей ён не меў імя... Таксама невядома, ці застаўся б ён жыць у горадзе, ці пайшоў бы і здох недзе ў яры, тужліва молячыся сваіму сабачаму богу.

Але ў яго жыццё ўмяшаўся чалавек, і ўсё перамянілася.

## 2

Тым летам я жыў у маленькім паўночным гарадку. Горад быў на беразе рэчкі. Па рацэ плылі белыя параходы, мурзата-карычневыя баржы, доўгія плыты, мардастыя карбасы, з выквацанымі ў чорную смалу бартамі. Ля берага была прыстань, якая пахла пянькою, канатамі, гніллю і воблаю. На гэту прыстань рэдка хто выходзіў з параходаў, хіба толькі прыгарадныя калгаснікі ды панурыя камандзіровачныя ў шэрых плашчах — прыязджалі з вобласці на лесазавод.

Вакол горада на нізкіх пляскатых узгорках раскінуліся лясы, магутныя, некранутыя: лес на сплаў секлі ў вярхоўях ракі. Сярод лесу трапляліся лугавіны і глухія азёры з велічнымі старымі соснамі на берагах. Сосны ўвесь час ціхенька шумелі. Калі ж з Ледавітага акіяна дзьмуў халодны вільготны вецер, нагаляючы хмары,— сосны грозна гулі і кідалі шышкі, якія стукаліся аб зямлю.

Я меў пакойчык на ўскраіне, на гарышчы старога дома. Гаспадар мой, доктар, быў чалавек заняты, маўклівы. Некалі ў яго была вялікая сям'я. Але двух сыноў яго забіла на фронце, жонка памерла, дачка паехала ў Маскву, доктар жыў цяпер адзін і лячыў дзяцей. Было ў яго адно захапленне: любіў ён спяваць. Тоненькім фальцэтам ён выводзіў розныя арыі, заміраючы ад асалоды на высокіх

потах. У яго было тры пакоі, але ён рэдка заходзіў туды, абедаў і спаў па тэрасе, а ў пакоях было прыцемна, пахла пылам, аптэкаю і старымі шпалерамі.

Вокны майго пакоя глядзелі ў здзічэлы сад, які зарос парэчнікам, малиннікам, дзядоўнікам і крапіваю ўздоўж плота. Раніцаю за акном валтузіліся вераб'і, чародамі наляталі дразды кляваць парэчкі, доктар не праганяў іх і ягад не абіраў. На плот часам узляталі суседскія куры і певень. Певень моцна спяваў, выцягваючы ўгору шыю, трос хвастом і з цікавасцю зазіраў у сад. Нарэшце ён не мог вытрываць, злятаў уніз, следам ляцелі куры і, спяшаючыся, пачыналі грэбціся ля кустоў парэчак. Яшчэ ў сад заходзілі каты і, прытаіўшыся за лісцем дзядоўніку, сачылі за вераб'ямі.

Я жыў у горадзе ўжо два тыдні, але ніяк не мог прывыкнуць да ціхіх вулачак з драўлянымі тратуарамі, з парослаю між дошак травою, да рыпучых прыступак лесвіцы, да рэдкіх параходных гудкоў уначы.

Гэта быў незвычайны горад. Амаль усё лета стаялі ў ім белыя ночы. Набярэжная і вуліцы яго ціхія і задумлівыя. Уначы ля дамоў чуўся дробны стук — гэта ішлі з начное змены рэдкія рабочыя. Крокі і смех закаханых усю ноч чуліся тым, хто лёг спаць. Здавалася, што ў дамоў чуйныя сцены і што горад, прытаіўшыся, прыслухоўваецца да крокаў сваіх жыхароў.

Уначы наш сад пах парэчкамі і расою, з тэрасы чулася ціхае храпенне доктара. А на рацэ бубніў маторам катэр і спяваў гугнявым голасам: ду-дуу...

Аднойчы ў доме з'явіўся яшчэ адзін жыхар. Вось як гэта здарылася. Вяртаючыся неяк з дзяжурства, доктар убачыў сляпога сабаку. З абрыўкам вяроўкі на шыі ён сядзеў, уціснуўшыся між бярвення, і калаціўся. Доктар і раней некалькі разоў бачыў яго. Цяпер ён спыніўся, разгледзеў сабаку ўважліва, пацмокаў губамі, пасвістаў, потым узяў за вяроўку і пацягнуў сляпога дадому.

Дома доктар памыў яго цёплаю вадою з мылам і накарміў. Па прывычцы сабака ўздрыгваў, калі еў, і сціпаўся. Ён еў прагна, спяшаўся і давіўся. Лоб і вушы яго былі ў пабялелых рубцах.

— Ну, а зараз ідзі! — сказаў доктар, калі сабака паеўся, і падапхнуў яго з тэрасы.

Сабака ўпёрся і закалаціўся.

— Гм... — сказаў доктар і сеў у качалку. Надыходзіў вечар, неба пацямнела, але не патухала зусім. Загарэліся

самыя вялікія зоркі. Гончы сабака лёг на тэрасе і задрамаў. Ён быў худы, тырчалі рабрыны, хрыбетнік быў востры, і востра выступалі лапаткі. Час ад часу ён расплюшчваў свае сляпыя вочы, натапырваў вушы і круціў у бакі галавою, прынюхваўся. Потым зноў клаў морду на лапы і заплюшчваў вочы.

А доктар разгублена глядзеў на яго, пакручваўся ў крэсле і думаў, як назваць яго. Ну, а як назваць? Ці лепей збавіцца ад яго, пакуль не позна? Навошта яму сабака! Доктар у задуменні паглядзеў удалечыню: нізка над небакраем зіхацела сінім бляскам вялікая зорка.

— Арктур... — прабубніў доктар.

Сабака насцярожыў вушы і расплюшчыў вочы.

— Арктур! — зноў сказаў доктар, і сэрца яго захвалявалася.

Сабака падняў галаву і няўпэўнена павіляў хвастом.

— Арктур! Ідзі сюды, Арктур! — ужо цвёрда, уладарна і радасна паклікаў доктар.

Сабака ўстаў, падышоў і асцярожна тыцнуўся носам у калені гаспадара. Доктар засмяяўся і паклаў яму руку на галаву.

Так у сляпога сабакі не стала назаўсёды таго, нявымаўленага імя, якім назвала яго маці, і з'явілася новае, дадзенае яму чалавекам.

Сабакі бываюць розныя, як і людзі. Ёсць сабакі жабракі, набірушкі, ёсць вольныя і панурыя валацугі, ёсць дурныя, заўсёды радасныя брахуны. Ёсць такія, што апусціліся і вымольваюць падачкі, падпаўзаюць да кожнага, хто толькі не свісне ім. Перасмыкаюцца, віляюць хвастом, нарабску мілыя, яны панічна вішчаць і кідаюцца прэч, калі ўдарыць альбо нават усяго замахнуцца.

Многа я бачыў сабак адданых, сабак пакорлівых, капрызных, ганарлівых, стоікаў і падліз, абыякавых, хітрых і бесталковых. Арктур не быў падобны ні на аднаго з іх. Яго пачуццё да свайго гаспадара было незвычайнае, узвышанае. Ён любіў яго страсна і паэтычна, магчыма, болей, чым жыццё. Але ён быў цнатлівы і рэдка дазваляў сабе быць пяшчотным да канца.

У гаспадара бываў часам дрэнны настрой, часам ён быў раўнадушны, часта ад яго непрыемна пахла адэкалонам. Але часцей за ўсё ён быў добры, і тады Арктур мучыўся ад любові, шэрсць на ім рабілася пушыстая, а цела быццам калола іголачкамі. Яму хацелася ўсхапіцца і памчац-

ца, захлёбваючыся ад радаснага брэху. Але ён стрымліваўся. Вушы яго апускаліся, спыняўся хвост, цела расслаблялася і замірала, толькі моцна і часта калацілася сэрца. Калі ж гаспадар пачынаў штурхаць яго, казытаць, гладзіць і смяяцца перарывістым галубіным смехам, што за асалода была тады! Гукі гаспадаровага голасу былі тады працяжныя і кароткія, булькатлівыя і шапаткія, яны былі падобны і на звон вады, і шэпт дрэў, і ні да чога не падобныя. Кожны гук параджаў нейкія іскры і невыразныя пахі, як кропля параджае хваляванне вады, а Арктуру здавалася, што гэта ўжо некалі было з ім, было так даўно, што ён цяпер ніяк не можа ўспомніць, дзе і калі. Хутчэй за ўсё гэтакае ж адчуванне шчасця было ў яго тады, калі ён сляпым шчанюком ссаў сваю маці.

## 3

У хуткім часе я меў магчымасць бліжэй пазнаёміцца з жыццём Арктура і ўведаць многа цікавага.

Мне здаецца цяпер, што ён неяк адчуваў сваю бяду, непаўнацэннасць. З выгляду ён быў зусім дарослы сабака з моцнымі нагамі, чорнаю спіною і рыжымі надпалінамі на жываце і на мордзе. Ён быў здаровы і вялікі на свой узрост, але ва ўсіх яго рухах адчувалася няўпэўненасць і напружанасць. І на яго мордзе, і ва ўсёй паставе была нейкая збянтэжаная запытальнасць. Ён добра ведаў, што ўсе жывыя істоты, якія акружаюць яго, вальнейшыя і імклівейшыя за яго. Яны хутка і ўпэўнена бегалі, лёгка і цвёрда ступалі, не спатыкаючыся і не натыкаючыся ні на што. Крокі іх па гуку адрозніваліся ад яго крокаў. Сам ён хадзіў асцярожна, заўсёды паволі і крышку бокам. Часта шматлікія рэчы станавіліся папярок яго дарогі. А між тым куры, галубы, сабакі і вераб'і, каты і людзі і многа астатніх жывёлін смела ўзбягалі па прыступках, пераскоквалі цераз канавы, закіроўвалі ў завулак, ляцелі, знікалі ў такіх мясцінах, пра якія ён і ведаць не ведаў. Яго ж доляй была няўпэўненасць і насцярожанасць. Я ніколі не бачыў, каб ён ішоў ці бег вольна, спакойна і хутка. Хіба толькі па шырокай дарозе, па лузе ды на тэрасе нашага дома... Але калі людзі і жывёліны былі зразумелы яму, і ён, магчыма, атаясамліваў сябе з імі, то аўтамабілі, трактары, матацыклы і веласіпеды былі незразумелыя яму і страшныя. Параходы і катэры спачатку абуджалі вялікую яго цікавасць. І толькі зразумеўшы, што яму ніколі не

разгадаць гэтую таямніцу, ён перастаў зважаць на іх. Гэтаксама не цікавілі яго ніколі і самалёты.

Але хоць ён не мог нічога ўбачыць, затое нюхам не мог з ім зраўняцца ніводзін сабака. Пакрысе ён вывучыў усе пахі ў горадзе і цудоўна арыентаваўся ў ім. Не было таго, каб ён заблудзіўся і не знайшоў дарогі дадому. Кожная рэч пахла! Пахаў было многа, і ўсе яны гучалі, усе давалі чуць пра сябе. Кожная рэч пахла па-свойму — адны непрыемна, другія ні то ні сё, трэція можна было нюхаць з асалодаю. Варта было Арктуру падняць галаву і панюхаць у той бок, адкуль павяваў вецер, ён адчуваў сметнікі і памыйнікі, дамы, цагляныя і з дрэва, платы і хлявы, людзей, коней і птушак так выразна, быццам бачыў усё гэта.

Быў на беразе рэчкі, за складамі, вялікі шэры камень, амаль цалкам урослы ў зямлю, які Арктур асабліва любіў абнюхваць. Камень сам пах нецікава, але ў яго порах і трэшчынках надоўга заставаліся самыя дзіўныя і нечаканыя пахі. Яны трымаліся доўга, здаралася, па цэлым тыдні, іх мог выдзьмуць толькі моцны вецер. Кожны раз, прабягаючы паўз гэты камень, Арктур закіроўваў да яго і доўга абследаваў. Ён фыркаў, хваляваўся, адыходзіў і зноў вяртаўся, каб высветліць яшчэ адну падрабязнасць.

І яшчэ ён чуў самыя кволыя гукі, якіх нам ніколі не пачуць. Ён прачынаўся ўночы, расплюшчваў вочы, настаўляў вушы і слухаў. Ён чуў усе шорахі на многа вёрст навокал. Ён чуў камарыную песню і гудзенне ў гняздзе ў восаў на гарышчы. Ён чуў, як шоргае ў садзе мыш і ціха ходзіць кот па даху хлява. І дом для яго не быў маўклівы і нежывы, як гэта здаецца нам. Дом таксама жыў: ён рыпеў, варушыўся, патрэскваў, уздрыгваў непрыкметна ад холаду. Па вадасцёкавай трубе сцякала раса і, збіраючыся ўнізе, падала на пляскаты камень рэдкімі кроплямі. Знізу чутно было ледзь улоўнае плюскатанне вады ў рацэ. Варушыўся тоўсты пласт бярвення ў запані каля лесазавода. Ціха парыпвалі ўключыны — нехта на лодцы пераплываў раку. І зусім далёка, у вёсцы, слаба крычалі пеўні ў хлявах. Гэта было жыццё, зусім не вядомае нам і нячутнае, але знаёмае і зразумелае яму.

І яшчэ адным быў ён адметны: ён ніколі не вішчаў і не скуголіў, напрошваючыся на шкадаванне, хоць жыццё было жорсткае да яго.

Аднойчы я ішоў па дарозе з горада. Цямнелася. Было цёпла і ціха, як бывае ў нас толькі спакойнымі летнімі адвячоркамі. Далёка на дарозе ўставаў пыл і чуваць было

мычанне, тонкія доўгія крыкі, ляскание пугі: з пашы гналі чараду.

Нечакана я заўважыў сабаку, які дзелавіта бег насустрач чарадзе. Па адметным, напружаным і няўпэўненым бегу я адразу пазнаў Арктура. Раней ён ніколі не бегаў за горад. «Куды ж ён бяжыць?» — падумаў я спачатку і заўважыў нечакана ў чарадзе, якая ўжо была блізка, незвычайнае хваляванне.

Каровы не любяць сабак. Страх і нянавісць да ваўкоў у кароў прыроджаныя. І вось, убачыўшы цёмнага сабаку, які бег насустрач, першыя рады адразу ж спыніліся. Тут жа наперад праціснуўся прыземісты падласы бык з кальцом у ноздры. Ён расставіў ногі, прыгнуў да зямлі рогі і зароў, ікаючы, дрыжучы скураю і выкаціўшы набеглыя крывёю бялкі.

— Грышка! — закрычаў нехта ззаду.— Бяжы хутчэй наперад, каровы ста-алі!

Арктур, ні пра чога не здагадваючыся, сваім нязграбным подбегам ужо зусім наблізіўся да чарады. Спалохаўшыся, я паклікаў яго. З разбегу ён прамчаўся яшчэ некалькі крокаў і раптоўна сеў, паварочваючыся да мяне. У тую ж секунду бык захроп, нечакана імкліва кінуўся на Арктура і хватануў яго на рогі. Чорны сілуэт сабакі мільгануў на фоне адвячоркавага неба і шлёпнуўся ў самую гушчыню кароў. Ад гэтага падзення, як ад бомбы, што разарвалася, каровы кінуліся ў бакі, храпучы і са стукам б'ючы рагамі аб рогі. Заднія напіралі на пярэдніх, усё перамяшалася, падняўся слупам пыл. Напружана і з болем чакаў я, што пачую перадсмяротны віск, але не пачуў і гуку.

Тым часам падбеглі пастухі, заляскалі пугамі, закрычалі на ўвесь голас, дарога расчысцілася, і я ўбачыў Арктура. Ён ляжаў у пыле і сам здаваўся кучаю пылу ці старою анучаю, якая кінута на дарозе. Потым ён заварушыўся, падняўся і, хістаючыся, закульгаў да абочыны. Старшы пастух заўважыў яго.

— Ах, с-сабака! — зларадна закрычаў ён, вылаяўся і вельмі моцна і спрытна сцебануў па Арктуру пугаю. Арктур не віскнуў, ён толькі здрыгануўся, павярнуў на імгненне да пастуха сляпыя вочы, дабраўся да канавы, спатыкнуўся і ўпаў.

Бык стаяў упоперак дарогі, капаў капытамі зямлю і роў. Пастух сцебануў і па ім гэтак жа спрытна і моцна, пасля чаго бык адразу супакоіўся. Супакоіліся і каровы,

і чарада паволі, падымаючы пыл, які пах малаком, і пакідаючы на дарозе «бліпцы», рушыла наперад.

Я падышоў да Арктура. Ён быў брудны і цяжка дыхаў, вываліўшы язык,— рэбры хадзілі хадуном пад скураю. На баках у яго былі нейкія мокрыя палосы. Аддушаная задняя лапа дрыжала. Я паклаў руку яму на галаву, загаварыў да яго, ён не адазваўся. Ва ўсёй яго істоце адчуваўся боль, неразуменне і крыўда. Ён не разумеў, за што яго тапталі і сцёбалі пугаю. Звычайна сабакі моцна скуголяць у такім выпадку. Арктур не скуголіў.

## 4

І ўсё ж Арктур так і застаўся б хатнім сабакам і, магчыма, растлусцеў бы напотым і разлепаваўся, калі б не шчаслівы выпадак, які прыдаў усяму яго далейшаму жыццю ўзвышаны і гераічны сэнс.

Здарылася гэта вось як. Я пайшоў раніцаю ў лес, паглядзець на развітальныя ўспышкі лета, за якімі, я ўжо ведаў, пачнецца хуткае адміранне. За мною ўвязаўся Арктур. Разоў колькі я праганяў яго. Ён садзіўся наводдаль, крыху чакаў і зноў бег за мною. Нарэшце мне надакучыла яго незразумелая ўпартасць, і я перастаў зважаць на яго.

Лес ашаламіў Арктура. Там, у горадзе, яму ўсё было вядомае. Там былі драўляныя тратуары, шырокія вуліцы, дошкі на беразе ракі, роўныя сцяжынкі. Тут жа з усіх бакоў падступаліся раптам да яго ўсё незнаёмыя рэчы: высокая, жорсткая ўжо трава, калючыя кусты, гнілыя пні, паваленыя дрэвы, пругкія маладыя елачкі, шаматкое апалае лісце. З усіх бакоў штосьці чапала, калолася, чапляла, быццам згаварыўшыся прагнаць яго з лесу. І потым — пахі, пахі! Колькі іх, невядомых, страшных, слабых і моцных, значэння якіх ён не ведаў! І Арктур, натыкаючыся на ўсе гэтыя пахучыя, шаматкія, траскучыя, калючыя рэчы, уздрыгваў, фукаў носам і прыціскаўся да маіх ног. Ён быў разгублены і напалоханы.

— Ах, Арктур! — ціхенька гаварыў я яму.— Бедны ты сабака! Не ведаеш ты, што на свеце ёсць яркае сонца, не ведаеш, якія зялёныя ўранку дрэвы і кусты і як ярка блішчыць на траве раса; не ведаеш, што вакол нас поўна кветак: белых, жоўтых, блакітных і чырвоных, і што між сівых яліп і жаўтлявае лістоты так пяшчотна чырванеюцца рабінавыя гронкі і ягады шыпшыны. Калі б ты бачыў

уночы месяц і зоркі, ты, магчыма, і пабрахаў бы на іх. Ды як жа табе ведаць, што коні, і сабакі, і каты — розных колераў, што платы бываюць карычневыя, і зялёныя, і звычайныя шэрыя, і як ярка гарыць у вокнах шкло ў часіну захаду, і якім вогненным морам разліваецца тады рака! Каб быў ты нармальны здаровы сабака, то быў бы гаспадар у цябе паляўнічым. Слухаў бы ты тады ранкамі магутную песню рога і дзікія галасы, якімі ніколі не крычаць звычайныя людзі. Ты гнаў бы тады звера, заходзячыся ад брэху, не памятаючы сябе, і гэтым пястрымным бегам ты служыў бы ўладыку-паляўнічаму, і вышэйшага за гэтую службу не было б нічога ў цябе. Ах, Арктур, няшчасны ты сабака!

Так ціхенька размаўляючы з ім, каб было яму не так страшна, я ішоў усё далей у лес. Арктур пакрысе аслухаўся і пачаў смялей абследаваць кусты і пні. Колькі новага і незвычайнага знаходзіў ён і ў якім быў захапленні! Цяпер, запалонены сваёй важнаю работаю, ён ужо не прыціскаўся да мяне. Зрэдку ён толькі прыпыняўся, пазіраў у мой бок мёртвымі белымі вачыма, прыслухоўваўся, каб упэўніцца, ці добра робіць ён, ці іду я за ім. Потым зноў пачынаў кружыць па лесе.

Хутка мы выйшлі на луг і пайшлі па зарасніку. Дзікае хваляванне ахапіла Арктура. Кусаючы траву, спатыкаючыся аб купіны, ён мільгаў між кустоў. Ён моцна дыхаў, лез напралом, не звяртаючы ўвагі ні на мяне, ні на калючыя галінкі. Нарэшце ён не вытрымаў, зажмурыўся, з трэскам сунуўся ў кусты, знік там, завалтузіўся, зафыркаў... «Некага пачуў!» — падумаў я і спыніўся.

— Гам! — звонка і няўпэўнена пачулася з кустоў.— Гам, гам!

— Арктур! — устрывожана абазваўся я.

Але ў гэты момант нешта здарылася. Арктур завішчаў і шумна рынуўся ў глыб кустоў. Выццё яго скора змянілася азартным брэхам, і па тым, як уздрыгвалі вяршыні кустоў, мне было відаць, дзе ён там прабіраецца. Спалохаўшыся за яго, я кінуўся напярэсцігі, пачаў клікаць. Але мой крык, мабыць, дадаваў яму толькі азарту. Спатыкаючыся, блытаючыся ў гушчарніку, я перабег цераз адну палянку, потым цераз другую, спусціўся ў лагчыну, выбег на чыстае месца і адразу ўбачыў Арктура. Ён выкаціўся з кустоў і мчаў проста на мяне. Яго было не пазнаць, бег ён смешна, высока падскокваючы, не так, як звычайна бегаюць сабакі, але гнаў упэўнена, азартна, брахаў не

нерастаючы, захлёбваючыся, зрываючыся на тонкі шчанячы голас.

— Арктур! — крыкнуў я.

Ён збіўся з ходу, я ўспеў падбегчы і ўхапіць яго за аброжак. Ён вырываўся, гыркаў, ледзь не ўкусіў мяне, вочы яго набеглі крывёю, і мне не так лёгка было супакоіць і забавіць яго. Ён быў выкачаны і паабдзіраны, хіліў левае вуха да зямлі: відаць, усё ж ударыўся разоў колькі, але такая вялікая была ў яго страсць, так быў ён узбуджаны, што і не адчуў гэтых удараў.

## 5

З гэтага дня яго жыццё пайшло іншым ладам. Зранку ён прападаў у лесе, уцякаў туды адзін і вяртаўся, бывала, толькі адвячоркам, а здаралася — і толькі на наступны дзень, паабіваны, з набеглымі крывёю вачыма. Ён вельмі падрос за гэты час, пабольшала грудзіна, абмацаваўся голас, лапы зрабіліся сухія і моцныя, як стальныя спружыны.

Як там ганяў ён адзін, як не разбіваўся, гэтага я не мог зразумець. Ён, мабыць, адчуваў усё ж, што ў яго адзінокіх паляваннях чагосьці не хапае. Магчыма, ён чакаў адабрэння, падтрымкі ад чалавека, што так неабходна кожнаму гончаму сабаку.

Я ні разу не бачыў, каб ён вярнуўся з лесу пад'еўшы. Яго бег, бег сляпога, нязграбнага сабакі, вядома ж, быў павольны і няўпэўнены. Лес быў яму маўклівым ворагам, лес біў яго, лупцаваў па мордзе, па вачах, лес кідаўся яму пад ногі, лес спыняў яго. Не, ніколі не даганяў ён сваіх ворагаў і не ўпіваўся ў іх зубамі! Толькі пах, дзікі, вечна хвалюючы, прываблівы, вечна невыносна-цудоўны і варожы пах — толькі і заставалася яму, толькі адзін след сярод тысяч вёў яго наперад і наперад.

Як знаходзіў ён дарогу дадому, ачуняўшы ад шалёнага бегу, ад вялікіх летуценняў? Якое адчуванне прасторы і тапаграфіі, які вялікі інстынкт патрэбен быў яму, каб, ачуняўшы, зусім знясіленаму, разбітаму, задыханаму, ахрыпламу недзе за многа кіламетраў у глухім лесе з шолахам травы і пахам з вільготных яроў дабрацца дадому!

Кожнаму гончаму сабаку патрэбна чалавечае адабрэнне. Сабака гоніць звера і забываецца пра ўсё, але нават у моманты самага вялікага азарту ён ведае, што дзесьці там, наперадзе, ахоплены гэтакім жа азартам, перабягае

ад лаза да лаза паляўнічы-гаспадар і што, калі прыйдзе час, яго стрэл вырашыць усё. У такія хвіліны голас гаспадара дзічэе і падахвочвае сабаку; ён таксама лазіць па кустах, бегае, хрыпла пацкоўвае, дапамагае сабаку разблытаць след. А калі скончана ўсё, гаспадар кідае сабаку пазанкі, глядзіць на яго дзікімі затуманенымі шчаслівымі вачыма, крычыць з захапленнем: «Ну, ты! Мі-ілы!»— і цярэбіць за вушы.

У гэтым сэнсе Арктур быў адзінокі і мучыўся. Любоў да гаспадара змагалася ў ім з паляўнічай страсцю. Некалькі разоў раніцаю я бачыў, як досвіткам Арктур вылазіў з-пад тэрасы, дзе любіў спаць, бегаў па садзе, садзіўся пад акном у доктара, пачынаў чакаць, пакуль той прачнецца. Так ён рабіў заўсёды і раней, і калі доктар, прачнуўшыся ў гуморы, вызіраў з акна і клікаў: «Арктур!» — што тады вытвараў гэты сабака! Урачыста ён падыходзіў да самага акна, задзіраў угару галаву і пахістваўся, перадступаючы з лапы на лапу. Потым ён улазіў у дом, там пачыналася валтузня, чуліся шчаслівыя гукі, доктаравы арыі і тупаценне ў пакоях.

Ён і цяпер чакаў, пакуль прачнецца доктар. Але цяпер нешта іншае турбавала яго. Ён нервова ўздрыгваў, абтрасаўся, чухаўся, пазіраў угору, уставаў, ізноў садзіўся і пачынаў ціхенька скуголіць. Потым пачынаў бегаць ля тэрасы, робячы ўсё большыя і большыя кругі, зноў садзіўся пад акно, нават коратка пабрэхваў ад нецярпення і, насцярожыўшы вушы, нахіляў галаву то ў адзін, то ў другі бок, доўга прыслухоўваўся. Нарэшце ён уставаў, нервова пацягваўся, хаўкаў, кіраваў да плота і рашуча вылазіў праз дзірку. Крыху счакаўшы, я бачыў яго далёка ў полі, ён трухаўся сваёй роўнаю, крышку напружанаю і няўпэўненаю рыссю. Кіраваў ён да лесу.

## 6

Неяк раз я ішоў са стрэльбаю па высокім беразе вузкага возера. Качкі таго года незвычайна растлусцелі, было іх многа, у лагчынах часта сустракаліся бакасы, і паляванне было лёгкае і радаснае.

Нагледзеўшы зручны пянёк, я прысеў, каб адпачыць, і калі аціх набеглы перад гэтым ветрык і прыйшло імгненне чысцейшае задуменнае цішыні, я пачуў вельмі далёка дзіўныя гукі. Было падобна, быццам нехта раўнамерна біў у срэбны звон, і гэты цёплы малінавы звон, блукаючы ў ельніку, узмацняўся борам, разносіўся па ўсім

лесе, настройваючы ўсё на ўрачысты лад. Паступова гукі пачалі адрозніванца, і, засяродзіўшыся, я зразумеў, што дзесьці брэша сабака. Брэх чуўся з другога азёрнага берага, з глушы сасновага лесу, быў чысты, слабы і далёкі, часам знікаў зусім, але потым зноў упарта ўзнікаў, ужо крыху бліжэй і мацней.

Я сядзеў на пні, круціў галавою, пазіраў навокал на жоўтыя, парадзелыя лісцем бярозы, на пасівелы мох і бачнае здалёку на ім барвовае асінавае лісце, слухаў срэбны голас, і мне здавалася, што разам са мною яго слухаюць, прытаіўшыся, вавёркі, цецерукі на блізкай сухой градзе, і бярозы, і цесны зялёны ельнік, і возера ўнізе, і ўздрыгвае натканае павукамі павуцінне. Потым мне ў гэтым цудоўным музычным брэху здалося нешта знаёмае, і я раптам зразумеў, што гэта гоніць Арктур.

Дык вось калі давялося мне пачуць яго! Слабае срэбнае рэха адбівалася ад сосен, і таму здавалася, што брэша некалькі сабак. Аднаго разу Арктур, мабыць, скалоўся і заціх. Доўгія хвіліны цягнулася гэтае маўчанне, лес адразу стаў пусты і мёртвы. Я быццам бы бачыў, як кружыцца сабака, паморгваючы белымі вачыма, спадзеючыся на адно толькі чуццё. А можа, ён ударыўся аб дрэва? Магчыма, ён ляжыць цяпер з разбітаю грудзінаю, не маючы сілы ўстаць, скрываўлены і журботны?

Але гон аднавіўся з новаю сілаю, ўжо намнога бліжэй да возера. Возера гэтае так ляжыць, што ўсе сцежкі, усе лазы ідуць да яго, ніводны не пройдзе збоч. Многа цікавага бачыў я ля гэтага возера. Цяпер я таксама падрыхтаваўся і чакаў. Хутка на невялікую, рыжую ад конскага шчаўя лугавіну з другога боку выскачыла ліса. Была яна брудна-шэрая, з мачалістым тонкім хвастом. На імгненне яна прыпынілася, натапырыўшы вушы, прыслухоўваючыся да гону, які набліжаўся. Потым няспешна перабегла цераз лугавіну, пайшла на ўзлесак, нырнула ў яр і знікла ў драбналессі. Адразу ж на лугавіну вылецеў Арктур. Ён ішоў крыху збоч ад следу, не перастаючы, злосна падаваў голас і, як заўсёды, высока і нязграбна бег з падскокам. Следам за лісою ён памчаў у яр, ткнуўся ў драбналессе, завішчаў і завыў там, заціх, выбіраючыся з нейкае цяжкае мясціны, потым зноў забрахаў басавіта і роўна, быццам ударылі ў срэбны звон.

Нібыта ў незвычайным тэатры прамільгнулі перада мною вечна варожыя сабака і звер, і я зноў застаўся адзін з цішынёю і далёкім голасам сабакі.

## 7

Слава пра незвычайнага ганчака хутка разляцелася па горадзе і па наваколлі. Яго бачылі на далёкай рэчцы Лось-ве, у палях за лясными нагоркамі, на самых глухіх лясных дарогах. Пра яго гаварылі ў вёсках, на прыстанях і на пе-равозе, пра яго спрачаліся за куфлем піва сплаўшчыкі і рабочыя лесазавода.

Да нашага дома пачалі паведвацца паляўнічыя. Як правіла, яны не верылі чуткам, бо па сабе ведалі цану па-ляўнічым расказам. Яны аглядалі Арктура, разважалі пра яго вушы і лапы, пра яго вязкасць, паратасць і іншыя паляўнічыя артыкулы; яны вышуквалі ў яго недахопы і ўгаворвалі доктара прадаць ім сабаку. Ім страшэнна хаце-лася памацаць мускулы ў Арктура, паглядзець яго лапы і грудзіну. Але Арктур сядзеў ля доктаравых ног такі пах-муры і насцярожаны, што ніхто не адважваўся працяг-нуць да яго руку. А доктар, чырванеючы і злуючыся, дзе-сятым разам даказваў, што сабака не прадаецца, што трэ-ба было б пра гэта ведаць усім. Паляўнічыя развітваліся засмучаныя, і на змену ім ішлі іншыя.

Аднойчы Арктур, перад гэтым моцна разбіўшыся, ля-жаў пад тэрасаю, калі ў садзе з'явіўся дзядок. Левае во-ка ў яго выцекла і зацягнулася, татарская бародка была як вышчыпаная, на галаве мяккая аблавушка, на нагах стаптаныя паляўнічыя боты. Убачыўшы мяне, дзед замар-гаў, зняў з галавы шапку, паскроб голаў і паглядзеў на неба.

— Надвор'е ж цяпер, надвор'е...— невядома да чаго пачаў ён, крактануў, заціх. Я здагадаўся і спытаўся:

— Ці не па сабачку прыйшлі?

— А то як жа! — ажывіўся ён і надзеў шапку. — Ды што ж гэта, напрыклад, выходзіць? Нашто доктару саба-ка? Не трэба ён яму, а мне — во так трэба! Хутка паля-ванне, і ўсё такое... У мяне, чуеш, у самога ёсць ганчак, але дрэнь: дурны, след не трымае і ніякага голасу. А гэ-та ж што! Сляпы ж, га? Галавой не спасцігнуць, як ганяе! Царскі сабака, вось табе крэст святы!

Ён паўздыхаў, высмаркаўся і пайшоў у дом, а праз пяць хвілін з'явіўся вельмі чырвоны і разгублены. Спы-ніўся побач са мною, крактаў, доўга закурваў. Потым насупіўся.

— Што, адмовілі вам? — спытаўся я, загадзя ведаючы адказ.

— І не кажы! — засмучана ўсклікнуў ён. — Ну што ты скажаш! Я з маленства паляўнічы — во, бачыш, вока страціў? — і сыны ў мяне таксама, і ўсё такое. Нам, чуеш, на работу сабака патрэбны, на ра-бо-ту! Не, не аддае... Пяцьсот рублёў даваў — якая ж цапа, га? — і не падыходзь, не дае! Ледзь не заплакаў, га? Гэта мне плакаць трэба! Паляванні падыходзяць, а сабакі няма!

Ён разгублена агледзеў сад, плот, і раптам на твары ў яго прамільгнула штосьці гэтакае хітрае і разумнае.

Ён адразу паспакайнеў.

— А дзе ён туліцца ў вас? — як быццам непарокам пацікавіўся ён і замаргаў вокам.

— Ці не сабаку ўкрасці хочаце? — спытаўся я.

Дзед збянтэжыўся, зняў шапку, выцер падкладкаю твар і пільна паглядзеў на мяне.

— Даруй госпадзі! — сказаў ён і засмяяўся. — Ды з вамі ж і да граху дойдзеш. А ты як думаў! Ну навошта яму сабака? Ты вось скажы!

Ён рушыў быў да варотцаў, але спыніўся і радасна паглядзеў на мяне.

— А голас жа, го-олас! Разумееш ты голас? Як тая крыніца, я табе кажу!

Потым вярнуўся, падышоў да мяне і зашаптаў, падморгваючы і касавурачыся на вокны дома.

— Ты пачакай, будзе маім сабачка. Нашто яму сабака? Чалавек ён галавасты, не паляўнічы... Прадасць ён мне яго, святы крэст, прадасць. Да пакроваў жа далёка, нешта прыдумаем. А ты гаворыш... Эх!

Як толькі стары пайшоў, у сад выйшаў доктар.

— Ну што ён вам гаварыў? — хваляваўся ён. — Ах, які працінуы старэчына! Такое ў яго вока, вы заўважылі? Ну як у бандыта! І адкуль ён даведаўся пра сабаку?

Доктар нервова пацірaў рукі, шыя ў яго пачырванела, сівая пасмачка ўпала на лоб. Арктур, пачуўшы голас гаспадара, выпаўз з-пад тэрасы і, пакульгваючы, падышоў да яго.

— Арктур! — сказаў доктар. — Ты ж мне, праўда, ніколі не здрадзіш?

Арктур заплюшчыў вочы і торкнуўся носам доктару ў калені. Ён не мог стаяць ад слабасці і сеў. Галаву яго цяжка хіліла да зямлі, ён амаль спаў. Доктар радасна паглядзеў на мяне, засмяяўся і палашчыў Арктура за вушы.

Ён не ведаў, што ганчы сабака ўжо здрадзіў яму, здрадзіў з таго самага імгнення, калі трапіў са мною ў лес.

## 8

Як бы было добра, каб усе дзіўныя гісторыі шчасліва канчаліся! І хіба не варты герой, хоць бы і гончы сабака, доўгага радаснага жыцця? Ніхто не нараджаецца на зямлі ні для чога, і гончы сабака нараджаецца, каб гнаць звера-ворага, гнаць за тое, што не прыйшоў да чалавека і не стаў яго сябрам, як прыйшоў калісьці сабака, а застаўся на ўсе вякі дзікім. Сляпы сабака — не сляпы чалавек, яму ніхто не дапаможа, ён адзінокі ў цемені, ён бяссільны і асуджаны самою прыродаю, заўсёды жорсткаю да слабых, і калі ён усё ж страсна служыць свайму галоўнаму прызначэнню, калі ён жыве, што можа быць лепшае, большае за гэта! Але такім жыццём Арктуру мала прыйшлося пажыць...

Жнівень канчаўся, сапсавалася надвор'е, і я збіраўся ад'язджаць, калі прапаў Арктур. Раніцаю ён пайшоў у лес і не вярнуўся ні пад вечар, ні наступнага дня, ні яшчэ праз дзень.

Калі сябра, з якім жыў, якога бачыў кожнага дня і да якога не заўсёды быў уважлівым, калі гэты сябра пакідае цябе і не вяртаецца болей, на долю табе застаюцца адны ўспаміны.

І я ўспамінаў усё дні, праведзеныя разам з Арктурам, яго няўпэўненасць, збянтэжанасць, яго нязграбны, крыху рубам, бег, яго голас, прывычкі, дарагія драбніцы, яго ўлюбёнасць у гаспадара, нават яго пах, пах чыстага здаровага сабакі... Я ўспамінаў усё гэта і шкадаваў, што гэта быў не мой сабака, што не даў яму імя, што не мяне ён любіў і не да майго дому вяртаўся ў цемры, ачнуўшыся ад пагоні за многа вёрст.

Доктар асунуўся за гэтыя дні. Ён спачатку западозрыў таго дзядка: і мы доўга шукалі яго, пакуль нарэшце не знайшлі. Але стары кляўся і бажыўся, што Арктура і ў вочы не бачыў, і напрошваўся шукаць яго разам з намі.

Вестка пра тое, што прапаў Арктур, імгненна абляцела горад. Аказалася, што многія ведаюць яго і любяць і што ўсе гатовы дапамагчы доктару ў пошуках. Усе былі затлумлены самымі супярэчнымі чуткамі і пераказамі. Хтосьці бачыў сабаку, падобнага на Арктура, хтосьці чуў у лесе ягоны голас.

Дзеці, тыя, якіх лячыў доктар, і тыя, якіх ён зусім не ведаў, хадзілі па лесе, гукалі, вылазілі ўсе лесніцоўкі, стралялі і па дзесяць разоў на дзень наведваліся да док-

тара даведацца, ці прыйшоў, ці знайшоўся дзіўны гончы сабака.

Я не шукаў Арктура. Мне неяк не верылася, што ён мог заблудзіцца, у яго было вельмі добрае чуццё. І ён вельмі любіў свайго гаспадара, каб прыстаць да якога-небудзь паляўнічага. Ён, вядома, загінуў...

Але як, дзе? — гэтага я не ведаў. Ці мала дзе можна знайсці сваю смерць!

А праз некалькі дзён зразумеў гэта і доктар. Ён неяк адразу засумаваў, перастаў спяваць і вечарамі доўга не спаў. У доме без Арктура зрабілася пуста і ціха, каты ўжо нікога не баяліся і вольна гулялі па садзе, камень ля рэчкі ніхто не абнюхваў болей. Непатрэбны, ён пявесела тырчаў над зямлёю і чарнеў ад дажджу, яго пахі былі нікому не прыдатныя.

У дзень майго ад'езду мы доўга гаварылі з доктарам пра ўсё-ўсякае. Пра Арктура мы стараліся не ўспамінаць. Адзін раз толькі пашкадаваў доктар, што ззамаладу не быў паляўнічым.

## 9

Гады праз тры я зноў трапіў у тыя мясціны і зноў пасяліўся ў доктара. Ён, як і раней, жыў адзін. Ніхто не стукаў кіпцямі па падлозе, не фыркаў носам і не малаціў хвастом па плеценай мэблі. Дом маўчаў, і пакоі гэтак жа пахлі пылам, аптэкаю і старымі шпалерамі.

Але была вясна, і ад пустога дома не было цяжка на душы. У садзе лопаліся пупышкі, крычалі вераб'і, у гайку гарадскога саду з гоманам ладкаваліся гракі, доктар наспеўваў фальцэтам свае арыі. Раніцаю над горадам стала сіняя пара, рака разлілася, як вокам спасцігнуць, на разлівах адпачывалі лебедзі і раніцаю ўздымаліся са сваім вечным «клінк-клапк», гугнява сігналілі стракатыя катэры, і працяжна дудзелі ўпартыя буксіры. Было весела!

На наступны дзень пасля прыезду я пайшоў на цягу. У лесе стаяў залацісты туман, навокал капала, звінела, булькала. Зямля агалілася, моцна і рэзка пахла, і колькі было іншых пахаў — асінавае кары, гнілога дрэва, вільготнага лісту — усе іх перабіваў моцны і рэзкі пах зямлі.

Быў цудоўны вечар з вогненным морам захаду, і слонкі ляцелі густа. Я забіў чатырох і ледзь адшукаў на цёмным лістоўным надсціле. Калі ж неба пазелянела і

патухла і высыпалі першыя зоркі, я паволі пайшоў дадому па знаёмай уезджанай дарозе, абыходзячы шырокія разлівы, у якія глядзелася неба, і голыя бярозы, і зоркі.

Абыходзячы адзін такі разліў па невялічкай грыве, я раптам заўважыў нешта светлае і падумаў спачатку, што гэта апошні кавалачак снегу, але, падышоўшы бліжэй, убачыў крыху раскіданыя сабачыя косці. Сэрца ў мяне застукала, я пачаў прыглядацца, убачыў аброжак з пазелянелаю меднаю спражкаю. Так, гэта былі Арктуравы косці.

Разгледзеўшыся што да чаго, я ўжо ў самыя прыцемкі здагадаўся, як усё было. У нестарое яшчэ, але сухое яліны была адна ніжняя галіна. Яна, як і ўсё дрэва, ссохла, асыпалася і адломвалася, пакуль не стала голаю востраю палкаю. На гэту палку іналяцеў Арктур, калі імчаўся па гарачым пахучым следзе, і не памятаў ужо нічога, і не ведаў нічога, акрамя гэтага следу, што клікаў усё наперад і наперад.

Ужо ў цемры я пайшоў далей, выйшаў на ўзлесак, а адтуль, чаўкаючы нагамі па мокрай зямлі, і на дарогу, але думкі ўсё вярталіся туды, на маленькую грыву з сухою абламанаю ялінаю.

У паляўнічых ёсць дзіўная любоў да гучных імёнаў. Якіх толькі не стрэнеш у паляўнічых сабак? Тут Дыяны і Антэі, Фебы і Нероны, Венеры і Ромулы... Але, мабыць, ні адзін сабака не быў так варты гучнага імя, імя пязгаснае блакітнае зоркі!

# Аляксандр Твардоўскі

## ПЕЧНІКІ

Пра печнікоў, пра іх своеасаблівае майстэрства, здаўна атуленае адценнем таямнічасці, якая быццам збліжала яго са знахарствам, — пра ўсё гэта я ведаў з самага дзяцінства, праўда, больш з разнастайных гісторый, легенд і анекдотаў.

У мясцовасці, дзе я нарадзіўся і вырас, быў вельмі вядомы пячнік Мішачка, як звалі яго, не зважаючы на немалыя гады, магчыма, за маленькі рост. Хаця ў нас гавораць нават і на дарослых, і на старых: Мішачка, Грышачка, Юрачка...

Мішачка, між іншым, быў знакаміты тым, што еў гліну. Гэта я бачыў сам, калі ён перакладаў у нас прагарэлы под у печы. Старанна замешваў гліну нагамі на цёплай вадзе гэтак, што яна блішчала, як масла, чапляў добры камяк яе на палец, запіхаў у рот, жаваў і глытаў, усміхаўся пры гэтым, як артыст, які хоча паказаць, што нумар даецца яму лёгка. Гэта я памятаю добра, як і тое, што Мішачка ўлазіў у нашу печ, сядаў там пад нізкім скляпеннем і выколваў спецыяльным малаточкам у сябе між ног, раскінутых убокі, старую цэглу. Як ён там намяшчаўся, хоць і маларослы, але ўсё ж не дзіця, я не мог зразумець: калі я аднойчы захварэў зімой і бабка паспрабавала выграць мяне ў печы, мне там здалося гэтак горача, цесна і страшна, што я закрычаў немым крыкам, рвануўся прэч і чуць не скінуўся з прыпечка.

Цяпер мне зразумела, што бяскрыўдны нумар з жаваннем гліны на вачах у людзей быў ад наіўнага жадання падкрэсліць незвычайнасць сваёй прафесіі, яе выключнасць: глядзіце, маўляў, не кожны гэта можа, не кожны і печы ўмее рабіць!

А Мішачка, нібы добры чараўнік са старых казак, быў і сапраўды добры, бяскрыўдны і ніколі не рабіў на шкоду людзям. А былі печнікі, якія прычынялі гаспадарам, калі тыя не дагадзілі ў печым, шмат трывогі і турбо-

ты. Умуроўвалі, напрыклад, дзе-небудзь у коміне бутэлечнае рыльца — і вые печ замагільнымі галасамі, прарочыць дому бяду і няшчасце. Альбо падвешвалі на тонюсенькай вяровачцы цагліну ў адпаведным месцы. Было разлічана, што першую абпалку яна вытрымлівае, а па другі ці на трэці дзень вяровачка перагарае, цагліна падае і закрывае дымаход, у печы не запаліш, у чым прычына не зразумееш, і раскідай печ зноў.

Былі і іншыя фокусы. Акрамя таго, аднолькавыя па канструкцыі печы адрозніваліся нагрэвам, цеплааддачай і даўгавечнасцю. Таму печнікоў у нас традыцыйна паважалі, пабойваліся і задобрывалі. Трэба яшчэ памятаць, якое вялікае месца ў прамым і пераносным сэнсе займала печ у ранейшым сялянскім жыцці. Яна была не толькі цяплом, не толькі кухня, але і пякарня, універсальная сушылка, і лазня, і пральня, і, нарэшце, любімае месца адпачынку пасля рабочага дня на холадзе, пасля дарогі альбо калі ломіць, круціць, калоціць цябе ад прастуды. Словам, без добрай печы няма і дома. Перакапацца ў гэтым мне давялося ў поўнай меры самому, і я гэтак многа і засяроджана думаў пра печы і пра печнікоў, што, здаецца, мог напісаць спецыяльнае даследаванне на гэту тэму.

Мне знайшлі кватэру цераз дарогу ад школы. Гэта сялянская хата, звязаная з двума гэтакімі ж хатамі, дзе жылі астатнія настаўнікі. Хата перагароджана на два пакоі, і перагародка раздзяляе печ, вялікую, якая выступае кухоннай плітой у пярэдні пакой, а ў другім пакоі — яна магутная грубка-галандка. Гэтая печ і была доўгі час прычынай маёго прыгнечанага настрою, суму, а часам нават і адчаю. Варта мне было на ўроку альбо ў любым іншым месцы на людзях ці ў адзіночку, за любой работай, успомніць пра дом, пра печ, як думкі мае пачыналі блытацца, я не мог ніяк засяродзіцца і пачынаў рабіцца злосны і няшчасны.

У гэтай печцы было цяжка, амаль немагчыма запаліць. Пліта яшчэ сяк-так разгаралася, але яна не мела для мяне, адзінокага, вялікага значэння. Вось як запаліць грубку, каб абагрэць другі пакой, дзе я працаваў і спаў? Трэба было спачатку адчыняць фортачку і дзверы ад дыму, які адразу запаўняў кватэру, нібы ў чорнай лазні. Вартаўніца не магла даць ніякай рады, і я браўся запальваць печку сам, але і ў мяне выходзіла тое ж самае. Дым валіў праз дзверцы, паддувала, сачыўся праз пябачныя

шчыліны зверху печкі, нават прабіваўся праз канфоркі пліты ў першым пакоі. Кожны раз можна было падумаць, што мы забываем адчыніць комін.

Каб запаліць у гэтай печцы, было ўжыта мноства прыёмаў, выкарыстаны ўвесь вопыт і ўменне людзей, якія мелі дачыненне да дзесятка школьных печак.

Вартаўніца Іванаўна і яе муж, аднаногі Фёдар Мацвееў, які дапамагаў ёй, былі сапраўдныя майстры. Прытым у кожнага была свая сістэма ці спосаб, прама супрацьлеглыя, але аднолькава добрыя па вынік. Коратка можна сказаць так: Іванаўна пачынала з агню, а Мацвееў — з дроў. Я добра вывучыў гэтыя два спосабы. Іванаўна, маленькая, паваротлівая, спрытная жанчына, запальвала ў пустой печы трубку бярosты, жменьку габлюжак, абрывак газеты альбо некалькі лучынак, і дадавала па лучынцы, па каліўцу — большага, мацнейшага,— і вырошчвала жывучы, моцны агонь, у які заставалася толькі падкідаць палена за паленам, пакуль дровы, падхопленыя знізу полымем, не падапруць пад верх так, што і ўсунуць няма куды палена.

Мацвееў наадварот з уласцівай яму няспешнасцю, часткова з-за калецтва, паволі і грунтоўна спачатку накладаў у печы дровы, то звычайнай клеткай, то пакрыж, то вертыкальна, шалашыкам, выкладваў, прыстройваў, выбіраў паляпякі, абдумана, старанна, быццам кожны раз рашаў цяжкую канструктарскую задачу. І толькі потым падводзіў пад гэтае збудаванне агонь, выкарыстоўваў тую ж бярosту, паперу, габлюшкі. І выходзіла гэтак жа спраўна, як і ў Іванаўны. Печ выгарала хутка, дровы згаралі роўна, ніколі не аставалася чаду, печы не астывалі раней патрэбнага часу. А мая давала аднолькавы дрэнны вынік пры абодвух спосабах.

Я сур'ёзна пачаў думаць, ці не ўстроілі ў ёй якую-небудзь штуку, як гэта рабілі калісьці майстры.

Сутыкнуўшыся з гэтай бядой, я паступова вызнаў усю гісторыю печкі. Аказалася, што з-за яе ніхто не хацеў жыць у гэтай кватэры. Памучылася, расказвалі, выкладчыца гісторыі Марыя Фёдараўна — уцякла. Летам жыла матэматычка Аксана Аркадзьеўна, пакуль не скончылі суседнюю кватэру, а восенню адразу ж перабегла туды, не дачакалася і канца работы.

Печку зрабілі немцы-васнапалонныя, а потым двойчы перакладвалі розныя выпадковыя печнікі, але ўсё няўдала. Мне было няёмка зноў прасіць дырэктара пера-

рабіць печ. Але яе ўсё роўна трэба было перарабляць, толькі каб недарэмна, хоць і ў чацвёрты раз.

Ёсць, гаварылі, па ўсё наваколле адзін чалавек — Ягор Якаўлевіч, — ён мог бы гарантавана зрабіць печку, але апошні час рэдка і неахвотна бярэцца за работу: жыве на пенсіі як стары чыгуначнік, у яго свой дом, сад, агарод. «Не хачу!» — і ўсё. Пасылалі яму з унукам-чацвёртакласнікам запіску, нават не адказаў, хадзіў да яго раз Мацвееў, а другі раз сустрэў недзе ў пасёлку — усё то хворы, то ўзяўся за работу ў іншым месцы, як там надалей, відаць будзе.

А далей адцягваць не было куды. Прайшлі Кастрычніцкія святы, зіма падбіралася — у сваёй кватэры я мог спаць толькі з-за франтавой прывычкі, дыктанты і сачыненні правяраў у настаўніцкай, калі ўсе разыходзіліся. У дадатак да ўсяго я баяўся, што жонка мая Лёля, не зважаючы на мае рашучыя папярэджанні, прыедзе сюды з пяцімесячным сынам, а кватэра не даведзена да ладу.

Усё гэта, і ў тым ліку адкладванне, зусім змучылі мяне. Турбавала не толькі печка, але і тое, што пра яе пастаянна гаварылі ўсе настаўнікі, дырэктар, вартаўнікі і, я ўпэўнены, вучні: дзеці заўсёды ўсё ведаюць пра наша жыццё па-за школай. Ды і зараз, калі ўся гэтая нязначная гісторыя з печкай асталася ў былым, я сам адчуваю, што не магу гаварыць пра яе з лёгкасцю як пра нешта смешнае, а з хваляваннем і сур'ёзна, чаго, вядома, гэта ўся справа не заслугоўвае. Але спытайцеся ў любога, асабліва ў жанчыны-гаспадыні, якая карыстаецца печчу, што такое дрэнная печ, як гэта адбіваецца на настроі, на рабоце, — усе вам скажуць, што з-за дрэннай печы можна нават і хутка пастарэць. А я якраз і глядзеў на ўсе гэтыя прыгоды вачыма маёй жонкі Лёлі, гарадской, нявопытнай у цяжкім паўсядзённым жыцці жанчыны-маці, якой трэба было жыць са мной у гэтай кватэры.

Той раніцай я прачнуўся раней звычайнага ад святла, якое даваў у акно снег, што выпаў уночы. І мне прыйшла ясная, простая і, здавалася, самая надзейная думка. Я ўспомніў райваенкома, маёра, з якім пазнаёміўся і разгаварыўся, калі прыходзіў да яго, каб стаць на ўлік як афіцэр запасу. Пайду, думаю, да яго, ён мне паможа: варта паглядзець у картатэку, у каго з ваеннаабавязаных ёсць спецыяльнасць «пячнік»,— вось і будзе пячнік.

Маёр прыняў мяне ў сваім маленькім, як каморка, кабінеціку з трыма драўлянымі і чацвёртай дашчатай сцен-

кай, якая аддзяляла яго ад вялікага, з драўляным бар'ерам, пакоя.

Просты, заклапочаны твар маёра з маршчынамі на лбе, якія падкочваліся ад брывей да густых цёмных валасоў, рабілі яго лоб нізкім і прыдавалі твару злосны выгляд, але твар гэты спагадліва выцягнуўся.

— Як вам сказаць... — загаварыў ён, закурыў папяросу. — Пячнік — такая прафесія, што яе не заўсёды ўказваюць. Шавец, каваль — іншая справа. А пячнік, — раптам усміхнуўся ён, паказаў пракураныя зубы з шырокім краем верхніх дзёсен, — кожны салдат — сам сабе пячнік. Зараз паглядзім.

Аказалася, што ёсць і печнікі, але адзін з іх калека, без рукі, другі жыве ў дальнім канцы раёна, трэці працуе старшынём вялікага калгаса — нечага і думаць, чацвёрты — дваццаць шостага года параджэння; нават і маёр сказаў, што пячнік павінен быць крыху старэйшы. Былі і іншыя кандыдатуры, якія адпалі з-за розных прычын.

— Вось што, — параіў мне маёр пад канец, калі я цалкам расказаў яму ўсю сваю гісторыю, — вы самі схадзіце да гэтага чараўніка, да Ягора. Я таксама чуў, што майстар цудоўны. Схадзіце, пагаварыце. А не выйдзе — давайце сюды. Прыдумаем нешта, — усміхнуўся ён зноў мне сваёй вяліказубай усмешкай, непрыкметна прыкрываючы рот, як гэта робяць людзі без зубоў, асабліва жанчыны.

Гэтая апошняя прапанова здалася мне не болей як звычайнай ветлівасцю, якая ні да чога не абавязвае.

На наступны дзень я накіраваўся да Ягора Якаўлевіча па гразкай і слізкай узбочыне шашы, абапал якой размясціўся пасёлак. Снег, які лёг на цёплую зямлю, застаўся толькі ў садах і гародчыках, дзе ніхто не хадзіў.

Была раніца, на вуліцу яшчэ мала хто выходзіў, і я радаваўся гэтаму: я не хацеў, каб усе ведалі і бачылі, куды і навошта я іду. У той жа час у мяне было адчуванне, нібы на нагах у мяне цесныя, нязручныя боты, я хаваю гэта, а ўсе ведаюць пра маю бяду, шкадуюць мяне і крыху пасміхоўваюцца. А я больш за ўсё не люблю спагады і насмешкі. І гэта, мне здаецца, асабліва развілося з таго часу, як стаў я жанатым чалавекам, галавой сям'і: раней такога і быць не магло.

А тут ідзеш, і ўсё здаецца табе — і гэтая старая ў гумавых ботах ля калодзежа, і дзяўчынка, якая нясе хлеб над пахвай і жуе давесак, і два хлопчыкі, якія павіталі-

ся са мной па скрыжаванні,— усе не толькі ведаюць, што я пядаўна жанаты, нявопытны і няўпэўнены пры ўладкаванні жыцця чалавек, а, мабыць, нават ведаюць, што цешча мая, гарадскі доктар, прыгожая і зусім яшчэ нестарая жанчына, якая неахвотна прызнае сябе бабуляй, адносіцца да мяне не надта, і што яе я не то сарамеюся, не то пабойваюся. І што ў яе ў кватэры мы з Лёлей і дзіцем месціліся ў меншым, прахадным пакоі, а яна — у вялікім, асобным.

Я мала верыў у поспех, зараней уяўляў чалавека, якога мучыць старэчая немач і якому не надта патрэбен і заробак. Горш за ўсё прасіць чалавека зрабіць нешта, калі ён не хоча ці проста можа не рабіць.

Сышоў я са сцяжынкі, пратаптанай паўз штакетнік, за які прытрымліваўся, каб не ўпасці, зайшоў праз варотцы да зашклёнай веранды.

Дзверы на веранду былі замкнёны: праз шкло я ўгледзеў, што там усё закладзена качанамі капусты, бурачкамі і морквай. У адным з вокан дома паказаўся доўгі строгі твар з рэдзенькай бародкай, рукой мне было паказана, што трэба абысці навокал дома.

Я абышоў дом, узышоў па рудых прыступках на адкрыты ганак, адтуль у сенцы і пастукаў у дзверы.

— Ну, ну, — абазваўся з сярэдзіны хрыплаваты голас, але моцны яшчэ. — На сябе.

Я зайшоў у кухню, даволі прасторную, на два акны. Ля акна справа сядзеў за сталом стары не стары, але ўжо ў гадах чалавек з прадаўгаватым, строгім і нездаровым, жаўтаватага колеру тварам і рэдкай, калісьці рыжай, а цяпер па́левага колеру бародкай. На стале стаяў самавар, астаткі, відаць, учарашняй закусі, і парожняя бутэлька. Чалавек спакойна і, як мне здалося, з падкрэсленай абыякавасцю да мяне рэзаў кружочкамі яблыка ў шклянку — чаёўнічаў. Гэта і быў Ягор Якаўлевіч.

— Не магу, — коратка і з нейкім халодным сумам сказаў ён, як толькі я пачаў пра сваю просьбу.

Я стаяў у парозе і прысесці мог альбо ля стала на вольнае крэсла, калі б мяне запрасілі, альбо прыстроіцца амаль ля самых дзвярэй на старой канапцы, заваленай нейкімі скрынькамі, валёнкамі, гаршкамі з-пад кветак і іншым рыззём. Тут я мог прысесці і без запрашэння, але адсюль гаварыць было нязручна, як цераз вуліцу.

Усё ж я сеў і пачаў яму расказваць па парадку, стараўся, вядома, не прапусціць, што наслухаўся пра яго

майстэрства. Усю сваю мароку я хацеў паказаць смешнаватай, націскаў на сваю бездапаможнасць і нявопытнасць у гэтай справе.

Але ўсё гэта ён слухаў быццам само сабой зразумелае і зусім нецікавае яму, не перабіваў: маўляў, гавары колькі табе хочацца і што хочацца, а мне ўсё роўна чай піць. Ён нават і не глядзеў на мяне, а болей у акно — на непагодлівую гразкую вуліцу, на свае кусцікі ў садзе, на ўсю гэту макрэчу і непрытульнасць надвор'я, бачыць якую нават прыемна, калі п'еш чай, на прывычным, любімым месцы, у цяпле, якое дае добрая печка. Ён, мабыць, ведаў цану гэтай ранішняй старэчай часіне з чаем, з тытунём, з няспешным, неўстурбованым і прыемным глядзеннем і думаннем.

Я хутка адчуў, што ў кухні напалена. «Рэклама»,— падумаў я і дадаў яшчэ адну ліслівую заўвагу наконт таго, як прыемна зайсці ў цёплае памяшканне.

— Не, не вазьмуся,— зноў перапыніў мяне пячнік, вяла адсунуў сподак са шклянкай і закурыў.

— Ягор Якаўлевіч!

— Ды што Ягор Якаўлевіч, Ягор Якаўлевіч! — вяла перадражніў ён.— Сказаў, не магу. Ясна?

Я ўпэўнены, што з гэтакай недаступнасцю і лянівай ганарлівасцю са мной не мог бы гаварыць не толькі загадчык раённага альбо абласнога аддзела асветы, але і любы самы высокі начальнік, які мае тэлефон, сакратароў і запіс на прыём. «Не магу, не вазьмуся»,— вось і ўсё. Самы суровы і недаступны начальнік усё ж павінен быў бы сказаць мне — чаму.

— Чаму, Ягор Якаўлевіч?

— А таму,— адказаў ён роўным голасам і нават не змяніў сваёй сумнай інтанацыі,— таму, што Ягор Якаўлевіч адзін, а людзей многа: і таму трэба, і таму. А ў мяне толькі дзве рукі,— развёў ён сваімі вялікімі кашчавымі рукамі і дакрануўся да высокага лба пальцам.— Дзве рукі і адна галава, больш няма.

У гэтых рухах, якія быццам усё спрошчвалі, міжволі заўважалася, што Ягор Якаўлевіч далёкі ад таго, каб не дааццэньваць значнасць сваёй асобы.

— Ягор Якаўлевіч, вы, можа, сумняваецеся наконт аплаты, дык я вам хачу сказаць,— адважыўся намякнуць я.

— Ды не, што там аплата! — ён махнуў рукой.— Аплата мая вядомая, а гавару — не вазьмуся. Адпаму зро-

біш — другі прыйдзе. А лепш нікому, тады і крыўды няма. Вось учора таксама прыходзіў чалавек,— паказаў левай рукой, у якой трымаў папяросу, на парожнюю бутэльку,— прыходзіў чалавек, і так і гэтак прасіў...

— А ўсё ж, Ягор Якаўлевіч?..

— Я ж вам па-руску гавару,— ён зноў адхіліў сваю руку да парожняй бутэлькі, мезенцам амаль дакрануўся да шкла,— вось жа прыходзіў чалавек.

Ён гэтак грунтоўна паказваў мне на бутэльку як на абазначэнне нейкага чалавека-прасіцеля, што я міжволі пачаў глядзець на яе, нібы бачыў замест яе жывога чалавека, які гэтак жа, як і я, прасіў Ягора Якаўлевіча.

І тут мне прыйшла простая здагадка, якая павінна была, гэтак падумалася мне, прыйсці з самага пачатку нашай гутаркі.

— А што, Ягор Якаўлевіч,— сказаў я рашуча, падышоў да стала,— можа, у сувязі з выхадным...— Я лёгка прыпадняў за рыльца парожнюю бутэльку дзеля большай нагляднасці.

Ягор Якаўлевіч падняў на мяне светла-блакітныя, са старэчай чырванню вочы, губы ледзь прыкметна ўсміхнуліся.

— Зранку не ўжываю.— І ў інтанацыі гэтай адмовы была ўжо не толькі недаступнасць, але і асуджэнне, і павучанне.— Зранку не ўжываю,— яшчэ цвярдзей паўтарыў ён, абапёрся на край стала, прыўстаў, даў зразумець, што сустрэча закончана.— Праўда, быў вось учора чалавек...

І я вырашыў, што для яго я проста «чалавек», як і той, што ў вобразе парожняй бутэлькі застаўся на стале: нас многа, а ён адзін.

Ён правёў мяне ў сенцы, стаяў у расчыненых дзвярах, чамусьці сказаў мне ўслед, магчыма, заўважыўшы маю засмучанасць:

— Буду міма ісці — зайду як-небудзь...

— Калі ласка,— механічна адазваўся я, хоць і не разумеў, навошта тады яму да мяне заходзіць.

Ад Ягора Якаўлевіча ішоў я панылы. Нібы хацеў зрабіць нешта нядобрае, а мяне злавілі, перапынілі і прысарамацілі. На самай справе, нашто мне было хадзіць да гэтага Ягора, прасіць яго, слацца перад ім, наступацца сваім гонарам? Няхай гэтым займаецца хто хоча, гэта не мая справа. Але што ж рабіць? Чакаць, пакуль «дырэктар асабіста зоймецца гэтым пытаннем», пакуль вызваляцца нейкія печнікі на станцыі, пакуль прыедзе жонка, якая не

паладзіла з маці, вырашыла, што лепш у шалашы жыць, альбы разам, а тут нічога не гатова.

Я зусім апусціў крылы, становішча маё бачылася мне ў самым горшым святле, вінаваціць некага аднаго ў гэтым я не мог, а таму пачаў абурацца недасканаласцю нашага гаспадарання.

Будуем унікальныя дамы, на што ідуць сотні марак рознай цэглы, узводзім збудаванні, якім наканавана ўвекавечыць наша існаванне, нашу працу на зямлі, данесці да нашчадкаў веліч нашых спраў і памкненняў, а зрабіць печку, звычайную рускую печку, якія вядомы яшчэ з часоў Кіеўскай Русі, зрабіць гэта абагравальнае збудаванне ў доме работніка інтэлігентнага занятку, выкладчыка роднай мовы і літаратуры,— задача, якую ніяк не адолець!

Я ішоў і разгортваў неабвержаныя аргументы ў тым сэнсе, што такое становішча трываць нельга, што гэта ненармальна. Адна за другой складваліся ў маёй галаве фразы, то лірычна-ўзнёслыя, то ядавіта-іранічныя, перакапальныя, пафасныя, ясныя, як божы дзень. Я быццам і не сам з сабой гаварыў, а прамову складаў, якую скажу з нейкай трыбуны альбо ў гутарцы з нейкім вялікім кіраўніком. А магчыма, гэта былі радкі і абзацы з артыкула, які на старонках газеты павінен быў горача і прама паставіць пытанне пра ўвагу да патрэб вясковай інтэлігенцыі. Але гэтага мне ўжо здавалася мала. Я дабіраўся да існуючых формаў і метадаў выкладання і г. д. і г. д. Паскрысе, непрыкметна я зусім адтанцаваўся ад сваёй печкі...

Мне гэтак захацелася пагаварыць з кім-небудзь пра ўсё гэта, расказаць пра свае найдакладнейшыя назіранні і неабвержаныя вывады, паўтарыць уголас найбольш удалыя мясціны і выразы з маёй прамовы, казырнуць цытатай, якую ўспомніў быццам між іншым.

Я пайшоў да маёра, забыўшы пра ягонае абяцанне «што-небудзь прыдумаць» наконт печкі, проста так. Ён жыў непадалёк ад ваенкамата, у адной палавіне драўлянага двухкватэрнага доміка з двума аднолькавымі ганкамі.

Мне сказалі, што ён ужо ў ваенкамаце, і я знайшоў яго там, дзе было па-ранішняму пуста і ціха, у тым жа маленькім кабінеціку. Ён падняўся насустрач мне, хутка загарнуў і сунуў у стол нейкі тоўсты агульны сшытак. Па майму выгляду, па ўзбуджанасці пасля хадзьбы і роздуму, ён падумаў, што ў мяне ўсё нармальна.

— Ну, як?

Я расказаў пра свой візіт, праўда, цяпер ужо з гумарком, неспадзявана пачаў паказваць, як важнічаў Ягор Якаўлевіч, як піў чай, як адмовіў мне. Я нават скапіраваў ягоны рух да бутэлькі: «Вось прыходзіў да мяне чалавек...» Пасмяяліся мы разам.

— Ну, што ж,— сказаў маёр,— давядзецца мне самому вам печку рабіць.

— Як гэта?

— А вось так, з цэглы! — засмяяўся ён, паказваючы зубы і прыкрываючы рот рукой.

Я толькі цяпер заўважыў, што ў гэтай яго ўсмешцы было нешта прывабнае, добрае. Яна адразу рабіла іншым яго заклапочаны, невясёлы твар.

— Дык вы самі, ці што, будзеце рабіць печку?

— Сам. Магу даручыць намесніку, але ён не ўмее.— Маёр не без задавальнення бачыў маю разгубленасць.— Заўтра субота? Заўтра звечара і пачнём.

Усё выйшла проста і не зусім прыгожа: як гэта маёру, у нейкім плане майму начальніку, рабіць у мяне печніком?

— Не верыце? Вы ж заходзілі да мяне на кватэру, бачылі печку? Мая! Гаспадыня задаволена.

— Не, чаму ж! Дзякуй, вядома! Тады трэба ж адносна ўсяго дамовіцца.

— Наконт ганарара? — з невясёлай гатоўнасцю падказаў ён.— Не хвалюйцеся, сыдземся.

— А ўсё ж?

— А ўсё ж не будзем пра гэта. Не хапала, каб райваенком на печках падрабляў! Дойдзе такое да начальства — ого-го!

— А калі дойдзе, што вы печы робіце?

— Гэта няхай даходзіць. Тут мне ніхто не ўказ. Я, напрыклад, сам усё гэта шыю,— ён абмахнуў сябе рукой па кіцелю і штанах,— атрымліваю адрэз і шыю. І на дзяцей верхняе шыю. І вам магу...

Назаўтра ён прыйшоў да мяне пад вечар з пакункам пад пахвай. У ім былі старыя салдацкія летнія штаны і гімнасцёрка, а таксама печнікоўскі малаток, жалезны складны метр, маток дроту, нейкія вяровачкі.

Ён агледзеў, абышоў печку і пліту, потым узяў крэсла, сеў тварам да галандкі і пачаў курыць, гледзячы на яе.

— Ну-у...— сказаў ён пасля роздуму.

— Што?

— Нічога. Гразі многа наробім.

— Гэта нічога. Іванаўна прыбяр

— А дровы ёсць? — спытаўся ён.
— Дровы? Нашто? Ёсць.
— Паспрабаваць запаліць.
— Гэта ў новай печцы?
— Не, спачатку ў гэтай запалім.

Мне здалося, што ён жартуе ці забыўся, як я яму распісваў пра яе.

— Вы ж толькі дыму наробіце. Няўжо вы мне не верыце?

— Веру, веру. А запаліць у печы трэба. Дзе дровы?

Дровы знайшліся ў калідоры, сярод іх і напалову абгарэлыя, якія пабылі ўжо ў печцы.

Маёр зняў кіцель і гэтак упэўнена ўзяўся за работу, што мне здалося: можа, мы з Іванаўнай і сапраўды нешта прамаргалі, а таму нас спасцігла няўдача. А ён зараз запаліць у печцы, і яна акажацца нармальнай. Гэта было б добра, але тады ўся мая гісторыя з печкай выглядала б зусім смешнай і недарэчнай.

Я проста ўзрадаваўся, калі ўбачыў, што печ у маёра задыміла гэтак жа, як і ў нас.

— Не, таварыш маёр,— сказаў я.
— Што не?
— Не гарыць.
— Вось і добра! Гэта нам і трэба! — засмяяўся ён.— Як не гарыць і чаму не гарыць — вось што важна!

Падпалка згарэла, дровы не заняліся гарэць, дыму найшло, як і звычайна. Маёр выйшаў на вуліцу, паглядзеў на комін. Я таксама выйшаў. Было яшчэ відно.

Колькі разоў я вось гэтак выбягаў на вуліцу, глядзеў, ці не пакажацца дымок з коміна! З дзяцінства яшчэ памятаю, калі добра прыгледзецца, хоць бы дзеля таго, каб даведацца, ці паставілі дома самавар, то над комінам заўважаецца слабенькае трымценне паветра, нібы вось зараз пакажацца дымок, а яго няма.

Маёр вярнуўся ў кватэру, узяў вяровачку з навязанай на канцы цяжкай гайкай і палез на дах. Я назіраў, як ён стаў ля коміна, пачаў апускаць гайку ў комін і вадзіць ёй там, то апускаў глыбока, з рукой, то прыпадымаў. Гэта было падобна, як вылоўліваюць «кошкай» вядро, якое патанула ў калодзежы.

У гэты час высокі мужчына ў куртцы з рыжым футравым каўняром і касымі кішэнямі на грудзях, які ішоў міма па дарозе, спыніўся, левай рукой прытрымаў за казырок фуражку і глядзеў на дах. У правай руцэ ў яго быў

лёгенькі кіёк. Калі маёр выбраў вяровачку з коміна і злез на зямлю, чалавек падышоў бліжэй, і я ўбачыў, што гэта Ягор Якаўлевіч. Ён кіўнуў мне і спытаў у маёра:

— Ну як?

— Чорт яго знае! У коміне быццам нічога і няма, а не гарыць.

Можна было падумаць, што яны не толькі ведаюць адзін аднаго, але абодва заняты гэтай печкай. Мы зайшлі ў кватэру, дзе яшчэ было дымна, і маёр з Ягорам Якаўлевічам загаварылі пра печку. Яны ўвесь час гаварылі ён і мелі на ўвазе невядомага майстра, які рабіў печ.

— Морду б яму намыліць,— з сумным перакананнем сказаў маёр.

Але стары пячнік прымірэнча запярэчыў:

— Біццём тут не паможаш. Тут галоўнае, што ён не пячнік, а сапожнік. Звесці два дымаходы — ад пліты і ад печкі — гэта не яго розуму справа.— Ягор Якаўлевіч гаварыў гэта і вадзіў сваім кіёчкам, быццам указкай, ставіў на коміне нейкія знакі.— Адно слова — сапожнік...

Гэта было сказана, быццам майстэрства шаўца параўноўвалася з печным непамерна больш складаным, напрыклад, з мастацтвам, як у Пушкіна: «Картину раз высматривал сапожник...»

Печнікі закурылі і яшчэ доўга абмяркоўвалі пытанне. Яны паводзілі сябе, як дактары ў час агляду хворага, не сароміліся блізкіх, якія разумелі іх тэрміналогію з пятага ў дзесятае, недагаворкі, паціскание плячыма і загадкавыя знакі ў паветры.

— Не можаш — не бярыся,— зрабіў вывад Ягор Якаўлевіч, як мне здалося, не без намёку і на прысутных.

Маёр бяскрыўдна растлумачыў:

— Я што? Я саматугам сабе печ зрабіў, які ж я майстар! А калі чалавек у такім становішчы,— кіўнуў на мяне,— трэба яму дапамагчы як-небудзь.

— Вядомая справа,— сказаў Ягор Якаўлевіч, задаволены маёравай сціпласцю.— Памагчы трэба, толькі каб потым зноў помачы не прасіць.

— Ягор Якаўлевіч! — Я раптам адчуў прыліў нейкага спадзявання.— Ягор Якаўлевіч, ну дык! А?!.

Маёр таксама падтрымаў мяне:

— А я б у вас, Ягор Якаўлевіч, за гліnámеса. Мне карысна будзе пры такім майстры парабіць, дальбог! — усміхнуўся, прыкрываючы рот рукой, у якой дыміла папіроса.

Не, усё ж простыя, звычайныя людзі ў рэшце рэшт знаходзяць дарогу да людзей незвычайных, з усёй іхняй, здавалася, непрыступнасцю.

— Ну што мне з вамі рабіць? Трэба памагчы,— сказаў майстар, і гэтае «трэба памагчы» нагадала рэзалюцыі нашага раённага і абласнога начальства: «Трэба дапамагчы наконт таго і таго».

Ягор Якаўлевіч сеў на крэсла перад печкай, як да яго сядзеў маёр, разглядаў яе і мармытаў сабе пад нос:

— Трэба памагчы, трэба будзе памагчы...— І махнуў кійком спачатку да маёра, потым да печы, загаварыў нараспеў: — Дык вось, дарагі мой, да заўтра ты мне гэтую печку разбярэш да цаглінкі, і каб бою ніякага, цаглінку да цаглінкі складзеш. Зразумеў?

Я прыкмеціў, што ён гаварыў маёру «ты», ужо лічыў яго падначаленым, хаця не мог не бачыць на крэсле кіцель з маёрскімі пагонамі, і ў гэтым ён таксама быў падобны на вялікае начальства.

Маёр сказаў, што ён зараз жа палезе на дах. Я вызваўся дапамагаць яму, але Ягор Якаўлевіч сказаў, што на дах лезці не трэба.

— Комін тут ні пры чым, згодзіцца нам і гэты. Яго падвесіць толькі трэба.

Як каміны падвешваюць, не ведалі ні я, ні маёр. Тады Ягор Якаўлевіч узяў кіёк за два канцы і растлумачыў заданне папулярна, звяртаючыся толькі да маёра:

— Возьмеш два такіх брускі, на вяршкоў два кожны. На гарышчы ў коміне плечыкі падаб'еш і пад плечыкі падвядзеш... Не толькі комін, але і ўсю печ вывесіць можна. Як бы ты разабраў печ на ніжнім паверсе, калі на другім на ёй другая? Усё ламаць з-за аднае? Не-е, брат...

Па гэтым распараджэнні я зразумеў, што стары не без прычыны ўзяў на сябе начальніцкую ролю. Я нават не ўспеў загаварыць пра аплату, як ён кіўком галавы развітаўся і пайшоў, добра натаптаўшы па падлозе сваімі бітымі валёнкамі ў самаробных гумах з аўтамабільнай камеры.

Пакуль сцямнела, мы з маёрам раскідалі печку, пліту не чапалі, падвесілі комін. Сам я баяўся, каб з гэтым падвешваннем не нарабіць бяды, але маёр справіўся з заданнем, быццам рабіў такое не ўпершыню. Наогул, ён быў, як высветлілася, з тых добрых мужчын, часцей за ўсё ваенных, што ўмеюць усё і да ўсякай работы прыступаюць смела, зыходзячы з усім вядомага вызначэння, што не багі гаршкі лепяць. Брускі, якія нам былі патрэбны, ён зрабіў

з абрэзка дошкі-шасцідзесяткі, удала раскалоў яе і выраўняў сякерай, як фуганкам. Дзверцы, уюшкі ён спрытна вызваліў ад дратоў, якія мацавалі іх у гнёздах. Працаваць з ім было лёгка і прыемна: ён не прыгнятаў няспрытнага і няўмелага памочніка сваёй перавагай, не злаваўся і не пасмейваўся, зрэдку жартаваў, весела і някрыўдна. Мы падрыхтавалі скрынку на гліну, пясок, каб усё было пад рукой, і пакуль мыліся і пераапраналіся, на прымусе ў мяне закіпеў чайнік.

— Чаёк добра,— проста згадзіўся маёр, і мы пасядзелі на маёй кухні, дзе было чысцей, пакурылі, пагаварылі.

Маёр паглядзеў мае кнігі, перанесеныя сюды, каб не пыліліся. Паказаў на растрапаны томік Някрасава, сказаў, што яго трэба пераплесці. І калі я заўважыў, што пераплётчыка тут не знайсці, ён прапанаваў сам пераплесці кнігу і нават мяне навучыць гэтаму. Вядома, без абрэза пад прэсам гэта не тое, але ж кніга будзе цалейшая. Кнігі ён любіў з той пяшчотай і павагай, беражлівасцю, якая бывае ў чытачоў з самага простага люду. Невялічкую маю бібліятэку ён перабраў, разглядваў томік за томікам, больш затрымліваўся на паэзіі. Я сказаў, што ён, мабыць, любіць вершы, а гэта не часта сустракаецца сярод неспецыялістаў. Ён усміхнуўся сарамліва і адначасна з адвагай, падкрэслена жартаўліва і з выклікам.

— Чаго ж вы хочаце, сам вершы пішу. І нават друкую. Ага!

— Вельмі добра,— сказаў я і не ведаў, што больш гаварыць, спытаўся: — Даруйце, вы пад псеўданімам выступаеце, мабыць? Я не памятаю вашага прозвішча ў друку.

— Не, прозвішча сваё, толькі не часта. І потым, гэта газета акругі, яшчэ часопіс «Советский воин», іх тут няма.

З гэтымі словамі ён крыху засумаваў, і я пацікавіўся яго вершамі. Папрасіў паказаць мне што-небудзь. Ён ахвотна згадзіўся, пачаў чытаць вершы на памяць.

Тут я хачу зрабіць агаворку, чаму не называю прозвішча маёра: менавіта таму, што ён друкуецца, і такім чынам можа высветліцца, што герой майго твора і маёр адзін і той жа чалавек. А гэтага мне не хочацца, бо апісваю яго я ва ўсіх драбніцах. Паспрабаваў назваць яго ў апавяданні другім прозвішчам, але гэта нейк не ішло да яго, і я пакінуў яго проста маёрам.

Маёр прачытаў некалькі вершаў, я іх не памятаю: яны былі вельмі ж падобныя на многія тыя вершы, якія з'явіліся ў газетах і часопісах пра цалінныя землі, пра салдац-

кую славу, барацьбу за мір, гідрабудаўніцтва, плаціны, дзяўчат і маленькіх дзяцей — будучых равеснікаў камунізма — і вядома вершы пра вершы. І былі не проста падобны пявольным падабенствам, якога аўтар хоча пазбегнуць, а быццам наадварот, аўтар намагаўся з усіх сіл, каб вершы ў яго былі, як і ў астатніх людзей, як гэта трэба каб было. Пра гэта я не мог яму сказаць: вельмі ж падабаўся ён мне сваёй дабратой, спагадлівасцю, умельствам і не прытворнай, а шчырай сціпласцю. Я сказаў нешта пра нейкую не зусім удалую рыфму, заўвага была дробязная.

— Не,— запярэчыў ён ціха,— рыфма што ж... Рыфма ў мяне ёсць...— Папраўляў стосік кніг на стале, паўтараў задумліва: — Рыфма ў мяне ёсць...— У гэтым ягоным пярэчанні была сумная недагаворанасць: ён сам, можа, нешта ведаў пра свае вершы такое, чаго я не заўважыў, і чаго, як яму здавалася, я не зразумеў. І раптам ён загаварыў, быццам апярэджваў нечую ацэнку верша: — Вы знаеце, я не такі дурны, каб лічыць гэта тым, што заслугоўвае нечага... Але я не баюся работы, я ўпарты, як бык, я магу не спаць, не есці і не піць, калі мне трэба нечага дабіцца... Пачаў я пісаць на вайне, не калі ў роце быў, а калі паранены ляжаў: як толькі паранены, дык і новы спытак вершаў, як раненне, дык і творчы адпачынак.— Ён засмяяўся са свайго жарта і працягваў: — А мне шанцавала: параніла чатыры разы — і ўсе не тое каб і лёгка, але і не цяжка, якраз у меру, месяцы на паўтара ў тыл. Папішаш, пачытаеш уволю — і зноў на фронт. Так і шанцавала. І цяпер у мяне пасада такая, што кожны выхадны мой. А вечар? А ноч? Таксама мае. І, шчыра сказаць, не магу я без гэтага, за што ўзяўся, я павінен спасцігнуць. І не адступлюся, пакуль не спасцігну. Вось як ад гэтай печкі. Вы думаеце, я вучыўся на печніка, курсы канчаў? Але мне трэба было зрабіць печку, наймаць няма каго ды і няма на што: сямейка, слава богу. Дык што я зрабіў? Я два разы яе клаў: першы раз на пробу выклаў, запаліў, скумекаў, што да чаго, а потым разабраў, як мы з вамі гэту,— толькі тая яшчэ не высахла,— і ўжо канчаткова вывеў. Паліцца. Можа, Ягор Якаўлевіч і знойдзе хібы, але паліцца, працуе.— І ён зноў засмяяўся, але неяк надвое: была тут і пахвальба сябе самога, але і гатоўнасць прызнаць, што ўсё гэта крыху і забаўна.

У гаворцы высветлілася, што адзін час мы былі на суседніх франтах, і гэтае даволі ўмоўнае суседства яшчэ больш зблізіла нас, гэтак жа як быццам збліжае людзей у

далёкім краі даволі ўмоўнае зямляцтва. Я правёў яго крыху, потым доўга не мог яшчэ заснуць у сваім халодным і пыльным пакоі з раскіданай печкай. Мне думалася, што гэты добры маёр, заняты службай, заклапочаны вялікай сям'ёй, не павінен быў бы мучыць сябе яшчэ і вершамі. Я разумеў, што вершы ягоныя былі не ад патрэбы выказаць сябе менавіта ў гэтай форме. Пра вайну ён пісаў так, што для гэтага неабавязкова трэба было правесці чатыры гады на фронце і быць чатыры разы параненым. У вершах пра нейкае сацыялістычнае дзіця зусім не адчувалася бацькі пецярых дзяцей, з вершаў пра цаліну толькі і запомнілася, што «целина-потрясена», нарэшце, і ў вершах пра вершы было вядомае паўтарэнне ісціны, што вершы патрэбны ў баі і ў працы.

Можа, ён і пісаў вершы толькі таму, што верыў — можа асвоіць любую спецыяльнасць, не толькі без спецыяльнай падрыхтоўкі, але нават калі і не надта цягне яго да гэтага. Але не, хутчэй за ўсё імкненне быць аўтарам ужо занадта моцна развілося ў ім; можна было не сумнявацца, што на гэтым шляху яго чакае шмат расчараванняў і горычы...

Прачнуўся я ад стуку ў акно над маёй галавой.

Грукалі кійком не моцна, але патрабавальна. Гэта прыйшоў Ягор Якаўлевіч, хаця на двары было зусім цёмна. Я запаліў святло і адамкнуў дзверы. Ён быў у той жа куртцы з каўняром і з тым жа кійком-указкай. Ніякага інструмента і рабочага адзення пры ім не было. Пакуль я апранаўся, ён курыў і кашляў, смаркаўся, пляваўся, разглядваў усё, што было падрыхтавана для работы.

— Ага, значыць адпачываем! Ага,— гаварыў ён паміж смарканнем і пляваннем.

Было відавочна, што ён задаволены тым, што застаў мяне ў пасцелі і прыйшоў раней, чым маёр, па якога я збіраўся ісці. Але маёр прыйшоў услед за старым праз хвілін дзесяць.

— Выхадны ж,— апраўдваўся ён і разгортваў пакунак з рабочым адзеннем.

— У каго выхадны, а ў нас з вамі рабочы дзень,— холадна адазваўся стары, назваў маёра на «вы», пакуль ён быў у кіцелі. Але, можа, гэтыя словы адносіліся заадно і да мяне з маёрам.— А вось гліну трэба было звечара замачыць, менш бы мясіць давялося. І цёплая вадзічка не пашкодзіла б. Не дзеля рук, а каб раствор быў яшчэ ліпчэйшы.— Раствор — гэтак ён называў увесь час гліну, не-

рамешаную з пяском, раўняў яе з цэментам. Пакрэхваючы, прысеў над фундаментам, прыкінуў сваёй палачкай і сказаў: — Чатыры на чатыры, больш не трэба.

— Ягор Якаўлевіч,— маёр падаваў яму свой складны метр.

Стары ўзмахнуў кійком.

— У мяне ў ім усе меркі, якія нам патрэбны. А калі не верыш — перамерай.

Але перамяраць не сталі. Гаворка проста ішла пра тое, што ніз печкі будзе чатыры на чатыры цагліны. Ягор Якаўлевіч пераклаў кіёк у левую руку, а правай хутка, адзін за адным выклаў цагліны насухую па вызначаным квадраце, устаў і паказаў на іх кійком:

— Вось так і будзеш весці.— Потым узяў са скрыні камяк замешанай намі гліны, расціснуў у руцэ, паморшчыўся і кінуў назад.— Трэба яшчэ крышку пяску. Куды, куды гэтулькі! Сказана ж — крышку. Вось і хопіць. Размяшай добра.

Мы пачалі работу, і з самага пачатку ў кожнага было сваё месца. Я замешваў гліну, падносіў і падаваў цэглу, маёр вёў кладку, а Ягор Якаўлевіч — я не магу сказаць дакладней,— узначальваў работу і кіраваў намі, як і раней з дапамогай свайго кіёчка-ўказкі, прысядаў, хадзіў, пакурваў і пакашліваў. Часам ён быццам і забываў пра печ, гаварыў пра тое, што рана ўставаць карысна, што перад работай нельга мець справу з віном, пра свой кашаль, які асабліва лютуе пасля ночы, пра якасць цэглы рознага абпальвання і пра многія іншыя матэрыялы. Але я заўважаў: за работай ён сочыць так, што ніводная цаглінка не легла на сваё месца без ягонага пільнага позірку, а часам і без кійка, які быццам незнарок лёгенька прыстукваў па ёй. Ягор Якаўлевіч быў у цёплай куртцы, а мы з маёрам у рабочым, у старых гімнасцёрках, ужо ўпарыліся і выцíралі лбы і насы аб рукавы і плечукі — рукі былі ў гліне. Ягор Якаўлевіч бачыў гэта і не праміnуў моманту, каб не павучыць.

— Уздыхні, друг, закуры.— Ён з хітрай гасціннасцю падаў маёру пачак свайго «Северу». Той выпраставўся і бездапаможна развёў рукамі.— Ага! Нечым узяць? Трэба рукі памыць? Ага? А гэта значыць, што ты яшчэ не пячнік, а глінамес.— Ён сунуў у рот маёру папяроску, даў прыкурыць і працягваў.— А павошта мне дзве рукі ў растворы? Не, хопіць адной, правай, а левая павінна быць сухая. Глядзі.— Ён адвёў убок кійком маёра, паклаў кіёк,

лёгкім рухам уверх асадзіў рукавы курткі ўніз, узяў левай рукой цагліну, правую памачыў у вядро з вадой, узяў жменю гліны.— Вось. Левай кладу, а правай падмазваю і зачышчаю. Зразумеў?

Ён хутка выклаў цэлы рад, хоць крыху і задыхаўся, але было відаць, што сілы на гэта траціць ён намнога менш, чым маёр.

— Левая заўсёды сухая! І тут не толькі тое, што я свабодна магу закурыць і твар выцерці, і нос падцерці, але і ў рабоце больш чысціні. Трэба табе, напрыклад, цвік — бярэш яго, акуляры альбо што іншае. Зашпіліць што-небудзь ці расшпіліць — калі ласка.— Ён паказаў, як гэта можна зрабіць левай рукой.— А ты стой, як чучала ў агародзе.

Майстар усміхнуўся нарэшце, задаволены сваім урокам, і таму дазваляў апошнія свае словы лічыць за жарт. Я быў рады за маёра: ён не толькі не пакрыўдзіўся, але і з захапленнем сачыў за ходам навучання, здалёк засланяў рот рукой, каб не вымазацца.

Ён паспрабаваў было зрабіць гэтак, як Ягор Якаўлевіч, але хутка яму чамусьці спатрэбілася перакласці цагліну з левай рукі ў правую, і ён здаўся.

— Не, Ягор Якаўлевіч, буду рабіць так, як магу.

— Давай, давай,— згадзіўся стары.— Гэта не зразу. А другі быццам і майстар нічога, а ўсё жыццё гэтак, як і ты...

Я ўпэўнены, што ён быў бы засмучаны і незадаволены, калі б маёру адразу ўдалося пераняць яго стыль. Відаць, і маёр зразумеў гэта, а таму і не стараўся. Потым Ягору Якаўлевічу, мабыць, надакучыла вучыць, і ён паставіў дзве цагліны на рабро, шчыльна, адна да адной, падняў руку над імі, быццам збіраўся ўзяць, і прапанаваў:

— А вось так адной рукой паднімеш?

Але маёр засмяяўся і пагразіў Ягору Якаўлевічу пальцам:

— Не, гэта фокус стары, гэта я ўмею!

— Умееш? Ну што ж! А другі б'ецца-б'ецца і не можа. Здаралася, на паўлітроўку спорылі.

Фокус быў у тым, як мне здавалася, што трэба было непрыкметна ўставіць паміж цаглін указальны палец, і тады абедзве цагліны можна было лёгка падняць і пераставіць на іншае месца.

Успамін пра паўлітру прымусіў мяне падумаць і пра снеданне, бо ўжо зусім развіднела, было амаль дзевяць

гадзін. Я сказаў, што ў мяне свой клопат, пайшоў на станцыю, дзе купіў хлеба, каўбасы, кансерваў і гарэлкі. Па дарозе дадому я зайшоў да Іванаўны і атрымаў ад яе цэлую міску салёных агуркоў — ад іх на свежым паветры ішоў востры і смачны пах часнаку і ўкропу. Прыемна было прайсціся, выпрастацца: у мяне ад работы ўжо забалела спіна, і я думаў, што і маёр адпачне, пакуль я хаджу. Але дома ўбачыў, што работа ішла без перадышкі, кладка паднялася да пліты, былі ўвязаны дзверцы і Ягор Якаўлевіч ужо без курткі, у вязаным джэмперы, выкладваў левы паўкруг скляпення, а маёр быў замест мяне на падачы. Яны працавалі хутка і спорна, маёр ледзьве ўспяваў. І яшчэ яны спрачаліся.

— Талент у чалавека павінен быць адзін,— гаварыў Ягор Якаўлевіч, рабіў работу, і левая рука была сухая.

Цела яго ў світэры здавалася маленькім пры вялікіх і доўгіх, з цяжкімі кісцямі руках, падобных на ракавыя клюшні. Спрэчка ў іх, відаць, пачалася з таго, пра што гаворка пачалася яшчэ пры мне,— з майстэрства, стылю ў рабоце,— але яна ўжо далёка выйшла за першапачатковыя рамкі.

— Талент павінен быць адзін. А на што няма таленту, за тое і не бярыся. Не псуй. Вось што я заўсёды гавару, а ты гэта запомні.

— Чаму ж адзін? — пярэчыў маёр спакойна і нават з адчуваннем сваёй перавагі.— А Рэнесанс — эпоха Адраджэння, Леанарда да Вінчы?

Ягор Якаўлевіч, мабыць, чуў гэтыя словы ўпершыню і злаваўся, што не ведае іх, але ўступаць не хацеў.

— Гэтага мы з табой не ведаем, гэта нам невядома, што там калі было.

— Як гэта невядома, Ягор Якаўлевіч! — здзівіўся маёр, азірнуўся на мяне.— Усім вядома, што Леанарда да Вінчы быў мастаком, скульптарам, пісьменнікам. Вось спытайцеся.

Я вымушан быў пацвердзіць, што сапраўды так яно і было.

— Ну, было, было,— зазлаваўся прыціснуты да сценкі стары,— але ж калі было? Да цара Гароха... Калі кожны сам сабе і жнец, і шавец, і на дудзе ігрэц.

— Гэта вы ў мой агарод?

— Не, я наогул. Другое развіццё развіваецца, другая тэхніка, усё, брат, другое.

Я здзівіўся гістарычнасці погляду Ягора Якаўлевіча, сказаў пра гэта і запрасіў перакусіць.

За сталом Ягор Якаўлевіч наадрэз адмовіўся выпіць.

— Гэта потым, калі ў печы запалім... Ты выпі,— сказаў ён маёру,— табе нічога.

— Ну, а вы, можа, усё ж?

— А я ўсё ж не магу: па рабоце. За мяне няма каму думаць.

Маёр не настойваў і не пакрыўдзіўся.

— Тады я вып'ю за вас чарачку. Будзьце здаровы!

Мы з маёрам выпілі. Размова ў нас завязалася зноў пра літаратуру. Зачапілі Маякоўскага, пра якога маёр гаварыў, як пра святога, чытаў і чытаў на памяць яговыя вершы, з такім захапленнем, што забываў заслапяць рукой сваю ўсмешку. А я думаў пра тое, чаму ён, калі гэтак любіць Маякоўскага, піша зусім інакш — роўна, акуратна, падражае ўсім на свеце, але толькі не свайму куміру. Але я не спытаў пра гэта, а сказаў толькі, што калі даводзіцца знаёміць школьнікаў з паэзіяй Маякоўскага, часта спатыкаешся па такія словы і словазлучэнні, якія ідуць у разрэз з законамі роднай мовы. Маёр пярэчыў горача і злосна, назваў мяне, хоць і жартам, кансерватарам і дагматыкам.

Ягор Якаўлевіч еў вяла, запіваў чаем, курыў і маўчаў з гонарам і адчужана, хацеў перачакаць нашу гутарку. «Калі я пра гэта нічога не чуў і не ведаю,— быццам гаварыў ён усім выглядам, крахтаннем, пасопваннем,— дык толькі таму, што ўсё гэта мне не трэба і нецікава, і зусім нейкае глупства». Але калі мы ўспомнілі пра Пушкіна, ён сказаў:

— Пушкін — вялікі рускі паэт.— І сказаў гэтак, быццам ён адзін толькі пра гэта ведае, сам дайшоў да гэтага і першы гаворыць па ўсім белым свеце.— Вялікі паэт! Эх! — Ён прыплюшчыў вочы і прачытаў з падкрэсленым захапленнем і замілаванасцю:

— Скажи-ка, дядя, ведь недаром
Москва, спаленная пожаром,
Французу отдана?

— Ды гэта ж Лермантаў,— засмяяўся маёр.

Але стары толькі скасавурыўся на яго і працягваў далей:

Ведь были ж схватки боевые,
Да, говорят, еще какие!

— Гэта ж Лермантава «Барадзіно»! — з вясёлым абурэннем перабіваў яго маёр і штурхаў мяне локцем.

Недаром помнит вся Россия
Про день Бородина!

Апошняе слова Ягор Якаўлевіч прамовіў моцна, выразна і нават тыкнуў пальцам на маёра: я ж, маўляў, пра тое самае і гавару. І рашуча не даваў перапыніць сябе:

— Ах! А «Палтаўскі бой»? «Горит восток зарею новой...»

— Вось гэта Пушкін, праўда,— не ўнімаўся маёр.— Толькі гэта цэлая паэма «Палтава». А так гэта Пушкін.

— А хіба я гавару, што не Пушкін? Хто ж яшчэ мог так напісаць? Можа, Маякоўскі твой? Не, брат!

— Маякоўскага таксама няма ўжо жывога. Што ён бы яшчэ напісаў — невядома.

— Хэ! — стары з вялікім недаверам махнуў сваёй цяжкай рукой.

— Ну і корань вы, Ягор Якаўлевіч! — маёр заклапочана пакруціў галавой, ссунуў маршчыны на лбу пад карані густога чорнага бобрыка.— Ох, корань!

Старому, мабыць, прыемна было пачуць, што ён корань, але ён адразу даў зразумець, што і гэта для яго не навіна.

— Слава богу, восьмы дзесятак распячатаў. Пажывіце, як я, тады будзеце гаварыць.— Гэта ўжо адносілася не толькі да маёра, але і да мяне, і да ўсяго нашага пакалення.

Але маёр і цяпер не захацеў хоць крыху паступіцца сваёй перавагай.

— Корань, корань! А «Барадзіно» ўсё ж напісаў Лермантаў.

Ягор Якаўлевіч нічога не сказаў, падзякаваў і ўстаў з-за стала прыгнечаны. Я думаю, што ён і сам зразумеў свой промах з «Барадзіном», але прызнацца ў гэтым было горш вострага нажа, як і тое, што ён не чуў пра Леанарда да Вінчы. Мне было шкода яго, як і заўсёды шкода старога чалавека, калі ён вымушаны быць пераможаным тымі, у каго перавага маладосці, ведаў і памяці.

Пасля снедання работа пайшла яшчэ весялей. Абодва печнікі сталі на кладку: Ягор Якаўлевіч ад кухні, маёр — ад пакоя, а я на сваё месца. Але работа ішла моўчкі, калі не лічыць кароткіх заўваг, якія датычылі толькі работы.

Можа, гэта быў вынік пядаўняй спрэчкі, у якой перамог маёр, а можа, і таму, што сама кладка рабілася больш складанай: пайшлі розныя «абароты», душнікі, уюшкі, падводка пліты да агульнага дымахода, і гэта патрабавала засяроджанасці.

Я не спрабаваў выводзіць майстроў з гэтага стану, таму што мне цяпер, на падачы дваім, было толькі ўспявай падварочвацца. А пакуль яны рабілі перакур, я спяшаў падрыхтаваць, падсунуць усё, што трэба, каб лягчэй было справіцца. Новая печка ўставала пад столь, на якой быў падвешаны комін, намнога меншая і таму быццам стройнейшая і прыгажэйшая. Абагрэўныя сценкі і люстра было выкладзена ў чвэртку цагліны, гэта значыць, у адну цагліну, пастаўленую на рабро. Калі Ягор Якаўлевіч пачаў рабіць з цэглы выпускі накшталт карнізу, печка стала яшчэ прыгажэйшая, і я бачыў яе ўжо пабеленай: яна будзе ўпрыгожваць пакой, калі ўсё прыбяру да прыезду Лёлі. Каб толькі палілася як след.

Трэба было падмасціцца, каб працаваць угары, пайшлі ў ход мае табурэткі, а потым і стол, які заслалі газетамі. Цяпер там, угары, працаваў адзін Ягор Якаўлевіч, ён цяпер быў тут гаспадар-уладар.

Калі яму спатрэбілася на карніз некалькі цаглін з выкаланай чвэрцю, з роўна выбітым вуглом, ён загадаў гэта зрабіць маёру. Маёр сапсаваў адну цагліну, другую, за трэцюю ўзяўся ўжо пачырванелы і надзьмуты, але і яе разваліў на кавалкі. Я чакаў ядавітых заўваг ад Ягора Якаўлевіча, але ён, здавалася, нават са спачуваннем аднёсся да няўдач асістэнта:

— Цэгла дрэнная. Хіба гэта цэгла? Дай сюды...

Ён спрытна падхапіў цагліну левай рукой, якая ў яго была сухой, падкінуў, зручна размясціў на далоні, лёгенька, быццам яйка аб яйка, цюкнуў па ёй малатком, выкалаў тое, што трэба. Гэтак жа ў яго атрымалася і з другой, і з трэцяй цаглінай, і з астатнімі, толькі некаторыя ён абколваў з двух альбо трох удараў.

— Ну-у,— сказаў маёр.— Во гэта да! Ну, чорт!

Але стары майстар жадаў быць велікадушным — свой спрыт ён аднёс на нялепшую якасць цэглы.

— Трапляецца і нічога.— Аднак не ўтрымаўся ад хітрай усмешкі.— І бачыш, падрад колькі трапілася...

Мы з маёрам засмяяліся, засмяяўся і сам Ягор Якаўлевіч. І я ўбачыў, што ён з ліхвой суцешаны за сваё паражэнне ў другой вобласці. Мы ўдвух абслугоўвалі яго і

проста любаваліся, як ён цагліна за цаглінай падводзіў кладку пад стары комін, як потым былі выбіты з-пад яго плечыкаў брускі — і нічога страшнага не здарылася, усё было як па шнуры, хаця Ягор Якаўлевіч ні разу не ўзяўся за правіла.

Адвячорак ужо зрабіў прыцемак у пакоі, калі Ягор Якаўлевіч злез з падмосткаў, наступіў урачысты момант апрабавання новай печкі. Я хацеў быў уключыць святло, але Ягор Якаўлевіч запярэчыў:

— Не трэба. Хіба агню не ўгледзім?

Ён прысеў перад печкай, але не на калені, сеў на заднікі сваіх вялікіх валёнак, як сядзяць звычайна сяляне ў санях, ля кастра альбо вакол агульнага катла на зямлі. Выклаў на сырыя яшчэ каласнікі трэскі і дробна наколатыя паленцы, выцер запалку, але не паднёс да падпалкі, запаліў газету, усунуў яе ў маленькія дзверцы паддувала і толькі потым запалак, які згарэў амаль да самых пазногцяў і сагнуўся ў кручок, ткнуў пад дробныя стружачкі. Газета хутка згарэла ў паддувале, а касцярок у печы разгараўся павольна, слаба — я нават баяўся дыхаць, гледзячы на яго,— але разгараўся. У маўчанні мы ўтрох глядзелі на яго. Вось ён пайшоў весялей, ахапіў і большыя трэскі,— спачатку было гэтак і ў старой печцы, а што далей? Ягор Якаўлевіч падкладваў дровы па метаду Іванаўны, агонь чапляўся за іх усё ўпэўненей і хутчэй, а потым у печы запалала весела і ярка, і гэта было асабліва прыемна ў прыцемках, якія запоўнілі пакой. Ягор Якаўлевіч цяжка ўстаў з калень.

— Ну, з новай печкай вас! — сказаў ён і пачаў мыць рукі ў рабочым вядры.

Дык вось чаму ён не даў мне запаліць святло: гэтак агонь у печцы быў відней, прыгажэйшы. Ягор Якаўлевіч быў паэт сваёй справы.

Калі мы з маёрам памыліся і пераапрануліся, я не без трывогі падступіў да перагавораў пра аплату Ягору Якаўлевічу. «Мая аплата вядомая»,— памятаў я сказаныя ім некалі словы і гатовы быў на ўсё, мяне толькі трывожыла: ці хопіць грошай, якія былі пры мне, каб разлічыцца зараз і спаўна. Печ гарэла выдатна, ужо былі ўкінуты тоўстыя палены, і яны загарэліся, і ўсё было гэтак добра, што я нават забыў выбегчы і паглядзець, ці ідзе з коміна дым: ідзе, калі печ гарыць.

— Што пра гэта гаварыць,— неяк адмахнуўся Ягор Якаўлевіч,— чаго пра гэта гаварыць...

— Не, усё ж, Ягор Якаўлевіч, скажыце мне, колькі вы павінны атрымаць?

— Ну, колькі яму, гэтулькі і мне,— зноў жа ці то су-р'ёзна, ці проста так адказаў ён і паказаў на маёра.— Разам рабілі. Ды і вас трэба браць у долю: дапамагалі.

— Ягор Якаўлевіч,— разгубіўся маёр,— тут у нас зусім іншыя адносіны, мне нічога не трэба. Я раней сказаў, што нічога не вазьму, бо не спецыяліст...

— А я таму не вазьму, што спецыяліст. Зразумела? Ды што тут гаварыць! Давайце лепш з пагоды запуску печы... Цяпер і я не адмоўлюся...

Я паспрабаваў схлусіць, што аплата гэтая для мяне нічога не значыць, што большую частку заплоціць школа, але тут Ягор Якаўлевіч перапыніў мяне строга і пакрыўджана:

— А гэта вы зусім дарэмна гаворыце, каб я са сваёй школы грошы браў... Не гэтакі я бедны, слава богу, і таму ніколі сабе не дазволю...

Можа, пакрыўджанасць у яго з'явілася з-за таго, што маёр і тут апярэдзіў яго, загадзя адмовіўся ад грошай, але так ці інакш, размову гэту мне давялося перапыніць.

Маёр усё гэта чуў, і калі мы селі за стол, паглядзеў на Ягора Якаўлевіча нейкім дзіўным — вясёлым і збянтэжаным — позіркам, паглядзеў-паглядзеў і раптам спытаўся:

— Ягор Якаўлевіч, ці ты не злуешся на мяне за нешта? — Пытанне было незвычайнае хаця б таму, што маёр звярнуўся да старога на «ты».— Ну, можа, я нейкім чынам пакрыўдзіў цябе?

— Не, чаму ж? — здзівіўся той і, быццам упершыню бачыць яго, агледзеў маёра ў ягоным кіцелі з пагонамі і трохпавярховай калодкай ордэнаў і медалёў.

— Чым вы маглі мяне пакрыўдзіць? Рабілі разам, усё добра, сварыцца нам быццам і няма чаго...

Цяпер Ягор Якаўлевіч гаварыў маёру «вы»: відаць, ён лічыў, што той ужо не знаходзіўся пад яго камандай, як у час работы.

— Ну што ж. Добры ты чалавек, Ягор Якаўлевіч, не кажу ўжо, што майстар. Давай вып'ем з табой, будзь здаровы!

Яны чокнуліся, быццам між імі і сапраўды нешта здарылася, а потым наступіла прымірэнне і ўзаемная радасць.

Потым да нас зайшла Іванаўна — яна ўгледзела дым над комінам, за ёй прытупаў і сам Мацвееў; яны таксама

выпілі з намі, хвалілі печку і ў вочы Ягора Якаўлевіча. Ён выпіў тры чаркі, расчырванеўся, пачаў хваліцца, што ён рабіў, і можа зрабіць і цяпер не простую рускую печку ці галандку, але і шведскую, і круглую — «бурак»,— і камін, і печ з паравым абагрэвам, і што ніхто так не зробіць, акрамя яго, таму што ў яго талент, а талент — справа рэдкая. Мабыць, ён крыху захмялеў, гаварыў моцна, але калі я захацеў наліць яму яшчэ, ён рашуча накрыў чарку рукой.

— Норма! — І пачаў развітвацца.

Я хацеў правесці яго, не з-за хмелю ягонага, а спадзяваўся, што за дарогу дамоўлюся пра аплату. Але ён цырымонна падзякаваў за пачастунак, знайшоў свой кіёк і развітаўся.

— Праважаць мяне? Я не дзеўка...

— Корань усё ж! — Сказаў услед яму маёр.

Мы яшчэ пасядзелі, пагаварылі. Іванаўна прынесла новых дроў, каб напаліць заўтра, і пачала прыбіраць у пакоі. Печка абсохла, нават пакой крыху абагрэла, і на душы ў мяне было добра, быццам больш у жыцці не будзе ніколі непрыемнага і цяжкага.

*1953—1958*

# Сяргей Залыгін

## БЛІНЫ

Гарачыя бліны добра мачаць у масла. Ідуць яны і са смятанай. І з варэннем з чорных парэчак. Добра ідуць бліны пад чарку, ідуць раніцой нашча, не ўпіраюцца і ў абед.

Лбоў Ціхан, галоўны бухгалтар і член праўлення калгаса «Сібірскі партызан», вось ужо колькі дзён бачыў перад сабой бліны.

Не толькі бачыў — адчуваў. Адчуваў пах бліна — духмяны, густапшанічны. Ніколі і нідзе на зямлі не пахне так пшаніца, як у блінах. Адчуваў ён блін і ў сваёй вялікай руцэ — гарачы, нібы паўдзённае сонца ў ліпені, мяккі і нават пухкі, падобны на толькі што вылупленае з яйца гусяня. На слых блін таксама даваў сябе адчуць — зняты з патэльні, ён яшчэ доўга ўздыхаў, але ўжо не гучна і сярдзіта, а ціха і ласкава, нібы кот перад сном.

Колер у бліна залацісты, таксама сонечны — так і просіцца на язык. Усё, што мае такі залацісты колер, абавязкова расце ў роце.

На смак... Тут ужо нічога не скажаш пра тое, як духмяны, гарачы, пухкі і залацісты пшанічны блін растае ў роце пад чарку. Нічога не скажаш, бо няма такіх слоў, каб не толькі сказаць — падумаць пра гэта.

Калі лічыць па-старому, ішоў вялікі пост, але Лбоў Ціхан, хоць і прытрымліваўся міхайлавага дня, каляд, вялікадня, сёмухі, да вялікага посту ставіўся без спагады.

І калі адбылася затрымка з блінамі, дык толькі з-за новага старшыні. Новы старшыня Пыжыкаў не даваў машыны, каб з'ездзіць у горад на млын намалоць сапраўднай, прыдатнай толькі на бліны пытлявапай мукі і яшчэ грэчкі да яе.

Дакладная лічба старшыняў у калгасе «Сібірскі партызан» вялася да дзесятага калена — не далей. У даўнія часы фігуры старшыняў ужо знікалі, мітусіліся, як тыя цені. Здаралася хто-небудзь і ўспамінаў, што адразу пасля вайны быў такі старшыня — Калупянкоў, але хто быў да

Калупянкова і хто пасля — ужо ніхто не памятаў. Нават цярплівае вывучэнне архіва праўлення наўрад ці развязала б гістарычную загадку.

Апошнім старшынёй, пасля якога прыйшоў Пыжыкаў, быў Калістрат Калістратавіч Абмяняйла-сын. За паўгода свайго гаспадарання ён перасягнуў усіх сваіх папярэднікаў, у тым ліку і Абмяняйлу Калістрата Калістратавіча-бацьку. Перасягнуў ён іх усіх па графе «крэдыт». У бухгалтарскіх кнігах калгаса заключная лічба гэтай графы дасягнула пры ім шасці знакаў. Яшчэ крыху папрацаваў бы Абмяняйла-сын — і ўсе шэсць васьмёрак і дзевятак гэтай шасцізначнай лічбы ператварыліся б у пузатыя нулікі, а ўзначаліла б гэты рад сёмая выразная лічба — худая адзінка.

Але не давялося Абмяняйлу-сыну давесці справу, што пачаў бацька, да канца, не давялося адзначыць свой рэкорд-мільён па графе «крэдыт»: прыйшоў Пыжыкаў.

З яго прыходам лічбы ў гэтай графе папаўзлі ўніз, упаў і настрой бухгалтара Лбова, усіх братоў Лбовых: родных — Ціхана, Ігната, Аляксея, стрыечных — Хведара, Прохара, Сямёна.

Зрэшты, у Пятроўцы даўно ўжо не было гаворкі пра сваяцкасць паміж братамі Лбовымі, ведалі толькі, што галоўны з іх — Лбоў Ціхан, што жывуць браты па прынцыпе «чым горш, тым лепш». Чым горш ішлі справы ў калгасе, чым больш заблытваўся ў даўгах, махінацыях і выпіўках новы старшыня, тым больш набіралі сілы Лбовы, асабліва Лбоў Ціхан. Чым ніжэй падаў працадзень, тым больш лбоўскай жывёлы пасвілася на калгасных пасевах і менш знаходзілася ахвотнікаў гэтую жывёлу выганяць — ёсць патрава ці няма яе, працадзень усё роўна нічога не варты.

І вось тут ужо звычна і смела гучалі прамовы братоў Лбовых на сходах — крытычныя, выкрывальныя, міралюбныя, агітацыйныя і хвалебныя,— якія заўсёды скіраваны на сваю карысць. Лбоў Ціхан упэўнена ляскаў у канторы костачкамі лічыльнікаў, а кладаўшчык Лбоў Ігнат грукаў гірамі вагі; фуражыр Лбоў Прохар гучней за ўсіх сварыўся з даяркамі, каб яны не агіналіся, а ўвішней прымалі корм жывёле; загадчык птушкафабрыкі Лбоў Хведар не толькі што днём — уночы рупіўся, правяраў цёплыя гнёзды нясушак; старшы конюх Лбоў Аляксей часцей ездзіў у горад на базар, і весялей гучаў тады баян у руках Лбова Сямёна. Лбоў Сямён — самы малодшы з братоў —

Другі год адпачываў у Пятроўцы пасля зняволення, усё прыглядаўся, якая праца ў калгасе будзе яму больш даспадобы. Старэйшыя браты ўлагоджвалі Сёму, як малое дзіця.

Новага старшыню Пыжыкава браты Лбовы запрасілі на хрэсьбіны. Не прыйшоў. Пасля запрасілі на памінкі, на вяселле, на Пятра і Паўла — на кожным тыдні браты Лбовы лёгка знаходзілі дзень, каб сабрацца за сталом, запрасіць госця. Пыжыкаў не прыходзіў. І на Кастрычніцкія святы таксама не быў у іх Пыжыкаў, і на Новы год не зайшоў, і Восьмага сакавіка не павіншаваў Лбовых жонак і дачок.

Тады большасцю галасоў праўленне пастанавіла прадаваць старшыні прадукты з кладоўкі па базарнай цане. Цэны гэтыя вызначаў жонцы Пыжыкава кладаўшчык Лбоў Ігнат. Разлічваючыся, жонка Пыжыкава гучна ўздыхала, грошы адлічвала павольна, але сам Пыжыкаў па-ранейшаму казаў Лбову Ціхану «дзякую», калі той запрашаў яго на вячэру, і не прыходзіў.

Пасля знік са старшынёвага «Масквіча» замок запальвання. Лбоў Ціхан спачуваў, лаяўся на народ, што жыве ў Пятроўцы, і сказаў, што ёсць у яго знаёмы, які не толькі што замок запальвання — самога «Масквіча» і нават «ЗІЛ» можа даць у прыдачу хоць цяпер. Сустрэцца з гэтым патрэбным чалавекам можна і сёння на кватэры ў Лбова Ігната ці ў яго, Ціхана.

Не прыйшоў Пыжыкаў пабачыцца з патрэбным чалавекам.

Пасля не даў Лбоў Прохар кватэры маладзенькай аграномцы. Паблукала тая ды пасялілася ў адным доме з Пыжыкавым. Праз тыдзень у раёне зрабілі Пыжыкаву заўвагу — навошта, маўляў, ты, таварыш, эксплуатуеш чужую працу, выкарыстоўваеш агранома як хатнюю работніцу? Чаму яна мые тваіх дзетак? Ці за гэта калгас ёй плоціць грошы?

Сёмага лістапада на стале ў братоў Лбовых дыміла сытнай парай вараная, смажаная і тушаная жыўнасць двух калгасных двароў: веснавы прыплод свінаматкі, гусі, качкі. Яшчэ была студзіна з галавізны і пожак бычкапярэзімка. Цэнтнер цукру пераварылі на брагу.

У Пыжыкава таксама было свята, была баранова лапатка, якую ён купіў у кладоўцы Лбова Ігната па перадсвяточнай базарнай цане, былі госці — аграномка, яшчэ два-тры камсамольцы і дзве-тры салдаткі.

Пыжыкаў спяваў, танцаваў, паказваў у асобах, як жонка купляла ў Лбова Ігната баранову лапатку, гаварыў, што калі-небудзь яго жонка паедзе ў сонечную Грузію, на бераг Чорнага мора, адпачываць — заслужыла.

Пазней паказвалі Пыжыкаву ў раёне сігналы. Сігналісты сцвярджалі, што старшыня спойвае моладзь, і аграпома таксама спойвае, і заатэхніка.

І вось няма ўжо больш запрашэнняў Пыжыкаву ад братоў Лбовых і, відаць па ўсім, ніколі не будзе. Не будзе таму, што запіў на міхайлаў дзень і прагуляў тыдзень Лбоў Прохар, фуражыр. Большасцю ў сем галасоў супраць чатырох праўленне вызваліла Лбова Прохара ад абавязкаў фуражыра.

Не будзе запрашэнняў Пыжыкаву да стала братоў Лбовых, таму што большасцю ў восем галасоў супраць трох праўленне калгаса перавяло старшага конюха Лбова Аляксея ў радавыя конюхі: Лбоў Аляксей коней і калёсы з калгаснай стайні пазычаў прамарцелі ў горадзе.

І ўжо зусім нездоўга да Кастрычніцкіх святаў у калгасе была выяўлена вялікая прыпіска малака.

Зачасцілі ў калгас камісіі. Раённая газета паведаміла пра абуральныя факты. Дзяўчына-сакратарка ў прыёмнай старшыні райвыканкома ўжо не віталася з Пыжыкавым.

Ноч напярэдадні таго дня, калі Пыжыкаву прапанавана было з'явіцца ў райком і пакласці на стол партбілет, ён праседзеў не звёўшы вачэй у канторы. Перагортваў бухгалтарскія кнігі, лісты ўліку надояў, ведамасці налічэння працадзён даяркам, квітанцыі маслазавода на здадзеную прадукцыю.

Лічыў на маленькай лінейцы і на вялікіх канцылярскіх лічыльніках.

Недзе гадзін у пяць Пыжыкаў усхапіўся, забегаў ад дзвярэй да цёмнага акна, ад акна да дзвярэй. Лінейка паказала — прыпіскі няма і быць не можа. Было гэта відаць па грашовай суме, якую атрымалі за малако. Па бухгалтарскіх дакладных кнігах выходзіла наадварот — прыпіска ёсць. Яшчэ атрымлівалася па гэтых кнігах, што якраз за тыдзень да гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі камуніст Пыжыкаў стане беспартыйны, выходзіла, што Пыжыкаў жулік, што месца яго на лаве падсудных, што нямала слёз яшчэ пральс жонка Пыжыкава, нямала выпадзе ёй бяссонных начэй.

Гадзін каля сямі раніцы ў канторы з'явілася цётка Феня, прыбіральшчыца. Моўчкі яна падмяла кантору ве-

нікам з палыну; палыннны пах здаўся Пыжыкаву асабліва горкім. Сярдзіта ён сказаў цётцы Фені:

— Пачакала б прыбіраць...

Цётка Феньня ў адказ падняла яшчэ гусцейшы пыл, прыгаворваючы, што парадку ў канторы няма і ніколі не будзе, калі не толькі ўдзень — усю ноч у памяшканні курыць. Потым сказала:

— Усё шукаеш? Шукаеш усё... Узяў бы ды паглядзеў, якім такім манерам цялушкі рэкорды па малаку ставяць.

Дык вось дзе была памылка: дванаццаць цялушак па акце старшыні рэвізійнай камісіі Лбова Прохара былі запісаны дойнымі каровамі, адны за тры месяцы, а другія і за паўгода да першага ацёлу. Вось і выходзіла: валавы надой завышаны, а малака няма і не было ў прыродзе.

За гэту памылку бухгалтару Лбову Ціхану праўленне аб'явіла вымову большасцю галасоў (два ўстрымаліся).

Вось з таго часу ніколі больш браты Лбовы і не запрашалі старшыню Пыжыкава пагасцяваць, пабавіць час у свойскай кампаніі.

З гэтае пары, збіраючыся разам, браты Лбовы часцей і часцей пускаліся ў нярадасныя ўспаміны пра бычкапярэзімка, з-за якога ўсё пачалося паміж імі і старшынёй Пыжыкавым, пра таго праклятага бычка.

А пачалося яно ў першы ж дзень, калі Пыжыкаў прыступіў да сваіх абавязкаў.

У кукурузе ён убачыў тады дзесяткі са два разнамасных сытых цялят і сказаў старшаму даглядчыку жывёлы:

— Куды ж ты, бацька, глядзіш — на тваіх вачах жывёла псуе калгасныя пасевы! Хутчэй выганяй цялят!

— Якіх? — спытаўся даглядчык.

— Ды вунь тых, што ў кукурузе!

— Тых цялят? Цялушачак, значыцца?

— Ну, іх! Ага...

Даглядчык пачухаў патыліцу, уздыхнуў:

— Дзе ж мне за тымі цяляткамі — ці ўгонішся? Куды там!

Пыжыкаў паціснуў плячамі, паклікаў хлапчука, што стаяў побач:

— Выгані ты, хлопец, цялят з кукурузы... Ды ў стойла іх!

— Цялят? — спытаў хлапчук, ды так спытаў, нібы першы раз у жыцці ўбачыў дзівосных звяроў...

— Ага, цялят! Ці не бачыш? — здзівіўся Пыжыкаў і

падумаў: «Народ, відаць, не вельмі кемлівы ў Пятроўцы!»

Хлапчук пагразіў пальцам Пыжыкаву і сказаў:

— Хітры ж вы, дзядзечка... Цяляты не чые-небудзь, а лбоўскія...

— Якія?

— Лбоўскія, кажу. Не разумееце вы, ці што?

— Ну і што з таго — лбоўскія?!

— А заганіце самі, будзеце ведаць, што з таго...— Хлапчук яшчэ раз скоса зірнуў на Пыжыкава, усміхнуўся і адразу ж знік — як ветрам здзьмула.

Пыжыкаў пагнаў цялят сам. Узяў дубец, зайшоў у кукурузу, сцебануў адно, другое. Цяляты спачатку торкнуліся ў розныя бакі, пасля збіліся кучай, пайшлі. Гнаў Пыжыкаў цялят вуліцай, і кожны раз, калі мінаў двор каго-небудзь з братоў Лбовых, ці той, адкуль браты бралі сабе жонак, або куды яны выдавалі дачок, хто-небудзь выскокваў на дарогу. Цяляты кідаліся ўбок, сабакі брахалі. Лбоўская радня гучна каменціравала падзею:

— Пастух, відаць, з вышэйшай адукацыяй!

— Колькі ж ты сабе працадзён налічыш за тое, што жывёлу пасвіш, даражэнькі?

— Трымай таго, чырвонага, лабатага, за рогі — а то ўцячэ!

І быў у Пыжыкава толькі адзін памочнік у гэтай справе — пярэзімак, цёмны, нейкай конскай, амаль гнядой масці. Памахваючы ўніз і ўверх пляскатай галавой з чорнай плямай на носе, ён ішоў, не звяртаючы ніякай увагі на сабак, ішоў туды, куды гнаў яго Пыжыкаў, і за ім неахвотна, лепа, але ўсё ж цягнуліся і іншыя цяляты.

Калі заставалася ўсяго некалькі крокаў да расчыненых дзвярэй стойла, адтуль раптам выйшаў Лбоў Аляксей — старшы конюх. Выйшаў, паглядзеў на сонца, пазяхнуў, прыкрыў рот валасатай, у гнаі, рукой.

Цяляты кінуліся ў абодва бакі ад чалавека, адно з іх трапіла пярэднімі нагамі ў кадушку, жаласна мыкнуўшы. Толькі пярэзімак як ішоў, так і рушыў наперад, ледзь не збіўшы з ног Лбова Аляксея, і пабег у стойла.

Лбоў Аляксей сказаў:

— Вітаю, таварыш новы старшыня! Адкуль гэта цялятак панабегла? Шусь, паганыя!

Бычок у кадушцы мыкнуў яшчэ жаласней, праваліўшыся нагамі глыбей. Не адказваючы Лбову Аляксею, Пыжыкаў прайшоў у стойла, загнаў пярэзімка ў бакавую перагародку, на дзверы павесіў свірпавы замок.

Лбоў Аляксей сказаў:

— Гэта брата майго, бухгалтара вашага Лбова Ціхана, жывёла...

Два дні ў кантору далятаді немыя крыкі пярэзімка, два дні Лбоў Ціхан, бухгалтар, седзячы за сваім сталом насупраць старшыні, быў вясёлы, смяяўся, называў Пыжыкава на «ты».

На трэці дзень ён сказаў:

— Трэба будзе на праўленні абмеркаваць бычка... Якое спагнанне прысудзіць праўленне, тое і будзе. Па дэмакратыі...

Пыжыкаў адказаў: навошта бычку дэмакратыя, ёсць закон — за патраву дзвесце рублёў штрафу.

На трэці дзень раніцай Лбоў Ціхан прынёс дзвесце рублёў і стаў называць Пыжыкава на «вы».

На міхайлаў дзень браты Лбовы даелі пярэзімка, але забыць яго не маглі доўга: усе беды, усе напасці, здаваліся ім, ішлі ад той гнядой жывёліны.

Трэба было пачакаць, не аддаваць за патраву штрафу, хай бы той бычок здох у стойле з голаду, хай бы Пятроўка даведалася, які жывадзёр старшыня Пыжыкаў.

Трох бычкоў не пашкадавалі б браты Лбовы, каб паўтарыць усё нанава, каб не пасмейваліся з іх у Пятроўцы, не нагадвалі пры зручным выпадку пра гнядога чарнаносага бычка.

Аднак гісторыя, як вядома, не паўтараецца.

І моўчкі ганяе цяпер Лбоў Ціхан костачкі на лічыльніках, а насупраць яго, прыбегшы з поля, з кароўніка ці яшчэ аднекуль, не-не ды ўсаджваецца Пыжыкаў. Сядзе, выме з кішэні сваю лічыльную лінейку, пасоўгае планку туды-сюды, паварушыць шкельца, падумае, і не раней Лбоў Ціхан уцяміць, што да чаго, як старшыня кажа, колькі павінен калгас утаргаваць за рыжыкі, колькі трэба заплаціць МТС, колькі абышлося ферме адно курынае яйцо.

Прыйдзе нехта з калгаснікаў, выкажацца за пасеў якой-небудзь сельскагаспадарчай культуры:

— Я так, старшыня, мяркую, а ты правер, ці так? Пацягні, га!

Пыжыкаў за планку пацягне, кіўне:

— А што, нябдага... Можа, яшчэ якія будуць прапановы?

Маўчыць Лбоў Ціхан. Не ўмешваецца. Не паспявае ён пакласці ўсе гэтыя лічбы на свае вялікія лічыльнікі, якія

яшчэ бацька яго ў тысяча дзевяцьсот трыццаць першым годзе, не без выгоды, прадаў калгасу.

Лічыць Лбоў на гэтых лічыльніках, каб капейка сышлася з капейкай. А тысячы, дзесяткі, сотні тысяч рублёў цягае ўзад-уперад на сваёй кішэннай лінейцы Пыжыкаў.

Сядзяць яны мірна, размаўляюць спакойна, лагодна — чорны, з калматымі бровамі, з чырвонымі падпалінамі ў няголенай барадзе Лбоў Ціхан і невысокага росту, вастравокі старшыня Пыжыкаў. І толькі прыбіральшчыца цётка Фенья паглядзіць-паглядзіць на іх, уздыхне і сама сабе скажа:

— Хай бы ўжо што-небудзь зрабілася...

І вось якраз тады задумалі браты Лбовы бліны.

* * *

Пыжыкаў убег у хату бледны, зусім змяніўшыся з твару. Скінуў куртку, наспешліва нацягнуў кажух. Жонка падумала — тэрмінова выклікаюць Пыжыкава ў раён, мабыць, непрыемная размова чакае. А было яшчэ горш.

Пыжыкаў крыкнуў:

— Нож! Нож, пытаюся, дзе шавецкі?

Жонка кінулася ад дзіцячага ложка:

— Сашачка, што з табой? Апамятайся! Навошта табе нож?! Не ведаю, дзе нож! Пра мяне падумай, пра дзяцей!

А ў Пыжыкава ўжо нож у руках, намацаў лязо пазногцем — усміхнуўся:

— Будуць бліны сёння ў Лбовых! Будуць блінцы са смятанай!

Сунуў нож у правы пім і выскачыў на двор. Прахрыпеў сіпатым на марозным паветры голасам старшынёўскі «Масквіч», крутнуў па вясковых вуліцах направа-налева і выскачыў на бальшак.

На бальшаку Пыжыкаў і шафёр Сцяпан выйшлі з машыны, уважліва сталі разглядаць сляды на ранішнім рыпучым спяжку.

Шафёр сказаў:

— Направа павярнулі... Значыцца, у горад!

Моўчкі кіўнуў Пыжыкаў — пагадзіўся з шафёрам.

Абшарпаны «ЗІС» у гэтую хвіліну сапраўды пад'язджаў да горада, былі ўжо відаць зацярушаныя снегам з наветранага боку фабрычныя каміны, цёмныя, расчыненыя насцеж вагоны на чыгуначных тупіках. Тут і там выбягалі ў стэп ускраінныя гарадскія вулачкі.

У кузаве «ЗІСа», падняўшы каўняры кажухоў і шчыль-

на прытуліўшыся да мяшкоў з зернем, сядзелі Лбоў Ціхан, Лбоў Аляксей, Лбоў Ігнат і яшчэ пяцёра — лбоўскія пляменнікі і дзядзькі. Размаўлялі на марозе не бойка, але і маўчаць таксама не маглі — раскрываўся каўнер то аднаго, то другога кажуха, з барановага футра высоўваўся твар каго-небудзь з пляменнікаў і дзядзькоў.

Лбоў Ціхан, закрыўшы нос рукавіцай, дыхаў на марозе густой парай:

— Ну, усё, бабы, салдаткі яго цяпер жывога пашматаюць. Абстругаюць да касцей, адны маслакі застануцца! Пакажуць яму аўтарытэт! — Лбоў Ціхан густа, басавіта зарагатаў і хуценька схаваўся ў каўнер.

Высунуўся Лбоў Аляксей, былы старшы конюх:

— Валяр'янт, што трэба! На ўсе сто дваццаць! І за тваю вымову, і за маіх кабыл!

Лбоў Ціхан дадаў:

— За бычка! — Памаўчаўшы, паўтарыў: — За бычка! — Пасля павярнуўся да Аляксея, каб той лепш чуў.— Варыянт — трэба казаць! Зразумеў? Ва-ры-янт!

Лбоў Аляксей застаўся пры сваёй думцы:

— А кінь ты!.. Валяр'янт — больш дакладна!

Лбоў Ігнат доўга прызапашваў пад каўняром цяпло, нарэшце і ён высунуўся на мароз:

— Учора ў кароўніку да яго падбегла старая Спірыдоніха: «Ксеня, кажа, паўхлебніца прыходзіць па старым календары. Той, кажа, палавіне зімы, што з хлебам, канец надыходзіць, цяпер, кажа, бясхлебная будзе палавіна. Да выпасу, кажа, таксама галодная трэць зімы жывёле застанецца. Вось гэтак па-старому было!» — Лбоў Ігнат зноў захінуўся ў кажух, але Ціхан памахаў яму рукавіцай — вылазь, маўляў, дагаворвай, пры чым тут Ксеня-паўхлебніца?

Не так хутка, але Лбоў Ігнат растлумачыў:

— Дык з гэтага і павялася далей іх размова: ён і кажа ёй, што, значыць, пара адстаўку даць той Ксені, лепш адзначыць свята Чырвонай Арміі, а яна яму: «Нядрэнна б бліны з таго выпадку, усё роўна пастоў не трымаемся».— «Вельмі добра,— кажа ён,— зробім». А яна: «Лбовы, кажа, на памол ехаць вырашылі». А ён: «Лбовы пачакаюць». А яна...

Тут Лбоў Ігнат зноў схаваў нос у каўнер. Яго штурхнулі ў бок, каб расказваў далей усё, як было, мабыць, ужо дзесяты раз, але з усімі падрабязнасцямі. Лбоў Ігнат, правёўшы па носе рукавіцай, працягваў:

— Яна кажа: «Супраць Лбовых не сунься. Спачатку ім, пасля ўсім астатнім». А ён кажа: «А калі, маўляў, якраз і наадварот?»

— А яна?

— «Не выйдзе»,— кажа.

— А ён?

— «Яшчэ як, кажа, выйдзе! Вось ты і паедзеш першая на млын».

— А яна?

— Адразу не паверыла... Пасля кажа: «Паспрабую».

Браты, пляменнікі і дзядзькі ўсе разам расхінулі каўняры:

— Ну, вось і паспрабавалі салдаткі! А мы — едзем!

— Паспрабавалі, значыцца!

— Патрымалі бязрогага бычка за рогі!

На гарадскім млыне было сёння даволі ціха: з дзесятак машын, дзве ці тры фурманкі — і ўсё. Мала знайшлося ахвотнікаў ехаць у гэтакі мароз... Шафёр «ЗІСа» Віталька, таксама з лбоўскіх пляменнікаў, уваткнуў машыну ў чаргу, дапамог вылезці з кабіны цётцы — жонцы Лбова Ціхана. Ціханава жонка, ледзь ступіўшы адной нагой на зямлю, закрычала, каб мужчыны асцярожней згрузілі яе кадушку з салёнымі памідорамі, хутчэй занеслі тую кадушку на базар, што працягнуўся побач з млыном двума драўлянымі павецямі, ды каб бегма па гіры і вагу збегалі. У яе быў свой разлік: мала завознікаў на млыне, невялікі і падвоз на базар.

Лбоў Ціхан пайшоў у цырульню, сказаўшы, каб паклікалі, калі прыйдзе чарга на памол. Лбовы Ігнат і Аляксей паляпалі рукавіцамі, паглядзелі на шыльду: «Буфет № 3 ад сталоўкі № 2», не згаворваючыся, адчынілі дзверы пад гэтай шыльдай. Пляменнікі і дзядзькі занеслі на базар кадушку з салёнымі памідорамі Ціханавай бабе, пасля патапталіся ля тых самых дзвярэй пад сіняй шыльдай і зайшлі.

Сказалі:

— Добры дзень...

Лбовы Ігнат і Аляксей адчувалі ўжо сябе тут гаспадарамі, адказалі:

— Не саромейцеся... Заходзьце.

— Гэта за свае грошы ды саромецца?

Пляменнікі і дзядзькі пакідалі кажухі на падлогу, занялі два столікі, заказалі па куфлю піва. Перад Лбовым Аляксеем ужо стаялі два, ён сказаў, каб яму прынеслі

яшчэ светленькай дзвесце грамаў. З яе ён і пачаў. Пераkуліў шклянку, паляпаў сабе па кадыку — усе яны, браты Лбовы, былі кадыкастыя.

— Парадак! Нібы сам пан бог басапож прайшоўся ўнутры раба свайго Аляксея Лбова — не пагрэбаваў! — Падзьмуў у піўную пену, тыцнуў палец у ямку: — Хлопцы, гляньце, га! Бліпок адтуль моргае! Гэта да чаго? Га?!

— А да таго,— не разгубіўся нехта з пляменнікаў,— што ты, дзядзька Лёша, сам бліны будзеш есці і нас запросіш!

Лбоў Ігнат паглядзеў на бойкага пляменніка з дакорам. Лбоў жа Аляксей грукнуў кулаком па стале:

— Так, пляменнік! Лбовы гуляюць — і сваякі ўсе гуляюць! Лбовы такія: калі ты да іх добра, яны да цябе яшчэ лепш! Вось так! У мяне баба спрытная, управімся да паўдня з памолам — увечары бліны будуць, што тваё сонца! Баба ў мяне, калі па праўдзе казаць,— люкс!

Хваліў Лбоў Аляксей сваю бабу і бліны, бліны і бабу — якія яны тлустыя і гарачыя. Пакуль не было Лбова Ціхана, выхваляўся, што баба яго тлусцейшая, чым Ціханава, і толькі калі ўспомніў Пыжыкава, увесь неяк адразу пасінеў, у кадыку яго нешта булькнула.

— Упоперак жыцця стаў Пыжыкаў! Не будзе!

Падхапілі ўсе:

— Не будзе! Бліны сёння будуць пячы ў Пятроўцы Лбовы, гасцей клікаць — Лбовы. Хто дужэйшы — Лбовы ці Пыжыкаў, кожны ўбачыць, чый аўтарытэт стаіць вышэй, кожнаму будзе зразумела. Агульны сход будзе — мала знойдзецца ахвотнікаў выступіць супраць Лбовых! Хутчэй бы той сход! Дадуць жыцця на сходзе Лбовы Пыжыкаву! Хадзіў пад Лбовымі не адзін старшыня, і гэты хадзіць! Па-хо-дзіць!

Пагаманілі яшчэ, раптам пачулі — на вуліцы хрыплавата прагудзеў «ЗІС».

Віталька накінуў паўкажушак, выйшаў паглядзець, ці не кліча хто, можа, і чарга на памол падышла ўжо, можа, хто са сваіх сігналіць радыятар разагрэць?

Абышоў машыну, глянуў туды-сюды — нікога няма. І раптам нечая далонь моцна сціснула яго руку вышэй локця.

Пыжыкаў! Ён!

— Давай, Віталька, сядай у кабіну...

Селі ў кабіну. Зноў гэтаксама ціха, спакойна Пыжыкаў загадаў:

— Уключай хуткасць!

Віталька правёў пальцамі па ўспацелым ілбе, націснуў на старцёр, пасля сказаў:

— Ключ у кажусе забыўся... У буфеце. Адну хвілінку...

— Пачакай, не спяшайся...— левай рукой Пыжыкаў прытрымаў за локаць Вітальку, правай выняў з-за піма нож, паскроб па лязе пазногцем, і было відаць — застаўся задаволены: нож востры, што тая брытва.

Віталька збялеў, ікнуў. Паглядзеў, як усміхнуўся Пыжыкаў, ікнуў зноў, ужо гучней.

— Ты тут пасядзі,— сказаў Пыжыкаў і шпарка выскачыў з кабіны, паставіў нож па шыну пярэдняга левага кола.— На ўсіх шасці скатах лапці твае паляцяць к чорту, зразумеў? Пакуль новыя не прышлю — будзеш загараць! Тыдзень на папраўку здароўя гарантую. Па кароткатэрміновым прагнозе, заўтра сорак тры — сорак пяць градусаў ніжэй пуля!

Прайшло некалькі секунд. Пыжыкаў прыўзняў руку з нажом — вось-вось уваткне ў шыну.

Матор цяжка ўздыхнуў, запрацаваў.

Пыжыкаў кінуўся ў кабіну.

Машына рванулася з месца, задні борт расчыніўся, мяхі з меткамі «Л. Ц.», «Л. І.», «Л. А.» адзін за адным вывальваліся з кузава, падалі абы-як на мёрзлую зямлю.

Першы выскачыў з цырульні Лбоў Ціхан; ён трымаў у руцэ кажух, па шыі ў яго матлялася сурвэтка, адна шчака была ў мыле. З брытвай у адной руцэ і з памазком у другой следам за ім бег гладкі цырульнік. Лбоў Ціхан быў сухарлявы, крокі ў яго былі шырокія, цырульнік прыкметна адставаў. Але тут Лбоў Ціхан паткнуўся на мех «Л. Ц.», закруціўся вакол яго і толькі паспеў паглядзець на Вітальку, які ў той самы момант заварочваў машыну ўлева, з плошчы ў завулак.

Яшчэ было відаць, як расчыніліся дзверы «буфета № 3 ад сталоўкі № 2» і з ганка ўзялі старт Лбоў Ігнат і Лбоў Аляксей, за імі — пляменнікі і дзядзькі.

У завулку стаяў «Масквіч», побач з ім — шафёр Сцяпан. Пыжыкаў сказаў Вітальку:

— Прытрымай!

Зарыпелі тармазы «ЗІСа». Віталька пачуў, як Сцяпан хутка закінуў борт на месца, як ён ляпнуў дзверцамі «Масквіча» і прагудзеў яму ў спіну: давай поўны наперад!

Гэтак яны і ехалі: «ЗІС» наперадзе, «Масквіч» — па

пятах. Ледзь толькі збаўляў хуткасць Віталька, шустры «Масквіч» сігналіў яму ззаду прастуджаным голасам.

Адстаў «Масквіч» ужо на прасёлку, які расчышчалі ад снегу пятроўскія калгаснікі. Скасіўшы вока на павароце, Віталька ўбачыў: Сцяпан выйшаў з машыны, размаўляе з людзьмі.

На наступным левым павароце Віталька зноў скасіў вока: Сцяпана ўжо не было відаць,— з усіх бакоў яго абкружылі людзі з рыдлёўкамі.

Аднак каля гаража «Масквіч» зноў дагнаў іх. Пыжыкаў са Сцяпанам моўчкі і хутка спусцілі ваду з машын, на дзверы гаража павесілі замок, ключ паклаў сабе ў кішэню Пыжыкаў.

Калі выходзілі з гаража, Сцяпан спытаўся ў Пыжыкава:

— А скажы, старшыня, калі ваяваў на фронце — гарачы быў у баі?

Пыжыкаў на імгненне спыніўся, нібы ўспамінаючы, пасля кіўнуў:

— А вось так — выгляну з акопа, а ўжо там кожны арыенцір з заплюшчанымі вачамі знайду. Пачуў каманду раз, паміраць буду — паўтару... Памятаю...

Вітальку Пыжыкаў і Сцяпан не заўважалі, быццам яго і зусім не было побач. Не лаялі яго, не дакаралі, не смяяліся з яго, і вось гэта найбольш крыўдзіла хлопца.

Ужо зусім сцямнела, калі да Лбова Ціхана прыйшлі Лбовы Аляксей, Ігнат, Прохар, Хведар, Сямён.

Гаварылі ціха, амаль шэптам. Сядзелі на кухні вакол стала, да паўлітэрак і закусі, што былі на стале, не дакраналіся. Сямёнаў баян ляжаў на лаўцы каля дзвярэй, паблісквaючы перламутрам.

Пытанне абмяркоўвалася адно: сітуацыя.

Лбоў Ігнат прапанаваў скардзіцца на Пыжыкава ў раён. За самаўпраўства. За здзек з людзей. За перавышэнне правоў. За пагрозу халоднай зброяй Вітальку. За прычыненую шкоду асабістай маёмасці калгаснікаў.

Лбоў Ціхан не падтрымаў брата:

— Не пасмяшыць бы людзей. Смех прыдушыш тут, у Пятроўцы, а выйшаў за сяло — яго ўжо не спыніш. Можа, лепей так: самім з сябе пасмяяцца?.. Я, напрыклад, згодзен,— уздыхнуў Ціхан,— сам не бачыў, а вы расказваеце, як цырульнік ляцеў за мной з намазком...

Лбоў Ціхан хацеў усміхнуцца — не атрымалася.

Лбоў Аляксей, былы старшы конюх, запытаўся ў Ціхана:

— Ты ў вёску па прасёлку страявым ці вольна маршыраваў? Я пакуль дайшоў, наслухаўся кпінаў — хопіць з мяне. І працадні налічалі за конскую работу — мех на сваім гарбе цягнуў, і на бліны набіваліся! Каму што — а з мяне хопіць.

— Ну і дурань... — паціснуў плячамі Лбоў Ціхан.— Мне ніхто ні слова. А чаму? Вельмі проста. Мы з бабай і мех і парожнюю кадушку закапалі каля бярозак пад снег, а самі загуменнямі, задворкамі дадому.

— Дзе ўжо нам раўняцца з табой розумам! Аднак смяяцца самім з сябе, Ціхан, зарэж — не будзем!

Прохар з Ігнатам пацвердзілі:

— Зарэж — не будзем!

Вырашылі тыдзень-другі радзей паказвацца на людзі, трымацца разам і строга, кожны вечар збірацца ў Ціхана або ў Ігната і не запальваць святла — няхай кожны бачыць, што браты Лбовы нешта задумалі не на жарт, да нечага рыхтуюцца.

Будуць чакаць-чакаць, гадаць-гадаць, што задумалі браты Лбовы, а тым часам бліны і забудуцца. Самае галоўнае — каб да сходу забылася, а там абавязкова здарыцца яшчэ які-небудзь выпадак: ці хто-небудзь парушыць дысцыпліну, ці злоўжыванне якое. Вось на гэты выпадак і наваляцца браты Лбовы на бліжэйшым сходзе. А потым... Потым Пыжыкаў, старшыня, убачыць, якія яны бываюць, браты Лбовы, калі хто беспаваротна пайшоў супраць іх: усё, што было да гэтага, толькі кветачкі!

Браты ўсё шчыльней схілялі адзін да аднаго калматыя галовы, раіліся, што б такое ўгатаваць старшыні Пыжыкаву... Адна толькі Сямёнава галава ўздымалася над імі. Сумна, мабыць, было Сямёну — ён пазяхаў, усміхаўся. Усмешка ў яго была ці то абыякавая, ці то з'едлівая — прынёс ён такую з турмы.

Раптам дзверы расчыніліся, у дом увайшла цётка Фенья, прыбіральшчыца.

— Здарова, грамадзяне мужчыны! Я ўжо думала, што ў хаце няма нікога — ціха неяк!

— Здарова! Табе чаго? — запыталіся браты Лбовы, рассоўваючыся на лаўках.

Фенья агледзелася:

— А гаспадыні, відаць, няма дома?

— Няма гаспадыні... — адказаў Ціхан.— Пайшла.

— І далёка?

— Ды ўжо далёка...

— А ці надоўга?

— Відаць, надоўга... Табе чаго?

Цётка Фенья сарамліва ўсміхнулася, расшпіліла ватоўку, павесіла яе на кручок ля дзвярэй.

— Парадак... Значыцца, няма гаспадыні...

— А табе, табе што?

— Дык вось я і кажу — няма, і дзякаваць богу. Без яе абыдземся, Ціханка!

Лбоў Ціхан ды і ўсе браты Лбовы зразумелі цётку Фенью: быў час, калі бухгалтар затрымліваў яе пры сабе ў канторы, надоўга затрымліваў, пакуль з крыкам і лямантам не прыбягала пад вокны Ціханава жонка. Але было гэта даўно, ужо забылася, цётка Фенья з таго часу прыкметна пастарэла, маршчакі прарэзалі яе некалі смяшлівы твар. Галоўнае ж, стала яна цішэйшая, маўклівейшая, і цяпер ад яе гучных слоў браты Лбовы скрывіліся, нібы ў іх раптам стрэльнула ў вушах. Адзін Сямён зарагатаў і гучна пляснуў сябе па каленцы.

А тым часам цётка Фенья скінула яшчэ і хустку, села на лаўку, пагойдала нагой:

— Холадна як на вуліцы — ратунку няма. Прымарозіла вось пальчык.

— Ну, хопіць! — падняўся Лбоў Ціхан.— Чаго расселася? Цябе хто клікаў? Чаго прыйшла?

— Вы, Ціхан Цімохавіч, клікалі.

— Ты што, звар'яцела?

Цётка Фенья памкнулася наперад, тыцнула пальцам у твар Ціхану:

— Вы бачыце, браты-браточкі, які ірад ён, гэты ваш Ціхан? Паклікаў, значыцца, прыйсці, а цяпер прыкідваецца: не ведаю, маўляў, чаго!

Браты пераглянуліся. Сямён зноў зарагатаў. Ціхан гаркнуў:

— Што брэшаш! Цыць адсюль!

— А-а-а! Падма-а-нваць бедную жанчыну! Угаварыў, а пасля ў кусты! Ірад супраціў цябе — чысты анёл нябесны!

Пакуль Лбоў Ціхан збіраўся крыкнуць яшчэ нешта, цётка Фенья зноў села на лаўку, пастукала нагамі ў падшытых пімах, уважліва паглядзела на іх і паўтарыла жаласна:

— Прымарозіла пальчык!

Лбоў Сямён устаў, падміргнуў Ціхану:

— Ну, клопат клопатам, а ўсяго не пераробіш. Пара дадому! — І падаўся па шапку.

— Ды ты ўжо прабачай, Сёма,— усё яшчэ стукаючы німамі, сказала цётка Фенья.— Кемлівы ты хлопец, Сёма...

Ціхан вырваў з рук у Сямёна шапку.

— Сядзі, кажу!.. Таксама пойдзеш па вёсцы выскаляцца! У-у, катаржнік!

Сямён спахмурнеў, адразу стаў на дзесяць гадоў старэйшы, паклаў руку з сіняй татуіроўкай на плячо Ціхану:

— Ану, паўтары, што сказаў? Паўтары, кажу!

Ускочыў Ігнат, стаў паміж Ціханам і Сямёнам. Сямён і яго другой рукой узяў загрудкі, паўтарыў пытанне:

— Ану, як сказаў?! Кажы, не бойся... Я не такіх бачыў!

Усхапіліся са сваіх месцаў Хведар і Прохар. Затрашчала нечая кашуля, гузікі стукнуліся аб падлогу і пакаціліся — адзін да дзвярэй, другі пад стол. Патузаўшыся, браты адцягнулі Сямёна ўбок, ён, не спяшаючыся, зашпіліў на сабе каўнер, сказаў Ціхану:

— Гаўкаеш, а паўтарыць баішся. Я ж таксама скажу табе, хто ты ёсць!

— Кормім цябе другі год... Разумець трэба было б...

— І яшчэ дзесяць гадоў будзеш карміць! Пакуль жывы будзеш... Не ты за мяне — я за цябе тэрмін адбываў!

— Крыўдзяць цябе, Сёма! — уздыхнула цётка Фенья.— Сапраўды, крыўдзяць... Калі кормяць яны цябе, значыцца, ёсць за што. Усе ў Пятроўцы кажуць. Што і гаманіць!

Ціхан кінуўся да Фені.

— Твая тут якая справа? Што табе трэба, чаго прыйшла, падлюга? Хто цябе клікаў? Калі?

— Сам падлюга! — абурылася цётка Фенья.— Сам і клікаў! А яшчэ мужчына! Прыкідваецца, горш за дзеўку! Напужаўся, калоціцца, што авечы хвост! Ану, завядзі па-авечы — бэ-бэ-бэ! Сам клікаў! Сёння ранічкай і клікаў!

— З глузду з'ехала баба!

— Мех мой з пшанічкай скідваў з машыны, а свой грузіў ды казаў: «Прыходзь, цётка Фенья, увечары па бліны! Пачастую!» Казаў ці не? Ну вось! — Усе прыціхлі, толькі цётка Фенья гучна пацягнула носам.— Ну, хопіць... Не хавай бліноў... Дух ад іх пшанічны, ох духмяны. Выстаўляй

на стол! Не шкадуй, кажу, блінкоў!.. Ай, прымарозіла я пальчык...

Лбоў Ціхан цяжка ўздыхнуў:

— Чаго ты на мяне вочы свае каровіны вылупіла?

Цётка Фенья зноў націснула плячамі:

— А якімі ж на цябе вачамі глядзець, як не каровінымі? Ты ж і сам сапраўды што той бычок, якога старшыня некалі заарыштаваў. Чыста яго, бычкоў, спрыт: міргнеш, пасля, значыцца, вылупішся, міргнеш, зноў вылупішся! Ну што, не верыш? Пабажыцца? — Цётка Фенья яшчэ пастукала пімамі адзін аб адзін, устала, павярнулася ў кут да абразоў і ўжо падняла была руку, каб перахрысціцца, ды раптам спынілася: — А ці варта бажыцца? Мо і так паверыш?

Лбоў Ціхан падаўся назад, не аглядваючыся, намацаў рукой на стале. Трапіў відэлец, ён сціснуў яго кіпцястымі пальцамі.

— Ну, глядзі ў мяне...

Фенья збялела.

— Крывасмо-ок! Рэж, калі, крывасмок! Гэта ж колькі ты ўдовінай крыві папіў, і ўсё табе мала?! Табе б увесь калгас з удоваў, ты б ужо разжыўся, бухгалцёр, азалаціўся б, праклятты, да самых нябёсаў! Табе ўсё адно, які старшыня, толькі б удоваў маўклівых болей, і жыццё ў цябе будзе — чыстая маліна! У-у-у, гад! — Яна ўздыхнула і дадала: — І зарэзалася б на тваім відэльцы. Паспрабавала б яшчэ раз — можа, цяпер і не прайшло б табе так. Паспрабавала б... Ды дзеці. Дзетак шкода, не сябе! — Раптам крыкнула гучна і пранізліва: — Дзяўчаткі! Дзяўчаткі, дзе вы там? Заходзьце, заходзьце — гаспадары прымаюць!

З цёмных сенцаў, жмурачыся на святло, увайшлі «дзяўчаткі» — бабка Семяніхіна, уся ў маршчаках, але рухавая і бойкая, і няскладная цётка Спірыдоніха, тая самая, што растлумачыла старшыні наконт ксенінага дня — Ксеніпаўхлебніцы.

Бабка Семяніхіна яшчэ з парога радасна пляснула ў ладкі:

— Здорава, значыцца, жывяце, мужыкі! А мы да вас! Па грамадскай справе! Ты ім не казала, Фенья, пра справы, га?

— Не, не казала пакуль што... Мы тут амуры з Ціханам разыгрывалі, ды Сёма вось перашкодзіў. Трымае брата — не пускае. Беражэ брата, не дае яму побач са мной на лаўцы насядзець!

Цётка Спірыдоніха засмучана паківала галавой, паўздыхала, пасля сказала:

— Малодшы брат — і хоча старэйшым кіраваць! Як жа ты, Ціхан, церпіш?

Ціхан прамаўчаў, за яго адказала цётка Фенья:

— І не пытайся, Спірыдонаўна! У Ціхана Цімохавіча і так цярпенне амаль што не лопнула... Вы там у сенцах, відаць, чулі, які тут у хаце вэрхал усчаўся!

— Вядома,— сказала бабка Семяніхіна.— У Лбовых кроў не старэе, кроў у іх, можна сказаць, усё ў адну гульню гуляе! Значыцца, браты ў поўным зборы! І здаровыя? Хворых няма?

— Што ты, старая, языком мелеш? Ну, няма хворых, табе што? — запытаўся ад стала Лбоў Хведар.

— А з гэтага нам старшыня Пыжыкаў і загадаў пачаць — даведайцеся, значыць, бабкі, ці ўсе яны ў зборы ў Лбова Ціхана ў хаце? Ці няма сярод іх хворых?

— Навошта яму? З якой нагоды?

— З нагоды агульнага сходу! — адказала цётка Фенья афіцыйна.— Казаў вам прыйсці абавязкова, калі здаровыя... Каб быў парадак, бо сярод вас тут два члены праўлення! Ну, хопіць, заседзеліся мы ў вас! Пайшлі, дзяўчаткі!

Цётка Фенья ўсміхнулася, усміхнулася так, як, бывала, даўным-даўно, яшчэ дзеўкай, успомніў Лбоў Ціхан, магла ўсміхацца яна адна: гарэзліва, хітравата.

Жанчыны выйшлі. Падхапіўшы за рэмень баян, пайшоў і Сямён.

Астатнія Лбовы яшчэ доўга стаялі нерухома, слухалі, як цётка Фенья і бабка Семяніхіна моцна грукаюць у вокны суседняга дома:

— На сход! Усім на сход! Пытанне разбіраць!

Доўга яшчэ Лбовы стаялі моўчкі.

## Рыгор Бакланаў

# ПАЧЫМ ФУНТ ЛІХА

Быў месяц май, ужо шосты дзень, як скончылася вайна, а мы ўсё стаялі ў нямецкай вёсцы: чатыры разведчыкі і я, старшы над імі. У вёсцы гэтай, не падобнай да нашых, было дванаццаць моцных, заможных дамоў, пад кожным домам — акуратна падмецены, насыпаны пяском склеп, і там — бочкі халоднага яблычнага сідру; у дварах — куры, ружовыя свінні, у стойлах цяжка ўздыхалі галандскія каровы, а за дамамі, па добра ўгноенай зямлі, расла збажына. І мірнае майскае сонца залаціла ўсё гэта: і збажыну на маленькіх палетках, і чырвоную чарапіцу дахаў, і ружовых свіней, і лагодных з самага ранку гаспадароў. Яны неяк адразу, без разважанняў, перайшлі да мірнага жыцця, так проста, быццам для гэтага давялося толькі зняць боты і абуць лямцавыя пантофлі, тыя самыя пантофлі, якія шэсць гадоў назад яны скінулі, каб абуць боты. Пра вайну яны не любілі гаварыць, толькі ківалі галовамі і праклiналі Гітлера: гэта ён вінаваты ва ўсім, няхай за ўсё і адказвае. А яны скінулі боты!

На другі дзень міру за вёскай, у збажыне, мы злавілі нямецкага яфрэйтара. Рослы, у чорным бліскучым афіцэрскім плашчы з аксамітным каўняром, ён стаяў сярод нас, а мы, схапіўшы немца, першы раз не ведалі, што з ім рабіць. Гледзячы на яго гарбавата паднятыя пад плашчом простыя плечы, я раптам адчуў умоўнасць многіх чалавечых паняццяў: пазаўчора ён быў вораг, а сёння ўжо не вораг і нават не палонны, і ў той жа час неяк нязвыкла адпусціць яго.

А ў ліпені сорак першага года... Мы адступалі, і шмат каго з нас ужо не было, але, узяўшы ў палон немца з вялікімі мазалістымі далонямі, мы ляпалі яму па спіне, спрабавалі нешта тлумачыць, нават спачувалі: вось ён — рабочы, а што Гітлер зрабіў з ім — прымусіў ваяваць супраць нас. І кармілі яго са свайго кацялка... Так было ў пачатку вайны. Ды вось яна скончылася, перад намі стаяў нямецкі

яфрэйтар, злоўлены ў збажыне, і ніхто з нас не мог узняць рукі, каб паляпаць яму па спіне. Не маглі мы цяпер сказаць адзін аднаму, як, мабыць, гаварылі салдаты пасля мінулых войнаў: «Ты салдат, і я салдат, і вінаватыя не мы, а тыя, хто прымусіў нас страляць адзін у аднаго. Няхай яны адказваюць за ўсё». Іншае ляжала паміж намі, іншай мерай пасля гэтай вайны вымяралася віна і адказнасць кожнага.

Але, відаць, жыхары вёскі і гаспадар дома, у якім я спыніўся, не адчувалі гэтага. Раніцаю, калі я, павесіўшы на спінку драўлянага ложка рэмень і пісталет, снедаў, гаспадар з люлькай у зубах уваходзіў у пакой і вітаў «гера афіцыра». Спачатку — ад дзвярэй, але праз дзень-два ён ужо сядзеў каля стала, паклаўшы нагу на нагу. У акно коса свяціла ранішняе сонца; ён, жмурачыся, пасмоктваў люльку з чорнай ад нікаціну металічнай накрыўкай і задаволена глядзеў, як «гер афіцыр» снедае. Ён таксама некалі быў малады і разумее, чаму ў маладога чалавека на раніцу такі добры, паўнацэнны апетыт. Прыжмураныя вочы яго лагодна ўсміхаліся. Чуваць было, як бегае па двары, звініць эмаліраванай даёнкай гаспадарова жонка. У васемнаццаць гадоў яна ўжо нарадзіла сына і цяпер, у трыццаць два, зусім не выглядала маткаю гэтага даўгалыгага, на паўгалавы вышэйшага за бацьку, худога нашчадка. Нам спачатку нават здалося, што гэта не яе сын, а яго ад ранейшага шлюбу.

У першы ж дзень гаспадар папрасіў у мяне дазволу начаваць у сваякоў з другой вёскі: жонка ў яго — маладая жанчына, а тут салдаты... Каб я не падумаў чаго благога, з намі будзе заставацца сын. З намі заставаліся ўся яго маёмасць, каровы, свінні, і ў мяне не ўзнікала сумненняў наконт прычын, з-за якіх у доме будзе начаваць сын.

Яны ішлі з дому, калі садзілася сонца, а хлопец дацямна яшчэ пазвоньваў у хлявах ключамі. Мы не звярталі на яго ўвагі. Сабраўшыся ў двары, разведчыкі глядзелі на захад сонца і ціха спявалі на два галасы пра казака, які паскакаў па «війноньку», і песня гэтая, сто разоў чутая, тут, у Германіі, сціскала сэрца.

Ранепька, яшчэ па халадку, гаспадары вярталіся. Ён ішоў павітацца з «герам афіцырам», яна адразу ж пачынала бегаць па двары, поўнымі ружовымі рукамі замешвала свінням, і ўсё гарэла ў гэтых руках. У двары ляпотна грэліся на сонцы мае разведчыкі, а яна бегала і бегала —

з кароўніка ў дом, з дома ў кароўнік, абдавала іх пахамі хлява, малака, гарачага поту і, страляючы вачамі, старалася па бягу мазануць каго-небудзь па каленях падалом спадніцы. А калі яна, упёршыся рукамі ў бокі, стаяла ў хляве і свінні тоўпіліся каля кармушкі, вішчалі, церліся аб яе расстаўленыя голыя ногі, яна са сваімі магутнымі клубамі, моцнымі формамі і заклапочаным тварам укормленага дзіцяці здавалася сярод іх помнікам сытасці і дастатку. Гаспадар жа быў нязграбны, жылаваты, з худымі плячамі, вялікімі кісцямі рук і заўсёднай люлькай у роце. Але праз расслабленую паходку, праз увесь гэты хатні выгляд неяк прабівалася вайсковая выпраўка, якую ён старанна хаваў.

Вось так і ў гэтую раніцу, пакуль я снедаў, ён сядзеў каля стала, вёў асцярожную размову. А я глядзеў на яго з-за краю шклянкі, і страшэнна хацелася дамоў, быццам мы не шэсць дзён, а сто гадоў ужо стаім у гэтай чысценькай нямецкай вёсцы, якая нейкім цудам апынулася ў баку ад галоўнай дарогі вайны. Была сёння толькі адна прыемнасць: у двары мяне чакаў новы матацыкл. Яго раніцай прыцягнулі разведчыкі, і я яшчэ не бачыў яго.

Каля акна, з мокрай дубовай кадкай перад жыватом, прайшла Магда. Нерухомы старэчы твар, голыя па локаць жылістыя рукі, на нагах — падкутыя салдацкія боты з кароткімі халявамі. Яна рабіла на нашых гаспадароў з восені. У гэтай вёсцы, здавалася, толькі для яе не настаў мір, і ніколі не будзе для яе таго міру, таксама як ніколі не надыдзе яе будучыня. Усё, што было ў яе, засталося ў мінулым, а ёй пры яе жалезным здароўі накапавана было яшчэ доўга жыць.

У яе быў муж. Камуніст. Яго забілі па мітынгу нажом у спіну. У яе быў сын, позні, адзіны. З ім яна пражыла другое жыццё, ужо не сваё — яго жыццё. Яго забілі ў сорак чацвёртым годзе на фронце.

Заспаны камандзір аддзялення разведчыкаў Маргосліп, у гімнасцёрцы без рэменя, босы, падышоў да яе, узяўся за кадку. Яна не выпускала яе з жылістых рук, і нейкі час, стоячы пасярод двара, яны цягнулі кадку кожны да сябе. Потым Маргосліп лёгка ўскінуў яе на плячо і панёс, а Магда ішла ззаду з цёмным нават у сонечны дзень тварам. Так яны зніклі за хлявом.

Я ні разу не бачыў, каб мае разведчыкі кінуліся памагаць каму-небудзь з гаспадароў: ні гаспадыні з яе такімі раскошнымі формамі, ні хлопцу. Адзіная, каго яны шкада-

валі, была старая Магда — яна страціла на вайне ўсё і цяпер працавала на людзей, якія не толькі нічога не страцілі, але, здаецца, яшчэ і прыдбалі.

Я даеў яешню з патэльні, наліў сабе другую шклянку віна. Яно было светлае, празрыстае, толькі што са склепа, і парожняя шклянка з мокрымі слядамі пальцаў на ёй доўга яшчэ стаяла на стале запацелая. Потым я перакінуў партупею — гаспадар пачціва прысутнічаў пры гэтым,— зацягнуў шырокі афіцэрскі рэмень і, адчуваючы кожны мускул, а з асаблівым задавальненнем — цяжар пісталета на баку, узяў афіцэрскую шапку і выйшаў у двор. Нават пасля такой вайны чалавек у дваццаць два гады, па сутнасці, застаецца яшчэ вельмі малады, калі могуць мець значэнне ўсе гэтыя дробязі, ды яшчэ на вачах у немца.

Пасля халоднага віна сонца ў двары сляпіла, а пад акном каля белай сцяны блішчаў і праменіўся сінявата-чорнай эмаллю і нікелем матацыкл. Ён задрыжаў ад заведзенага матора, я вывеў яго з двара і ледзь паспеў паставіць ногі на педалі, як ён ірвануўся пада мною, і палявая дарога пабегла, імкліва расхінаючыся насустрач. Я імчаўся па ёй угору, да блакітнай сцяны неба, і гэта была праўда, што скончылася вайна і мы ў Германіі. За ўсіх, хто не дайшоў сюды. Я да канца націснуў на газ і адчуваў ужо толькі вецер на зубах і прыемны халадок пад сэрцам — востры халадок жыцця.

За пераваламі была яшчэ вёска, там стаяў Валодзя Якавенка, начальнік разведкі другога нашага дывізіёна. Таксама з чатырма разведчыкамі. Па камяністым пад'ёме ў лесе, памагаючы нагамі, я ўзабраўся на перавал, і адтуль, з аглушальным трэскам, страляючы за сабой з выхлапной трубы, матацыкл уварваўся на вуліцу. Дрэвы, аканіцы дамоў, кветнікі — праз заслону слёз усё злілося ў дзве сонечныя паласы, якія быццам спыніліся ў кутках вачэй.

Наперадзе — развілка вуліц, куча друзу пасярэдзіне. Да Якавенкі — направа. І ў той момант, калі ўжо я паварочваў, нахіліўшыся разам з матацыклам набок, з-за дома выскачыла шчаня. Проста пад кола. Усё адбылося імгненна, рукі спрацавалі хутчэй за галаву. Я паспеў павярнуць руль, затармазіць. Мяне кінула вобзем і пацягнула па пыле, а я ўсё хапаўся за матацыкл рукамі.

З гарачкі ўскочыў. Каля дома хлопчык гадкоў трох трымаў тое шчаня на руках. Ён са страхам глядзеў на

мяне круглымі вачанятамі і з усяе сілы прыціскаў шчаня да грудзей.

Галіфэ маё трэснула на каленях, праз пыл на апечаных далонях выступіла кроў. Зламаны матацыкл ляжаў на кучы друзу, задняе кола яго круцілася. Я сеў на камень. Ногі ў мяне дрыжалі. Выплюнуў з рота зямлю. «Вось так і разбіцца мог. Пасля вайны...» Ад Якавенкі ўжо беглі сюды разведчыкі. Яны прынеслі ў дом усё па частках: асобна мяне, асобна шапку, якую нехта з хлопцаў адшукаў па другім баку вуліцы.

Пакуль з мяне сцягвалі боты, Якавенка стаяў побач са шклянкай гарэлкі ў руцэ.

— Выпі,— гаварыў ён.— Косці цэлыя? Як, хлопцы, ці цэлыя косці?

І пальцамі мацаў маю галаву.

— Церпіш? А тут? Ну дык нічога! Можна, ні!

Калі ўсе пайшлі, ён сеў побач са мною на ложак. І тут толькі я заўважыў, што ў яго твар хворага чалавека. Ад яго добра несла гарэлкай.

— Ведаеш,— сказаў ён,— я быў у канцлагеры. Тут жа канцлагер размяшчаўся. За тры кіламетры адсюль. Я ўчора ездзіў туды.

Ён выцер далонню лоб.

Я ведаў, што ў яго ў сорак першым пад Кіевам загінуў бацька, камісар танкавага батальёна Якавенка. А праз два гады да іх у хату прыйшоў чалавек і сказаў маці, што ён быў у палоне разам з іх бацькам, у адным лагеры. Ён уцёк адтуль, з Германіі, а бацька іх уцякаць ужо не мог і прасіў толькі перадаць сям'і, што ён жывы. Маці напісала пра ўсё на фронт сыну, не ведаючы, верыць ці не.

З таго часу была ў Якавенкі адна патайная надзея: вось прыйдзем мы ў Германію і ён даведаецца пра бацьку. І чым бліжэй быў канец вайны, тым большай нецярплівасцю ахутвалася яго надзея.

Учора ён убачыў нарэшце нямецкі канцлагер. Тым самым шляхам, ад варотаў лагера да крэматорыя, якім прайшлі тут сотні тысяч пакутнікаў, ішоў ён па зямлі, што ўвабрала іх кроў. Ён ужо ведаў, што, калі б і быў сярод іх назаўсёды зніклых слядоў след яго бацькі, ніхто ніколі не раскажа яму пра гэта.

— Там роў такі... За крэматорыем.— Якавенка раптам пабялеў.— Мухі на ім... Зялёныя... Я не адразу ўцяміў... Толькі чамусьці жудасна стала. Ад смуроду, пэўна... Там

чалавечы тлушч, у рове. Людзей спальвалі, і сцякала туды.

Ёнківаўся, сутула сціснуўшы каленямі рукі.

— Ведаеш,— сказаў ён,— я на адно спадзяюся: бацька быў камісар. А камісараў яны ў палон не бралі... І потым, той чалавек сказаў, што ў лагеры бацькава прозвішча было Якаўлеў. Не Якавенка, а Якаўлеў. Можа, пераблытаў з кім-небудзь? Маці яго больш ніколі не бачыла.

Што я мог адказаць яму? Я згадзіўся, што такое, вядома, можа быць, я сам ведаю некалькі такіх выпадкаў. Вось, напрыклад, у нашым палку, калі мы прарываліся з акружэння...

Якавенка сядзеў, ківаючыся, вочы яго былі заплюшчаныя, твар спалатнелы, на паружавелых скронях і на лобе выступіў пот.

Уночы, знянацку прачнуўшыся, я ўбачыў над сабою на столі шырокі цень: плечы на ўсю столь і ўцягнутую ў іх галаву. Падпёршы кулакамі скроні, Якавенка сядзеў за сталом, дзве свечкі ў сподачку знізу асвятлялі яго твар. Пачуў, што я не сплю, і ў пантофлях на босую нагу, у галіфэ, у непадпяразанай гімнасцёрцы перасеў да мяне на ложак.

— Мне там сказалі, попел... попел ад спаленых людзей на дарогі вывозілі. Палеткі пасыпалі тым попелам.

Ён нацёр горла. У яго сохла ў роце, і голас быў хрыплы.

— Я вярнуўся, пытаюся ў іх: «Ці ведалі пра ўсё гэта?» — «Нікс, нікс!» Не ведалі, кажуць. Дык ідзіце глядзіце! — Шыя яго налілася крывёю.— Не ідуць. Не хочуць ісці. Зразумеў? Побач людзей palілі. Попелам пасыпалі зямлю. А яны цяпер хлеб жаруць.

Ён падняўся, агеньчыкі закалыхаліся, цень ад рукі матлянуўся па сцяне да паліцы. Якавенка ўзяў адтуль нейкую цацку, павярнуў яе кляймом да святла: «Бачыш?» Кляймо было французскае. У хісткім святле глядзелі на нас са сцен, з паліцаў рэчы, штучкі, цацкі, якія дзіўна не стасаваліся адна з адной. Гэта былі рэчы з розных сем'яў, якія ніколі да гэтага не ведалі адна адну, якія гаварылі на розных мовах,— сабраныя разам рэчы людзей, магчыма, цяпер ужо знішчаных. А ў двары стаялі каровы, вывезеныя з Галандыі, свінні, прывезеныя з Даніі. І за некалькі кіламетраў адсюль — канцлагер.

На другі дзень я не мог глядзець на палеткі. «Попелам пасыпалі зямлю...» Не хацелася верыць у гэта. Я ведаў

ужо, як лёгка пры жаданні віну аднаго ці некалькіх перанесці на ўсіх. Але маўчалі ўсе. І тыя, хто ведаў, і тыя, хто толькі здагадваўся, і нават тыя, хто не ўхваляў.

Мы спускаліся пад гару, і разведчык, нацягваючы лейцы, прытрымліваў коней. Я ляжаў на сене, свяціла сонца, ад коней пахла гарачым потам, узбоч ад фуры беглі назад палі. На рыхлай попельна-шэрай зямлі — маладая, крыху запыленая збажына. Яна сакавіта льснілася, набіраючы сілу. І я не мог глядзець на гэтую зямлю, на гэтую збажыну.

У блакітна-ідылічным небе Германіі плылі чыстыя зіхатліва-белыя аблокі. Цень ад іх бязважка слізгацеў па зямлі. Мір і цішыня. Але колькім людзям у гэтым міры давядзецца ўваскрашаць і нанава хаваць забітых, а рэдкім шчасліўцам — сустракаць пахаваных!

Мы ўехалі ў вуліцу, завярнуліся каля двара, і разведчык пагнаў коней назад — ён спяшаўся,— а я пайшоў да нашага дома. Нікога з маіх хлопцаў у двары не было, гаспадары ж, ледзь толькі ўбачылі мяне, схаваліся ў кароўніку і там пра нешта шапталіся. Некалькі разоў адтуль выглядвалі іх усхваляваныя твары. Нешта адбылося за час маёй адсутнасці.

Я сеў на лаўку, выцягнуў нагу, якую было цяжка згінаць, хацеў закурыць. Але на мне было сіняе Якавенкава галіфэ, а запальнічку я забыўся ў сваіх. Гаспадар ужо ішоў да мяне. Я паслініў палец і пачаў церці абадраны на баку рэмень.

Гаспадар быў нават больш ветлівы, чым заўсёды. Убачыўшы ў маіх руках цыгарэту, адразу ж, але без залішняй паспешлівасці, як добраму знаёмаму, паднёс агонь. Пасля гэтага сеў таксама на лаўку — мужчына з мужчынам.

Яшчэ прыкурваючы, я прыкмеціў адным вокам, як прабегла ў хлеў гаспадыня. Твар у яе быў гнеўны і разам з тым спалоханы. Гаспадар быццам бы не заўважаў гэтага. Ён курыў люльку, і сонца свяціла нам абодвум у вочы. А тым часам да нас ішоў яго сын з запісной кніжкай і алоўкам у руках. Спыніўся перада мной, трымаючы разгорнутую кніжку каля вачэй, і, нібыта збіраючыся заспяваць, адкашляўся. Я глядзеў на яго знізу. Калі ён загаварыў, плечы ў яго апусціліся, выцягнулася ад хвалявання шыя.

Ён гаварыў хутка, я ўспрымаў сэнс толькі асобных нямецкіх слоў. Але ён настойліва паўтараў зноў і зноў, і я

нарэшце зразумеў. Выходзіць, без мяне тут нехта з разведчыкаў застрэліў свінню.

— Эршос, эршос! — паўтараў ён, паказваючы, як гэта было зроблена.

Праз двор, перавальваючыся, прайшоў Маргослін у новай бліскучай скуранцы. На разведку выйшаў, таму трымаўся незалежна. Хлопец яго не бачыў. З плямамі хваляванчя на твары ён казаў:

— Гэта была добрая свіння. Яна мела трыццаць кілаграмаў вагі і яшчэ магла расці. Але там было трыццаць кілаграмаў паўпацэннага свінога мяса. І кожны кілаграм каштуе...

Ён ужо некалькі разоў сказаў «костэт». З маленства я памятаў гэтае нямецкае слова. Тады я ведаў вершык: «Гутэн таг, фрау Маер! Вас костэн дзі аер? — Ахт пфеніг.— Ахт пфеніг? Дас іст цу тоер!..» Добрая, добрая фрау Маер!

У гэтую вайну быў эсэсаўскі генерал Маер, кат і садыст.

Падагнуўшы ногі пад лаўку, упіраючыся ў яе далонямі, гаспадар пагойдваўся ўсім целам. Кашчавыя плечы яго падняліся, галава ўвайшла ў іх. За ўвесь час ён не сказаў ні слова, толькі слухаў і з заплюшчанымі вачамі ківаў люлькай. Я зірнуў на яго рукі, што абхапілі пальцамі дошку. Гэта былі вялікія рабочыя рукі. У іх зморшчыны і вакол вялікіх пазногцяў паўядалася нешта чорнае. Зямля? А можа, попел?

Немец ківаў люлькай, а сын яго пры мне падлічваў нанава тое, што ўжо было падлічана ўсёй сям'ёй. Я мусіў пераканацца і сам убачыць, што мяне тут не ашукваюць, што за выдатную свініну з мяне возьмуць па сярэдняй цане. У хлопца набялеў нос і пальцы мітусліва рухаліся ўвесь час. Ён паднёс запісную кніжку да самых вачэй і прачытаў прозвішча таго, хто застрэліў свінню: «Зольдат Макарушка». І паглядзеў на мяне. Я не адразу зразумеў, што гэтае з цяжкасцю вымаўленае, чужое на слых «зольдат Макарушка» і ёсць Макарушка, наймаладзейшы з маіх разведчыкаў.

Ён прыйшоў да нас у вызваленай украінскай вёсцы, загаварыў да мяне, першага начальніка, якога сустрэў. Босы, здзічэлы і — па вачах было відаць — вельмі галодны, ён прасіў, каб мы ўзялі яго з сабой на фронт. У вёсцы той яго ніхто не ведаў, ён з'явіўся тут вясною, калі яшчэ не сышоў снег, і быў таксама босы, а скрозь падраныя

штаны відаць былі сінія ад холаду калені. Жанчыны лічылі яго прыдуркаватым, шкадуючы, зрэдку кармілі яго. З гэтай прычыны, відаць, і не забралі яго ў Германію.

Ён адразу прывык да разведчыкаў, але доўга яшчэ, расказваючы што-небудзь, гаварыў пра нас «рускія», як гаварылі немцы, а за імі — жыхары акупіраваных тэрыторый. Быў ён ціхі, бяскрыўдны і цяпер, калі ад'еўся, вельмі дужы. Не памятаю ўжо, хто першы ахрысціў яго Макарушкам, але імя гэта надзвычай ішло да яго, здаровага, рахманага хлопца, і ўсе так звалі яго, а сапраўднага імя ніхто і не помніў. Аднаго разу, калі мы ўдвух сядзелі на назіральным пункце, Макарушка расказаў мне пра сябе. Ён быў з партызанскай вёскі. Амаль усе мужчыны, сярод іх і бацька яго, пайшлі ў лес, але немцы чамусьці доўга не помсцілі сем'ям. Потым неяк наляцелі ўночы, сагналі жыхароў у школу, забілі дзверы, а будынак падпалілі. Тых, хто спрабаваў выскачыць з агню праз вокны, расстрэльвалі на месцы. Там, у агні, загінула яго маці. І ўсё ж, хоць аблава была нечаканая, многія жанчыны паспелі схаваць дзяцей. І частка жыхароў схавалася. Іх расшуквалі пасля па скляпах і ямах. Уночы вялі на расстрэл. Макарушка нёс на руках двухгадовую сястрычку. Каля яра ўсіх пастроілі ў рад. Аднаго Макарушка не мог дараваць сабе: што ў той апошні міг трымаў сястрычку на руках.

— Каб я яе на зямлю паставіў... Маленькая, згубілася б у нагах, можа, не заўважылі б. Ноч жа. А яна спужалася, трымаецца за мяне, не адарваць. Ногцікі ў яе былі, дык упіліся мне вось сюды.— Ён паказаў на шыю. І я падумаў тады: колькі ні пражыве ён на свеце, заўсёды будзе памятаць гэтыя вострыя ногцікі двухгадовай дзяўчынкі, якая ўсім маленькім целам адчула смерць.

«Яна яшчэ магла расці...» — сказаў малады немец пра свінню, якая важыла трыццаць кілаграмаў. Гэта была яго свіння, і ніхто не меў права беспакарана страляць у яе. І бацька, што сядзеў у пантофлях на лаўцы, ухвальна ківаў сваёй люлькай: ён быў задаволены сынам.

Я глядзеў знізу на маладога немца. Яму чатырнаццаць гадоў, і голас у яго ломкі, не зацвярдзеў яшчэ. Яму якраз столькі, колькі было Макарушку, калі яго з двухгадовай сястрычкай на руках павялі на расстрэл, калі ён потым, уночы, вылез з агульнай магілы, запоўз у гушчар лесу і там адзін, як звер, зёлкамі залечваў раны.

Гэты ў чатырнаццаць гадоў яшчэ не спазнаў нічым

фунт ліха, але ўжо добра ведае, колькі каштуе кілаграм паўпацэшпага свінога мяса. І вось ён, з паперкаю ў руках, перада мной, перакананы ў сваім праве выстаўляць нам рахунак.

На вячэру мы елі свініну. Гаспадары фермы, як заўсёды ў гэты час, пайшлі, незадаволеныя намі. Яны не падымалі вачэй, гаспадынііны шчокі гарэлі ад высахлых слёз. Толькі сын, малады кіраўнік, усё яшчэ ўвіхаўся каля жывёлы.

За фермай, за маленькімі дагледжанымі палеткамі, у цеснаце садзілася сонца, абломваючы промні аб спічастыя дахі. Мяккае апошняе святло трымцела ў празрыстым паветры, а ў пакоі панаваў ужо змрок.

Я пачуў, як стукнулі веснічкі. Потым зашоргалі незнаёмыя крокі. Праз акно мне была відаць толькі частка двара. Я пачакаў, і чалавек прайшоў далей, адкуль я ўжо бачыў яго. Чалавек быў змардаваны, цягнуў нагу, але па двары ішоў так, што я здагадаўся: ён тут некалі ўжо бываў. Дайшоў да дзвярэй хлява, зазірнуў у яго цёмную глыбіню. Ён не бачыў, што з-за кастра дроў за ім сочыць гаспадароў сын. А той ужо вытыркнуўся ўперад, гатовы грозна крыкнуць, ды раптам нешта змянілася ў яго твары: ён пазнаў гэтага чалавека.

Крокі чуліся ўжо на ганку. Фіранка на акне адрэзала тулава, і я бачыў толькі ногі ў стаптаных чаравіках, якія падымаліся па прыступках. Чалавеку было балюча ступаць на правую нагу; ледзь ступіўшы на яе, ён пераскокваў на здаровую, а хворую плазам цягнуў за сабою ўгору.

Ён не адразу знайшоў ручку дзвярэй, некалькі хвілін я чуў яго цяжкое дыханне з таго боку. Нарэшце дзверы адчыніліся, ён пераступіў цераз парог. Гэта быў стары ў шэрай выцвілай і, відаць, не яго вопратцы: яна вісела на ім. Ён агледзеў пакой, і зноў мне здалося, што ён тут некалі ўжо быў.

— Добры дзень! — сказаў я са змроку прасценка.

Ён уздрыгнуў, хуценька павярнуўся з нейкім дзіўным выразам вачэй. Але гэта быў не спалох. Разгледзеўшы, хто перад ім, ён зняў з галавы круглую лагерную шапку:

— Дзень добры, пане таварышу!

І, не адразу знаходзячы рускія словы, памагаючы сабе жэстамі, ён рукою абвёў пакой:

— Той... пан Рашке... дома? Нах хауз?

— Дома, дома. Цяпер няма яго,— казаў я чамусьці гучна, быццам ад гэтага руская мова рабілася яму больш

зразумелаю, і таксама памагаў сабе жэстамі.— Але паогул ён тут. Хіер.

— Хіер...— паўтарыў чалавек і падзякаваў: — Дзенькуе. Дзякуй, товажыш.

Я пасунуў да яго цяжкае дубовае крэсла.

— Сядайце.

— Дзенькуе бардзо. Мне тшэба пана Рашке зобачыць.

Ён сеў, востра выступілі худыя калені. Зблізку цяпер было відаць, што гэта не стары, а вельмі змардаваны чалавек з шэрым бяскроўным тварам.

— Ён прыйдзе,— сказаў я.

Макарушка прынёс патэльню. На ёй — кавалак сакавітай свініны і смажаная на свіным сале бульба. Усё было гарачае, шыпела, сквірчэла, і пах раздражняў галоднага чалавека.

Я адпусціў Макарушку, паклаў з патэльні на талерку палову мяса і бульбы, пасунуў да яго. І ўбачыў жах у яго вачах, калі ён глянуў на свініну.

— Ніц, ніц! — ён трос галавой.

— Ды ешце, ешце,— настойваў я.— Мне зараз яшчэ прынясуць.

Але ён слабой рукой упіраўся ў талерку. Я збянтэжыўся, бо нічога не разумеў. Наліў яму віна. Ён падзякаваў вачамі і з прагнасцю пачаў піць. На скронях яго то надзімаліся, то западалі жылы, на руцэ, якая трымала шклянку, выразна відаць было запясце — бранзалет з сухажылляў — і косці, што прамнямі ішлі да пальцаў. На зарослы, вялізны ад худзіны кадык — ён хадзіў угору-ўніз — страшна было глядзець.

Ён не дапіў, закашляўся і кашляў доўга, пакутліва, наліўшыся да сіні крывёю. Аж слёзы выступілі на вачах. Потым, знясілены, доўга не мог аддыхацца, рукі ў яго трэсліся.

— Вы жылі тут раней? — спытаўся я, каб памагчы яму ў размове пераадолець пачуццё няёмкасці ад сваёй немачы.— Вы ведаеце гэты дом?

Ён глядзеў на мяне, як глуханямы, быццам па губах стараўся зразумець, што яму гавораць.

— Вы не разумееце па-руску?

— Так, так,—ківаў ён.— Розумем. Помалу.

— Я кажу, ці не жылі вы тут некалі?

— Так,— і ён адмоўна паківаў галавою.

Мне раптам здалося, што ён не пры сваім розуме: такія ў яго былі вочы. Ён зноў агледзеў пакой.

— Поляк,— сказаў ён. І паглядзеў на мяне. Потым паўтарыў: — Поляк,— гэтым ён хацеў, відаць, растлумачыць мне сваё становішча тут, становішча чалавека, сілаю забранага ў Германію.

— Мая жонка... была тутай.— Ён паказаў праз акно на кароўнік. Падымаць руку яму было цяжка.— І сын муй... Гды сын уродзіл...ся і закжычаў, жона заслоніла ему уста. Так,— ён зацiснуў сабе рот рукою. І калі худая рука яго закрыла палову твару, вочы зрабіліся большыя, у іх была нечалавечая пакута.— Каб ніхто не слухаў! Але схаваць можна тылько мартвэго. Тылько мёртвага... Неяк раз яна карміла яго грудзьмі, млекем... До оборы,— ён зноў паказаў на кароўнік,— туды, до оборы вшэдл немец. Ніц не жэкл. Ніц не гаварыў! Тылько паглядзеў на дзецко, на сына, як яго кормяць млекем. Она не могла мі тлумачыць, як паглядзеў, тылько плакала і држала, кеды то мувіла. Цо моглэм зробіць? Цо? Працовалэм у другога немца ў тамтэй вёсцы, але цо моглэм зробіць?..

Шэрыя сухія вусны яго быццам знямелі ад холаду, ледзь варушыліся. Вочы спыніліся на адным пункце, шкляным бляскам адбівалася ў іх святло ад акна:

— Тэраз я бачу, як ён паглядзеў. Ён, господаж, даваў ёй ежу, каб могла працаваць, а хлопчык браў яе сілы. Потэм она ховала хлопчыка, як ішла ў поле. Муві, же услыхала его кжык... крык. Але я мыслю, тэн кжык она заўшэды мела ў сэрцы. Она бегла з поля і чула, як хлопчык, нашэ дзецко, кжычало. Немец у двары запрагаў коней. І хлеў,— ён паказаў рукой, не знаходзячы слова.— Дошка... Разумееш?

— Дошкай прыпёрты? Зачынены звонку?

— Так. Она чула, она адчыніла. Кеды вшэдла... калі ўвайшла туды, шмат свінняў... Кеды...

Ён зноў паказаў жэстам, і я здагадаўся:

— Разапхнула свінняў?

— Так, так... Там зобачыла нашэго хлопчыка. От тэго часу бачыла тылько тое. Кеды зусім страціла розум і больш не могла працаваць, немец узяў яе за руку і одпровадзіў до обозу... У лагер, розумееш? Там быў крэматорыум. Не ведзяла, доконд яе вядуць. І то было яе шчасце.

У змроку амаль не было відаць яго твару, толькі цені замест шчокаў ды паблiскваюць вочы ў глыбокіх вачніцах. Чуваць было, як у двары ціха спяваюць разведчыкі.

— Пултора рокі былэм у лагеры і дажыў. Абы прыйсці тутай...

Я прыгадаў, як хлопец, гаспадароў сын, глядзеў з-за дроў на паляка. Падышоў да акна, паклікаў Маргосліна. Песня абарвалася, усё бліжэй чулася рыпенне скуранай курткі. Маргослін спыніўся пад акном.

— Прывядзі сюды хлопца,— сказаў я.

Зноў у прыцемках зарыпела скуранка. Чуліся галасы, крокі ў двары, за хлявамі, вакол дома.

У пакоі было ўжо зусім цёмна, свяціліся толькі вокны ды люстра ў кутку.

— Там комора. Така велька комора... камера. Вось гэтымі рукамі зроблена.

Ён паказаў свае рукі і сам паглядзеў на іх.

— Туды людзей зганялі. І жоны, і дзеці. Дзеці з забаўкамі. З цацкамі. Ім казалі — там ест лазня. І людзі ішлі. І дзеці. Там,— ён узняў вочы на столь,— таке окенко. Там пускалі газ. Газ... І моя Катажына не ведзяла, доконд ее вядуць, і то было ее шчасце... Така млода... Она тутай. І ўсюды. У той зямлі. Усюды.

Я зноў убачыў у яго вачах іскру вар'яцтва. Але ж ён зусім не вар'ят!

На ўсякі выпадак я спытаўся, ці ведае ён вёску, куды ходзіць ночанач гаспадар, і ці зможа пайсці з намі. Мы сядзелі моўчкі і чакалі.

Нарэшце вярнуўся Маргослін. Хлопца нідзе не было, як я і думаў.

Учатырох — паляк, Маргослін, Макарушка і я — ішлі мы праз лес. Месяц, здавалася, ніяк не мог вырвацца з расколіны гары. Ён быў вялізны, медна-аранжавы, а гара перад ім — чорная. Нарэшце ён адарваўся, усплыў і пачаў хутка падымацца, паступова змяншаючыся. І калі ён спыніўся ўгары, у белым святле яго, якое зрабіла таямнічым усё наваколле, мы ўбачылі вёску: сіняватыя сцены дамоў, мокры схіл чарапічных дахаў, у цёмных вокнах — пераліваецца шкло. Мы ішлі загуменнямі. Ад двароў цягнула сонным, застойным цяплом хлява, мачой, а знізу — свежай сырасцю: там, пад навіслым хмызняком, блішчаў па камянях чорны ручай. Да яго вялі мокрыя ад расы каменныя прыступкі.

Два чалавекі сачылі за домам і хлявом, два ціха ўвайшлі ў двор, пусты і бяццам вымецены пад месяцам. Па драўляных драбінах мы ўзлезлі на вышкі. Сабака знізу аж ахрып ад брэху і кідаўся з ланцуга, які ўсё валіў яго на спіну. Аднак ні ў адным акне не загарэлася святло, ніводныя дзверы не рыпнулі.

На сене бялелі побач у цемры дзве пярыны. У іх яшчэ засталіся ўмятыя сляды ад целаў. Мы абмацалі ліхтарыкамі ўсе куткі на вышках, у хляве, у доме і ў двары. Тых, каго мы шукалі, не было нідзе. Іх не было і назаўтра. Пазней мы даведаліся, што яны пайшлі на Захад. Утрох.

Жыхары казалі, што гэта былі вельмі благія людзі. Некаторыя прыгадалі, што ён быў нацыст. Усё гэта яны гаварылі цяпер.

— Чаму ж вы раней маўчалі?

Яны паціскалі плячамі:

— Баяліся...

Толькі Магда не казала пра іх ні благога, ні добрага. Яна наогул ні з кім не размаўляла. Яшчэ некалькі дзён яна прыходзіла, як заўсёды, зранку, карміла свіней, падмятала двор, даіла кароў — выконвала свае абавязкі, якія механічна прывязвалі яе да жыцця. І надоенае малако стаяла ва ўсіх бітонах і кісла.

Магчыма, і цяпер нашы былыя гаспадары ўспамінаюць тыя майскія дні як чорныя дні свайго жыцця. Тады хлопцу было чатырнаццаць гадоў, і голас у яго яшчэ ламаўся. Шмат у каго тады ламаўся голас. Цяпер ён памацнеў.

А ў тыя першыя, лічаныя дні міру стаяў перада мной худы чатырнаццацігадовы немец з рахункам у руках. Я яго бачу і цяпер — з набялелым носам, з плямамі хвалявання на твары. Яго не цікавіла мінулае, ён нічога не хацеў пра яго ведаць, ён хацеў атрымаць за свінню. І ён быў упэўнены ў сваім праве прад'яўляць рахунак.

## Уладзімір Цендракоў

# ПІСЬМО, ЯКОЕ СПАЗНІЛАСЯ НА ДВАЦЦАЦЬ ГАДОЎ

*Гэта адбылося летам 1943 года. Імёны і прозвішчы тут сапраўдныя.*

І на фронце здаралася адпачываць.

Мы стаялі на Данцы ў другім эшалоне. Рэдкія снарады з самых дальнабойных нямецкіх гармат даляталі да нашых акопаў, але і тыя, выпушчаныя наўздагад, не рабілі вялікай шкоды. Не рвуцца міны, не свішчуць кулі, сувязныя не поўзаюць па жываце з роты ў роту. Тэлефаністы ўсюды працягнулі двайную лінію, дзе трэба — акапалі кабель, дзе трэба — замацавалі: нішто не зачэпіць, нішто не парве, сувязь, як у сталіцы,— знімай трубку, гавары з кім хочаш. Радысты зноў збілі зумерны стол, трэніраваліся. Віця Сонейка, калі не ўдавалася ўвільнуць, драмаў на трэніроўках, правяраючы на практыцы стары салдацкі афарызм: «Салдат спіць, а служба ідзе».

Часам мы хадзілі купацца на Данец, часам зазіралі ў напалавіну ўцалелую прыфрантавую вёсачку, у якой яшчэ заставалася некалькі сем'яў, у тым ліку адна — маці і дачка. Маці здавалася бабуляй, дачцы было гадоў шаснаццаць — празрыстая ад голаду, мілавідная, з сарамліва палахлівымі вачыма. Звалі яе Настачкай. Вось на гэту Настачку мы і хадзілі любавацца, проста так, без усякай хітрай думкі.

Часцей за нас наведваўся лейтэнант Агапян. Прыходзіў, садзіўся, маўчаў, паголены да сінявы, пахмуры, з-пад густых і жорсткіх броваў глядзяць некуды ўбок загадкава-цёмныя масляністыя вочы. Насцечка пры ім абмірала ад страху. Адкуль ёй было ведаць, што лейтэнант Агапян — самы бяскрыўдны чалавек на свеце.

Зрэдку афіцэрам да салдацкага кацялка капусты выдавалі дадатковы паёк — якую-небудзь бляшанку рыбных кансерваў і пачак пячэння. Лейтэнант Агапян ніколі не з'ядаў яго адзін, прыносіў да нас, а ўжо мы без лішняй

сарамлівасці дапамагалі яму расправіцца, часам забываючыся сказаць «дзякуй». Лейтэнант Аганян узяў сабе за правіла як толькі можна аберагаць сваіх падначаленых. Мы не капалі штабных зямлянак, толькі зрэдку, калі іначай было нельга, дапамагалі змучаным тэлефаністам наводзіць сувязь, кожны, хто праштрафіўся, ведаў, што наш узводны будзе абараняць яго з пенай на губах перад начальнікам сувязі. Ды і вучобай ён нас не абцяжарваў. Зумерны стол быў хутчэй шчытом, які адгароджваў ад папрокаў: маўляў, радысты лайдачаць у абароне. А мы-такі лайдачылі, спалі колькі хацелі, тэлефаністы і сувязныя ПЗД называлі зямлянку радыёўзвода — «Сочы».

Лейтэнант Аганян не асмеліўся прызнацца Настачцы, затое прызнаўся мне:

— Хар-рошая дзяўчына...— Уздых, летуценна-сумны позірк.— Вось скончыцца вайна, застануся жывы...— Зноў уздых.— Чэспае слова, ажанюся... Не верыш?

Калі б я быў трохі старэйшы і разумнейшы, то, напэўна, зразумеў бы і не засмяяўся б. Але мне толькі нядаўна стукнула дзевятнаццаць гадоў, я са скуры лез, каб выглядаць бітым воўкам, не смешачкі — усё прайшоў.

І я засмяяўся:

— Заўтра пойдзем, паслязаўтра забудзеш. Колькі яшчэ такіх харошых сустрэнеш.

Я не падазраваў, што плюнуў у самую душу лейтэнанту Аганяну. Ён узарваўся:

— Мал-чышка. Сапсаваны чалавек.

— Ну вось, і пакрыўдзіўся...

— Маў-чаць! Як размаўляеш?.. Я хто? Лейтэнант? Ты хто? Малодшы сержант!.. Я-ак размаўляеш?!

Ну, гэта было занадта. Гаварылі ж усяго толькі пра Настачку,— што ж, я павінен выцягнуцца ў струнку, як у тыле на парадзе, узяць пад казырок: «Так точна! Прыгожая, вачэй не адарваць! Абавязкова ажэніцеся, таварыш гвардыі лейтэнант!»

Але на наступны дзень мяне выклікаў начальнік сувязі палка. Ён наогул не любіў радыстаў, а мяне асабліва: без дай прычыны зваў «філосафам» — больш зняважлівай мянушкі для яго не існавала.

Начальнік сувязі сядзеў на нарах без ботаў, кіцель з капітанскімі пагонамі накінуты паверх кашулі, шлёпае картамі, якія па днях адабраў у нас.

Збоку сядзіць збянтэжаны і надзьмуты Аганян. Няўжо данёс? Такога яшчэ не здаралася. Наўрад...

— В-вы!.. Вы хто так-кі?..

Называе мяне на «вы» — значыць, усё, трапіў не ў добры час.

— В-вы хто такі, пытаюся?.. Маўчаць!.. Як стаіце? Дзе выпраўка?

Я б з радасцю стаў на ўсіх правілах статута навыцяжку, але зямлянка нізкая, упіраюся пілоткай у бярвенне накату.

— Вы каму пярэчылі? Хто ён вам? Можа, ён ваш падначалены? Можа, в-вы заўтра мной захочаце камандаваць? Можа, мне цяпер ускочыць і стаць па стойцы «смірна»? Маўчаць!

Маўчу. Кідаю вокам на пакрыўджана надзьмуты Аганянаў твар і думаю: ён ці не ён? Падобна, перад гэтым начальнік сувязі пясочыў самога Аганяна.

— Распусцілі вас! Інтэлі-генцыя! Салам зараслі, ад сну напухлі! Ф-філасофствуеце!..

І мне раптам стала весела: «Чашы, чашы сабе на здароўе. Лаянка на каўняры не вісне... А што ты са мной зробіш? Ану... Не расстраляеш, выкусі, віна не тая. У штрафкову роту пашлеш — знайшоў чым напалохаць».

Відаць, начальнік сувязі па маім твары зразумеў: як ні кіпяціся — не праймеш. Ён са злосці гаркнуў:

— Дзесяць сутак строгага арышту!

Мы з Аганянам пераглянуліся: «На фронце — і арышт! Ну, брат, адмачыў».

— Лейтэнант Аганян! Забяспечце!

Добра сказаць: «Забяспечце».

Даводзілася капаць розныя зямлянкі ў абароне, але каб пры штабе палка была калі-небудзь выкапана зямлянка гаўптвахты — не даводзілася бачыць ні мне, ні Аганяну.

«Забяспечце...»

У Аганяна быў змрочна-збянтэжаны выгляд.

— Куды я цябе забяспечу?

— Гэта ўжо не мой клопат,— адказаў я, дэманстрацыйна расшпільваючы рэмень і падаючы свайму азадачанаму начальніку.

— Сапсаваны чалавек... Што з цябе вырасце?

— Не маю ўяўлення.

— Трэба было заварыць кашу...— Ён камячыў маю папругу, не ведаючы, у які бок накіравацца.

— Я не вінаваты, што дайшло да начальства,— падкалоў я.

— А я вінаваты?.. Думаеш, я данёс? А? — абурыўся Аганян, абурыўся шчыра.

Але загад ёсць загад — трэба выконваць.

Аганян, пакутуючы ад таго, што вядзе без рэменя пад арышт свайго падначаленага пад позіркамі разведчыкаў, тэлефаністаў, вартавых з камендантцкага ўзвода, вяла крочыў наперадзе мяне, каб не падумалі — канваіруе, і проста з прынцыпу «вочы б мае на цябе не глядзелі».

Армейская ісціна гаворыць: нічога няма невыканальнага. Знайшлося месца і для «губы».

Калі мы яшчэ толькі размяшчаліся ў абароне, сувязныя ПЗД на скорую руку выкапалі сабе маленькую зямлянку — перажывём, не доўга стаяць. Але час ішоў, мы не здымаліся з наседжанага і не такога ўжо і дрэннага месца. Сувязным надакучыла спаць на чарзе: яны адбудавалі вялікую жылплошчу з прасторнымі нарамі, два накаты. Старую зямлянку кінулі.

Яна і выратавала Аганяна. Калі б не было яе, яму давялося б аддаць мне сваю персанальную зямлянку, а самому спаць на маім месцы, на агульных нарах.

— Сядзі,— сказаў ён.— Зараз вартавога прышлю.

І пайшоў, забыўшы забраць мой рэмень.

Вартавы быў не хто іншы, як Віця Сопейка. Ён прынёс з сабой нечую вінтоўку і адкрыта пядобразычлівыя адносіны да мяне.

— Хлопцы купацца сабраліся,— паведаміў ён.

— Не выйдзе. Вартуй мяне, а то ўцяку.

— Ды ўцякай, бяды такой. Купацца б пайшоў. Пасунься, ці што?..

Я пасунуўся, мой вартавы паставіў ля маіх ног вінтоўку, лёг побач.

Усе нары ў зямлянцы былі засыпаны пісьмамі. Мы ляжалі на іх.

ПЗД — пункт збору данясенняў. Адсюль лёгкія на нагу сувязныя бегаюць па падраздзяленнях, прыносяць звесткі. Калі мы, радысты,— больш сучасная сувязь у параўнанні з тэлефаністамі, то сувязныя ПЗД, відаць, вядуць сваю радаслоўную ад таго грэчаскага хлопца, які прынёс з-пад Марафона ў Афіны лаўровую галінку,

Але ў палку ПЗД замяняе яшчэ і паштовую кантору. Сюды дастаўляюцца пісьмы, тыя ж сувязныя іх разносяць. Тут, у былой зямлянцы ПЗД, засталіся ляжаць нейкія пісьмы і ляжаць ужо больш за тыдзень.

Я ўзяў пісьмо, упоперак адраса тлуста выведзена: «Выбыў». Другое — «выбыў», трэцяе, чацвёртае... Нехта забіты, нехта паранены, відаць, ёсць і проста адкамандзіраваныя — на ўсіх адно і тое ж слова: «Выбыў», не сказана толькі куды — у іншую часць, у шпіталь ці на той свет.

Ведаю, нядобра чытаць чужыя пісьмы. Ведаў гэта і тады.

Калі б мы знайшлі выпадкова згубленае пісьмо, і ў галаву не прыйшло б адкрыць, пацікавіцца, напэўна пасталіся б перадаць таму, каму адрасавана. Але тут пісьмы — б ы л ы я, нічые. А яшчэ, відаць, чалавек пад арыштам дазваляе сабе больш, бо лічыць сябе па-за законам.

Паштоўкі, сакрэткі, канверты, склееныя хлебным мякішам, проста згорнутыя трохкутнікам пісьмы. Каравыя, дрыжачыя літары, відаць, выведзеныя старэчай рукой, па паперу, напэўна, упала не адна сляза — маці піша сыну, а сын-та «выбыў»... Ці буйны, салідна нязграбны почырк, літара лезе на літару: «Тата! Я вучуся ў пятым класе, дапамагаю маме...» Тата таксама «выбыў»...

Мы прывыклі да таго, што пастаянна нехта «выбывае», і не бязлікія адрасаты, пра якіх ведаеш толькі прозвішча ды імя, а таварышы.

Нам удваіх было ўсяго трыццаць дзевяць гадоў. Пры любой магчымасці мы стараліся адвярнуцца ад усяго, што напамінала смерць.

Мы са спакойным сумленнем адкінулі ўбок і пісьмо старэнькай маці, і пісьмо сур'ёзнага пяцікласніка. Мы шукалі іншыя лісты — ад дзяўчат,— каб далучыцца да таго, чаго самі яшчэ не адчувалі — сум кахання, разлука, шчаслівая рызыка ад прыхаванага прызнання. Мы нават нясмела разлічвалі не застацца староннімі назіральнікамі, а заявіць аб сабе. Пішуць жа тым, хто «выбыў», на пісьмо адказу не будзе, дык што перашкаджае нам адказаць?

Мы шукалі лісты ад дзяўчат.

З многіх лістоў мы адабралі толькі два. Прайшло дваццаць гадоў, а я амаль даслоўна памятаю цэлыя кавалкі з іх.

Здаецца, са Свярдлоўска яна пісала яму:

«Цяпер ноч. Я баюся начэй. Днём — работа, і, што таіць, нялёгкая. Днём — людзі, а ўночы — ты. І вось тады я

пачынаю адчуваць, што ты такое. Сказаць, што з аднаго боку — горад, завод, цэх, прахожыя, знаёмыя, сябры, з другога — ты, ты — паўсвету! Не, мала! Баюся, што хутка стане лягчэй дыхаць, работы будзе менш, больш вольнага часу і тады — пустата, тады нікуды не схаваешся ад цябе. У які нешчаслівы час спазналі мы адно аднаго! Знаёмыя, сябры, горад, увесь свет, у якім я жыву, не могуць замяніць цябе. Цябе няма, няма і жыцця. *А ты не адказваеш мне ўжо* на трэці ліст! Я без цябе — нішто, прыкрая выпадковасць на свеце. Ты можаш гэта зразумець? Адкажы мне! Пішы, нават калі няма часу...»

Подпіс быў неразборлівы. Той, каму адрасаваны ліст, ведаў яе імя, нам яно заставалася тайнай.

Але калі б мы і змаглі разабраць імя, наўрад ці адважыліся б адказаць. Той для яе не паўсвету — увесь свет, нам месца няма. Занадта сур'ёзны чалавек пісаў гэты ліст. Занадта сур'ёзны, а магчыма, і вельмі дарослы, ён палохаў нас.

А другі ліст-сакрэтачка прашыты роўнымі чысценькімі радкамі. На адрасе, як і належыць, наш нумар палявой пошты, адрасавана нейкаму *Яўгену Паляжаеву.*

«Твая фатаграфія стаіць на маім паходным століку, ты на ёй вельмі строгі. Ты сочыш за мной. І твой позірк прымушае мяне ўглядвацца ў самую сябе. Як хачу быць чыстай, разумнай, прыгожай перад табой. Як хачу быць вартай цябе!..»

Тут ужо не свет, не паўсвету, тут намнога прасцей — кахаю, хачу быць вартай цябе. І няма гнятлівай сур'ёзнасці, і недзе між чысценькіх радкоў праглядвае дзявочая гуллівасць, і подпіс ясны і выразны, само імя просценькае, наіўнае, лубачнае — Любоў Дуняшава.

Я і Віця Сонейка пераглянуліся: «Адкажам?» — «Адкажам!»

— Бяжы ў зямлянку, прынясі маю палявую сумку,— загадаў я вартавому.

І ён кінуўся, пакінуўшы мне на захаванне сваю вінтоўку.

У палявой сумцы, якую я захапіў яшчэ пад Сталінградам у пакінутай немцамі зямлянцы, захоўваўся дзённік, мацерыны пісьмы і цэлая калекцыя аўтаматычных ручак. Мне прыносілі іх нават незнаёмыя салдаты, пыталіся:

— Дзе тут дзівак, які махорку на ручкі мяняе?
— Я.
— Бяры.

У мяне былі ручкі са шкляпымі вітымі пёрамі, з залатымі пёрамі, была ручка, інкруставаная срэбрам,— не пісала,— была, нарэшце, вялікая чорная ручка, якая ўмяшчала ледзь не паўбутэлечкі чарніла.

Вось гэтай салідпай ручкай я і ўзброіўся.

Віця Сонейка стаў у мяне за спіной і прыглушаным голасам даваў парады:

— За нутро калупні, жаласна, са слязой...

І я пачаў:

«Дарагая і незнаёмая нам Любоў Дупяшава!

Да нас выпадкова трапіў ваш ліст...»

Зразумела, пра абставіны, пры якіх ён трапіў, я сціпла прамаўчаў.

— Са слязой, каб прапяло...

— Ды ідзі ты к такой мацеры! Не перашкаджай...

«Паверце, што мы ад усёй душы спачуваем Вам. Нас глыбока кранула Ваша вялікае і чыстае пачуццё да незнаёмага нам чалавека. Мы яшчэ не ведаем, дзе знаходзіцца Яўген Паляжаеў, але верце — знойдзем яго след. Знойдзем і ўсё паведамім Вам. Будзьце мужныя! Разлічвайце на лепшае...»

Віця Сонейка соп за маім плячом.

Пад канец я сышоў з асноўнай тэмы і разагнаўся:

«Ваш адрас — палявая пошта. Мы зразумелі, што Вы падзяляеце наш лёс, служыце ў радах нашай доблеснай арміі. І нам уяўляецца Ваш Высокі Вобраз — ці сястры, што паўзе з сумкай да параненых, ці асістэнткі, якая падае сівому хірургу інструменты ў час аперацыі, ці цярплівай, добрай сядзелкі каля ложка хворага...»

Памятаю, я ніяк не мог вырваць нашу новую знаёмую за межы медыцынскага абслугоўвання.

Віця прасіў — «са слязой», я ж працаваў на прынцы-

пе: ліслівасць душу крапае, яна больш надзейная, не дае асечкі.

Мы заклеілі ліст, папісалі адрас, мой вартавы адразу ж сарваўся з месца, кінуўся ў новую зямлянку ПЗД, уручыў з адпаведным наказам:

— Не згубіце, чэрці.

Дзесяць сутак строгага арышту...

Па Дысцыплінарным статуце мне належала ўдзень не спаць, гарачую ежу атрымліваць праз дзень, астатні час сядзець на чэрствым хлебе і вадзіцы, абдумваючы свой учынак.

Я спаў у кампаніі свайго вартавога колькі ўлезе, і ўдзень і ўночы. Як толькі надыходзіў час абеду ці вячэры, Віця Сопейка хапаў кацялкі і бег на кухню. Повару, які арудаваў чарпаком, ён гаварыў значна:

— Арыштаванаму.

Арыштаваны, пацярпелы,— як не пашкадаваць бедалагу! — і повар навальваў у нашы кацялкі і гусцейшага і больш.

Нас не цягалі да зумернага стала, не прымушалі вучыцца, не пасылалі ў каравульны нарад, далі магчымасць распараджацца часам поўнасцю па свой густ.

Надакучвала тырчаць у зямлянцы, і я падпяразваў забыты Аганянам рэмень і разам са сваім безадказным вартавым ішоў да Данца, купацца. Вінтоўка вартавога, вядома, заставалася ў кутку па нарах, чакала нашага вяртання. Трэба было толькі не трапіць на вочы начальніку сувязі, ды і сустрэчы з Аганянам таксама пажадана было пазбягаць. Калі б мы сутыкнуліся з Аганянам — мы разумелі — паставім чалавека ў няёмкае становішча: ён павінен будзе пакараць, хоць і не хочацца.

Вартавога патрэбна мяняць. І ў першы ж вечар прыйшоў узброены радыст з новенькіх, на фізіяноміі якога я ўбачыў яўнае жаданне добрасумленна выканаць ускладзены на яго абавязак. Але Віця Сопейка прагнаў яго:

— Ідзі! Ідзі сабе. Скажы, што я буду вартаваць бязменна.

Я быў за тое, каб знаходзіцца пад арыштам усе дзесяць сутак, а калі трэба — і больш. Віця Сопейка, адаслаўшы змену, не супраць быў ахоўваць мяне. Але...

Але прыйшоў загад мяняць абарону — з другога эшалона ў першы.

І нас, двух лежабокаў, выгналі з абжытай, спакойнай арыштанцкай зямлянкі, кінулі на дапамогу тэлефаністам знімаць так добра пракладзеныя лініі, якія так верна служылі.

Давялося пасля адпачынку, высалапіўшы язык, бегаць з цяжкімі катушкамі.

Мінула нямала дзён. Забылася гісторыя з маім арыштам, забылася абжытае месца ў другім эшалоне. У новым яры ўзнік гарадок з зямлянак, не горшых за ўсе астатнія, якія мы пакінулі.

Адрадзіўся нават незаменны зумерны стол — верная прыкмета, што праціўнік нас асабліва не турбуе.

Віця Сонейка пачаў выдумляць сабе хваробы, прападаў у санроце — там аб'явілася тоўстая добрая сястра, якая закруціла мазгі не аднаму Віцю.

У мяне парваліся боты, і я аддаў іх рамантаваць рабому ездавому з каменданцкага абозу.

Ішлі будні...

Мне прынеслі ліст.

Я круціў трохкутнік са штэмпелем: «Салдацкае пісьмо — бясплатна», узіраўся ў незнаёмы почырк, гадаў: ад каго?

Я перапісваўся толькі з маці. Не, не ад яе... Здаралася, дзяўчына аднаго з нашых хлопцаў пісала: «У мяне ёсць добрая сяброўка, яна хоча перапісвацца з франтавіком, дай адрас...» Давалі мой, вядома, з рэкамендацыяй без залішняй сціпласці: «Геройскі салдат, хлопец — што трэба»... і прыходзіла пісямцо: «Ах, як я Вас паважаю за геройства...» Сорамна было і за яе, і за самога сябе.

Я падазраваў — і цяпер такое. Адкрыў...

Не, штосьці не тое...

«Дзякуй, дзякуй за глыбокае спачуванне. Сёння толькі даведалася і спяшаюся падзяліцца радасцю: Яўген Палажаеў жывы! Ён быў лёгка паранены, лячыўся, цяпер зноў вярнуўся ў сваю часць. Яго палявая пошта такая ж, як і Ваша, толькі літар іншы — «Г». Знайдзіце яго, пацалуйце яго за мяне. Не сумняваюся, што Вы станеце з ім сябрамі... Папрасіце паказаць маю фатаграфію. На ёй вы ўбачыце дзяўчынку, вельмі кволую, цыплячую. Але гэтая дзяўчынка, клянуся Вам, шмат перажыла. Праўда, вельмі

шмат. Вы не паверыце, калі ўбачыце... (Я і на самай справе ў гэта чамусьці не асабліва верыў — какетнічае.) Вы пішаце, што ўяўляеце мяне медсястрой, але гэта не зусім так. Я нашу пагоны з чорнай акантоўкай і эмблемай скрыжаваных маланак. Адным словам, я — сувязістка.

Яшчэ раз, сустрэньцеся з Жэнем і абавязкова пацалуйце яго за мяне.

Ваша Любоў Дуняшава».

Я кінуўся да Віці Сопейкі.

— Чытай! Адказ!

Віця прачытаў і прыйшоў у захапленне:

— Бач ты, сувязістка... А можа, радыстка?

— Можа.

— Зусім радня.

— На сёмым кісялі.

— Значыць, пойдзем знаёміцца,— прапанаваў ён.— Па ліцеру — гэты Паляжаеў ваюе ў другім батальёне.

— Цяпер?

— А калі ж?

— Не.

— Чаму?

— Боты...

Віця зразумеў мяне.

Мае боты ў рамонце. А які франтавік, што шануе сябе, пойдзе на першае знаёмства ў абмотках? Можа, Паляжаеў — афіцэр, нельга ж перад ім абы-як. Абмоткі? Не! Навошта з салідным чалавекам так, быццам яны самі лыкам шытыя.

І мы пачалі падганяць рабога ездавога, чакалі ботаў, перачытвалі ліст Любы Дуняшавай. Рабы марудзіў...

Нарэшце боты атрыманы. Але мне проста не шанцавала ў дробязях: па-першае, рабы на галоўкі паклаў непрыгожыя, яны лезлі ў вочы, латкі, па-другое, згубілася зорачка з пілоткі. Дробязь, але без зорачкі мая старая, выліпялая пілотка не мела ніякага выгляду. Як ні разгладжвай, як ні муштруй далонню — ні больш, ні менш каўпак блазнаў. Уяўлялася — ускіну далонь да гэтага каўпака: «Здравія жадаю! Дазвольце пазнаёміцца...» Якое ўражанне будзе?

І ўсё-такі мы пачысцілі боты да бляску, паставілі каля земляных нараў, леглі спаць. Выранана: ідзём у госці да Яўгена Паляжаева.

А ў пяць раніцы пачуўся крык:

— Па-а-ад'ём!

Нашы роты пайшлі ў наступленне.

Мы паспешна нацягнулі пачышчаныя боты.

У другі батальён, толькі не ў госці.

Камбат-два Грачуха са сваімі ротамі перабраўся цераз рэчку Разумную. Згінаючыся пад упакоўкамі радыёстанцыі, мы спяшаліся да яго.

Пра Разумную салдаты гаварылі: «Пераплюнуць можна, а перайсці нельга». Наш бераг — плоскі, балоцісты, нямецкі — высокі, абрывісты, з вапняковымі выкідамі. Нашы пазіцыі — як на далоні, немцы схаваны грэбенем абрыву, сядзяць у добрых акопах.

Па забалочаным лузе пракапаны траншэі з чарназёмнымі брустверамі. Яны напалавіну заліты цёмнай, закіслай вадой. Мы спачатку спакойна маршыравалі па траўцы ўздоўж траншэй. Вядома, і міны шлёпаюць, і кулі свішчуць, але ж боты пачышчаны, ці ж хочацца лезці ў ваду?

Але недзе наперадзе ў сінім паветры нарадзіўся лёгкі, як дыханне, гук. Секунда — і ён ператварыўся ў дзікае завыванне. Выбух! Чорная зямля ўскінулася на дыбы.

Мы прыгнуліся, заспяшаліся...

Новае завыванне. Чорная гразь на момант закрыла нават сонца. Лупяць па нас цяжкімі!.. Тут ужо не да форсу, саскочылі начышчанымі ботамі ў залітыя траншэі, пабеглі, ледзь не кранаючы падбароддзем ваду.

А выбухі ззаду, выбухі спераду, камякі зямлі шлёпаюць па галаве, спіне, каробках рацыі.

Вые новы снарад, захліпнуўся. На імгненне — цішыня, нібы ты аглух. Падай! Побач! Уціснуўся тварам у мокры бруствер.

Быццам мяккім і цяжкім мяшком стукнула па галаве, зноў зацягнула зямлёй сонца, чадна запахла хіміяй.

— Жывы, Віцька? — свой голас чужы, далёкі.

— Жывы. Тупаем далей.

Устаючы, бачу на брустверы вінтовачную гільзу і зорачку, яна ззяе рубінавай эмаллю, якраз у маю пілотку. Хапаю зорачку ў кулак — знаходка! Бягу, шлёпаючы па вадзе, якая дастае ледзь не да каленяў.

Траншэя вяла да пераправы.

А пераправа прыстраляна. Кожныя пяць хвілін, не часцей і не радзей, ускідваюцца побач з ёю слупы гразі, ападаюць, сівы дым чапляецца за рэдкія кусты.

Рэчка чорная, стаячая, не рэчка — ручай, сапраўды пе-

раплюнуць можна. Цераз яе перакінуты спехам лагі, закіданы галлём. Галлё ў засохлай гразі, і на ім — трупы... Ды ці толькі трупы?..

— Мілыя! Родныя! Паможыце, галубкі!.. Маць вашу так! Пама-а-ажы-ыце!

Крычаць параненыя.

Яны побач, мы бачым іх, яны нас — не. Ужо шмат гадзін чуюцца іх галасы ў паветры, якое толькі цяпер пачало налівацца гарачынёй. Просяць, праклінаюць, клічуць, пагражаюць.

— Родненькія! Сволачы!.. Браткі!.. Паможыце ж, гады!..

І стогны...

Адзін паўзе ў наш бок. Я нават бачу яго твар — цёмны, як старая медзь, рот разяўлены, хапаецца непаслухмянымі рукамі, стараецца прыўзняцца, рукі падломваюцца.

Я адварочваюся, але ад крыкаў не адвернешся...

Іх шмат, нас двое, пераправа прыстралявая. Толькі сунься — і застанешся ляжаць там. Нам загадана: як мага хутчэй прыбыць з радыёстанцыяй на той бераг, няма сувязі. Нам загадана...

— Таварышы! Браткі! Гады!..

Віця Сопейка глядзіць на мяне, на яго размяклай, нечакана разгубленай фізіяноміі пытанне: «Што?.. Загадвай!»

Тут ён успомніў, чорт вазьмі, што я старшы.

— Шукаем брод, Віцька...

Сам хаваю вочы. Непадалёк падае снарад, нас абсыпае зямлёй.

Паўзём, цягнучы на спіне радыёстанцыі. Паўзём побач з вадой. Разумная — пераплюнуць можна, перайсці нельга... Крыкі параненых стаяць у вушах.

Некалькі крокаў да таго берага. Цёмная вада, яна ўсюды аднолькавая. Дзе брод?..

— Скідай упакоўку! У рукі!

Лезу ў ваду першы.

Вады па пояс. Трымаю на плячы прыёмаперадатчык.

Некалькі крокаў, адна секунда — і мы на другім баку. Нават па грудзі не было. Дзесьці ў далёкім кутку мазгоў — здзіўленне: чаму ўсе лезлі на мосцік?.. Так лёгка перабрацца нават не ўмеючы плаваць. Чаму?.. Не крычалі б цяпер там...

Мы над высокім берагам, ён прыкрывае. Ніводзін сна-

рад сюды не заляціць, ні снарад, ні куля, ні нават крутая міна. Якая вялікая свабода — выпрастацца на ўвесь рост!

Я азіраюся назад. Пракляты плоскі бераг, шмат жа палегла на ім нашых людзей. А недзе стогнуць параненыя, іх стогны не даносяцца сюды.

Нешта ўпілося ў руку. Расціскаю кулак, на далоні — зорачка. Кідаю яе на зямлю. Мне цяпер напляваць, як будзе выглядаць мая пілотка.

Мы захапілі вёсачку, што стаяла на самым грэбені высокага берага. Стаяла... Цяпер вёсачкі няма, сумнымі нарастамі сярод чорных галавешак тырчаць печы, не ўцалела нават ніводнага коміна.

Затое ўцалелі ўсе скляпы. Тут іх выкопваюць не пад домам, як у нашых мясцінах, а асобна на двары. Амаль усе цэментаваныя, крутыя лесвічкі вядуць уніз. Вось у такім склепе мы і ўладкаваліся з радыёстанцыяй. Як у бліндажы — вытрымае прамое пападанне.

Віця Сонейка ўжо навастрыў лыжы:

— Пайду прагуляюся, малодшы сержант.

— Сядзі. Сам хачу прагуляцца. У пяць нуль-нуль звяжашся са штабам палка.

Я прыпаравіўся: як толькі ў Сонейкі з'яўляецца сверб у нагах, спяшаюся пакінуць яго аднаго. Радыёстанцыя на яго поўнай адказнасці, паспрабуй толькі кінь. І тады ўжо ён цярпліва чакае, пакуль я хаджу паблізу.

На зямлі пад нагамі вызвоньваюць пустыя гільзы. Смярдзючы дымок цягнецца ад папялішчаў. Я накіраваўся да ўскраіны вёскі, да абрыву, каб з вышыні глянуць на той бераг, з якога мы прыйшлі.

Пасярод вуліцы, нейкай плоскай і занадта шырокай без дамоў, выкапана вялізная квадратная яма, відаць, немцы рыхтавалі сабе зямлянку і не паспелі накрыць.

На дне ямы забіты — наш, мяркуючы па суконнай гімнасцёрцы і дыяганалевым галіфэ — афіцэр. Ён ляжыць, распасцёршы рукі, раскінуўшы ногі ў салдацкіх кірзавых ботах, вялікі, дужы, на грудзях набор ордэнаў і медалёў, кучаравая галава адкінута назад. Кучаравая галава, а твару няма. Відаць, асколак трапіў у патыліцу і выйшаў праз твар — з крывавага месіва тырчыць белая костка.

Я трохі затрымаўся і пайшоў далей — ці ж мала забітых, яшчэ адзін. Твары мёртвых звычайна не запамінаюцца, гэты ж запомніўся тым, што ў яго няма твару.

Вось і ўскраіна вёскі, вось абрыў, ён збягае ўніз, маршчыністы, паточаны ручаямі, што сцякаюць вясной да Разумнай. А Разумная адсюль прыветлівая — берагі апушаны кустамі, уздоўж кустоў уюцца пявучыя сцяжынкі і чорна блішчаць зацішныя затокі, у такіх няблага клююць акунькі. За рэчкай — працізліва зялёныя, выгладжаныя лугі, іх далёкая ўскраіна купаецца ў блакітнай мутнаватай смузе, вока не асіліць тоўшчу празрыстага паветра. І на гэтую даверліва раскрытую зямлю побач са мной з акопаў, выдзеўбаных у вапняковым акрайку берага, вызеўрыліся два кулямёты з драпежнымі ствaламі.

Даверліва раскінулася зямля пад ствaламі. Уцяклі гаспадары кулямётаў, ствалы маўчаць, але і ў немаце іх адчуваецца жорсткая злосць.

Я павярнуў назад.

Каля знаёмай мне квадратнай ямы стаіць на насыпе салдат, глядзіць на забітага кучаравага афіцэра, што вольна раскінуўся на спіне.

Салдат — худы, нясkладны хлопец з доўгім, шэрым ад пылу плямістым тварам. Ён, як пастух на па́лку, абапіраецца на вінтоўку, за спіной у яго рэчавы мяшок з кацялком, выгляд адчужаны, глянуць збоку — ні больш ні менш высушаны людскімі няшчасцямі біблейскі прарок.

Нехта са знаёмых забраў дакументы і разам з імі — ордэны, каб здаць у штаб.

Я зазірнуў пад каску ў брудны ціхі твар салдату.

Доўгі твар не тое каб сумны, хутчэй цярплівы — хлопец прывык да смерці, прывык да крыві, калі і жахаецца, то сцішана, ведае: крычы, кліч, абурайся — нікога не здзівіш, не кранеш, не паможаш.

— Знаёмы? — спытаўся я, ківаючы на забітага.

Ён памаўчаў, кінуў скупа:

— Ага.

— Хто гэта?

— Камандзір нашай кулямётнай роты Паляжаеў.

— Яўген Паляжаеў!

Хлопец зірнуў скоса на мяне з-пад каскі і не пацікавіўся, адкуль я ведаю Яўгена Паляжаева, камандзіра кулямётнай роты пры другім батальёне.

Кучаравая, закінутая назад галава, шырокія грудзі, распасцёртыя рукі... Нехта ўжо ўзяў у яго дакументы, а разам з дакументамі канечне — пісьмы Любы Дуняшавай, а з пісьмамі — яе фотакартачку...

«Папрасіце паказаць маю фатаграфію. На ёй вы ўба-

чыце дзяўчынку, вельмі кволую, цяплічную. Але гэта дзяўчынка, клянуся Вам, шмат перажыла. Праўда, вельмі шмат...»

Я чамусьці не веры ў, што яна шмат перажыла. Той, хто сапраўды шмат перажыў, так лёгка пра гэта не гаворыць...

У Любы Дуняшавай перажыванні наперадзе.

— Не ты забраў яго дакументы?

— Не.

— І ты ў іх не заглядваў?

Хлопец недружалюбна пакасіўся на мяне:

— А нашто? Я яго не па дакументах ведаў.

Сонца садзілася, касы цень ад стромай сцепкі націху набліжаўся да забітага, збіраючыся сарамліва накрыць яго. Ён ляжаў тварам да сіняга бязвоблачнага неба...

«Сустрэньцеся з Жэнем і абавязкова пацалуйце яго за мяне».

Пацалуйце? Асколак трапіў у патыліцу.

Я адвярнуўся і пайшоў да сябе. Ішоў і глядзеў на боты, заляпаныя гразёю, у белых струпах засохлай вапны...

Сонейка сядзеў каля радыёстанцыі, з тварам, налітым крывёй, крычаў у мікрафон:

— Фрыц! Не займай хвалю! Ты, гад картавы! Уматвай да чортавай мацеры! Прыём!

Звычайная гісторыя: нейкая нямецкая радыёстанцыя выпадкова выйшла на нашу хвалю, перашкаджала звязацца з палком. Віця Сонейка лічыў: калі ён працуе, то эфір — яго манаполія.

Пабочныя размовы на радыёстанцыі строга забаронены, а размовы з праціўнікам — тым болей. Часам яны канчаліся сумна: засякуць нямецкія пеленгатары — лаві снарады. Раз радыёстанцыя — значыць, штаб, а раз штаб — снарадаў не шкадуюць.

Але цяпер немцы адкінуты; можна ўявіць, якая ў іх там суматоха і неразбярыха — не да пеленгавання.

Віця Сонейка ўбачыў мяне, збянтэжыўся, вінавата забурчаў:

— Балбочуць і балбочуць, слова не прапхнеш...— І раптам без пераходу заззяў: — Танцуй!

Я адвярнуўся, ступіў у кут.

— Танцуй! Бачыш?

Ён паказаў мне паштоўку.

— Табе піша, не мне... «Вы ўвайшлі ў лік маіх сяброў...» На табе вось, ты ўвайшоў, а я не... Танцуй, а то не аддам.

Я чамусьці зусім не здзівіўся, што паштоўка ад Любы Дуняшавай прыйшла ў гэты дзень, у гэты час.

«Я крыху захварэла, ляжу, карыстаючыся вольным часам, каб пагаварыць са сваімі сябрамі. А Вы ўвайшлі ў лік маіх сяброў. Чаму Вы не адказалі на мой ліст? Нядобра забываць. Ці сустрэліся Вы з Жэнем? Прызнаюся Вам, да гэтага часу мяне не пакідае светлая радасць, што ён жывы, здаровы і што ў нас з ім ёсць агульныя знаёмыя».

Усяго некалькі сказаў, ці шмат напішаш на паштоўцы.

Я тады не адказаў на яе ліст. Не змог.

Праз некалькі дзён у сяле Цыркуны я згубіў сваю палявую сумку разам з дзённікам, з лістамі Любы Дуняшавай, з калекцыяй трафейных аўтаручак.

А яшчэ праз некалькі дзён пад Харкавым мяне параніла.

Але нумар палявой пошты Любы Дуняшавай я помніў добра. У шпіталі некалькі разоў браўся пісаць ліст да яе. Пачынаў і кожны раз адкладваў. Не так проста, аказваецца, паведаміць пра бяду...

«Ці сустрэліся Вы з Жэнем?» Ага, сустрэўся...

«Пацалуйце яго за мяне...» Не, гэтага я не зрабіў.

Не стаў і сябрам Яўгена Паляжаева...

Я маўчаў, баяўся, пасля забыў нумар палявой пошты, ведаю, што ён пачынаўся з лічбы «18...»

Прайшло роўна дваццаць гадоў. Дваццаць!

Адрасы памяняліся, даўно зараслі старыя раны. Праз дваццаць гадоў я адважыўся нарэшце выканаць абавязак, напісаць ліст.

Любоў Дуняшава, ці дойдзе ён да цябе?

## Юрый Нагібін

# НА ЦІХІМ ВОЗЕРЫ

### 1

Валькоў прачнуўся ад раптоўнай цішыні, як прачынаюцца ад грукату. Дасюль грузавік надта трэсла на бруку, ён тарахцеў бартамі, у кузаве, як пушкі, бухалі, сутыкаючыся, пустыя жалезныя бочкі. І ў кабіне, дзе прыкархнуў Валькоў, бразгатала, трашчала, дзынкала. Гэты лязгат, буханне, тарахценне, дзынканне, якія зліліся ў адзін суцэльны грукат, не толькі не перашкаджалі спаць, а закалыхвалі, як... калыханка. Можа, толькі ў калысцы спалася яму так ціха-мірна і смачна. Ён прачнуўся, але не расплюшчыў вачэй, спадзяваўся, што яго не будуць непакоіць, што грузавік пойдзе далей, а ён зноў засне і пазбудзецца ў сне болю ў галаве, ад якога пакутаваў пасля ўчарашняй выпіўкі.

— Гэй, уставай! — штурхануў у бок кулаком шафёр.— Табе ж на Рыбацкае трэба. Вунь яно. Рыбацкае!

— Ці ж я казаў, што мне на Рыбацкае? — прамармытаў Валькоў і расплюшчыў вочы.

Метраў за паўсотню ад машыны пачыналася і далёка за гарызонт галялела вялікая вада. Возера ляжала роўна з нізкім берагам, зарослым дзікім гарошкам. Справа ў возера нібы ўразалася, як спіца, доўгая вузкая каса, уся, апрача яе звужанага пясчанага вастрыя, густа ўстаўленая хвоямі. Хвоі, ад вадзянога бляску, здавалася, аддзяліліся ад зямлі і вісяць у паветры. Над возерам кружыліся чайкі. Удалечыні відаць былі два-тры баркасы.

— Мне ў Вязнікі,— вяла сказаў Валькоў і, забраўшы сваю скрынку з начыннем і абгорнутую рагожаю пілу, нязграбна палез з кабіны.

— Тут табе і Рыбацкае і Вязнікі. Вунь там, за дарогай! — Шафёр з трэскам зачыніў дзверцы кабіны, машына памчалася.

Валькоў правёў грузавік тужлівым позіркам і павольна пакрочыў росным лугам да вады. Спаласнуўшы твар,

ён адразу пачуў сябе свежым і бадзёрым. Быццам гаючая сіла была ў гэтай чыстай вадзе, боль як рукою зняло. Валькоў яшчэ раз агледзеў азёрную прастору і ўбачыў новыя нібы драбніцы. Злева відаць былі драўляныя сходкі, пагойдваліся пузатыя лодкі, падобныя да марскіх шлюпак; на беразе сушылася рыбацкая сетка, на якой паблісквала луска. Да сходак ішла маторная лодка, за якою цягнуліся, шырока разыходзячыся, сінія вусы. Дзіўнае, неспакойнае пачуццё варухнулася ў Валькове: ён быццам чакаў такога чыстага, светлага, гладкага, як шкло, возера з яго цішынёю і спакоем, з далёкімі хвоямі, што нібы лунылі ў паветры, з рыбацкаю прыстанню і сеткамі, з нейкаю радаснаю пустэльнасцю. Возера зусім не падобнае на азёры яго роднага Мяшчэрскага краю. Там яны нібы ўціснутыя ў лясістыя берагі, змрочныя, непразрыстыя, густа пазарасталі чаротам, плюшчаём, лілеямі, хоць таксама прыгожыя, але зусім на свой манер.

Цяпер Валькоў ужо не шкадаваў, што паслухаўся выпадковага ў дарозе сябрука і паехаў сюды на грузавіку. Пазнаёміліся яны дзесьці пад Оршай. Памятаецца блакітны пры дарозе рэстаранчык на шашы, столік, засланы абрусам, вазон з кветкамі, які ўвесь час замінаў бачыць аднаму аднаго. Завалокся туды Валькоў ужо на падпітку: выпіў, развітваючыся з землякамі, таварышамі з арцелі, якія спяшаліся дахаты. Усе яны людзі сямейныя, а ён бабыль, ніхто не чакае яго дома, ён адарваўся ад хлопца, пабадзяецца адзін. Пра што была ў яго размова з новым сябруком, ён забыўся, быццам бы пра ўсё на свеце. Але цвёрда запомнілася, што той угаворваў яго падацца на возера Рыбацкае, у вёску Вязнікі, адкуль ён сам родам, толькі вось ажаніўся ён з тутэйшаю, аршанскаю, і адарваўся ад дому. А пад поўнач, калі рэстаран ужо зачынялі, гэты новы сябрук раптам ускочыў з крыкам: ёсць грузавік на Рыбацкае! Валькоў замітусіўся, пачаў соваць афіцыянту грошы, шукаць сваё начынне. Той самы сябрук з дапамогаю нейкіх дабрачынцаў падсадзіў Валькова ў машыну. Замільгалі дрэвы, набягаючы з цемры ў святло фар, агеньчыкі кацiных вачэй ля дарогі, набягалі хаты і хацінкі з цёмнымі вокнамі. А потым было абуджэнне і гэта возера... Колькі ж пратарабаніў ён на грузавіку? Вёрстаў трыста, чатырыста, не меней.

Недалёка, за паўкіламетра ад шашы, на другі яе бок, відаць былі сярод дрэў саламяныя стрэхі, гонтавыя дахі. Пэўна, гэта і ёсць Вязнікі. Валькоў узяў сваю скрынку і

пілу, рушыў быў уперад і раптам замёр: па росным гарошку, выкручваючыся, паўзла па яго тоўстая доўгая вужака. І ў іхняй Мешчары вадзіліся змеі: гадзюкі, мядзянкі; хлапчуком ён безліч перабіў іх каменнямі і проста палкай, але такога здаравеннага гада ён зроду не бачыў, хіба толькі ў Маскоўскім заапарку ці ў кіно. Валькоў не быў баязлівец, але тут, баючыся варухнуцца, ён стаяў бы здранцвелы, глядзеў, як падпаўзала да яго вужака, пакідаючы на расянай траве яркі зялёны след. Толькі ля самых ног яна слізганула на выгладжаную вадою пясчаную палоску берага, бездапаможна перасмыкнулася па пяску, з цяжкасцю падцягнула сябе да вады і адразу знікла ў глыбіні.

Не жадаючы развітвацца з першым ціхамірным пачуццём, Валькоў, лёгкі чалавек, тут жа запэўніў сябе, што гэта была зусім не змяя, а мясцовая вужака, і весела пакрочыў да вёскі.

## 2

Вёска была невялікая, хоць і з дзвюх вуліц, вельмі зялёная і вельмі яркая ад кветак. Ля кожнага дома вяргіні нібы высыпалі свае пупышкі, чырвоныя, жоўтыя, белыя, чырвона-чорныя і белыя з чырвоным. Валькоў здзівіўся з гіганцкіх рабін, што выстраіліся з аднаго і з другога боку вуліцы; густа ўсыпаныя спелымі ягадамі, яны сплялі свае вяршыні над вузкай вулачкай, утвараючы цяністы нібы купал. Здзівілі яго агароджы вакол кветнікаў, двароў і агародаў, зробленыя са старых рыбацкіх сетак, нацягнутых на калы. Такія агароджы рамантаваць яму, зразумела, не прыйдзецца, а вось маленькія стройныя хаткі быццам чакалі яго: дзе прагніў дах, дзе адцягнула ўніз акаліцы, дзе скасабочыліся дзверы, нахіліўся ганак. Мабыць, даўнавата не завітвалі сюды цесляры, а тутэйшым жыхарам ці няма калі, ці няма звычкі самім падпраўляць свае будынкі. Відаць, выпадковы сябрук не зманіў,— Валькоў сапраўды будзе тут жаданы госць.

Пасярод невялічкай плошчы было навязана пярэстае цялё. Убачыўшы Валькова, яно задзёрла пыску і рыкнула. Міла і па-дзіцячы жаласліва. Некалькі белагаловых дзетак пускалі змея, але змей упарта прыпадаў да зямлі. Смачна пахла смажанаю рыбаю і дымком хваёвых шышак. Чарада драздоў наляцела на рабіну, сіваграк сеў на слуп, ярка зелянеючы спінкай. Потым прыляцелі галубы і сталі смела і нібы з гонарам хадзіць каля Валько-

ва. З бліжэйшай падваротні выскачылі надзіва маленькія ў вельмі яркім стракатым пер'і куркі і такі самы маленькі, нібы цацка, пеўнік. І Валькову зноў чамусьці стала радасна, як нядаўна на возеры; яму зноў здалося, быццам ён ці ў сне, ці ва ўяўленні бачыў гэту вёску са зграбнымі хатамі, прыгожымі дрэвамі і кветкамі, асмялелымі птушкамі і добрай, даверлівай цішынёй. Валькоў заўсёды лічыў і выхваляўся перад другімі, што яму даспадобы толькі гарадское жыццё, а як даводзілася быць у гарадах, асабліва ў вялікіх, ён губляўся, адчуваў сябе драбнотаю і няздатным звярнуць на сябе ўвагу, хоць ён болей любіў быць у людзей навідавоку...

Нечакана перад ім з'явілася маленькая, сухенькая бабулька з поўным кошыкам жоўтых махавікоў.

— Дзень добры, бабулька! — ветліва сказаў Валькоў.— Дзе гэта мне... як яго...— тужыўся ўспомніць названае сябруком прозвішча.— Як яго... Часціка знайсці?

— Можа, Лапціка?

— Так-так, Лапцік! — узрадаваўся Валькоў.

— Які табе Лапцік трэба? — спыталася старэнькая, весела пазіраючы мокрымі блакітнымі вачыма.

— Ну, што галоўны ў вас...

— За галоўнага ў нас лічыўся Станіслаў, ён першы тут пабудаваўся.

— Мабыць, ён.

— Не ён, чалавеча. Ён перад вайною памёр.

— Ну, а мне трэба жывы Лапцік, ён тут, у вёсцы.

— У вёсцы, галубок, нікога няма, усе на лоўлю пайшлі.

— А ты, бабка, мне яго хату пакажы.

— Дык чыю гэта хату?

— Лапціка, кажу табе. Лапціка!

— Як я табе пакажу, калі тут усе Лапцікі?

— Як гэта — усе?

— Усе да аднаго: і я Лапцік, і брыгадзір Лапцік, і ўсе рыбакі Лапцікі.

— Бач, якая ты жартаўніца! — зарагатаў Валькоў, зразумеўшы бабульчына тлумачэнне.— Мне, мабыць, пра брыгадзіра Лапціка казалі.

— І брыгадзір, чалавеча, на возеры. Толькі ўвечары вернецца.

— А не скажаш, у каго мне прыпыніцца?

— Ідзі проста да ўдавы Алёны Лапцік, трэцяя хата з краю, у яе раскошна.

— Дзякуй, бабулька... А грыбы ў цябе — паганыя!

— Гэта яны недзе ў вас паганыя, а ў нас самы сакаўны грыб махавік. Толькі згатаваць трэба ўмеючы...

Валькоў зноў падумаў, што ўсе ў вёсцы маюць адно прозвішча. І тут яму цюкнула: старая пажартавала з яго. Ён крыкнуў занятым гульнёю дзецям:

— Гэй, Лапцік!

І ўсе дзіцячыя галоўкі павярнуліся ў яго бок. Валькоў усміхнуўся і пайшоў да паказанай яму хаты.

На ганку, нахіліўшыся над тазам, жанчына ў сіняй вылінялай спадніцы і жоўтай кофце счышчала рыбу. Валькоў паглядзеў на яе моцныя ногі ў белых травяных парэзах, на моцныя голыя локці, на круглую шыю, далікатна-белую ля патыліцы, і адразу рашыў, што лепшага прытулку яму не трэба.

— Здравія жалаю, хазяйка! — зухавата прывітаў ён.— Ці не дазволіце ў вас прызямліцца?

Жанчына азірнулася. Высокія грудзі, шырокі разлёт плячэй, у вачах сінь, роўны і чысты загар на твары, у куточках карычнявата-чырвоных поўных губ вільготныя ямачкі.

— Добры дзень,— сказала жанчына без здзіўлення.— Заходзьце.

Валькоў ступіў быў на ганак і спыніўся: на вяроўцы, нацягнутай між слупкоў ганка, віселі змеі, якраз такія, як ён сустрэў па возеры, толькі худзейшыя і карацейшыя. Жываты іх распоратыя.

— Што гэта за такія змеі? — спытаўся Валькоў.

— Вугры. Хіба не ведаеце? — Жанчына ўсміхнулася.— Рыба як рыба.

— А-а-а! — сказаў Валькоў.— Еў і іх.

Ён ніколі і не каштаваў вугроў, хоць чуў, што іх ядуць.

— Вэндзіць збіраецеся?

— Ага...

— На альховых цурках?

— Не, на хваёвых шышках.

— А ў нас рыбу толькі ў альховым дыме вэндзяць.

— Тут альхі няма. Вы скуль будзеце?

— З Мешчары. Мо чулі? Клёпікаўскі раён.

Жанчына кіўком галавы выказала, што не ведае.

— Разанская вобласць. Пад Масквою.

— Вунь што! — сказала яна з павагай.— А сюды які вецер занёс?

— Эх! — сказаў Валькоў бестурботна.— Куды нашага брата не заносіць! Спытайцеся лепей, дзе я не быў...

Не бываў Валькоў шмат дзе: у Сібіры і на Далёкім Усходзе, у Сярэдняй Азіі і на Урале, на Каўказе і ў Крыме, Прыбалтыцы і на Поўначы, затое аб'ездзіў усю Разанскую і Уладзімірскую вобласці, цяслярыў на Волзе, на Арлоўшчыне, на Куршчыне, аднойчы нават да Кіева дабраўся, а што Масква — то ледзь не родны дом яму...

— А я далей за Кабыльнік нідзе не была,— уздыхнула жанчына.

— Што гэта за Кабыльнік?

— Вёска, кіламетраў сем адсюль, там касцёл, сельсавет, магазіны, цырульня... Колькі гадкоў да Мінска збіралася, а не з'ездзіла.

— Чаму так?

— Усё не выходзіла. А як муж загінуў, то і зусім... Ядзька маленькая на руках, дый грошай няма.

— А муж дзе загінуў?

— Утапіўся,— ледзь прыкметна махнула рукой.— Гадоў пяць ужо. У буру баркас перакуліла, двух выратаваліся, а чатырох і не знайшлі. З іх толькі Мікола быў жанаты, астатнія — хлопцы, халасцякі. Я адна ўдава на ўсю вёску. Тут гаспадары жонак перажываюць...

— Трэба ж...— шчыра паспачуваў Валькоў, а сам сабе падумаў: калі Міколу было накапавана самім лёсам утапіцца, то добра, што сталася гэта да яго прыходу ў вёску.

Алена панесла вугроў у вяндлярню, а Валькову сказала заходзіць у хату. Перагародка з дошак дзяліла хату на кухню і святліцу. У кухні стаяў накрыты цыратаю стол, два ўслоны і табурэтка, ля ўвахода на цвіку вісеў умывальнік з медным носікам і чысты суравы ручнік. Валькоў памыўся, пабрыўся, надзеў свежую кашулю і зайшоў у святліцу. Тут было чыста, светла і пуставата: два драўляныя ложкі, камода, некалькі крэслаў, над столлю вісела вялікая лямпа з жалезным абажурам. На куце, над ложкам, дзе ў рускіх хатах вісяць абразы, была прымацавана кнопкамі каляровая карцінка: за доўгім сталом, устаўленым стравамі, сядзелі, з тузін, барадатыя людзі. У аднаго з іх, маладжавага, рыжаватага, над галавою быў круг з надпісам незнаёмымі літарамі. Валькоў здагадаўся, што гэта Ісус Хрыстос з апосталамі. Вярнуўшыся з вяндлярні, Алена растлумачыла Валькову, што карціна называецца «Тайная вячэра». Хрыстос толькі

што сказаў сваім вучням, што адзін з іх здрадзіў яму. Здраднікам быў Юда, гэта ён сціскае ў руцэ мяшэчак з трыццаццю срэбранікамі.

— Колькі гэта на нашы грошы? — пацікавіўся Валькоў.

Гаспадыня не ведала. Што ж да карцінкі, то яе пакінула нябожчыца свякроў, набожная, хадзіла ў касцёл.

Потым яны снедалі, елі смажаную, вэнджаную, салёную, гатаваную рыбу: шчупака, акуня, сяляву, вугра. Перамогшы агіду, Валькоў пакаштаваў вугра і папрасіў дабаўкі: смажаны, ён вельмі смачны, а вэнджаны яшчэ смачнейшы. Валькоў сказаў, што перад ад'ездам адсюль закажа сабе бочачку вэнджанага вугра. Сама гаспадыня са смакам ела гатаваную каўбасу, якую Валькоў выняў са сваёй дарожнай торбы. Ён пашкадаваў, што не здагадаўся напакаваць усю торбу каўбасы...

У часе снедання прыбегла гаспадынina дачка Ядзя. У яе былі сінія матчыны вочы. Убачыўшы незнаёмага чалавека, яна збянтэжылася, штосьці шапнула матцы на вуха. Тая крышку пачырванела і строга сказала ёй не гаварыць абы-чаго. Дзяўчынка ўзяла скібку хлеба з каўбасой і выбегла з хаты.

— Ці не за новага бацьку мяне палічыла? — спытаўся Валькоў.

— Нехта ж сказаў ёй, што ў яе новы тата будзе, дык яна...

— А праўда — будзе?

— Будзе...— стрымана азвалася гаспадыня, а пасля, як пілі чай, расказала. Ёсць тут рыбак, Уладзіслаў Лапцік, сябар яе нябожчыка мужа. Жонка яго Алеся памірае, хворая на рак. У іх трое дзетак. Пасля смерці жонкі Уладзіславу не абысціся без гаспадыні. Так ужо і лічыцца, што Алена стане яго жонкай. Ёй, сказаць шчыра, з удовінаю доляй нялёгка, ёсць хлеб і да хлеба, але гэта не ўсё. Алеся, Уладзіслава жонка, не крывіць на яе вока, а як трэба што падмагчы — здараецца гэта нячаста,— заўсёды кліча Алену: яна ж будзе за гаспадыню ў хаце. Алеся вельмі збылася з хваробы, але яшчэ на нагах.

— Чалавек я прабеглы,— кінуў Валькоў,— а нешта не разбяруся. Кахаецеся вы з ім, ці як?

— Якія могуць быць любошчы пры жывой жонцы? — злосна кінула гаспадыня.— У нас гэтак не робіцца. Гэтак не робяць.

— Ну, а ён вас любіць?

— У нас пра гэта гаворкі не было. Ён Алесін муж, а я Міколава ўдава.

— То як? Вы любіце яго?

— Чалавек ён добры і з Міколам сябраваў. Але хопіць пра гэта...

І гаспадыня сказала, што вельмі ж якраз, вельмі дарэчы апынуўся Валькоў у вёсцы: трэба пакрыць хлеў, перарабіць перагародку ў свіпушніку, у лазні палок наслаць...

— Не шкодзіла б ганак падладзіць,— дадаў Валькоў,— дзверы агледзець у сенцах, аканіцы паправіць. Калі рабіць, то рабіць!

— А колькі за ўсё гэта возьмеце? — пасцярожыўшыся, спыталася гаспадыня.

— Дамовімся. Не пакрыўджу.

— Не-не, так няможна. Вы скажыце, колькі, можа, не па сіле мне...

— Начлег, харч — і ўвесь разлік!

Удава, відаць, здагадалася, што Валькоў хоча паспагадаць, зрабіць ласку. Яна сярдзіта пачырванела. Валькоў пакорліва перавёў свае празрыстыя, з колерам ліпавага мёду, вочы на «Тайную вячэру» і пакляўся Хрыстом-богам, што ўсюды такі закон: дзе майстар жыве і сталуецца, ён плату браць не павінен.

— Калі ўжо так...

Не марудзячы, Валькоў дастаў са скрынкі інструмент, падвастрыў пілу і ўзяўся за працу. І скора з усёй вёскі збеглася дзятва. У Вязнікі рэдка завітвалі такія майстры, і дзеці моўчкі, з захапленнем сачылі за ўмелымі рукамі Валькова. Падабаўся ім і яго радняны фартух, і белая тасёмка на чорных валасах, і яго тонкае меладычнае высвістванне, а найбольш залацістая габлюшка, што віхрылася над рубанкам, калі Валькоў габляваў дошку. Дзеці перашэптваліся, штурхалі адно аднаго локцямі, потым абступілі Ядзю і сталі нешта прасіць у яе. Ядзя доўга не згаджалася, насцярожана глядзела, але, відаць, паслухалася дзяцей, падышла да Валькова і, пачырванеўшы, спыталася, ці можна ўзяць па стружцы. Расчулены і размякчаны Валькоў паабяцаў выразаць кожнаму хлапчуку шаблю, а кожнай дзяўчынцы — свісток.

Алена прыйшла клікаць Валькова абедаць і доўга стаяла, гледзячы на яго працу. З маленства яна ведала нялёгкую рыбацкую працу. Не было ёй дзівам іх умель-

ства, спрыт, мужнасць, а тое, што рабіў Валькоў, захапляла і радавала яе. Якое трэба зоркае вока і якая трэба спрактыкаваная рука, каб гэтак роўна састругваць тонкую-тонкую павуцінку-стружку, каб гэтак хутка і дакладна выбраць паз, каб гэтак надзейна і шчыльна падагнаць драніцу да драніцы. Яна падумала, што Валькоў не проста цясляр, а ўмелы майстар, штукар. Гэта ёй было прыемна. У Вязніках не давалі веры гаварунам, а Валькоў якраз і быў ці не з той пароды. Але ён, мабыць, не толькі здатны языком рабіць.

Якраз яшчэ палуднавалі, калі паўз хату прайшлі рыбакі, што вярнуліся з лоўлі. У брызентавых робах, зюйдвестках і з доўгімі халявамі гумовых ботах, усе як адзін невысокія, але камлюкаватыя, яны прайшлі цяжкаватаю і павольнаю хадою. Іх стомленасць і набраклае вадою адзенне надавалі хадзе змрочную ўрачыстасць. Адзін з рыбакоў адлучыўся ад таварышаў, падышоў да расчыненага акна ў кухні і паклаў на падаконнік кілаграмы на тры шчупака. Зялёна-блакітныя халодныя рыбаковы вочы акінулі Валькова, і той адразу рашыў: гэта і ёсць Уладзіслаў Лапцік. Алена кіўком падзякавала рыбаку, а ён, нічога не сказаўшы, пайшоў. Малапкава хуткі позірк, кінуты на яго рыбаком, выказаў насцярожанасць і непрыхільнасць.

Вячэралі на змярканні. Над вёскай стаяла празрыстая ціша, драбнюткая машкара таўклася ў паветры і ледзь чутна звінела. У гэтых мізэрных істотах ледзь ліпела жыццё, такое слабае, што любая стыхія, больш жорсткая, чым паветра, была для іх пагібеллю: калі мошкі садзіліся на руку ці на лоб Валькову, то паміралі раней, чым ён плясне па іх далонню.

У вёсцы ўжо ўсе спалі. Рыбакам уначы зноў выходзіць на лоўлю, і жыццё ў Вязніках замірала рана. Толькі ва ўдовінай хаце гарэла лямпа. Валькоў радаваўся з іх адасобленасці, быццам яны жылі адно дзеля аднаго, нібы ў змове супраць усяго свету. Але не такі ён быў чалавек, каб з ціхаю ўдзячнасцю прыняць просты, сціплы дарунак лёсу: добрую і чыстую блізкасць маладой жанчыны, даверлівую размову, смачнага вугра з залацістым адлівам на яго жываце.

— А ці няможна, гаспадынька, знайсці чвэртачку?

— Што вы! — усміхнулася яна.— Бліжэй, чым у Кабыльніку, гарэлкі не возьмеш.

— Няўжо і ў рыбакоў няма?

— Адкуль? У будні тут не п'юць, толькі на свята прывозяць бочку піва...

— Што-што? Адну бочку на ўсю вёску?

— А нашым мужчынам болей не трэба. Вып'юць па куфлю ці два, і давай песні.

— Во гэтак? — усміхнуўся Валькоў.— Я, ведаеце, зроду не п'яніца, але пад добрую закусь, як, скажам, ваш вугорчык, тузін піва лёгка кульну.

— Піва тут п'янае, асабліва...

— Нашага брата півам не спалохаеш,— далей хваліўся Валькоў,— мы на спірце замешаны!

Убачыўшы, што такая размова гаспадыні не даспадобы, Валькоў, каб пацешыць яе, перакінуўся... на людаедства.

— Няўжо сапраўды гэта бывае? — жахнулася гаспадыня.

— А як жа!.. І са мной выпадак быў. Працаваў я ў Сібіры, у самай-самай глухмені. Аднойчы перабіраўся пяшэчкам з адной вёскі ў другую і трапіў у снежную завею. Я збіўся з дарогі і забіўся ў тайгу, у непралазную нетру. А ўжо і ноч находзіць, цемра непрасветная. Іду, па грудзі ў снег правальваюся, на галлё натыкаюся. Бяда. Горшая не бывае. І раптам агеньчык — леснікова хатка! Ну, добра. Заходжу. Гаспадар — ляснік. Здаравец такі, рабы, на руках пярсцёнкі залатыя. Відаць, некалі за золаткам ганяўся. У Сібіры гэта любяць. Павячэралі мы з ім, выпілі па чарцы і ўлегліся спаць. А назаўтра раніцой, бачым, хацінку да самага даху занесла, так, што і не выбрацца.

— Трэба ж!

— Так-так... Пачалі мы, гэта, адкопвацца, цалюткі дзень важдаліся, а ўсё дарэмна: адкінем шуфель, а завіруха новыя два нанясе. Бачым: калі аднекуль падмогі не будзе — тут нам і магіла! Пражылі мы з ім у гэтым палоне з тыдзень, усё ў падкіднога дурня гулялі і з'елі ўсё чысценька, да крошачкі. Нарэшце нават сабаку яго гончага, цапы яму няма, з'елі! Даю яму калоду зняць, а ён гэтак уталопіўся на маю руку і калоды не знімае. Тут мне і цюкнула... «Чаго,— кажу,— ты ўглядзеўся?» А ён моўчкі глядзіць і аблізваецца. Жудасна мне стала...

— Хай бог крые ды бароніць!..— Гаспадыня нават кранулася, каб устаць.

— Так, страшна было... У яго нож і стрэльба. Дзе мне з ім голымі рукамі справіцца!

— То як жа выратаваліся вы?

Валькоў апусціў галаву, прымоўк.

— Не выратаваўся я,— прамовіў ён сумна.— На восьмы дзень... зжор ён мяне, усяго як ёсць...

Зноў даў маху: гаспадыня нават не ўсміхнулася. Выйшла так, што Валькоў зноў пакпіў з яе добрага пачуцця. І пачаў ён прастарэкаваць пра свае блуканні, якіх было многа ў яго валацужным жыцці. Ён гаварыў цяпер усё сур'ёзпае, нават трагічнае. Гэта былі гісторыі, пачутыя ім ад людзей у чайных, у вагонах, на параходах, у пераходах пехатою па дарогах. Але Валькоў шчыра лічыў гэтыя гісторыі сваімі. Жыццё ў яго апавяданнях было небяспечнае, бурлівае, напоўненае дзівоснымі, фатальнымі здарэннямі і цяжкімі стратамі. Расказваючы, Валькоў сам здзіўляўся: чаму гэта з другімі здараюцца ўсякія цуды, а з ім, колькі ні бадзяўся па свеце, не было ніводнай вартай прыгоды. Манюка і хлус, ён слепа верыў чужым небыліцам і, бачачы, як расчырванеўся гаспадынін твар, як загарэліся яе вочы, ён ужо не проста расказваў, а як артыст — натхнёна, люта.

Гаспадыню ахапіла складанае, пакутлівае пачуццё. Яна адчувала за Вальковымі незвычайнымі байкамі і зманлівую спакусу невядомага ёй жыцця і свету, але не магла не бачыць, што ёсць ва ўсім гэтым непраўдзівае, фальшывае, што пазбаўляе жыццё яго натуральнай, прывычнай сур'ёзнасці. І ўсё ж выпадковец гэты не проста маніў, а ўсё яго стаpанне было дзеля Алены, у яе вачах быць лепшым, вышэйшым, і яна не магла не цаніць гэтага. Не даводзілася яму лавіць вугроў у навальнічныя ночы, валачы адубелымі ад сцюжы рукамі цяжкія сеткі, быць на старым баркасе, калі яго шпурляе люты шторм,— дык ён і стараецца даказаць словамі сваю мужчынскую годнасць. Алене раптам стала шкада гэтага пустога чалавека, суцэльнай яго беспрытульнасці, яго залежнасці ад людзей,— а ён жа майстар і аддае свой спрыт, умельства, мабыць, на не заўсёды вартую, прыстойную працу. І яна з журбою спыталася:

— А сям'я ў вас ёсць?.. Жонка, дзеткі?

— Нічога такога ў мяне няма! — адказаў Валькоў.— Я вольны казак.

— Як жа вы так? — дапытвалася гаспадыня.— Хіба гэта жыццё — аднаму адзінокаму?

Валькоў узяўся напускаць туману, што, маўляў, ёсць на свеце адна жанчына-доктар, якая, можна ска-

зацъ, прапанавала яму пажаніцца. У яе свой дом пад Масквой, сад — трыццаць дрэў, мелася купіць мотаролер...

— Хай бы ажаніліся з ёю,— сказала гаспадыня.

— Не будзе гэтага,— сцяў губы Валькоў.— Цяпер ні ў якім разе,— і ён паглядзеў гаспадыні ў вочы.

А ёй і ў галаву не прыйшло, што Валькоў спрабуе ісці на нейкае заляцанне. Размова звяла і спынілася. Зноў чуваць ціша начной вёскі.

— Вам дзе паслаць? — спыталася Алена.

— На сене. Люблю пах свежага сена...

Алена выйшла з кухні і неўзабаве паклікала яго. Валькоў падняўся, у роце адчувалася нейкая сухасць. Прычыніўшы за сабою дзверы, ён апынуўся ў поўнай цемры. Ён не бачыў, але адчуваў Алену па яе дыханні, па цеплыні, што ішла ад яе цела.

— Я паслала. Ідзіце спаць.

— А вы?..

— І я пайду.— Яна пазяхнула, лёгенька паляпваючы па вуснах.

— Са мной...— сказаў ён шэптам і абняў гаспадыню за плечы.

А яна моўчкі адштурхнула яго ад сябе. Тады ён абхапіў яе за плечы, прыціснуў у куток у сенцах, звязаў яе сваім целам і прыпаў вуснамі да яе вуснаў. З нечаканасці і разгубленасці яна нейкае імгненне заставалася нерухомаю, потым слізганула ўніз, выкруцілася і каленам штурханула Валькова ў жывот. Ён войкнуў, адхінуўся, а яна дала кулаком па носе.

— Нашто ж гэта? — сказаў ён.

Алена расчыніла дзверы на вуліцу, у сенцы зазірнулі сваім слабым святлом зоркі. Цяжка дыхаючы, яна глядзела на Валькова бліскучымі раз'ятранымі вачыма, і яму здалося, што зараз зноў пляспе па твары. Ён захінуў твар рукою.

— Ну, хопіць табе,— сказаў ён засмучана і гамзата. Нос захрас кроўю, якая ўжо сцякала на губы і бараду.

Алена зайшла ў хату і зразу вярнулася, выкручваючы намочаны ручнік.

— На, прыкладзі.

Валькову здалося, што нос яго расце, распухае, распаўзаецца на ўвесь твар.

— Вышэй кладзі, на пераносіцу, во гэтак...

— Мабыць, спрактыкаваная...

Нос перастаў расці, але вельмі балеў. Такая цяжкая ў яе рука...

— Як табе?

— Быццам лепей. Дзякую.

— Няма за што,— усміхнулася гаспадыня і моўчкі прычыніла за сабою дзверы.

Валькоў залез па драбінах на сена і, не распрануўшыся, улёгся каля акенечка.

Ён разважаў: нельга без віна, і рашучасць не тая, і не той спрыт. Калі б яго падагравала віно, то ніяк бы не адкруцілася ад яго. Трэба ж! Трыццаць год бабе, а як мудруецца!.. Вунь арлоўская Верка, пуцявога абходчыка дачка, толькі школу скончыла, а кожную ноч да яго ў шалаш прыбягала. Брыгадзірка Васіліса ў калгасе пад Цецюшчамі дзеля яго агранома кінула, а салдатка Нюра з Куршчыны дык перад усёю вёскай не пабаялася сарамоцця, каб з ім, з Вальковым, адну ноч пабыць... А з гэтай, здаецца, усё было як найлепей: цалюткі дзень хадзіў за ёю, амаль задарма ўзяўся ўсё ёй зрабіць дый рук у ход не пускаў, пакуль не пагаварыў хораша. І што ёй трэба? Ён бы з месяц пажыў з ёю як з жонкаю, клапаціўся б пра яе, песціў бы Ядзьку. Каб другі хто на яго месцы, не дараваў бы ёй за тое, што спусціла юшку з носа, а ён сцярпеў праз сваю мяккасць і далікацтва...

У дахавае акенца з начной чарнаты глядзелі вялікія яркія зоркі. Сон не прыйшоў, і Валькоў стаў глядзець на зоркі, на іх чыстае журботнае святло, крыўда адышла ад сэрца, яму стала сумна, самотна і трошачкі радасна, што ёсць на свеце такія нечаканыя людзі, як Алена, што заўтра ўбачыць яе, будзе ёй рабіць і сядзець з ёю за адным сталом. «Спі спакойна»,— сказаў ён Алене, быццам яна была побач, і непрыкметна заснуў...

Алена ляжала і думала пра пастаяльца. Вядома, яно, дзівацтва яго, з таго, што ён чалавек зусім іншага, не знаёмага ёй жыцця, іншых звычаяў. Напэўна, сярод сваіх ён ніякі не дзівак. Можа, ён і другіх цалаваў, толькі-толькі пазнаёміўшыся, але тут гэтак не гадзіцца, гэтак не робіцца. Нябожчык Мікола пацалаваў яе пасля вяселля, і Уладзіслаў пацалуе пасля вяселля, як пройдзе ўдоўства. Рыбакам даводзіцца падоўга ісці па лоўлю рыбы, ім трэба быць спакойнымі за сваіх жонак і нявест, трэба ведаць, што дабро само сябе сцеражэ. З пакалення ў пакаленне выпрацавалася гэта строгая чысціня. Тут і жонак бяруць заўсёды са сваёй вёскі. Яна з дзявоцкіх гадкоў

хораша ведала, што мужам яе будзе рыбак, а ўдавеючы, павінна чакаць другога рыбака. Яе пацалаваў гэты наброда-прыхадзень, і яна выцяла яго, балюча і зняважліва выцяла, хоць і апрыкрала ёй адзіноцтва. Па Міколу яна сваё адплакала, а да Уладзіслава ў яе ніякага пачуцця, апрача сяброўства і пакоры. І нічога тут не зробіш, так трэба, мабыць, для жыццёвага парадку, важнейшага за яе жаночы лёс. А пастаялец гэты, відаць, проста з бруднымі рукамі, проста ласун, качуся — куды коціцца, рыбацкі кручок без зазубня. У яго валасы цёмныя, а ўсе рыбакі бялявыя, крыху рыжаватыя, твар у яго смуглява-бледны, а рыбакі чырвоныя, як медзь, і вочы ў яго з колерам ліпавага мёду, а не звычайнага блакіту...

## 3

Валькоў затрымаўся ў Вязніках. Працы ў іх было! Рыбакі штодзень вярталіся з багатаю здабычаю, грошай у іх было. Чаму ж не выкарыстаць Вальковых паслуг? У каго драбніца якая, а ў каго вялікая работа: збіць табурэтку ці лаўку, а то і падняць хату: асела так, што сабакі ў вокны зазіраюць.

Валькоў хутка і лёгка разабраўся, як жывуць мясцовыя людзі. Поле дзейнасці для яго, Валькова, у Вязніках было нешырокае: рыба, рыба, рыба, найперш — вугор; лавілі тут і шчупакоў, і акунёў, і сяляву, і плотку, і ментузоў, і верхаводку, але размову, заўсёды скупую, нешматслоўную, вялі найболей пра вугроў; буйныя вугры ішлі на экспарт, і плацілі за вугроў у рыбгасе ўдвая больш, чым за іншую рыбу, лавіць іх найцяжэй.

Ці то з павагі, ці то ад забабонаў слова «вугор» амаль не называлі, гаварылі, нібы ўрачыста, «ён», і кожны разумеў, пра што ідзе гаворка. Сёння «ён» добра на перамёт браўся. Не пашанцавала звяну Уладзіслава Лапціка, у дзвюх сетках «яго» зусім не было... Эх, каб ветрык расхадзіўся, любіць «ён» шторм... Сцішылася возера, «ён», відаць, надоўга на дно пойдзе... Брыгадзір усе «яго» звычкі ведае, таму і налоўлівае, кручкі і снасці на травах заварвае, каб адбіць жалезны і вераўчаты пах, бо «ён» занадта пах усякі чуе.

Падобныя размовы былі ў двары Уладзіслава Лапціка, дзе Валькоў папраўляў студню. Малады, гаваркі Андрэй Лапцік, спагадлівы да Валькова, расказаў пра «яго» такую гісторыю. Год пяць назад, пазайздросціўшы заўсёднай

удачы Ігната Лапціка, цяперашняга брыгадзіра, яны сваёю камандай парашылі хадзіць за ім следам: куды Ігнат, туды і яны. І ўсё адно Ігнат кожны раз вяртаўся з багатаю здабычай, а яны амаль з пустымі рукамі. Разгадвалі, ламалі галовы. А потым сцямілі: у камандзе Ігната ніхто не курыў, а яны — усе пыхкалі. Выходзіць, «ён» і дым у паветры чуе?..

— То вы не курылі б на лоўлі,— уставіў Валькоў.

— Мы так і зрабілі,— сказаў Андрэй.— Змучыліся без курэння і нічога не злавілі.

— І чаму ж?

— Дыханне ў нас усё адно тытунёвае,— растлумачыў Андрэй.— «Ён», відаць, чуе гэта.

— Ты, брат, заліваеш: не адзін жа Ігнат у вас вугроў ловіць!

— На перамёт ён адзін умеў, мы толькі сеткамі.

— Трэба ж, простая рыба...— быў пачаў Валькоў, але яго перабіў Уладзіслаў Лапцік.

— Яшчэ не ведаем — ці рыба! — як заўсёды хмурна і цвёрда сказаў ён.— Хіба можа рыба пяць кіламетраў па лузе прапаўзці?

— А «ён» можа? — здзівіўся Валькоў.

— Калі раса, і больш прапаўзе!

— Чым жа «ён» дыша?

— Чым дыша... Пра гэта і вучаныя людзі не ведаюць. А ў нас што пытацца?

Усё, што парушала звычнае яго ўяўленне пра жыццё, непахіснасць і трываласць нейкіх аснoў,— усё ў Валькове радасна адклікалася. Ён і сам быў парушэннем парадку, пры якім у чалавека павінна быць сям'я, сталая праца, цвёрдыя абавязкі. Ён даведаўся ад маладога Андрэя Лапціка такія дзівосы пра вугра, што галава закружылася... Дасягнуўшы сталасці, вугры па малых і вялікіх рэках перабіраюцца ў Балтыйскае мора. Потым, абагнуўшы Еўропу, перасякаюць Атлантычны акіян і заходзяць у Саргасава мора, дзе і нерастуюць.

Самкі кладуць ікру — і паміраюць. А вугровыя малявкі тым самым шляхам вяртаюцца ў Рыбацкае...

— Чаго ж яны ідуць туды? — цікавіўся Валькоў.— Яны ж могуць і тут ікру класці!

— Бо там адны самцы жывуць, а ў нас толькі самкі.

— О-го! — недаверліва абазваўся Валькоў.— А не маніш?

— Так, праўда,— пацвердзіў Уладзіслаў Лапцік, нібы

кінуў цяжкую гіру на вагу.— Самцы ніколі нам не трапляліся.

— А якія яны — самцы?

— Ці ж мы іх бачылі? — сказаў малады Андрэй Лапцік.— Шульц, былы капітан, у Кабыльніку жыве, дык той казаў, быццам самцы па тры метры даўжыні. І важыць самец ледзь не пуд.

— Во, брат! Гэта дык штукі! — цешыўся Валькоў.— А самцы таксама даюць дуба пасля нерасту?

— Пра гэта як хто казаў. Уладзіслаў казаў, што застаюцца жыць; Андрэй стаяў за роўную долю: павінны гінуць і самцы.

— Выходзіць, ім за любоў смерць наканаваная? — з развагаю прамовіў Валькоў.

З хаты на ганак выйшла Уладзіслава жонка Алеся, худая, з жоўтым, з сінцамі, тварам. Яна слаба сказала:

— Уладзя, клікні Алену, трэба Верачку купаць.

Уладзіслаў надняўся, за ім Андрэй.

Цяпер Валькоў кожны раз выходзіў насустрач рыбакам, калі яны вярталіся з возера, і неяк неспакойна пытаўся, ці многа налавілі «яго». Нібы засмучаўся, калі здабыча была невялікая. Пытаўся ён заклапочана, але заставаўся ў Вязніках чужынцам. Незразумелыя і нейкія трудныя былі яму тутэйшыя людзі. Яго збівала з панталыку і маўклівая строгасць мужчын і ані незразумелая яму прыветлівасць жанчын. Адпрэчаны ўдавою, Валькоў спрабаваў падплысці качарам да маладой жонкі Андрэя Лапціка, рагатухі і гаваркой маладзіцы, што, здавалася, круцілася каля яго, калі ён працаваў у іх на двары. Але меў такі паварот, перад якім... аплявуха здалася б... ласкаю! Між тым, гэта не так засмуціла яго, як азадачыла, пахіснула яго ў жыццёвых уяўленнях.

Аднойчы ён напрасіўся пайсці лавіць вугроў. Калі кацер рушыў з месца, Уладзіслаў, які стаяў каля Валькова, выграб з кішэні разам з махорачным смеццем вытачаны драўляны корак. Смецце сыпнуў на вецер, а корак, здзьмухнуўшы з яго пыл, паклаў зноў у кішэню.

— Што ў цябе такое?

— Быццам не ведаеш? — непрыязна буркнуў Уладзіслаў.— Вуграм зад затыкаць. Затычка!

— Бач ты!..

— А інакш як утаймуеш «яго»? Хоць на кавалкі рэж — кожны асобна варушыцца будзе. А заткнеш зад — яму адразу ж пераб'е дыханне. А не — уцячэ...

Калі размова ішла пра вугроў, Валькоў гатовы быў верыць усяму. Нядаўна Андрэй Лапцік паказаў яму яшчэ адну дзівосную іх здатнасць. Ён узяў жывога вугра і паклаў на зямлю каля сваёй хаты хвастом к возеру. Вугор, энергічна звіваючыся, як стой павярнуўся да возера галавой. Андрэй зноў паклаў яго хвастом к возеру, і зноў вугор, звіваючыся і выкручваючыся, лёг галавою да вады. А возера адтуль і не відаць і не чуваць. Можа, вугор проста вільгаць здалёк чуе? Андрэй паднёс вугра да бочкі з вадою, але вугор не абмануўся, зноў знайшоў возера. Компасную стрэлку можна адхіліць ад полюса магнітам, а вугра нічым не збіць, ён усё роўна павернецца галавой да возера.

Валькоў таксама захацеў мець корак, але ні ў кога лішняга не было. Брыгадзіра непакоіць не адважыўся: стары Лапцік, і так змрочны, глядзеў воўкам. Выпадкова знайшоўшы на кацеры кавалак хваёвай кары, Валькоў дарэмна спрабаваў выразаць корак-затычку. Прыемнасці ад паездкі з рыбакамі не стала. А дзень быў ясны, ветраны, буруны пагрозна і пеніста ішлі за вінтом, чайкі віселі над кацерам на нерухома распластаных крылах і раптоўна паўскасяк саслізгвалі да самай вады, качкі наляталі чарodamі і рассыпаліся ў прыбярэжным чароце; над самым пясчаным дном, што здавалася блізкім на любой глыбіні,— такая чыстая і празрыстая была вада ў возеры,— прахадзілі плямістыя ментузы і цёмныя шчупакі, падобныя на бярвенцы. Але да ўсяго гэтага ў Валькова, пазбаўленага магчымасці прыняць удзел у лоўлі, ужо не было радаснай увагі. Праміпула яго і тое, як запускалі перамёт, як ставілі сеткі.

А калі перамёт выцягнулі на палубу і доўгія, тоўстыя, светлапузыя вугры выкручваліся на кручках, ён ледзь не вар'яцеў ад азарту і сваёй бездапаможнасці. Знімаючы з кручка слізкага метровага прыгажуна, ён немым голасам крычаў, каб яму хутчэй падалі корак заткнуць вугра, бо ўцячэ. Рыбакі моўчкі працавалі і быццам не чулі Валькова. Толькі стары брыгадзір злосна сказаў:

— Сціхні ты, тараторка!

Валькоў убачыў, што вугры кідаюцца ў кош жывюсенькія і хоць там круцяцца, уюцца і высоўваюць наверх маленькія змяіныя галоўкі, але рыбакоў гэта ані не трывожыць. Зразумела, Уладзіслаў накпіў з яго, усе гэта ведалі. Валькоў употайкі акінуў сур'ёзных, маўклівых, засяг-

роджаных людзей, здольных нечакана выкінуць гэтакую штуку. Так, пальца ў рот ім не кладзі!..

Калі вярнуліся з лоўлі, жарт з коркам ведала ўся вёска; жанчыны, убачыўшы Валькова, сарамліва пырскалі, а дзеці смяяліся з яго не таячыся.

— Як можна абы-чаму верыць? — з прыкрасцю сказала яму Алена. Ёй было непрыемна, што пастаялец стаў пасмешышчам усёй вёскі.

## 4

Аднойчы ноччу на возеры разбушаваўся шторм. Кацер, які вяртаўся з лоўлі, вялікая хваля кінула ў Купанскай затоцы на камень. Кацер прабіла, і ён ледзь не патануў. Але ўсё абышлося добра, прабоіну хутка залапілі. З радасці брыгадзір Лапцік аб'явіў выхадны дзень, у Кабыльнік паслалі па піва. Пад поўдзень бочку прывезлі на пусты шырокі брыгадзіраў двор, дзе былі ўкапаныя ў зямлю лаўкі і стол на адной тоўстай назе. Гэты стол жанчыны заставілі поўнымі куфлямі і талеркамі з вэнджаным вугром.

Валькоў прыскочыў, калі Андрэй Лапцік выбіў з бочкі драўляную шырокую затычку і пеністае піва палілося ў падстаўленыя куфлі. Падхапіўшы куфель, Валькоў праціснуўся да бочкі.

— Во гэта затычка! Га? — усміхнуўшыся, сказаў Валькову Уладзіслаў.— Такою, нябось, не толькі вугру зад заткнеш!

— А можна і табе пашчу заткнуць,— дабрадушна агрызнуўся Валькоў.

— Ты? Рукі кароткія! — з несхаванаю, з адкрытаю злосцю адсек рыбак і адышоўся.

«Усё ён чэпіцца,— падумаў Валькоў.— І што яму кепскае зрабіў я? Адчувае, што мне Алена падабаецца? Дык у нас з ёю нічога ніякага. Запас, злыдзень, запасае: пры жывой жонцы ўжо другую слупамі абгарадзіў». Валькоў прыпаў губамі да куфля і, не перадыхваючы, прагна выпіў халоднае, свежае, лёгкае піва. Зляцеў прыкры настрой. Валькоў радаваўся: і ясны дзень, і гэта маленькае свята, і святочны выгляд мужчын і жанчын, і ціхамірны на ўвесь дзень адпачынак. І ён прыбраўся не абы-як: новае галіфэ з сіняга дыяганалю, увабранае ў хромавыя боты, чыстая гімнасцёрка, флоцкі рэмень з медзяною спражкаю сцягваў і падкрэсліваў стройнасць яго постаці. Пасля першага куф-

ля ён неяк асабліва адчуў сваю годнасць і, каб не страціласяя гэта адчуванне, перакуліў другі, абцёр рот і сказаў маладому Андрэю Лапціку:

— Ану, хлопча, нацадзі яшчэ для разгону!

Андрэй варухнуў палінялымі ад сонца брывамі.

— Ці не занадта? Блага будзе.

— Не твой клопат,— паблажліва ўсміхнуўся Валькоў.

Нахваленае мясцовае піва ані не брала яго, у галаве — ясна, на сэрцы — цеплыня, цела — нібы моцна нацягнутая спружына. Пазіраючы з-за зялёнага куфля на гурт жанчын у каляровых шаўковых кофтачках, ён гучна, з падбадзёрваннем клікнуў:

— Гаспадынькі! А вы чаго там сухарамі сохнеце?

Жанчыны засмяяліся, але і адным словам не адказалі.

— Ім нямо;кна, нельга ім,— сказаў Андрэй Лапцік.

Гэ! Не ўмеюць піць у Вязніках. Рыбакі ўсё радзей падыходзілі да бочкі, яны стоўпіліся вакол старога брыгадзіра і, быццам не пад гучны гармонік, вялі павольную песню. З выгляду крышку ахмялелыя, яны пагойдваліся пад песню, нібы на дробнай хвалі. Уладзіслаў Лапцік пільна сачыў за Вальковым.

— Што, Уладзік? Вып'ем? — лагодна звярнуўся да яго Валькоў.

— Не трэба,— пахмурна буркнуў той.

— Каму не трэба, а каму трэба! — і Валькоў спаражніў яшчэ адзін куфель.

Усё, што адбывалася пасля, Валькоў успрымаў ужо не як цэльную карціну, а як асобныя плямы, выхапленыя з дурманнага муту. То ён чапляецца да рыбакоў, хто колькі выпіў, і, сплёўваючы гаркаватую сліну, выхваляецца: «А я з паўтузіна сцебануў». То ён перабівае чыюсьці размову, звычайную размову пра рыбу, то пачынае расказваць, як яго з'еў ляснік у тайзе.

Рыбакі ўхмыляюцца. Стары Лапцік адганяе дзяцей.

— Нашто іх гоніш? — злосна кідае Валькоў.

— Няма чаго ім, дзецям, лухту такую слухаць.

— Гэта не лухта — байкі!

— Тое самае.

Валькоў разумее, што яго хочуць пакрыўдзіць, але адразу ж забываецца на гэта. Потым нібы з туману раптам выплывае Андрэеў, Лапцікаў, твар і рука з рыжымі валасатымі пальцамі, што забірае ў яго куфель. Але ён паспеў ужо выпіць, і цяпер замест радасці ў яго пякучы да слёз сум. І Алена прыйшла на свята. Толькі ж яна не бачыла,

як лоўка ён п'е, як добра абыходзіцца з яе парачопым, як падвясельвае кампанію сваімі расказамі, як ад яго ўсе рады, апрача гэтай дубіны — Уладзіслава...

Яшчэ адзін куфель. Валькоў нацадзіў яго сам. Яго цягне да рыбакоў, ён не раз і не два перабівае сумную, нескапчонную гаворку пра тую самую рыбу. Ён ужо амаль не адрозпівае твараў, не чуе, што яму кажуць,— вымагае ўвагі да сябе, пабачыў куды больш, чым тутэйшыя седупы, ён мае што парасказваць.

— Рыба — што! — крычыць ён у абвеяныя падчырвоненыя твары пад шапкамі бялявых валасоў.— Птушкі! Вось што радасць душы!

— Якія гэта птушкі?

Пытапне, якое з хмурпаю злосцю задаў брыгадзір Лапцік, дайшло да Валькова так выразна, нібы дасюль ён спаў і толькі зараз прачнуўся. Ён убачыў сябе па гапку брыгадзіравай хаты, вакол яго стаяць рыбакі, чакаюць адказу.

— Пяюхі... спявачкі...— сказаў ён рашуча.— Толькі ж у мяне іх пебагата: дзевяць чыжыкаў, шаснаццаць шчыглоў, сто сорак сем канарэек...

Ён хацеў сказаць сорак сем, але з языка сарвалася «сто сорак сем». Пасміхваючыся, перабіваючы адзін аднаго, рыбакі распытваліся, дзе ж ён трымае гэтулькі птушак.

— А дома! Ну, дзе ж!

Ого! Значыць, у яго такі вялізпы дом?..

Дом немалы, ды яшчэ з мезапінам. Сам ён жыве ў мезаніне, а ўвесь ніз адвёў птушкам. Дом падзяліў металічнымі сеткамі на тры пяроўныя часткі. У самай малепькай жывуць чыжыкі, у другой, большай,— шчыглы, а ў трэцяй, самай вялікай,— капарэйкі.

— Гэта вальера! — сказаў ён раптам, успомпіўшы недзе пачутае слова.— Там у мяне прымайстраваны ўсялякія жэрдачкі, кармушкі, карыцечкі з вадою...

Маніць і сам, мабыць, верыць у сваю мапу. А чаму б і не? Хіба ён не можа на зароблеиыя грошы трымаць птушак-пяюшак? Дурань быў, што ранеіі не дадумаўся. Цяпер ён абавязкова пабудуе сабе вальеру, пакупляе капарэек і паселіць у доме бабульку, каб было каму даглядаць птушак, калі самога яго не будзе дома. Птушкі будуць спяваць, а ён акампаніраваць па баяне...

Уяўлепая будучыпя ўжо стала Валькову рэчаіснаю, рэальнаю, і ён пачаў расказваць, якія канцэрты дае ён са сваімі капарэйкамі: уся вёска збягаецца пад вокнамі! Сярод птушак ёсць і салісты — шэрыя капарэйкі; калі параў-

паць з імі жоўтых — цьфу, бесцань! Мала хто ведае пра гэта, але ўся сіла ў шэрай капарэйцы. Яго перапытаў адзін з рыбакоў: ці праўда, што ён іграе на баяне?

— А як жа! Раз я канарэйкам акампаніраваю...

Нічога не сказаўшы, яму сунулі ў рукі якісьці вялікі прадмет і сказалі: «Ірай».

— Гэта ж не баян, а трохрадка,— пагардліва ўсміхнуўся Валькоў, калі разгледзеў інструмент, што ляжаў у яго па каленях, і адлажыў гармонік убок.

Гэтак жа хутка, як і трохрадка, паявіўся невялікі, у перламутравай аздобе, баян. Валькоў не разумеў, чаму людзі так стараюцца. Гэткае дзіва — мацаць баян! Іграць яму не хацелася, гаварыць куды цікавей. Поўны дом шчабятлівых і пеўчых птушак, салістаў, жоўценькі хор,— ён так яскрава і радасна бачыў усё гэта, што яго пявучы дом выклікаў сум і тугу, і Валькоў непрыкметна змахнуў слязу.

— Апу цябе з тваім баянам! — груба і журботна сказаў ён рыбаку, які ўсё даваў яму ў рукі інструмент.— Не хачу іграць, і ўсё.

Валькоў убачыў Алену, яна стаяла ля плота.

— Каб гітара, сыграў бы! — сказаў ён гучна, каб чула Алена.— А баянам у нас толькі бабы забаўляюцца...

— Будзе табе гітара! — панура запэўніў яго брыгадзір Лапцік.

Валькову няўцям было, што гэтыя сур'ёзныя, негаваркія, сумленныя людзі робяць апошнюю праверку яму, перш чым выкінуць са свайго гурту. Ім надакучыла цярпець пустабрэха і бабніка, але яны былі цярплівыя і прастадушныя і не хацелі пазбавіць... яго апошняга шанцу.

А Валькоў сядзеў зажурыўшыся. Чаму ён адразу не сказаў рыбакам, што ў вальеры, апрача канарэек, жывуць яшчэ дзевяць маленькіх зялёных папугаеў-неразлучнікаў, названых так за іх сямейную адданасць: калі памрэ адзін з пары, то і другі тут жа загавее душою. А хіба не магла там быць і пушыстая малпачка? Як дзень вялікі, вісіць яна ўніз галавою, зачапіўшыся хвастом за электрычны шнур. Толькі, магчыма, небяспечна трымаць яе ў вальеры, яшчэ пажарэ ўсіх канарэек і неразлучнікаў?..

Штосьці ткнулася яму ў рукі і глуха тромкнула. Гітара-сяміструнка, дэка ўпрыгожана перазнятымі карцінкамі. Дзіўна, адкуль узялася ў іх гітара? Не для іх гэты інструмент...

— І гэта гітара! — сказаў ён пагардліва.— Масавая

прадукцыя, дошка са струнамі. Вось у мяне гітара — краснашчокаўская! Гучыць яна...

— Ты хоць на гэтай сыграй,— цяжкім словам прамовіў брыгадзір Лапцік.

— Пайграйце,— нахіліўшыся да яго, ціха сказала Алена. Ён і не заўважыў, як яна падышла.

Валькоў адгукнуўся на яе нечаканую мяккасць вартаю жалю ўсмешкай.

— Сыграць?..— няпэўная надзея надала яму смеласці.— Хочаце? Гавайскаю гітараю зраблю. Гавайская спявае са стогнам, з пералівамі... Дайце грабеньчык!

Алена павольна і прыгожа ўскінула рукі, выняла з куксы грабеньчык. Валькоў прыладзіў яго на грыфе і ўзяўся падцягваць струны. На яго твары была няўважлівасць, бяздумнасць. А зайграў ён адразу, не беручы разгону акордаў, моцна і гучна, упэўнена і проста, як абчэсваў дошкі ці заганяў цвікі ў драўніну. І гучанне гітары было зусім незвычайнае — асаблівае, «гавайскае», з трапяткім, далікатным, меладычным падвывам. Апусціўшы галаву, нібы разглядаючы перазнятыя на дэку карцінкі, Валькоў хутка перабіраў пальцамі з плоскімі жаўтаватымі пазногцямі па струнах, а потым рэзка падняў на людзей амаль цвярозы твар і заспяваў:

Я встретил вас — и все былое
В моем разбитом сердце ожило,
Я вспомнил время, время золотое —
И сердцу стало так легко...

Голас у яго быў высокі, тэнаровы, крышку драўляны, хоць і са слязою. На верхніх нотах яму не хапала дыхання, і ён браў такія ноты за два прыёмы, але рыбакам, непрывычным да такога спеву і такіх песень, здавалася, што спявае сам анёл. І Алена слухала, на сэрцы было шчымліва і прыемна; ёй здавалася, што песня выходзіць з яго самога, з мелодыяй і словамі, ствараецца ім для яе...

Нет, не одно воспоминанье,
Вся жизнь заговорила вновь,—
И то же в вас очей очарованье,
И та ж горит во мне любовь!..

Перавёўшы на Алену вочы колеру ліпавага мёду, бачачы яе, праспяваў Валькоў апошні куплет і накрыў далонню струны, быццам задушыў музыку. У галаве праяснілася, ён зразумеў, што песня спадабалася ўсім, што людзі здзівіліся, расчуліліся, а ў старога Лапціка заблішчала сляза. Але ў самога Валькова не было ні радасці, ні гонару.

Хто як, а ён ведаў цапу сваёй музыцы; у іх іграла і спявала ўся вёска, як уся вёска цяслярыла і сталярыла: было гэта ўмельства спрадвеку. Некаторыя ігралі і спявалі лепш, некаторыя горш, салаўём ён не лічыўся. Тое самае і на працы — майстар як майстар, але не бог. А вязнікоўцы, як відаць, не верылі нават, што ён умее на гітары іграць. Што ж... для іх ён зусім бесцань... Няхай сабе, усе грошы, якія тут падчаплю, аддам на канарэек, прышлю ім фатаграфіі, грошай — Андрэйку Лапціку. Няхай на мае грошы прыедзе. Хай упэўняцца.

А, зрэшты, якая мне справа да іх? Колькі іх было, такіх вёсак, на маім шляху, колькі яшчэ будзе... Будуць вёскі, і гарады будуць, толькі без Алены. Не, не простай блізкасці з ёю хацелася яму цяпер, а жыць каля яе, быць ёй мужам, бацькам яе Ядзькі. І каб усе грошы ёй аддаваць, і быць з ёю ўсе ночы, у хаце і на сене, калі ў святліцы душна, і ў лесе, і на беразе возера, і на Каўказе, і ў Крыме, на цёплым Чорным моры. І не бадзяцца па свеце, а знайсці працу тут, блізка, каб штовечар вяртацца дахаты. І каб было ў іх няхай сабе не сто сорак сем, а сем канарэек, і ён бы падыгрываў ім...

Не ўздымаючы галавы, ён глянуў перад сабою і ўбачыў яе загарэлыя, моцныя, прывабныя ногі ў белых травяных парэзах.

— Наце,— сказаў Валькоў смуглым нагам і падаў Алене грабеньчык.— Трымай! — ён сунуў Андрэю Лапціку гітару.— Дрэнь твой «струмант»...

Устаў, людзі расступіліся, і Валькоў паваложся прэч. Хтосьці прасіў яго астацца і яшчэ паспяваць, а ён нават не адказаў. Няхай сабе цягнуць хорам свае сумныя песні, калі не змаглі паверыць чалавеку...

А ноччу Валькову стала кепска, ён кулём зваліўся з вышак, з сена, але не дабег да дзвярэй, яго стала ванітаваць, ірваць проста ў сенцах. І Алена выйшла, каб дапамагчы яму, толькі ў кашулі і спадніцы. Ён стаяў перад Аленаю, неапранены, варты жалю, змакрэлы і не меў сілы прамовіць слова, толькі махаў рукою, каб яна пайшла. Але яна не адыходзіла, а трымала далоняю яго галаву, прымушала піць ваду з карца і лаяла рыбакоў, што дазволілі яму столькі выпіць. Ледзь жывы ад бяды і мукі, Валькоў разумеў, што ўсё загінула, што ён быў хвалько, манюка, што ён быў п'яны і нікчэмны. Усе гэта бачылі.

— Ну, што ж,— хрыпла сказаў Валькоў.— Парадак...

## 5

Хоць Валькоў і лічыў сябе назаўсёды тут зганьбаваным, але гітара і песня зрабілі тое, чаго не магла зрабіць яго гучная выхваляльная гаварыльня,— да яго падабрэлі. Праўда, гэта не мела нават цэню пашаны, так ставяцца ў вёсках да пакрыўджаных богам — дурненькіх, гарбатых, нямкоў. Дабросць гэта была Валькову як нож у сэрца. Ён спяшаўся закончыць усю недаведзеную работу, каб хутчэй пакінуць Вязнікі. Стараўся не сустракацца з Алесяй і сталавацца каб не ў яе.

Аднойчы Валькоў пачуў, як Алеся, хворая жонка Уладзіслава, страшыла свайго меншанькага:

— Не будзеш спаць, Чучукалу паклічу!

Валькоў падумаў, што Чучукала нібы іх мяшчэрскі дамавік ці вядзьмак, і надта здзівіўся, калі гэта слова пачуў у размовах рыбакоў. Прамаўлялі яго з горыччу, злосцю і пакораю. А Чучукала зусім не казачная нячыстая сіла, а новы дырэктар рыбгаса.

У рыбгас Чучукала трапіў за нейкую правіннасць, дагэтуль займаў пасаду ў сталіцы рэспублікі. Стаўшы кіраўніком рыбгаса, Чучукала задумаў наладзіць справы пасвойму. Ён паклікаў да сябе старога брыгадзіра Ігната Лапціка, і адбылася прыкладна такая гаворка:

— Чаму лоўля вугроў спыняецца задоўга да замаразкаў?

— Вугры пакідаюць Рыбацкае...

— А чаму вугры павінны пакідаць савецкае возера і станавіцца здабычай чужаземных рыбакоў?

— Яны ідуць на нераст...

— А чаму тут не нераставаць ім, як нерастуе іншая рыба?

— Дык жа тут водзяцца толькі вугровыя самкі...

— Глупства, гэтага ніхто не даказаў, а план па вугроў не выконваецца. Вугор — гэта валюта! Дзяржава вядзе суровую барацьбу з валютчыкамі, а тут гэтакая каштоўная валюта праходзіць між пальцаў, і ўсе хоць бы хны. Час назаўсёды спыніць вугровую эміграцыю, выконваць і перавыконваць план, даваць дзяржаве залаты прыбытак!..

Даведаўшыся, што вялікі вугровы паход праз моры і акіяны пачынаецца па вузенькай, як стужка, Сапушцы, Чучукала вырашыў перагарадзіць гэту рачулку, якая ўпадае ў Рыбацкае, і замкнуць вугроў у возеры. Дарэмна спрабаваў стары Лапцік адгаварыць Чучукалу ад гэтакай за-

думы. Ён прамаўляў высокія, жаласныя і пепісьменныя словы пра «кругаверць» у прыродзе, перасцерагаў, што гэтак можна і зусім вынішчыць вугровае племя. Чучукала ж дзёўб адно: «Мы не павінны чакаць міласціну ад прыроды!» Стары брыгадзір не стрываў:

— Ну, а як загубім вугроў, тады іх на тваёй мордзе лавіць будзем?..

Буйны, мясісты дырэктараў твар наліўся гнеўнаю кроўю, і на месца старога брыгадзіра быў прызначаны Уладзіслаў Лапцік. Праўда, ніхто ў вёсцы, і сам Уладзіслаў, не лічыўся з прызначэннем, усё, як і раней, рабілася, як скажа Ігнат. Але да начальства цяпер з'яўляўся Уладзіслаў, а не стары Ігнат.

Рыбакі бэсцілі Чучукалу «дурнем», «псотнікам», «недаробкам», маткі страшылі ім непаслухмяных дзяцей; адпюткая на ўсёй вёсцы бабулька, якая хадзіла ў касцёл, казала: Чучукала вязнікоўцам — за іх грахі. І толькі Валькоў, бывалы чалавек, угадаў праўду-ісціну. Не, Чучукала не прыдурак, не тупіца, ён хітры, яго не ашукаеш. Ён, відаць, вельмі нагарэў, і зараз яму трэба лоўкі крок і выйгрыш, каб зноў прабіцца наверх. Такога шанцу невялічкі рыбны заводзік, дзе ўсё рабілася рукамі, не даваў. Налоўліваць рыбы куды больш, чым дагэтуль,— не проста. Дык Чучукала і знайшоў адзіную надзейную магчымасць. Ён пачынаў гульню, у якой ён не прайграе. Няхай сабе праўда, у рыбакоў і ў возеры звядуцца вугры, але ж гэта выявіцца не скора, калі ўжо да Чучукалы рукой не дастаць будзе...

Адным словам, Валькову па душы быў гэты прышлы чалавек, што не пабаяўся ўварвацца ў даўні парадак і гатовы наламаць дроў дзеля бясспрэчнай і блізкай сваёй выгады. Ды і рыбакі, калі гаварыць толкам, дарэмна ўпіраюцца. Яны ж будуць лавіць вугроў да самай зімы і абарвуць немалыя грошы, а там відаць будзе. Зразумела, Валькоў рыбакам не расказаў сваіх думак, яго хата з краю, ды яны, відавочна, лічаць яго за прыдурка.

Уладзіслаў Лапцік брыгадзірам пабыўся не вельмі — некалькі дзён. Ад Вязнікаў да вусця рэчкі багата бліжэй, чым ад іншых рыбацкіх вёсак, і Чучукала, паклікаўшы да сябе Уладзіслава, сказаў цвёрда: вязнікоўцы павінны зрабіць гаць па Сапушцы.

— Гэтага, чалавеча, нельга рабіць! — з болем сказаў Уладзіслаў.

— Мне парад не трэба,— нудна наморшчыўся Чучукала.— Загадалі — рабі!

— Няможна, пане, гэтак.

— Ты не разводзь мне анархіі! — Чучукала стукнуў па стале кулаком.— Вы служачыя, зразумела? Выганю ўсіх к чортавай матары, інакш заспяваеце!

— Не будзем, і ўсё,— ціха, але цвёрда сказаў Уладзіслаў.— Хочаш звесці вугра, то сам і калупайся!..

У тую ж гадзіну, саромячыся старэйшых і бывалейшых, брыгадзірскі клопат узяў на свае маладыя плечы Андрэй Лапцік. Яго суцяшала тое, што неўзабаве з ім будзе тое, што і з Уладзіславам. Але выйшла інакш.

— Працуе ў вашай вёсцы цясляр? — спытаўся Чучукала пры сустрэчы ў Андрэя.— Валькоў, ці як яго?

— Працуе.

— Кемлівы?

— Кемлівы.

— Гаць зможа зрабіць?

— Самі ў яго спытайцеся.

Чучукала ледзь быў не ўскіпеў, але, мабыць, штосьці прачытаў у Андрэевых вачах і буркнуў:

— Пашлеш яго да мяне...

Размова з Андрэем радавала Валькова: пахла вялікім барышом. Толькі рыбакам гэта, мабыць, не даспадобы. Але яму з рыбакамі дзяцей не хрысціць. Увечары сказаў Алене пра тую прапанову Чучукалы і дадаў:

— Нешта не ляжыць у мяне душа да гэтай гаці.

Калі б Алена падтрымала яго і парадавалася з таго, што ён так сумленна ставіцца да рыбацкіх нягод, Валькоў лёгка адмовіўся б ад заробку. Але яна сказала неяк спакойна і неяк адчужана:

— Калі не вас, то другога наймуць.

— Выходзіць, не адмаўляцца?

Яна пацiснула плячыма: а мне што...

Няхай так будзе: я зраблю гаць, зараблю кучу грошай і куплю тваёй Ядзечцы раяль. Паслухаем, што ўсе вы тады скажаце на Валькова, калі з горада прывязе на грузавіку раяль, цёмны, як вір, з клавішамі слановай касці. Ці не давядзецца толькі сценку раскідаць, каб паставіць яго ў тваёй хатцы. Астатнія грошы на вяселле сабе пакіну, з жанчынаю-дакторкаю ажанюся, а не з якою там цёмнаю рыбачкай.

На другі дзень Валькоў пайшоў у праўленне рыбгаса. Чучукала быў зусім не падобны на ведзьмака ці лесуна,

меў выгляд кіруючай асобы. Камлюкаваты, мажны, з насівелымі, пастрыжанымі пад вожыка валасамі і чорнымі вусамі падкоўкай, ён быў у кавяркотавым кіцелі і такіх самых штанах. Чучукала, напэўна, адразу зразумеў, што яму трапіўся патрэбны чалавек, і, не трацячы часу, прапанаваў Валькову з'ездзіць на рэчку, каб усё вырашыць на месцы.

— Колькі возьмеш? — спытаўся Чучукала, калі паглядзелі на вузенькую мутную рачулку ў нізкіх берагах.

Валькоў кінуў вокам на сыты, сіваваты дырэктараў твар, успомніў, як гнеўна наліваліся чырванню яго шыя і вушы пры кожным падскоку машыны на калдобістай дарозе, і зразумеў, што Чучукала ні перад чым не стане, каб вырвацца з гэтага закутка, каб, рассеўшыся, ехаць на мяккай падушцы «Волгі», а не на мулкім сядзенні «казла». Ён назваў бязглуздую цану: чатыры «кавалкі».

— Справішся? — спытаўся Чучукала.

— Я не толькі гаці,— Валькоў плюнуў,— а сапраўдныя плаціны будаваў.

— Цвёрда дамоўлена,— сказаў Чучукала.

Таксама хутка вырашыў адносна матэрыялу, транспарту, дапаможных рабочых, патрэбных Валькову пры закладзінах падводнай часткі гаці.

— Рабочых возьмем у Вязніках.

— Не пойдуць яны,— запярэчыў Валькоў. Яму не хацелася звязвацца з рыбакамі.

— Прымусім! — пагрозліва прамовіў Чучукала. У ім прамільгнула нешта вядзьмарскае: халоднае і наступнае.

— Не, з прымушанымі я працаваць не буду...

— Няхай сабе так,— Чучукала нешта зразумеў і пагардліва прыжмурыў вочы.— Дам з завода.

З Чучукалам Валькоў зноў сустрэўся праз тыдні два, калі паказваў Чучукалу, што зрабіў.

— Справа такая,— пахмурна сказаў начальнік, аглядаючы моцна зробленую з бярвёнаў гаць.— Рыбакі мелюць, быццам вугор усё адно ўцячэ ў першую ж навальнічную ноч. Не чуў?

— Хай мелюць...— усміхнуўся Валькоў.— Я за сваё адказваю. Самі ж бачыце, праз гаць яму не ўцячы. Можа, хіба берагам...

— Дзе там! У мяне па беразе пройдзе?! — нешта пагрозлівае прагучала ў голасе Чучукалы,— сёння ж загадаю ўсю траву скасіць! — Ён прымоўк.— Вось што, Валькоў, трэба табе самому сваю гаць праверыць.

— Як гэта — праверыць?..

— А так: падзяжурыш на рэчцы ў навальнічную ноч. Будзе, як трэба — атрымай свае грошыкі і каціся куды хочаш!

— Што? Мне кожную ноч па рэчцы дубець?

— А зводка надвор'я? Будзе шторм — папярэдзім! Зразумела?

— Я сваё зрабіў, не маеце права...

— Я сказаў — і ўсё! — адсек Чучукала.— Палавіну зараз атрымаеш, астатнія — потым...

У той вечар, калі прыйшло Чучукалава папярэджанне, Валькоў вырашыў: пасля дзяжурства не вяртацца больш у Вязнікі. Алена папраўляла рыбацкую падхватку. Валькоў увайшоў у кухню і сказаў:

— Паеду ўжо я. Не ўспамінайце ліхам, калі што... Вельмі дзякую вам...— Валькоў і сам не разумеў, чаму раптам загаварыў чужымі яму, тутэйшымі словамі развітання.— Бывайце...

— Бывайце...— сказала гаспадыня, не падняўшы галавы.

— Не крыўдуйце, калі Ядзі гасцінец прышлю...— тым самым тонам, злуючыся на сябе, казаў Валькоў.

— Ці трэба? Не,— з сумнаю нібы насмешкаю абазвалася гаспадыня.— Вы і так на ўсіх нас пастараліся.

Валькоў нічога не сказаў і, нязграбна адступаючы задам, выйшаў з хаты.

## 6

Ад крыху пажаўцелай, нізка скошанай травы, ад сухога лісця вяза, ад лазняку, што схіліўся над рэчкай, ішоў мяккі, тленны пах. У начной цішыні чуваць былі нягучныя галасы: кагосьці дагнаў і пакрыўдзіў нехта мацнейшы, хтосьці выратаваўся і радаваўся, хтосьці трывожыўся, хтосьці скардзіўся, хтосьці сонна мармытаў, нібы сам сябе закалыхваў...

Гэтая сціпла агучаная цішыня была нястойкая, нетрывалая. Штосьці зусім выразна наспявала ў прыродзе. З захаду насоўваліся цёмныя і цяжкія хмары, захад быў непрыемны, мутна-ружовы, і па ім, па цёмных хмарах час ад часу мільгалі цьмяныя, нямыя бліскавіцы.

Прыхінуўшыся спіной да вяза, Валькоў задрамаў, але праз дрымоту працягваў адчуваць жыццё вакол сябе. Ён усведамляў, што змерклася і падняўся вецер, што месяц

пазалаціўся і свеціць па зямлю, што шуміць у бурных хвалях возера. Драмаў і бачыў сон, хутчэй не сон, а прывід, які нескапчона паўтараецца, як музычныя такты, калі на зношанай патэфоннай пласцінцы іголка трапляе ў шчарбіну. Ён стаіць у Алепіным двары, на страху хлява садзіцца варона з конскім хвастом. «Што гэта?» — з тугою пытаецца Алена. «Верхалёт,— спакойна адказвае ён.— Гэта па добрае». А сам ведае, што гэта вельмі кепска, вельмі сумна, нават па пагібель. Потым усё гэта на момант цьмянее і знікае, і зноў двор, на хлеве варона з конскім хвастом, і тужлівае Аленіна пытанне, і яго супакойвальны адказ. І зноў тое самае, толькі мацней і мацней сціскаецца сэрца, і, не стрываўшы ад болю, ён прымушае сам сябе здрыгануцца і з кароткім, ледзь чутным стогнам скідае гэты незразумелы і жахліва жудасны сон.

Моцна, гулка стукае сэрца. Валькоў паківаў галавой, усміхнуўся і раптам неяк дзіўна ўсхліпнуў. Праўдзівей, у ім усхліпнуў нехта маленькі, бездапаможны. «Расклеіўся ты, хлопец,— сказаў ён сабе,— ужо і верхалёты сняцца». Але туга, адчутая ў спе, не прайшла, засталася ў ім, хоць што тут журботнае — варона з конскім хвастом... Проста туга — смешна...

Валькоў выняў капшук, скруціў цыгарку і, абхінуўшыся пінжаком, закурыў.

Рэчка пабліскваўа пад месяцам, і ў яго празрыстым святле Валькоў заўважыў на беразе доўгае выгінастае цела вугра, ён поўз, спрабаваў, стараўся абысці гаць берагам. Але трава была скошана, вугор прапоўз па беразе некалькі сантыметраў і бяссільна тузаўся амаль на месцы на нізкай пожні.

Калі Валькоў выйшаў з-пад вяза, быццам трапіў у другую ноч, па целе хвастануў халодны і вільготны моцны вецер, а там, у зацішку, і ўявіць нельга было, што ён такі моцны. Вецер ішоў, наступаў з возера, гнаў з яго ваду, рэчка па гэты бок гаці падпялася. Неба зацягнулі хмары, месяц раз-пораз зацягваўся сіняватым дымком, але было светла: адна за аднойналяталі і налялталі бліскавіцы.

Валькоў падняў вугра. А той, як спружына, выслізнуў з рук. Валькоў зноў схапіў яго і зноў не ўтрымаў: вугор быццам высмактваў сам сябе з моцна сціснутых пальцаў. Тады Валькоў пабег пад вяз, узяў накінуты там лом, вярнуўся, падхапіў вугра пад пуза і шпурнуў к вадзе. Вугор упаў на пясчаную пры вадзе палоску, адсюль было лёгка спіхнуць яго ў ваду.

Зіхнула маланка, і ў яе імгненным святле Валькоў убачыў, што ў рэчцы кішаць вугры, іх чорныя, паднятыя над вадой галоўкі выразна вырысоўваліся на светлай сцяне гаці. Здавалася, яны аблізваюць дошкі. Валькоў адчуў, што твар яго становіцца халодны. Здавалася, ад беспрычыннага страху. Гаці ім не праскочыць, але бяда, што некалькі вугроў выскачылі на нізкі бераг, злева ад гаці. Валькоў схапіў лом, размахнуўся — і новы вугор, бліснуўшы светлым жыватом, паляцеў у ваду. Ды замест яго з рэчкі выкінуліся другія вугры, а сярод іх, можа быць, і той, якога Валькоў толькі што скінуў у рэчку.

Бухматы пук грошай у кішэні пінжака замінаў Валькову, дый горача яму стала, хоць усё мацней дзьмуў сцюдзёны вецер. Валькоў скінуў пінжак, аднёс яго пад вяз і павесіў на сук. А вецер усё болей гнаў ваду з возера, ціхая рачулка ўспенілася, забурліла. У белай пене выразней вытыркаліся цёмныя вугровыя галоўкі. Валькову здавалася, што вугроў стала ў шмат разоў болей. Хоць гэтыя без касцей істоты нічога не змогуць зрабіць з яго збудаваннем, на якое скарыстана тоўстае бярвенне, як нельга лепш трывала змацаванае жалеззем, але Валькову станавілася цяжэй, неспакойней. У гэтай вугровай упартасці было штосьці такое непераадольнае, якое не ў змозе перасягнуць людскі разлік, волю, рашучасць. Успомніліся размовы рыбакоў, што вугра не ўтрымаць, што ён абавязкова ўцячэ ў першую ж навальнічную ноч, што ёсць у гэтага стварэння штосьці загадкавае, што яго нельга параўноўваць ні з якой істотай на зямлі... Але глупства ўсё гэта, адны забабоны: рыба ёсць рыба! Дарэмна толькі марнуе ён сілу. Сухазем'ем адсюль ім нікуды не выбрацца...

Ён працягваў шпурляць вугроў у ваду, не верачы, што гэта трэба, і не адважваючыся спыніць марную, якая ўжо і знясіліла яго, працу. А тут! ...Лінуў лівень, патухлі зарніцы, у цемры Валькоў не бачыў вугроў, не мог нават разгледзець, дзе бераг, дзе рэчка, дзе гаць. Неяк дацягнуўся да вяза, наткнуўся тварам на галлё і лёг, скурчыўшыся і прытуліўшыся да вяза. Падсохлае лісце не схавала ад дажджу, і Валькоў, каб не намачыць грошай, скруціў пінжак і схаваў цэлы пук іх пад сябе.

Дзіваком здаваўся ён самому сабе. У апраметнай цемры, у суцэльным шуме дажджу і рэчкі, адрэзаны, ды не кімсьці, ад усяго свету, сядзіць ён, як пад рэшатам, пад асеннім дрэвам, і незразумела нават, як ублытаўся ва ўсё гэта ён, мяшчэрскі майстар, цясляр Васіль Валькоў. Мо-

жа, гэта і ёсць тая прыгода, пра якую ён так марыў? Няхай бы гэта прыгода здарылася з кімсьці другім. Але нічога не зробіш, трэба датрываць. Заўтра ў канторы ўсё сённяшняе стане мінулым, ён атрымае свае грошы, і бывайце здаровы...

Штосьці моцна і дробна забарабаніла па зямлі, па лісці вяза, дзіўныя белыя палоскі прарэзалі цемру. Валькоў здагадаўся, што гэта град, толькі тады, калі балюча сцебанула па плячах і каленях. Дождж сціх, і стала чуваць, як з шорганнем скочваліся градзіны па скосе берага ў рэчку. Зноў зірнуў месяц, і ўсё кругом заблішчэла: лужыны, лісце, градзіны. Паслізваючыся на буйных, з зязюліна яйка, градзінах, Валькоў спусціўся да рэчкі. Ля вады град ляжаў светлаю серабрыстаю дарожкаю, і па ёй, як па расістым гаросе, паўзлі два вялізныя вугры. Ледзь стрымаўшыся... каб не бахнуць іх ломам, Валькоў падчапіў аднаго і кінуў у ваду, потым другога. Цяпер убачыў ён, як высока паднялася вада ў рэчцы. Вугры ўскідалі галоўкі ўжо за край мосціка, які Валькоў зрабіў над вадасцёкам, каб можна было перайсці з берага на бераг. Здавалася, яшчэ хвіліна-другая, і яны пачнуць пераскокваць цераз гаць. Ён узбег на мосцік якраз у час: вялізны вугор, як спружына, кінуўся з вады, ледзь-ледзь не на мосцік. Валькоў згроб яго нагой у ваду, але побач ускінулася яшчэ адна вузкая галоўка, яе Валькоў капнуў ломам, ударыў нагою па другой галаве, паслізнуўся і балюча пляснуўся бокам аб дошкі. Падхапіўшыся, ён убачыў, што многа вугроў ужо абыходзіць гаць, і кінуўся ўніз...

Валькова ахапіла лютасць. Ён прамок да рубца, паслізнуўся і моцна выцяўся бокам, да крыві пасціраў далоні аб лом. А вугры — насядалі, у непераадольнай сляпой упартасці падстаўлялі яны сябе не пад штуршкі, а пад удары жалезнага лома. І ўсё лезлі, лезлі, лезлі... Штосьці цёмнае прачнулася ў Валькове, ён, раз'юшаны, насіўся з гаці на бераг і назад на гаць, амаль не ўсведамляючы, што робіць, памятаючы толькі адно: трэба заганяць вугроў назад у рэчку. Зноў сцебануў лівень, але Валькоў не хаваўся пад вязам, ён і ў апраметнай цемры знаходзіў вугроў. Пад ліўнем градзіны раставалі, змываліся ў рэчку. На бераг выпаўзалі толькі адзінкавыя вугры. Было відаць, што вугровая безліч стараецца прабіцца вадою...

Дождж сціх, а навальніца шумела, зіханне маланак часам злівалася ў суцэльнае яркае полымя, што ўскідвалася купалам над зямлёю. Аглушальныя перуны пераходзілі ў

сухі трэск, шкляны звон, цяжкія каменныя абвалы, быццам ушчэнт разбураліся нябачныя палацы.

У зіхаценні бліскавіц Валькову бачыліся іншыя, чорныя маланкі, што шпурляла са сваёй глыбіні запененая рэчка.

Вугры выскоквалі з пабухлай вады, праслізгвалі па самай гарбіне вадаспаду, што біўся і пеніўся з гаці, удараліся аб мосцік і звальваліся назад у ваду. Некаторым удавалася ўскінуць на мосцік большую частку цела, і яны віселі так, шалёна звіваючыся, спрабуючы ўспаўзці наверх. Але Валькоў паспяваў і скідваў іх у рэчку. Ён даўно страціў меру часу і не мог бы сказаць, колькі ідзе ўжо гэта барацьба: гадзіну, дзве, тры, шэсць гадзін. Вугроў было зараз ужо ці не болей, чым вады ў рэчцы. Валькову здалося, што рэчка паднялася не так ад дажджу ці ад вады з возера, прыгнанай ветрам, як ад гэтых незлічоных цёмных істот, што запоўнілі ўсё вузкае рэчышча ад возера да гаці.

Вялізны, па паўтара метра, вугор кінуўся з вады і бахнуўся на мосцік каля самых Вальковых ног. Ён зрабіўся нібы жывой і са сталі спружынай, ірвануўся наперад, на другі бог гаці.

— Ах ты гад! — шалеючы ад злосці, зароў Валькоў і гахнуў вугра ломам па галаве.

Ён датуль біў, пакуль не раструшчыў вугру галаву. Тады, як звар'яцелы, стаў біць па доўгім пругкім целе, здрабніў вугра па кавалкі. Але кожны кавалак нібы меў асобнае жыццё, поўз далей, наперад.

— Гад ты печаны! — сказаў Валькоў ужо не на вугра. Сказаў — на сябе. І апусціў лом.

Гэта быў момант бязлітаснага для яго самога апрытомнення. На што пайшоў ён іржавым ломам? На само жыццё, на яго спрадвечны, святы закон. Вугры прабіваюцца ў далёкае цёплае мора, на магутны, чысты, далікатны кліч прыроды, каб на векі вечныя захаваць свой род. А ён, Валькоў, праз сваю нікчэмную карыслівасць, дзеля ганебных разлікаў пейкага Чучукалы, перагарадзіў вуграм шлях, аддаў іх на знішчэнне і выміранне. Выпадковы прыхадзень, карыслівы чужынец, ён пайшоў наперакор тутэйшым людзям, якія з даўняга даўна сваёй працаю падружыліся з прыродаю, навучыліся паважаць яе законы.

Валькоў высока ўзняў лом, як мог, увагнаў у паз між двух бярвёнаў і, наваліўшыся ўсім целам, спрабаваў разняць тое, што будаваў, што збіваў, змацоўваў з усёй сваёй стараннасцю і ўмельствам.

Неверагодным напружаннем усёй сваёй сілы Валькову ўдалося ўбіць лом між бярвёнаў і прасунуць яго пад дужку жалезнага клямара. Але, калі паспрабаваў сарваць клямар, лом выслізнуў з Вальковых рук і ўпаў у рэчку. Без разваг ён кінуўся ў ваду ўслед за ломам. У вадзе, яна была яму па шыю, кішэлі вугры, яму здавалася, што ён трапіў у змяіны клубок. Але не было ні страху, ні агіды. Гэта былі яго маладзейшыя, бязмоўныя браты, і ён навіпен дапамагчы ім. Ён нырнуў і, нават тварам адчуўшы слізкіх вугроў, абмацаў на дне лом, схапіў яго, вугры заміналі выбрацца на бераг, і ён расхінаў іх:

— Дайце ж прайсці, браточкі! Бесталковыя вы!..

Вылезшы на бераг, Валькоў зноў узышоў на гаць, адсюль зручней было яе разбураць. Ён пачуў у сабе прыліў бадзёрасці, цяжкі лом налягчэў у яго руках. Ён здзіўляўся, адкуль у яго новая, нечаканая сіла; ён яшчэ не ўсвядамляў, што зараз ён узняўся да найлепшага ў самім сабе, што зараз ён быў і самой прыродай, і самім яе людскім розумам, які ахоўвае яе...

Блізкая маланка нечакана сцебанула па вачах, асляпіла, пранізала электрычнаю сутаргай. Валькоў упаў, на нейкае імгненне страціўшы навакольны свет, а калі апрытомнеў, то ўбачыў на беразе рэчкі вялізны факел: гарэў падпалены маланкаю вяз. Сухі ад старасці, абсушаны ветрам, ён успыхнуў, як порах. Пылаў ад нізу камля да верхавіны, з трэскам гарэла тоўстае галлё, а лісце згарала, не ўспыхваючы агнём. Валькоў абыякава падумаў, што там, пад вязам, застаўся яго пінжак і грошы, і зноў узяў лом у рукі.

Ужо бралася на світанне, калі гаць паддалася і абрушылася. Валькоў ледзь паспеў саскочыць на бераг. Рэчка сама, сваёю сілаю закончыла пачатае. Валькоў не бачыў, як у пралом рынуліся вугры, як прадзіраліся яны на волю, пакідаючы на бярвёнах і нашчапаных дошках шматкі... свайго мяса. Валькоў стаяў і глядзеў, а потым з болем аддзіраў лом ад скрываўленых далоняў: яны прысохлі да жалеза. На беразе круціўся і звіваўся адзінокі вугор. Валькоў сапхнуў яго ў рэчку і павольна, хістаючыся, ледзь цягнучы ногі, пайшоў пад спалены вяз. Зямля пад дрэвам была пакрыта мяккім попелам. Валькоў прысеў на зямлю, прыхінуўшыся спіною да цёплага, абгарэлага вяза, апусціў скалечаныя рукі на калені, схіліў галаву на грудзі і адразу ж заснуў.

Раніцою на рэчку прыйшлі рыбакі. Яны ўбачылі раз-

бурапую гаць, пекалькі мёртвых вугроў па беразе, спаленае дрэва і ў моцным сне чалавека. Каля яго валяўся лом у запёках крыві, нейкія абгарэлыя лахманы і пекалькі скручаных у чорныя трубкі паперак. У чалавека быў мёртвы, стомлены твар, рукі звісалі з каленяў, пальцы былі скурчаны. Рыбакі раскатурхалі Валькова, каб завесці яго ў вёску. А ён не разумеў, чаго ад яго хочуць, заматаў галавою, штосьці мармычучы, і зноў заснуў. Тады яны паслалі па жанчыну. Яна падышла, крапула за плячо, і Валькоў расплюшчыў вочы. Жанчына дапамагла яму ўстаць, асцярожна завяла яго руку сабе на плячо і павяла ў вёску. У сваё жыццё.

# Уладзімір Багамолаў

## СЭРЦА МАЙГО БОЛЬ

Гэтае пачуццё не пакідае мяне вось ужо многа год, але з асаблівай сілай яно авалодвае мною 9 мая і 15 верасня.

Зрэшты, не толькі ў гэтыя дні я ўвесь у палоне таго пачуцця. Неяк увечары, неўзабаве пасля вайны, у людным, ярка асветленым «Гастраноме» я сустрэўся з маці Лёнькі Зайцава. Стоячы ў чарзе, яна задумліва глядзела на мяне, і не павітацца з ёй я проста не мог. Тады яна падышла бліжэй і, пазнаўшы, хто я, выпусціла ад нечаканасці сумку і раптам заплакала.

Я стаяў, не маючы сілы зрабіць і кроку ці вымавіць хоць слова. Ніхто нічога не разумеў: думалі, што ў яе ўкралі грошы, а яна ў адказ на роспыты толькі істэрычна выкрыквала: «Ідзіце!!! Пакіньце мяне ў спакоі!..»

У той вечар я хадзіў як сам не свой. І хоць Лёнька, я чуў, загінуў у першым баі, можа, нават не паспеў забіць і аднаго немца, а я прабыў на перадавой каля трох гадоў і ўдзельнічаў у многіх баях, я адчуваў сябе ў нечым вінаватым і бясконца абавязаным і гэтай старой жанчыне, і ўсім, хто загінуў — знаёмым і незнаёмым, і іх маткам, бацькам, дзецям і ўдовам...

Нават толкам не магу зразумець чаму, але з таго дня я ўсяляк пазбягаю, каб не трапляць на вочы гэтай жанчыне, і, калі бачу яе — яна жыве ў суседнім квартале,— пераходжу на другі бок вуліцы.

А 15 верасня — дзень нараджэння Пецькі Юдзіна: кожны год у гэты вечар яго бацькі склікаюць да сябе сяброў яго дзяцінства.

Прыходзяць дарослыя саракагадовыя людзі, але п'юць не віно, а чай з цукеркамі, пясочным тортам і яблычным пірагом — з тым, што больш за ўсё любіў Пецька.

Усё робіцца так, як было і да вайны, калі ў гэтым пакоі жартаваў, смяяўся і камандаваў лабаты жыццярадасны хлапчук, забіты недзе пад Растовам і нават не пахаваны ў сумятні панічнага адступлення. На самае пачэснае

месца ставяцца Пецькава крэсла, яго кубак з духмяным чаем і талерка, куды маці старанна пакладае арэхі ў цукры, самы вялікі кавалак торта з цукатам і акрайчык яблычнага пірага. Быццам Пецька можа пакаштаваць хоць кавалачак і закрычаць, як бывала, на ўсё горла: «Смаката якая, браткі! Ану наляжам!»

І перад Пецькавымі бацькамі мне таксама вельмі няёмка: адчуваю якойсьці нязручнасці і вінаватасці, што вось я вярнуўся, а Пецька загінуў, увесь вечар мучыць мяне. Да болю сціскаецца сэрца; задумаўшыся, я не чую, пра што гавораць за сталом, я ўжо далёка-далёка... У думках бачу ўсю Расію, дзе ў кожнай другой ці трэцяй сям'і хто-небудзь не вярнуўся...

*1963*

# Павел Нілін

## СТАРЫ ЗАВЕЕЎ

У Завеева Егізара Сямёнавіча памерла жонка, калі яму ішоў ужо шэсцьдзесят другі год. Дзеці выраслі, разышліся па свеце. Завееў астаўся адзін у прасторным доме над Ангарой.

Было гэта, здаецца, у тысяча дзевяцьсот другім годзе. Завееў пагараваў тыдні са два і рашыў ажаніцца.

Увесь пасёлак разгубіўся — і з-за таго, што Завееў не вытрымаў нават належнага тэрміну пасля смерці жонкі, і з-за таго, што на схіле год, калі людзям пра смерць трэба думаць, уздумаў ажаніцца.

І галоўнае, абурыла ўсіх, што ён уздумаў браць дзяўчынку-сірату Ефрасінню, якой ледзь толькі споўнілася шаснаццаць.

Шаснаццаць і шэсцьдзесят два гады. Ён што, здурнеў, ці што? Ну, дзяўчынка, зразумела, не ведае, што такое сям'я. І акрамя таго, ёй і дзецца няма куды, няма дзе жыць. А ён, Завееў, павінен жа ўсё гэта разумець.

З Краснаярска, пасля таго, як пачуў пра бацькаву жаніцьбу, прыехаў старэйшы сын Георгій.

— Тата, вы што вытвараеце, падумайце. Яна ж, гэта дзяўчынка, Прося, майце на ўвазе, цвікі ў кішэні носіць.

— Якія цвікі? — здзівіўся Егізар.

— Якія? Звычайныя. Ад труны вашай. Яна ж цяпер будзе чакаць таго часу, калі... гэта самае... калі можна будзе труну забіць. І яна, майце на ўвазе, астанецца гаспадыняй у доме, калі вы, адным словам, ачахнеце...

— Вось і добра,— расцвіў Егізар.— Вось і добра, што знайшоўся чалавек на такую работу. А то як жа паміраць мне аднаму? Усе разышліся, і нават труну няма каму закрыць. Гэта, Гошка, сынок, шчасце мне — ажаніцца мне цяпер, пакуль я, як быццам бы, і не стары зусім. А хто ж за мяне потым пойдзе? А без жонкі мне нельга. У мяне, ты ж бачыш, дом, гаспадарка, дзве каровы, конь і цэлая тайга зверыны, якую я павінен сачыць і страляць.

— Ды нашто ж дзяўчынку бераце? — закрычаў ад злосці Георгій.— Хіба мала дарослых баб? Мне ж сорак другі год, я маладзейшы за вас, палічыце, на дваццаць год, а і я нізашто б не адважыўся...

— У гэтым і ўсё яно,— усміхнуўся Егізар.— Справа ў тым, што трэба адважыцца. І хто можа? Ты вось не можаш, а я магу. І — раблю. А хто і што там гаворыць, мне ўсё гэта зусім нецікава слухаць. І за ўсіх і за ўсё, што кожны думае, я адказваць не бяруся. Адказваю за сябе, калі астаўся зусім адзін, як ты правільна сказаў.

Прыязджаў да Завеева поп з Тулуна, доўга гутарыў, угаворваў. Пад канец, як і павінна, пачаў пагражаць геенай вогненнай.

Завееў, аднак, не спалохаўся. Ён упарта, як заняты, стаў супераk усеагульнага незадавальнення.

І дзяўчынка гэтая Ефрасіння, таксама, надзіва ўсім, не паддалася на ўгаворы, не пакарылася пагрозам, паўтарала з зайздроснай смеласцю, што любіць Егізара Сямёнавіча і жыць без яго не можа.

І калі ён гэтак сумеў прыручыць яе, чым умудрыўся спакусіць — незразумела.

Па законе абвянчацца яны не маглі, пакуль нявесце не споўніцца васемнаццаць. Пэўны час яны жылі нявенчаныя, літаральна пад свіст усяго пасёлка і бліжэйшых вёсак.

Нарэшце Ефрасіння стала паўналетняя. Поп вымушаны быў абвянчаць іх, такім чынам, узаконіць гэты няроўны саюз.

Вянчаліся яны пад вечар. Была позняя восень, ішоў дождж. Але каля царквы сабраўся ўвесь пасёлак, каб асмяяць маладажонаў.

Хлапчукі пальцы ў рот і свісталі ім услед.

На вясельную вячэру, вядома, ніхто не прыйшоў. Ды Завееў і не запрашаў нікога. Але вячэра была сапраўды вясельная: свініна і цяляціна, рабчыкі, смажаныя ў брусніцах, гарэлка, настоеная на абляпісе і на духмянай травезаранцы, зялёна-палевая, ядавітая на выгляд, але халаднавата-саладкавая на смак.

Піў гарэлку, праўда, толькі Егізар. Ефрасіння чокалася з ім мятным квасам у гранёным лафітніку. І абое рабілі выгляд, што не звяртаюць ніякай увагі на вокны, апырсканыя дажджом, быццам слязамі, і заклеепыя насамі і шчокамі непрыязных, але цікаўных суседзяў.

Вокны знарок не былі завешаны. Глядзіце, хто хоча,

на наша шчасце ці на наша глупства, як вам ужо там здаецца.

Пасёлак асабліва юраваў ад пасмешак пасля таго, як недзе амаль праз месяц пасля вяселля Ефрасіння нарадзіла хлопчыка.

А хлопчык быў лабасты, лупаты, выліты Егізар Завееў, які сурова і ў той жа час быццам і насмешліва глядзіць на свет, нібы загадзя смяецца са сваіх праціўнікаў.

На хрысціны ніхто не прыйшоў, акрамя хроснага бацькі Мітрафана Хахалева, бакалейшчыка, які выпадкова заехаў, і павітухі Кудзіміхі, якая гэтак напілася салодкай гарэлкі на вячэры, што адважылася гаварыць, быццам Егізар некалі быў яе ўхажорам, які, як можна было зразумець, нават збіраўся ажаніцца з ёй.

— Ды нашто ты мне трэба была, старая зязюля? — стрымана ўскіпеў Егізар.— Ідзі на сябе ў люстра глянься.

— Не, ты сам спачатку глянь на сябе,— злосна параіла Кудзіміха.— Ты ж дзед сваёй жонцы.

— А вам то што? — спыталася ў Кудзіміхі Ефрасіння. — Вы чаго не ў свой агарод сунецеся?

— Хлюзда, інтэрсантка няўдзячная! — ускрыкнула, быццам ад нясцерпнага болю, Кудзіміха.— Ды калі б не я, ды не мой клопат, не мая добрая душа, то хто тут у тайзе ўзяўся б прымаць ад цябе твайго сына-парсючка, хто б сведкам і хросным пайшоў на вяселле і на хрысціны, каб не ўгаварыла я Хахалева Мітрафана Ягоравіча?! Ды і ён, бачыце, усё ж не пайшоў з-за сораму з вамі вячэраць, не захацеў вашай салодкай выпіўкі і пачастунку. Брыдка перад людзьмі, падумайце толькі, што жывяце насуперак усім правілам...

У двух пунктах сваёй доўгай, з лаянкай, прамовы ўчыніла вялікую знявагу гаспадыні дома Кудзіміха. Гэта, першае, што сказала страшнае слова «інтэрсантка», і, другое, калі абазвала сына Ваську парасём.

Рахманая Ефрасіння агрэла Кудзіміху качалкай па хрыбце, чым быццам бы папярэдзіла ўвесь пасёлак, усіх пасмешнікаў і ворагаў, што яе пакорлівасць мае межы і што на вялікую крыўду яна можа адказаць адпаведна.

Праз год Ефрасіння нарадзіла другое дзіця, зноў хлопчыка — Інакенція. І гэтак пусціла на свет траіх, двух хлопчыкаў і адну — на завяршэнне — дзяўчынку.

Вось з адным з гэтых траіх я і пазнаёміўся летам тысяча дзевяцьсот шасцідзесятага года на будаўніцтве Брацкай ГЭС. Ён і расказаў мне вышэй апісаную гісторыю яго

бацькоў. Нават болей, пазнаёміў мяне з імі, бо яны прыехалі да яго ў госці. На першы погляд бацька здаўся мне не такім і старым. Высокі, паджары, ён больш падобны быў на жыхара пустыні — чорна-карычневы, быццам абсмалены на сонцы. Яму магло быць і шэсцьдзесят, і семдзесят, але ж не сто з гакам.

Аднак лускавініста-сухія рукі і белаватая плеўка ў вачах, якраз такая, як у птушак, якія засынаюць, гаварыла пра яго доўгі век. І рухаўся ён з асаблівай асцярожнасцю, патрэскваў суставамі, як страказа крыллем.

Акрамя многага, я папытаўся ў яго і пра суседзяў — тых, хто асмейваў яго з-за жаніцьбы з дзяўчынкай.

— Памерлі, — сказаў ён. І ў вачах яго прамільгнула гарэзная іскрынка, якая адразу ж і атухла слязой слабасці.— А дзяўчынка гэта, як вы тут сказалі, вось яна,— паказаў ён на маленькую бабку, якая сядзела на лаўцы ля ярка асветленага сонцам зялёнага штакетніку. І зноў паўтараў, ужо без іскаркі ў вачах. —А суседзі нашыя, тыя самыя, усе памерлі. Усе да аднаго. Нікога не засталося. — І пасля таго, як памаўчаў: — Няма каму цяпер пасмяяцца, хоць і трэба было б...

Я прысеў на лаўку побач з гэтай слабенькай, непрыкметнай, па-сібірску сціпла, але акуратна адзетай бабулькай.

Яна сядзела з краю і, здаецца, абыякава глядзела на лес, які парадзеў на гэтым участку, на заараную механізатарамі зямлю, на бялява-смарагдавую ваду магутнай рэчкі, над якой тут і там выцягнулі свае шыі пад'ёмныя краны. Мне хацелася пагаварыць з ёй, але я яшчэ не ведаў, з чаго пачаць.

Раптам яна загаварыла сама.

— Мялеюць рэчкі. А чаму? — быццам спыталася яна і выцерла губы ражком хусцінкі. — Таму і мялеюць, што людзі зводзяць лес. А, мабыць, і пасля нас тут людзі будуць. А без лесу якая ж радасць жыць? Адзін чад.

Голас яе здзівіў мяне сваёй нечаканай цвёрдасцю. І сказанае здзівіла. Здзівіў сэнс сказанага.

— Гэта тут, паблізу, здаецца, што лесу мала, — сказаў я. — А далей тайга...

— Гэта вы каму, мне, ці што, расказваеце? — яна неяк хутка павярнулася да мяне сваім вузенькім, цёмным, іканапісным тварыкам. І ў вачах яе, некалі, мабыць, вялікіх і сініх, на імгненне прамільгнула ледзь не пагарда. — А я ў тайзе, аднак, змалку жыву. Ад самага параджэн-

ня. І з Егізарам Сямёнавічам, як выйшла за яго, абышла і аб'ехала, аднак, многа тут. Ён жа яшчэ пядаўна звераловам быў...

Яна, было падобна, з хваляваннем спяшалася расказаць пра ўсё, каб у пастаронняга чалавека найхутчэй узнікла правільнае ўяўленне пра тое, хто яна і яе муж.

І калі гаварыла гэтак, нечакана паспешліва, з усё большым хваляваннем, быццам маладзела ў мяне на вачах, дапамагала мне ўявіць, якая яна была шустрая дзяўчынка, дзяўчына ў той час, калі раптам пакахала гэтага на выгляд суровага звералова з незвычайным іменем Егізар.

А ён стаяў у гэты час крыху наводдаль, абапіраўся на доўгі сукаваты кій — высокі, худы, і, магчыма, нават сярдзіты.

— Думае, — амаль як на бога, паглядзела яна на яго. І чамусьці цішэй, нібы па сакрэце, пачала пераконваць мяне, што ён зусім не злосны і не пануры. — Вы нават і ўявіць не можаце, аднак, які ён вясёлы і добры,— гаварыла яна. — І з ім нідзе не страшна — ні на рэчцы, ні ў лесе. Я ж з ім усё жыцце, як адзін дзень, пражыла. І ні на часінку, аднак, не засумавала...

Вочы ў бабулькі ў гэтае імгненне зноў сталі вялікія і сінія. І я падумаў, што дзіва, відаць, не ў тым, што каханне часам зводзіць зусім розных людзей. Дзіва, відаць, у яго бяссмерці.

*1963*

# Уладзімір Дудзінцаў

## НАВАГОДНЯЯ КАЗКА

Я жыву ў фантастычным свеце, у казачнай краіне, у горадзе, які я стварыў у сваім уяўленні. Там людзі трапляюць у незвычайныя гісторыі, і невялікая доля гэтых здарэнняў выпала і мне. Сёе-тое я і раскажу вам, карыстаючыся тым, што пад Новы год чалавек ахвотна і даверліва слухае розныя выдумкі. Я раскажу пра дзівосы, якія часта падкідвае нам час. Вы ведаеце, што час неабдымны, ён дзейнічае ўсюды. Нават у казачным свеце гадзіннік можна зверыць па сігналах маскоўскага часу. Вось таму я і не баюся пачынаць расказ. Можа, знойдзецца цікаўны чалавек, што захопіцца маёй выдумкай, якая аблегчыць яго сур'ёзнае, не выдуманае жыццё.

У наш горад прыляцела дзіўная птушка — сава. Некалькіх чалавек яна ашчаслівіла сваім візітам. Першы быў мой непасрэдны начальнік, шэф лабараторыі па даследаванні Сонца, дзе я працую. Другому, каму пашчасціла,— гэта мой сябр па школе, урач. Трэцім сава выбрала мяне. Птушка гэта цудоўная. Было б някепска, калі б грунтоўна вывучылі яе схільнасці, а партрэт узялі і змясцілі ў атласе.

У мяне да гэтага часу ўжо былі навуковыя працы пра некаторыя ўласцівасці сонечнага святла. Я атрымаў вучоную ступень, быў кансультантам у некалькіх камісіях і спяшаўся стаць вядомым чалавекам. Пераймаючы норавы нашых старэйшых людзей, я навучыўся так, як і яны, высока трымаць галаву, так, як і яны, не спяшаючыся абдумваць зададзенае мне пытанне і гэтаксама, падняўшы брыво, расцягваць свой сур'ёзны, прадуманы адказ. Яшчэ адна мая рыса: я прывык клапаціцца пра сваё дарагое паліто.

У нас у кабінетах ёсць шафы, і я, як і нашы старэйшыя супрацоўнікі, павесіў у сваёй шафе драўляныя плечкі пад паліто, якія пазначыў сваімі ініцыяламі.

Я быў ад прыроды крыху здольным чалавекам і, выс-

лухаўшы параду аднаго акадэміка, прывучыў сябе запісваць усе думкі, якія нечакана прыходзілі мне ў галаву. Вядома, што самыя вартыя думкі не тыя, якія мы вымучваем, седзячы гадзінамі за сталом, а тыя, якія налятаюць, як парыў ветру, часцей за ўсё, калі ты ідзеш па вуліцы. Я запісваў гэтыя думкі і адразу забываўся на іх. Затое наша тэхнічка добра помніла, што ў мяне ў стале трапляюцца паперы, якія гараць, як порах. Яна прызвычаілася вычышчаць мой стол і распальвала імі ўсе печы ў лабараторыі.

Але нешта ад наіўнага дзіцяці было ў мяне пад апраткай салідпасці (між іншым, нешта ад такога ж дзіцяці было і ў майго шэфа). Гэта дзіця з надзьмутымі шчокамі калі-нікалі давала сябе адчуць, асабліва вячэрнім часам, калі мы, халасцякі, садзіліся ў нашай кватэры перад тэлевізарам і, вылупіўшы вочы, знямеўшы, як заспіртаваныя, сачылі за нагамі футбалістаў, якія мільгалі ў блакітным акенцы.

Як бачыце, я не шкадую тут перш за ўсё самога сябе. Многія грані свайго характару я выстаўляю на ваш суд і выстаўлю яшчэ не раз, разумеючы ўсё і з'яўляючыся першым суддзёй самому сабе. З нейкага часу ў мяне нібы прасвятлелі вочы: якраз з таго дня, калі сава зрабіла мне асабіста першы візіт. Яна прасвятліла мне вочы. Дзякуй ёй.

Я, напрыклад, па-новаму зірнуў на сваю цяганіну з нейкім С.— членам-карэспандэнтам адной акадэміі навук з правінцыі. Пяць гадоў таму назад у сваім артыкуле ён назваў маю вядомую надрукаваную працу «нікчэмнай выдумкай». Я змушаны быў яму адказаць. У новым артыкуле я нібыта мімаходзь абверг галоўныя палажэнні С. і сказаў, па-мойму, да месца, такія словы: «Іменна гэта без поспеху імкнецца даказаць кандыдат навук С.» (Мне добра вядома, што ён хоць і член-карэспандэнт, але вучоная ступень у яго, як і ў мяне — кандыдат.) На гэты мой выпад С. тут жа адказаў брашуркай і там таксама як бы мімаходзь сказаў, што я падганяю вынікі сваіх доследаў пад тэорыю, а слова «тэорыя» ўзяў у двукоссе. Неўзабаве пасля гэтага я надрукаваў вялікі артыкул пра свае новыя назіранні над Сонцам, якія пацвярджалі тэорыю, узятую ў двукоссе, а выкладкі С. разграміў у пух і прах. «Тарпеда лучыла лінкору ў круйт-камеру»,— так сказалі з гэтага выпадку мае сябры. Імя С. у артыкуле я не ўспомніў — я ведаў, што гэтай маёй другой тарпеды вораг

не праглыне. Я проста сказаў: «Некаторыя аўтары». Але лінкор праглынуў маю тарпеду і адказаў мне...

І так далей. Гэта вайна, якая цягнулася пяць гадоў, так ужо размагніціла маю нервовую сістэму, што лепш не гаварыць... Ды не толькі маю...

Але... бліжэй да справы. Аднойчы раніцай мы ўсе сабраліся ў нашай лабараторыі, павесілі свае польты на плечкі і, перш чым заняцца доследамі, пачалі, як кажуць, ранішнюю раскачку. Пачаў яе наш старэйшы і паважаны шэф, доктар навук. У вольны ад работы час ён займаўся вывучэннем старызны, збіраў каменныя тапары, старасвецкія манеты і кнігі, і, па-мойму, у гэтым, а не ў нашай працы быў для шэфа ўвесь сэнс яго спакойнага жыцця.

— Цікавая рэч! — сказаў ён, запрашаючы нас паслухаць.— Нядаўна, расшыфроўваючы адзін надпіс на каменнай пліце, я знайшоў вось што... Вось гэты малюнак.

І ён паказаў нам белы ліст, на якім была намалявана тушшу вушастая сава.

— Мне ўдалося прачытаць і надпіс,— з гонарам сказаў шэф.— Там пасля нейчага імя было напісана: «А жыцця ў яго было дзевяцьсот гадоў».

— Та-ак... — задумліва сказаў адзін з маіх калег па групе, моднік і жартаўнік. — Мне б хапіла і чатырохсот...

— А навошта вам? — раптам рэзка выгукнуў плячысты і сухі пажылы мужчына, які амаль заўсёды маўчаў. Ён сядзеў побач са мной і адрозніваўся ад нас усіх тым, што ніколі не звяртаў увагі на сваё адзенне, быў маўклівы і незвычайна працалюбівы.— Вам гэтыя чатырыста гадоў не патрэбны,— сказаў ён. — Вы і так не спяшаецеся.

— Я хачу звярнуць вашу ўвагу! — павысіў голас шэф, даючы зразумець, што яго перапынілі на паўслове.— Звяртаю вашу ўвагу! Такія словы ў розныя гады былі знойдзены ў многіх краінах. У адной пустыні стаіць велізарная сава з граніту. У нашай мясцовасці гэта першая знаходка. Магу пахваліцца,— тут шэф задаволена ўсміхнуўся,— гэта сава і гэты надпіс — мая асабістая знаходка, маё адкрыццё. Я выкапаў гэты камень у сваім садзе.

Мы павіншавалі шчаслівага шэфа, яшчэ раз кінулі вокам на саву і пайшлі кожны за свой стол.

— Я абавязкова дазнаюся, што значыць гэты малюнак,— сказаў шэф.— Пасля я гэта ўсё апублікую...

— Гэта ж дзевяцьсот гадоў жыцця!..— Не змог стрымацца я.— Няўжо некалі можна было так доўга жыць?

— Усё можна! — азваўся плячысты, заўсёды заняты працай мой сусед.

— Што вы гэтым хочаце сказаць? — ветліва спытаўся шэф.

— Час — таямніца,— адказаў мой сусед, яшчэ больш таямніча.

— Так, час — таямніца,— падхапіў шэф ягоную думку. Ён зняў са сцяны пясочны гадзіннік, перакруціў і паставіў перад сабой на стол.— Цячэ! — сказаў ён, гледзячы на пясок.— І глядзіце, што выходзіць: імгненне, якое мы перажываем, можна параўнаць з дробнай пясчынкай, з бясконца маленькай кропкай... Яно вось-вось знікне...

І мне раптам сціснула недзе ў грудзях. У мяне ў жыцці было некалькі месяцаў нечаканага, незвычайнага кахання, і гэтыя месяцы цяпер, калі я на іх азіраюся з болем, зліліся ў адно імгненне, зрабіліся пясчынкай, якая ўпала на дно гадзінніка. І ніякага следу... Нібы нічога і не было! Я ўздыхнуў. Калі б можна было перакруціць гадзіннік!..

— Даруйце, шэф,— перапыніў мае думкі наш загадчык аддзела кадраў.— Што ж атрымоўваецца па вашай, з дазволу сказаць, тэорыі: калі час — кропка, значыць, у нас няма нашага гераічнага мінулага? Няма сонечнай будучыні?

Ён любіў заўсёды задаваць лабавыя пытанні — нібы абвінавачваў субяседніка ў вялікім злачынстве.

— Я прашу прабачэння, калі сказаў што-небудзь не так,— адказаў наш мірны шэф.— Але я, па-мойму, не паспеў сфармуляваць ніякай тэорыі. Гэта ўсё жарты, фантазія...

— І фантазія нейкая дзіўная! Ёсць усё-такі рамкі...

— Даражэнькі...— азваўся раптам наш непрычасаны, заўсёды заняты працай дзівак. Мы ўсе агледзеліся.— Усё новае, усё, чаго мы шукаем, ляжыць па-за рамкамі. Пасярод рамак усё абшукана, а што засталося — усё звычайнае...

І разявіўшы рот (у яго была такая манера), ён ціха, без гуку, засмяяўся ў вочы строгаму субяседніку. Тут мы даведаліся пра новую рысу ў характары нашага калегі.

Два гады мы сядзелі з ім у адным пакоі і не ведалі чалавека! Бачылі толькі, як ён не часта голіцца і кідае з плеч на крэсла паліто. Заўважалі, што на паліце ў яго не хапае некалькіх гузікаў. Урэшце, бачылі, што калега працуе за чатырох. А пазнаёміцца як след з ім не давялося.

— Хочаце, я зараз раскажу вам адну цікавую гісторыю,— зноў пачулі мы голас гэтага працавітага чалавека.

Усе здзівіліся: чалавек упершыню захацеў змарнатравіць свой час на пустую балбатню з намі! Не думаў я, што размова пра даўгалецце так яго разварушыць.

— Толькі я зараз збегаю ў падвал, паладжу прыборы. Хай працуюць, каб не губляць часу,— сказаў ён і хутка выйшаў.

— Сухі ён чалавек ці не сухі?

— Не думаю! — запярэчыў наш жартаўнік.— Да яго зрэдку прыходзіць дама. Я жыву побач з ім. Маладая дама. Я неяк спаткаў яе на лесвіцы. Ідзе і нічога не заўважае. Аслепла ад кахання!

— Вы ведаеце, што ў яго ёсць унікальны старасвецкі гадзіннік? Ідзе з незвычайнай дакладнасцю і заводзіцца раз у год.— Гэта сказаў шэф.

— Дык вось, сябры! — Наш пасівелы непрычасаны новы калега (мы ж з ім толькі сёння пазнаёміліся), наш рабацяга ўвайшоў і сеў на сваё месца, узяўшы ў рукі лагарыфмічную лінейку.— Вы гаворыце, дзевяцьсот гадоў... А вы ведаеце, што час можа стаяць на месцы і можа мчацца з вялікай хуткасцю? Вам не даводзілася чакаць спаткання?

— Так, час можа вельмі марудна паўзці,— сказаў шэф.

— Ён можа стаяць на месцы! Вы помніце паведамленне пра тое, што вучоныя прарасцілі насенне лотасу, якое праляжала ў каменнай грабніцы дзве тысячы гадоў? Для гэтага насення час спыніўся. Час можна затрымліваць і можна падштурхнуць,— сказаў наш рабацяга.

Пры гэтым ён расцягнуў лінейку і нешта занатаваў. Ён і за гутаркай умудраўся працаваць.

— Я растлумачу зараз гэтыя словы гісторыяй, якую вы, незалежна ад яе маралі, выслухаеце з цікавасцю.

І, пачынаючы расказ, ён чамусьці павярнуўся да мяне, нібы яго словы адносіліся толькі да маёй персоны.

— У некаторым царстве... а іменна — у нашым горадзе, некалькі гадоў назад адбыўся такі казус. У парку культуры ў нядзелю ў адным самым цяністым кутку сабралася шэсцьдзесят, а можа быць, і сто, элегантна адзетых мужчын на нейкі сход, які яны вырашылі правесці на свежым паветры. Пазней стала вядома, што ў нашым парку засядаў дзве гадзіны, ну як вам сказаць, сімпозіум

бандытаў і зладзеяў, якія, як яны кажуць, знаходзяцца «ў законе». У іх, у гэтай публікі, ёсць свае строгія правілы. Парушэнне іх караецца смерцю. Тых, каго прымаюць у «закон», абавязкова рэкамендуюць некалькі паручыцеляў. Новаму члену шайкі тушшу наколваюць на грудзях дэвіз: некалькі слоў, па якіх можна адразу пазнаць, што чалавек свой. Дык вось, іх сход адбыўся, і міліцыя, вядома, нікога не злавіла.

— Якія адносіны мае гэта гісторыя да нашай тэмы аб часе? — ціха спытаўся шэф.— Ці вы, можа быць, яшчэ не скончылі гаварыць?

— Ага, я не скончыў. Адносіны мае самыя непасрэдныя. Я якраз пераходжу да тэмы. Бандыты-«законнікі» з'ехаліся на суд. Судзілі сваіх калег і вынеслі шэсць смяротных прыгавораў, з якіх пяць ужо выкананы. Шостага асуджанага яны ніяк не могуць злавіць,— справа гэта для іх ускладнілася. Я спачатку скажу, хто быў гэты шосты і ў чым яго віна. Гэта быў кіраўнік, прэзідэнт, ці, як яны кажуць, «пахан», усёй шайкі «законнікаў», самы стары і хітры з усіх бандытаў. Ён сядзеў у нейкай далёкай турме, і, мусіць, там, у адзіночцы, яму стукнула ў галаву, што ён, па сутнасці, нічога не зрабіў у жыцці і нічога не атрымаў, а жыць яму асталося мала. Разважаў ён так: увесь сэнс жыцця бандыта — у найлягчэйшым прысваенні чужога багацця: золата і іншых рэчаў. А кошт і аўтарытэт рэчаў у чалавечым грамадстве катастрафічна падаюць.

— Выходзіць, ён быў тэарэтыкам, ваш бандыт! — пачуўся іранічны голас загадчыка кадраў.

— Ага, ён быў сур'ёзны чалавек,— згадзіўся наш дзівак (у мяне да яго расла сімпатыя).— Гэты парушальнік законаў, які натварыў многа бяды, у апошнія гады прыціх і стаў чытаць кнігі. Кнігі — гэта страшэнная сіла. Ён прачытаў шмат кніг. Ён не спяшаўся пакінуць турму: яму было зручна чытаць і думаць у каменным мяшку, а браты-«законнікі» здабывалі свайму ўладару па волі любую кнігу, хоць бы яна захоўвалася ў падвалах дзяржаўнага казначэйства за сямю пячаткамі, і перасылалі ў камеру. Вось так... І тут ён зразумеў, што аўтарытэт дарагіх рэчаў катастрафічна падае. Некалі, у далёкім мінулым, багатыя людзі, князі адгароджвалі ў марскіх залівах басейны і разводзілі ў гэтых басейнах мурэнаў. Выкормлівалі іх чалавечым мясам — кідалі ў мора рабоў. Падаць такую мурэну на святочны стол лічылася найвышэйшым

шыкам. Але цяпер мы нават і падумаць не можам без агіды пра такія забавы нашых продкаў. Некалі золата было металам без імені і проста ляжала ў зямлі. Пасля ўжо чалавек даў яму імя і цану. Лічылася найвышэйшым шыкам, калі на адзенні і зброі блішчала золата. Але цяпер ніхто з нас не адважыцца паказацца ў гасцях з залатым ланцужком праз увесь жывот ці хоць бы з золатам на заколцы ў гальштуку. Аўтарытэт золата падае. А дзе прэстыж дарагой тканіны? Я магу вас заверыць, што і цяперашнія самыя дарагія тканіны ўжо назаўсёды выходзяць з моды. Фарсіць дарагімі рэчамі сёння — прыкмета духоўнай адсталасці.

— Ты глядзі, як расправіўся гэты бандыт з матэрыяльнымі каштоўнасцямі! Цікава, што ж мы будзем мець замест рэчаў? — спытаўся загадчык кадраў. Яго гэты расказ крыху збіў з панталыку, таму што сам загадчык не раз фарсіў у сваім дарагім каверкотавым гарнітуры з шырокімі плячыма, а яго жонка, прыйшоўшы раз у лабараторыю, прынесла на руцэ цяжкую чарнабурую лісу.

— Гэта не ён расправіўся з дарагімі рэчамі. З імі расправуляюцца людзі. Бандыт толькі прыкмеціў гэта і задумаўся. Ён зразумеў, што на змену рэчам беззваротна ідзе прыгажосць чалавечай душы, якую не ўкрадзеш і не купіш ні за якія грошы. Сілай зброі нікога не змусіш палюбіць сябе. Прыгажосць душы заўсёды вольная. Яна адразу выйшла на пярэдні план, як толькі золата і аксаміт здалі свае пазіцыі. І цяпер золушкі ў паркалёвых плаццях перамагаюць прынцэс, якія абвешаны шоўкам. Таму што ў танным плацці ўся прыгажосць у пакроі, а гэта каштоўнасць ужо не матэрыяльная. Лініі плацця — гэта густ, характар таго, хто стварыў і хто выбраў сабе гэтыя лініі. І нездарма многія прынцэсы, у якіх яшчэ жыве душа, сталі прыбірацца пад золушак. А калі сустрэнецца якая, абвешаная футрам і шыкоўнай тканінай, дык мы ўжо не захапляемся дарагавізнай яе вопраткі, а кідаемся прэч ад духоўнага ўрода, які сам сябе выстаўляе перад людзьмі.

І мой бандыт адкрыў сабе, што за ўсё сваё жыццё ніколі не меў такіх «рэчаў», як людская павага, дружба з чалавекам, сапраўднае каханне. А імкнуўся ўсё жыццё да таго, што не мае ніякай вартасці. Адбылося нешта накшталт грашовай рэформы. Вось так...— Голас у расказчыка ахрып. Ён адкашляўся.— А людзі, любоў і дружба якіх яму былі патрэбны, жылі на свеце. І ён іх ведаў...

Была жанчына. Але ён нават паявіцца да яе не мог. Не мог ёй адкрыцца, што кахае, не рызыкаваў.

Наогул, гэты чалавек напісаў пра ўсе свае меркаванні ў вялікім пісьме да братоў-«законнікаў» і заявіў, што скідае з сябе «сан», вяртаецца да нармальнага жыцця, нармальных рабочых людзей і надумаўся якім-небудзь незвычайным учынкам дабіцца таго, чаго яшчэ не зведаў у жыцці і да чаго раптам пацягнуўся, як кажуць, усёй сваёй істотай. Гэты ягоны ліст турэмная адміністрацыя надрукавала ў спецыяльнай лістоўцы і разаслала па ўсіх турмах і лагерах. Вы, вядома, разумееце: дакумент быў выбуховай сілы і яго важна было выкарыстаць.

Цяпер глядзіце, у якім становішчы апынуўся наш «пахан». За ўсё жыццё ён атрымаў у розных судах увогуле дзвесце гадоў турмы. Іх жа не адседзіш. Ён разумеў, што і дзяржава не «разменіць» яму гэты тэрмін. З другога боку, лепш за ўсіх ведаючы парадкі ў шайцы «законнікаў», ён разумеў, што «браты» не даруюць яму здрады і недзе ўжо на яго навостраны нож. А яму трэба было пражыць хоць бы некалькі гадоў, каб зрабіць тое, дзеля чаго ён пайшоў на такі ўчынак. І вось, яшчэ да таго, як адбыўся над ім суд яго «братоў», ён зрабіў свой апошні пабег. Ён быў досыць багаты, і, як гэта бывае ў казках, знайшліся ўрачы, якія сумелі замяніць усю скуру на ягоным твары, на руках і на галаве (разам з валасамі). І голас яны яму змянілі. Гэта былі вялікія майстры.

Бандыт атрымаў найлепшыя дакументы і стаў іншым чалавекам. За тры гады ён скончыў два інстытуты. Цяпер ён канчае сваю работу. Ён задумаў вельмі вялікую справу і хоча зрабіць людзям падарунак...

— Ну добра,— перапыніў я яго, таму што ён глядзеў увесь час на мяне.— Зноў жа, якое дачыненне мае ўсё гэта да нашай размовы? Да таго, што час можа стаяць па месцы і бегчы з вялікай хуткасцю, да таго, што напісана на камені: «А жыцця ў яго было дзевяцьсот гадоў»?

— Самае непасрэднае дачыненне. На гэтага чалавека палююць выканаўцы прысуду. Яны ўпарта ідуць па яго слядах. І абавязкова знойдуць. Чалавеку засталося вельмі мала часу. Часу — разумееце? І чалавек думае за год ці за два пражыць нанава ўсё сваё жыццё. А што б атрымалася, каб ён так жыў усе гады? Жыццю ягонаму было б, можа, нават больш, чым дзевяцьсот гадоў.

— Вы маеце на ўвазе, вядома, змест жыцця, а не яго працягласць? — сказаў шэф.

— Адразу відаць, што вы не вельмі эканоміце час! — разгневаўся мой сусед.— Так, так, так! Змест! Тое, чым мы напаўняем сасуд часу. Яго трэба напоўніць толькі самай моцнай асалодай, адчуваннем вялікай радасці...

— Ну вось, разагнаўся! — зноў пачуўся голас загадчыка кадраў.— Гэта прапаведзь найчысцейшага эгаізму. Вам бы ўсё радавацца, піць асалоду! А мне здаецца, што трэба і для народа папрацаваць. Га? Як вы думаеце?

— Вы адсталі, вось што я думаю. Вас трэба ўзяць на буксір. Вы лічыце, што радасць, асалода, тое, чым вы патаемна займаецеся ў сваіх чатырох сценах,— гэта грэх. А праца для людзей — гэта ваш публічны абавязак. Мой бандыт у параўнанні з вамі — перадавы чалавек. Усе вашы радасці ён паспытаў, і яны яму апрыкралі. Ён прызнае цяпер толькі адну радасць — тое, што вы лічыце суровым абавязкам.

— Скажыце...— пачаў пасля мінутнай паўзы шэф.— Адкуль вы ведаеце такія падрабязнасці? Чалавек жа гэты змяніў твар, імя... Ён, напэўна, не дурань і не адкрываецца першаму сустрэчнаму.

— А я для яго першы сустрэчны.

— Вы тады павінны выдаць яго, калі вы свядомы чалавек,— сказаў раптам загадчык кадраў.— Павінны заявіць. Ён учыніў гэтулькі злачынстваў і збег з турмы...

— Нізашто,— адказаў наш калега.— Нізашто! Гэта ж ужо не бандыт. Ён цяпер не шкодны. Нават карысны. Калі ён закончыць сваю работу, ён сам сябе выдасць людзям.

Тут ён выцягнуў з кішэні свой рэдкасны гадзіннік — цяжкую цыбуліну на стальным ланцужку.

— Прабачце. Я павінен пайсці паглядзець, што паказваюць прыборы.

І пайшоў. У дзвярах ён затрымаўся і сказаў, гледзячы мне ў вочы:

— А расказваў я ўсё гэта галоўным чынам для вас. Думаю: можа, вы ўлічыце вопыт іншых людзей і кінеце гуляць у лялькі — спыніце вашу пустую палеміку з гэтым членам-карэспандэнтам...

Ці мог я тады ўявіць, што жыццё прывяжа мяне да гэтай гісторыі, зробіць мяне другім яе героем, героем-двайніком!..

Каб праверыць адно падазрэнне, якое раптам у мяне ўзнікла, я спусціўся прыкладна праз паўгадзіны ў падвал і ледзь чутно скрыпнуў дзвярыма, за якімі сядзеў гэты чалавек, абстаўлены шклянымі і меднымі бліскучымі прыборамі. Я ледзь чутно скрыпнуў дзвярыма, а ён так ірвануўся з месца, што разбіў некалькі прабірак.

— Выбачайце,— сказаў я.

— Вы хочаце праверыць маю здагадку? — спытаўся ён, супакойваючыся.

— Вы не баязлівы,— адказаў я.

— Вас я не баюся.— Ён павярнуўся да сваіх прыбораў.

Цяпер, калі я ведаў пра тое, пра што перш толькі падазраваў, я зразумеў і шмат чаго больш (пра што да часу маўчаў).

Незадоўга да гэтых падзей я заўважыў, што сёй-той цікавіцца маёй асобай. Нейкі цень не адступаючыся хадзіў за мной па вуліцах горада і здалёку сачыў. Мне ні разу не ўдалося разгледзець ягоны твар, хоць ён і не спяшаўся ад мяне схавацца. Для свайго назіральнага пункта ён (ці яна) выбіраў цёмныя аркі або дзверы пад'ездаў. Ён вылазіў проста на сонца, але, як толькі я хапаўся за кішэню — за акуляры,— мой «сябра» ціхенька хаваўся пад арку. Я некалькі разоў падыходзіў да тых варот або да пад'езда, дзе схаваўся гэты ўлюбёны ў мяне суб'ект, але нікога не знаходзіў. Не так даўно выпаў першы мяккі і чысты снег. Я ішоў позна ўвечары па пустой вуліцы; пачуўшы ззаду крокі, я, перш чым паспеў азірнуцца, зразумеў: гэта ён (ці яна). Агляну́ўся і ўбачыў нешта накшталт плашча ці хваста фрака, які мігнуўся за вуглом. Я пусціўся наўздагон, як дурны, і, калі выскачыў за вугал, убачыў зусім пусты белы завулак. Я зірнуў на снег і не знайшоў ніякіх слядоў. Праўда, потым я ўспомніў: у пульхным лёгкім снезе раставала некалькі падобных па крыжыкі адбіткаў — як усё роўна сляды вялікай курынай лапы.

У падвале я шэптам расказаў пра ўсё гэта майму калегу. Ён паціснуў мне руку:

— Дзякуй. Я і сам сёе-тое заўважаю. А цяпер ідзіце. Мне трэба спяшацца. Як бачыце, мой час мяне прыспешвае. Ды і вам не пашкодзіла б паскорыць тэмпы. Ці мала што можа здарыцца...

Мы абое працавалі над адной праблемай, але ішлі розпымі шляхамі. Нехта з нас дваіх быў на правільнай

дарозе, нехта памыляўся. Але праблема была вартая таго, каб памыліцца і паказаць іншым правільны шлях. Мы шукалі спосаб кандэнсацыі сонечнага святла. Той прадукт, які мы збіраліся атрымаць, павінен быў забяспечыць месяцы і гады яркім сонечным святлом цэлы мацярык. На нашай планеце адзін яе бок ніколі не асвятляе сонца. Тут заўсёды ноч і зіма. Тое, што мой калега ўхапіўся імепна за гэту самую важную праблему, было для мяне яшчэ адным доказам: перада мною быў гэты самы незвычайны атаман шайкі бандытаў, які спяшаўся жыць. Ці зможа ён выканаць свой план за год, няхай нават за два?

Я чалавек, які цвяроза глядзіць на рэчы, і то тапчуся на месцы з года ў год, усё думаю, з якога боку падысці да ўсяго гэтага, бо пачаць даследаванне — гэта значыць адкласці ўбок іншыя справы, улезці з галавой у работу на цэлых дзесяць гадоў. Калі б уцягнуць у гэта ўсю лабараторыю! Але дзякуй богу, што хоць нам дазволілі займацца гэтай праблемай. У нас было шмат праціўнікаў. Амаль усе члены вучонага савета лічылі нас фантазёрамі. Дык вось: дзесяць гадоў... Як жа ён справіцца з гэтым за свае два гады?

Але выйшла, што не два гады, а ўсяго толькі некалькі гадзін аставалася ў арсенале гэтага чалавека. Назаўтра раніцай мне пазванілі з бальніцы. Майго незвычайнага бандыта, скрываўленага, знайшлі поччу ля нашага пад'езда (мы жылі з ім у адным доме). Яму панеслі некалькі нажавых ран у спіну. Ускалыхнуўся ўвесь інстытут, пачалі званіць у паліклініку вядомым хірургам, але было позна. У полудзень інстытуцкія актывісты ўжо званілі ў бюро па арганізацыі пахаванняў.

Яго смерць, якую ён сам сабе нібыта прадказаў, вельмі падзейнічала на нас. Некалькі дзён мы ўсе, сыходзячыся раніцай на рабоце, даволі выразна глядзелі адзін на аднаго. Я аказаўся маладушным чалавекам. Спачатку кінуўся ў паніку і нават пахудзеў. Не мог слухаць ніякай пабочнай гутаркі, якая не тычылася справы, і напружана працаваў цэлы тыдзень. А праз тыдзень, калі я атрымаў новы нумар нашага навуковага часопіса і прачытаў у змесце імя члена-карэспандэнта С., я тут жа закіпеў і забыўся на ўсё на свеце, апрача гэтага кавалка паперы, усыпанага друкарскімі значкамі. Я первова пе-

рагартаў часопіс і адразу згледзеў набраную дробным шрыфтам зноску (самыя здзеклівыя выразы заўсёды набіраюць дробным шрыфтам). Там, сярод ветліва-ядавітых слоў, я заўважыў і сваё прозвішча. І жыццё маё вярнулася ў старое рэчышча. Папера, папера, хто цябе выдумаў! Я кінуў работу і, падбухтораны ўсім нашым аддзелам, які складаўся цалкам з маіх балельшчыкаў, напісаў артыкул і даў у ім не адну, а аж тры зноскі. Яны павінны былі канчаткова знішчыць майго ворага. Мы складалі гэтыя зноскі ўсім аддзелам. І каб вы захацелі зірнуць на нас, калі мы былі заняты гэтай работай, я мог бы вам падказаць: схадзіце ў Траццякоўскую галерэю і паглядзіце карціну Рэпіна «Запарожцы». На гэтай карціне ўвесь наш аддзел — і наш шэф, які рагоча, узяўшыся за жывот, у тым ліку і я, што сядзіць за сталом, у акулярах, з пяром у руцэ.

Вярнуўшыся ў старую, звыклую каляю, я зусім забыўся на таго суб'екта, які некалі сачыў за мной з-за вуглоў, з-пад арак і пад'ездаў. Пасля вядомых вам цяжкіх дзён, якія закончыліся пахаваннем, хвост фрака знік. Я быў упэўнены, што за мною сачыў тады адзін з бандытаў, які выконваў прысуд над тым, каго цяпер ужо няма.

Але неўзабаве пасля таго, як я атрымаў газету са сваім артыкулам-адказам майму заклятаму ворагу С., а дакладней, у той дзень, калі я выйшаў з рэдакцыі, дзе мне заказвалі яшчэ адзін артыкул, я адчуў усёй сваёй істотай, што за мной сочаць. Я азірнуўся і нікога не заўважыў. Не, прыгледзеўшыся, я ўсё ж убачыў у напалову разбураным доме, які рабочыя разбіралі на знос,— у цёмным праломе на другім паверсе — нейкую фігуру: яна тут жа сiганула ўбок, схаваўшыся за сцяну.

Якраз у гэты дзень я павінен быў адзначаць свой трыццацігадовы юбілей. Хацеў запрасіць сяброў, каб адсвяткаваць гэту круглую дату. І вось, як бачыце, яшчэ днём, пры сонцы, на маё свята лёг першы цень.

Я вярнуўся дамоў, падняўся на свой паверх. У агульнай зале, дзе мы глядзелі па вечарах тэлевізар, чакаў мяне калега — моднік і жартаўнік.

— Ну што, пагуляем сёння?

— Нешта мне нядужыцца,— адказаў я.— Давайце адкладзем.

— Нядобра быць надзьмутым у такі знамянальны дзень. Трыццаць гадоў — самы лепшы ўзрост мужчыны!

І ён падарыў мне яркі гальштук.

— А то адсвяткуем? Я скіну цябе з ног! — шапнуў ён.— Мне пашчасціла здабыць рэдкае ў нашым баку віно!

Між іншым, гаворачы з ім, я заўважыў: у далёкім кутку сядзіць незнаёмая жанчына. Яна, мусіць, даўно ўжо чакала мяне — я неяк востра адчуў гэта. Вось яна ўстала, ступіла да мяне — і я ўжо нічога не чуў, што гаварыў мне калега. Гэта была жанчына гадоў трыццаці, з пакатымі плячыма і вельмі прыгожая. Яе прыгажосць была ў асаблівых, няправільных, але прывабных рысах твару, няправільнай паставе і больш за ўсё ў сумным позірку. Гэта ж прыгажосць азвалася паўторна і ў ціхім нізкім голасе жанчыны. Я адразу ж успомніў тую, другую, залатую пылінку, якая даўно ўжо лягла на сваё месца ў пясочным гадзінніку. Тая ляжала, забытая мною, а гэта рухалася да мяне.

— Вам прасілі перадаць у дзень нараджэння вось гэта,— сказала яна амаль афіцыйна і ўручыла мне знаёмы гадзіннік-цыбуліну, вялікі, цяжкі, на стальным ланцужку.— І яшчэ вось гэта...

Яна дастала з сумачкі і падала мне канверт.

Я спытаўся:

— Гэта ён?

— Ён,— адказала жанчына.

Мне захацелася асцярожна дазнацца: ці спазнаў той, якога ўжо няма, сапраўдную любоў другога чалавека, якую нельга ні купіць, ні ўкрасці? Але не паспеў. Па маім твары яна адгадала пытанне і, варухнуўшы рукою, спыніла мяне.

— Гэта было, было,— шапнула яна.— І ёсць. І будзе! Але ён не быў упэўнены... Я прытваралася. Вы разумееце, што гэта такое?.. А калі мяне пусцілі ў бальніцу, я цэлую гадзіну крычала яму: «Так, так, так!» Але ён не пачуў.

Я схіліў галаву. Бедны мой калега! Я-то ведаю, што гэта такое...

Паклаўшы гадзіннік у кішэню, я правёў жанчыну ўніз, пасля вярнуўся.

— Гэта тая самая,— ціха сказаў мне наш моднік.— Хадзіла да бандыта. Нікога не заўважала. Стаіш у яе на дарозе — ідзе проста, нібы хоча прайсці скрозь цябе. Аслепла ад кахання.

І засмяяўся:

— Цябе-то яна заўважыла! Беражыся!

Я пайшоў у свой пакой і разарваў канверт.

«Вам перададуць гэта пісьмо, калі я буду забіты,— пісаў мой колішні калега.— Вы таленавіты чалавек. Я пішу менавіта вам, таму што вы ведаеце пра мяне больш за іншых і, можа быць, больш за іншых ацэніце час. Жыццё даецца адзін раз, яго трэба піць без перадышкі. Вялікімі глыткамі. Трэба хапаць самае каштоўнае. А што самае каштоўнае — пра гэта я ўжо казаў. Не золата і не адзенне. Мне хочацца, каб вы дажылі да вялікай радасці. Вы павінны памятаць пра зацемнены мацярык, дзе жывуць цяпер мільёны людзей. Хай дзень, калі вы атрымаеце гэты ліст, будзе днём вашага сапраўднага параджэння...»

Я не дачытаў пісьма. Шчаслівая думка, раптоўна ўзнікшы, перашкодзіла мне. «Я шчаслівейшы за яго,— вось што прыйшло мне ў галаву.— У мяне яшчэ палова жыцця наперадзе, а то і дзве трэці. Можна не спяшацца. Я яшчэ ўспею».

У гэты час цемната закрыла маё акно. Відаць, маляры падцягнулі да мяне на чацвёрты паверх сваю люльку. Перавярнуўшы ліст, каб чытаць далей, я падышоў бліжэй да акна. «Але што могуць рабіць маляры на вуліцы зімой?» — раптам падумаў я. Падняў вочы і аж уздрыгнуў: на тым баку сцяны сядзела на металічным лісце, прыбітым пад акном, вялікая сава з калматымі вушамі, з сівымі бакенбардамі і — самае дзіўнае — зусім скажоная, нібы яе вылепіў першабытны чалавек. Гэта была мая сава. Я ўпершыню ўбачыў тады яе жывую. Што меў сілы я махнуў на яе пісьмом: «Кыш-ш!» Але на гэта сава не звярнула ніякай увагі.

Імгненная здагадка глыбока кальнула мяне, нават пот выступіў ад раптоўнага страху і болю. «Фу!» Я з цяжкасцю перавёў дух і выцер лоб. Сава сядзела на сваім месцы, нерухома, вертыкальна, як сядзяць усе совы. Я яшчэ раз перавёў дух, выцер лоб і асцярожна выйшаў з пакоя. Не памятаю, як я апынуўся на вуліцы, на марозе. Куды ісці? Ага, вось куды, там працуе мой школьны сябра, вопытны ўрач-універсал, чалавек творчага складу. Ягоныя работы пра псіхіку чалавека добра ўсім вядомыя. Яго зацікавіць мой выпадак, ён зоймецца мною.

І я хутка пайшоў па бэзавым вячэрнім бульвары і тут жа за плячыма пачуў пошчак чужых няроўных крокаў. Я азірнуўся. Нехта стаяў за бліжэйшым дрэвам — я выразна ўбачыў калматае вуха і адтапыранае крыло. Гэтая сава была ростам з мяне.

Доктар быў заняты. Я доўга сядзеў ля белых дзвярэй кабінета, а за імі чуліся хуткія роўныя крокі. Нарэшце дзверы расчыніліся, і паявіўся мой школьны сябра, у белым халаце і ў белай шапачцы аж па бровы, схуднелы і бледны ад бяссоннай работы.

— Ну як? — закрычалі адпекуль.

— Тое самае! — нервова крывячыся, гледзячы на мяне і не бачачы, крыкнуў доктар.— Зноў нічога не атрымалася.

Я ўстаў з крэсла. Доктар прачынаўся марудна. Заўважыў нарэшце мяне, пазнаў і падаў руку.

— Калі ў госці, то не ў пару...

— Я не ў госці.

— Ану падыдзі,— ён узяў мяне за руку і паглядзеў на кончыкі пальцаў.— Колькі табе гадоў?

— Трыццаць...

— Я і забыўся, што мы з табой равеснікі... Дык што цябе непакоіць? Хто-небудзь праследуе?

— Калі б толькі ведаў, хто! Такі дзіўны суб'ект!.. Ты зараз будзеш рагатаць.

— Я яго ведаю. Хочаш, пакажу? Ідзі за мной...

Ён правёў мяне ў кабінет, павярнуў тварам да акна.

— Мая сава! — шапнуў я.

Яна сядзела за акном.

— Не толькі твая,— сказаў доктар.— Але і мая. Дай мне яшчэ твае рукі, я пагляджу на іх. Та-а-ак...

Ён адышоўся да стала, пастаяў, павярнуўшыся да мяне спіной. Пасля, падышоўшы зноў, сказаў:

— Рана ці позна — усё роўна будзеш ведаць. Дык ведай: табе засталося жыць усяго адзін год.

Падлога раптам правалілася ў мяне пад нагамі, і я ўпаў бы, калі б доктар не падтрымаў мяне і не пасадзіў на крэсла.

Я ведаю, ёсць людзі, якія не баяцца смерці, а я прызнаюся вам — закалаціўся ад страху. Калі закончу пачатую справу — тады можна і паміраць. Толькі не цяпер!

— Не веру,— зноў шапнуў я.

— Ты лепш устань і хутчэй бяжы адгэтуль,— сказаў доктар, падняўшы брыво і нервуючыся.— У цябе яшчэ цэлы год жыцця.

— Я не веру!

— Выбірайся адсюль! — раптам закрычаў доктар.— Ты крадзеш мой час! Я сам хворы, мне засталося толькі паўтара года жыць!

Ля дзвярэй ён усё ж затрымаў мяне і, спяшаючыся, сказаў амаль скорагаворкай:

— Гэта старая хвароба, і больш за ўсё ад яе церпяць таленавітыя людзі. У іх гэта бывае ў вострай форме. Людзі шэрыя, з кіслым характарам хварэюць ціха і паміраюць ціха.

— І вы нічога яшчэ не вынайшлі ад гэтай хваробы?

— Мы многа чаго вынайшлі. Але лячыць яшчэ не ўмеем. Та-а-ак. Мы ўсё ж вынайшлі сёе-тое...— паўтарыў доктар цішэй.

Пасля ён мне вось што сказаў:

— Той, хто выразна бачыць саву, ужо напалову выратаваны.

І стукнуў за мной дзвярыма.

«А я яе выразна бачу ці не? Трэба будзе праверыць»,— падумаў я.

Тут, у цішыні, я раптам пачуў гулкае чыканне: гадзіннік, падарунак бандыта, ішоў сваім ходам, дакладна адлічваючы секунды. Пачуўшы яго звонкі ход, я дастаў цяжкую стальную цыбуліну, уставіў фігурны ключ і завёў спружыну. Разоў дваццаць я павярнуў ключ, пакуль, нарэшце, не адчуў, што ён упёрся. Усё! Гадзіннік заведзены на год.

«Трэба спяшацца! Трэба ўсё абдумаць»,— сказаў я сам сабе. Першы раз у жыцці я спяшаўся па-сапраўднаму.

Чысты марозны вечар сустрэў мяне вясёлымі агнямі, шумам аўтамабіляў і далёкім мігценнем зорак.

«Буду думаць і глядзець на зоркі»,— вырашыў я. І зорнае неба нібы апусцілася нада мной, каб я лепш мог яго разгледзець.

«Ну, добра. Цела маё памрэ. Ну і хай памірае. Але думкі, думкі! Няўжо яны знікнуць?» Я заплюшчыў вочы.

«Не знікнем,— адказалі ў цемені мае думкі. Яны былі спакойныя, не тое, што пачуцці.— Паглядзі,— гучаў іхні голас.— Свет цывілізаваных людзей існуе некалькі тысяч гадоў. А колькі часу жывуць рэчы, зробленыя людзьмі? Машыны, мэбля, адзенне — усё рассыпаецца на працягу некалькіх дзесяткаў гадоў. Як жа мы набылі ўсё, што нас акаляе? Вельмі проста. Мы набылі думкі: сакрэты плаўкі металаў, формулы лякарстваў, таямніцу зацвярдзення цэменту. Спалі кнігі, знішчы сакрэты рамёстваў, дай некалькі дзесяткаў гадоў на тое, каб на іх забыцца,— і чалавецтву зноў давядзецца пачынаць сваю дарогу ад

каменнага тапара. І твой сын — не ўнук, а сын,— выкапаўшы з зямлі шасцярню, якую ты зрабіў у маладыя гады, будзе дзівіцца з яе, як з цуду, створанага богам».

Над горадам з нябачнага рэпрадуктара данёсіўся вальс. Я не ведаў кампазітара. І нават музыкі нібы не чуў. Гэта быў не аркестр: і трубы — не трубы, і скрыпкі — не скрыпкі, а галасы маіх пачуццяў. А калі завялі сваю песню драўляныя духавыя інструменты, калі заспявала дрэва, то стала ясна: гэта надзейна запёртыя мае жаданні ціха запелі ў сваёй цеснай скрыпцы, абмежаваныя граніцамі майго кароткага жыцця.

«Ты хочаш жыць,— сказаў мне невядомы кампазітар.— Глядзі, што зрабілі з табой тыя нотныя значкі, якія я пакінуў пасля свайго пядоўгага і вельмі цяжкага жыцця сярод людзей. Слухай: хто жыве цяжка, каму адпушчана мала часу, той мацней любіць жыццё. Лепш не мець, але жадаць, чым мець і не жадаць. Я вельмі любіў жыццё і перадаю гэту любоў табе».

Пасля ён панізіў голас:

«А цяпер слухай. І пры сваім кароткім жыцці я зведаў вялікае шчасце. Ты знаеш, пра што я гавару. А ты? Ці трос табе руку ўдзячны чалавек, ды так, што мог зрушыць з месца тваё сэрца? Ці бачыў ты перад сабой вочы, поўныя слёз кахання?»

Гэтыя думкі аглушылі мяне. Нічога такога яшчэ ў мяне не было! Як і мой бандыт, я жыў шмат гадоў толькі для рэчаў. Сам-то я кахаў, але не бачыў яшчэ такіх вачэй! Я не зведаў вялікай дружбы, не заслужыў людской удзячнасці... Я апусціў галаву і ўжо не слухаў музыкі; наўкола патухлі агні горада. Толькі адно я пачуў — вясёлае чыканне. Гэта гадзіннік, падарунак бандыта, адлічваў час і мае секунды:

«У цябе ўсё жыццё наперадзе. Цэлы год! Ты толькі што нарадзіўся. Ты цяпер маладзейшы, чымся быў. Хутчэй бяжы туды, дзе твая работа. Там усё — і твой сябра і твая любоў!»

Я кінуўся бегчы, перапяў таксі — хутчэй, хутчэй у лабараторыю! — і шафёр, уключаючы трэцюю скорасць, са здзіўленнем азірнуўся на незвычайнага для яго пасажыра.

Пакінуўшы машыну ля пад'езда, я пабег па лесвіцы. У калідоры каля напаленай печы, апусціўшы галаву, спала на крэсле старая тэхнічка. Я разбудзіў яе.

— Давайце, давайце хутчэй усе мае паперы! Тыя,

што я аддаў вам сёння! Я ж раніцай вам прывалок цэлы стос...

— І-і, даражэнькі, успомніў!

Я застагнаў і палез у печ, у гарачы попел.

— Усё, усё спаліла. Добра гарэлі,— толькі твае паперы так добра гарэць. Бачыш, як я ўгрэлася, нават заснула!

«Чык-чык-чык»,— азваўся бандытаў гадзіннік у маёй кішэні. Сцяўшы зубы, я адамкнуў свой кабінет і пачаў выносіць адтуль скрынкі з прыборамі на вуліцу, у таксі. Я вырашыў адкрыць дома філіял і працаваць ночу. Я ж мог бы ўжо заслужыць вялікую ўдзячнасць ад людзей, а яшчэ нічога не пачынаў рабіць!

Калі, трымаючы ў абедзвюх руках па скрынцы, я naявіўся на парозе нашай халасцяцкай кватэры, там, у агульнай зале, ля тэлевізара, сядзела ўжо некалькі чалавек.

— Ітак, вырашана — сваткаванне пераносім! — сказаў мне жартаўнік.

Ён круціў ручку ў тэлевізары. На шкляным экране раптам замільгалі ногі футбалістаў. Усе прысутныя замерлі. Вочы ў іх парабіліся вялікія і спыніліся. Я пачуў чыканне свайго гадзінніка і зразумеў: калі б наш тэлевізар без перапынку працаваў дзве тысячы гадоў, гэтыя пяць чалавек сядзелі б ля яго, не адрываючыся, і захаваліся б для сваіх нашчадкаў, як насенне лотаса.

Я перасунуў некалькі чалавек разам з крэсламі, каб не перашкаджалі мне прапесці рэчы, перанёс у свой пакой усе прыборы і адпусціў шафёра.

Мая сава сядзела на сваім месцы за акном. Цяпер я глядзеў на яе спакойна. З пакоя добра асвятляла яе яркая лямпачка. Ці добра я яе бачыў? Я падышоў да акна. Нейкі час мы глядзелі адно на аднаго. Пасля яна прайшла па жалезным лісце туды і назад — нібы па суку на дрэве ў заапарку. Нахілілася, падняла сваю жоўтую трохпалую лапу, як абкапаную воскам, і хуценька, што курыца, пацерабіла задпім кіпцем дзюбу. І зноў супакоілася, села вертыкальна і ўтаропілася на мяне двума бляшанымі кружкамі-вачыма. Я добра бачыў сваю саву!

Пасля я апамятаўся, хутчэй пачаў адчыняць скрынкі і расстаўляць прыборы. Праз пяць мінут мой пакой заблішчаў шклом і нікелем — стаў лабараторыяй.

«А што я паспею зрабіць? — падумаў я.— Мне трэба не менш дзесяці гадоў!»

Я намагаўся ўспомніць хоць што-небудзь з маіх думак, спаленых у розны час у печах лабараторыі. Паспрабаваў запісаць іх нанава — але нічога з гэтага не атрымалася.

— Гэта б скараціла маю работу ўдвая! — Я нават стукнуў кулаком па стале.

Тут я згледзеў на падлозе запіску бандыта, якую кінуў днём. Некалькі радкоў у ёй я не паспеў дачытаць, і якраз гэтыя радкі глядзелі на мяне з падлогі.

«Я не магу быць вам карысны. Ці зразумелі вы тое, што было расказана пра аднаго бандыта? Тады папрасіце жанчыну, што стаіць перад вамі, і яна аддасць вам сшытак, куды я, таячыся, перапісаў усе вашы думкі, тыя, што два гады вы кідалі ў печ. Я хацеў сам пакарыстацца імі — яны ж вам былі непатрэбны...»

— Дзе ж я яе цяпер знайду? — закрычаў я, зноў не дачытаўшы запіскі. І тут жа згледзеў словы: «Яе тэлефон...»

Праз некалькі секунд я быў ужо, як у казцы, сярод закалыханых тэлевізарам сонных людзей і, паставіўшы тэлефонны апарат аднаму з іх на плячо, набіраў нумар. Пачулася некалькі гудкоў, пасля яе голас.

З гэтага моманту ў маім новым — кароткім — жыцці пачаўся новы раздзел. Пачаўся з непаразуменняў, прычыну якім даў я сам.

— Трэба адразу браць трубку! — гэтыя словы сарваліся ў мяне з языка раней, чымся я падумаў, што гэта нетактоўнасць.— Дзе сшытак? Чаму вы мне яго не аддалі?

— Вы не папрасілі,— адказала яна.— Нават не сталі чытаць пісьма. А ў запісцы сказана: калі вы...

— Адразу відаць, што вы не цэніце час! — зноў я забыўся па тактоўнасць.— Даруйце мне...

Трубка раптам змоўкла.

— Што ж вы маўчыце? — закрычаў я зноў.— Сшытак, сшытак мне!

— Еду,— адказаў нізкі ласкавы голас.

Калі я пачуў яе крокі, я раптам зразумеў, што чакаю не толькі сшытак. З таго самага імгнення, калі я ўбачыў гэту жанчыну ўпершыню, мяне ціха, непрыкметна пацягнула да яе, як трэску цягне вадой здалёку ў вір. Ці не другая гэта залатая пясчынка падышла да горлавіны

шклянога гадзінніка, каб праляцець праз яе ў адзін міг? «Што ж, ляці,— падумаў я.— Цяпер для мяне гэтага не існуе... Вы ўсе, прыгажуні, любіце, каб за вамі доўга і ўпарта бегалі,— і правільна робіце. А ты тым больш, таму што яшчэ не забыла таго, каму крычала: «Так! Так! Так!» І, відаць, ты яго і не забудзеш — бадай, ці зможа мая нічым не прыкметная фігура выветрыць з тваёй памяці гэтага экзатычнага загадкавага чалавека з чужым тварам? Ды і каханне ўжо не для мяне...»

Тут яна адчыніла дзверы і зайшла — невысокая, ціхая прыгажуня, з вельмі пакатымі плячыма. «Кахаю цябе!» — закрычала ўва мне ўсё жывое. Я зразумеў, што ў маім новым жыцці прайшло ўжо дзяцінства і наступіла ранняе юнацтва. Але тут я пачуў папераджальны стук у шыбу і нават не паглядзеў туды, адразу ўсё зразумеўшы.

Павітаўшыся з жанчынай, я выхапіў з яе рук сшытак, павярнуўся да яе спіной, разгарнуў яго і ўбачыў чарцяжы, накіды і разлікі — тыя самыя, што некалькі гадоў багата раскідваў і паліў. Я перагартаў увесь сшытак. Ого! Ужо не дзесяць, а восем гадоў! Я буду працаваць у інстытуце і дома — гэта дасць яшчэ два гады. Я зраблю так, каб доследы ішлі не ў адным, а адразу ў некалькіх кірунках. Днём і ноччу!

— Куды вы так спяшаецеся? — спытала жанчына, бачачы, як я спешна злучаю правады і ўключаю прыборы.

— Мне засталося вельмі мала...— сказаў я і асекся.— Жыццё кароткае, а работы шмат. Вось я і спяшаюся.

Я ўключыў усе прыборы, і ў колбах і рэтортах загарэліся вясёлыя агні, па шкляных трубачках пабеглі празрыстыя цуркі кіпеню, і ў тыглях пачалі плавіцца рэдкія мінералы.

Мая сава спала за акном, схаваўшы галаву пад крыло. Я, каб пазбыцца апошніх сумненняў, рашыў праверыць адну рэч.

— Што гэта там за акном? — нечакана спытаўся я ў жанчыны і паказаў на саву.

Пры гэтых словах вялізная птушка падняла галаву і хуценька заміргала жоўтымі лінзамі вачэй. Жанчына падышла да акна, прынікла да шкла і закрылася ад святла абедзвюма рукамі.

— Там нікога няма,— сказала яна ўсміхаючыся. І раптам змоўкла. Стала ўважліва сачыць за мною, пры-

кусіла губу, нібы чымсьці здзіўленая.— Там нікога няма,— паўтарыла яна.— А вы каго-небудзь убачылі? За вамі сочаць?

— Няма дык няма,— ухіліўся я ад адказу.

І раптам яна — яна! — задала мне пытанне. Прыйшла яе чарга здзівіць мяне і завесці ў тупік. Яна спыталася:

— Вы нашто перамянілі пакой?

Я здзівіўся, выпрастаўся, але ёй не адказаў — я ўжо быў ва ўладзе новых паводзін. Розныя дробязі не павінны былі датычыць мяне. Я стаў круціць ручку свайго старога арыфмометра — мне трэба было зрабіць сякія-такія вылічэнні. Яна, не адрываючыся, сачыла за мной.

Прыкладна праз гадзіну яна не вытрымала — ціхенька засмяялася.

— Вы хоць скажыце, куды вы так спяшаецеся?

— Куды? Адзін чалавек, вы ведаеце, каго я маю на ўвазе, ужо гаварыў вам, куды ён спяшаецца...

— Гаварыў...

— Дык вось, і я туды спяшаюся. Я ўжо пражыў цэлае жыццё і нічога яшчэ не зрабіў. А я магу даць сёе-тое людзям. Не будзе ў мяне апоры на зямлі, пакуль удзячны чалавек не тармасне мне руку так, каб сарвалася са свайго месца сэрца. Я буду працаваць для яго. Ён існуе невядома дзе. Зойдзе — і гэта будзе мой шчаслівы дзень.

Ёй, мусіць, спадабаліся гэтыя словы. Яна памаўчала, пасля зноў узялася за сваё.

— Нашто вы марна траціце час? Гэта так не падобна на вас! У нас жа ёсць новы, зручнейшы вылічальны апарат.

Яшчэ што? Які там новы апарат? Я зноў ёй не адказаў. Тады яна ўзяла мяне за руку і павяла да дзвярэй.

— А гэта яшчэ што? — спыніўся я.

— Не губляйце часу,— сказала яна ў тон мне.— Не бойцеся, я памагу вам выйграць час.

Яна павяла мяне ў другі пакой, туды, дзе месяц назад жыў мой незвычайны калега-бандыт. Дастала ключ, адамкнула дзверы яго пакоя, запаліла святло і адвярнулася ад мяне, хаваючы ўсмешку. Затое я шчыра абрадаваўся: у пакоі стаялі самыя новыя дарагія прыборы — якраз тое, чаго мне не хапала. Я пачаў аглядваць прыборы, перастаўляць іх з месца на месца і зусім забыўся на маладую жанчыну.

— Як вам не сорамна! — раптам пачуў я яе голас.— Прыкідвацца, нібы ніколі не бачылі гэтых рэчаў!

Зноў за сваё!

— Што вы хочаце сказаць? — рэзка спытаўся я.

— Вы ж павінны былі хоць зрэдку наведваць свайго калегу,— ухілілася яна.— Можа, вы нават не бачылі і гэтага?

На падаконніку ў акварыуме расла незнаёмая мне вялікая кветка з моцным пахам. Жанчына падвяла мяне да яе. Яна нібы экзаменавала мяне. І я раптам успомніў.

— Гэта лотас. Ён вырас з насення, якое праляжала ў грабніцы дзве тысячы гадоў...

— Та-ак,— абрадавалася яна.— Стаўлю вам пяць з плюсам. А гэта вам знаёма?

І яна падала мне вылічальную машыну апошняй мадэлі — такую, пра якую я нават і не марыў. Гэта машына можа замяніць цэлае бюро вылічальнікаў, узброеных простымі арыфмометрамі.

— Можна ўзяць гэту рэч? — не ўтрымаўся я.

— Вы губляеце час! — павысіла яна голас, перадражніваючы не то бандыта, не то мяне.— Так! Так! Так! Гэта ўсё ваша. Усе прыборы. І нават лотас!

Мне здалося, што яна на мяне пакрыўдзілася.

— Хаця, я разумею,— раптам сказала яна, задумаўшыся.— Змяніў твар, змяніў голас, значыць, трэба мяняць і пакой. Каб ніхто не ведаў, не сказаў... І нават сяброў...

Каб я тады хоць задумаўся над тымі словамі! Але ж я быў ва ўладзе новых паводзін, якія ў маёй галаве ўсё павярнулі па-новаму. І я махнуў рукой на яе словы.

За гэту ноч я далёка сігануў у сваёй рабоце. Я пераканаўся ў правільнасці маіх далёкіх меркаванняў. Калі так пойдзе і далей, я месяцаў праз восем атрымаю першы вынік, і тады можна будзе ўключыць у работу ўвесь інстытут. Усе скептыкі складуць зброю!

Нічога не заўважаючы, спадзеючыся на самае лепшае, я прыйшоў раніцай у нашу лабараторыю. Яшчэ ў дзвярах я пачуў вясёлы шум. Аказалася, мой вечны праціўнік С. ужо надрукаваў адказ на мой артыкул!

— Якая аператыўнасць! — іранізаваў на ўвесь голас шэф, і сярод балельшчыкаў пасля кожнага яго слова падымаўся вясёлы шум.

Усе яны стаялі каля майго стала, шэф рагатаў, узяўшыся за жывот, і для вядомай карціны не хапала толькі пісара з пяром за вухам, гэта значыць, мяне.

— Ну, дарагі баец, цяпер ваш ход,— сказаў шэф і паклаў газетную выразку мне на стол.

І я іх здзівіў. Я нават не стаў чытаць артыкула гэтага С., які мне цяпер здаўся толькі наіўным, а не небяспечным дзіваком. Ён ужо не ўзбунтаваў маю кроў, у ёй гарэў ужо другі агонь. Я адмахнуўся ад яго, як ад камара. І мушу сказаць, забягаючы наперад, што гэты С. доўга яшчэ друкаваў артыкулы спецыяльна для мяне. У адной зносцы ён напісаў, што я сарамліва маўчу, што я збег у кусты, што, як страус, схаваў галаву і гэтак далей. Ён кукарэкаў здалёку і біў крыламі, як певень, зманьваючы мяне на рысталішча.

Убачыўшы, што я адклаў убок газетную выразку, мае калегі пераглянуліся.

— Ты гэта ці не? — спытаўся збянтэжаны жартаўнік.— Глядзіце, ён, здаецца, не пагаліўся! Сябры! Ён кінуў паліто на крэсла! Ну, ну... На паліце няма двух гузікаў! Ці не здаецца вам, што яго падмянілі? Ён нечым стаў падобны на таго, што сядзеў побач з ім...

І ён выразна паглядзеў на пусты бандытаў стол.

І праўда, мой характар зусім змяніўся. Я стаў другім чалавекам. Адразу я забыўся на свае манеры вялікага вучонага, не стаў гаварыць напеўна, не стаў звяртаць увагі на дробязі. У мяне быў радасны настрой. І такое з'явілася жаданне жыць...

Чым жа я захапляўся? Я ўвесь час глядзеў на яе. Яна няблага ўладкавалася ў маім пакоі, прынесла з сабой ложак-раскладушку і завіхалася ля прыбораў дзень-ноч. Я нават не ведаю, ці спала яна. І я радаваўся, гледзячы на яе здалёку,— як яна сядзіць за сталом, як схіляе над ім галаву — нібы маладая маці над сваім немаўляткам.

І, гледзячы на лінію яе галавы, шыі і пакатага пляча, па якой я пазнаў бы яе дзе хочаш, я ўвесь час марыў. І калі мне жадалася, каб яна павярнулася да мяне, яна заўсёды ўлоўлівала маё маўклівае жаданне: паварочвалася і ўпіралася падбародкам у плячо. Але заўсёды яе нешта стрымлівала, і яна, зірнуўшы на мяне, хуценька бралася за прыборы.

Яе не толькі нешта стрымлівала, але і не давала спакою. І яна надумала ўстроіць мне яшчэ адзін экзамен. У нас было правіла: калі на рабоце выпадала вольная часіна, якую трэба было нечым запоўніць, мы абавязкова ішлі куды-небудзь на выстаўку, у оперу ці на канцэрт.

І вось аднойчы вечарам, настроіўшы аўтаматы і ўключыўшы прыборы, яна ўзяла мяне пад руку.

— У нас ёсць вольны час. Цэлая гадзіна. Можаце вы падарыць яго мне?

Я спакойна падумаў.

— Ну, добра. Падару.

Мы выйшлі на вуліцу. Яна падхапіла мяне, і мы пайшлі ў нейкіх цёмных прысадах.

Раптам яна спыталася:

— Няўжо ты не помніш гэтай сцежкі?

Мне ўсё гэта надакучыла, і я не стаў нічога хаваць ад яе.

— Вось так, давайце на ты. Але я прашу вас пакінуць гэту недарэчную гульню, у якую вы ўжо гуляеце два месяцы і якой я не разумею. Гэта гульня адымае ў мяне толькі час.

— А куды вы ўвесь час спяшаецеся?

У гэты момант я згледзеў у зацені за ліхтаром цёмны сілуэт маёй савы, яе бліскучыя вочы,— яны хуценька міргалі. Я спыніўся. Хацеў паказаць маладой жанчыне гэтыя вочы, але ўспомніў: яна ж іх усё роўна не згледзіць!

— Куды я спяшаюся? — Я рашыў сказаць ёй усё, не хаваючыся.— А вось куды: мне засталося жыць менш года...

Мае словы яе моцна ўразілі. Я, відаць, сказаў тое апошняе, пасля чаго яна ўжо не магла стрымацца. Яна спыніла мяне, зайшла наперад і, склаўшы рукі лодачкай, узяла мяне за падбародак. Я ўбачыў зблізку яе вочы, поўныя слёз.

— Калі ты ўпэўнены, што будзеш жыць менш года, дык навошта мы тут манім адно аднаму! — прашаптала яна.

Я хацеў бы сказаць, што... Але яна паклала пальцы мне на вусны.

— Дык жа гэта ты, ты!

І я здагадаўся.

— Вы думаеце, што я — гэты... ваш?

— Хопіць мяне мучыць... Успомні, як ты хаваўся ў мяне першы раз. За што ты мяне мучыш?

— Але ж я зусім іншы чалавек! — закрычаў я.— Глядзіце, у мяне інакшыя валасы, другі твар! Я нічога не памятаю! У мяне няма ніводнага шва. Усё, што вы бачыце — усё маё!

— У цябе і першы раз не было ніводнага шва. А я адгадала. Адразу адгадала! Скажы, чаму ты, калі я прыйшла да цябе з тваёй запіскай і гадзіннікам, раптам змяніўся з твару і спытаўся: «А ці было каханне?» Табе вельмі хацелася гэта ведаць. А я тады адразу разгадала тваю гэту наіўную хітрасць.— Яна засмяялася.— Ведаеш, як ты тады мяне абрадаваў, спытаўшы гэта!

— Я хутка расстануся з вамі назаўсёды,— сказаў я.

— Ніколі мы не расстанемся. Я знайду цябе, калі ты нават зноў уцячэш ад мяне і зменіш не толькі твар, але і пераменіш рост.

— Мне засталося жыць менej года. Гэта дакладна.

— Не веру. Ты ўжо гэтулькі гадоў гаворыш гэта!

— Але ж той гаварыў, і яго забілі.

— Не забілі. Ты з галавой, ты ўсё прадумаў. І загадаў перадаць усё свайму двайніку — табе ж. Ты хітры. Яны цябе ніколі не знойдуць...

— А, чорт... Блазнота нейкая...

Мусіць, і той так гаварыў ёй, бо яна засмяялася.

— Я не буду пра гэта гаварыць. Ты і тады гэтага не любіў. Не буду! Сёння ты яшчэ лепшы, чымся быў тады. У цябе стаў мякчэйшы характар, ты часта ўсміхаешся! Ты так добра гаворыш пра чалавека, якога ты чакаеш і які павінен прыйсці... Я згубіла гэтулькі часу! Павошта я дазволіла сабе прытварацца з табой, як усё роўна мне семнаццаць гадоў! Хочаш, я крыкну табе тое слова, якое ты так прасіў? Так! Так! Ты чуеш? Крыкні мне, што чуеш!

— Чую,— шапнуў я. Я не мог больш стрымацца. Трэску панесла ў вір.— Якога мяне ты больш кахаеш,— толькі і змог я спытаць,— таго, які забіты, ці таго, які тут, побач з табой?

— Каторы тут!..

Мяне кахалі. Я ўбачыў вочы. Варта было мне крыху павярнуць галаву направа, і я бачыў дзве бліскучыя ад слёз зоркі.

І я заняў месца бандыта, якога ўжо не было між нас.

Доктар гаварыў праўду: пяць ці шэсць месяцаў пражыў я пасля сустрэчы з ім, і мне стала кепска. Сярод яркага лета я павінен быў злегчы.

Я вінавата сказаў ёй, ціхай, разгубленай:

— Ведаеш, дружок, мне цяжка стала хадзіць. Давя-

дзецца табе сёння пакамандаваць адной, а я застануся ў пасцелі. Уключы радыё.

Яна ўключыла — і адразу стаў чуцен то занадта моцны, то ціхі, які губляўся ў рокаце магнітных бур, голас нашага цёмнага мацерыка. Недзе там працавалі, здабывалі вугаль, вырошчвалі пад штучным святлом капусту.

— Трэба больш энергічна дзейнічаць. Трэба спяшацца!

Яшчэ хутчэй пацяклі гарачыя цуркі ў шкляных трубках, ярчэй загарэліся агні.

Дажджлівым вераснем мы закончылі работу на адной устаноўцы. Я ляжаў у пасцелі і быў настолькі слабы, што не мог падняць галавы.

— Адкрый першы свінцовы каўпачок,— сказаў я.

Яна адкрыла.

— Памылка,— пачуў я яе ціхі голас.— Тут ляжыць толькі маленькі чырванаваты вугельчык.

— Не, гэта не памылка,— адказаў я спакойна.— Гэта толькі варыянт. Усё ўлічана на іншых устаноўках. А вугельчык гэты ўжо можна паказаць... Пакліч калег. І шэфа пакліч.

Яны зайшлі ўсе, ступаючы на пальчыках, як заходзяць да хворага ў бальніцу. Раней я не пускаў іх да сябе, і цяпер, зайшоўшы ў мой пакой, які ператварыўся ў лабараторыю, яны спыніліся ля дзвярэй і пачалі азірацца. Яны не ведалі, што думаць пра мяне, іх дзівіла ўсё: і сцены, спісаныя формуламі, і падрапаная цвіком мэбля — я пісаў і на ёй,— і бляск прыбораў, ад якіх струменіла лёгкая цяплынь.

Пасля яны зглядзелі мяне. Мусіць, мой выгляд збянтэжыў іх — яны зусім змоўклі. Толькі наш жартаўнік, які не зводзіў вачэй з маёй сяброўкі, нешта шапнуў шэфу.

— Пазнаём іх з вынікамі,— сказаў я.

І яна, мая жонка і сяброўка, як сапраўдны вучоны, за дзесяць хвілін зрабіла ім даклад аб нашай рабоце і паказала вугельчык, які ніяк не хацеў астываць.

Гэты вугельчык здзівіў усіх, асабліва шэфа. Ён першы ўрачыста падышоў паціснуць маю руку. І ўсе мае калегі зашумелі і наперабой кінуліся да мяне, схапілі мае аслабелыя, лёгкія рукі і пачалі іх тармасіць,— і я адчуў, што сэрца маё вось-вось сарвецца з месца.

— Мы сёння ж уключаемся ў работу,—сказаў шэф.— Усёй лабараторыяй!

З гэтага дня ў маім пакоі пачалі дзяжурыць днём і ноччу два нашы супрацоўнікі, і, апрача таго, кожны дзень з лабараторыі па тэлефоне перадавалі нам зводкі,— работа хутка ішла наперад.

Марозным снежнем у прысутнасці нашага шэфа мая сяброўка адкрыла другі свінцовы каўпачок.

— Зноў памылка,— ціха сказала яна шэфу.— Тут яшчэ горш — вугельчык зусім чорны.

Але я пачуў іх.

— І гэта памылка ўлічана.— Я ледзь кратаў вуснамі.— Прадаўжайце работу. І хутчэй!

У мяне быў добры слых. Я пачуў, як шэф, прыкрыўшы рукою рот, шапнуў:

— Трэцяя памылка зжыве яго са свету...— і дабавіў моцна, на ўвесь пакой: — Гм... Я думаю, лепш будзе завезці трэцюю ўстаноўку да нас у лабараторыю. Там мы хутчэй ды і дакладней правядзём дослед.

— Давяраю,— сказаў я.

І вось мы — я і мая жонка — засталіся адны ў ціхім, пустым пакоі. Нас двое і яшчэ — сава, якая аднойчы ўхітрылася праціснуцца праз фортачку да нас і цяпер драмала на падаконніку ці хадзіла пад сталом, пастукваючы дзюбай аб падлогу. Жонка — яна па-сапраўднаму заслужыла гэта імя — сядзела каля мяне, і мы ціха ўспаміналі нашы кароценькія маладыя дні.

На трэці ці на чацвёрты дзень я адчуў сябе горш і папрасіў:

— Адчыні акно.

— Дарагі мой, на дварэ мароз. Ці трэба гэта?

— Адчыні, адчыні,— шапнуў я.

Жонка падышла да акна.

— Што гэта? У снежні — вясна! Чуеш? На вуліцы растае снег, і муха, прачнуўшыся, лезе ў акно!

— Адчыні!..

Яна адчыніла спачатку фортачку, пасля расхінула і ўсё акно — і разам з вясновым цёплым ветрам у пакой увarвалася надзвычай прыемная далёкая музыка. Яна струменіла над горадам, то заціхаючы, то разліваючыся магутнай хваляй. Я слухаў яе і не ведаў, што гэта граюць тэлефонныя правады, разносячы па ўсім свеце вестку аб перамозе чалавека над холадам і цемнатой. Час ад часу да гэтай музыкі далучаўся ўрачысты звон, запаўняючы далячынь,— гэта над горадам ляцелі самалёты з каштоўным грузам — везлі першую вясну на цёмны мацярык.

Але я гэтага не ведаў, мне было вельмі цяжка, я зусім аслаб, прыслухоўваўся толькі, ці не ідуць мае калегі з добрай весткай. І яшчэ мяне палохала сава: яна, узбуджаная, хадзіла і хадзіла ля маёй пасцелі, атрасаючыся і рэзка ўзмахваючы крыллем. Няма нічога цяжэйшага, як расстанне з жыццём у той час, калі ты не давёў да канца патрэбную людзям справу, якая цалкам залежала ад цябе!

Пасля на мяне зваліўся сон. Недзе хадзілі па лесвіцы; бразгалі дзверы; чуваць былі нейчыя паспешлівыя крокі. Але я гэтага не чуў. Я пачуў толькі голас доктара, майго школьнага сябра:

— Яшчэ жывы!

Ён сеў ля мяне ў галавах і дрыжачымі рукамі пачаў развінчваць свінцовы патрон.

— Хутчэй, хутчэй, скажы! — хацеў крыкнуць я.

І крыкнуў, таму што маёй хваробы ўжо не было са мной.

Асляпляльная кропля дрыжала ў доктара ў руках, заліваючы сонечным святлом увесь пакой. Я ведаў пра яе даўно, яна снілася мне; заплюшчыўшы вочы, я часта бачыў яе тады, калі толькі яшчэ ўстанаўліваў прыборы. А цяпер я не мог глядзець на гэтае маленькае, вельмі яркае сонца. Я падняўся з пасцелі і захістаўся на слабых нагах. Падбегла жонка, каб падтрымаць мяне, але я жэстам спыніў яе і сам прайшоў па пакоі. Нават тупнуў! Жонка прыхінулася да сцяны і аж ззяла ўся, не верачы.

— Дзякуй, доктар,— шапнула яна.

— За што? Ён сам перамог сваю смерць. Сам знайшоў лякарства! Гэта — ягонае святло!

Зноў бегалі па лесвіцы; грукалі дзверы, і ў пакой уварваўся цэлы натоўп — тут былі і мае сябры, і многа іншых людзей, якіх я зусім не ведаў. Мяне абступілі, нехта трос мяне за руку. Мой шэф праціснуўся да мяне.

— Вы ўсё ж змаглі... Змаглі сціснуць свой час!..— павіншаваў ён мяне.— У старажытнасці разам з вашым імем намалявалі б саву!

І я падумаў: і праўда, я ж сціснуў свой час. Я пражыў за адзін год цэлае жыццё. А колькі такіх гадоў наперадзе — цэлы акіян часу!

Каму ж мне трэба было падзякаваць за гэта? Я паглядзеў на падаконнік, дзе заўсёды сядзела мая сава. Але яе там не было. Там толькі стаяў акварыум, і ў ім цвіў лотас. А за акном, далёка-далёка ў бякла-блакітным вясеннім

небе, ляцела да гарызонта нейкая вялікая птушка, цяжка махаючы крыллем.

Акіян часу шумеў ля маіх ног. Я стаяў на яго беразе, гатовы пачаць жыццё спачатку, і таемныя хвалі будучыні адна за адной каціліся да маіх ног і, адбягаючыся, зманьвалі мяне. Заўтра я ўжо буду плыць далёка за гарызонтам. Мне зрабілася крыху нават боязна: за год я прывык, што сава заўсёды са мной. Ці змагу я жыць без яе? Ці не ператворыцца гэты магутны акіян, які чакае мяне, у маленькую ручаіну, якой я нават і не заўважу, як пераступлю?

Тут я ўспомніў пра гадзіннік — падарунак бандытаў. І адразу пахаладзеў ад страху — гадзінніка майго не было чуваць.

Я ўхапіўся за ланцужок... Ага!.. Гадзіннік спыніўся! Год жа прайшоў, цэлы год, і гадзіннік трэба завесці зноў!

Я дастаў гадзіннік, уставіў фігурны ключ і павярнуў яго дваццаць разоў. Вось і ўпор — гадзіннік пайшоў. Пайшоў на Новы год.

# Аляксандр Яшын

## ЧАСТУЮ РАБІНАМІ

Мне и доныне
Хочется грызть
Жаркой рябины
Горькую кисть.
*Марына Цвятаева.*

Вясной у Падмаскоўі, хаваючы лыжы па гарышча, я ўбачыў развешаныя пад кроквамі гронкі рабіны, якія восенню сам збіраў, сам чапляў на вяроўкі, а пасля забыўся пра іх і, калі б не лыжы, не ўспомніў бы.

У даўнія часы на маёй радзіме рабіны нарыхтоўвалі на зіму як ежу, нароўні з брусніцамі, журавінамі, грыбамі, карысталіся імі і як лекамі, калі балела галава, ці ўчадзеў.

Памятаю, вымарожвалі мы прусакоў у хаце, парасчынялі дзверы і вокны, распёршы створкі лучынамі, а самі перасяліліся да суседзяў. Зімой такім спосабам выганялі прусакоў ледзь не ў кожным доме. Пры лютым марозе міне некалькі дзён — і ніводнага прусака не застанецца ў шчылінах. Вярнуліся мы ў сваю хату праз тыдзень, маці прапаліла ў печы, ды зачыніла юшку рана, не разлічыла, і пад вечар мы ўсе качаліся на халоднай падлозе, як прусакі. Не ведаю, што б з намі было, калі б не марожаныя рабіны. Мабыць, яно дзіўна, але цяпер успамінаць пра гэта мне толькі прыемна.

У Падмаскоўі я рваў рабіны больш з-за любові да гэтых сваіх успамінаў пра дзяцінства ды яшчэ таму, што ўрадзіла іх летась столькі, што шкада было бачыць, як сакавітыя, прыгожыя ягады дзяўбуць дразды.

На цёмным гарышчы пад самым дахам пучкі рабін віселі, як бярозавыя венікі. Лісце на гронках пасохла, пажухла і пакруцілася, і самі ягады перамерзлі за зіму, паморшчыліся, нібы тыя разынкі, затое былі смачныя. Свежыя рабіны — і гаркавыя, і занадта кіслыя, ёсці іх цяжка, як і раннія журавіны. Але і журавіны, і рабіны, прыхоп-

лепыя марозам, пабываюць ні з чым не параўнальныя якасці: і ад гаркавасці нешта засталося, а ўсё-такі саладка, і, галоўнае, ніякай аскомы ў роце.

Колер рабінавых ягад таксама за зіму памяняўся, ён стаў мякчэйшы і багацейшы танамі: ад карычневага, ледзь не арэхавага, да бурштынавага і ярка-жоўтага, як колер лімона. Хоць навошта гэта трэба параўноўваць рабіны з лімонам, а лімон з рабінамі?

Пакаштаваўшы ягады тут жа на гарышчы, я спачатку ўзрадаваўся, што зноў змагу неяк пацешыць сваіх дзяцей і лішні раз даказаць ім, што вясковае дзяцінства не толькі не горшае, а шмат у чым нават лепшае за дзяцінства гарадское.

Не ведаю, як гэта перадаць, растлумачыць, але ўсё жыццё я адчуваю горыч ад таго, што паміж мной і маімі дзецьмі пралягае бездань.

Не, справа не ва ўзросце. Справа ў тым, што я быў і ёсць вясковы, а дзеці мае гарадскія, і што той вялізны горад, жыць у якім я так і не прывык, для іх — любімая радзіма. І яшчэ справа ў тым, што я не проста выхадзец з вёскі, з хвойнай глухамані,— а я ёсць сын селяніна, а ў іх і разумення няма, што значыць быць сынам селяніна. Паспрабуй удзяўбі ім, што жыццё маё і цяпер цалкам залежыць ад таго, як складваецца жыццё маёй роднай вёскі. Цяжка маім землякам — і мне цяжка. Добра ў іх ідуць справы — і мне лёгка жывецца і пішацца. Мне баліць усё, што робіцца на той зямлі, дзе я не адну сцежку вытаптаў босымі пяткамі; па палях, якія яшчэ плугам араў; на лугах, якія абхадзіў з касой і дзе стагаваў сена.

Усёй скурай сваёй я адчуваю і чакаю, калі аслабаніцца гэтая зямля з-пад снегу, і мне не ўсё роўна, чым засеюць яе сёлета, і які яна дасць ураджай, і ці хопіць на зіму кармоў каровам, а хлеба людзям. Не магу я не думаць кожны дзень і пра тое, ці пабудавана ўжо ў маёй вёсцы навес на машыны, ці яны ўсё яшчэ гніюць і ржавеюць пад адкрытым небам, і калі ж нарэшце будуць даваць запчастак столькі, колькі трэба, каб работа ішла без перабояў, і пра тое, калі нарэшце будуць першыя нармальныя дарогі ў маіх родных мясцінах, і калі сасновы зруб стане клубам, і пра тое, калі мае аднавяскоўцы перастануць на рэшце глушыць гарэлку, а жанчыны гараваць з-за гэтага.

А яшчэ: колькі таленавітых дзяцей расце цяпер у маёй вёсцы, і ці ўсе яны выб'юцца ў людзі, ці заўважыць іх у пару хто-небудзь, і кім яны стануць?..

Кожную раніцу я нібы чую, як рыпяць калодзежныя жураўлі на маёй неширокай вуліцы і халодная празрыстая вада з драўлянага вядра са звонам ліецца ў ацынкаваныя вёдры. Ці рыпяць жураўлі цяпер? Ці ацалеў той калодзеж непадалёк ад нашай хаты, з якога я сам шмат гадоў насіў ваду на каромысле?

Што да ўсяго гэтага маім сынам і дочкам? Ва ўсякім выпадку, яны не сялянскія дзеці і таму не адчуваюць, як мне здаецца, і не разумеюць майго дзяцінства. Розныя мы людзі, з рознага цеста зleплены, і, відаць, па-рознаму глядзім на свет, на зямлю, на неба.

Хоць, можа, не ўсё тут у мяне правільна, паспрабуй разбярыся ў гэтым!

Рэўнасць і крыўда мучаць мяне, калі паміж намі апускаецца раптам нейкая заслона і мае шматмудрыя нашчадкі раптам пачынаюць нават бунтаваць, пасміхацца з мяне за тое, што мяне кожнае лета цягне не ў цёплыя краі, не да сіняга мора, а ў маю паўночную глухамань, да камароў ды мошак. Яны ж камароў і мошак цярпець не могуць. Хоць калі сказаць, то не кожны чалавек здольны звыкнуцца з гэтай нечысцю на зямлі.

Пах скацiннага двара, угноеных палёў і саломы мяне ўзбадзёрвае, мне ўспамінаецца толькі што спечаны хлеб, а дзецям маім пах гною — гэта смурод, і нічога болей.

У мастака Сярова ёсць цудоўная карціна «Валы» — у старога Сярова, не ў цяперашняга. Наўрад ці мае дзеці адчуваюць усю прыгажосць гэтага сяроўскага шэдэўра. Нават калі сыны мае трапляюць у вёску, іх прыцягвае болей трактар, а не жывы конь, самае дасканалае са стварэнняў прыроды. З машынай упраўляцца лягчэй, чым з жывой істотай...

Праўда, і вясковыя дзеці цяпер ахвотней гуляюць не ў коней, а ў трактар, у аўтамабіль, як у час вайны гулялі ў вайну. І, магчыма, мае страхі перабольшаны. Але ўсё-такі мне чамусьці часам шкада сваіх дзяцей. Шкада, што яны, гарадскія, менш бываюць на прыродзе, у вёсцы, чым мне хацелася б. Яны, відаць, нешта губляюць з-за гэтага, нешта пяўлоўнае, добрае праходзіць міма іх душы.

Мне думаецца, што жыццё заадно з прыродай, любоўны ўдзел у яе рабоце і пераўтварэнні яе робяць чалавека працавітым, мякчэйшым і дабрэйшым. Я не ведаю іншага рабочага месца, акрамя зямлі, якое б надавала столькі высакароднасці і так супакойвала чалавека.

Наогул, шкада мне сваіх дзяцей, але я люблю іх і таму

заўсёды стараюся паваяваць з імі за сваю вясковую рада-слоўную, за сваіх вотчычаў і дзедзічаў.

І цяпер, знайшоўшы забытыя на гарышчы рабіны і ўспомніўшы, з якой асалодай мы ў дзяцінстве елі іх, марожаныя, я зноў вырашыў для сябе: вось толькі пачастую — і адчуюць мае птушаняты, што значыць сапраўдная прырода, сапраўдная Расія, і мы лепш будзем разумець адно аднаго.

Дарэчы, і цвіце рабіна надзіва прыгожа, пышна і таксама гронкамі. Кожнае суквецце — цэлы букет. Але вясной розных кветак гэтак шмат, што гэтыя белыя, крэмавыя гронкі на дрэвах не кідаюцца ў вочы. Прытым вясной дзецям маім не да кветак, не да прыгожага ў прыродзе, не да паездак у вёску. Школьныя перагрузкі, часта бязглуздыя, не пакідаюць часу ім і настаўнікам, каб цікавіцца жывой зямлёй. Ды і ўвосень, калі на загонах паспявае гарох, на градах гародніна, а ў лясах грыбы, брусніцы, касцянка, яны, дзеці, павінны быць у горадзе, за партамі, і калі бачаць што, то толькі на гандлёвых прылаўках.

А ўсё-такі...

Але перш чым сустрэцца са сваёй сям'ёй, я з пучком рабін на вяроўцы заявіўся ў коле таварышаў па рабоце. Заўсёды прыемна нешта дарыць людзям, і таму я асабліва ўзрадаваўся, што рабіны мае ўсхвалявалі маіх знаёмых.

Адзін з іх, шырокай касці, шумны, аўтар калгасных раманаў, першы ступіў мне насустрач, сказаў «ого!», узяў пучок з маіх рук, каб адчуць яе цяжар, узважыў на руцэ і, як знаўца, панюхаў.

— Ого! — паўтарыў ён.— Вось гэта яно! Рабіны! Можна?

Ён адшчыкнуў адну ягадку, потым другую, узяў на язык, пацмокаў, разжаваў.

— Няўжо з радзімы?

— Не, тутэйшая, падмаскоўная.

— Ты глядзі! Як ні абломваюць, а ўсё жывая. Вось што значыць руская рабіна!

І ён пачаў асцярожна перабіраць сухое, шчыльна зляжалае бурае і шэрае лісце і адкрываць, нібы раскручваць гронкі бурштынавых і чырвоных ягад.

— Ага, паўночны вінаград! Вітаміны! — прыцмокваў ён.— У нас раней пад кожным акном у вёсцы два ці тры дрэвы раслі абавязкова. Былі аднаствольныя, а то і кустом, ад кораня ў чатыры-пяць ствалоў. Вясной водар па ўсёй хаце. Што гэта за дом без свайго садзіка пад вокнамі.

Мала пад вокнамі, у нас нават за дваром, на пляцы, дзенебудзь каля гумна накідалі куточак пад дрэвы. Чаромхі на пляцы звычайна не саджалі, ад яе заразы шмат, на салодкае, як вядома, розная пошасць лезе. А рабіны садзілі часцяком. Напэўна ж і ў вашых мясцінах агародчыкі былі? Усё памятаеш?

— Як не памятаць! Любілі і мы па чаромхах ды па рабінах лазіць, хлебам не кармі.

— Вось-вось,— узрадаваўся ён,— хлебам не кармі! А нашы дзеці растуць! Нават па дахах не лазяць. Што за дзяцінства. Коней ды кароў толькі на малюнках бачаць. Адзін ірвецца да більярда, хлебам не кармі, другі марыць за руль сесці. І развязныя нейкія... Мой малодшы днямі сустрэў старога Чукоўскага, Карнея Іванавіча,— жывога Чукоўскага! — і пытаецца: «Як жыццё?» Быццам па плячы паляпаў. А потым зазірнуў да яго ў расчынены гараж і кажа: «Я не ведаў, што ў вас «ЗІМ»!» Карней Іванавіч, вядома, зарагатаў. Зарагочаш!

«Ну, да маіх дзяцей гэта не адносіцца,— з задавальненнем падумаў я.— Мае не такія, і, магчыма, таму, што ў мяне іх многа, і не так ім проста і лёгка жывецца».

А ён казаў далей:

— Між іншым, у нас раней пірагі пяклі з чаромхавымі ягадамі. Зубы ва ўсіх былі моцныя, ясі — аж хрусціць. А з рабін не памятаю што рабілі... Спелыя гронкі клалі на зіму між дубэльтамі, гэта ўжо для прыгажосці. На белых аркушах са школьных сшыткаў — чырвоныя кропкі... І на ручніках вышывалі рабіны — добра!

Успаміны сельскага раманіста, яго красамоўнасць ужо немагчыма было спыніць. Я слухаў і чакаў: ці ўспомніць пра чад? Успомніў!

— А ці ведаеш, што ў вёсках рабіны ратуюць людзей ад чаду? Зімой печы паляць шмат, паспяшаецца баба зачыніць комін, каб цяпло зберагчы,— і ўсе ўпокат ляжаць. Ну, прынясуць такі вось пук з гарышча і жаруць. Ад нашых марозаў тараканы сыплюцца, а рабіны робяцца толькі саладзейшыя. Як кажуць, што рускаму здарова — тое... і гэтак далей. І што ты скажаш, праходзіць чад, галава не трашчыць. Нашто ўсе гэтыя пірамідоны, анальгіны, траічаткі? Іншая справа натуральная гаючая сіла! — І ён, шумны, так зарагатаў, што можна было падумаць, не смяецца, а на некага крычыць.— Твая ягадка ўжо адтала, а ўсё яшчэ смачная. Я вазьму галінку з сабой?

— Бяры, калі ласка, і не адну.

Ён узяў і зноў пачаў настройвацца на ўспаміны:

— Ага, вось жа як, рабіны... А ўсё-такі, што мы такое з рабін рабілі?

— Настоечку, настоечку з рабін рабілі, вось што! Як жа забыць такое? — зацікаўлена ўклініўся ў размову другі мой знаёмы і таксама з задавальненнем пачаў адшчыкваць ягадку за ягадкай.

А трэці нечакана спытаўся:

— Што гэта?

— Рабіны, вядома.

— Рабіны? — здзівіўся ён. «Што стаіш, качаясь?» Адкуль яны ў вас?

— Восенню красаваліся пад акном, а зімой віселі на гарышчы.

— Гэта цікава, раскажыце, раскажыце!

Яшчэ не зразумеўшы толкам, ці сапраўды гэта яму цікава, я пачаў расказваць. Але што, напраўдзе, было расказваць? Чаго такога ён мог не ведаць пра рабіны?

— Калі ласка, пытайцеся, што вас цікавіць?

— Як што цікавіць? Перш за ўсё — дзікія рабіны ці садовыя?

— Былі дзікія, цяпер растуць на пляцы. Прынёс з лесу некалькі тоненькіх, зацiснутых кусцікаў, перасадзіў пад вокны, на волі яны прыняліся, папрыгажэлі. Пакуль рабіны даглядаеш, клапоцішся пра іх — яны не дзікія, і ягады буйнеюць, дабрэюць, а перастань клапаціцца — здзічэюць, запаршывеюць, і ягады стануць дробныя, горкія, ледзь не ядавітыя...

Цікаўны мой сябра заззяў ад здагадкі:

— Адбываецца тое ж, што і з людзьмі?

— Напраўдзе, тое ж,— пацвердзіў я.— Вось ужо другую восень ад драздоў на маёй рабіне адбою няма.

— Вельмі цікава! I дразды, значыць, рабіны любяць?

— Як жа, любяць! Ёсць дрозд, якога так і завуць: рабіннік.

Тут першы знаёмы зноў уключыўся ў гаворку:

— А ты не заўважаў,— пытаецца ён,— калі на рабіны ўраджайны год, дразды, што ты скажаш, зімаваць застаюцца? Не заўважаў?

— Заўважаў,— адказаў я.

— Вядома, не ўсе, а смялейшыя, самыя адчайныя, так сказаць.

— I не адны дразды, напэўна. Дарэчы, сёлета так і здарылася: вялікія чароды птушак у нашых пералесках

засталіся па зімоўках, зразумелі, што ад дабра дабра не шукаюць.

— Вельмі цікава,— загаварыў зноў гарадскі кніжнік.— Вось якая справа! І што вы з імі рабілі, з рабінамі?

— Што з імі рабіць? Абламаў гронкі з дрэва, проста з лісцем, як бачыце, узяў вяроўку, прывязаў да яе канца палачку-выручалачку і нанізаў гронкі на вяроўку. Вось і ўся работа.

— Вельмі цікава! А што потым?

Я пачаў усміхацца ад забаўнай грунтоўнасці яго пытанняў. Але ці павінен быў я чакаць і тым болей патрабаваць, каб і гэты мой таварыш, які мае сваё кола жыццёвых інтарэсаў, якое адрозніваецца ад майго, але аднолькава патрэбнае і важнае, каб і ён глядзеў на мае рабіны гэтаксама, як я на іх гляджу? Не было ў мяне такога права. Значыць, не да месца была і мая іронія. Іншая справа — калі б дзеці мае цікавіліся так усім, што датычыць майго дзяцінства!

— Што потым, кажаце? А паспрабуйце! — і я з гатоўнасцю падаў яму квяцістую гірлянду.

— І што, ягады замерзлі зімой? — дапытваўся гараджанін.

— Ільдзінкамі сталі. Ды вы пакаштуйце, не бойцеся!

— А смак іх змяніўся ад гэтага? Кіслыя яны ці якія?..

Адзін раз ён нават крануў лісце, пашамацеў ім, але так і не адважыўся ўзяць у рот ніводнай рабінавай ягадкі. Што ж, выходзіць, я павінен пашкадаваць і яго? Ці хопіць у мяне шкадавання на ўсіх?

— Ах, што за прыгажосць, што за прыгажосць! — у захапленні засакатала раптам падмаляваная немаладая дама, якая друкавала ў газетах нарысы на маральна-бытавыя тэмы.— Гэта ж дзіва дзіўнае, ды і толькі! І як пахне! Можна, я панюхаю?

— Можа, хочаце і пакаштаваць?

— З задавальненнем! І вы не пашкадуеце?

Яна хуценька клюнула ягадку, з'ела яе, зморшчылася і засакатала яшчэ энергічней.

Я зняў зверху некалькі гронак, даў ёй.

— Ах, што вы, ах, навошта вы! — узрадавалася яна.— Раздзяляць такую прыгажосць, такое тварэнне прыроды! Хіба ж можна! — Але гронкі рабін узяла. Узяла беражліва, з рук у рукі, як калі б гэта быў сігнальны экземпляр яе новай кніжкі. Потым вынесла са свайго пакоя велізар-

ны аранжавы апельсін і не адстала, пакуль я не згадзіўся ўзяць яго ўзамен рабінам.

— За дабро трэба плаціць дабром! — шматзначна сказала яна.

А рабінавыя гронкі тут жа апусціла ў шклянку з вадой.— «Вось так!» — і не пераставала кудахтаць ад захаплення і задавальнення:

— Які букет, ах! Ён у мяне будзе стаяць на пісьмовым стале. Гэта ж сама Расія!

Сама Расія!.. Я ўспомніў пра Бабрышын Угор на маёй радзіме. Восенню, калі пахаладае, і раніцай рэчка прасвечваецца да дна, і лясныя паляны прасвечваюцца наскрозь, калі на мокрай ад расы траве блішчыць павуціна, а ў ясным, сонечным паветры носяцца чароды маладых качак,— раптам з усіх пералескаў выступаюць на пярэдні план прыбраныя, абчапляныя гронкамі рабіны: вось яны мы, не праглядзіце, маўляў, не грэбуйце нашымі ягадкамі, мы шчодрыя! Ветрык іх гладзіць і цярэбіць з верху да нізу. і птушкі на кожнай галінцы жыруюць, пералятаючы, як з гасцей у госці, з адной залатой вершаліны на другую, а яны стаяць сабе, пагойдваючыся, і любуюцца самі сабой...

Хлыне дождж — і зазззяе ўвесь рачны бераг. Сцякае вада з рабінавых гронак кропелька за кропелькай, ягады чырвоныя і кроплі чырвоныя; дзе вісела адна ягада — цяпер іх дзве, і абедзве жывыя. Чым больш дажджу, тым больш ягад у лесе...

Усё, вядома, можа прымільгацца, да ўсяго з часам прывыкаеш, але такое не заўважыць цяжка. Ускінеш галаву і нечакана для сябе, як пасля доўгай адлучкі, і быццам бы ўжо не вачыма, а нейкім унутраным, духоўным зрокам убачыш усю гэтую прыгажосць у дзівосна чыстым, чароўным ззянні. Убачыш, як у першы раз, усё занава — і радуешся за сябе, што ўбачыў. Ні наяве, ні ў сне гэтага забыць ніколі нельга. Вось яна якая, наша рабіна!

Нездарма ж, запудзіўшыся па радзіме, руская паэтэса, колькі ні пераконвала сябе і іншых, быццам яе ўжо нішто не можа спакусіць, што ёй «усё роўна, і ўсё адно», усё абыякава, пад канец верша прызнавалася:

> Но если по дороге куст
> Встает, особенно — рябина...

Далёкі мой сваяк, хімік Аркадзь Паўлавіч Расткоўскі, якога лёс закінуў на ўсё жыццё ў спякотны, раней далёкі ад Расіі Ташкент, улюбёны ў экзотыку Усходу, ва ўсе гэ-

тыя старадаўнія мазаічныя медрэсэ, і ляпныя мячэці, і каравап-сараі, нават чай піў толькі з піялы, а ўсё-такі пастойліва, да канца дзён сваіх спрабаваў прымусіць расці ў сябе пад акном простую рускую рабіну. Праўда, не ўдалося гэта яму...

Вядома, і рабіна можа прымільгацца. Аднойчы да мяне на Бабрышын Угор, у маю паляўнічую хату, прыехаў восенню сябра з Ленінграда. Я не ведаў, чым парадаваць яго, а ён глянуў раніцай з акна і, як змоўшчык, шапнуў мне:

— Пад акном у вас прыгажуня стаіць, не бачыце?

Я з перапуду прыняў яго словы ўсур'ёз, кінуўся да акна і ахнуў: пад акном сапраўды стаяла сапраўдная прыгажуня. Рабіна! Як жа я раней яе не заўважыў?

Сама Расія!.. Успомніў я і пра кветкі ў гаршках на вокнах гарадскіх кватэр, пра маленькія, вартыя жалю клумбачкі ў дварах шматпавярховых будынкаў, а то проста каля лесвіц, справа і злева ад уваходных дзвярэй, пра клумбачкі, якія старанна і беражліва даглядаюць гараджане. Усе яны, разумеючы гэта ці не, сумуюць па сапраўднай прыродзе. Гаршкі і клумбы — хіба гэта прырода!

— Дазвольце ж прычасціцца і мне! — працягнуўся да рабін праз натоўп пажылы грузны літаратар з сівымі вусамі, у карычневым шарсцяным світары, у чорнай акадэмічнай шапачцы на голым чэрапе.— Рэдка я цяпер іх бачу, а ў юнацтве, бывала, мы насілі іх з-за ракі цэлымі кашамі, сявалкамі. А то зацягнем папругі тужэй і напхаем пад кашулі кругом сябе, проста да голага цела, колькі можа ўмясціцца. З-за ракі адпраўляемся тоўстыя, як бочкі, а па дарозе ядзім ды з дудачак страляем, і чым бліжэй да дому, тым танчэйшыя робімся. Як гэта дакладней сказаць: танчэем, танеем, станчаемся? (Пачаліся пакуты слова!) Не, станчаемся сказаць нельга, сэнс іншы... Самыя лепшыя рабіны, вядома, марожаныя. Дарэчы, ад чаду добра памагаюць...

І ён пачаў успамінаць пра тое самае, пра што мы перагаварылі ўжо. Мы не перабівалі яго.

— Чалавека не можа не цягнуць да прыроды, ён сам яе тварэнне,— сказаў ён пароннце.

— Дык у чым жа справа стала? — спыталіся ў яго не без папроку і адразу ў некалькі галасоў.— Ехалі б у вёску, жылі б на падножным корме, прыкладаў нямала...

— Гэ, маладыя людзі! Вы, здаецца, злуецеся? А разважалі, напэўна, пра адзінства з прыродай, пра тое, што

яна змякчае норавы?.. Справа простая: спачатку патрэбен быў інстытут, потым спатрэбіліся выдавецтвы, часопісы... Потым гарадская жонка з'явілася... Цяпер, на жаль, я ўжо не магу спаць на сенавале і насіць ваду з калодзежа. Вось у будучым, на якое мы цяпер працуем, павінна наступіць гармонія паміж горадам і лесам. Зеленаград — для мяне гэта гучыць, як, напэўна, для першых рускіх рэвалюцыянераў гучала слова «сацыялізм»...

Па-рознаму ставіліся знаёмыя да майго пачастунку і рознымі вачыма на яго глядзелі.

Нейкая дзяўчына ўторкнула рабінавую гронку сабе ў прычоску і зараз жа пабегла да люстэрка: у чорных валасах яе заблішчалі ледзь не сапраўдныя рубіны. Потым яна папрасіла яшчэ дзве-тры гронкі ягад, каб зрабіць з іх пацеркі.

— Я кожную ягадку лакам намажу,— растлумачыла яна.

Малады паэт сказаў:

— Колькі песень складзена пра рабіну, а яшчэ хочацца. Галінку рабіны трэба было б упісаць у наш герб...

Калі б надарыўся мастак, і ён, відаць, сказаў бы нешта падобнае:

— Колькі карцін напісана, а яшчэ адной не хапае. Маёй! Дзіўна, што ў ляпных арнаментах у нашых архітэктараў шмат вінаграду і няма рабіны...

А гардэробшчыца Поля падышла да справы чыста практычна:

— Я вось замару гэтую галінку па-нашаму, па-разанскаму, ды чаёк завару, пацешуся, маладое жыццё ўспомню. Раней у нас дзеўкі рабінамі мілых прыварожвалі. Памагала. Я ўжо адваражыла...

Ягад у мяне было шмат, я не баяўся, што іх не хопіць маім дзецям, і толькі ўвесь час думаў пра тое, як яны прымуць іх, ці спадабаецца ім мой паўночны, мой вясковы пачастунак.

Але болей за ўсіх мяне здзівіў апошні з тых, хто падышоў. Ён проста па-сяброўску сказаў мне:

— Слухай, Саша, прадай мне ўсё гэта!

— Як гэта прадай? — разгубіўся я.

— Ну так, усе гэтыя «вітаміны». А не хочаш прадаць — аддай так, я табе таксама падкіну які-небудзь сувенірчык.— І ён пачаў капацца ў сваіх шматлікіх шырокіх кішэнях, нядбайна тузаючы серабрыстыя змейкі-маланкі.

Патрэбны яму мае рабіны! Але я ўсё-такі даў галінку

і яму. Пры гэтым мне вельмі хацелася сказаць: «З'еш, можа, на карысць пойдзе!»

Але я нічога не сказаў.

Пасля размовы з ім я хутка пакінуў дом, дзе жылі і тварылі мае таварышы.

А дзеці мае ўзяліся за рабіны спачатку недаверліва, моршчачыся і ўздрыгваючы гэтак жа, як увосень, калі елі тугія і сакавітыя ягады проста з дрэва. Але хутка яны накінуліся на рабіну апантана, з'елі ўсе з задавальненнем і ўсё папракалі мяне за тое, што я не частаваў іх такой смакатой раней.

— Гэта ж зусім розныя рэчы! — гаварыла мне старэйшая дачка.— Няўжо ты не разумееш? Гэта розныя рабіны.

Вось яно як, я ж яшчэ і вінаваты. Добра, ешце, раз да смаку прыйшліся. І няхай яны ратуюць і вас ад любога чаду, нашы рабіны.

А пад канец, калі ўсе супакоіліся, я пачуў адзін даверлівы і добры голас:

— Тата, хіба там, на тваёй радзіме, шмат такіх рабін? Можа, восенню з'ездзім, пабяром, га? Тых, вашых! Толькі ж восенню зноў у школу трэба...

*1965*

# Яўгеній Еўтушэнка

## ЧАЦВЁРТАЯ МЯШЧАНСКАЯ

Я рос на Чацвёртай Мяшчанскай.

Я любіў гэтую ціхую вулачку, дзе не хадзілі ні тралейбусы, ні аўтобусы, ні трамваі, толькі стары конь са стомленымі добрымі вачамі цягаў па бруку фуру з гароднінай па гумавым ходзе. Тут было ўсё зусім не падобнае на звычайнае «паштоўкавае» ўяўленне аб Маскве, але таму гэта і была сапраўдная Масква.

Машыны, якія зрэдку заязджалі сюды, вымушаны былі рэзка тармазіць і прасоўваліся паволі-паволі, бо на самай сярэдзіне вуліцы дзеці заўсёды гулялі ў футбол.

Тут было многа таполяў, і, калі яны абляталі, футбольны мяч кожны раз трапляў у шэрыя гурбы тапалінага пуху.

О, гэты тапаліны пух на Чацвёртай Мяшчанскай.

Пушынкі марудна і мякка кружыліся ў паветры, плавалі, як чародкі малюсенькіх качанят на паверхні луж, што засталіся пасля ўчарашняга дажджу, заблытваліся ў валасах прадаўшчыц вафляў, патрохі набіваліся ў кабуру міліцыянера, вялікага аматара гэтых вафляў, а вечарам, залятаючы ў адчыненыя вокны, садзіліся на чорныя пласцінкі, якія кружыліся... Такімі вось тапалінымі вечарамі хадзілі мы разам па Чацвёртай Мяшчанскай: Рыма, Роза, Сцяпан і я. Мы ўсе жылі ў адным доме, былі аднагодкі і помнілі адзін аднаго столькі, колькі наогул маглі штонебудзь помніць.

У Сцяпана ў руках была гітара. Я ў прынцыпе гэты інструмент лічыў атрыбутам пошласці, але Сцяпанаву гітару любіў. І голас ягоны любіў, цягучы, я б сказаў, журботна ўсмешлівы голас, якім Сцяпан напяваў песеньку, складзеную мною і ім:

На этой тихой улочке,
где бродит столько пар,
когда-то с кремом булочки
тебе я покупал.

Смотрел на платье синее
у дома твоего
и называл по имени,
а больше ничего.

Счастливая, несчастная,
кружилась голова...
Четвертая Мещанская,
дом семь, квартира два!

Дом наш быў маленькі, двухпавярховы, з вясковым драўляным ганкам, што выходзіў у двор. Дом даўно не рамантаваўся, тынкоўка з яго абсыпалася, і хлапчукі, калі збіраліся клеіць новага папяровага змея, выкалупвалі з яго аблупленых бакоў пажаўцелую дранку. Але для нас тут усё было поўна нявытлумачанага значэння: і таямнічы пах сырых хлеўчукоў, і такі нечаканы на дашку ганка маленькі сланечнік з сярэбраным пушком на жорсткай зялёнай скуры, і доўгі стол, урыты пад таполямі, дзе па вечарах чуўся стук драўляных бочачак лато з зацёртымі лічбамі на маленькіх донцах, і бліскучыя пад вадасцёкавай трубой адшліфаваныя і закругленыя вадой кавалачкі цэглы, і цёмна-зялёныя асколкі бутэлечнага шкла — «марскія каменьчыкі» Чацвёртай Мяшчанскай.

На Чацвёртай Мяшчанскай жылі самыя розныя людзі: вадаправодчыкі і цырульнікі, афіцыянткі, грузчыкі, гадзіннікавых спраў майстры і фрэзероўшчыцы, лазеншчыкі і інжынеры. Яны пазычалі адзін у аднаго крэслы і чаркі, прышчэпкі для бялізны і гальштукі, хадзілі адзін да аднаго пазваніць па тэлефоне, паглядзець тэлевізар альбо набраць у вядро вады, калі ў адным з дамоў псаваўся водаправод. Раніцай яны сустракаліся ў магазіне, падстаўляючы «авоські» пад бульбу, што глуха стукалася па нахільным драўляным латку, а вечарам — на лавачках у дварах і на бацькоўскіх камітэтах у школах з чырвонай цэглы, дзе яны няёмка сядзелі за партамі, зрэзанымі нашымі сцізорыкамі, і гаварылі пра нас, дзяцей Чацвёртай Мяшчанскай. І вось мы — Рыма, Роза, Сцяпан і я — выраслі, і Чацвёртая Мяшчанская глядзела на нас, радуючыся і тым часам трывожачыся, што мы, яе дзеці, ужо не дзеці...

Мы любілі па вечарах сядзець пад вялікай-вялікай чаромхай у нашым двары на лаўцы, якую зрабіў сам Сцяпан. Ён вучыўся ў інстытуце лясной гаспадаркі і лічыў, што кожны лесавод, які паважае сябе, умее рабіць усё, як Рабінзон. Гэта ён падарыў мне, калі я ад'язджаў у экспедыцыю на Алтай, сканструяваны ім паляўнічы нож з маленькай запальнічкай усярэдзіне. Сцяпан быў, па-мойму,

прыгожы хлопец з густымі брывамі, якія ўпіраліся адно ў адно, з сарамлівымі і ў той жа час — як бы гэта сказаць? — энергічнымі вачамі. Так, так, менавіта так: з энергічнымі вачамі! А Рыма лічыла яго непрыгожым і хоць гаварыла літасціва пры гэтым: «Праўда, знешнасць для мужчыны не мае значэння...»,— Сцяпан хмурнеў і ўвесь хаваўся кудысьці пад свае чорныя зросшыя бровы.

Яна-то была прыгожая, Рыма,— самая прыгожая на Чацвёртай Мяшчанскай. А Сцяпан аднойчы мне сказаў, што яна самая прыгожая ва ўсёй Маскве. Аднак ён пры гэтым дадаў: «Праўда, знешнасць і для жанчыны, па-мойму, значэння не мае...» Але гэта было сказана без пэўнасці, а таму непераканаўча.

Рыма вучылася ў тэатральным інстытуце і дужа важнічала. Яна любіла здзіўляць: «Масальскі сказаў, што ў мяне рэдкае спалучэнне магчымасцей інжэню і характарнай актрысы...» Слова гэта, «спалучэнне», ёй, відаць, падабалася, і аднойчы ў парку ЦДСА, калі мы каталіся на лодцы, яна сказала, неяк асабліва прыжмурыўшыся: «Якое цудоўнае спалучэнне блакітнага з зялёным!» Я ледзь у ваду са смеху не зваліўся, а Сцяпан панура пачырванеў: ён заўсёды панура чырванеў, калі Рыма рабілася раптам не такой, якой мы яе ведалі столькі гадоў, а нейкай іншай — надуманай і пагардлівай.

Перамена гэта адбылася з ёй зусім нядаўна, калі яна раптам зразумела, што прыгожая. Яе бацька, вялізны, падобны на Паддубнага хірург, басіў: «І што здарылася? Была дзяўчына як дзяўчына і раптам паглядзела на сябе ў люстэрка — і ачмурэла. Пластычную аперацыю ёй, мусіць, трэба зрабіць?»

Ёй няспынна званілі. Ёй увесь час што-небудзь дарылі. Ёй прызначалі спатканні. Нарэшце, яе праводзілі. Праводзілі самыя нечаканыя і амаль заўсёды новыя прыхільнікі.

То яе, збочыўшыся, вёў пад руку падобны на пераадзетую распаўнелую жанчыну вядомы тэнар. То адразу двое ці трое тэатральных хлопчыкаў з аднолькавымі прычоскамі і ў аднолькавых вельветавых штоніках, забягаючы наперад, марна мітусіліся перад ёй.

Неяк на таксі яе прывёз сімпатычны цыбаты хлопец у каўбойцы з пацёртым каўняром — відаць, студэнт. У яго не хапала рубля, каб заплаціць па лічыльніку, і, залваючыся чырванню, ён доўга збіраў з усіх кішэняў дробязь. Шафёр, усміхнуўшыся, страсянуў на далоні манеты, пера-

сынаным тытунём, хлебнымі крошкамі, і залаты зуб у кутку ў яго ў роце пагардліва бліснуў.

Пад руку з Рымай на нашай вуліцы наявіўся пасля доўгай адсутнасці блудны сын Чацвёртай Мяшчанскай — Кока. Кока — гэта Колька Кутузаў з нашага дома; ён стаў вядомым футбалістам і жыў цяпер на Нова-Пясчанай. Хлопчыкі пасталі шарэнгай уздоўж тратуара, з нямым захапленнем гледзячы на яго. Кока важна ішоў з першай прыгажуняй Чацвёртай Мяшчанскай, пагардліва ставіў свае найдаражэйшыя ногі на тратуар у трэшчынах, дзе прабівалася трава.

А аднаго разу Рыму прывёз на сваёй машыне немалады, стомлены чалавек з кароткім сівым вожыкам. Хтосьці з хлапчукоў, абураны тым, што Рыма дазволіла сабе праняняць іх Коку на нейкую невядомую асобу, крыкнуў: «Зноў з новым!» І хлапчукі засмяяліся гучна і жорстка. На Рыму гэта, як мне здавалася, не зрабіла асаблівага ўражання, а вось чалавек, які прывёз яе, неяк бездапаможна сцепануўся і яшчэ больш пастарэў...

Рыма была гордасцю Чацвёртай Мяшчанскай, і Чацвёртая Мяшчанская не даравала ёй. А Сцяпан дараваў, і я дараваў, і Роза даравала.

Так, пра Розу: я ж нічога не сказаў пра яе. І не выпадкова. Яна нейкая ўся была непрыкметная, наша Роза: маленькая, моцненькая, паўсюды-паўсюды — на посе, на руках і нават на вушах — у яе былі вяснушкі. Ёй так не пасавала яе імя. Яна працавала на заводзе кантралёрам АТК. Не ведаю, што яна там кантралявала, ды і ўявіць я сабе не мог, што Роза наогул што-небудзь можа кантраляваць. Але вось аднойчы наша Роза, маленькая Роза, калі мы сядзелі разам пад чаромхай, так жа ціха, як і ўсё, што яна рабіла, сказала:

— А я на цаліну еду, хлопчыкі...

Усе мы паставіліся да гэтага па-рознаму. Я перапытаў. Сцяпан адразу дзелавіта ўдакладніў:

— Куды ж там?

А Рыма паглядзела на Розу так, нібыта перад ёй толькі цяпер з паветра нечакана ўзнікла гэтая істота з тоўстымі нагамі ў чаравіках, пачышчаных зубным парашком, з вушамі, абсыпанымі вяснушкамі.

— Ідзеш у нагу з векам. Ну, ідзі, ідзі, не спатыкніся толькі...

Сцяпана так і тузанула, і мне таксама зрабілася неяк непрыемна, быццам на лаўцы з намі была не Рыма, а

якісьці чужы, варожы нам чалавек. Але пагардлівая насмешлівасць раптам змянілася ў яе вачах нейкай журботнай пяшчотай, а можа, сумнай зайздрасцю. Яна абняла Розу і моцна пацалавала яе — спярша ў адну шчаку, потым у другую, нібыта не яна толькі што сказала гэту пошлую, пагардлівую фразу. Дзіўная была Рыма!

А Роза так жа нечакана паехала, як і аб'явіла рашэнне паехаць. Ад яе прыходзілі з Казахстана пісьмы, такія ж кароценькія і просценькія, як яна сама. Пісьмы гэтыя да таго былі падобныя на яе, што іншы раз мне таксама здаваліся вяснушчатымі. Заўсёды ў іх укладзена што-небудзь: альбо засушаная стэпавая кветка, альбо пасма кавылю, а восенню прыйшло пісьмо, у якое быў укладзены каласок — чысценькі, моцны,— таксама нечым падобны на Розу. Калі ў газетах друкавалі фатаграфіі герояў цаліны, я шукаў на іх Розу, але чамусьці не знаходзіў: яна ж маленькая, наша Роза. Сярод такіх высокіх хлябоў яе, напэўна, і не відаць!

А са Сцяпанам было блага. Аднойчы позна ноччу ён прыйшоў да мяне і сказаў:

— Апранайся.

Я падзеўся.

— А цяпер што?

— Цяпер выйдзем.

Мы выйшлі.

— Мы з табой пойдзем у рэстаран,— растлумачыў Сцяпан. Я вельмі здзівіўся, бо не памятаў, каб Сцяпан хадзіў у рэстаран. Але менавіта таму, што здзівіўся, пайшоў.

Зайшлі мы ў рэстаран другога разраду «Нарва», недалёка ад нашага дома. Швейцар падазрона пакасіўся на баскетбольныя Сцяпанавы кеды, але прапусціў. Афіцыянт з вялізным, падобным на валляк падбародкам прыбраў са стала талеркі, дзе нечыя недакуркі былі ўторкнуты ў недаедзены рамштэкс, і, зухавата перавярнуўшы абрус, надаў сталу штосьці, што павінна нагадваць свежасць.

Сцяпан, чырванеючы, заказаў трыста грамаў нейкага лікёру і два супы харчо. Афіцыянт, выкаціўшы вочы пасля такога заказу, пакрыўджана высунуў валляк і паплыў да буфета.

Было душна і шумна. На маленькай эстрадзе сляпы акардэаніст іграў «Мішку». Адзінокі падпіты камандзіровачны ўвесь час гаварыў тосты за жанчыну, якая сядзела побач з румяным, акуратным лейтэнантам, чым лейтэнант,

як мне здалося, быў не вельмі задаволены. На куце з дзвюма дзяўчынамі сядзеў Кока і піў чэшскае піва. Кока трохі збянтэжыўся, што мы заспелі яго ў рэстаране другога разраду, але тым не менш павітаўся з намі, узняўшы руку з бронзавым пярсцёнкам. Я быў таксама здзіўлены, бо ведаў, што Кока заўтра павінен іграць з венграмі, але нічым свайго здзіўлення не выдаў.

Афіцыянт прынёс наш бязглузды лікёр. Сцяпан паспрабаваў зеленаватую густую вадкасць, пасля адсунуў чарку:

— Клапамі пахне! І што гэта за звычай такі: калі чалавеку з чалавекам пагаварыць трэба,— значыць, абавязкова выпіць! Ну яго, гэты лікёр! Хадзем адсюль.

Сцяпан, зноў чырванеючы, расплаціўся, і мы падняліся. Ля дзвярэй я азірнуўся, сляпы акардэаніст еў грэцкую кашу з малаком, акуратнага лейтэнанта з яго спадарожніцай ужо не было відаць, а нястомны камандзіровачны падсеў да Кокі і гаварыў тосты ўжо за Кокавых прыяцельніц. Афіцыянт зліў не выпіты намі лікёр з чарак у фужэр і кульнуў яго ў валляк. Па яго твары мітусліва бегалі чырвоненькія жылкі...

— Уф! — уздыхнуў Сцяпан, калі мы выйшлі на вуліцу.— Не атрымаецца з мяне, Жэнька, п'яніцы!..

— Вельмі добра, што не атрымаецца,— сказаў я,— але ў чым усё-такі справа?

— Ты ведаеш, я кахаю яе.

— Каго яе? — спытаў я, хоць выдатна ведаў, каго.

І Сцяпан мне не адказаў на гэтае лішняе пытанне.

— Разумееш,— сказаў Сцяпан,— існуюць людзі, у якіх ёсць нейкая ўнутраная ілжывасць, і ўсе іх знешнія паводзіны — рухі, манера размаўляць — гэта толькі сродак для таго, каб схаваць гэтую ілжывасць. А ў Рымы наадварот. Яна ўсімі сваімі паводзінамі спрабуе схаваць тое добрае, што ёсць у ёй. Яна пібыта нават саромеецца гэтага добрага! Яна паводзіць сябе так, быццам ёй нішто не цікава, акрамя самой сябе: ні хлеб, які Роза вырошчвае, ні дрэвы, якія я садзіць буду, ні аперацыі, якія яе бацька дзень і ноч робіць,— а я вось ёй не веру! Яна мне аднойчы сказала, што актрыса павінна быць унутрана халоднай. Сару Бернар да прыкладу прыгадала. Я ёй кажу: «Няўжо вялікія акцёры, нават калі плачуць, унутрана халодныя?» Гэта вельмі проста,— сказала яна,— трэба толькі выклікаць у памяці тое, ад чаго плакала калісьці. Хочаш, пакажу?» Яна стала да сцяны, заплюшчыла вочы, а з-пад вейкаў — слёзы, вялікія сапраўдныя. Не ведаю, мо-

жа, у іх тэатральным жыцці гэтак і бывае, але мне зрабілася брыдка... А ўсё-такі я не веру, не веру, што гэта ў яе душы!

І колькі б яна мне пра свае раманы ці — як гэта яна іх там называе — навелы ні расказвала, таксама не веру.

Мы ішлі па Сэрэцэнцы. Было каля дванаццаці. Ужо зачынялі «Гастраном», і каля яго дзвярэй, як заўсёды, мітусіліся некалькі тых, што спазніліся, дарэмна спрабуючы перакананць прыбіральшчыцу, што яшчэ рана зачыняць. Прадаўшчыца газіраванай вады прыбірала шклянкі ў цыратавую сумку. З вітрыны універмага сарамліва і стомлена ўсміхаўся манекен. Манекену было сорамна, што ён дрэнна надзеты.

У кінатэатры «Уран» кончыўся апошні сеанс, і, закрываючы нас суконкамі, міма струменіліся жанчыны і мужчыны, якія пахлі духамі гэтых жанчын.

І раптам мы пачулі:

— Што гэта вы тут робіце?

Перад намі стаяла Рыма пад руку з маладзенькім марскім афіцэрам.

— Гэта Пеця,— сказала Рыма,— і зараз, на гэтай жахлівай музычнай камедыі, ён зрабіў мне прапанову. Але я яму сказала, што не вартая яго. Вы можаце пацвердзіць, што гэта праўда.

Пеця жаласна пачырванеў і, чамусьці зняўшы фуражку, дзіцячай хусточкай пачаў выціраць лоб, які спацеў ад нечаканасці.

— Хлопчыкі! — сказала Рыма.— Я ведаю, што мы будзем зараз рабіць. Мы паедзем у Сярэбраны Бор.

Яна махнула рукой, і, ачмурэлыя і трохі прыгнечаныя, мы праз момант сядзелі ў таксі...

Уначы над Масквой-ракой усё было таямніча: і месячна бліскаючыя мармуровыя столікі пустога летняга кафэ, і валейбольная сетка паміж цёмных дрэў, у ячэйках якой варушыліся буйныя зоркі, і чорная вада з доўгімі срабрыстымі адбіткамі агнёў, што былі падобныя на слупкі манет. З таго берага даносілася шарыпванне: гэта церліся адна аб адну цёмныя лодкі.

Я купацца не стаў. Пеця, збянтэжана кратаючы корцік, мусіць, з-за сарамлівасці адмовіўся. Рыма і Сцяпан паплылі адны.

— Не гаруйце, Пеця,— сказаў я ціхім голасам, усё роўна як быў намнога старэйшы за яго,— вы яшчэ малады.— І загаварыў з ім пра заўтрашні футбол.

Чорныя галовы Рымы і Сцяпана ціха рухаліся ўпізе, пасля зніклі з вачэй. І раптам на другім беразе, на крутым пясчаным абрыве каля лодачнай станцыі, я ўбачыў два сілуэты, быццам высечаныя з чорнага каменя. Яны стаялі над лодкамі, што гойдаліся на прыколе, над чорна-срэбранай ракой, якая аддзяляла іх ад нашага берага, і над усімі яго смуткамі і радасцямі.

І для мяне, аддзеленыя чымсьці большым, чым адлегласць, гэта былі ўжо не Рыма і Сцяпан, а незнаёмыя мужчына і жанчына, якія пераплылі раку, якую я яшчэ не пераплываў. І жанчына зрабіла крок да мужчыны і падала яму рукі. І мужчына зрабіў крок да жанчыны, але спыніўся і адхіліў яе. Жанчына нешта гаварыла мужчыну, але ён нерухома стаяў, гледзячы не на яе, а ўніз, на раку, якую ім трэба было зноў пераплыць, каб вярнуцца да таго, што на імгненне было забыта. І зноў яны ўвайшлі ў раку, але ж нельга ўвайсці ў адну і тую ж раку двойчы, і хоць яны плылі, як тады, побач, у іх рухах была нейкая шчымлівая раздзеленасць.

Яны выйшлі на наш бераг, і зноў гэта былі ўжо не тыя незнаёмыя мужчына і жанчына, а Рыма і Сцяпан. І Рыма з кроплямі вады, што свяціліся ў валасах і на плячах, падышла да панурага марскога афіцэра і з горкай весялосцю сказала:

— Нічога, Пеця, мы з вамі ў некаторым родзе сёння таварышы па няшчасці: вось таксама зараз нібыта прызналася ў каханні і таксама нічога не атрымалася.

Так сказала Рыма, самотна закінуўшы галаву, і ўсю дарогу назад яна маўчала. Маўчаў і Сцяпан. Маўчаў і я. І ўжо, вядома, маўчаў разгублены марскі афіцэр Пеця, які нічога не разумеў...

Назаўтра мы сустрэліся са Сцяпанам на стадыёне; білеты мы куплялі загадзя,— як заўсёды, тры месцы побач. Але Рымы з ім не было.

— Што ты ёй сказаў учора, Сцяпан? — спытаўся я ціха, але жорстка.

— Што не кахаю яе,— вось што я ёй сказаў! І ні аб чым больш не пытайся. Глядзі, Кока наш...

Якраз у гэты момант Коку далі выдатны пас, а ён нават не пацэліў нагой па мячы.

— З поля Кутузава! — закрычаў, склаўшы далоні трубкай, наш сусед і ўскочыў, губляючы з каленяў партфель, з якога пасыпаліся бухгалтарскія бланкі, палавіна булкі з каўбасой і папяровыя шклянкі.

Ї стадыён падхапіў і пачаў скандзіраваць з пагардай:

— З по-ля! З по-ля!

Ён быў жорсткі,стадыён. Ён імгненна забыў пра тое, колькі разоў пляскаў гэтаму высокаму русяваму хлопцу з такімі таленавітымі нагамі. Зараз ён бачыў толькі ягоную ганьбу і патрабаваў яго замяніць. А Кока, цяжкі ад учарашняга чэшскага піва і збянтэжаны галёканнем, што чулася адусюль, кожны раз губляў мяч і біў невядома куды. І раптам, сабраўшы, напэўна, усе сілы, ён выключна прыгожа перакінуў мяч пяткай цераз галаву самому сабе на выхад, пераскочыў цераз падстаўленую нагу рыжага венгра і ўдарыў ужо амаль з самай стужачкі. Увесь стадыён, і верачы і не верачы, прыўзняўся, штосьці крычаў і кідаў у паветра шапкі, парасоны, плашчы. Лік стаў 1 : 1. І тут жа пачуўся свісток суддзі.

Венгры, прысеўшы на кукішкі, фатаграфаваліся ў цэнтры поля, а нашы хлопцы ў цёмных ад поту футболках панура ішлі ў раздзявалку. І самым пахмурым быў Кока, хоць ён і выратаваў каманду ад паражэння... Нам зрабілася шкада Коку: усё-такі ён быў наш, з Чацвёртай Мяшчанскай. Мы зайшлі да яго ў раздзявалку. Нас доўга не прапускалі, але потым прапусцілі. Усе футбалісты ўжо выйшлі, а Кока ўсё яшчэ змрочна сядзеў, захутаўшыся ў махнаты ручнік.

— Не будзеш другі раз піць перад матчам! — сказаў я.— А ўсё-такі гол ты лоўка забіў, Кока...

Ён раптам па-дзіцячы ўсміхнуўся.

— А гэта сапраўды нішто, здаецца, атрымалася: пяткай цераз галаву самому сабе на выхад.— І раптам зноў спахмурнеў.

Потым ён пачаў адзявацца. І са з'яўленнем на ім белай сілонавай кашулі, пярэстага пінжака з разрэзам ззаду, блакітных штаноў, вастраносых макасінаў і ўжо вядомага бронзавага пярсцёнка зноў ператварыўся з сумнага хлопчыка ў вялікага футбаліста.

— А што з Рымай? — спытаў Кока.

— Яна зайшла да мяне перад матчам з нейкім марачком, сказала, што гэта яе муж, і запрасіла на вяселле ў наступную нядзелю.

І тут я зразумеў, што гэта праўда. Гэта было надта падобна на Рыму. І Сцяпан гэта зразумеў. І толькі вялікі футбаліст нічога не разумеў у тым, што адбылося, і, няўцямна пазіраючы на нас, папраўляў свой гальштук...

Праз тры дні, вярнуўшыся дамоў, я знайшоў на стале

паперку: «Дыплом прыняты. Атрымаў накіраванне і сёння ад'язджаю. Калі паспееш, Паўночны вакзал, 44-ты цягнік, вагон 6-ты. Адпраўленне — 20.45. Сцяпан». Я глянуў на гадзіннік. Заставалася дзесяць хвілін...

На перон я паспеў, калі цягнік нераашуча скалануўся і рушыў. Мужчыны і жанчыны з добрымі, разгубленымі вачамі ішлі за вагонамі, і ў людзей, якія стаялі ў вагонах, былі таксама добрыя і разгубленыя вочы, вочы людзей, што праводзілі нерухомае.

І я ўбачыў Сцяпана, і Сцяпан убачыў мяне. Ён стаяў на падножцы вагона ў рудым лыжным касцюме і баскетбольных кедах. Я хацеў нешта сказаць яму, але нічога не сказаў. І Сцяпан таксама хацеў мне штосьці сказаць і таксама не прамовіў нічога. Я яшчэ ішоў побач са Сцяпанам, але гэта была толькі бачнасць таго, што мы побач. Я паўна паскорыў крок, спрабуючы не адстаць ад цягніка, які набіраў хуткасць, але нельга не адстаць ад таго, што мацнейшае за цябе. І я спыніўся на самым краі перона і доўга-доўга махаў ужо нябачнаму Сцяпану, пакуль ліхтар апошняга вагона, рубінава пасвечваючы, не схаваўся за пераплёценнямі сталёвых канструкцый. Я застаўся на пероне, а Сцяпан, які толькі што стаяў на падножцы побач з гэтым піеронам, ужо стаў часткай той невядомай задымленай прасторы, якая ўцягнула ў сябе цягнік... Так паехаў Сцяпан. А вяселле Рымы павінна было адбыцца ў нядзелю.

У нядзелю з раніцы лінуў дождж. Дажджынкі, абгортваючыся пылам, спачатку нясмела заскакалі па Чацвёртай Мяшчанскай, пасля раптам з неба лінула густая, цёплая вада. Вадасцёкі захлыналіся, капялі; ручаіны беглі насустрач адна адной і знікалі адна ў адной.

Мокрыя дзеці, дужа шчаслівыя, што мокрыя, закасаўшы штаны, скакалі па вадзе танец дажджу і дзяцінства. Гаспадыні выстаўлялі ў двор бляклыя герані, зеленарогія альясы і цёмныя цыратавыя фікусы. Пахла зямлёй і лістотаю.

І ў гэты дождж я зайшоў да Рымы.

Рыма сядзела ля стала, заваленага скруткамі, слоікамі маянэзу, звязкамі цыбулі і яшчэ не пастаўленымі ў ваду кветкамі. На падлозе ля яе вузенькіх замшавых чаравічак выстраілася вясельная гвардыя бутэлек шампанскага ў сярэбраных касках. Нібыта не заўважаючы ўсяго гэтага, Рыма глядзела нейкім мёртвым позіркам на свята вады і зеляніны.

— Усё, што ты мне збіраешся зараз гаварыць,— сказала Рыма,— не мае сэнсу. А вось і Пеця.

Увайшлі шчаслівы Пеця, які да гэтага часу не мог асэнсаваць таго, што адбывалася, і Рымін бацька, які глядзеў на Пецю з журботным спачуваннем.

— Яшчэ да вечара далёка,— сказаў бацька Рымы змрочна,— перакусіць, ці што...

І раптам Рыма ўскочыла і кінулася да акна.

Ля акна стаяла маці Розы — старая адзінокая жанчына, што працавала прыёмшчыцай у пральні. Яна трымала ў руках скамечанае пісьмо, а вочы ў яе былі збянтэжаныя нечым страшным і застылі ў гэтай збянтэжанасці.

Мы выбеглі ў двор, завялі яе ў пакой. Я выхапіў з яе рук пісьмо. Яно было наіўна афіцыйным і яшчэ больш страшным з-за гэтай наіўнай афіцыйнасці.

— «Дарагая Еўдакія Мікалаеўна! — прачытаў я ўсім.— Пішуць вам камсамольцы саўгаса, дзе працавала ваша дачка. Яна была сакратаром нашай камсамольскай арганізацыі і, нягледзячы на пагрозы, заўсёды выступала супроць хуліганаў і хапуг, якія пралезлі ў нашы рады. У ноч на 12 чэрвеня, калі яна вярталася з палявога стана, у стэпе яе падсцярог выключаны па яе патрабаванні з камсамола Аляксандр Яніхін і нанёс ёй пяць нажавых ран. Не прыходзячы ў свядомасць, яна памерла. Над забойцам будзе наладжаны паказальны працэс.

Дарагая Еўдакія Мікалаеўна! Вашу дачку мы пахавалі каля таго самага месца, дзе яна ўпершыню павяла свой трактар на штурм цаліны. Яе імем мы пастанавілі назваць камсамольскі клуб, які будуецца. Светлая памяць аб вашай дачцэ будзе жыць у нашых сэрцах».

Далей ішлі подпісы.

Я не мог нават уявіць сабе, што Розы — моцненькай Розы — можа раптам не стаць. Я быў, Рыма была, Сцяпан, праўда, далёка: але таксама быў, Чацвёртая Мяшчанская была, а Розы больш не было. Толькі дзесьці, далёка ад Чацвёртай Мяшчанскай, на казахстанскай зямлі была маленькая магіла, такая ж маленькая, як і сама Роза.

І маці Розы ўзяла пісьмо сваімі вузлаватымі рукамі, скрозь якія столькі прайшло і яшчэ пройдзе прасцірадлаў, кашуляў, каўнерыкаў, і, хістаючыся, пайшла сярод дзяцей, якія скакалі па вадзе. А Рыма раптам заплакала так, што нам стала жахліва; заплакала, паваліўшыся сваёй каштанавай галавой на недарэчныя скруткі. Пасля падня-

ла галаву, паглядзела на Пецю, увешанага пакетамі, на дурное шампанскае і сказала спакойна і прасветлена:

— Пеця, вы вельмі добры, але я не буду вашай жонкай, Пеця. Я кахаю Сцяпана.

І Рыма выбегла з дому і пайшла ў сваіх бездапаможных замшавых чаравічках, аблепленая мокрай каляровай сукенкай, пайшла, сама не ведаючы куды.

Жыццё жорстка нагадала ёй пра тое, што яно, жыццё, даецца толькі адзін раз і што нельга хлусіць самой сабе ў сваім адзіным жыцці.

Так ішла Рыма і плакала горка і вызвольна.

Плакала Рыма, і, можа, недзе ў далёкай тайзе горкімі мужчынскімі слязамі плакаў Сцяпан, які не ведаў, што вяселле не адбылося...

# Фёдар Абрамаў

## МАЦЯРЫНСКАЕ СЭРЦА

Ніводнага не засталося, усе там... А які лес быў! Пецтя, Ваня, Павел, Ягор, Сцёпа... Пяць мужыкоў! Я, некалі, надыходзіць пара раджаць, не пра тое думаю, як іх усіх пракарміць ды адзець-абуць, а пра тое, як за сталом усіх пасаджаць. У свёкра, бач, стол быў невялікі, на саміх дваіх ды на сына, а мяне ў хату ўзялі — засыпала дзецьмі.

Ну, пра старэйшых я ўжо не кажу — тых вайна праглынула. За адзін год тры пахаронкі атрымала — вось як па мне праехала вайна. І Ягора праз вайну таксама страціла — у палоне быў у германца. А вось Сцёпа! Мезенчык мой любы! Той ужо на маім сумленні, таго я сама выпусціла... Вось і не прасыхаю. Каторы ўжо — дваццаць сёмы год пайшоў, а я ўсё сябе пілую, усё думаю: ах, каб ты тады, Афім'я, спахапілася ў час, не кукавала б ты цяпер адна пад старасць. Кладуся і ўстаю ўсё з гэтым.

Ты калі ж гэта з дому паехаў? Да вайны яшчэ? У трыццаць восьмым? Ну, дык не памятаеш Сцёпу. Я яго ў трыццаць чацвёртым на бяду нарадзіла. Усе ў мяне дзеці былі добрыя, ні на якага не пакрыўджуся, а такога не было. Золата дзіця! Колькі яму — і дзевяці гадоў не было, як памёр,— а мы з дзеўкай не ведалі ні дроў, ні вады. Усё ён. За козлы стане — самога і не відно, толькі піла жыхае. А ці ў грыбы, ці ў ягады — не трэба загадваць, пасылаць, сам бяжыць. Вось гэта яго стараннасць і збіла мяне з панталыку. Я ўжо тады на яго вочы раскрыла, як ён крывёю захадзіў. Неяк раніцаю выйшла за хлеў — не ведаю, чаму гэта я тады дома да светлага ранку затрымалася, бо таксама і на работу і з работы ўсё ў прыцемку, дзяцей на тыдню ў вочы не бачыш — вось як мы ў вайну тут рабілі, а гэта не ведаю чаго — затрымалася. Гляджу — людцы мае, снег за хлявом, куды ўсе ходзім, увесь у крыві, і на бярвенні кроў памерзла.

Я ў хату:

— Хто цяпер бегаў за хлеў?

Маўчаць. І дзеўка маўчыць, і хлопец.

— Прызнавайцеся,— кажу,— бо нядобра ў вас. Да доктара трэба.

Тут Сцяпанка і прызнаўся мне: «Я, мама».

А я ўжо і сама здагадалася, што ён. Хлопец, ужо католу пору, з восені япчэ, благі з твару. Сходзіць дзень у школу, а тры ляжыць. А раз прыйшла дадому — па сена ездзіла.

— Мама,— кажа,— да мяне сёння птушачка прылятала. Я ляжу на лаве, а яна села на раму, ды дзюбкаю ў шыбу стук-стук і ўсё глядзіць, глядзіць мне ў вочы. Чаго ёй ад мяне трэба?

— Бо гэта яна змерзла, у цяпло прасілася. Бачыш, кажу, маразы якія — аж бярвенне трашчыць.

А птушачка, бачыш, незвычайная была — смертная. Папярэдзіць прылятала: рыхтуйся, маўляў, хутка па тваю душачку прылячу.

Але тады, як Сцёпа расказваў мне пра гэту птушачку, я нічога і не падумала нават: натамілася, уся змерзла — ці да птушачкі мне было? А вось калі я кроў за хлявом пры белым свеце ўбачыла, тут я і пра птушачку ўспомніла.

Пабегла да брыгадзіра.

— Так і так, кажу, Павел Ягоравіч, у мяне хлопец вельмі ж захварэў — дай каня ў раён да доктара з'ездзіць.

А брыгадзір, царства яму нябеснае — памятаеш, напэўна, Пахурожу,— паганы чалавек быў, за кожным словам мацюк.

— У лес, у лес, маць-перамаць!.. Каб праз гадзіну духу твайго тут не было!

— Не, кажу, Павел Ягоравіч, крычы — не крычы, а павязу хлопца ў бальніцу. Ты, кажу, такіх правоў, каб мяне затрымліваць, не маеш.

Павел Ягоравіч спачатку нагамі захадзіў, потым пачаў мяне вайною гнуць: «Я хіба гэту праклятую вайну выдумаў?» — а потым бачыць, што вайна не памагае — і бух мне ў ногі:

— Што ты, кажа, Афім'я, апамятайся! Хлопец твой як-небудзь тыдзень перабудзе, а мне, кажа, за тое, што конь у прастоі,— рэшка...

Я прыйшла дадому, плачу.

— Дзеці, кажу, што мне рабіць? Брыгадзір гоніць у лес...

А дзеці — што! Хіба можна такую справу вырашаць з дзецьмі?

— Едзь, мама. Трэба ж памагаць братам.

У той час у нас яшчэ ўсе былі жывыя: і Пеця, і Ваня, і Паша, і Ягор.

Ну, паехала. Як не паедзеш. Тады ж не проста так рабілі — не грошы ў лесе заграбалі, а лясную бойку з ворагам вялі. Так нам усім пра лесапарыхтоўкі тлумачылі — і дарослым і школьнікам. Цярпіце! Дапаможам нашым сынам і братам на фронце...

Ой, што толькі перажылі! Цяпер пачнеш успамінаць, дык не кожны і верыць. Як, кажуць, можна цэлую зіму пражыць і каб без хлеба? А мы ў тую зіму хлеба ў вочы не бачылі — усё да зернетка выграблі на вайну. Ды і бульбы было не ўдоваль. Хіба што толькі капуснага лісту хапала ўволю. Вось Сцёпа мой праз гэта капуснае лісце і захварэў і здароўе страціў.

На пакровы прыбягае са школы — якраз у гэту пару адліга наступіла, снег на полі скрозь вадою заліўся.

— Мама, кажа, людзі па калгасным капусніку лісце збіраюць. Нам, кажа, таксама трэба.

— Трэба, кажу, хлопец, ды маці твая не вылазіць з запрэжкі.

А вечарам прыходжу з работы — а ў мяне поўная хата капуснага лісту. Анька сядзіць пры лучыне — перамывае ў начоўках. А хто напасіў — пытацца не трэба — Сцёпа. Ляжыць на печы, а сам — зуб на зуб не пападае — гэтак вымерз. Сам ведаеш, як на асенпім капусніпічы па вадзе ды па гразішчы боўтацць. Ды яшчэ ў нашай абуўцы.

І вось жа які ў мяне тады розум быў. У лесе па два сухары на дзень давалі — радуюся. Клопат вялікі — я хоць Сцёпу крышку падтрымаю, можа, ён у мяне таму і чахне, што хлебны смак забыў... А вярнулася з лесу, а ён у мяне і зусім кепскі. Я сухары высыпала на стол: Сцёпачка, Сцёпка, еш, родпенькі! Колькі хочаш, еш... Хоць усе зараз.

А Сцёпа мой за сухар аберуч учапіўся, а разгрызці і сілы няма.

— Я, кажа, мама, другім разам.

Ну, а я каня нават і не заводзіла на канюшню. Судзіце, хоць на месцы расстраляйце — павязу хлапца ў бальніцу!

Ды не давезла... Адну вярсту не давезла... Спуск, не даязджаючы раёна, памятаеш? Высачэнная лістоўніца стаіць, камель абгарэлы. Ну дык вось каля гэтай лістоўніцы і скончылася Сцёпава жыццё.

Сцюжа была, мароз, я ўсе апраткі, якія былі ў хаце, на яго накідала, а тут, каля лістоўніцы, крышачку адхіліла.

— Сцёпа, кажу, да раёна пад'язджаем. Можа, хочаш паглядзець?

А ён сам мяне просіць: «Мама, скажы, калі будзем заязджаць у раён». Дзіця ж! Нідзе далей свае вёскі не быў — хацелася па белы свет паглядзець.

І вось Сцяпанка мой прыўзняў галоўку.

— Мама, кажа, як светла! Які раён у нас прыгожы.

Ды і ўсё — кончыўся. Так у мацеры на руках і адышоў.

Не ведаю, што б там са мною было, пэўна, ад слёз захлынулася б ці замерзла б зусім — гэтакі маразіна стаяў. Ды добра, што на маё шчасце ці на бяду Таіса Ціханаўна трапілася, старшыня нашага сельсавета... З раёна дадому дабіралася. Пехатою. Вось гэтак у тыя гады старшыні ездзілі. На сваіх дваіх. Коней па ўвесь калгас тры ці чатыры каңякі пакідалі, а ўсіх астатніх у лес, на ўсю зіму.

Ой, які чалавек была ў нас старшыніха. Бывала, нікому патураць не стане — калі там трэба ў лес ці на іншую работу. Сама гоніць. Але калі ўжо ў каго якое гора ці пахаронка — тут ужо яна заўсёды. Першая будзе галасіць. Бывала, так і казала: «Няма мне вам, бабы, чым памагчы, нічога цяпер у Савецкай улады няма, апроч слёз і жаласці». Ну, і галасіла, сябе не шкадуючы. А іншы раз, калі бачыць, што чалавека слязьмі ды шкадаваннем не прабяць, і накрычыць і палае. Мяне тады не адзін дзень муштравала.

— Колькі, кажа, ты будзеш галасіць? Сыны на фронце, можа, галодныя ды халодныя — дык ім што, слёзы твае памогуць? Не забывай, кажа, ты маці, ды і над табою маці ёсць таксама. Усім мацяркам маці.

Ох, Таіса, Таіса Ціханаўна... Колькі гадоў мінулася! Самой, пэўна, ужо гадоў дваццаць няма на свеце жывое. Неўзабаве пасля вайны скруціла яе, пэўна, па нашым горы сэрца надарвала... А я ўсё з ёю гаманю — начамі, угалас. Гаманю ды спрачаюся.

Ганна, дачка, прачнецца:

— Што ты, старая, здзічэла! Сказана табе: вайна Сцёпу з'ела.

— Можа, і не вайна, кажу. Над старэйшымі, кажу, маёй волі не было, а меншы ж каля мяне быў. Я недагледзела.

— Ды калі ж табе было даглядаць яго. Ты ж у лесе была.

— А што, кажу, здарылася б, калі б я на дзень ці на два пазней у лес паехала?

Ганне няма чаго сказаць, ды раніцой рана ўставаць трэба (па ферме працуе), дык яна як наробіць крыку:

— Ці дасі ты мне спакою? Калі гэта ў нас скончыцца?

Я сціхну — бяда проста, якія ўсе людзі парабіліся нервеныя, усё крыкам, усё горлам, а сама пра сябе думаю: ніколі не скончыцца. Да скону веку не скончыцца. Да таго часу, пакуль жывое мацярынскае сэрца.

# Васіль Бялоў

## НА РАДЗІМЕ

І вось зноў родныя мясціны сустрэлі мяне стрыманым шэптам альшэўніку. Забялелася луской гонтавых стрэх старая мая вёска, вось і хата з патрэсканымі вугламі. Па гэтых вуглах залазіў я некалі пад страху, неадольны ў сваім імкненні ў вышыню, глядзеў на сінія зубчастыя лясы і хаваў у адмысловых шчылінах дзіцячы рыштунак.

З гэтай сасновай крэпасці, з гэтых цудоўных варот пайшоў я некалі ў вялікі і грозны свет, даўшы наіўную клятву ніколі не варочацца, але чым далей і хутчэй я адыходзіў, мяне неадольна цягнула назад...

У старой нашай хаце забіты вокны і дзверы. Я пакідаю паклажу на ганку ў суседкі і іду ў сонечнае поле, успамінаючы мінулае. Якое смешнае маленства! Яно ўвайшло ў маё жыццё далёкай хісткай смугой, упрыгожыла будучыню яркімі рамантычнымі штрыхамі. У той дзень, калі я пайшоў з дому, так, як і сёння, трашчалі палявыя конікі, так, як і сёння, лянiва плыў нада мною каршун, і толькі сэрца было маладое і не верыла ў зваротны шлях.

І зноў вядзе мяне да лясных пагоркаў доўгая гібелая грэбля, і зноў я слухаю пошум летняга лесу. Зноў урачыста і мудра шуміць нада мною старасвецкі бор, і, здаецца, ён нават і не хоча глядзець на мяне. І над борам вісіць у густой сінечы сонца. І не сонца — Ярыла. Яно не шкадуючы, імгненна і без шуму сыпле ў купаты халодны мох сваe чырвонцы, а над мохам, як змораныя за пражай бабулі, дрэмлюць смалістыя елкі; яны, бывае, глуха шэпчуць, як бы бунтуючы супраць шчодрага сонца, а можа быць, незадаволены сваёй старасцю. Над елкамі — старасвецкі пах папараці. Я іду чорнай конскай сцежкай, не заўважаю нават, як на твар наліпае павучынне і з дзіцячым піскам таўкуць мак перада мной камары, хоць кусаюцца яны зусім не па-дзіцячы. Я гляджу на чырвоныя, у белых кропачках шапкі мухамораў, пасля бачу, як дзяцел, апёршыся на растапыраны хвост, дзяўбе сваім моцным носам сухое дрэва; на твары мне сцёбаюць галінкі крушыны, і вось я ўжо на сухім, і нага мая пакаўзнулася на сліз-

кім сасновым шыллі. У бронзавых соснах загудзеў сухаросны вецер, і сосны адгукнуліся ціхай жальбай, і мне здалося, што ў іх кронах цяжка ўздыхае велікан, які наіўна, як дзіця, збірае сваю сілу не сабе, а другім. Пад гэтыя лагодныя ўздыхі, нібы з мінулых вякоў, невыразнай белапарусная грамадай выплываюць воблачныя фрэгаты.

Мне здаецца, што я чую, як расце на палянках трава, я адчуваю кожную травінку, адразу сцягваю прапацелыя боты і босы бягу на рыжы пясчаны бераг, зноў стаю над ракой і кідаю лясныя шышкі ў сінюю густую ваду, у гэту халодную пасцель русалак, і гляджу, як разыходзяцца і паміраюць вадзяныя кругі. Мая ціхая радзіма, ты зноў не даеш мне старэць і лечыш маю душу сваёй зялёнай цішынёй! Але ці будзе канец цішыні!

Як хітрая ліса, махнула хвастом мая сцяжына і згубілася ў траве, а я выходжу не да маладых бяроз, а да белых казак маёй зямлі. Абмытыя ліпеньскімі дажджамі, бярозы сарамліва махаюць галінкамі, прыглушаючы двухнотны, невядома адкуль чутны голас зязюлькі: «Ук-ку, ук-ку!» — нібы дзьме хто коратка і рытмічна ў пустую бутэльку. І зноў чуваць пяшчотны бярозавы шэпт.

Я саджуся ля цёплага стога, куру і думаю, што вось адыдзе яшчэ не адно паўстагоддзе, і бярозы спатрэбяцца адным толькі песням, а песні таксама ж паміраюць, як і людзі. І я чую ў шэпце бяроз дакор спрадвечных сведак чалавечага гора і радасці. Спрадвеку радніліся з намі гэтыя дрэвы, адорвалі нашых дзядоў і прадзедаў скрыпучымі лапцямі і бяздымнай лучынай, пахнючымі венікамі, розгамі, палазамі, гучнымі берасцянымі пастуховымі трубамі і цяжкімі помслівымі дубінамі.

Я выходжу на зялёны прастор і гляджу туды, дзе яшчэ зусім нядаўна было гэтулькі вёсак, а цяпер адны белыя бярозы. Не, у тутэйшых мясцінах пажары не бываюць так часта, і гадоў пяцьсот ужо не было пашэсцяў. Можа быць, так яно і трэба. Знікаюць вёскі, а на змену ім нараджаюцца вясёлыя, шумлівыя гарады?.. Я абдымаю родную зямлю, чую цеплыню роднай травы і нада мною калышуцца купальніцы і люцікі.

Шумяць непадалёк сосны, шапочуць бярозы. І раптам гэты шум разрывае незразумелы свіст, расце і запаўняе ўвесь гэты ціхі зялёны свет. Я гляджу ў неба, але сярэбраны рэактыўны самалёт ужо знікае за гарызонтам.

Як мне зразумець, што гэта? Ці мае слёзы, ці, можа, выпала сярод дня скупая салёная раса?

## Эмануіл Казакевіч

# ПРЫЯЗДЖАЎ БАЦЬКА Ў ГОСЦІ ДА СЫНА

Іван Ермалаеў чакаў у госці свайго бацьку. У пісьме не гаварылася, калі дакладна і якім цягніком бацька прыедзе, і таму Іван непакоіўся і злаваўся на педантычную вясковую звычку паведамляць пра выезд паўслова, і пра здароўе суседзяў і далёкіх сваякоў, якіх Іван амаль забыў ужо,— на чатырох старонках са школьнага сшытка.

Дваццаць восем гадоў назад, пятнаццацігадовым хлапчуком, паехаў Іван з вёскі, ці, дакладней, быў прагнаны маладою мачахаю, якая, зусім як у казцы, неўзлюбіла пасынка. Далейшае жыццё яго таксама аказалася поўным чынам падобным на казку, цяжкую і няпростую ў сваёй штодзённасці, але ўсё роўна поўную цікавых здарэнняў і падзей, калі азірнуцца назад і акінуць вокам усё, што мінулася.

Мужчынкам-падлеткам, з выгаралымі валасамі, у лапцях і зрэбнай кашулі, прыйшоў ён у абласны горад Пензу, а адтуль завербаваўся на новабудоўлю ў Магнітагорск, горад, пра які гаварылася так, нібыта ён ужо быў, хоць на самай справе яго і не было яшчэ. Чорнарабочы, фабзаец, цясляр, муляр, Іван сярод дзесяткаў тысяч іншых будаваў завод сваімі рукамі, а завод, у сваю чаргу, таксама габляваў і плавіў яго самога, непрыкметна габляваў і плавіў на сваё падабенства. Так ціхі і безадказны сялянскі хлапчук ператварыўся ў вядомага чалавека, імя якога называлася нязменна пры ўсякім пераліку самых вядомых доменшчыкаў краіны з такою самаю непазбежнасцю, з якою, напрыклад, Лермантаў называецца пры кожным пераліку выдатных рускіх паэтаў; заўсёды галодны падлетак, які жыў самымі незвычайнымі ўяўленнямі пра свет і людзей і якога кідала ў пот ад страху перад старэйшымі, ператварыўся ў спакойнага, упэўненага ў сабе чалавека, бацьку вялікай сям'і, кніжніка, які пры выпадку любіў і артыкульчык напісаць у газету; безадказны жыхар самых халодных куткоў у будаўнічых бараках стаў уладаль-

нікам чатырохпакаёвага дома з садам у новым горадзе на беразе Урала, дэпутатам гарсавета, членам у розных камісіях — словам, адным з тых, што маглі б звацца ганаровымі грамадзянамі Магнітагорска.

Натуральна, што Іван любіў Магнітагорск стоенай, але моцнаю, глыбокаю любоўю. Горад быў для яго не проста месцам жыхарства, як старыя гарады для сваіх жыхароў — адзін не змог бы жыць без другога: калі б не горад, Іван не стаў бы Іванам, калі б не Іван, горад не стаў бы горадам. Бацькоўская і сыноўняя любоў адначасова — вельмі рэдкае пачуццё; такім пачуццём да Магнітагорска і жыў Іван.

Дадому ён не пісаў — не так ад крыўды, як ад цяжкага і несумненнага разумення абыякавасці да яго тамашніх сямейнікаў. Ён толькі час ад часу пасылаў ім то пяцьдзесят, то сто рублёў, а калі стаў цвёрдаю нагою каля доменнае печы спачатку трэцім, потым другім, а нарэшце і старшым гарнавым, пачаў пасылаць па дзвесце рублёў штомесяца. У адказ ён часам атрымліваў кароткую пісульку, што грошы атрыманы, і з паклонамі ад суседзяў і невядомае радні. Іванава жонка, Любоў Ігнатаўна, пасылала гэтыя грошы без асаблівай ахвоты: кожны раз у канцы месяца ёй здавалася, што не хапае менавіта гэтых дзвюх соцень. І калі аднойчы яна паспрабавала пачакаць з адпраўкаю грошай, то атрымала ад звычайна пакладзістага і спакойнага Івана такога нагаяю, што з таго выпадку выконвала гэты абавязак вельмі дакладна і акуратна.

Справа ў тым, што ўсе гэтыя гады ў Івана жыў заўсёды не надта моцны, але шчымлівы ціхі боль пры ўспаміне пра родную вёску. Боль гэты з цягам часу паступова слабеў і ўсё радзей і радзей абзываўся; калі ж прыйшла вестка, што прыедзе бацька, ён як бы абнавіўся з новаю сілаю, толькі паступова перайначваючыся ў сваю супрацьлегласць — у стрыманае захапленне чалавека, які зноў вяртае сабе нешта страчанае і ўсё яшчэ дарагое.

Гэты тыдзень Іван працаваў з васьмі раніцы і таму мог паспець да маскоўскага цягніка, які прыходзіў на світанні. У фіялетавым прыцемку выводзіў ён сваю «Пабеду» і ехаў на станцыю.

Чым бліжэй паволі пад'язджала да ракі адзінокая «Пабеда», распырскваючы па дарозе цёмныя веснавыя лужыны, тым усё больш і больш завалодвала небам ранішняя зара — зара не гарадская, а хутчэй вольная, шырокая стэпавая зара, якая не адрозніла яшчэ, што ўнізе пад

ёю не стэп, а горад. Шматлікія дагледжаныя дамы і вуліцы яшчэ не прыжыліся на сваіх месцах: кожнаму дому і кожнай вуліцы здавалася нібыта, што яны з краю, што адразу за імі — канец горада, пустая прастора; так яно і было зусім нядаўна.

Вакол святлела, і фіялетавы світанак нябачна ўзнімаўся і кудысьці знікаў. Гэта было падобна па тое, быццам не вельмі імкліва надымалі велізарную лёгкую фіялетавую заслону, за якою ўзнікала мякка асветленая цёплым жоўтым святлом шырачэзная, яшчэ пустая сцяна, на якой неўзабаве адбудуцца важныя падзеі.

І вось нарэшце самая галоўная падзея адбываецца: як толькі машына пад'язджае да ракі, перад Іванавым позіркам узнікае завод на тым беразе. Здаецца, што гэта — вялізная бурлівая вулканічная прастора, спехам прыкрытая мураванымі сценамі, бляшанымі дахамі і тоўстым шклом, затычкамі з вогнетрывалага металу, з адводамі — шматлікімі трубамі, скрозь якія вулкан мае магчымасць хоць часткова выдыхнуць лішак сваёй лютасці; з гэтых труб належыць полымя і дым самых разнастайных колераў і адцепняў; вось з адхону абрынуўся распалены шлак, і вогненны струмень яго, сцякаючы ўніз, нагадвае абрысы чалавека з раскінутымі рукамі.

У параўнанні з магутным палыханнем заводскага вулкана магутныя электрычныя лямпы ў вокнах, на слупах і каля прахадных здаюцца бляклымі і мёртвымі, як свечкі ў параўнанні з ляспым пажарам.

Іван радасна ўсміхаўся. Ён не пераставаў цешыцца сваім заводам, дзе працаваў ужо чвэрць века, як дзеці стрэлачнікаў не стамляюцца махаць рукамі цягнікам, якія імчаць паўз іх кожны божы дзень.

Уздоўж завадское сцяны, а потым вуліцамі старога горада па левабярэжжы ехаў Іван да вакзала. Перад вакзалам ён выключаў матор, замыкаў машыну, а сам ішоў да выхаду на перон і тут доўга, да канца, пакуль не раз'язджаліся ўсе пасажыры, стаяў, углядаючыся ў кожнага з прыезджых, нават маладых людзей: яму было цяжка ўявіць сабе бацьку праз дваццаць восем гадоў, і ён на ўсякі выпадак дапытліва, з заміраннем сэрца зазіраў пад усе капелюшы і шапкі.

Бацькі ўсё не было. І каторы раз Івану даводзілася садзіцца ў машыну і вяртацца дадому аднаму. Напружанае чаканне, спадзяванне, што ён вось-вось убачыць бацьку, не праходзілі так сабе. Едучы назад, ён неадступна

ўспамінаў сваё дзяцінства ў роднай вёсцы. І зноў ныў у яго сэрцы даўно зарубцаваны душэўны боль маленькага хлапчаняці ў вялікіх лапцях, якога паволі і настойліва выжывала з бацькавае хаты прыгожая дурная баба. Амаль з ранейшым пачуццём адчаю і тупога фаталізму ўспамінаў ён цяжкія бацькавы ўздыхі, калі не было жонкі, і яго прыніжанае маўчанне пры ёй. Перад яго затуманеным позіркам узнікалі зноў і зноў малюнкі дзяцінства, шырокія, мяккія, падобныя на конскія, бацькавы губы, калі бацька сёрбаў поліўку, маўкліва слухаючы, як мачаха дакарае яго дачку, без дай прычыны чапляецца да сына, крычыць яму ў твар: «Дурны! Іванка дурны!» — грукае ў качарэжніку вілкамі, палыхае жарам; ён успамінаў, як прачынаўся на досвітку ад крэхту і стогнаў на палацях і бачыў у змроку тоўстыя белыя, як смятана, мачашыны і худыя, як драўляныя, бацькавы ногі і, разумеючы, што праз гэта ўсё мачаха забрала ўладу ў хаце, пакутліва думаў, як усё гэта страшна і незразумела. Ён бачыў, нібыта ў сапраўднасці, спрацівелую, але да слёз любую нізкую хату на краі вёсачкі, каля самае рэчкі Вароны, і душа яго, уся ва ўладзе ўспамінаў, зноў як быццам адчувала даўнюю любоў да гэтае хаты і гэтае вёсачкі —напраўдзе, нават не любоў, а пачуццё глыбокае ўпэўненасці, што толькі ў гэтым куточку здолеў жыць на свеце Іван Ермалаеў.

Але вось ён пераязджаў мост у новы горад, ужо гаманкі і ажыўлены, поўны людзей і сонца. Ён нетаропка ехаў шырокімі вуліцамі, забудаванымі вялікімі дамамі, плошчамі, дзе ўсё ўражвала чысцінёю, навізною і прастораю, дзе ў адрозненне ад старога горада на другім беразе не адчувалася блізкіх завадскіх будынкаў, тут ранішняе паветра было чыстае і свежае, а маладая завязь на дрэвах ярка зелянела. Нарэшце ён пад'язджаў да сваіго дома і заганяў машыну на месца. І тут успаміны адступаліся ад яго. Ён пячутна адмыкаў дзверы, ставіў чайнік на плітку, пераадзяваўся ў рабочае. Дома яшчэ ўсе спалі, толькі кот з ляпотаю ацірауся каля ножкі стала. Неўзабаве, пачуўшы шорах у сталоўцы, выходзіла са спальні ў халаце і пантофлях ружовая, заспаная Любоў Ігнатаўна. Яе хада ціха і дамавіта чулася то тут, то там. Гукі ў хаце рабіліся паступова ўсё болей складаныя і разнастайныя: рып дзвярэй, драбнюткая хада цешчы Дар'і Аляксееўны, усхліп чайніка, што закіпаў на плітцы, стук высокіх абцасаў старэйшае дачкі Марыны, студэнткі горна-металургічнага інстытута, гучнае вясёлае пазяханне сына Пеці, вучня

дзевятага класа, потым яго свіст, парэшце, валтузня і пранізлівы заклік з крайняга пакоя злева: «Мама!» — шлёпалі босыя ногі, булькаў струменьчык у начнічок — гэта прачыналіся трое малодшых.

Пакуль Іван піў чай, паўз яго то паволі праходзіў, то праносіўся віхрам хто-небудзь з сямейнікаў, але Іван, як звычайна ў ранішнія часы, не звяртаў на іх ніякае ўвагі, цалкам як бы ігнаруючы іх існаванне. А яны, у сваю чаргу, таксама як быццам не заўважалі яго, такая была даўняя завядзёнка. Ён нібыта ўжо быў не тут, а на заводзе, каля доменнае печы, і пачынаў ужо далучацца да таемнасці металу і агню, і ў сям'і ўсе разумелі гэта, і, не накідаючы, вядома, свайго штодзённага запятку, паважліва маўчалі і хадзілі як найцішэй, ледзь толькі траплялі яму на вока.

З тыдзень ездзіў Іван сустракаць на станцыю свайго старога, але так і не стрэў яго, а з'явіўся бацька зусім нечакана і будзённа, і не рана, а недзе гадзін так у дзесяць. Проста пастукаў у дзверы і адчыніў іх невысокі дзядок з невялічкаю шэраю бародкаю, з невялікім клуначкам у руцэ. Зайшоў, папытаўся, ці тут жыве Іван Ермалаеў, а даведаўшыся, што тут, сеў на крэсла і пачаў позіркам мераць пакой, як, скажам, маляр ці майстар-абойшчык, прыкідваючы аб'ём маючай быць работы. Дар'і Аляксееўне і ў галаву нават не прыйшло, што гэта і ёсць доўгачаканы госць, і яна сказала яму, што гаспадыня хутка прыйдзе, а сама рабіла сваю работу.

Радыёпрыёмнік гаварыў бадзёрым галаском — галаском «спецыяльна для дзяцей». Дзеці ж былі на дварэ. Любоў Ігнатаўна пайшла ў магазін. Пеця — у школу. Марына збіралася ў інстытут — яе чакаў каля веснічак сын сталяра Піменава, студэнт-аднакурснік, а можа, і жаніх. Сам жа Іван, які пядаўна вярнуўся з начное змены, адсыпаўся, і яго роўны храп даносіўся са спальні ў тыя імгненні, калі роблена бадзёры голас з радыёпрыёмніка рабіў паўзу.

Дар'я Аляксееўна, маленькая бабулька ў акулярах, скончыла, нарэшце, усе свае ранішнія хатнія справы і села на канапу з кніжкаю: яна была заядлая чытачка. Яна чытала гучным шэптам амаль уголас. Падняўшы праз нейкі час вочы, яна ўбачыла дзядка на тым самым месцы і падумала, што Любе, калі яна дамовілася са страхаром, трэба было б ужо і быць дома. Клуначак старога Дар'я Аляксееўна палічыла за торбу з інструментамі.

Як гэта неадпойчы здаралася ў гісторыі, усё вырашыла дзіця. Шасцігадовы Федзя Ермалаеў, прыбегшы з двара па нейкую патрэбную яму рэч, убачыўшы старога, што задрамаў ужо на крэсле, спытаўся з дзіцячай адкрытасцю:

— Дзядуля, а чаго ты тут сядзіш?

Стары памыляў мяккімі губамі, патузаў шэрую бародку, уважліва паглядзеў на хлапчаня і, непрыязна скасіўшы вочы на бабульку ў акулярах і на кнігу, адказаў:

— У госці да вас, мілок, прыехаў. У госці. Ты б пашукаў мне свайго тату...

Федзя кіўнуў лабастаю галавою, але паколькі тата спаў і будзіць яго забаранялася, хлапчук накіраваўся зноў да выхадных дзвярэй; аднак спалучэнне слоў «дзядуля» і «ў госці» здалося Федзю даволі важным, бо за апошнія дні ў сям'і яно вымаўлялася бясконца. Таму ён, на ўсякі выпадак, падышоў да бабулі, матнуў галавою у бок старога, сказаў:

— Дзядуля ў госці прыехаў.

І толькі тады зноў пабег на двор.

Словы гэтыя не адразу дайшлі да Дар'і Аляксееўны, а калі дайшлі, яна разгублена зірнула на дзверы, за якімі знік Федзя, потым на дзядка, які зноў нібыта задрамаў, упусціла з рук кнігу і кінулася да госця:

— Божачка! Вы... Ці не Цімафей Васільевіч вы?

Узнялася мітусня. З двара збегліся дзеці з суседнімі дзецьмі. Міця пабег па маці ў магазін. Федзя кінуўся ўслед па Марыну і вярнуў яе, гэта расчаравала і засмуціла Віцю Піменава. Раскатурхалі Івана.

Іван выбег у сталовую босы, моцна прыціснуў бацьку да грудзей, скінуў з яго шэрую ватоўку, сцягнуў з ног боты і даў свае мяккія хатнія пантофлі, памог цешчы хутчэй сабраць на стол і расчулена ўсё глядзеў, як бацька жуе мяккімі губамі і ціхавата пасміхаецца.

Цімафей Васільевіч амаль і не змяніўся, толькі барада і валасы яго болей пашарэлі, і сам ён увесь пашарэў, страціўшы той цагляны колер твару і шыі, які так добра запомніўся Івану яшчэ з дзяцінства. Апрача таго, ён як бы набыў важнасць, пазбавіўшыся мітуслівасці, уласцівай яму некалі ў даўнія часы.

Сына, вядома, ён не пазнаў; ён з цікавасцю пазіраў на Івана, намагаючыся знайсці тыя рысы падабенства, якія раднілі яго з колішнім хлапчуком Ванем і, не знаходзячы гэтых рысаў, няпэўна паўтарыў:

— Ну, вось і стрэліся, і дзякуй богу...

Іван непакоіўся, што бацька будзе ўспамінаць пра даўняе, прасіць прабачэння, каяцца, але стары пра мінулае не абазваўся ні адным словам, спаважна перадаў паклон ад свае жонкі і дзяцей ад другое свае жаніцьбы, а таксама ад Ваневай сястры, якая пакалечылася яшчэ ў дзяцінстве, замуж не пайшла і так і засталася жыць пры бацьку. На Іванава запытанне, якія навіны ў вёсцы, Цімафей Васільевіч адказаў, што ў вёсцы ніякіх змен не адбылося, усё па-ранейшаму. Іван засмяяўся.

— Ну, як жа не адбылося? У вас жа калгас цяпер?

Стары адказаў абыякава:

— А? Ну але, калгас... А ты хіба да калгаса яшчэ паехаў? Ага, да калгаса...

— А ты кім у калгасе робіш? — спытаўся Іван.

— Я? А чаго я там не бачыў? — насупіўшыся, адказаў стары.

— А як жа? — здзівіўся Іван.

— А так. Жывём пакрысе,— няпэўна адказаў Цімафей Васільевіч, але адразу, скоса зірнуўшы на Івана, паспешліва дадаў: — Хваліцца няма чым...

У гэты час, засопшыся, вярнулася Любоў Ігнатаўна. Знаёмячыся з ёю, стары задаволена ківаў: Іванава жонка аказалася рослаю мажною кабетаю, ружовашчокаю, з блакітнымі вачыма. Старому падабаліся рослыя, у целе жанкі. Пахваліў ён таксама і кватэру Іванаву; праўда, не разумеў, навошта ванна: аказалася, на здзіўленне дзецям, у жыцці сваім ён ніколі не бачыў ванны. Аднак ацаніў яе стары даволі хутка. Вымыўшыся і пераадзеўшыся ў Іванаву бялізну, ён сеў на крэсла каля акна ў сталовай, чысценькі, маўклівенькі, і на гэтым крэсле сядзеў увесь час, а ўся сям'я, радасна ўзбуджаная, вярцелася вакол яго, як спадарожнікі вакол планеты.

Неўзабаве з кухні данесліся складаныя і прыемныя пахі святочнае начосткі, якая рыхтавалася да вячэрняй падзеі ў гонар прыезду Цімафея Васільевіча. Малодшыя дзеці — Вера, Міця і Федзя — не адыходзілі ад дзеда ні на крок, глядзелі на яго маўкліва і чакалі ўсё, што ён паклiча іх, пагаворыць з імі. Але ён не звяртаў на іх ніякае ўвагі. Толькі калі ўпершыню з'явіўся старэйшы, дзевяцікласнік Пеця, стары раптам зацікавіўся ім і не мог усе дзець на месцы: надта ж тоіі падобны быў на хлопчыка Ваню, толькі што не ў лапцях і замест зрэбнага ў гарадскім клятчастым пінжачку з гальштукам і ў вузкіх штанах.

Пакуль усё гэта адбывалася дома, Іван паехаў на за-

вод запрашаць у госці сяброў, якія працавалі на дзённай змене. Потым ён аб'ехаў тых сваіх таварышаў, хто сёння працаваў уночы. І, нарэшце, вярнуўся дадому і вясёлы і давольны, з цэлаю скрынкаю гарэлкі і шампанскага на заднім сядзенні ў машыне.

Гасцей сабралася поўная хата. Тут былі майстры доменных печаў, пераважна пажылыя людзі, і сярод іх праслаўлены Ульянаў з прыгожаю жонкаю-верціхвосткаю. Быў і яшчэ больш праслаўлены Ганчарэнка, пенсіянер ужо, вусаты, як запарожац,— адзін з апошніх супрацоўнікаў Свіцына, ён памятаў яшчэ самога Кураку на Краматорскім заводзе. З ім разам прыйшлі жонка, сівая, спаважная, як прафесарыха, і сын-палкоўнік з маладою жонкаю — гэтыя прыехалі на адпачынак. Былі тут гарнавыя з Іванавай печы з жонкамі, людзі маладыя і сціплыя, быў інжынер Каламейцаў — новае свяціла доменнай вытворчасці — і яго жонка нарсуддзя Лідзія Іванаўна Каламейцава, інструктар гаркома партыі, колішні доменшчык Лёня Башмакоў і сталявар Піменаў з жонкаю і сынам.

Да Марыны ў гэты час прыйшлі дзве яе сяброўкі, каб разам рыхтавацца да заліку, але з такое нагоды іх таксама пасадзілі за стол, і яны сядзелі ўтраіх з краю, розумам сваім імкнучыся ў суседні пакой, да падручнікаў і канспектаў, а нікчэмнымі пяццю пачуццямі ахвотна астаючыся тут, за раскошным сталом, пад вабнымі позіркамі мужчын і кіслымі — трыццацігадовых маладзіц, сярод хмельнае атмасферы весялосці, якая толькі набірала разгон. Да Марыны падсеў Віця Піменаў: ён не еў і не піў, а толькі ўвесь час глядзеў на Марыну, нібы бачыў яе першы раз.

Стол быў прыгожы і багаты. Тут красаваліся розныя кілбасы, студзень, самыя разнастайныя кансервы ў бляшанках, але пастаўленых на фарфоравыя талерачкі, халодныя блакітнаватыя з магазіна куры, селядцы, рыба заліўная і ўжо прыморшчаныя — ішоў май месяц,— але ўсё яшчэ смачныя гуркі і мочаныя яблыкі.

Ды ўсё ж вяршыняю над усім былі пельмені — знакамітыя на ўсю Расію, не тыя, што з магазіна, абы-якія, у пудных кардонных каробках, а самаробныя ўральскія, выштукаваныя з адмысловае ялавічыны, бараніны і свініны, пельмені чатырох гатункаў — вялізныя, як пірагі, і маленечкія, як дзіцячыя вушкі, такія, дзе ўся хітрасць у цесце, дзе яно — як паветранае, і духмянае і, здаецца, растае ў роце, а мяса — як быццам толькі да яго прыправа. У другіх — уся смаката ў мясе, у дакладнасці яго пра-

порцый, у яго незвычайнай сакавітасці (не разяўляй рота, бо так і пырсне), а цеста толькі так, футлярчык, толькі плевачка для боскага зместу.

Дар'я Аляксееўна, Любоў Ігнатаўна і Марына, разгарачаныя, ружовыя, сур'ёзныя, вельмі падобныя адна на адну, але і вельмі розныя (самі накшталт тых пельменяў розных гатункаў) пачалі падаваць пельмені з пылу з жару, міску за міскаю; і як толькі міскі пусцелі — а гэта адбывалася вельмі хутка,— адразу неслі новыя міскі і не прысядалі, пакуль самыя ненасытныя госці не адвальваліся да спінак крэслаў у шчаслівай знямозе.

Падаючы, Любоў Ігнатаўна і Дар'я Аляксееўна асаблівую ўвагу аддавалі Цімафею Васільевічу, і яны шапталі яму — то адна, то другая — у вялікае сівае вуха пра смакату гэтых ці тых пельменяў і наперабой падсоўвалі да яго перац, смятану, кету, топленае масла і воцат у вялікім фужэры.

За здароўе прыезджага госця пілі бясконца. Тосты за яго паднялі стары Ганчарэнка, Каламейцаў, Башмакоў, Ульянаў і малодшы Ганчарэнка, палкоўнік. Гэты вітаў яго ад асобы ледзь не ўсіх узброеных сіл, што, дарэчы, рассмяшыла аднаго толькі Лёню Башмакова: дакладчык і лектар, ён добра ведаў цану розным перавелічэнням.

Стары Ганчарэнка дзякаваў Цімафею Васільевічу за сына, які з'яўляецца, як сказаў ён па-старамоднаму, «упрыгожаннем айчыннай металургіі». Гарнавыя вырашылі падкінуць на «ўра» бацьку свайго старшога, і ён на іх магутных руках лёгенька падскокваў пад самую люстру, пазіраючы з апаскай на шматлікія шкляныя падвескі.

Пасля вячэры стол засунулі ў куток, крэслы расставілі ўздоўж сцен. І ў жанчын разгарэліся вочы. Зайграў патэфон. Пачаліся танцы. Толькі Дар'я Аляксееўна, згаладалая, як воўк, прыткнулася да стала і села есці ўжо халодныя пельмені, умудраючыся адначасова, нягледзячы на гармідар, заглядваць у кніжку.

Пакой быў не надта каб вялікі, танцавалі, тоўпячыся, як у амерыканскім бары, але гэта не толькі нікому не перашкаджала, але наадварот, яшчэ больш усіх весяліла. Не абыходзілася без жартачак тых, хто танцаваў з чужымі жонкамі, да гаспадароў, якія не танцавалі, а таксама без жартаў стрэчных, абмену на хаду досціпамі, флірту «нарокам» і «напраўду». Панавала вольная інтымная, але не загульная весялосць, якая бывае ў кампаніях, што святкуюць заўсёды разам, дзе ўсе адзін да аднаго прывык-

лі, кожны ведае недахопы іншага лепш за свае, усе звязаны шматгадовым сяброўствам і ўзаемнай сімпатыяй, якія, аднак, не выключаюць, завочных, праўда, маленькіх плётак і даволі злосных укольчыкаў з выпадку чужых прамашак.

Чалавека чужога, які трапіў у такое асяроддзе выпадкова, вельмі лёгка могуць збіць з панталыку намёкі на невядомыя яму падзеі, уласныя, толькі гэтаму колу людзей прыналежныя слоўкі і прозвішчы і нейкі ўмоўны, звязаны з агульнай вытворчасцю і супольным адпачынкам жаргон, які зразумелы толькі тут і нідзе болей на свеце.

Танцавалі доўга і самааддана. Як звычайна, галоўная тут была Любоў Ігнатаўна. На твары яе адбівалася тая падкрэсленая абыякавасць, якая была адзнакай асаблівага шыку магнітагорскіх замужніх жанчын; яна быццам была прызвана сведчыць цнатлівасць іх намераў і тое, што для іх галоўнае ў танцы — зусім не партнёр, не мужчына, а танец сам па сабе, што гэта проста мастацкае захапленне — і нічога больш. Хоць Любоў Ігнатаўна танцавала, па першы погляд, і стрымана, няспешна, нават як быццам незацікаўлена, але яе плаўнае кружэнне мела куды больш небяспечнай перавагі і сілы, чым бадзёры галоп іншых танцорак, і сапраўды яна пераганцавала ўсіх. Калі астатнія, ушчэнт змогшыся, сядзелі ўжо ўразвалку на крэслах і канапе, толькі яна, ды яшчэ какетлівая Кацярына Сцяпанаўна Ульянава ды прыезджая маладая жонка палкоўніка Ганчарэнкі яшчэ былі на нагах. Потым і прыезджая ў знямозе звалілася на канапу, проста на рукі свайму мужу. Тут змянілі пласцінку, і гармонік зайграў «рускага». Любоў Ігнатаўна і Кацярына Сцяпанаўна спыніліся як укапаныя, вочы іх зрабіліся хітрыя-хітрыя, і яны пусціліся ў скокі.

Але мужчыны ўсё яшчэ ніяк не здольныя былі «адпавядаць». Толькі часам зрэдку, узбадзёраныя асабліва хвацкім пераборам гармоніка ці ўжо занадта адважным калепцам і настойлівым выклікам адной з дзвюх няўтомных танцорак, хто-небудзь з мужчын рабіў праходачку па пакоі з перастукам абцасаў ці нібыта ў адчаі кідаўся на паўхвіліны ўпрысядку з такім напружаным тварам, нібыта прыслухоўваўся, ці не пачуецца ў адказ стуку знізу, з-пад падлогі, ці нават з супроцьлеглага боку Зямлі, і, не атрымаўшы адказу, ён расчараваны і ніякавата зноў рассаджваўся на канапе, а на змену яму выскокваў хто-небудзь іншы.

Потым зноў змянілі пласцінку, але Кацярына Сцяпанаўна больш ужо не здолела, і толькі адна Любоў Ігнатаўна, ганаровая свайй перамогай над суперніцай, зноў замерла, зрабіла млявыя вочы і пайшла, закружылася па крузе плаўнай паходкай дзяўчыны з аула. За ёю кідаўся хто-небудзь з мужчын і, сціснуўшы між зубоў лязо сталовага нажа, ішоў за ёю, як прывязаны, і лезгінка нечакана выклікала агульны смех, калі яе высякаў гарэзлівы русак з кірпатым носам і скуластым слабабародым тварам.

Паступова і людзі і ўвесь пакой — усё разам набыло той самы выгляд, як і стол пасля вячэры, калі ўся нарыхтаваная пачостка дарэшты страціла сваю першапачатковую шыкоўнасць і хараство: усе салаты разбураны і перамешаны, піражкі ўсе надкусаны, усе талеркі перамазаныя — і ўсё перамешана. Карацей кажучы, пачалася тая церасналосіца разумнай гаворкі і несусветнай лухты, галасных спеваў і беспрычыннага смеху, тая надпітая дабрадушная бяссэнсіца, якая заўсёды з'яўляецца найвышэйшай кропкай кожнага вялікага застолля.

У гэтых абставінах адна толькі Дар'я Аляксееўна непахісна заставалася на варце. Яна паклала спаць дзяцей. Яна ціхенька адправіла Марыну і яе таварышак у другі пакой рыхтавацца (Віця Піменаў непрыкметна вышмыгнуў услед за імі). Яна пачала выносіць рэшткі вячэры, каб сервіраваць чай, пры гэтым не забыўшы — добрая руская душа! — пакінуць на стале недапітыя бутэлькі.

Яшчэ адзін чалавек, апрача Дар'і Аляксееўны, быў цвярозы, як шкельца,— гэта сам гаспадар Іван Ермаласаў.

Іван сёння амаль не піў, не быў, як звычайна, завадатарам агульнай весялосці, не скакаў на пару з Любоўю Ігнатаўнай «рускага» і з арлінай пільнасцю не сачыў за пустымі чаркамі і талеркамі ў гасцей. Сёння ён быў ціхі і цвярозы, маўклівы і ласкава пазіраў на ўсіх, асабліва на сваіх хатніх. І выгляд у яго быў больш стрыманы, чым звычайна, у новым, яшчэ сёння толькі абноўленым выдатным чорным гарнітуры «з выпрацоўкай». Гэты новы гарнітур, пра які гаварылася ўжо даўно, зрабіў на ўсіх выключнае ўражанне, і асабліва на модніцу Кацярыну Сцяпанаўну; яна звярнула агульную ўвагу на тое, як чорнае да твару Івану, светламу бландзіну, які ён у чорным пагляднны і элегантны, і глядзела на Івана яшчэ прыхільней, чым звычайна. Спадабаўся гарнітур і Цімафею Васільевічу, той, намацаўшы крам, нават прыцмокнуў.

Ад бацькі Іван не адыходзіў ні на крок, часам абды-

маў яго адной рукою за плечы і звяртаў яго ўвагу на чыйнебудзь жарт ці смешную якую байку і перад тым, як самому смяяцца з гэтага жарту ці байкі, глядзеў запытальна на бацьку: ці зразумеў ён — і сам пачынаў смяяцца не раней, як пачынаў усміхацца бацька, улавіўшы соль жарту. Зрэдку Іван уставаў і, крануўшыся бацькавага плечука — маўляў, я ненадоўга,— пакідаў сталовую: проста так, ад стомленасці цвярозага сярод добра надпітых людзей. У суседнім пакоі Марына і яе таварышкі рыхтаваліся да заліку. Віця Піменаў, які здаў залік раней, сядзеў на падаконніку і глядзеў на Марыну, адрываючыся ад гэтага занятку толькі тады, калі трэба было растлумачыць незразумелае месца ў падручніку,— ён быў выдатнік і вылучаўся сваімі здольнасцямі, і было дзіўна і крапальна, як ён у адно імгненне, з тым самым зачараваным выразам пераключаўся з кахання на металазнаўства.

Пасміхаючыся сам сабе, пакідаў Іван гэты пакой і пераходзіў у другі, дзе на шырокім ложку спалі ўсе трое маленькіх. Гукі вальсаў і тупат ног сюды амаль не даносіліся. Іван стаяў і пазіраў на дзяцей, слаба асветленых святлом маленькага начніка, і сам сабе прысягаў, што ніколі не пойдзе ад іх, не пакіне сям'ю, не пакіне іх без бацькі; гады чатыры таму назад ён быў так заварожаны адной доктаркай з завадской паліклінікі, што нейкі час гатовы быў нават парваць з сям'ёю.

Стоячы ля сонных дзяцей, Іван адчуваў, як завалодвала міжволі ім дзіўная душэўная слабасць, прыемная і адначасова такая балючая.

Ён пастаяў, пакуль гэта дзіўнае адчуванне не ўлеглася, і вярнуўся ў сталовую. Тут ужо націшэла. Аматары спеваў на нейкі час адолелі аматараў танцаў. Суддзя, Лідзія Іванаўна Каламейцава, была галоўнай спявачкай. Голас у яе быў нізкі, цыганскі, і песні яе былі гэтакія ж гуллівыя або з надрывам. Гуллівыя яна спявала сур'ёзна, а надрыўныя — смяшліва і, напэўна, гэтак і трэба было спяваць. Усе сцішыліся, нават танцоры. Разумная Лідзія Іванаўна, аднак, нядоўга спявала адна, неўзабаве завяла агульнавядомую харавую, і ўсе галасы радасна падхапілі, заспявала нават Дар'я Аляксееўна, толькі інжынер Каламейцаў чарціў нешта на паперы старэйшаму Ганчарэнку, націху раячыся са старым доменшчыкам з выпадку нейкай «рацыяналізатарскай прапановы».

Пасля госці селі піць чай з розным печывам. Толькі Ульянаў і Башмакоў не пажадалі, як яны сказалі, «ра-

біць ярша» — мяшаць гарэлку з чаем — і пілі гарэлку. Кацярына Сцяпанаўна, прыхільна пасміхаючыся і жартуючы з палкоўнікам, нездаволена касілася на мужа, калі ён зноў наліваў сабе чарку, і яе жывыя карыя вочкі то міргалі мяккім масляным бляскам, то злосна паблісквалі ў бок мужа.

Цімафей Васільевіч сядзеў у куточку, да ўсіх прыглядаўся, больш слухаў, чым гаварыў, спаважна пагладжваючы шматок сівай барады. Майстар Ульянаў зусім пасябраваў з бацькам свайго старшага гарнавога, якога ён аддана любіў, і на добрым падпітку час ад часу лез да яго з абдымкамі, запрашаў у госці і сентыментальна ўздыхаў, успамінаючы арлоўскую вёску, якую пакінуў дзіцем яшчэ гадоў сорак назад.

Людзей паступова ўсё меншала. Першыя — яшчэ да поўначы — непрыкметна пайшлі гарнавыя з Іванавае змены. Яны амаль і не пілі нічога, таму што ў дванаццаць павінны былі заступаць. Івана ж, у сувязі з сямейнай урачыстасцю, начальнік цэха замяніў другім старшым гарнавым.

Астатнія госці пачалі разыходзіцца недзе пасля дзвюх ужо ночы. У тры ўсё сціхла. Пакуль Любоў Ігнатаўна і Дар'я Аляксееўна, пазяхаючы на ўвесь рот, прыбіралі посуд, падмяталі падлогу і слалі пасцелі, стары, якому зусім не хацелася спаць, пачаў распытваць у сына пра гасцей (хто яны, якія займаюць пасады, колькі атрымліваюць жалавання), асцярожна кранацца жаночай схільнасці да танцаў «абы з кім», меркаваць, ці не лепей аддаць Марыну замуж за другога сына Ганчарэнкі (яго ў гасцях не было, але стары доменшчык выхваляўся ім Цімафею Васільевічу), чым за гэтага яе жанішка: бацька ў жанішка надта маўчун, відаць, скупы, ды і свайго жытла не маюць, займаюць кватэру ў вялікім казённым доме. Іван пасмейваўся, адказваючы на бацькавы пытанні і пякрыўдна адводзячы яго меркаванні, адначасова ціха радуючыся таму, што ў яго ёсць родны бацька, шчыра і сапраўды заклапочаны яго справамі. А бацька глядзеў на доўгі, прыбраны ўжо стол, але яшчэ засланы ружовым абрусам, успамінаў вечар з гасцямі і гаварыў у роздуме:

— Добра жывеш...

Пазней, калі ўжо ўсе палеглі і паснулі, Іван выйшаў на ганак і пастаяў, гледзячы, як звычайна, у бок завода, на палыханне святла над ім. Івану зрабілася цікавата, што змена працуе, а ён вось тут, стаіць на ганку свайго

дома,— здаецца, упершыню за дваццаць гадоў не быў ён разам са сваёй брыгадай. Ён пільна і раўніва глядзеў у бок домнаў, якіх адсюль не відно было, але ён угадваў іх па ружовых, аранжавых і залацістых водсветах і дымах.

Ён вырашыў, што заўтра абавязкова пакажа бацьку завод, і паспрабаваў уявіць сабе, якое ўражанне зробіць завод на старога, звычнага да таго пейзажу, які так добра помніўся Івану з дзяцінства: вясковыя хаты спускаюцца да самае рэчкі, за рэчкай горбяцца пагоркі, укрытыя цёмнай зялёнінай дрымучага сасновага бору. Направа, удаляючыць, прасціраецца бяскопцая раўніна; на ёй там і сям віднеюцца невялічкія вёсачкі, а злева высіцца гара, ля падножжа якое раскінулася вялікае сяло і ярка бялее прыхадская царква Васілія Вялікага; туды, некалі даўно, хадзілі на багамолле да крыніцы святой вады.

Гэты ўспамін здаўся такім далёкім, гэта карціна такая была непадобная на тую, якую бачыў цяпер перад сабою Іван у цемры вясновае ночы, што на нейкае імгненне ён адчуў сябе не адным чалавекам, а нібыта двума — так цяжка было аб'яднаць у адной біяграфіі гэтыя два такія розныя светы. І тое, што заўтра яго бацька Цімафей Васільевіч Ермалаеў вось так раптам можа аказацца на Магнітагорскім заводзе, здавалася таксама неверагодным.

Гадзін у дванаццаць дня пазаўтра Іван не без урачыстасці пасадзіў Цімафея Васільевіча ў машыну побач з сабой і накіраваўся з ім на завод. Ззаду сядзела Дар'я Аляксееўна — ёй трэба было ў бібліятэку, памяняць кнігі на ўсю сям'ю. Кнігі, акуратна перавязаныя матузком, яна паклала сабе на калені, Іван высадзіў яе каля бібліятэкі і паехаў да заводакіраўніцтва.

Разам з бацькам яны падняліся атрымаць пропуск. Служачыя заводаўпраўлення амаль усе ведалі Івана і звалі яго Іванам Цімафеевічам. Вітаючыся з ім, яны ў той жа час з усмешкай касілі позірк на мешкаватую постаць сівага дзядка з бародкай, які выпадаў з агульнае карціны — ніякі не дзелавы, не камандзіровачны, не інжынерны, не індустрыяльны: стары жмурыў вочы і круціў галавой ва ўсе бакі, старанна разглядваючы столь, сцены, нібыта па абавязку, але без цікавасці.

Часам нехта, прыпыняючыся, пытаўся:

— Што, бацька прыехаў?

А тыя, хто ведаў Івана бліжэй, падыходзілі:

— Прыехаў ужо?

І паціскалі старому руку з прыкметпа падкрэсленай павагай.

Дзяўчына, кроў з малаком, што сядзела ў пакоі, куды зайшлі бацька з сынам атрымаць пропуск, узняўшы вочы спачатку здзівілася, а потым, убачыўшы Івана старога, спачатку здзівілася, а потым, убачыўшы Івана, што стаяў у яго за спіною, адразу ўспомніла і прыветна заківала галавой.

— Зараз, зараз выпішам пропуск, як вас велічаць? Цімафей?..

— Васільевіч.

Стары ззяў ад задаволення: магчыма, думалася яму, што вось хоць і жывуць яны з сынам паасобку і так даўно, а ўсё роўна ён, бацька, як бы нябачна заўсёды быў побач з сынам — звалі ж Івана ўсе гэтыя незнаёмыя людзі «Цімафеевічам», па бацьку.

Атрымаўшы пропуск, яны спусціліся па лесвіцы ўніз, пайшлі да прахадной і, нарэшце, аказаліся на зямлі завода. Праўда, па зямлі бацька з сынам рухаліся пядоўга, неўзабаве дарога ўткнулася ў шырокую жалезную лесвіцу, па якой яны падняліся на віядук, узняты высока над зямлёю, і пайшлі па ім. Унізе, даволі глыбока пад імі, цягнуліся ў розных кірунках рэйкі, аўтаматычныя дарогі, тонкія і тоўстыя трубаправоды. На бліжэйшай адлегласці ўзвышаліся сцены велізарных цэхаў. Адусюль вырывалася са свістам пара з труб, то там, то сям з непрыкметных адтулін вырывалася нават полымя. Роўнае сапенне чулася вакол, няспыннае роўнае сапенне, якое час ад часу перабівалі гудкі і цяжкі грукат платформаў з каўшамі, у якіх астывала ўжо, непрыкметна робячыся пунсовым, вогненнае варыва.

Нарэшце ўдалечыні, а потым усё бліжэй, насоўваючыся, як нейкі грозны прывід, перад імі паўстала шарэнга доменных печаў. Іван спыніўся і паказаў іх бацьку, каб ён здалёку ацаніў гэтыя дзівосы. Яны выглядалі як гіганцкі шматвежавы лінейны карабель, а кожная паасобку нагадвала марсіяніна, але паколькі старому не было з чым іх параўноўваць — ні пра лінкоры, ні пра марсіян ён не меў ніякага ўяўлення,— то ён проста спалохаўся.

— Печы? Вось гэта дык печы! — нясмела прамовіў Цімафей Васільевіч.

Ён-то і раней чуў пра доменныя печы, але гэта слова выклікала ў яго самае пэўнае і даступнае параўнанне: яму думалася, што гаворка ўвогуле ідзе пра рускія печы,

у якіх замест кашы вараць жалеза. Дакладней кажучы, калі Ваня напісаў, што працуе каля доменных печаў, Цімафей Васільевіч адразу ўявіў сабе поле, а на ім, накшталт стагоў, вялікія белыя рускія печы, з падпечкамі і прыпечкамі, чарапом і комінам.

Спускаючыся ўслед за сынам па жалезнай лесвіцы да доменнага цэха, Цімафей Васільевіч, як зачараваны, не зводзіў воч са спляцення гіганцкіх цыліндраў, конусаў і прызмаў, з якіх складаўся дзівосны корпус доменнай печы, і ўсё паўтараў:

— Печ! Вось гэта дык печ!..

Унізе, пад домнай, дзе чалавек здаецца сабе самому асабліва маленькім і мізэрным, яны наткнуліся на інжынера Каламейцава, які, пазнаўшы іх, аж засвяціўся. Імкнучыся перакрычаць няспынны гул, які даносіўся сюды з усіх бакоў, ён моцна запытаўся:

— Яшчэ не апахмяліліся?

Гэтыя надта ўжо будзённыя словы ў такой незвычайнай абстаноўцы як быццам вярнулі Цімафею Васільевічу прытомнасць, і ён заўсміхаўся гэтаксама спакойна і нават крыху паблажліва, як і ўчора, калі падымаліся тосты ў гонар яго прыезду.

Калі Каламейцаў пайшоў, запрасіўшы бацьку з сынам зайсці да сябе ў кантору, а вечарам — дадому ў госці, Іван сказаў пра яго:

— Выдатны інжынер.

— А ты не інжынер? — спытаўся Цімафей Васільевіч.

Іван усміхнуўся:

— Хацеў, ды мала аказалася аднаго хацення. Падрыхтоўкі не было. Пачаў завочна вучыцца, ды не атрымалася. Не тыя гады, галава не так варыць... Памяць... Адным словам, кінуў. Ну, ды нічога, рабочыя таксама патрэбныя. Затое дачка мая хутка будзе інжынерам.

Стары з недаверам паківаў галавой: «Рабочы? Глядзі, як яго ўсюды сустракаюць»...

На доменнай печы, дзе працаваў Іван, бацьку старшага гарнавога таксама сустрэлі з павагай і шчырасцю. Чорныя ад сажы гарнавыя і газаўшчыкі падыходзілі да яго, пасміхаліся чарнамазымі тварамі і знарок не падавалі яму рукі, каб не перапэцкаць шаноўнага госця.

У велізарным будынку было цемнавата і свежа. Жоўты пясок мірна ляжаў на падлозе ў домне, як на беразе рэчкі. Людзі, аднак, снавалі туды і сюды, відаць, былі нечым вельмі занятыя, чаго стары не разумеў. З'явіўся адне-

куль Ульянаў, але і ён быў зусім не па-ўчарашняму сур'ёзны і дзелавіты. Ён гучна аддаваў загады, некага грозна пуцаваў, і немагчыма было ўявіць яго п'яным і слязлівым ці каб ён баяўся свае разбітное жонкі і дараваў ёй усе яе штукі. Цімафея ж Васільевіча ён стрэў па-прыяцельску, завёў да сябе ў пакойчык, дзе вакол віселі ўсё нейкія шчыты, а на іх пяспынна ўздрыгвалі стрэлкі, потым даў яму сінія акуляры і павёў яго да печы — глядзець скрозь невялікія «вочкі» на запёртае полымя, якое бушавала ў яе нутры.

Потым Ульянаў раптам некуды знік, і Цімафей Васільевіч адчуў сябе пакінутым і загубленым тут у гэтым дзіўным, ні на што на свеце не падобным корпусе. Але вось са змроку аднекуль з'явіўся Іван. Ён узяў бацьку за руку і, як дзіця, павёў некуды, паставіў яго збоку і ціха сказаў:

— Глядзі.

І тут пачалося! Адчынілася лётка, і распалены вадкі метал рынуўся з печы. Усё ў домне імгненна ператварылася. Стала невыносна горача і нясцерпна светла. Цень заскакаў па аддаленых сценах, як шалёны. Агонь, асвятліўшы ўсе закуткі доменнай печы і адначасова і суседнюю домну, злучаную з гэтай, нібыта рассунуў іх, паказаў іх сапраўдныя памеры, куды больш грандыёзныя, чым гэта ўяўлялася спачатку.

Распалены вадкі метал пусціўся па нахільнай плоскасці проста на падлогу невядома куды і пэўна здолеў бы ўсё спаліць на сваім шляху, калі б не лагчынкі ў жоўтым пясочку, адразу не заўважаныя. Распаленыя струмені кінуліся па гэтых лагчынках наперад. Пунсовае і залацістае полымя, падобнае на тое, як малююць пекла, раптам нагадала Цімафею Васільевічу іх прыхадскую царкву Васілія Вялікага, дзе на ўсю сцяну адлюстраваны былі пякельныя пакуты грэшнікаў. А тут агонь быў сапраўдны, і чэрці, ці тутэйшыя гарнавыя з баграмі ў руках, кідаліся з гэтымі баграмі проста на агонь і вадкі агонь скіроўвалі то ў адну, то ў другую лагчынку і ўжо не заўважалі ні Івана, ні яго бацькі, нібыта гэта былі ім зусім незнаёмыя людзі.

Цімафей Васільевіч глядзеў на ўсё, што яго абступала, з забабонным жахам, і толькі прысутнасць сына супакойвала яго, хоць і сын у час плаўкі змяніўся непазнавальна, зрабіўся нейкім як быццам нетутэйшым, глядзеў на агонь і метал як зачараваны, забыўшы, здаецца, пра

ўсё па свеце; залацістыя водсветы мільгалі па Іванавым твары, ззялі і іскрыліся ў яго вачах.

Нібыта адгадаўшы бацькавы думкі, Іван павярнуўся да яго, паглядзеў на яго ўважліва і сказаў ласкава:

— Не бойся, тата...

Чамусьці менавіта тут успомніў ён гэта слова «тата», забытае ім яшчэ з дзіцячых гадоў, і яно расчуліла яго. І ён паўтарыў:

— Не бойся, тата, агонь — наш палоннік, разлічаны і распісаны па графіку...

Гэта, вядома, было так, але калі Цімафей Васільевіч аказаўся на высокай платформе, якая вяла з домны на вольную прастору, ён не без апаскі азірнуўся на неба: ці ёсць хаця яно на сваім месцы. Неба было на сваім месцы, у ім нерухома і незвычайна высока стаялі перыстыя воблачкі. Цімафей Васільевіч крадком перахрысціўся і ўздыхнуў. Іван заўважыў гэта і ўсміхнуўся. Звычны некалі і цяпер амаль забыты Іванам гэты рух, аднак, нечым яго расчуліў, якраз як і слова «тата». І ў той самы час яго дзівіла тое, што жыццё бацькава так мала змянілася — ва ўсякім разе, на першы погляд; здавалася, што там у яго ўсё як і было трыццаць гадоў назад, хіба што толькі замест падвод і саней ходзяць цяпер па дарогах аўтамашыны. Ён падумаў: «Ці то раён у іх там гэтакі адсталы, ці то сам бацька моцна трымаецца за старое, што раён адсталы»...

Доўга разважаць, аднак, не было ні ахвоты, ні часу; рэштка дня і ўсе наступныя дні былі да адказу запоўненыя: то хадзілі ў госці, то ў кіно ці Палац металургаў. Іван быў заклапочаны толькі адным: як бы найлепей гасцявалася старому, чым бы яшчэ яго ўсцешыць. У суботу і нядзелю — два адразу выхадныя ў Іванавай брыгадзе — вырашылі паехаць за горад на рыбалку.

Да дома Ермалаевых у тры гадзіны пасля полудня з'ехаліся дзве «Пабеды» і «Масквіч». Іван вывеў і сваю «Пабеду». Пагрузілі палаткі, рыбалоўныя снасці і кухоннае начынне, параспіхвалі ў багажнікі часткі разборнае лодкі і нарыхтаваныя загадзя абрэзкі дошак і рэек. На гэтыя дошкі і рэйкі Цімафей Васільевіч глядзеў са здзіўленнем, пакуль яму не растлумачылі, што ў стэпе паліва няма, таму даводзіцца браць яго з сабой, каб варыць юшку на агні. Цімафею Васільевічу, жыхару лясное мясцовасці, гэта здалося незвычайна смешным — ездзіць са сваім

палівам,— і ён упершыню за ўсё гэтыя дні засмяяўся, і ўсе заўважылі, што сын вельмі падобны на яго.

Іван сваю машыну павёў наперадзе ўсяе маленькае аўтакалоны. З Іванам у машыне былі Цімафей Васільевіч, Лёня Башмакоў і палкоўнік Ганчарэнка — на гэты раз не ў фарсовай вайсковай форме, а ў зношаным, відаць, бацькавым гарнітуры, старым капелюшы і доўгіх, вышэй каленяў, паляўнічых ботах. На іншых машынах ехалі іх уладальнікі — інжынер Каламейцаў, інжынер Лапін і гарнавы Сінічкін; кожны са сваімі прыяцелямі. Жанчын не бралі, лічылася, што рыбалка — занятак выключна мужчынскі, нават болей: доўгачаканы адпачынак мужчын ад жаночай прысутнасці. Паважаныя сямейнікі пачуваліся тут як школьнікі, што збеглі з заняткаў, яны адчувалі проста патрэбу перабольшваць свой хатні цяжар і недахопы жаночага характару — для поўнага свайго задавальнення.

Неўзабаве машыны апынуліся ў стэпе па не надта каб выразнай стэпавай дарозе, створанай хутчэй часовым настроем саміх шафёраў, чым клопатамі дарожнікаў. Даволі пустынная, аднастайная, хвалістая роўнядзь сямімільным крокам ішла насустрач і, далёка абыходзячы машыны, з лянотай паўзла нібыта не назад, а наперад. Адзінай адметнасцю на ўсім шляху, на якую звярнуў увагу Цімафея Васільевіча Лёня Башмакоў, быў залаты прыіск — некалькі скасабочаных драўляных будынін. Цімафей Васільевіч, чалавек, які ўсё жыццё пражыў у Еўрапейскай Расіі, дзе пра сапраўднае золата, якое здабываецца проста з зямлі ці з дна рэчак, хадзілі толькі легенды, закідаў Лёню пытаннямі, чаму прыіск пакінулі і ці не засталося там золата, і ўсё азіраўся на старыя будынкі і круціў галавою.

Лёня Башмакоў добра ведаў і любіў тутэйшыя мясціны і, нягледзячы на аднастайнасць ландшафту, умудраўся расказваць пра іх розныя дасціпныя гісторыі. Уехалі ў сяло, і Лёня сказаў, што назва яго Трэбія, і пайшла яна ад італьянскай рэчкі, дзе паўтара стагоддзя назад Суvораў разбіў генерала Макдапальда («Пазней ужо напалеонаўскага маршала і герцага Тарэнцкага»,— важна кінуў Лёня ў бок палкоўніка Ганчарэнкі). Увогуле мясцовасць тутэйшая вылучалася замежнымі назвамі: тут непадалёку было сяло Парыж, пасёлак Фер-Шампенуаз, сёлы Наварын, Балканы — так захоўвалася памяць аб перамогах рускага войска, дзе вызначыліся, і не раз, і ўральскія казакі,

Але вось машыны ўз'ехалі на грэбень нявялікага ўзвышша. Справа ўнізе, сярод зарасляў, раптам паказалася пакручастая светлая стужка ракі. Машыны доўга калясілі ўздоўж яе берагоў і, нарэшце, спыніліся каля ціхага заліўчыка. Рыбакі ўзяліся ўсталёўвацца; яны былі стрымана ўсхваляваныя і раз-пораз запытальна і прагна пазіралі на загадкава-бязмоўнае люстра ракі. Рабілася ўсё спрытна і зладжана, было відно, што ўсё і даўно прадумана і разлічана: адны ставілі палаткі, другія выгружалі снасці, трэція ўзяліся наладжваць разборную лодку, пафарбаваную чырвоным лакам, як трамвай; гэта была складаная і карпатлівая работа, аднак неўзабаве лодка слізганула па заліўчыку, як чырвоная рыбка. У яе селі Лёня Башмакоў і Сінічкін. Яны расставілі сеткі ў розных мясцінах. Нехта накапаў чарвякоў, нехта ладзіў вуды. Каламейцаў узяў у сваю гумовую надзімную лодку палкоўніка Ганчарэнку і выправіўся з ім ставіць сеткі далей, у нейкай сваёй запаветнай мясціне. Вярнуўшыся назад, разам з Лапіным, яны пачалі рыхтаваць закуску, вядома, яшчэ не юшку — юшка была яшчэ сярод карчэўя, у выбоінах дна, церлася яшчэ па водарасцях, кружылася па вірах, памахвала хвастамі, паторгвала плаўнікамі,— а з хатніх, вядома, прыпасаў, нарыхтаваных і спакаваных тымі самымі жонкамі, пра якіх гаварылася тут гэтак звысака.

Івану сёння не дазвалялі займацца агульным клопатам, забіралі ў яго з рук усякую работу, і ён сядзеў з бацькам на беразе і тлумачыў яму, хто чым займаецца, як гід усё роўна пры важным замежным госцю. Пахла прахалодай і глеем, і Івану ўспомнілася рэчка Варона і вялізны паром цераз яе.

Скончыўшы справы, усе сабраліся вакол пасланага на траве квадратнага брызенту; усімі колерамі бляклай вясёлкі паблісквалі пластмасавыя талерачкі і пластмасавыя чаркі, стаялі — каб не перапіцца — усяго тры бутэлькі гарэлкі сярод сподачкаў з селядцамі, каўбасой, смажанымі катлетамі і вараным мясам і слоікамі гарчыцы да ўсяго гэтага. На чыстым паветры, калі забыліся канчаткова ўсе службовыя справы і ўвесь клопат, апрача як пра тое, што робіцца пад вадою, ідзе ці не ідзе ў сеткі рыба, гэта быў не абед, а захапленне.

Сёй-той пасля абеду тут жа на траве і заснуў, і толькі самыя заядлыя вудзільшчыкі разышліся з вудамі хто куды і сядзелі паасобку, цярплівыя і маўклівыя, але ў глыбіні душы азартна імклівыя, чаго б гэта ні каштавала абагнаць

сваіх сапернікаў. Цімафею Васільевічу таксама ўручылі вуду, і ён, спрактыкаваным вокам кінуўшы па беразе, выбраў сабе зацішнае месцейка воддаль ад іншых і таксама ўсеўся вудзіць. Стары не паддаўся: налавіў яшчэ болей за іншых акунёў і нават аднаго шчупака і язя.

Змяркалася. Паволі вудзільшчыкі сабраліся ля машын. Прачнуліся тыя, што спалі. Расклалі вялікае вогнішча. Пачалі абіраць бульбу. Набліжалася «мастацкая частка», як зваў яе Лёня Башмакоў. Ён і Сінічкін у чырвонай лодачцы адплылі праверыць бліжэйшыя сеткі і неўзабаве прывезлі пад агульнае захапленне палову вядра трапяткое рыбы. Тут жа ўзяліся рыхтаваць «вялікую юшку». Пачалі чысціць жывую рыбу, рэзаць яе, яшчэ трапяткую ў руках, акрываўленымі нажамі, і кідаць у вядро, дзе бушаваў вар разам з цэлымі цыбулінамі і крышанамі бульбы, скідаць лыжкамі шум з паверхні маючай быць юшкі, і пры гэтым усе былі вельмі заклапочаныя і ганарыстыя і казалі, што дома хіба зварыш такую юшку, і што без жанчын яно неяк нават смачней і апетытней, і што, маўляў, недарэмна найлепшыя кухары — мужчыны, і што наогул кухня — зусім не такі вялікі ўжо небыт, як пра гэта звычныя гаварыць жонкі. І хоць усе ў глыбіні душы добра ведалі, што ўся гэта гаворка — толькі так, для прыліку, але так ужо на рыбалцы трэба было трымаць «гонар».

Калі ўжо ў катле закіпела разам з бульбай і цыбуляй і рыба, Каламейцаў, Башмакоў і Лапін накіраваліся да машын і вярнуліся адтуль з чорным перцам і лаўровым лістам у вялікіх канвертах. Зірнуўшы на іх урачыстыя, амаль набожныя твары, гісторык змог бы нарэшце зразумець, чаму чалавецтва гэтак прагнула вастрыні прысмакаў, што, гонячыся за імі, адкрыла аж Амерыку. Пасёрбалі юшкі на гэты раз выпіўшы ўжо і добра нават. І вось на небе паказаўся маладзік, пасерабрыў заліўчык, і ў кустах на беразе яго зашамацеў ветрык. А стэп ляжаў шырокі і бясконцы; ад машын і людзей вакол вогнішча на яго падалі зманлівыя, неспакойныя цені. Жабы крумкалі непадалёку.

Позна ўначы, калі не спалі самыя няўрымслівыя, далёка ў стэпе заміргалі, свецячыся ў цемры, два вокі, і неўзабаве да лагера рыбаловаў наблізілася яшчэ адна машына, грузавая. Яна спынілася непадалёку, і фары яе адразу ж патухлі. Пачуліся няспешныя мяккія крокі па траве. Хутка ў светлы круг зайшлі трое мужчын. Разгледзеўшы іх, рыбаловы агаласілі бераг вясёлым крыкам: гэта былі

таксама заядлыя аматары рыбалкі — дырэктар саўгаса Капуннікаў, заатэхнік і дырэктараў шафёр.

— Даўно вас не было відно,— грэючы рукі над вогнішчам, прамовіў Капуннікаў.

— Ды ўсё няма калі,— адказаў Іван, нібыта апраўдваючыся.— План выконваць трэба. Месяц канчаецца. Сёння вось выбраліся — і то толькі, можна сказаць, у гонар майго госця. Бацька прыехаў... Даўно не бачыліся, чвэрць стагоддзя з гакам... Ён у мяне заядлы рыбалоў. Спіць у палатцы, натаміўся.

Прыезджыя тут жа пачалі віншаваць Івана. Ён дзякаваў ім і бянтэжыўся.

Цімафей Васільевіч тым часам не спаў. Ён слухаў усю гаворку з задавальненнем. Тое, што дырэктар гэтак пасвойску, нават як быццам залежна ад яго, размаўляе з Іванам, цешыла сямейны гонар старога і нават крыху дзівіла яго. Дырэктар скардзіўся Івану па непаладкі і ўпрошваў памагчы людзьмі на рамонце інвентару — у яго было кепска па слясарнай часці.

Іван па даручэнні прафкома займаўся шэфскай работай, а доменны цэх якраз трымаў шэфства над цалінным саўгасам, дзе дырэктарам быў Капуннікаў. Але стары не разбіраўся ў гэтых узаемаадносінах, і ён пільна і з павагай пазіраў з палаткі на сур'ёзны твар свайго сына, асветлены залацістым ад вогнішча палыханнем, усё роўна як там, на домне, і шаптаў сабе:

— Іванка, бач! Вось табе і Іванка — дурань!..

І ён не пажадаў заставацца ў палатцы — вылез пагрэцца ў промнях славы і ў цяпле вогнішча. Пры дырэктару ён назваў сына Іванам Цімафеевічам і потым ужо інакш ніяк яго і не зваў, і гэта бянтэжыла Івана і непакоіла.

Увесь наступны дзень лавілі рыбу, сланяліся па беразе, перакусвалі, успаміналі і расказвалі розныя байкі. Ласкавыя сонечныя промні, трымценне светлых палос па вадзе, заблытанасць высокіх стэпавых траў, бясконцы няспынны перасвіст і перазвон птушак і насякомых — усё гэта нібыта ткала нябачна вакол людзей сетку ціхага і бязважкага настрою зачаравання і ляноты. З яе не так проста можна было выблытацца, і патрабавалася пэўнае намаганне волі, каб на захадзе дня пачаць зборы, укладку, адзяванне, каб вярнуцца зноў да імклівага будзённага жыцця.

На дарогу закусілі. Зноў падымалі тосты за Цімафея Васільевіча. Хітраван Капуннікаў, выключна зацікаўлены ў тым, каб паддобрыцца да Івана і атрымаць патрэбную

дапамогу ад доменнага цэха, заўважыўшы замілаванне да бацькі, якое так і свяцілася ў вачах у знакамітага доменшчыка, не шкадаваў ні пахвальных слоў, ні бурных пачуццяў. Зрэшты, ён і сам быў шчыра крануты гэтай чыстай непадробнай сыноўняй любоўю, ён успомніў сваіх бацькоў, ужо вельмі старых. Яны жылі на ўскрайку Сімферопаля ў маленечкім дамку, ён рэдка пісаў ім і вырашыў сёння ж напісаць ім пісьмо.

Жывая рыба білася ў вёдрах і карзінах. Яе падзялілі пароўну паміж усімі. Сінічкін, які зранку яшчэ добра выпіў, раптам пачаў біць сабе ў грудзі і крычаць, што ён і ў дзяцінстве быў беспрытульнік і цяпер у яго няма страхі над галавой, і яму няма каму прывозіць рыбу, і няхай яго долю пашлюць да чортавай матары: ад яго нядаўна сышла жонка, і пры падзеле рыбы гэта бяда здалася Сінічкіну асабліва невыноснай. Ён пачаў абдымаць Цімафея Васільевіча, называў яго бацькам і жаліўся яму на праклятае жыццё, лічачы, відаць, што чалавек, які пражыў такія гады, зразумее яго лепей за іншых.

Сінічкіна супакоілі, замест яго за руль яго аўтамабіля сеў палкоўнік, і машыны памчалі назад па ледзь прыкметных стэпавых дарогах.

Вырашылі выбраць другі маршрут, каб правесці Канунніка да саўгаса. Стэп змяніўся бледна-бярозавымі гаямі, маляўніча раскіданымі там і сям. Пасля гладкіх аднастайных прастораў гэтыя зялёныя гайкі радавалі душу, і блакітнае неба над імі было нібыта яснейшае, чым над жаўтлява-рудаватым стэпам.

Саўгас быў зусім новы. Атынкаваныя белыя дамкі, такія самыя белыя прадаўгаватыя і круглыя гаспадарчыя забудовы — усё гэта сляпіла вочы. Новымі здаваліся тут нават каровы і авечкі. Тут яшчэ не было катоў і сабак. І людзі былі ўсё маладыя. Можа, таму хлопцы і дзяўчаты, якія страчаліся тут усе ў новых ватоўках, з такой цікавасцю пазіралі на Цімафея Васільевіча, калі ён прайшоў па вуліцы пасёлка ў сваім шэрым картовым гарнітурчыку, увесь час трымаючыся ля дырэктара саўгаса...

У Магнітагорск прыехалі позна вечарам, усе, апрача тых, хто вёў машыны, соладка спалі, таму нават і не развітваліся. Сонпага Цімафея Васільевіча Іван паклаў у пасцель, як быў, нераздзетага, толькі боты сцягнуў у яго з ног; Лёня Башмакоў застаўся дасыпаць у Івана — яму паслалі ў сталовай. Ермалаеўскую долю ўлову кінулі ў вялізную міску, долю Лёні Башмакова — у вядро.

Іван лёг побач з жонкай і шэптам, каб нікога не пабудзіць, доўга расказваў ёй пра рыбалку, пра сімпатычнага Кануннікава і яго новы саўгас, пералічваў усіх злоўленых рыб па пародах і прыкладнай вазе.

Зайшла ў іх з жонкаю гаворка і пра маючы быць неўзабаве ад'езд Цімафея Васільевіча дадому і ў сувязі з гэтым, вядома, і пра падарункі яму самому і яго сям'і. Любоў Ігнатаўна, як усякая разумная і хітрая жонка, якая ведала, як захоўваць у сям'і згоду і мір, сама ўзяла ў рукі ініцыятыву і прапанавала купіць і паслаць Іванавай мачасе абрус, адрэз сукна на паліто і шкурку на каўнер, сястры — летнюю сукенку і адрэз на зімовую, дзецям Цімафея Васільевіча ад другой жаніцьбы — іх было трое — чаравікі, штаны і зноў жа сукенку, а яшчэ нейкаму дзядзьку і дзвюм цёткам, якіх часцей за іншых успамінаў стары,— боты і па хустцы.

Самому Цімафею Васільевічу трэба было зрабіць, канешне, выключна каштоўны падарунак, і таму Іван і Любоў Ігнатаўна доўга меркаваліся наконт гэтага. Любові Ігнатаўне было боязна прапанаваць нешта занадта таннае, каб не пакрыўдзіць Івана і каб не здацца скупой і незычлівай у Іванавае радні; у той жа час ёй не хацелася вельмі і раскашэльвацца — і так давялося пазычыць у Ульянавых тысячы з паўтары на падарункі і іншыя расходы — сваіх грошай магло і не хапіць. І яна, скасіўшы позірк на задуменны мужаў профіль, усклікнула з вясёлай адвагай у голасе, аднак не без надзеі, што муж сам запярэчыць на яе прапанову.

— А давай мы яму аддамо твой новы гарнітур! Нічога! Будзем жывыя і здаровыя — другі справім!

Івану новы гарнітур падабаўся вельмі, і такі лёгкі адказ жонкі ад гэтага гарнітура ўкалоў Івана; ён не без падставы падумаў нават, што яна так ахвотна аддае гарнітур таму, што на вечары ў ім Іван заўважна прыйшоўся даспадобы Кацярыне Сцяпанаўне Ульянавай: Любоў Ігнатаўна крыху раўнавала яго да свае сяброўкі, якой заўсёды прагнулася кахання. Але нічога не скажаш, падарунак быў выдатны, гарнітур і старому вельмі кінуўся ў вока, дый такі падарунак як быццам і грошай не каштаваў — за яго заплацілі хоць і многа, але ўжо даўно.

— Добра, Люба, маладзец, Люба,— сказаў сціхаміранна Іван і пагладзіў жонку па яе пышным плячуку, і яна, узрадаваная гэтай пяшчотай і яго задавальненнем ёю, у душы

канчаткова змірылася з тым, што давядзецца адмовіцца ад новых паліто Марыне і Міцю.

Іван з жонкай, здаволеныя адно адным, паснулі бязгрэшным сном.

Раніцай Іван пайшоў на завод, а Цімафей Васільевіч, прачнуўшыся, пахмяляўся агурэчным расолам, які яму прынесла добразычлівая Дар'я Аляксееўна. Ён спытаўся ў яе, дзе тут царква і ці не збіраецца яна на ютрань — сёння ўшэсце, сорак дзён па вялікадні. Дар'я Аляксееўна, стрымана пасміхнуўшыся, адказала, што яе гаспадар, які працаваў ліцейшчыкам на Златаустаўскім заводзе, быў старым бязбожнікам, сам не верыў у бога і яе адвучыў, так што яна гадоў трыццаць ужо як не ходзіць у царкву.

Усё ж яна правяла Цімафея Васільевіча да трамвая, пасадзіла яго і растлумачыла, як ехаць у царкву праз увесь горад.

Пакуль ён ездзіў, усё было зроблена: пазычаны грошы, усё, што трэба, куплена і білет таксама — на той дзень, які назваў стары.

Развітальнае застолле, запланаванае загадзя, было людпае і вясёлае, як і пры сустрэчы. Раніцаю старому далі гасцінцы. Стары нібыта і не вельмі здзівіўся, толькі прыціх, вочы неяк звузіліся-звузіліся, ён паволі, усё роўна як недаверліва, браў у рукі кожны гасцінец і, выслухаўшы, каму ён прызначаецца, задумваўся на імгненне, узважваючы вартасці чалавека і рэчы, якая яму прызначалася.

І толькі калі ўсе гасцінцы былі складзены, стары раптам паглядзеў на сына з-пад ілба і спытаўся:

— А ты, Ваня, сам... колькі ж жалавання атрымліваеш?

Іван адказаў, ганаровы і расчулены:

— Нічога, бацька!.. Не хвалюйся... Хапае, тата, хапае!

А Любоў Ігнатаўна, даючы старому грошы на дарогу, таксама расчулілася і, уздыхнуўшы, сказала яму ласкава, хоць і не без адцення балючасці:

— І па дзвесце рублёў высылаць вам будзем...

Стары пры гэтым глядзеў недзе ўбок і хутка-хутка маргаў вачыма, і было незразумела: ці то ён хоча заплакаць, ці думае пра нешта сваё. І ўвесь выгляд яго ў гэты час быў нейкі дзіўны: ці то задзірысты, неўпэўнены, ці то жаласлівы, варты шкадавання.

І вось аднойчы, прачнуўшыся, дзеці не засталі дзядулю. Ён паехаў уночы, калі яны спалі. Затое ў іх з'явілася

яшчэ адна забаўка: яны пачалі цяпер гуляць «у дзядулю», і гульня гэта стала самая любімая. За дзядулю звычайна была Вера: яна прыклейвала да падбародка шматок шэрага футра ад старое бацькавае шапкі і сядзела бязмоўная, адчужаная на крэсле з чаркай у руцэ, астатнія дзеці чокаліся з ёю таксама чаркамі і шклянкамі і казалі тосты; Федзя ж, які быў за палкоўніка,— той нашыў сабе на плечы чырвоныя папяровыя пагоны — казаў прамову і крычаў «ура», а потым «дзядуля» дзелавіта атрымліваў падарункі, хуценька хаваў іх у чамадан і пытаўся ў кожнага, хто колькі атрымлівае жалавання, і абяцаў пісаць усім пісьмы. Суседнія дзеці, якім таксама страшэнна хацелася гуляць у такую гульню, але якія з прыроджанага, ці што, пачуцця праўдзівасці, гуляць у яе самастойна не адважваліся, абавязкова прыходзілі да ермалаеўскіх дзяцей, законных дзядулевых унукаў, і яны таксама аддана чокаліся з Верай і крычалі «ўра».

Усе знаёмыя пры сустрэчы з Іванам абавязкова пыталіся, як даехаў стары і што піша, ці спадабаўся яму Магнітагорск і завод. А Іван, бянтэжачыся (таму што ад старога не прыйшло ніводнага слоўка), адказваў усім, што бацька даехаў добра.

Вестку ад Цімафея Васільевіча Іван атрымаў толькі месяца праз паўтара і вельмі ж дзіўным чынам. У доменны цэх неяк днём пазванілі з нарсуда і загадалі перадаць яму, каб ён зайшоў да суддзі Каламейцавай. Ён здзівіўся, але, вядома, пайшоў і яшчэ больш быў здзіўлены і непрыемна ўражаны злосным выглядам Лідзіі Іванаўны і сухім зваротам да яго на «вы». Гледзячы на яго настойлівым суровым позіркам, які біў проста па пераносіцы (Іван ніколі не бачыў у яе такіх вачэй — да гэтага часу ён ведаў іх толькі вясёлымі ці насмешлівымі), яна спыталася ў яго без лішніх прадмоў:

— Грошы бацькам пасылаеце?

Іван аж уздрыгнуў ад нечаканасці.

— Пасылаю,— сказаў ён, пачырванеўшы пад яе позіркам і міжвольна неяк сціснуўшыся ад прадчування нейкай невядомай бяды.— Пасылаю... А што?.. Вядома ж, пасылаю. Не бацькам — бацьку, у мяне маці няма. З кожнай другое палучкі пасылаю. Толькі не пасылаў апошні раз, я ж даў яму на дарогу.

Распытваючы ў яго і пры гэтым прыдзіраючыся да кожнага слова, яна нарэшце ўздыхнула з палёгкай, і позірк яе зрабіўся лёгкі.

— Так я і думала,— сказала яна і паклала на плячук яму цяжкую і ласкавую руку.— Квітанцыі хаваеш?

— Квітанцыі? Не ведаю... Наўрад ці...

— Так я і думала,— паўтарыла яна, паківаўшы галавою.— Вось прыбыў іск ад твайго бацькі. Скардзіцца на цябе: маўляў, член партыі, дэпутат, домаўладальнік, багацей, а аліментаў не плаціш. Кінуў, маўляў, родных на вейвецер — бацькоў, братоў і сясцёр, з якіх двое непаўналетнія, а адна кульгавая, калека.

Іван нават і не паспрабаваў апраўдвацца і нешта тлумачыць. У ім нібыта штосьці абарвалася. Ён сагнуўся, уцягнуў галаву ў плечы, на момант адчуўшы сябе няшчасным і безабаронным сялянскім хлапчуком даўнейшых часоў. Яна ж глядзела недзе ўбок і разважала ўголас:

— Ну, факт тваіх грашовых пераводаў мы, дапусцім, з дапамогай пошты здолеем устанавіць у любы час, не ў гэтым справа. Адна я не вырашаю, у мяне засядацелі, усё высветліцца на судовым паседжанні, але думаю, што прысудзім мы яму з цябе, улічваючы тваю мнагадзетнасць, рублёў пяцьдзесят у месяц. Гэта будзе дастаткова. Ён мае авечак, карову, выкормлівае свінню ды яшчэ валёнкі валіць... Сам жа ён мне расказваў. Пяцьдзесят рублёў будзеш плаціць...

У гэты момант яна паглядзела на Івана і асеклася, уражаная выразам яго твару.

— Хіба ў гэтым справа? — прамовіў ён, махнуўшы рукою.

— Вядома. Канешне. Я разумею,— сказала яна мякка і нібыта вінавата.

— Можа, яны гэта так?.. Не падумаўшы? Па сваёй цемнаце?.. Га? — гаварыў ён, гледзячы на Лідзію Іванаўну з умольным запытаннем.— Можа, ім жывецца цяжка? Га?..

Пакінуўшы памяшканне суда, Іван з жахам падумаў пра тое, што яму трэба ісці дадому; ён не мог цяпер убачыць жонку і Дар'ю Аляксееўну і нават дзяцей, якія, магчыма, за сцяной гулялі «ў дзядулю». І ён вырашыў зайсці ў піўную, выпіць там грамаў трыста рускай горкай, каб не было гэтак брыдка. Але калі ён падышоў да ракі, перад яго вачыма ўзнікла звычная, але заўсёды такая ашаламляльная сваёй веліччу карціна вечнага працаўніка завода. У загусцелым змроку розпакаляровыя снапы полымя разнастайных адценняў чырвонага і аранжавага і асляпляльныя ўспышкі белага агню то тут, то там імкліва і дзёрзка

прарэзвалі лад нерухомых рэчаў. У гэтым зладжаным свеце — вялізным целе, якое мела ў сабе цёмныя горы, няпэўна асветленыя дамы, цяжар рачной вады і неба з дзівоснымі хмарамі, ледзь прыкметна асветленымі апошнімі промнямі нябачнага ўжо захаду сонца — завод у гэтым свеце з яго няспынным цяжкім постукам быў вечна нястомным сэрцам, амаль такім самым складаным і таямнічым, як і чалавечае сэрца. Іван з любоўю, з балючым уздыхам усміхнуўся:

— Вось яна, твая вёска, твой родны дом, твой бацька, твая маці... Твая Магнітка.

# Гаўрыіл Траяпольскі

## КАЛЯ КРУТОГА АБРЫВУ

Развіднела. У полі ціха-ціхутка, ані гуку. Ані жывое душы навокал. Сеня Трошын сядзіць на кукішках у маладым аўсе і пільна глядзіць на вялікую кроплю расы. Русыя, амаль белыя валасы з завітушкамі на скронях нічым не прыкрытыя. Сеня паводзіць галавой то ў адзін, то ў другі бок, пахіляючыся і прыплюшчваючы вока. Час ад часу на твары ў яго з'яўляецца ўсмешка. У руцэ ён заціснуў шапку, у якой штосьці заварушылася. Сеня растуліў шапку і пагладзіў маленькае зайчаня з гладкім і далікатным пушком.

— Сядзі, сядзі, дурненькае! Нічога дрэннага з табой не будзе.

Зайчаня паварушыла ноздрамі, яшчэ шчыльней прыціснула вушы і даверліва палезла ў Сенева рукаво, адкуль патыхала цяплом.

— Ну, сядзі ў рукаве. Няхай сабе. Сядзі: будзеш там як на курорце... Пацешныя яны, смактуны-зайчаняты: не разбіраецца ні ў чым — бяры яго рукамі ды нясі...

Сеня зноў заглядзеўся на тую ж кроплю расы. Калі паглядзіш на яе злева, дык бачыш ружавата-чырвоны золак над самым даляглядам; а паглядзіш справа — відаць адлюстраванне палявой зеляніны і воблакі. Сапраўдныя, але малюсенькія аблачынкі! Цэлы свет у кроплі! І Сеня бачыць гэтае мініяцюрнае адлюстраванне свету, ціхага, спакойнага ў свежасці дасвецця. Калі глядзець адным вокам, другое заплюшчыўшы, дык малюнак робіцца больш выразны і яркі. Сеня ўсміхаецца ад ціхай радасці.

Ён апусціўся на калені і азірнуўся навокал. Раса на лістоце рдзела, пералівалася. На кожным лісточку — кропля, і ў кожнай кроплі — маленькі свет. Шмат дзівоснага, проста цудоўнага бачыў Сеня ў полі, але такое заўважыў за свае дваццаць чатыры гады ўпершыню.

Ён устаў. Перасадзіў зайчаня ў шапку і сунуў яе за пазуху. Пастаяў крыху. Перакінуў цераз плячо сетку на

перапёлак, а на другое плячо закінуў звязаныя чаравікі. Падняў з зямлі торбачку, у якой затрапяталіся перапёлкі. Яшчэ раз паглядзеў на параскіданыя па полі крышталікі расы і пайшоў напрасткі, па збожжы. Сеневы порткі даўно ўжо былі мокрыя да каленяў — больш зарасіць іх ужо не страшна. Дый раса была такая прыемная, так асвяжала і падбадзёрвала. Як хораша ў полі на досвітку!

Ды раптам ён спыніўся: наперадзе, на кургане, як скульптура, што з'явілася на стыку дня і ночы, стаяла здаравеннаяваўчыха. Сеня доўга глядзеў на яе, не паварухнуўшыся, пасля шапнуў:

— Здарова, знаёмая!

Ваўчыха, павярнуўшыся да яго ўся, паглядзела, а потым спакойна пайшла за курган.

Выйшаўшы на дарогу, Сеня пакіраваўся не ў сяло, а ў супрацьлеглы бок: ён ішоў на працу проста з палявання. Да сяла — кіламетраў шэсць, а да месца сённяшняй працы, на праворванне сланечніку,— не больш за кіламетр. Дзеля гэтага ён і снеданне мае ў рукзаку.

Неўзабаве ён падышоў да брыгаднага стану і скінуў каля лясное паласы ватоўку. На працу людзі прыходзілі не раней, як у сем гадзін, і Сеню аставалася яшчэ гадзіны тры-чатыры на сон. На стане было таксама ціха, як і ўсюды навокал. Вартаўнік, інвалід Айчыннай вайны Рыгор Фаміч, моцна спаў седзячы, выцягнуўшы драўляную нагу і схіліўшы на грудзі галаву: сон на золку моцны і салодкі.

— Няхай паспіць,— ціха сказаў Сеня.— Цяпер тут і красці няма чаго. Вось у жніво, тады глядзі. Тады, калі ён засне, я яго падніму.

Сеня дастаў зайчаня і пасадзіў на далоні: яно было не большае за гусінае яйцо.

— А вось я выпушчу цябе тут, у лясной паласе. Што ты скажаш? Тут цябе каршун не дастане,— звярнуўся ён да зайчаняці.

Ён прысеў, каб пасадзіць зайчаня пад куст. Ды тут здалёк пачулася рытмічнае паляскванне, падобнае да лёгкага паляскваиня пугай. Сеня прыслухаўся, усміхнуўся і падумаў: «Канстанцін ідзе. Не буду пакуль што выпускаць — няхай ён паглядзіць». І накрыў зайчанятка другой далоняй.

Паляскванне зрэдку, але ўвесь час паўтаралася і наближалася. А праз некалькі хвілін на прасецы паказаўся чалавек. Ён ішоў, узняўшы галаву, як быццам гледзячы ўвесь час наперад, пастукваў кіёчкам па халяве бота і ці-

ха мармытаў нейкі матыў. Апрануты ён быў добра: тонкасуконныя штаны, засунутыя калошынамі ў добрыя боты, карычневая сацінавая кашуля, на плечы пакінуты шэры летні пінжак. Апроч кіёчка, у руках у яго нічога не было. Не дайшоўшы да Сені крокаў са тры ці з чатыры і пастукаўшы кіёчкам па халяве, ён спытаў, галаву трымаючы па-свойму высока:

— Хто тут?

— Я.

— Сеня... Як палявалася?

— Шэсць штук злавіў.

— Добра.

— Раса апоўначы лягла, а то і больш злавіў бы. Калі росна, дык перапёлка не ідзе пад сетку. Крычыць, дурніца, і ні з месца.

— Бачыў ты яе! Зарасіцца баіцца... Тлустыя?

— Ніштто сабе... Сядай сюды, Канстанцін. Штосьці табе пакажу.

— Ану? — І Канстанцін, асцярожна ступаючы, падышоў да Сені. Ён быў сляпы. Вочы нерухомыя. З выгляду здаваўся Сеневым аднагодкам. Тонкімі, мяккімі пішчыкамі пальцаў ён дакрануўся да Сені, а тады яны моцна пацiснулі адзін аднаму рукі.

— Чаго ты ды куды ты так рана ходзіш, Косця?

— Гэта табе — рана, а мне ўсё роўна... На кукурузу хадзіў — усю абышоў: цяпер ведаю, дзе яна ў гэтым годзе пасеяна і як туды ісці.

— Вось яно што... І знайшоў? Як гэта ты так смела ходзіш па полі? Заблудзіць не баішся?

— А гэта што? — Косця падняў свой кіёчак і пастукаў ім.— Ён мяне вядзе. Скажам, перада мною наперадзе слуп — толькі лясну кіёчкам па халяве, і ён скажа: слуп. Вось дайшоў да брыгаднага стану і адразу бачу — стан. Або вось ты сядзіш, а я міма іду; маўчы, калі табе хочацца, а я ўсё роўна бачу. Кожнае рэчыва перадае гук пасвойму. І збажына таксама, і слапечнік. Я ўсё бачу. І хваля такая тонкая ад кожнага прадмета падыходзіць да твару... Не разумееш? — спытаўся ён раптам.

— Чаму ж не! Разумею. Толькі лічу, што мне гэта недаступна. Мне вочы завяжы — і канец. Ты вось і шчоткі робіш, і хамуты, і сеткі пляцеш, майстар на ўсе рукі. Усё гэта, вядома, і я змог бы, навучыўшыся, але змог бы толькі з вачыма. А так — недаступна.

— І мне ж яно сёе-тое недаступна. Змалку чую: «Свят-

ло, святло»,— а што гэта такое — і блізка не ведаю. Скажам, зялёны ліст і жоўты ліст, увосені,— гэта я бачу, пальцамі акрэслю. А святло — не ведаю. Гэта мне, бачыш, недаступна.

— Ну што ж,— перапыніў яго Сеня, відаць, не хочучы далёка лезці ў гэтую тэму.— Ты паглядзі, каго я пад купінай знайшоў.— І ён паднёс бліжэй да Косці далоні з зайчыкам.

— Трусяня як быццам... — Косця пагладжваў зайчыка, чапаў тонкімі пальцамі поўсць, вушкі, лапкі.— Ага! Зайчанятка?

— Яно.

— Якое мякенькае... А навошта ты яго ад маткі забраў? Можа, нядобра гэта, Сеня?

— Наадварот. Тут, у лясной паласе, яму спакайней, а там яго каршун як бачыш хапане. А матак у яго столькі, колькі зайчых з малаком.

— Як гэта?

— Ды так. Яна, зайчыха, як толькі, ведаеш, прывядзе на свет зайчанят, дык накорміць іх адразу ж, а яны адразу — скок, скок! — каторае куды ды пад купінкі або ў ямкі. Вунь як. Бывай, матуля!

— А потым?

— А потым так: як толькі яно захоча есці, дык ці-хенька пішчыць: «Пі-пі-пі!» Тады бяжыць да яго зайчыха з малаком, якая найбліжэй. Калі дык і дзве адразу бягуць, толькі еш, калі ласка, ды не лянуйся.

— Глядзі ты! Проста дзіва!

— Я ўсё гэта сам бачыў, асабіста. «Пі-пі-пі!» — і яна бяжыць, пагоцвае. Заросіцца ўся, як тая баба, што бялізну мые ў рацэ, але бяжыць, спяшаецца. І другая бяжыць. Ну, гэтая, вядома, спозніцца. Першая корміць, а другая сядзіць побач, галавою ківае, як нянька. Дальбог жа!

— Як нянька! — засмяяўся Канстанцін.— Ты ж проста цуды бачыш на паляванні.

— Усё роўна ўсяго не бачу.

Канстанцін павярнуў да яго галаву са здзіўленнем: трошкі адкапыліў губы і ўзняў бровы.

— Чаго ты дзівішся? Вось толькі што бачыў я неба ў кроплі. Упершыню ў жыцці! — усклікнуў Сеня захоплена.— Разумееш, аблачынкі, зара — усё ў адной кроплі...

Канстанцін усміхнуўся спакойнай усмешкай і сказаў упэўнена:

— Не разумею.

— Не толькі ты. А вось Маша, жонка мая, усё разумее. І я ў ёй усё разумею.

— І мая Насця ўсё разумее, хоць і відушчая.

— Гэта добра, калі адзін аднаго разумеюць. Вось і Аляксей Сцяпанавіч, наш старшыня, я так думаю, разумее, што я без палявання не магу: не пярэчыць. А брыгадзір тармозіць. А што я — менш за каго працадзён нахадзіў? Якраз больш, а не менш.

— А я наадварот — Аляксея Сцяпанавіча не разумею. Я яму кажу, што з кукурузных мяцёлак можна такія венічкі вязаць — імі ў горадзе адзенне чысцяць. За кожны такі венічак — рубель, а я адзін звяжу за дзень штук пятнаццаць, а то і дваццаць. Ці нават больш. «Табе,— ён кажа,— і без таго работы хапае — не справішся». Мяне работай спалохаў! Выгады не бачыць. Што ж, увосені я яму давяду. Паспее кукуруза, дык звяжу штук дзесяць, прынясу ў праўленне — паглядзіць і зразумее.

Яны памаўчалі. Канстанцін дастаў кішэнны гадзіннік — з накрыўкай, але не зашклёны,— каўзануў па выпуклых кропках пішчыкам і сказаў:

— Палавіна пятае. Пайду.

— А я трохі пасплю. Ды ў абед яшчэ гадзінку датачу.

— Паспі, паспі.— І Канстанцін, выйшаўшы на дарогу, падаўся ў напрамку калгаса, працуючы сваім кійком: то стукне ім перад сабой, па дарозе, то — па халяве.

І доўга яшчэ Сеню чуваць было Косцева паляскванне ды пастукванне: тук, тук... лясь... лясь... лясь... тук. «Добры чалавек Канстанцін,— падумаў Сеня, выпускаючы зайчаня.— Другі і з вачыма столькі не варты».

Сонца пачало ўзыходзіць. Свіснуў суслік, нібы сігналячы, што ён прачнуўся першы. Крот пачаў выштурхоўваць з нары свежую зямлю. Прабег палявы тхор. І яшчэ раз свіснуў суслік. Успырхнуў над зялёнінай жаваранак і адразу ж прызямліўся: рана яшчэ спяваць. У чыстым, свежым ранішнім паветры за кіламетр было чутно, як спрасонку загамапілі трактарысты каля будкі, запраўляючы трактары для дзённай змены. Сеня лёг на ватоўцы і адразу заснуў.

Калі вартаўнік Рыгор Фаміч прачнуўся, ён убачыў Сеню, які ляжаў, раскінуўшы рукі і ногі. «Бач ты яго,— падумаў ён.— Не пабудзіў мяне. Добра я драмануў, добра. Дык і ты паспі, паляўнічы... Спі».

Гадзіне а сёмай на дарозе паказаўся «Масквіч» старшыні калгаса. Рыгор Фаміч ачомаўся, але Сеню не пабу-

дзіў. З машыны выйшлі старшыня Аляксей Сцяпанавіч Зярноў і брыгадзір Карней Пятровіч Ухаў.

— Добрае раніцы, Фаміч! — прывіталі яны вартаўніка.

— І вам таксама!

— Ужо і Сеня тут,— сказаў голасна Аляксей Сцяпанавіч.

— Ці-шэй! — засіпеў Рыгор Фаміч.— Няхай паспіць. Ён з палявання. Людзі пад'едуць, тады і падымецца. Ён ніколі не спозніцца.

Ды Сеня пачуў гаману і прачнуўся. Працёр вочы, памыўся каля бочкі з вадой і падаў па чарзе руку старшыні і брыгадзіру.

— Добры дзень! Прыехалі, значыцца. Штосьці сёння раненька?

— На сенажаць прабіраемся,— адказаў Аляксей Сцяпанавіч.— Каб не прыйшлося туды людзей перакідаць: сена ў пракосах, а барометр ападае. Дажджу баімся.

— Сёння не будзе дажджу,— упэўнена сказаў Сеня.

— Ну, ты ўсё ведаеш! — з іроніяй запярэчыў брыгадзір.

— Ноччу раса была буйная,— адказаў Сеня.— Пасля расы ў той самы дзень дажджу не бывае.— Ён падумаў і дадаў: — І перапёлка на досвітку не маўчала. А перад дажджом яна ходзіць моўчыкам.

— Па-твойму, значыцца, барометру не трэба верыць? — спытаўся брыгадзір.

— Ціск можа ападаць, а дажджу можа і не быць. Пры буйнай расе дажджу ніколі не бывае,— яшчэ раз паўтарыў Сеня.

— Зусім навукова,— пацвердзіў Аляксей Сцяпанавіч.— Правільна. Грэбці сена трэба, але ж пажару тут ніякага няма,— звярнуўся ён да брыгадзіра.— Перакінь туды чалавек з дзесятак — хопіць.

— І нага мая не ные,— умяшаўся Рыгор Фаміч.— А перад дажджом яна ў мяне не маўчыць.

Брыгадзір не запярэчыў старшыні, але па твары яго было відно, што ён незадаволены ўсімі трыма субяседнікамі. Яму здавалася, што ўсе яны не разумеюць найважнейшага: справіцца з сенам да абеду, а не марудзіць з ім да вечара. Аляксей Сцяпанавіч, наадварот, быў цалкам задаволены «мясцовым прагнозам». Ён ведаў, што парушэнне рытму ў рабоце — небяспечная справа: туды перакінь,

тут пакінь, а сярод белага дня зноў вязі людзей на тое самае месца.

— Карней Пятровіч! — раптам звярнуўся да брыгадзіра Сеня.— Калі закончым праворваць міжраддзе, адпусці мяне дні на два.

— На табе! Бачыш, Аляксей Сцяпанавіч,— адразу загарэўся той.— Зноў «адпусці». Начамі лазіць па полі ад маладое жонкі, а тут яшчэ і ад работы хоча ўцячы.

— У мяне працадзён больш як ва ўсіх,— запярэчыў Сеня.— Адпусці, зрабі ласку. Я сваё наганю. У пядзелю пайду працаваць.

— Не магу цяпер. Работы ў полі — хоць удушыся, а ты — «адпусці». Маленькі ты, ці што? — закрычаў брыгадзір.

Аляксей Сцяпанавіч спытаўся ў Сені:

— А куды табе трэба?

— Ды не хацеў я загадзя гаварыць. Можа, яшчэ і не ўдасца нічога.

— А ты скажы — чаго добрага, і адпусцім.

Сеня паглядзеў на брыгадзіра не вельмі даверліва і адказаў старшыні:

— У Крутых Абрывах, у самым гушчары — у цернях, ваўчыха з выводкам... Вырасце гэтае кодла — паўстатка авечак выдушаць.

— Ну, а ты што зробіш? Заб'еш яе, ці што? — нецярпліва гаварыў брыгадзір, паглядаючы на сонца, што ўзышло.

— Можа, і заб'ю.

— А навошта табе два дні?

— Ды як тут сказаць — можа, спатрэбіцца і больш. Яе ж трэба высачыць і...— Сеня не дагаварыў і, махнуўшы рукой, адышоўся.

Старшыня і брыгадзір пра штосьці гаварылі, але ён не слухаў. Яму было крыўдна, што брыгадзір не разумее яго. Ён думаў, што тут рабіць: ваўчыха непакоіла яго ўжо некалькі дзён.

Аляксей Сцяпанавіч падышоў да Сені і спытаўся:

— А падпусціць яна цябе са стрэльбай? Ваўкі хітрыя.

— Дык трэба ж спачатку без стрэльбы... Высачыць, абдумаць, а пасля ўжо... Яна мне ўжо знаёмая. Ведаю, што адразу са стрэльбай не варта. Тады яна або сыдзе загадзя, або ў пары засядзе, або паперацягвае малых у іншае месца... Хіба што пару раскапаць? — спытаўся ён сам у сябе.

Аляксей Сцяпанавіч глядзеў на Сеню і думаў. Сеня таксама думаў, гледзячы на поле.

— Ты сёння што робіш? Які ў цябе нарад? — спытаўся Аляксей Сцяпанавіч, падумаўшы.

— За конным планетам хаджу: коньмі ўзрыхляем сланечнік. Сёння, бадай, кончым.

Аляксей Сцяпанавіч больш нічога не сказаў. Ён адышоўся да брыгадзіра. Той штосьці запісваў і не ўзняў галавы. Але Сеня пачуў яго голас.

— Аляксей Сцяпанавіч! — гаварыў ён абурана.— Самі вы патрабуеце рытму ў рабоце, а тут вунь што раіце: адпусціць калгасніка з поля. Не разумею!

Потым яны гаварылі ціха і неўзабаве паехалі далей.

Цэлы дзень Сеня ўзрыхляў міжраддзе. Сёння ён быў маўклівы. На пытанні адказваў неахвотна, а на жарты зусім не адказваў. У абедзенны перапынак ён лёг спаць, як звычайна, але заснуць не змог: ваўчыха не выходзіла з яго думак. Нікога, як яму здавалася, не цікавіць гэты небяспечны звер. Летась ваўкі перадушылі авечак з дваццаць. Няўжо і сёлета гэта трэба? Крычаць на праўленні ды пастухоў лаяць — гэта не цяжка...

Ды не адзін Сеня задумаўся пра ваўчыху. Аляксей Сцяпанавіч уранні, калі ад'ехалі ад брыгаднага стану, гаварыў брыгадзіру:

— Сеню трэба адпусціць. Ваўчыха гэтая можа нам нарабіць бяды. Чаго добрага, яна там не адна.

— Ды не заб'е ён яе,— пярэчыў Карней Пятровіч.— Ці ж адзін паляўнічы, ды яшчэ з аднастволкай, можа забіць мацёрую ваўчыху? Не. Месяц будзе хадзіць, але не заб'е. У Сенькі што — перапёлачкі, зайчыкі, качкі... Ён і так мне агорк са сваім паляваннем: то яго на качак адпусці вясной, то ён зімою пойдзе ды трапіць у самую завіруху, а ты па ім бядуй. Годзе ўжо гэтага. І такое можна яшчэ сказаць: малады ён і клёку ў яго малавата — аднаму на ваўчыху хадзіць.

— А ўсё-такі адпусці яго, Карней Пятровіч,— настойваў старшыня, хаваючы ўсмешку ў чорных вусах. Загарэлы па-паўднёваму, ён глядзеў наперад, ведучы машыну. Ветрык варушыў яго валасы, ужо крыху пасівелыя.— Адпусці, адпусці! Справа важная.

Карней Пятровіч безнадзейна ўздыхнуў і адвярнуўся.

Аднак увечары, на брыгадным стане, ён паклікаў Сеню і коратка сказаў:

— Ідзі ўжо, калі так. Два дні табе.

— А Аляксей Сцяпанавіч адпусціў?

— Ты вось ідзі. Калі я дазваляю — значыцца, ідзі. Усё.

— Усё,— пацвердзіў Сеня.

Падышоў грузавік. Абодва яны селі ў кузаў разам з іншымі калгаснікамі і больш не сказалі адзін аднаму ні слова. Толькі ўжо каля гаража Карней Пятровіч параіў, злезшы з машыны:

— Ты там, Сеня, глядзі: не вельмі адзін супроць ваўчыхі з вывадкам... Асцеражней, я гавару.

— А я думаў, што толькі прыйду, дык адразу яе за гарляк — цап! А яна мяне — хап! — і па хлопцу.— Сеня сказаў гэта сур'ёзна, без усмешкі.

Але Карней Пятровіч зразумеў іронію і махнуў рукой.

— Дзівак ты нейкі, Сеня! — сказаў ён на развітанне.

Дома Сеня павячэраў з жонкай, разасланшы пастольнічак па траве пад клёнам. Смажаныя перапёлкі былі вельмі смачныя, а аладачкі са смятанай здаліся Сеню зусім ужо выдатнымі. Ён старанна выцер апошняй аладачкай талерку, справіўся з гэтай аладачкай і сказаў:

— Дзякуй, Машанька! Гладка павячэраў... Прысядзь сюды — я табе штосьці раскажу.

Ён прынёс з каморкі кінжал, зроблены з пакарочанага штыка ад нямецкай вінтоўкі, і прысеў з ім каля каменя. Маша прымасцілася побач на прызбе. Маша — маладая, дужая, паўнагрудая, з вясёлымі шэрымі вачыма, якія смяюцца з-пад чорных густых брывей. У сяле здзіўляліся: як гэта такая красуня выйшла за «ціхоню Сеньку». Праўда, Сеня не быў які-небудзь заморак, але на першы погляд і асаблівай сілай не вызначаўся, хоць мускулы яго і нагадвалі цвёрдую гуму, якая бывае на аўтамабільным напампаваным балоне — не ўвагнеш. І ростам — сярэдні, але трывалы ў плячах. І такая, трэба сказаць, красуня пакахала Сеню.

Схаваўшы рукі пад фартух, Маша з ласкавай кплівасцю спыталася:

— Пра што ж ты будзеш сёння расказваць? Можа, пра курапатак?

— Не. Ты слухай.— Ён пачаў вастрыць кінжал і, не спыняючы работы, спытаўся: — Ты ў кроплю калі-небудзь глядзела раніцай?

— У кроплю?!

— Ага.

— Ты нешта сёння не зусім.— І яна дакранулася да яго галавы, лёгенька ўскудлаціла валасы.

Сеня расказваў Машы падрабязна:

— Ты разумееш, Машанька: дрыжыць, пераліваецца то ясна, то цьмяна. І такая маленечкая. У кіно такога не можа быць — такое ім недаступна.

Маша слухала і глядзела на Сеню. І ніякага запалу ў вачах яе не было, і ўжо не здавалася, што вось-вось з яе вуснаў зляціць вострае словечка, якога сёй-той так баяўся ў брыгадзе.

— Харошы ты...— ціха сказала яна.

— А Карней Пятровіч кажа — «дзівак».

— І няхай сабе кажа.

Кінжал ціхутка палізваў камень.

Вечар стаў ужо цёмна-сіні, дрэвы — амаль чорныя.

— Заўтра я пайду, Маша. На два дні пайду,— далажыў Сеня, устаючы з каменя.

— Далёка?

—Ваўчыху высочваць.

— Страшна, Сеня. Яна ж з ваўчанятамі... Кажуць, што іх двое, мацёрых, тут пасялілася, самка і самец.

— Ну і няхай сабе. Я ж на іх адразу так не палезу. Пасачу. Падумаю... Што ты на гэта скажаш?

— А хіба ж ты паслухаеш — не пойдзеш?

— Пайду.

— Дык ідзі. Добра.— Яна абняла яго і трошачкі пасядзела, прытуліўшыся шчакой.— Хадзем, Сеня.

Неўзабаве Сеня спаў, палажыўшы галаву на руку Машы. А яна драмала, баючыся паварушыць рукой, каб не прабудзіць яго.

Уранні Сеня выйшаў з дому. За плячыма — рукзак, у ім, апрача яды, старанна загорнуты томік «Ціхага Дона» (ён чытаў раман ужо другі раз). На плячы — каса, за халявай — кінжал. Сеня ішоў і ўважліва паглядаў па абочыны дарогі. Нарэшце ён павярнуў з дарогі, сарваў жменю чабору і нацёр ім кінжал — пах жалеза прапаў зусім. Пасля гэтага ён пайшоў хутчэй, у напрамку Крутых.

Гадзіны праз паўтары ён ужо быў на найвышэйшым абрыве яра. Адгэтуль відаць былі ўсе чатыры берагі яру, якія ў гэтым месцы разыходзіўся развілкай. Яр быў шырокі, з крутымі берагамі, зараслымі густымі цернямі, ляшчэўнікам, шыпшыннікам і, зрэдку, дзікімі вішнямі. У непралазным гушчары кустоў самотніцамі стаялі вялікія грушы-дзічкі. Унізе відаць была вузкая і глыбокая прамо-

іна з белым мелавым дном і зусім стромымі краямі, а па ёй ціхенька цурчэла ручаіна, выцякаючы з крынічкі, што хавалася недзе ў развілцы, у непраходным гушчары. Ручаіна цякла недалёка, яна прападала за нейкіх паўкіламетра адгэтуль, у мелавым пласце.

Далей, за ярам, пачынаўся лес — такі, якія бываюць толькі ў чарназёмнай зоне: сярод дубоў і ляшчэўніку — мноства дзікіх груш і яблынь. Лес закрываў далягляд, і здавалася — тут канец стэпу і прасторы.

Паміж лесам і ярам — чыстая прагаліна з рэдкімі кустамі: стэп бязлітасна адсоўваў лес за яр. З абрыву, на якім стаяў Сеня, добра відно было ўсё навокал абедзвюх развілак яра: куды б ваўчыха ні пайшла, Сеня яе ўбачыць. Але ці пойдзе яна? Дзе яе лаз? Калі яна, поччу ці днём, выходзіць і прыходзіць? Дзе яе нара? Ці тут самец? Усе гэтыя пытанні Сеня задаваў сам сабе, прысеўшы на краі зараслай бур'яном варонкі ад бомбы.

Ён трохі адпачыў, тады абкасіў вакол сябе бур'ян, палажыў на траву рукзак, дастаў брусок і пачаў мянціць касу. Каса звінела, і звон яе пранізаў зараснік яра. Сеня ведаў: ваўчыха чуе, насцярожылася, можа, глядзіць на яго — што за чалавек убіўся ў гэтую цішыню; ён ведаў, што ваўкі не любяць голасу жалеза. Аднак ён знарок мянціў ды мянціў. Пасля выбраў мясціну з лепшай травой і пачаў яе касіць, паволі, спакойна, з перапынкамі. Чалавек косіць траву, павінна падумаць ваўчыха, і больш нічога,— такі быў першы разлік.

Увесь дзень Сеня прабыў, як яму здавалася, на вачах у ваўчыхі: касіў, абедаў, прыкідваўся, што спіць, чытаў. Але ні разу не заўважыў нейкіх адзнак прысутнасці звяроў.

Адвячоркам, калі Сеню трэба было асабліва асцерагацца, быць пільным, па тым баку яра паказаўся чалавек. Ён абышоў зараснік і падышоў да Сені. Гэта быў Гурэй Кузін, па мянушцы Гурка-Шпак. Гурка, стары гадоў шасцідзесяці, ішоў з фэсту, з сяла Жытукі, куды ён штогоду хадзіў на сёмуху і прападаў там па некалькі дзён. Не пусціць яго было немагчыма —нават усім праўленнем. Ён здаваў каня і сек драбней маку:

— Чалавек я лерыгіёзны. Ізноў жа, у Жытуках у мяне цешча састарэлая: трэба ж мне ёй пашану аддаць. Ізноў жа, у царкву Хрыстову павінен там зайсці, паколькі ў нас такавое няма. Бо грахоў жа па нас, грахоў! Госпадзі божачка, колькі грахоў! — Пры гэтым ён не без яхіднасці глядзеў на іншых конюхаў, выразна неракапаны ў тым,

што ў іх грахоў куды больш, чым у яго, і ён нават можа памаліцца і за іх, калі папросяць па-хрысціянску.

Ды конюхі не прасілі ў яго, а хто-небудзь з іх нават казаў Гурку сярдзіта:

— Ідзі, ідзі... Ты — гарэлку піць, а за цябе хтосьці працаваць павінен. Азуіт ты, Гурэй.

Ні старшыня калгаса, ні, тым больш, брыгадзір ніяк не маглі справіцца з Гурэем у такіх выпадках: ён ведаў, што за гэта яму, старому, нічога дрэннага не зробяць. На прачыстую, у самую гарачую палявую работу, ён хадзіў яшчэ далей, пад самую Альхаватку — за семдзесят кіламетраў, і тады яго не было не менш за тыдзень.

Аднак хадзіў ён, калі папраўдзе, проста выпіць. Мужчынка яхідны, зайздроснік і страшны нахаба.

— Здароў, Сеня! Ізноў жа, косіш? — піскліва зачырыкаў ён, узяўшыся за скупенькую бародку.

— А што?

— Ды постаць выкасіў не менш, як на сотак пятнаццаць. Хто, значыцца, у калгас косіць, а хто сабе.

— Ды што ты, Гурэй Змітравіч! Гэта я не сабе.

— Ізноў жа, маніш, Сенька. Касі, касі. Тут уварвеш — ніякі чорт не ўбачыць. Касі: больш малачка дасць карова — будзе Машка твая здарова. Хі-хі!

Сеня пачаў злавацца ў душы, сціснуў зубы. Але, і стрымліваючыся, раптам сказаў:

— Сядзь, Гурэй Змітравіч, пакуры. Я хоць і не куру, а ты пакурыш і... паслухаеш.— У апошнім Сеневым слове была такая нотка, што каб Гурка быў разумнейшы — хутчэй пайшоў бы адгэтуль.

— Ізноў жа, пакуру. Добра. Касі, ліха яе бяры, траву... А Машка твая — баба як печ! Ёсць за што ўзяцца. Хі-хі!

Сеня ніколі не любіў нахабшчыны і ўжо гатовы быў тыцнуць нахабе ў морду, але вырашыў адвучыць Гурку нахабнічаць хоць бы пры ім і таямнічым голасам спытаўся:

— Гурэй Змітравіч! Як жа ты ярам ішоў?!

— А што?! — спалохана выцягнуў бародку Гурэй.

— Ды там жа восем ваўкоў! Сам бачыў. Я ўжо тут сяджу сам не свой — не ведаю, як з месца скрануцца.

— А я... ц-ц-це... цераз яр...

— З'ядуць!!! — крыкнуў Сеня страшэнна спалоханым голасам.— На свае вочы бачыў. Дальбог!

Гурка спачатку падскочыў, седзячы, не паднімаючы

ног, пасля нечакана ўсхапіўся і пабег ад варонкі, азіраючыся на яр.

— Стары пахаба! — гукнуў Сеня.— А я табе зманіў! Душа твая заечая! Ніякіх ваўкоў я не бачыў. Глядзі — пры мне не брашы, што твая сліна вядзе, бо я не пагляджу, што ты старэйшы.

Гурэй раптоўна спыніўся, крута павярнуўся да Сені і закрычаў:

— Калгасную траву касіць! Красці! З чалавека лерыгіёзнага кепікі строіць! Я табе пакажу!.. Я цябе выведу! Сукін ты сын, ізноў жа...

Нарэшце, закасаўшы портачкі, ён дробненька пашыбаваў далей, з паскуднай лаянкай, на замольванне якое змарнуе яшчэ не адзін рабочы дзень.

Прыйшоўшы ў калгас, Гурэй, не заходзячы дахаты, не проста ўвайшоў, а ўскочыў у праўленне і зачырыкаў пра тое, што «Сенька калгасную траву косіць і возіць дахаты». У дварэ ён трашчаў пра парушэнне «дысцыпліны», пра развал калгаса такімі, як Сенька. Брыгадзір задумаўся: «Адкуль ён, Шпак, узяў усё гэта?» Ён падумаў, падумаў і далажыў старшыні, Аляксею Сцяпанавічу. Той, не паверыўшы, выклікаў Гурку і распытваў пра ўсё падрабязна. Але і пасля гэтага Аляксей Сцяпанавіч не паверыў і сказаў:

— Паеду сам пагляджу.

Тым часам Сеня ляжаў у бур'яне і сустракаў ноч на краі варонкі, не адводзячы вачэй ад зарасніку. З поўдня, на даляглядзе, выпучыўся кавалак хмары ды так і астаўся чорнай, змрочнай гарой. Недзе далёка ўспыхвала маланка. Ціхенька загрукацела громам, як быццам з-пад зямлі. «Сухі гром»,— падумаў Сеня. Неўзабаве цемрадзь накрыла зямлю такой заслонкай, што ўжо нічога не было відаць. Маланкі паярчэлі, а гром чуўся таксама ўсё як з-пад зямлі. Дыханула настойлівым ветрам — бур'ян заныў, лес за ярам зашумеў устрывожана, з рокатам. Сеня падкурчыў ногі і ўсё глядзеў ды глядзеў. І раптам... ззаду ён пачуў такі гук, як быццам нехта пераламаў у пальцах сухую сцяблінку бур'яну. Сеня павярнуў галаву, насцярожыўся. Далёкая маланка на нейкі момант слаба асвяціла навакол-ле: ваўчыха ценем стаяла за Сенем, крокаў за дваццаць. Яна зайшла супроць ветру і назірала за Сенем раней, чым ён заўважыў яе,— вынюхвала, вывучала. Так блізка ваўкі могуць падысці да чалавека толькі тады, калі ён без стрэльбы,— Сеня гэта ведаў. Ён убачыў яе на нейкую до-

лю секунды. Пасля зноў цемрадзь, беспрасветная, цяжкая — нібы асела на плечы. Сеню ўсё здавалася, што ваўчыха стаіць ззаду, але неўзабаве ён убачыў збоку, ужо далей, два фасфарычныя агеньчыкі, падобныя на пабліскі гнілячкоў: «знаёмая» спакойна ішла ў бок свайго логава. І ў гэтым быў ужо Сенеў поспех — яна не заўважыла нічога небяспечнага. Аднак немагчыма было акрэсліць, дзе яна ўвайшла ў зараснік.

«Сухая навальніца» кончылася. Вецер прыціх. І Сеня заснуў, затуліўшыся ў плашч.

На досвітку ён прачнуўся і, не падымаючы галавы, агледзеў наваколле. Усё было таксама: на шараватым золку яр здаваўся мёртвым, а лес — як быццам сама ўспаўся.

Сеня чакаў. Золак — час бегавога палявання. «Знаёмая» павінна выйсці. Але дзе — вось пытанне... Убачыў яе Сеня ўжо ўдалечыні, з паўкіламетра ад яра: ваўчыха выйшла непрыкметна. І ён трымцеў у душы, горка думаючы: «Не паверыла, не ашукаў».

Ранак рассунуў шэрасць, што вісела над зямлёй. На ўсходзе загарэлася вялізнае, неабдымнае зарыва, але да ўсходу сонца аставалася яшчэ не менш за гадзіну. Далёка адышоўшыся ад зарасніку ўлева, Сеня спусціўся да ручаіны, спачатку нацёршы падэшвы чаборам, што трапіўся на дарозе, і зачэрпаў вады. Так, з кацялком у руцэ, ён трохі пастаяў на дне яра. Пад нагамі быў мел, а размытыя абрыўчыкі берагоў прамоіны пранізаны карэннем, якое звісала да дна. Сеня паглядзеў на падножжа абрыўчыка. І раптам прыйшло адкрыццё. Ён нагнуўся нізка над зямлёй і пачаў прыглядацца. На меле ён заўважыў плямкі: гэта былі сляды воўчых кіпцюроў. Ваўкі не падцягваюць кіпцюроў, як іншыя звяры. Ясна — ваўчыха ходзіць пратокай, хаваючыся за сценкай кручы, і з'яўляецца ў стэпе далёка ад логава. Аднак калі яна выйшла, дык павінна і вярнуцца. Так думаў Сеня. Ён паспяшаўся ўзысці наверх, узяў касу і зноў пачаў касіць, пазіраючы на пратоку.

Перад усходам сонца ён заўважыў спіну «знаёмай»: яна не бегла, а ціха ішла пад кручай да зарасніку, нібы і не чуючы гукаў касьбы. «Чалавек косіць траву — і ўсё,— у думках тлумачыў ёй Сеня.— Ты разумееш — косіць».

А праз гадзіну, не пазней, з'явіўся самец; ён бег, сігаючы па схіле напрасткі, без асцярогі, і ўляцеў у зараснік стралою. «Значыцца, логава блізка ад крыніцы»,— акрэсліў Сеня.

Увесь дзень ён быў у выдатным настроі. Касіў, варыў

есці, спаў, разлёгшыся на толькі што скошанай траве, зграбаў і капіў скошанае ўчора — без грабляў, рукамі і канцом касільна, зняўшы з яго касу. Апоўдні ваўкі пакамі падаліся ў поле і вярнуліся ўжо ўвечары, на змярканні: ваўчыха ішла спераду, самец — ззаду, следам за ёю па пратоцы яра. У сонечны дзень ваўкі рэдка калі астаюцца ля логава — яны пакідаюць ваўчанят адных. Ніводзін звер так рэгулярна не корміць сваіх малых, як ваўчыха, але ж і лішне ссаць не дазволіць — яна ўцякае ад логава, палюючы або вылежваючыся паблізу ад вывадка. У гэты час ні самец, ні самка ўжо не бадзяюцца, як звычайна, па чужым наваколлі — яны жывуць сям'ёю, «дома», у радыусе не больш за пяць-сем кіламетраў ад логава.

— Значыцца, прыйшлі дахаты,— сказаў Сеня ўголас і прысеў на капе. Ясна — удзень можна заходзіць на кватэру да «знаёмай». Ён сабраўся і пайшоў дахаты.

А неўзабаве да гэтага месца падкаціў «Масквіч», скачучы і гайдаючыся, як качка, на куп'і і раўчуках. З машыны выйшаў Аляксей Сцяпанавіч, за ім выскачыў Гуршка-Шпак, а тады ўжо з'явіліся член рэвізійнай камісіі баградаты Агап Ягоравіч і брыгадзір Карней Пятровіч. Першы засакатаў Шпак:

— Я, разумееш, з фэсту іду. Іду, а Сенька мне, ізноў жа, гаворыць: «Пакуры». Я, разумееш, ізноў жа, куру, а сам усё разгледзеў і думаю сабе: «Калгаснае дабро, а ён...» Ну, думаю, няхай сабе ноч, а я пайду да старшыні... Іду, а яны, восем ваўкоў, насустрач! Во-осем! Божачка! Не, думаю, ізноў жа, я не спалохаюся! Усё роўна не вярнуся — пайду да старшыні. Нічога я, ізноў жа, не баюся. Я, разумееш, дзеля праўды, ізноў жа, нічога не пашкадую.

— Ды перастань ты балабоніць,— бесцырымонна перапыніў яго Аляксей Сцяпанавіч.— Усё гэта ты ўжо сто разоў пераказаў. А я вось не бачу, дзе ўзята сена. Ты кажаш: «Возіць дахаты». След ад капы павінен быў бы астацца. Ды і палавіна сена сырога, сёння скошана.— У прыцемках ён абышоў усю пакошу, прыгінаючыся, разглядаючы.

— Значыцца, недзе, ізноў жа, косіць. Значыцца, адтуль вазіў. Я сам асабіста бачыў: вазіў, вазіў, дальбожачка, вазіў.

Агап Ягоравіч гаварыў басам:

— На кожны выпадак акт складзём, Сцяпанавіч. Пасля разбяромся... Так яно... Няўжо ж Сямён так сапсаваўся?.. Не верыцца. Але факт: скошана.— Ён таксама хадзіў па пакошы, згінаўся нізка над зямлёй, мацаў сена і гава-

рыў: — Гэта ўчора скошана, а гэта сёння... Факт: скошана.

Карней Пятровіч увесь час маўчаў — думаў. А Аляксей Сцяпанавіч заключыў:

— Ніякага акту складаць не будзем.

Нічога ліхога не думаючы, Сеня лажыўся спаць і ціха казаў сваёй Машы:

— Удзень пайду да іх «у госці». «Знаёмая» здаравенная, як цялуха!.. Хітрая, але ашукаў: ведаю, калі ідуць у поле і калі вяртаюцца і дзе ў іх лаз.

Заснуў ён моцным і спакойным сном.

Апоўначы хтосьці пастукаў у акно.

— Хто? — спытаўся Сеня.

— Я — Канстанцін.

— Не спіцца табе, ці што?

— Адчыні, справа важная.

Сеня выйшаў на вуліцу.

— Справа, брат, непрыгожая пачынаецца,— сустрэў яго Канстанцін.

— А што здарылася?

— Ты разумееш, нядобра... Я ў праўленні быў. Акт на цябе хацелі скласці... Гурка-Шпак усё кажа: «Саставіць акт на Трошына Сямёна...»

— Акт? За што? Сам жа брыгадзір... А што гаворыць Аляксей Сцяпанавіч?

— Ён толькі адно: «Я сваю думку выказаў».

— Няўжо ён паверыў?

— А хто яго ведае,— неакрэслена сказаў Канстанцін.— Ты сена касіў?

— Касіў.

— Сабе вазіў?

— А як жа гэта я калгаснае сена сабе вазіць буду!

— Добра... Значыцца, Гурка-Шпак наплёў... А ты чаму касіў там, дзе не след, дзе касавіцы не пачыналі?

Сеня падрабязна расказаў, навошта яму патрэбна было касіць. Закончыў ён так:

— Няўжо ж павераць, што я касіў сабе? Ды не вазьму я ані каліва калгаснага! Забі мяне — не вазьму! Як жа гэта я не здагадаўся раней? Лепш капаў бы рыдлёўкай.— Але, падумаўшы, ён сказаў: — Нельга рыдлёўкай: ніхто там ніколі не капае.

Канстанцін у роздуме пастукаў кіёчкам і сказаў:

— Ну, ты спі. Спі — удзень усё стане відней...

Сеня нічога не сказаў Машы, каб не хваляваць яе. Ён ціха лёг спаць.

Ужо добра па поўначы Аляксей Сцяпанавіч сядзеў у сябе дома за сталом у адной майцы. Ён толькі што прыйшоў з работы, якая пачыналася ў шэсць гадзін, і піў малако. Хатнія ўсе спалі. У адной руцэ ён трымаў газету, бегла праглядаючы яе, у другой — конаўку малака. Праз адчыненае акно ён раптам пачуў, як нехта стукнуў па плятні гародчыка і асцярожна, нібы крадучыся, ішоў уздоўж плятня да брамкі. Ціха рыпнула брамка. Чалавек ішоў ужо каля сцяны хаты, усярэдзіне гародчыка. Такога дагэтуль яшчэ не было, і Аляксей Сцяпанавіч падумаў ліхое: выключыў святло і стаў у міжваконні, прыслухоўваючыся. У хаце было ціха. У гародчыку таксама ціха. Так прайшло некалькі мінут. Пасля Аляксей Сцяпанавіч пачуў, як чалавек, асцярожна ступаючы, пайшоў назад да брамкі.

«Значыцца, хтосьці проста падслухоўваў»,— падумаў гаспадар і, высунуўшыся ў акно, ціха гукнуў:

— Хто тут?

— Не спіш, Аляксей Сцяпанавіч? Гэта я — Канстанцін.

— Нешта ж ты да мяне забрыў, Косця. Заблудзіў?

— Не. У сваім сяле я не магу заблудзіць. Я думаў: калі не спіць — пастукаю, а спіць — пайду назад.

— Сядай там на лаўку. Я выйду.

Калі Аляксей Сцяпанавіч выйшаў з хаты, Косця спытаўся:

— Чытаў, відаць? Ціха так у цябе.

— Чытаў газету.

— А мне Сеня прывёз Астроўскага «Як гартавалася сталь». Вось дзе кніга, Аляксей Сцяпанавіч! Якія людзі бываюць! — Ён падумаў трохі і дадаў: — Эх, і кніга ж! Па-нашаму напісана — для пальцаў.

Аляксей Сцяпанавіч падумаў: «А як жа гэта я ні разу не прывёз яму кнігі? Прывязу, абавязкова прывязу».

— Я табе спаць не даю. Я — не так сабе,— сказаў Косця.

— Відаць, што не так сабе, калі ноччу прыйшоў.

— За тое, што ноччу, прабач. А справа важная: пра чалавека... Пра Сеню гаварыць прыйшоў.

— А што там з ім? — спытаўся Аляксей Сцяпанавіч, як быццам не здагадваючыся.

Канстанцін расказаў яму ўсё так, як яму расказваў Сеня.

— Ты разумееш, Аляксей Сцяпанавіч,— закончыў

ёп,— у яго нават і ў галаве не было, што падумаюць дрэнна. Ваўкоў ён высачыў. А што ён мог там такога рабіць, што ваўкі заўсёды бачаць? Капаць нельга — ніхто там не капаў. А сена там хутка касіць будуць — на лузе кончылі. Гурку-Шпаку не вер: Шпак — трапло спакон веку, і нічога ён не бачыць. Сляпы ён у жыцці, гэты няшчасны Шпак,— так яму і памерці, нахабу нягоднаму.

Роўная, спакойная Косцева гаворка лілася ціхай ноччу неракапаўча. Аляксей Сцяпанавіч зразумеў цяпер, тут, побач з Канстанцінам, што хоць ён і кіруе калгасам ужо каля трох год, аднак у душу кожнаму яшчэ не зазірнуў. Вось і ў Косцеву не зазірнуў. А глядзець трэба. Ён і сказаў, памаўчаўшы:

— Я Гурку не паверыў. Не хвалюйся, Косця.— Ён падумаў трохі і, палажыўшы на Косцева плячо далонь, сказаў задумана: — А наконт венічкаў, якімі вопратку чысцяць, я падумаю. Толькі ўсё гэта трэба арганізавана. На зіму трэба парыхтаваць матэрыял. Падумаю.

— Дзякую табе, Сцяпанавіч! — усхвалявана сказаў Канстанцін.— А я, прызнаўшыся шчыра, думаў ужо і так: чалавек ты рабочы, з завода, пятнаццаць год у вёсцы не быў. Механіку ведаеш і агратэхніку ўжо вывучыў. Але... ці разумееш ты калгаснікаў? Бачыш, як я падумаў неразумна. Вось і добра: памыліўся я, значыцца.

— Прывыкаю, Канстанцін. Памаленьку прывыкаю разумець,— гаварыў Аляксей Сцяпанавіч, не здымаючы рукі з пляча субяседніка.— І Сеню пачынаю разумець: адзін любіць сад, другі — пчолы, а Сеня любіць паляванне, поле, прыроду. І калгаснік ён добры.

Канстанцін пайшоў дахаты супакоены, а дотык старшынёвай рукі адчуваў датуль, пакуль не заснуў.

Уранні прыйшоў па Сеню пасланец: выклікалі ў праўленне. Сеня ішоў у праўленне змрочны. У душы кіпела горкая крыўда.

— Сядай, Сямён Сцяпанавіч! — запрасіў яго старшыня.— Мы з табой па бацьках цёзкі.

Сеня сеў, гледзячы проста ў твар старшыні. Той заўважыў, што Сеня пануры і, здагадваючыся чаго, убачыў у яго позірку штосьці новае, чаго раней не заўважаў: Сеневы вочы выказвалі непахіснасць і гатоўнасць абараняцца.

— Ну? Высачыў?

— Высачыў.

— А што далей?

Сеня прыціснуў шапку да грудзей і з нейкай прыкрасцю ў голасе сказаў:

— Ды не вазіў я сена! Не сабе касіў...— І ён, не дагаварыўшы свайго, адвярнуўся да акна.

Аляксей Сцяпанавіч выйшаў з-за стала, зашчапіў дзверы, каб ніхто не ўвайшоў, і некалькі разоў моўчкі прайшоўся па кабінеце.

— Вось што, Сямён Сцяпанавіч! — пачаў ён нарэшце.— Ідзі на ваўкоў і сёння... Калі высачыў — даводзь справу да ладу. Колькі табе дзён спатрэбіцца?

Сеня ўзняў здзіўленыя вочы, шырока расплюшчыўшы іх, і сказаў няўпэўнена:

— А сена?

— Плюнь. Разумею. Пабі ваўкоў, Сямён Сцяпанавіч.

— Не ведаю. Можа, і паб'ю.

— Ты калі-небудзь біў іх?

— Не. Ад старых паляўнічых, у Жытуках, чуў, як іх...

— Пабі.

— Сёння яшчэ не можна ісці: падрыхтавацца трэба, карцечы нарабіць. І дзень трэба ясны, сонечны: у такія дні яны ад логава ў поле адыходзяцца.— Сеня гаварыў ціха, упэўнена, але ён не сказаў ніводнага лішняга слова.

Аляксей Сцяпанавіч не зразумеў як след, як гэта ён збіраецца біць ваўкоў каля логава ў той час, калі яны ў поле пайшлі. Старшыні, магчыма, не гэта было важна: ён зразумеў чалавека.

— Не курыш? — спытаўся ён, прапануючы папяросы.

— Не.

— Ну дык і не куры. Гэта лепш. Лепш раскажы, як да цябе прыходзіў Гурэй Кузін, да Крутых Абрываў.

Сеня расказаў, нічога не замоўчаўшы. Аляксей Сцяпанавіч толькі ўсміхнуўся ўхвальна, і Сеня павесялеў.

Нехта пастукаў у дзверы. Аляксей Сцяпанавіч сказаў:

— Ну, Сямён Сцяпанавіч, дзейнічай. Знішчыць вывадак — вялізная карысць калгасу. Я на цябе спадзяюся... Ага! А можа, табе загоншчыкаў даць?

— Непраходнае там месца, загоншчыкі не выганяць.

— Ну дык думай. Дзейнічай.

Зноў нехта пастукаўся. Аляксей Сцяпанавіч адшчапіў кручок на дзвярах, і Сеня, лоб у лоб, сустрэўся на парозе са Шпаком. Прыплюшчаныя масляністыя вочкі таго паблісквалі іскрамі смеху, дробныя зморшчыны пакрыжаваліся на шчоках так, нібы пакінулі сляды яго бязладнага, бяздумнага жыцця. Гурка выразна быў у вясёлым настроі.

— Выклікалі? — гучна і весела спытаўся, клапаючыся, Гурэй.
— Выклікалі,— панура і ціха адказаў Аляксей Сцяпанавіч.
— З'явіўся, ізноў жа, дакладненька.
— З'явіўся, ізноў жа,— іранічна паўтарыў старшыня.
— Як па гадзінніку.
— Не той гадзіннік,— злосна сказаў Аляксей Сцяпанавіч.
Гурэй разгубіўся і затупаў на адным месцы, нібы стаяў басанож на рассыпаных кнопках, і паўтарыў:
— Як па гадзінніку. Дакладненька.
— Ды не дакладненька. Ты — адваротны гадзіннік: не ў той бок стрэлка ідзе.
У суседнім пакоі пачуўся стрыманы смех. Хтосьці там, не могучы больш стрымлівацца, вохнуў.
Гурэй нічога не разумеў: ён адразу неяк раскіс, раскірэчыў ногі і ўжо міргаў паволі, апускаючы павекі, як сонная курыца насоўвае плеўку на вочы. І маўчаў.
— Вось як яно. Ты даўно ілжэш? — сцебануў пытаннем старшыня.
Гурэй маўчаў.
— Забыўся «ізноў жа»? Эх ты, Гурэй, Гурэй! Што ж тут за гэткую ману прыдумаць?.. Судзіць за паклёп па артыкуле — карысці табе не будзе. Вось што: вазьмі фурманку, едзь да Крутых і перавязі ўсё сена на калгасны двор. А Сямёну Сцяпанавічу завязеш, як і належыцца па статуце, кожную дзесятую капу. Гэта табе пакаранне за брахню: і людзі будуць ведаць, і сам запомніш.
— Як жа гэта? Да Крутых? Да в-в-ваў-коў?
— А гэта ўжо я не ведаю, да каго. Сена перавязеш. Зразумеў? І Сямёну Сцяпанавічу — дзесяць працэнтаў! Уцяміў?
— А хто ж гэта будзе, ізноў жа, Сямён Сцяпанавіч?
— «Ізноў жа» забыўся? Сеня-паляўнічы — вось хто! Не Сеня ён, а Сямён Сцяпанавіч Трошын.
Гурэй пачухаў локцямі бакі і тоненька зарыпеў:
— Я чалавек, ізноў жа, лерыгіёзны. Мне лепш у царкву святую пайсці, калі ўжо грэх такі. Замаліў бы грэх, раз ужо так. У царкву, а не па сена. Ён і сам перавязе.
— Нічога, нічога. Перавязі сена, а потым замоліш: мне цябе трэба судзіць за паклёпніцтва, а я вось супроць закону раблю. Замоліш?
Гурэй уздыхнуў і пабрыў з кабінета, цягнучы ногі.

Увесь дзень Сеня працаваў на чорным, не парослым травой папары, разбіваючы на клетках гной. Стомлены, але задаволены, ён прыйшоў увечары дахаты. Маша затрымалася на поліве бульбы — яе не было дома. Сеня адмыў чаравікі ад гною, вымыў ногі, зняў кашулю, памыўся да пояса. Маша прыйшла, калі ўжо ён выцер цела ручніком і так, без кашулі, корпаўся ў скрынцы, выбіраючы лепшы свінец. Яна распаліла агонь на прыпеку пад трыножкай, паставіла варыць бульбу, а сама падышла да Сені і моўчкі абняла яго. Пасля яна паглядзела Сеневу кашулю і, заўважыўшы невялікую дзірачку, тут жа спрытна зашыла яе. Сёння яна была асабліва ласкавая, але нейкая ціхая. Сеня адчуваў гэта па тым, як яна дакранулася да яго валасоў, па яе ўсмешцы і ўсё паглядаў ды паглядаў на яе, стараючыся рабіць гэта непрыкметна. Ён рэзаў свінцовыя палачкі на карцечынкі і пагляда́ў. І, нарэшце, не вытрываў:

— Ты сёння асаблівая...

— Як гэта «асаблівая»? — з лёгенькім сумам спыталася яна.

— Ды я і сам не магу сказаць, якая ты.

Яна нечакана села побач з ім на лаўцы, прытулілася шчакой да яго голага пляча і прашаптала:

— Можа, лепш не ішоў бы ты, Сеня, на ваўкоў... Баюся я. Ты ж адзін ідзеш.

— Як гэта «не ішоў бы»? — здзівіўся Сеня.— Сам Аляксей Сцяпанавіч даў каманду — знішчыць вывадак.

І зноў яго Маша асталася пераможаная.

Назаўтра раненька Сеня старанна накачаў з учарашніх кавалачкаў свінцу круглых галачак — атрымалася выдатная карцеч; зарадзіў дзесяць патронаў, перасыпаўшы карцеч крухмалам (для кучнасці бою), заліў верхнія пыжы воскам, каб не адышлі, і пайшоў у Крутыя. Замест чаравікаў ён зноў, як і ў першы раз, абуў боты і сунуў за халяву кінжал. У рукзаку была буханка хлеба, на плячах — лёгкая ватоўка. Ён ішоў улегцы, не абцяжарыўшы сябе нічым лішнім: стрэльба і рыдлёўка.

Цяпер ён ішоў са стрэльбай — ваўкі могуць пачуць яго здалёк. Таму ён, яшчэ задоўга да месца, абкружыў яры і пайшоў проці ветру. Трэба было зрабіць так, каб ні разу вецер не данёс паху стрэльбы да логава і, што не менш важна, каб ваўкі не ўбачылі Сеню. А то будзе па ўсім паляванні.

Аднак, нягледзячы на ўсю яго асцярожнасць, у гэты дзень ён не бачыў ваўкоў.

На змярканні ён асцярожна — цяпер ужо з ветрам — адышоўся з паўкіламетра назад і заначаваў у рэштках саломы ад леташняй сцірты. Агонь раскласці нельга было. Сеня пад'еў хлеба, добра пасыпанага соллю, і лёг на саломе. Не спалася: ён думаў пра ваўчыху. Ці яна бачыла яго, ці не бачыла — і так было ясна, што яна асцярожная. Сеня быў перакананы: «знаёмая» ведае яго з твару, пазнае па хадзе, нават як кашляне ці чхне, і калі яна пачуе яго стрэльбу, перацягае ваўчанят у іншае месца адразу ж. Воўк не можа паверыць чалавеку — воўк ненавідзіць чалавека як свайго заклятага ворага. Сеня ведаў, што, калі ён параніць ваўчыху, а не заб'е адразу, ваўчыха, абараняючы малых, перагрызе яму горла, як ягняці: параненая каля логава ваўчыха страшная нават бывалым паляўнічым-ваўчатнікам. Так думаў Сеня, засынаючы. «Каб удвух»,— прамільгнула ў думках. Але ў сяле не было паляўнічых, апроч яго.

На другі дзень ён убачыў ваўкоў апоўдні, было з кіламетр ад Крутых. Значыцца, на дзень ваўкі ішлі ў поле. А калі ішлі, дык толькі пратокай — інакш ён іх не заўважыў бы. І Сеня вырашыў пачыкаць. Перад заходам сонца ён споўз па вымоіне ўніз у яр, прыкрываючыся бур'янам і кавылём, і засеў у засаду каля сцежкі пратокі, пад густым кустом.

Сцямнела. Пачыналася ноч. У яр спусцілася халодная, каламутная навісь імглы. Самой імглы ў цемрадзі не было відно, і здавалася, што цяжкая макрэча прыдушыла чалавека ў глухім яры. Стрэльба стала вільготная, коўзкая. Сеня і не думаў выціраць стрэльбу, пазбягаючы найменшага руху, не робячы нават ціхусенькага шорхату. Гэта было вельмі цяжка: косці пачалі неўзабаве нямець, пальцы, заціснутыя на шыйцы прыклада, зрабіліся цвёрдыя і непаслухмяныя; ён стараўся часцей паварушваць імі, але нават і гэты рух здаваўся яму небяспечным: ваўкі чуйныя! Кароткая чэрвеньская ноч была на гэты раз доўгая, цяжкая, сырая! Ужо і поўнач прайшла, а Сеня не бачыць і не чуе нічога: ні адзінага гуку, ні найменшага шолаху.

Ды раптам... ён здрыгануўся — храбуснула косць. Ён выразна пачуў гэта: ззаду за ім храбуснула косць. Пасля ён пачуў лёгкае павіскванне, падобнае да таго, як скавыча шчаня, калі яно правінаваціцца і перавернецца лапкамі ўгору, чакаючы кары: або ваўчаняці за штосьці папала

ад маткі, або яны пакусаліся едучы... Ясна: ваўкі былі за спіной у Сені — у глыбіні зарасніку, каля крыніцы. Яны ўвайшлі не пратокай, дзе сядзеў Сеня, а іншай сцяжынай. У Сені прамільгнула думка: «А ці не азначае гэтае павіскванне таго, што ваўчыха пачала ўжо сваіх ваўчанят перацягваць у іншае месца?» І яму здалося адразу, што ён апынуўся ў недарэчным становішчы: сядзіць, а ваўкі ведаюць, што ён сядзіць. Але як жа так здарылся? Калі ён засеў, вецер павяваў на яго ад логава, пасля адразу асела імгла, ад якой прытупляецца ваўчынае чуццё; пасля Сеня са сваёю стрэльбай стаў мокры — гэта таксама выгадна для яго, бо памяншае пахі да апошняй долі. Але магло быць і так: ваўчыха падыходзіла да Сені, а ён не заўважыў яе з-за імглы. Не. І так не магло здарыцца: дно пратокі мелкае, белае, і па ім нават у імгле можна ўбачыць ваўчыху за пятнаццаць-дваццаць крокаў; ён прыгледзеўся да кустоў і яшчэ раз пацвердзіў у думках: «Не, так не магло здарыцца». І тым не менш усё было для Сені як у імгле, такой самай, як гэтая, у яры.

З такімі думкамі, з анямелым целам, увесь пранізаны вогкімі дрыжыкамі, ён пачуў на золку шорхат: ваўкі ішлі па зарасніку, у іх была, відаць, свая сцяжына: шамаценне было лёгкае — ваўкі не прадзіраліся праз калючы цярноўнік, а ішлі па сваёй сцежцы, зрэдку паварушваючы галінкі, чапаючы іх бакамі. Потым усё аціхла.

Сеня асцярожна павярнуўся тварам да зарасніку. Цяпер ён глядзеў угару, на край яра, дзе, на яго думку, маглі паказацца ваўкі — там выходзіла наверх вузкая і мелкая, на паўметра, прамоіна. Відаць, падэшва яе не зарослая, а хмызняк проста яе хавае сваім сплеценым голлем. Сеня не памыліўся: ваўчыха з воўкам выйшлі там. Яны трошкі пасядзелі, паглядзелі навокал, ва ўсе бакі, і паволі, спакойна пайшлі — ваўчыха спераду, воўк ззаду. Метраў з дзвесце ад Сені. Ён вырашыў так: калі яны ўвечары або ноччу ўваходзілі ў зараснік таксама, дык стрэльбу яны не маглі пачуць. Другой пацехі ён прыдумаць не мог, але гэты раз надзея не пакінула яго.

Сяк-так разагнуўшы ўдзеравянелыя ногі, ён разварушыў іх, патупаўшы на адным месцы, паварушыў рукамі, энергічна пацёр локцямі бакі і ўзышоў на верх яра, да варонкі і коп сена. Сеня спыніўся, застыў ад нечаканасці: тут ніякай імглы не было — усё далёка-далёка было відаць.

— Дурань я, дурань! — Сеня пляснуў шапку аб зям-

лю.— Як жа гэта я не ўцяміў, што заімглёным ярам яна не пойдзе!

І сапраўды: у тых выпадках, калі чуццё чым-небудзь абмежавана, воўк спадзяецца на востры зрок. Так і ў тую ноч — яны ўваходзілі і выходзілі адразу наверх па другой сцежцы. І Сеня зноў нягучна, стрымана лаяў самога сябе:

— Эх ты, Сенька, Сенька! Колькі ж табе яшчэ жыць трэба, каб паразумнець? Таксама мне паляўнічы!

Як бы, аднак, ні было яму крыўдна, але цяпер Сеня канчаткова лічыў ваўчыху разумнейшай за сябе, больш асцярожнай, вопытнай, і нават адчуў да яе павагу.

— Маладзец ты, знаёмая, маладзец! — гаварыў ён ціхенька, супакоіўшыся.

Узышло сонца. Заспявалі жаваранкі. Прыпазніўшыся, зайчыха пачыкіляла на адначын, на днёўку: заляжа цяпер у лёжцы і засне з расплюшчанымі вачыма, якія бачаць і праз сон; прыцісне вушы так, што слыхавыя адтуліны астаюцца адкрытыя, заўсёды напагатове.

«Ох ты, разумная! — падумаў Сеня.— Каля самае ваўкаўні ўцалела. З'ядуць яны цябе, вось пачакай: не дажывеш да зімы. Хіба ж ты не ведаеш: дзе ваўкі, там зайцоў няма. А ты ўсё жывеш, крывалапая цешча. І ты, відаць, хітрэйшая за мяне».

Сеня ўздыхнуў і прысеў на капе. Удалечыні, лявей лесу, на чыстым папары ён зноў убачыў ваўкоў — значыцца, далёка ад логава яны не адыходзіліся. Яны трушком перабягалі цяпер каля грукатлівага трактара, не звяртаючы ўвагі на тое, што ён грукоча так блізка ад іх.

Хутка Сеню павяло на сон. Ён прылёг на капе і, прыціснуўшы да грудзей зараджаную стрэльбу, заснуў адразу.

Спаў ён не доўга — у полі чалавек адпачывае хутка. І Сеня прахапіўся недзе каля снедання. Ён сеў, перакусіў, працёр стрэльбу і загледзеўся на тое месца, дзе, ён меркаваў, павінна быць логава.

Ветрык павеяў яму ў твар — гэта добра. Але што цяпер рабіць далей? Пакінуць жывой ваўчыную сям'ю ды ісці дахаты на смех усяму калгасу? Тады зноў — чым бліжэй да восені, у статку будуць знікаць авечка за авечкай. Не, ён адгэтуль не пойдзе. А далей што? Сядзець яшчэ ноч, дзве, тры? Няма пэўнасці, што «знаёмая» не пачуе яго. Раскапаць нару? Але тады можна ўзяць толькі ваўчанят. Затое пасля ваўчыха будзе заядла помсціць усёй ваколі-

цы. Бывалі выпадкі, калі старая ваўчыха перадушвала да трыццаці авец за адну ноч, помсцячы за дзяцей. Не, так нельга. І паступова, разважаючы сам з сабой, узважваючы свае назіранні за ўсе дні, Сеня вырашыў.

Як толькі прыйшло рашэнне, ён адразу ж устаў, накінуў рукзак у капе, праверыў патроны і накіраваўся на другі бок яра — туды, дзе выходзіла патаемная прамоіна. Неўзабаве ён ужо быў там. Кароткі і пільны агляд пацвердзіў, што сцяжына тут ёсць. Сеня зашпіліў ватоўку на ўсе гузікі, хоць яму і без гэтага было горача. Ватоўкі ў капе ён усё-такі не пакінуў: яна была яму неабходная пры выкананні задумы. Ісці па ваўчынай сцежцы не было як: калючы хмызняк і сплецепае голле настолькі густыя, што прайсці можна было толькі расчышчаючы дарогу сякерай. Сеня стаў на карачкі і папоўз уніз прамоінай. Сяды-тады ён поўз па-пластунску. Верх ватоўкі па шматкі падзёрся яшчэ ў палавіне дарогі. Ён падрапаў твар і рукі калючкамі цярноўніку і шыпшыны, але ўсё лез і лез. Неўзабаве Сеня пачуў цурчэнне крыніцы. Ён спыніўся перадыхнуць. Прыслухаўся. Раптам на рукаве ватоўкі ён убачыў самую сапраўдную мясную муху; гэта і ўсцешыла яго, і ў той жа час па спіне пайшлі мурашкі: блізка мяса — блізка логава. Ён пачуў ужо выразны пах псіны. А праз хвіліну натknуўся на цялячы чэрап. Сеня ўстаў.

Крокаў за пяць ад яго быў абрывчык. Над ім расла вялізная груша-дзічка, карэнне якое звісала ўніз. А паміж карэннем зеўрала дзірка — ваўкаўня ў натуральным паглыбленні. Перад нарой — невялікая пляцоўка, тры-чатыры квадратныя метры, чыстая, не зарослая. І на гэтай пляцоўцы сядзела двое ваўчанят месяца па паўтары. Яны глядзелі па Сеню спачатку здзіўлена, а пасля ўжо шмыганулі адно за адным у нару: дзіўны ўсё-такі госць з'явіўся каля іхняй хаты — лепш схавацца.

Сеня прабраўся да нары. Зрэзаў кінжалам ляшчыну і натыкаў ёю ў пару, трымаючы ў правай руцэ стрэльбу напагатове. Нара была зусім неглыбокая, не больш за метр, але шырокая ўсярэдзіне. Ваўчаняты там ціхенька бурчэлі, здзіўленыя з'яўленнем кія, але іншых якіх-небудзь гукаў не чулася (ваўкі не гаўкаюць). Ваўчыхі не было. Сеня распераазаў вузенькі раменьчык, палажыў яго ў кішэню і пачаў расчышчаць рыдлёўкай уваход у нару. Час ад часу ён пакідаў капаць і прыслухоўваўся. Часамі яму здавалася, што нешта шархаціць — тады ён настаўляў у той бок стрэльбу і нейкі час сядзеў у напружаным чакан-

ні. На шчасце, шоргат ці шастанне былі не воўчыя. Але адзін раз ён сапраўды ажно пахаладзеў: раптам над самым вухам, ліха на яе, нечакана застракатала сарока. А гэтая птушка можа прывесці ваўчыху сваім крыкам. Яна так, гэтая белабокая брыда: чалавек пройдзе — пастракоча, воўк прабяжыць — пастракоча, заяц прагоцае — стракоча, злыбеда! Часамі Сеню здавалася, што стрэльба ляжыць не так, каб пры патрэбе можна было яе зручна схапіць, тады ён клаў яе проста перад каленьмі, з узведзеным курком, і рабіў сваё далей. Сустрэча са «знаёмай» тут не абяцала чаго-небудзь добрага — яна сюды з гушчару сiганула б, ды так... І Сеня стараўся, спяшаўся да болю ў суставах. Яму ўсё здавалася, што ўваход пашыраецца паволі. Але гэта толькі здавалася: праз паўгадзіны ён ужо мог пралезці туды да палавіны тулава.

І вось ён зняў ватоўку. Прыслухаўся. Выцер пот з ілба рукавом. Яшчэ раз паглядзеў на стрэльбу і... палез у ваўкаўню. Нейкі асаблівы пах воўчай псіны моцна заказытаў у носе. Сеня намацаў рукой перад сабою дно логава: яно было чыстае, без подсцілу. Ён павёў далонню па дне ўправа і, памацаўшы мяккае, ашчарэпіў усімі пальцамі ваўчаня. Звярок папаўся так, што Сенева рука перахапіла яму горла, і той захрыпеў. Сеня вылез. Разняў пальцы. Ваўчаня глытнула некалькі разоў паветра і, адразу апамятаўшыся, паспрабавала нырнуць у логава. Але Сеня прыціснуў яго аберуч і, не зважаючы на тое, што яно ашчэрваецца, выкручваецца, гырчыць, перавязаў упоперак жывата раменьчыкам. Цёмна-шэры шчанюк, які ніколі не бачыў чалавека, ужо ўзненавідзіў яго як мог: ён грыз раменьчык, кусаў зямлю, але нічога не мог зрабіць. Сеня загарнуў яго ў ватоўку і палез сваім следам на верх яра. Цяпер угару, ды з ваўчанём, паўзці па прамоіне стала цяжэй. Аднак трэба было спяшацца, бо інакш можна сустрэцца са «знаёмай» тут, на воўчай сцяжыне — нос у нос!.. І зноў — праклятая сарока! Ды ён спяшаўся, спяшаўся, як толькі мог.

Калі ён дабраўся наверх, кашуля была суцэльным лахмоццем, а цела падрапана ды пасечана ў многіх месцах, ды гэта не страшна — загоіцца ўсё, галоўнае, што Сеня ўжо наверсе. Ён выразаў другі кій, прывязаў да яго канца раменьчык, што на ваўчаняці, і павалок яго. Ваўчаня ўпіралася, то валакучыся на ўсіх чатырох лапах, то на баку; часамі яму ўдавалася ўчапіцца зубамі за раменьчык і так валачыся, скруціўшыся абаранкам.

Сеня ішоў хутка. Але калі ваўчаня пачынала куляцца, ён спыняўся, даваў яму перадыхпуць і зноў валок далей. Ішоў так, каб вецер увесь час дзьмуў у плечы. Так ён давалок ваўчаня да варонкі, адкуль пазіраў за ваўкамі раней, у першыя дні. Тут ён развязаў знямоглага, спакутаванага звярка, які ўжо і не думаў кусацца, толькі цяжка дыхаў ды ўздрыгваў. Тады Сеня хутка выкапаў невялікую ямку, на якія паўметра, загарнуў ваўчаня ў ватоўку і палажыў гэты скрутак у ямку, раменьчык прывязаўшы да ўбітага ў зямлю шпянька.

Цяпер Сеня сядзеў са стрэльбай у руках, тварам супроць ветру, у той бок, адкуль валок ваўчаня. Разлік у яго быў такі: ваўчыха пойдзе па следзе ваўчаняці абавязкова, пеадкладна, як толькі з'явіцца ў пары; з ветрам стрэльбу яна не пачуе, а Сеню ўбачыць толькі за некалькі крокаў. Ён сам ішоў на кароткую і страшную сустрэчу...

Прайшло ўжо многа часу — Сеня не ведаў колькі. Ён не заўважыў, як сонца схіліла з паўдня, як павеяла халадочкам, але ён адразу адчуў набліжэнне вечара па ветры. Вецер аціхаў. Гэта было вельмі і вельмі дрэнна. Але як толькі ён гэта падумаў, ён убачыў... «знаёмая» бегла па следзе свайго малога, апусціўшы галаву. Сеня прыціснуўся да зямлі, сціскаючы ў руках стрэльбу. Ваўчыха бегла без усякага роздуму, спяшаючыся, проста на Сеню: яна была гатова на ўсё. Вось ужо дзвесце метраў... Сто... Яна павярнула галаву і паглядзела набок, не спыняючыся. Вось ужо Сеня бачыць шырокі лоб, кіем апушчаны хвост і прыгорбленую спіну.

«Не параніць,— думаў ён,— не параніць. Або намесцы забіць, або зусім не папасці». На нейкую долю секунды ён успомніў Машу, аднак гэта было толькі на момант... «Знаёмая» спынілася за дзесяць крокаў ад Сені з ходу, нібы на штосьці паткнуўшыся. Яна пачула. Яна наставіла хіб і, злёгку ашчэрыўшыся, пайшла ступою. Сеня ўбачыў чырвапаватыя дзёсны ваўчыхі. О, яна ўжо добра ведала, хто ўзяў ваўчаня. Ведала! І Сеня стрэліў ёй у грудзіну. На момант дым закрыў ад яго ваўчыху. Ён ведаў, што перазараджаць аднастволку позна, і выхапіў кінжал, укленчыўшы. І ўбачыў: «знаёмая» апала на калені, ткнуўшыся носам у зямлю; яна падняла зад на лапы, не хочучы падаць зусім; яна яшчэ хацела ўстаць і сігануць — апошні, самы апошні раз сігануць, каб учапіцца зубамі і, не адпускаючы іх, памерці. Але яна ўстала на ўсе чатыры лапы і... рынулася вобземлю.

Усё было скончана. «Знаёмая» ляжала перад Сенем. А ён яшчэ з мінуту ўсё стаяў на каленях з кінжалам у руцэ, з запечанай крывёй на падрапаным твары, у падранай дашчэнту кашулі; ён таксама быў страшны.

...Самца ён забіў на следзе ваўчыхі: Сеня валок яе метраў са сто і зноў засеў у засаду. Воўк наткнуўся на яго, сігаючы шырокім бегам, не падазраючы засады. Убачыўшы Сеню, ён рэзка павярнуў убок, кінуўшыся наўцёкі, але карцеч секанула яму па баку.

— Баязлівец! — сказаў з пагардай Сеня, падыходзячы да мёртвага самца.

У логаве аказалася яшчэ трое ваўчанят. Іх Сеня забіў ужо ранкам наступнага дня. Ён сцягнуў мацёрых ваўкоў і тых трое ваўчанят у варонку і памаленьку пайшоў дахаты, несучы пад пахай жывое ваўчаня, загорнутае ў ватоўку. Ён вызваліў яму галаву зусім, паслабаніўшы на шыі раменьчык. Можа, таму, што ваўчаняці было ўтульна і цёпла, а можа напакутаваўшыся — яно ўжо было ўдзячнае, што яго прыгарнулі,— яно не кусалася, не гыркала, але на Сеню не глядзела, адварочваючы мордачку ўбок і ўніз.

Апошнія метры да свае хаты Сеня ішоў цераз агароды, ледзь ішоў, перамагаючы самога сябе, каб не легчы проста ў бульбоўніку.

Машы не было дома. Сеня пасадзіў ваўчаня ў падпечак, зняў рэшткі кашулі і порткі, выйшаў на двор, да студні, выліў на сябе вядро халоднай вады, пасядзеў трохі, нічога не думаючы, на зрубе і толькі пасля гэтага пачаў мыцца.

...У праўленне ён зайшоў ціха, як звычайна, і пастукаўся да Аляксея Сцяпанавіча. Той адгукнуўся:

— Уваходзьце!

А калі Сеня ўвайшоў, паціснуў яму з усмешкай руку.

— Аляксей Сцяпанавіч! — звярнуўся Сеня. — Падводу трэба паслаць па ваўкоў.

— Па-біў?!

— Пабіў.

І толькі пасля таго, як прывезлі ваўкоў, а людзі сабраліся паглядзець на іх, абмяркоўваючы ды захапляючыся, Аляксей Сцяпанавіч ацаніў ды зразумеў, што зрабіў Сеня: на такое маглі адважыцца тры паляўнічыя разам, не менш. А Сеня пастаяў перад ваўкамі ў задуме і, не звяртаючы ўвагі на пахвалу ды воклічы, ціха сказаў, гледзячы на «знаёмую»:

— Вось і ўсё... Вось і ўсё...

Яму да болю шкада было разлучацца з ваўчыхай.

Гурэй зразумеў гэта па-свойму і сказаў:

— Гэта, Сямён Сцяпанавіч, цябе гасподзь, ізноў жа, уратаваў.

— Дурны ты, Гурэй Змітравіч, хоць і пажылы чалавек, — адказаў Сеня.

І дзіўна — Шпак ані трохі не пакрыўдзіўся, а сказаў яму так:

— Кожнаму чалавеку, Сямён Сцяпанавіч, богам, ізноў жа, свой розум дадзены. — Ён памаўчаў і з выразнай зайздрасцю гаварыў далей: — Гэта, значыцца, па трыста рублёў за галаву ад дзяржавы — паўтары тысячы, ды за шкуры, ізноў жа, не менш шасцісот! Госпадзі! Больш за дзве тысячы! — Ён пачухаў патыліцу, крактануў ад зайздрасці і падцягнуў штонікі, ухапіўшыся адной рукой за гузік спераду, а другою — ззаду. Гурка-Шпак вельмі шкадаваў цяпер, што не ён пабіў ваўкоў, і яму здавалася, што ён спакойна мог гэта зрабіць. Але ён толькі паўтарыў яшчэ раз: —Ох-хо-хо... Больш за дзве тысячы!

Аляксей Сцяпанавіч дапоўніў:

— Гэта не ўсё, Гурэй Змітравіч: належыцца яшчэ і прэмія ад калгаса па авечцы за кожнага мацёрага ваўка.

Але Сеня не слухаў Гурку. Сеня глядзеў і глядзеў на «знаёмую», не зводзячы вачэй, і сказаў яшчэ раз, ціха, шэптам:

— Вось і ўсё кончана...

Дома ён выцягнуў ваўчаня з падпечка і задумана глядзеў на яго доўга-доўга. А побач сядзела захопленая Маша.

Было гэта два гады таму назад.

Ваўчаня стала ўжо вялікім воўкам. Нікому чужому ён не дазваляе да сябе датыкацца, апроч Косці. Аляксей Сцяпанавіч нязменна кіруе калгасам і часта заходзіць да Сені. Тады воўк глядзіць на старшыню спакойна, з годнасцю.

Наогул, калі вы хочаце пабачыць ручнога воўка, дык заходзьце да Сямёна Сцяпанавіча Трошына проста ў калгас «Светлы шлях». Толькі ўлічыце, днём гаспадара дома няма — ён на працы, абавязкова. Калі ж ён на паляванні, дык прыйдзецца пачакаць яго дзянькі два. Ён паранейшаму любіць жыццё — наша, сапраўднае жыццё, якое часамі адлюстроўваецца і ў кроплі.

# Сяргей Нікіцін

## СЕРПАНЦІН

Ёсць адзін пісьменнік з птушыным прозвішчам... ну, скажам, Ястрабаў...

У той, цяпер ужо далёкі год, я жыў на ціхай вуліцы ціхага горада ў дамку з яблыневым садам і, як умеў, браў ад жыцця ўсё, што давала мне мая дужая бядняцкая маладосць. Самай вялікай радасцю таго жыцця было прачнуцца па досвітку, калі ружовы туман спавівае лістоту дрэў і пад акном падымаюць вэрхал вераб'і. Хоць і кажуць — не радуйся, рана ўстаўшы, а радуйся добраму часу, — я ўсё роўна кожнага ранку ўскокваў з пасцелі ў бадзёрым, без дай прычыны вясёлым настроі і, адзяваючыся, спяваў на ўсё горла які-небудзь бравурны матыўчык без слоў: тра-ля-ля-ля... трам-там-та-там.

Аднойчы менавіта ў такі вось момант рама раптам грукнула, быццам яе расхінуў пругкі скразняк, над падаконнікам вырасла чорная ўскудлачаная галава Грышкі Ястрабава, і ён прывітаў мяне, нядбайна памахваючы рукою.

— Салют, стары! Ішоў міма, чую — спяваеш. Асмеліўся зазірнуць...

— Давай, залазь, — сказаў я.

Ён падцягнуўся на моцных руках і перамахнуў цераз падаконнік. Быў Грышка хлопец рослы, з масіўным падбародкам, напорыстым, з іронінкай, паглядам з-пад выпуклых броваў, і калі гаварыў, то адчувалася, што яго думку лепш не аспрэчваць — знішчыць.

Мы пазнаёміліся з ім яшчэ зімой у горача напаленай і закуранай рэдакцыі раённай газеты. Цяга да пяра і паперы стыхійна збірала там кожны дзень маладых, нявопытных, але поўных надзей і палемічнага запалу людзей, якіх называлі тады пісьменнікамі-пачаткоўцамі, — і сярод іх Грышка Ястрабаў прыкметна вылучаўся як сваёй валявой знешнасцю, магутным напорам у спрэчках, так і тым, што ўжо надрукаваў у раённай газеце апавяданне.

Мне апавяданне не спадабалася. Але дзіўна! Я ўбачыў у гэтым не Грышкаву слабасць, а сваю літаратурную няспеласць і няздольнасць зразумець нейкія таямніцы творчай магіі. Гэтак упэўнівала нас магутнасць Грышкавай веры ў сябе.

У тую раніцу, чокаючыся са мною не дарагім, але смачным паўсухім вінам, купленым на рынку ў прыезджых малдаван, Грышка сказаў:

— Вып'ем за поспех. Я веру, што буду першы... ці ніхто.

Увосень мы абодва былі прыняты ў Літаратурны інстытут. Памятаю сваё адчуванне паўрэальнасці свету, калі дасюль амаль неадушаўлёныя, нематэрыяльныя аўтары прачытаных кніг раптам з'явіліся перада мною ў вобразах жывых, адчувальных людзей. Дзядуля з мінулага стагоддзя Целяшоў і зусім яшчэ бадзёрыя Ціханаў-Себераў і Нікулін, гледзячы на якіх думалася, што Чэхаў, Талстой, Горкі, Купрын не такія ўжо далёкія ад нас у часе, а Бунін, як ляднік, захаваўшы ў засмучанай душы сваёй старую Расію, жывы і дагэтуль і яшчэ не напісаў «Бернара», дзе скажа прарочыя словы: «Думаю, я быў добры мастак...» Высокі, стройны прыгожы Фадзееў і яго ўсмешка, якая кранае не толькі вусны, а асвятляе ўвесь ружова-юны твар, яго сівізна, не шэрая, не блакітнаватая, не зеленаватая, не з жаўцізною, а белая-белая, як бавоўна... Павольны, ціхі голас Паўстоўскага, голас казачніка, голас ванны, ціхі голас Паўстоўскага... Разумны, увесь у дробных рысачках твар Лядроўніка... Разумны, увесь у дробных рысачках твар Ляопава з позіркам, нейкім як бы здалёку, з пакутай... Бас і манапалітнае, помнікавае аблічча «брывапосьбіта» Лугаўскога... І Прышвін — гэткі цыган-канакрад у спакоі — з яго чараўнічымі прамовамі... І маленькі, як мумія, сівавусы, з кругла выпуклымі над павекамі яблыкамі васы, з кругла выпуклымі над павекамі яблыкамі вачэй Серафімовіч у пышнай аправе развітальных кветак...

Памятаю нашу інстытуцкую бібліятэку, захаваную ад усіх пошасных канфіскацый... Памятаю Цвярскі бульвар у пурпуры і золаце восені, у пушыстых снегападах зімы і задуменна сумна схіленую галаву Пушкіна ў святле старадаўніх грапёных ліхтароў... Памятаю трапяткую радасць наступовага далучэння да мастацтва і ведаў праз кнігі, лекцыі, сустрэчы, сяброўскія спрэчкі, літаратурныя ўдачы і расчараванні...

Грышка ўспрыняў інстытут па-свойму.

— Раней мы марнавалі час кожны паасобку, а цяпер

сабраліся ўсе разам і марнуем яго сумесна,— казаў ён.— Працаваць, сябры, трэба працаваць.

І Грышка працаваў. Яго працаздольнасць межавала з самакатаваннем фанатыка. Пасля лекцый, наспех перакусіўшы ў сталоўцы Камернага тэатра, дзе нас па-суседску кармілі нядрэннымі абедамі, ён замыкаўся з дапамогаю ножкі табурэта, прасунутай у ручку пустой аўдыторыі, і выходзіў адтуль пад раніцу, зараслы сівым шчаціннем, з чырвонымі вачамі.

Ён пісаў раман пра беларускіх партызанаў.

— А што ты пра іх ведаеш? — неяк пацікавіўся я.— Калі сам не партызаніў, дык...

— Ты наіўны, стары,— усміхнуўшыся, перапыніў мяне Грышка. — Леў Талстой партызаніў у дванаццатым годзе? Не? Ага! Я пашвэндаўся тыдзень па Шклоўскім і Аршанскім раёнах, схапіў знешнія абставіны, а каб мужыкоў пісаць, мне не пазычаць...

«Пісаць мужыкоў» на Грышкавай мове значыла «ствараць вобразы».

Не памятаю, у якім з выдавецтваў раман у хуткім часе выйшаў у перакладзе на яўрэйскую мову. Па тым часе выхад у студэнта кнігі была падзея ў інстытуцкім жыцці. Мы абмацвалі важкі томік з незразумелымі літарамі, выціснутымі на грубай паперы, і пранікаліся да Грышкі зайздрасцю, пашанай і захапленнем.

— Працаваць, сябры! Працаваць трэба! — разрываўся Грышка ад самазадаволена-шчаслівага смеху.

Улетку мы раз'ехаліся на практыку,— правільней, мізэрна забяспечаныя камандзіровачнымі рублямі, накіраваліся хто куды, людзей паглядзець, сябе паказаць. Я і Грышка Ястрабаў трапілі з брыгадай часопіса «Смена» на Куйбышаўгідрабуд.

Ах, дарога, дарога! Адно гэтае слова ўжо хвалюе мяне... Грукат вагонных колаў... віхор прапелера... крокі па зарослай падарожнікам і аўсянікам палявой дарозе...

Калі збажына налье колас і пачне спець, яна траціць сваю ярка-зялёную афарбоўку і на кароткі час, перш чым пажаўцець, робіцца сівая. У гэты час і адвозіў нас з Масквы ташкенцкі цягнік. Ужо ў самой далёкасці яго прызначэння таілася чароўнасць: не нейкі там прыгарадны — каўроўскі ці мурамскі, а ташкенцкі! Чым далей імчаў ён нас ад Масквы, тым менш было лесу і пералескаў. Масівы жыта павольна віравалі за акном вагона, і хто-небудзь з пасажыраў не-не дый зазначаў уголас, што зба-

жыпа сёлета выдатпая. Гаварылася гэта па пекалькі разоў на дзепь, але ўспрымалася як павіпа і выклікала сярод астатніх пасажыраў дзелавітае ажыўлепне — глядзелі ў акно, згоднаківалі галовамі, размаўлялі пра віды на ўраджай.

Я ўпершыню ехаў у такую далеч, і ўсё, што рабілася ў вагоне і за яго межамі, было прасякпута для мяне асаблівым сэнсам. Праносіліся міма гарады, вёскі, палі, гаі, грукаталі масты, мільгалі старыя тэлеграфпыя слупы, апускаліся і зноў узляталі правады, і агромністая прапягласць краіны адчувалася з такой непасрэдпай відавочнасцю, што міжвольна бянтэжыла думка пра марнасць намагання пазнаць і ўбачыць яе ўсю.

А потым распасцерлася перад вачамі Волга. І яна таксама збянтэжыла сваёй магутпасцю мяне, які вырас на Клязьме, з яе капрызнымі водмелямі, мелкаводнымі ціністымі завадзямі, спакойнымі затокамі ў белых лілеях і жоўтых гарлачыках, ніцымі вербамі, схіленымі над вадой. Адзінокім і згублепым у неабсяжным прасторы адчуў я сябе, упершыню ступіўшы на гарысты бераг Жыгулёў. Да змяркання было яшчэ далёка, але ў здрапцвелай цішыні, у жаўцізне сонечных промняў ужо адчувалася маруднае згасанне дня... Рака быццам ашклянела. Цёмна-зялёная вада маналітнай масай імкнулася ўніз, і на яе паверхні не было ні хваль, пі ўсплёскаў. Толькі далёка на сярэдзіне ды ля берага, дзе тапуў адломлены ад гор камень, яна была ўзрыта градамі дробных хваль. У бледна-блакітным, якім япо бывае толькі перад захадам, небе купаліся чайкі. З аграмаднай вышыні япы кідаліся да вады і здавалася, вось-вось разаб'юцца аб яе. Але не! Чайкі — лёгкія і стройныя — зноў узвіваліся ў неба, зачараваныя кружылі ў ім, і шэрыя крылы іх здаваліся сярэбранымі пад промнямі пізкага сопца — сярэбрапымі ў блакітным... Вось адна з чаек кінула кароткі стогн-крык, і ўся чарада адказала ёй надрыўным плачам. Чайкі быццам клікалі кагось, хто пе прыйдзе. Яны ведалі гэта, але ўсё ж пастойліва кідалі ў прастор свой дарэмны кліч...

І таксама бянтэжыў мяне напачатку вір тутэйшага жыцця — сабраных у цеспым распарадку Жыгулёўскіх гор гэтулькі грукатлівых цяжкіх машып і людзей з Урала, з Башкірыі, з Украіпы, з Казахстапа, Азербайджапа, Беларусі, Грузіі... Не, здавалася, не абняць гэтыя тысячы лёсаў розумам і пе паказаць, пе апісаць словамі.

Грышка засумаваў тут праз тыдзень.

— Гэтая мітусня толькі перашкаджае мне, — бурчаў ён. — Блытае, адводзіць у бок ад асноўнага струменю рамана. Паеду я дадому, сябры. Працаваць, сябры, паеду.

— Схапіў знешнія абставіны? — спытаўся я.

— Схапіў, стары, — сказаў Грышка. — І паеду дадому ўпісваць у іх сваіх мужыкоў.

Увосень у інстытут ён не вярнуўся. Глуха пражыў усю зіму ў маці на бульбе, вадзе і хлебе, а вясною з'явіўся ў сталіцу з раманам пра волжскую будоўлю. Памятаю, як ён, стомлены, шчаслівы, ап'янелы, сядзеў у нас у інтэрнаце за незасланым фанерным сталом і шчодра частаваў хлопцаў з авансу за прыняты часопісам раман, разпораз, як заклінанне, даводзіў сваё:

— Працаваць трэба, сябры, працаваць!

Прыклад быў перад намі. І некаторыя з нас, паддаючыся яго спакуслівай сіле, пачыналі думаць: «А сяду ж і я таксама, кіну ўсё і нашрайбую раман ці аповесць...»

За лета Грышка ажаніўся, стаў жыць у жонкі пад Масквой у прасторным светлым доме з мезанінам і дзвюма верандамі. Блізка да дома падступаў лес, дзе раслі грыбы, па неглыбокім яры бег крынічны, жвавы ручаёк, які не замярзаў і зімою, напаўняючы балацявіны празрыстай, цёмна-зялёнай вадой.

Жонка ў Грышкі была яму да пары — буйная і ўся нейкая відная жанчына. Касметыка ёй была не да твару. Густыя валасы колеру начышчанай чырвонай медзі, бліскучыя зялёныя вочы, белая скура, за якую не бярэцца загар, поўныя чырвоныя губы —усё ў ёй дыхала жыццелюбівай пародай.

Мы цяпер зрэдку бачыліся з Грышкам. Ён зноў працаваў над новым раманам, а ўсякая знешняя перашкода для яго работы расцэньвалася ў доме з мезанінам як святатацтва. Іншы раз, прыехаўшы ў гэты дом, я проста не бачыў гаспадара, пра што, дарэчы, не вельмі шкадаваў, пакінуты сам-насам. Было асабліва добра тут узімку, калі над цёмнай вадой ручая сярод снягоў кучаравіўся тонкі туман і чырвонае пяро паплаўка касяком ішло ўглыбіню, пацягнутае сваволнікам печкуром.

Галіна — Грышкава жонка — была гасцінная і ветлівая, але да мяжы, за якой ляжаў рабочы час яе мужа. Калі Грышка заседжваўся пасля снедання, яна падыходзіла, гладзіла яго па жорсткіх валасах і казала:

— Ястрабочак, нам пара працаваць.

— Іду-іду, старая,— з гатоўнасцю адгукаўся Грышка і ішоў да сябе ў мезапін.

Увечары, пасля вячэры, паўтаралася тое самае.

— Ястрабочак, нам трэба спаць, а то заўтра раніцай ты не зможаш працаваць.

І было відаць, што Галіна ганарыцца сваёй роляй яго апякункі і памочніцы і што перадрук рукапісаў, падшыванне газет, адшукванне патрэбных кніг, даведнікаў, календароў ёй сапраўдная асалода.

Пакой у мезаніне быў завалены гэтай даведачна-інфармацыйнай літаратурай. Грышка пісаў раман пра калгасную вёску, і на двух сталах, на канапе, на падаконніку, на падлозе ляжалі разгорнутыя падшыўкі «Сельскохозяйственной газеты», брашуры, даведнікі старшыні калгаса і агранома, календары прыроды, закладзеныя папяровымі стужачкамі на многіх старонках, і, калі раман дапісваўся, усё гэта ў той жа дзень замяняла даведачная літаратура па металургіі, таму што Грышка пачынаў працаваць над раманам пра Магнітагорск.

Грышкавы раманы друкаваліся. Паспяваючы за ўсімі зменлівасцямі часу, яны мелі бачнасць вастрыні, і аўтара ўшаноўвалі прызнаннем, папулярнасцю, літаратурнымі прэміямі. Грышка бег за часам па пятах, і час не даваў яму перадышкі. Гэтая пагоня нават уяўлялася мне ў адчувальна-бачных вобразах. Вадкая шэрая маса часу, падобная да акіянскага адліву, адступае перад Грышкам, а ён, босы, у талстоўскай блузе бяжыць за ёю і не можа замачыць нават кончыкаў пальцаў.

Прасторную блузу з суравізны пад шнурочны паясок Грышка сапраўды завёў. Адзяваў ён яе толькі дома і быў як патрыярх велічны ў ёй, калі спускаўся са свайго мезаніна па рыпучых пад яго цялеснай масай прыступках. За паясок ён засоўваў вялікую і тоўстую запісную кніжку, якая не памясцілася б у кішэні, і часта ў час прагулянкі, абеду ці размовы нешта размашыста запісваў у ёй.

— Пакажы, Ястрабочак,— патрабавала Галіна і, прачытаўшы, нязменна ўхваляла: — Гэта — якраз тое, Ястрабочак. Ты малайчына!

Здарылася так, што мы не сустракаліся з Грышкам некалькі гадоў. Да таго часу я перастаў ужо чытаць яго раманы, знаходзіў у іх тых самых Грышкавых «упісаных у абставіны мужыкоў», зробленых як па капыл, і цяпер ехаў у загарадны дом, прадчуваючы тую няёмкасць, якая

павінна ўзнікнуць, калі Грышка спытаецца пра свае раманы.

Пры сустрэчы і за абедам ён не спытаўся. Сам Грышка нейк абвяў за гэтыя гады — надоўга апускаў набрынялыя павекі, церабіў свой масіўны падбародак, гаварыў марудна, неахвотна. Перад абедам выпіў некалькі вялікіх чарак гарэлкі, закусіўшы радыскай, і, калі зноў працягнуў руку да графіна, жонка спыніла яго:

— Ястрабочак, ты не зможаш увечары працаваць.

— Адчапіся,— зморшчыўшыся, сказаў Грышка, але піць не стаў.

Пасля абеду ён насуперак звычаю не пайшоў да сябе ў мезанін, а паклікаў мяне гуляць. На ім па-ранейшаму была палатняная блуза, за поясам тырчала запісная кніжка, але з'явілася і новая звычка — абапірацца ў хадзе на сукаватую палку з сярэбранай аздобай.

Мы перайшлі праз пранізаны сонцам, поўны птушынага шчабятання лес да ручая, пастаялі над вадой, прыслухоўваючыся да плёскату, падобнага на ціхі звон, і раптам Грышка, гучна выдыхнуўшы, прамовіў скрозь зубы:

— Бабу сваю ненавіджу.

Я не знайшоўся, што сказаць у адказ, ды ён і не чакаў ніякага адказу, працягваючы гаварыць як бы сам сабе.

— Ведаю, што я несправядлівы, але ўсё мне здаецца, што гэта яна прымушае мяне да мае літаратурападобнай пісаніны. Быццам, каб не было яе, не было гэтага дома, я пісаў бы зусім па-іншаму.

— Ну і пішы,— сказаў я.

— Не магу, стары,— уздыхнуў Грышка.— Я быццам серпанцін жую. Трэба ці ўсю стужку зжаваць ці парваць. А парваць ужо духу не хапае. Я ж ведаю, што мяне адразу ж забудуць, калі я перастану выдаваць штогод па рамане. Мудры стары Уільям Шэкспір праўду сказаў: час праходзіць, а з ім мінае ўсё часовае. Пра свой час трэба пісаць вечнымі словамі.

Вярнуўшыся з прагулянкі, Грышка зноў не пайшоў у мезанін, а сядзеў на адкрытай верандзе ў плеценым крэсле, апусціўшы павекі, церабіў падбародак.

У паніклых ад спякоты клумбах перад верандай стракаталі конікі.

— Куратнікам пахне, га? — спытаўся раптам Грышка, не расплюшчваючы вачэй.

— Якім куратнікам, Ястрабочак? — устрывожана

спыталася Галіна, падыходзячы да яго ззаду.— Ніякага куратніка ў нас няма.

Яна па-ранейшаму была прыгожая пышнай здаровай прыгажосцю трыццаціпяцігадовай жанчыны, і тая самая шчырая гордасць памочніцы ў рабоце мужа заўважалася ў кожным яе позірку на яго, у кожным яе руху.

— Калі ж мы сёння будзем працаваць, Ястрабочак?— спыталася яна, запускаючы руку ў яго жорсткія валасы.

Грышка нахіліў галаву, дастаў з-за пояса сваю тоўстую кніжку і размашыста напісаў у ёй некалькі слоў.

— Пакажы, Ястрабочак,— патрабавала Галіна, са звыклай упэўненасцю працягваючы руку.

Ён выдраў з кніжкі лісток, сунуў яго жонцы і пайшоў праз клумбы прэч.

Галіна трымала перад сабою лісток на далонях і доўга ўчытвалася ў тое, што было напісана на ім, потым раптам з крыкам адкінула яго ад сябе, як агіднага павука, і пабегла ў дом.

Разгублены, я механічна падняў з падлогі гэты пакасую выдраны лісток і, перш чым паспеў уцяміць, што раблю нетактоўнасць, адным позіркам схапіў кароткую фразу:

«Абрыдла ты мне, праклятая баба».

Я зразумеў, што гаспадарам будзе цяпер не да мяне. Паклаўшы лісток на ранейшае месца, на падлогу, быццам ніхто і не падымаў яго, я спусціўся з веранды і пайшоў на станцыю.

*1969*

# Юрый Бондараў

## ЗБРОЯ

Калісьці дужа даўно, на фронце, я любіў разглядаць трафейную зброю.

Гладка адшліфаваны метал афіцэрскіх парабелумаў адліваў варанёнай чарнатой, рубчатая ручка нібыта сама прасілася ў абдымкі далоні, спускавая скаба, таксама да казытлівай гладкасці адпаліраваная, патрабавала кратаць яе, прасунуць указальны палец да цвёрдай пругкасці спускавога кручка; засцерагальная кнопка лёгка зрушвалася, вызваляючы залацістыя патроны да дзеяння,— ва ўсім гатовым да забойства механізме была чужая нудлівая прыгажосць, нейкая тупая сіла закліку да ўлады над другім чалавекам, да пагрозы і падаўлення.

Браўнінгі і маленькія вальтары здзіўлялі сваёй лялечнай мініяцюрнасцю, нікелем ствольных каробак, чароўным перламутрам ручак, вытанчанымі мушкамі над круглымі дульнымі выхадамі — у гэтых пісталетах усё было зручна, акуратна, усё ззяла жаночай пяшчотай, і была ласкавая смяртэльная прыгажосць у лёгкіх і халаднаватых маленечкіх кульках.

І як гарманічна сканструяваны быў нямецкі шмайсер, амаль бязважкі, дасканалы па сваёй форме аўтамат, колькі чалавечага таленту было ўкладзена ў яго эстэтычную стройнасць прамых ліній і металічных выгібаў, якія прываблівалі пакорлівасцю і нібыта чакалі дакранання да сябе.

Тады, больш за трыццаць гадоў назад, я многага не разумеў і думаў: наша зброя грубейшая за нямецкую, і толькі падсвядома адчуваў нейкую ненатуральнасць у вытанчанай прыгажосці прылады смерці, аформленай, як дарагая цацка, рукамі саміх людзей, смертных, недаўгавечных.

Цяпер жа, праходзячы па залах музеяў, завешаных зброяй усіх часоў — пішчалямі, шаблямі, корцікамі, кіп-

жаламі, сякерамі, пісталетамі,— бачачы багатую інкрустацыю зброевых лож, брыльянты, упраўленыя ў эфесы, золата, што блішчыць у ручках мячоў, я з гідлівым пачуццём супраціўлення пытаю ў сябе: «Чаму людзі, падвержаныя, як і ўсе на зямлі, ранняй ці позняй смерці, рабілі і робяць зброю прыгожай, нават вельмі прыгожай, надобнай па ўзор мастацтва?

Ці ёсць які-небудзь сэнс у тым, што жалезная прыгажосць забівае самую вышэйшую прыгажосць творчасці — чалавечае жыццё?»

## Уладзімір Лідзін

# СТАРАЯ ЯБЛЫНЯ

У камандзіроўцы мастак Амвросіеў пасяліўся ў дужа старой хаце, дзе некалі жыў вясковы настаўнік Іўлеў; цяпер сядзібу займаў ветпункт. Амвросіеў узяў з сабою фарбы і палотны, і першым яго памочнікам стаў піянер Паўлік Белацветаў, сын ветэрынарнага фельчара. Ён цягаў за ім мальберт, з глыбокай пашанай гадзінамі сачыў за яго працай, і кожны новы эцюд выклікаў у ім стрыманае захапленне. Яму падабаўся і сам мастак — каржакаваты, кудлаты, з ружовымі поўнымі шчокамі і моцнымі рабочымі рукамі. Спадабаўся і Паўлік мастаку — яго далікатны бледнаваты твар са строгімі шэрымі вачыма, каштанавая пасмачка валасоў на чыстым высокім ілбе і тоненькая шыя ў шырокім каўняры летняй кашулі.

Аднойчы, калі яны пасябравалі, Паўлік рашыўся даверыць мастаку вялікую таямніцу: ён павёў яго на гарышча, дзе ляжалі стосы старых газет і часопісаў, ірваны матрац, з якога выпіралі спружыны, плеценыя крэслы з парасплятанымі завіткамі і футарал з-пад віяланчэлі з выдранаю ўсярэдзіне абшыўкаю.

— Заходзьце,— таямніча сказаў Паўлік і адразу зачыніў дзверы на засаўку.— Усё гэта я знайшоў на гарышчы, дзе ніхто ніколі не бывае, і ўсё гэта даўно б спалілі ці скурылі. А я кожны дзень прыходжу сюды і чытаю.

Каля акенца стаяла плеценае крэсла, у якім Паўлік, зручна ўладкаваўшыся, звычайна чытаў, цешачыся таямнічай адзінотай. З акна быў відаць двор ветпункта, некалькі сумных апоеных ці з падседамі кабыл, якіх лячыў Паўлікаў бацька, высокі, вірлавокі, падобны на Мусаргскага ветфельчар Белацветаў. Сярод кучы кніжак, што ляжалі на падлозе, болей за ўсё было часопісаў «Педагогический листок», «Сад и огород» і пухлых, цаглянага колеру кніжак «Вестника Европы».

— Гэта ўсё дужа рэдкія кнігі,— пачціва сказаў Паў-

лік, здзьмухваючы пыл з адной.— Я спачатку ўсё прачытаю, а потым аддам у нашу школьную бібліятэку. А вось гэта я таксама знайшоў сярод кніг.

І Паўлік трохі раўніва падаў мастаку стос звязаных аборкаю сшыткаў. Мастак развязаў аборку і ўбачыў, што ў сшытках — вучнёўскія сачыненні на тэму «Любоў да роднай прыроды». Пад адным сачыненнем алоўкам была пастаўлена адзнака «5», і тым самым чырвоным алоўкам у сачыненні была падкрэслена фраза: «Прырода нам сябар, калі мы дапамагаем ёй, і можа быць ворагам, калі мы адступаем перад ёй».

Мастак узяў у Паўліка з рук сшытак і сеў з ім у крэсла перад акенцам.

— Ведаеце, я вырашыў аддаць гэтыя сшыткі нашай настаўніцы біялогіі,— сказаў Паўлік, трывожна пазіраючы, ці асцярожна мастак гартае старонкі.— Напэўна, яны могуць спатрэбіцца ёй.

Калі трымаеш у руках сшыткі вучняў, якія даўно ўжо сталі дарослымі ці нават старымі людзьмі, заўсёды робіцца сумна: час ідзе, мяняюцца пакаленні; тыя, што некалі былі зусім маладыя, даўным-даўно пражылі сваё жыццё, і час, быццам марскі прыбой, змыў усё з берага... Але ці бясследна знікае тое, што ён змывае? Сіла марскога прыбою не толькі зносіць пясчынкі, але і намывае берагі. Мастак трымаў у руках сшыткі і глядзеў у акенца, за якім ляжаў зіхоткі, моцны летні дзень.

— А яшчэ,— ужо зусім даверліва сказаў Паўлік,— сярод старых газет я знайшоў адну кніжачку, паглядзіце. Я думаю пакінуць яе сабе.

І ён беражліва падаў мастаку вузкую, пераплеценую ў чырвоны каленкор кніжачку «Календарь сельского хозяина на 1899 год». У гэтым дадатку да часопіса «Сельский хозяин» на адвароце тытула было пазначана імя, імя па бацьку і прозвішча ўладальніка, Севяр'яна Апалонавіча Іўлева. У календары была надрукавана сістэма мер, даведачная садоўніцкая кніга з раздзеламі садоўніцтва і гародніцтва, звесткі пра тое, як даглядаць газоны і кветнікі і шмат старонак для паметак, спрэс спісаных высокім вузкім почыркам. І з гэтых запісак мастак даведаўся, што настаўнік Іўлеў сам быў апантаны аматар прыроды і садоўнік.

«1899. Зіма снежная, вельмі суровая. Але ў другой палове снежня ўсталявалася цёплае надвор'е. Часта былі адлігі, былі і маразы да 15°—18°, але рэдка. Люты —

раз'юшаны месяц са снегападамі. Сёння, 23 сакавіка, увечары прыляцелі гракі, займаюць гнёзды, разносіцца іхні крык. Удзень усё растала, пачарнела. Гракоўні яшчэ не ўсе занялі гракі. У вераб'ёў шчабятанне вясновае. Вечар шэры, але блакітнае неба свіціцца.

Я часта думаю пра сваю працу настаўніка. Настаўнік не пакідае ніякага матэрыяльнага следу сваёй дзейнасці, і ніколі нельга падвесці рысу: што ты зрабіў і якія вынікі тваіх сціплых намаганняў. Нядаўна напісаў пісьменніку Чэхаву, які заўсёды так спачувальна малюе жыццё настаўнікаў, пра свае думкі і атрымаў у адказ слаўны ліст. Чэхаў піша, што для культуры важныя ўсе дзеячы— і вялікія і маленькія, што кожная вялікая рака складаецца з маленькіх рачулак і ручаёў, без якіх не было б і самой ракі. Я люблю нашу родную прыроду — нашы палі, лугі, лясы,— яна навучыла мяне неяк асабліва адчуваць дзяцей. У кожным нясмелым парастку жыве будучыня, і калі я на ўроках расказваю падлеткам, што часта наведваюць мой сад, пра жыццё прыроды, пра яе красу і мудрыя законы, мне здаецца, што я саджу сад і ад мяне шмат у чым залежыць росквіт гэтых, пакуль яшчэ нясмелых, парасткаў.

...Летні цёплы дзень. Вечарам праліўны дождж. Ноч сцюдзёная. Раніца шэрая. Туман. А 5 гадзіне выглядае сонца. Вечар ясны, афарбоўка зары пагодлівая.

Вось ужо шмат гадоў, як я дзень пры дні занатоўваю з'явы прыроды; можа быць, мае штодзённыя запісы дапамогуць вылічыць сярэднюю колькасць ападкаў у нашай паласе, запасы вільгаці на палях, час прыходу пораў года, і некалі ў шчодрым плёне будзе часцінка і маёй працы. Калі я думаю пра гэта, настаўнікава жыццё здаецца мне незвычайна поўным, а кола маіх хлопчыкаў, якіх я вучыў і вучу, надзіва разрастаецца ў часе...»

Далей, упераменшку са звесткамі пра надвор'е, ішлі запісы пра тое, як упарадкаваць стары сад і як узімку даведацца, ці пашкоджаныя пупышкі кветак.

— Дык праўда,— запытаўся Паўлік, акругляючы вочы,— усё гэта не можа прапасці?

Ён ніяк не хацеў зміры́цца з тым, што і вучнёўскія сачыненні пра прыроду і настаўнікавы нататкі пра яе могуць забыцца назаўсёды.

— Безумоўна, не,— адказаў мастак,— ні адно добрае пасеянае семя не прападзе... і тым, што ты піянер і што ў цябе наперадзе вялікае жыццё, ты абавязаны многім з

тых, чые імёны паглынуў час. Але іх слаўныя справы ён ашчаджае і пакідае нам.

— А ведаеце,— адгукнуўся Паўлік,— у нашым садзе зберагляся старая яблыня, якую пасадзіў яшчэ Севяр'ян Апалонавіч... гэта чырвоны апіс, хадзем, я пакажу.

Яны злезлі з гарышча, і Паўлік завёў мастака ў сад. Старыя яблыні часткова вымерзлі ў лютую зіму, часткова загінулі ў вайну, і цяпер на роўпай адлегласці адзін ад аднаго ўзнімаліся саджанцы. Толькі магутная яблыня, на якой ужо была завязь, быццам вызначала, якімі павінны стаць саджанцы.

— Гэта і ёсць чырвоны апіс,— сказаў Паўлік, знізіўшы голас і быццам адкрываючы мастаку яшчэ адну таямніцу.

Амвросіеў падышоў да дрэва і абапёрся на яго ніжнюю галіну. Ён успомніў стос вучнёўскіх сачыненняў пра прыроду і дзённік старога настаўніка, які адлюстраваў і хаду зімы, і красу вясновага абуджэння, прылёту гракоў, летніх ліўняў, пагодных світанкаў, і запаветнае настаўнікава спадзяванне, што яго праца не кане ў нябыт.

— Ану, Паўлік, давай прынясём мальберт і скрынку з фарбамі... трэба ж дапісаць учарашні пейзаж,— сказаў ён праз хвіліну.

Яны пайшлі, і мастак, быццам захоплены новай думкай, дадаў:

— Ёсць добрая казка ў дацкага пісьменніка Андэрсена... Аднойчы вылупілася з яйца лебедзянятка з чатырма залатымі пярсцёнкамі на шыйцы, і нейкая маці раздала гэтыя пярсцёнкі сваім чатыром сынам. Адзін з іх стаў скульптарам, другі мастаком, трэці кампазітарам, а вось чацвёртага пацалаваў сонечны прамень, і ён стаў уладальнікам пярсцёнка шчасця. Гэта была натура паэтычная, і яго думкі сягалі высока ў неба. Ёсць такія людзі, усё, да чаго яны дакрануцца, пачынае гучаць пад іхнімі рукамі, і думкі ў іх незвычайна шырокія, яны падпарадкоўваюць сабе час... і нават коні разумеюць іх з першага слова.

Ён успомніў, як ветфельчар Белацветаў неяк расказаў яму пра Паўліка, што жывёла ставіцца да яго з асаблівым даверам і нават хворую нагу коні падаюць яму спакойна.

Пакой Амвросіева знаходзіўся ў бакавым флігелі, і там ужо быў беспарадак, як у майстэрні мастака: на мальберце сох пачаты пейзаж — купка дрэў, паміж якімі свіцілася азоранае сонцам макавае поле,— і на падлозе стаялі падрамнікі, зробленыя калгасным цесляром. Мастак па-

дышоў да мальберта, доўга глядзеў на пейзаж, адышоў, каб паглядзець яшчэ здаля, і Паўлік раптам убачыў, як ён тонкім, гнуткім нажом пачаў здымаць з палатна непрасохлую фарбу і як пейзаж быццам раставаў пад яго рукой.

— Што... што вы робіце? — усхваляванa выгукнуў Паўлік, але мастак моўчкі, пачырванеўшы ад напружання, з сілай вадзіў нажом па палатне, пакуль пейзаж не знік зусім.

— Вось цяпер будзе выдатны грунт,— сказаў ён з задавальненнем.— А пож гэты называецца мастыхін, карысная рэч... часам лепей за пэндзаль памагае мастаку знайсці сябе.

Ён перакінуў цераз плячо рэмень ад скрынкі з фарбамі, узяў складанае крэсла, а Паўлік, усё яшчэ ўзрушаны і разгублены, нёс за ім мальберт і вялікі палатняны парасон. Яны пайшлі ў сад, і мастак выбраў мясціну непадалёку ад старой яблыні.

— Бачыш, Паўлік, у кожнай карціне перш за ўсё павінна быць выяўлена глыбокая думка мастака... інакш карціна мёртвая, што б там за дзівосы на ёй ні былі намаляваны.

Сціснуўшы зубы, похапкам змешваючы фарбы на палітры тым самым гнуткім нажом, здалёк нацэльваючыся, перш чым пляснуць пэндзлем па палатне, Амвросіеў узяўся за працу. Ён маляваў старую яблыню з моцнымі, тугімі завязямі і маладзенькую яблыньку, якой старое дрэва быццам перадавала запавет плоданашэння. І Паўлік Белацветаў, сочачы за ўпэўненымі рухамі дужай, з кароткімі пальцамі рукі мастака, цяпер ужо настойліва думаў, што «Календарь сельского хозяина» ўсё-ткі трэба аддаць настаўніцы біялогіі.

## Уладзімір Салаухін

# ДЗЯЎЧЫНКА НА МАРСКІМ УРЭЗЕ

Парады просяць, калі хістаюцца. Рашэнне яшчэ не прынята. Усё яшчэ можна зрабіць і так, і гэтак. Ланцужок жыцця, ланцужок падзеяў, фактаў, лёсаў, пачынаючы ад пункта прынятага рашэння, будзе вязацца і плесціся ці такі, ці іншы. Дык як жа тут, скажыце, не хістацца?

Парайце вы вашаму сябру Сяргею не жаніцца з дзяўчынай Таняй, ён паслухаецца вашай парады і не жэніцца. Што ж адбылося? А тое, што з адказнасцю настолькі дзіўнай, якую, бадай, лепш назваць безадказнасцю, вы перасунулі рычагі, пераялі вельмі важныя стрэлкі, і цяпер некалькі цягнікоў панясуцца ў прасторы і часе па іншых пуцях, чым яны панесліся б без вашай парады, пра якую вы, прачнуўшыся на другі дзень, чаго добрага, і не ўспомніце.

А цягнікі гэтыя — лёсы. Лёс самога Сяргея. Лёс беднай Тані. А можа, і не беднай. Лёс Сяргеевых і Таніных дзяцей, але ўжо не іх сумесных дзяцей, заўважце гэта! У іх павінны былі нарадзіцца Светачка, Ірачка і Андрэйка, з якіх пасля выйшлі б эстрадная спявачка, настаўніца і тэхнік па рамонту тэлевізараў. А цяпер у Тані зусім не будзе дзяцей, а ў Сяргея народзяцца Танечка і Славік. Танечка сяк-так паступіць у лясны інстытут, а Славіка возьмуць у армію. Іхняя часць будзе стаяць на Украіне. Ён ажэніцца з мясцовай дзяўчынай і населіцца каля Вінніцы. Уладзіцца ў саўгасе трактарыстам, а дома разводзе парасят і гарбузы ў агародзе.

Вось што вы нарабілі сваёю парадай!

А хіба ж мы ведаем, што за дзеці нарадзіліся б у Светачкі, Ірачкі і Андрэйкі, якія не нарадзіліся па вашай віне? І што за дзеці народзяцца ў Танечкі і Славіка, і чаго яны натвораць, жывучы на зямлі.

Даючы тую колішнюю параду, я не задумваўся над важнасцю таго, што адбываецца. І занятак быў у мяне самы празаічны: я сядзеў за сталом і еў паўднёвую страву,

прыгатаваную з салодкага перцу, кабачкоў, памідораў, зялёнай фасолі і цыбулі.

З гэтым домам я ўпершыню пазнаёміўся гадоў дванаццаць назад (божа мой, як ляціць час!), зусім выпадкова. Ішоў па перагрэтай прыморскай вулачцы, шукаючы пакоя. У палавіне верасня ўзбярэжжа прыкметна пусцее, свабодныя пакоі трапляюцца часта. Аднак выбраць з многага заўсёды цяжэй, чым проста знайсці.

Дварок, зацененны асаблівым, пападным чынам, і дамок, што бялеў у глыбіні зеляніны, спынілі мяне. Я адчыніў брамку, пайшоў па простай дарожцы, і навіслыя гронкі чорнага вінаграду, замглёнага белым пылком, увесь час, пакуль я ішоў, прасілі, каб я падставіў прасторныя прыгаршчы і прыняў у іх цяжкую, прахалодную гронку.

Мне паказалі пакой з акном на старую вузлаватую хурму, дзікую, асыпаную дробнымі, як чарэшні, жоўценькімі пладамі, на падобныя да бамбуку кукурузныя сцёблы, паміж жаўтлявасцю якіх віднелася яркая сінеча блізкага мора. У пакоі стаялі ложак, стол і шафа для вопраткі,— значыцца, усё, што мне трэба.

Гаспадыня ўзялася і карміць мяне. Я садзіўся за стол тройчы ў дзень і неўзабаве ведаў ужо ўсю сям'ю.

Галава сям'і Міхаіл працаваў на рыбзаводзе. Ён вяртаўся дахаты пасля шасці гадзін вечара, і ад яго пахла салёнай рыбай.

Гаспадыня Каця працавала толькі дома, на ўчастку. Зямля патрабавала догляду, дзеці таксама.

Увосень пачыналася асаблівая пара. Налівалі ў бутэлькі цыцабель, запячатвалі іх дротам і смалой, закопвалі ў зямлю. Нарыхтоўвалі аджыку. Варылі, марынавалі, салілі, сушылі, вялілі. Душылі вінаград. Вінны пах стаяў над вёскай.

Сям'я была руская, але рабілі яны ўсё тое ж, што і мясцовыя людзі, значыцца, тое, што вымагалася кліматам, зямлёй, усялякімі пладамі, якія выспявалі на гэтай зямлі, і звычаямі народа, які ўрабляў гэтую зямлю.

Міхаілу было гадоў сорак пяць, Каця выглядала гадоў на дзесяць маладзейшай, але, магчыма, іхняя розніца ў гадах была не такая вялікая.

Старэйшаму сыну маіх гаспадароў споўнілася чатырнаццаць год: ён вучыўся ў восьмым класе. Дачка Людачка перайшла ў шосты.

Як гэта часта бывае, на другі год мы спісаліся, і я прыехаў адразу да маіх добрых гаспадароў. Так і пайшло ў

мяне — кожную восень у іх чысты дамок. Раскладзеш рэчы, паперы па стале, паглядзіш у акно, убачыш марскую сінечу паміж кукурузнымі сцёбламі, і на душы стане цёпла і ціха, лёгка і радасна. Ці шмат чалавеку трэба?

Значыцца, я сядзеў за сталом і еў паўднёвую страву, прыгатаваную з салодкага перцу, кабачкоў, памідораў, зялёнай фасолі і цыбулі, запіваючы яду маладой, духмянай «ізабэлай». Каця сядзела насупраць мяне і лушчыла часнок для салення. Віктар зайшоў у пакой, узяў падводную стрэльбу, ласты і пайшоў да мора. Людачка была невядома дзе. Міхаіл яшчэ не вярнуўся з працы.

Гаворка ў нас з Кацяй ішла самая дзяжурная, штодзённая, немагчыма і прыгадаць, пра што мы тады гаварылі. Ды гэта і не мае значэння. Хоць, бадай, нядрэнна было б і прыгадаць, як гэта іменна наша зусім нязначная размова дайшла да таго нечаканага пункта, калі Каця, трохі збянтэжана і пачырванеўшы, падзялілася са мной:

— Не, мы з Мішам цвёрда вырашылі. Віктар, можна сказаць, на нагах. Людачка таксама стала дарослай дзяўчынкай. Няўжо ж цяпер зноў усё пачынаць? Гэта толькі збоку гледзячы добра. Або каму па дзяцей не пашанцавала, дык тыя сумуюць. Гэта я разумею. Бо добра ж гаворыцца: «Без дзяцей дрэнна, а з імі яшчэ горш». Мы, богу дзякаваць, дваіх выгадавалі. Доўг перад прыродай выканалі.

Наконт прыроды і доўгу яна сказала з пэўнай гарэзлівасцю, са смяшком, а ва ўсім іншым была нават аж надта сур'ёзная.

— Мы цяпер вольныя птушкі, рукі нашы развязаны. Захочам — тут будзем жыць, захочам — у Расію паедзем, бліжэй да родных мясцін. І наогул... Хіба ж хто ведае, колькі я перажыла, калі ў Людачкі было двухбаковае запаленне лёгкіх у двухгадовым узросце? А як я яе ўсё ночы навылёт на сваім плячы насіла, і так цэленькі год?

— А чаму трэба было насіць?

— Крычала. Удзень маўчыць. А як толькі нам спаць лажыцца, дык і давай канцэрт. Дзярэцца і дзярэцца. Пакуль на плячы носіш — маўчыць. Толькі пакладзеш — зноў на ўвесь свет. Я стала на цень падобная. І парадзіць — не цукерачку з'есці. Мы забываемся. Так яно, відаць, наладжана, каб жанчыны забываліся. А гэта ж пакута страшэнная. Крычым жа мы, вішчым, як парася недарэзанае. Не ўжо, успомніш толькі... Брр! Ну, дый гады ўжо не тыя. І Міша, як вы ведаеце... выпівае. Ці мала як

гэта на дзіцяці адаб'ецца. Народзіцца які-небудзь трыгубы. Вы якога, дваццатага ад'язджаеце? Ну вось, вас правядзём, дваццаць трэцяга я і пайду. Чацвер будзе — добры дзень.

Што за настрой напаў на мяне? Я і сам разумеў, што гэтым двум людзям, якія ў свой час прайшлі цераз маладосць, закаханасць, наладжванне гнязда, нараджэнне дзяцей, не патрэбна цяпер новае піскляня. А калі і патрэбна, дык — божа мой! — ні Віктар ні Людачка лішне з гэтым не адцягнуцца. Не паспееш апамятацца — вось табе ўнук! Спрытныя пальцы жанчыны лушчылі часнок. Галоўка трэскалася і з лёгкім гукам рассыпалася на долькі. Белае і ліловае шалупінне заставалася ўбаку, і было яго шмат у параўнанні з моцнымі, глянцавапымі долькамі на талерцы, і яны захоўвалі ў сабе той вельмі моцны, вельмі складаны экстракт, выпайдзены прыродай, які мы, людзі, паміж сабой пазываем часнаком.

Кацімы пальцы спрытна яго лушчылі. Я заглядзеўся на іх і іменна па рабоце пальцаў, па іх амаль няўлоўным хваляванні зразумеў, што вырашыць справу Каця з Міхаілам, дамо ім веры, вырашылі, а ўсё ж цяпер, у гэты момант, Каця чакае яшчэ і майго слова, парады, ухвалы іхняму ўчынку.

Выразна памятаю, што я хацеў сказаць: «Правільна вырашылі. Вядома, прыйдзецца перанесці аперацыю. Ды ў наш час ад яе, здаецца, ніхто яшчэ не памёр. Адпачніце, пажывіце спакойна. Хутка ўнукі пойдуць. А ці ведаеце вы, што ўнукаў любяць больш, чым сваіх дзяцей?» Тут я, магчыма, развіў бы тэорыю пра ступені біялагічнага сваяцтва паміж бліжэйшымі і наступнымі пакаленнямі, аднак замест усіх гэтых развяжанняў я нечакана і прастадушна спытаўся:

— А не шкада?

Пальцы ўздрыгнулі і выпусцілі дольку часнаку, якую лушчылі. Каця ўзняла галаву і паглядзела на мяне здзіўлена.

Я не разумеў, што ад мяне цяпер, па сутнасці, залежыць жыццё чалавека: нарадзіцца яму ці не нарадзіцца, быць ці не быць. Высокія матэрыі былі мне ў той момант чужыя. Я хацеў ухваліць рашэнне сям'і, а замест гэтага ляпнуў сваё недарэчнае, не да месца: «А не шкада?»

— Калі б усе шкадавалі...— пачала Каця і не дакончыла фразы.

Хтосьці гаварыў за мяне далей, вёў сваю лінію:

— Мне часткова вядома гэтае адчуванне. Я паэт, а павінен займацца прозай.

— Але ж вы пішаце і вершы.

— Час ад часу. Аднак калі б я не займаўся прозай, дык вершаў у мяне было б значна больш. Я недалічваюся некалькі сотняў вершаў. Атрымліваецца так, што проза іх задушыла; з-за яе яны не з'явіліся.

— І вам не шкада? — з гаркаватай усмешкай спыталася Каця.

— Не тое каб шкада,— сур'ёзна адказаў я,— але часамі хочацца ведаць, якія гэта былі б вершы, пра што, наколькі добрыя ці дрэнныя, і, паверце, туга нападае. Робіцца страшна ад незваротнасці таго, што адбылося, ад таго, што я ніколі ўжо не даведаюся, што задыхнулася, загінула ва мне пад цяжкімі глыбамі праклятай прозы.

Я памаўчаў і ўдарыў, кажучы па-спартыўнаму, ніжэй пояса:

— А жанчыны хіба не думаюць пра сваіх дзяцей, якія не нарадзіліся? У вас жа, відаць, не першы аборт. Скажыце, ніколі вам не хацелася хоць адным вокам зірнуць на дзяцей, якіх вы атруцілі?

— Навошта ж вы так? — Каця збялела, губы яе задрыжэлі.

— Прабачце, вядома, я грубавата выказаўся. Але звычайна жанчыны ў гэтым не раскайваюцца. Толькі адна жанчына раскайваецца і пакутуе, дый то з такой прычыны, што памерла дачка, а дачцэ прысніўся сон.

— Які сон? — насцярожылася Каця.— І як гэта дзяўчынцы прысніўся сон, калі яна памерла?

— Перад смерцю. Дзяўчынка памірала і ведала, што памірае. І маці ведала. І вось у дзень смерці, раніцай, дзяўчынка кажа: «Бедная мама. Застанешся ты адна. Мне прыснілася сёння, што ты стаіш на паляне і навокал цябе шмат дзяцей. Тры дзяўчынкі і чатыры хлопчыкі. Ды толькі ж усе яны жахлівыя, іх так шкада, бо у аднаго галава падобная на бутэльку, у другога тры нагі. У дзяўчынкі замест рук маленькія лапкі, як быццам крылейкі аскубленага куранияці. Страшэнны-страшэннейшы сон. А ты іх усіх абдымаеш і плачаш. І нібы я бягу да іх, і яны пачынаюць са мною гуляць...» Жанчына чула гэта і не чула, бо не тым была занята яе галава. Потым, аднак, праз месяц, увесь час успамінаючы ды перабіраючы ў памяці апошні дзень сваёй беднай дзяўчынкі і кожнае слова яе, жанчына раптам пахаладзела ад супадзення. Яна прыгадала,

што ў жыцці сваім зрабіла імсння сем абортаў. І сямёра дзяцей прысиілася перад смерцю дзяўчынцы. Дык, вы ведаеце, яна ледзь-ледзь не звар'яцела. Здаецца, яе нават лячылі.

— Як страшна вы гаворыце. Я не думала, што вы такі злосны...

Тут прыбегла Людачка. Гутарка наша перапынілася, і больш мы да яе не вярталіся. Праз некалькі дзён я паехаў у Маскву, а потым выпала некалькі няўдачлівых гадоў, без паўднёвага сонца, без цёплага мора, без пакоя, які выходзіць вокнамі на старую вузлаватую хурму і на кукурузу, якая зычна шапаціць тады, калі на сакавітым і гучным блакіце з'яўляюцца зыркія белыя баранчыкі.

Ішлі верасні і кастрычнікі, таксама цудоўныя, з жаўталісцем у бярозавых гаях, з паласатымі рыжыкамі ў маладым сасонніку, з крыштальнымі замаразкамі ўранні або ўжо з чорнымі дажджлівымі начамі, у якіх пачуцця і настрою не менш, чым у празрыстым ранні ці ў сонечным поўдні.

Ды цела запудзілася па саланаватым ёдзістым ветрыку, па цёплай, але ўжо не гарачай гальцы і па той невыказнай аксамітнай пяшчоце, якую ўмее дарыць толькі марская вада.

Больш чакаць я не мог. Пакінуў усю мітусню (а асноўная справа заўсёды са мной) і паехаў, памчаўся да мора. Пасля доўгага перапынку я падыходзіў да пасёлка каля рыбазавода, нібы да роднай вёскі, па якой засумаваў. Каля знаёмай брамкі паставіў свой чамадан і ўжо з прыемнасцю прадбачыў усплёск рукамі і воклічы, непазбежныя пры нечаканай сустрэчы. Усмешка загадзя расплылася на маім абліччы, і як бы я ні хацеў яе сагнаць, яна рабілася толькі шырэйшая і больш прамяністая, сказаў бы я, калі б гаворка ішла пра чужую ўсмешку, а пра сваю прыходзіцца сказаць, што яна рабілася ўсё больш ды больш дурною.

Дурною яшчэ і таму, што ніхто не ішоў мне насустрач па дарожцы ад белага доміка да брамкі, пад гронкамі чорнага вінаграду, якія таксама, як і заўсёды, звісалі з мудрагелістых, загнутых у выглядзе аркі лозаў.

Пакінуўшы чамадан на вуліцы, я пайшоў да доміка і каля ганка заўважыў чужую дзяўчынку, якая забаўлялася марскімі каменьчыкамі.

Дзяўчынка перапыніла гульню і ўзняла на мяне... Ну, як жа там гаварылася ў старых сентыментальных раманах? Васількі вачэй? Незабудкі вачэй? Бываюць жа ў ма-

лых такія сінія, такія светлыя вочы! Разам з тым у позірку дзяўчынкі не было ніякай малечай наіўнасці і, як бы гэта сказаць, блакітнасці херувімчыка, анёлачка, ці што. Наадварот, позірк яе быў напоўнены сур'ёзнасцю і нават строгасцю.

Трэба было як мага даўжэй, ухапіўшыся, як за саломінку, трымацца за гэтыя вочы. Ды што рабіць? Адначасова я ўбачыў і тое, што сама дзяўчынка жахліва, безнадзейна непрыгожая. Штосьці бабульчына, штосьці ад зморшчанага печанага яблыка, штосьці ад жалю вартай малпачкі было на яе тварыку. А самае галоўнае, і гэта ўразіла мяне, як стрэл, у дзяўчынкі была раздвоеная, заечая губа. З адкрытай надзеяй на цуд, як быццам я вываліўся з самалёта і спадзяваўся застацца жывым (такія выпадкі бываюць), я спытаўся:

— Чыя ж ты?

— Міронава,— адказала дзяўчынка.

— Як гэта — Міронава? Міронавых я ўсіх ведаю.

— Я Міронава. Я не вінавата.

«Бог мой! Ну вядома ж, ты не вінавата! — зіхатнула ў маёй галаве.— Гэта я, я ва ўсім вінават! Пачаў плесці тады лухту несусветную. Закрануў за жывую струну, і вось ён — вынік! Параіў, называецца, адгаварыў, пераканаў. Дзяўчынка, міленькая, а ці ведаеш ты, што, каб не я, цябе магло б і не быць?..»

Я глядзеў на яе, як на цуд. Непрыгожасць яе стушавалася і адышла па задні план. Рукі, ногі, задзёрты носік, вяснушкі на носіку і вочы, як быццам па зіральныя адтуліны ў нейкую пасудзіну, у якой гарыць роўнае сіняе святло. Чароўны агонь. Агонь любові, чысціні, прыняцця свету. Агонь душы. І ўсё гэта ўжо ёсць, рухаецца, адказвае на пытанні, моршчыць лабок, усміхаецца. І ўсяго гэтага магло б не быць. Павінна было не быць. А дзе ж яно было б? Куды падзелася б? Недарэчным чынам усплыла ў памяці фраза нейкага індыйскага мудраца (Гандзі?), якую я не памятаў свядома, але якая калісьці, відаць, засела ў памяці: «На гэтым свеце рэдка ўдаецца парадзіцца ў выглядзе чалавечай істоты».

— Дзяўчынка, а як жа ты завешся?

— Аннушка.

— А дзе мама?

— На рынак пайшла. А ты хто?

— Мяне завуць дзядзька Пеця. Я раней жыў у вас вунь у тым пакоі.

— А цяпер там мой ложачак.

— І добра. Толькі ці можна мне ўнесці чамадан? Я пачакаю тваю маму.

— Хочаш, дык пакажу табе мае сакрэты?

— Калі ты не баішся іх адкрыць...

— Я цябе не баюся,— адказала Аннушка і павяла мяне за вугал дома. Мы прыйшлі на пляцоўку, засыпаную пяском, дзе валяліся шуфлікі, лапатачкі і формачкі.— Зараз ты ўбачыш сакрэт. Яны вельмі прыгожыя. Глядзі.

У адным месцы Аннушка пачала разграбаць пясок, які ляжаў тут даволі тоўста. Я чакаў, што яна выцягне з пяску якую-небудзь цацку, што-небудзь схаванае. А то, быць можа, там у яе хто-небудзь пахаваны, птушка, напрыклад? Тым больш нечаканым было тое, што я ўбачыў. Я нават не адразу зразумеў, што гэта такое і як яно зроблена. Але Аннушка не ашукала: гэта было прыгожа. Дзіўна, што мы не ведалі гэтага ў нашым маленстве і што я нідзе не сустракаў гэтага раней. Ці не прыдумала гэта Аннушка сама?

Сакрэт быў у тым, што ў пяску на пэўнай глыбіні былі паложаны розныя кветкі, адны толькі галоўкі кветак без сцяблінак і лістоў. Кветкі гэтыя былі пакладзены цесна, адна да адной, прыціснуты асколкам шкла велічынёй з чайны сподачак і прысыпаны пяском. Калі Аннушка разграбала пясок, кветкі пад шклом, сплюшчаныя ў роўную плоскасць, з'явіліся ў маіх вачах маляўнічаю плямай, як нейкі скарб, нечакана знойдзены ў зямлі.

— Ну і сакрэт! — вырвалася ў мяне.

— Праўда, хораша?

— Вельмі! Пакажы яшчэ, калі ёсць.

Аннушка падводзіла мяне то да аднаго месца пясчанай пляцоўкі, то да другога, прыглядалася нейкі момант, нібы бачачы скрозь зямлю, і пачынала адкрываць чарговы маленькі цуд. Кветкі былі розныя. І яшчэ ярчэй, яшчэ больш незвычайна ўспыхнулі і засвяціліся яны, калі Аннушка адкапала мне «сакрэт» не на пясчанай пляцоўцы, а ў звычайнай чорнай зямлі, каля градкі з гуркамі. У адным месцы пад шклом ляжалі рознакаляровыя марскія каменьчыкі, і гэта таксама атрымалася нечакана і прыгожа, хоць і не так, як з кветкамі.

— Праўда, прыгожыя каменьчыкі?

— Праўда.

— Хадзем да мора, я і табе такіх набяру. Я ведаю, дзе водзяцца найпрыгажэйшыя каменьчыкі.

— А што ж, хадзем. Я пакупаюся з дарогі. Колькі год не акупаўся ў сіняе мора.

— Колькі год?

— Цябе яшчэ не было на свеце.

— А свет быў?

— Свет быў.

— І мора было? І мама?

— Былі. Толькі адной цябе не было. Дзіўна.

— Дзіўна,— згадзілася Аннушка, і мы пайшлі да мора.

Я разлёгся на гальцы, з асалодай адчуваючы, як яна выпраменьвае цеплыню. Распасцёршы рукі, я купаўся ў залацістым бязвоблачным небе.

Варта было мне ледзь-ледзь прыпадняць галаву — і на самым краечку вады і зямлі, на самым урэзе мора, як сказаў бы які-небудзь воднік, я бачыў дзяўчынку ў паркалёвых трусіках, беленькіх, з буйным чырвоным гарошкам. Дзяўчынка бегла ўслед за хваляй, якая адкочвалася, нібы спецыяльна дзеля яе, выхоплівала з-пад хвалі патрэбныя ёй каменьчыкі і бегла назад, таму што хваля пачынала каціцца назад. Так яны забаўляліся — мора і дзяўчынка.

Дзяўчынка была маленькая, а мора вялікае. І можна было яшчэ і яшчэ павялічваць тое, што акружала маленькую дзяўчынку, таму што большае за мора — гэта краіна, большае за краіну — акіян, большае за акіян — зямля, большае за зямлю — неба, большае за неба... Аднак, як бы наша ўяўленне ні разбягалася ўшырыню і ўдалечыню, накшталт бязгучнага выбуху, дзяўчынка заставалася тою самай, не рабілася меншай. Сусвет сусветам, а дзяўчынка дзяўчынкай. Магчыма, абое яны — пясчынкі, магчыма, абое яны бязмежныя. А магчыма, і роўныя.

«Адгаварыў, параіў...— думаў я між тым, увесь час пазіраючы на дзяўчынку.— А што ж будзе з ёю далей? Можна, вядома, адштурхнуўшыся ад гэтага пункта, як бачыш распрацаваць тую ці іншую сюжэтную лінію, і пасля яны, гэтыя лініі, у рамане ці ў аповесці будуць неракапальныя і праўдападобныя».

О, мільёны сюжэтаў і варыянтаў, якія дарэмна было б зводзіць да дзвюх-трох знарок агрубленых літаратурных схем!

А справа ж у тым, што мы і нашы лёсы — як каменьчыкі на гэтым марскім беразе. Усе падобныя адзін да аднаго, а двух аднолькавых не знойдзеш. І хоць усе каменьчыкі, разам узятыя,— гэта маса, і гальку для якіх-небудзь будаўнічых патрэб можна чэрпаць каўшом экскаватара,

лічачы тонамі,— кожны каменьчык усё-такі сам па сабе: гэты з жоўтымі пражылкамі, па гэтым ружовыя кропачкі, гэты чорны, нібы агат (а бывае ж і сапраўды агат!), гэты белы, як цукар, гэты празрысты, як шкло.

Што ж, мільёны сюжэтаў і варыянтаў, якіх не ахапіць нават уяўленнем, аднак і тых, што ахопіш, традыцыйных, таксама многа — да Улонавай, да Тарасавай, да Гаар Гаспаран або па іншым адгалінаванні — да Касмадзям'янскай, да Церашковай, а там яшчэ да маці Ясеніна, да сяброўкі і спадарожніцы пратапопа Авакума. Або найпрасцейшае: дом, муж, які працуе на рыбазаводзе. Рынак. Кабачкі і памідоры, мыццё бялізны, нарыхтоўка яды, прасаванне, падмятанне, маскоўскія пастаяльцы, двое адукаваных дзяцей.

Тут ва мне акрэслілася тое, што існавала ўвесь гэты час, гэтыя гадзіны-паўтары, як цьмяная, але настойлівая перашкода: я зразумеў, што баюся паказацца Каці на вочы.

Ці не абуджаўся ў яе сэрцы папрок, калі малая спала, а яна глядзела на сваю некрасуню, на сваю горкую няўдаліцу, ці не было тады патаемных або і адкрытых слёз? Выгляду яна, вядома, не падасць, аднак сустрэне холадна. Не прыме ў дом? Пакой заняты Аннушкай, вельмі зручна адмовіць. Калі прыме холадна, і сам пойдзеш, не чакаючы адмовы, трэба хутчэй, пакуль яна прыйдзе, вынесці чамадан, перабрацца на іншую вуліцу, на другі канец пасёлка, у іншы горад. Такое бяды, я чалавек незалежны!

Дзяўчынка і мора ўсё яшчэ забаўляліся.

— Ну, ты пойдзеш са мной? Не баішся быць каля мора? Не ўтопішся?

— Пайду з табой. Нешта мама затрымалася на рынку.

— А... яна любіць цябе, твая мама?

— Я не пыталася. Хіба ж ёсць мамы, якія не любяць дзяцей?

Пайсці, не паказаўшыся, было ўсё-такі смешна. Але і чамадан разбіраць я пакуль што не захацеў. Прылёг на ложак, заслапы шарсцяною шорсткаю коўдрай, і зыбкая, лёгкая дрымота перамагла мяне. Здаецца, я нават заснуў. Ва ўсякім разе, я не заўважыў, колькі прайшло часу, пакуль у садзе пачуўся знаёмы голас, які ані не змяніўся:

— Сонейка ты маё, ластавачка ты мая! Зачакалася. А я зайшла да Надзі Кавупіхі дый загаварылася. Ах ты мая ненаглядная! Як ты тут, без мяне? А чаму трусы мокрыя? Ты што, купацца хадзіла? Адна?

— Я не адна. Да нас дзядзька прыехаў.
— Які дзядзька?
— Стары знаёмы. Калі мяне яшчэ не было.
— Дзе ж ён?
— Спіць у маім пакоі.
— Ах, божа мой! Ды гэта ж, відаць, ты ведаеш хто?! Давай мы з табой хутчэй пераапранёмся, каб ён паглядзеў, якая ты ў нас красунечка. А то ж ты перад ім ды такая мурза. І я пайшла як па бяду. Хадзем, надзенеш белую сукеначку, чырвоныя сандалікі, завяжам бант. Ах ты! Ён жа, можна сказаць, твой хросны, другі бацька. А ты перад ім такой мурзай. Нядобра.

Узрост, ці што, такі. Ад простых слоў, ад песні, ад кадра ў дакументальным кіно сляза падкочваецца. А яшчэ мяне сорамам апякло за тое, што мінут пятнаццаць таму назад я так дрэнна думаў пра Кацю, а разам з ёю — і пра ўсіх чалавечых матак.

# Георгій Сямёнаў

## НОЧ ПАД КІЦЕЖАМ

Лодка плыла ўздоўж пірса, пад прасмаленымі бартамі нерухомых суднаў. Свяціла сонца, але вада пад імі, густая ад ценю, здавалася цяжкай і бруднай, быццам волжскія працаўнікі напаілі яе чарнатой сваіх крутабокіх бартоў.

У аглухлым свеце, нямым і рухомым, за сілуэтамі баржаў, круціўся на пірсе вінт зялёпага верталёта. З-за трэску лодачнага матора не чуваць было, як раве ён, і толькі па тым, як скаланалася паветра, можна было зразумець, што ёсць гэты перадпалётны ўпэўнены гул матора.

Недзе канчаўся рэальны і трывалы свет — цяжкія баржы, драўляныя ветракі, бялізна над палубай, якарны канат, абрэзаны чорнай вадой,— і пачыналася штосьці неадчувальнае, нямое і хісткае: зялёны верталёт на пірсе, размашысты круг яго вялікага вінта і высакавольтная лінія ў небе...

І калі лодка абагнула баржы і калі скончыўся пірс, змураваны з розпакаляровага каменя, верталёт раптам скрануўся, лена падняўся над травой, пачаў хутка набіраць вышыню і, ужо над самай вадой быццам пагнала яго высокім ветрам, нячутна паляцеў прэч ад меднай паветранай лініі, пацягнуў за сабой струменьчыкі дыму, якія лёгка расплываліся ў паветры.

Мора ляжала спакойнае і пяшчотнае. У рэдзенькай белай далечыні плавалі астравы, падобныя на вячэрнія воблакі, а далей, за астравамі, цягнулася паўз небакрай празрыстая акварэльная стужка... Гусеў ведаў, што гэта бераг, што ён пясчаны і чысты, што растуць на ім старыя бярозавыя гаі, жывуць людзі і птушкі, але было ў яго адчуванне, што глядзіць ён на нейкі зорны бераг, да якога яшчэ мільёны гадоў ехаць, і ніколі не зацвярдзее, не стане жаданай зямлёй размытая па ўсім небакраі палоска.

У лодку ён трапіў выпадкова, не дачакаўся рэйсавага катэра, і сядзеў цяпер, азіраўся па баках, па перакладзіне ў хісткім, пяўстойлівым чаўне, сярод чужых людзей у вы-

ліпялых брызяптоўках, якія сядзелі пры маторы, і ад гэтага нізка асела карма.

Яны лена перагаворваліся пра нейкі патэфон, які ўпаў па мінулым тыдні ў ваду, пасмейваліся, хрыплавата адкашліваліся, гаварылі пра выпітую гарэлку і зноў успаміналі злашчасны патэфон. Пачуць словы было цяжка, і Гусеў спрабаваў уявіць патэфон, які пад уласную музыку ляціць у ваду... Але зразумеў, што «патэфон» — гэта нейкі Валерык і што ён быў моцна п'яны ў той дзень, калі раптам пачаўся шторм.

Уперадзе сядзела тоўстая дзяўчына ў круглых акулярах. Вочы яе за шкельцамі былі туманныя і смяшлівыя. Яна дурэла з сабакам.

— Бач які, бач які! — радасна прыгаворвала яна маладому сабачку.— Бач які! Чаго ж ты, дурань, не кусаешся, чаму такі добры? — Шлёпала яму па губах, цягала за загрывак, пстрыкала па носе, але сабака ласкава прыплюшчваў вочы і адварочваўся. Дзяўчына пыталася амаль шэптам: — Хочаш, я цябе кусацца навучу? Хочаш?.. Дзядзька Міш! — крыкнула яна раптам.— Што гэта ў цябе Сільва не кусаецца?

— Чаго? — крыкам перапытаўся гаспадар лодкі.

— Я гавару, Сільва ў цябе добрая, не кусаецца!

— Каб кусалася, то даўно бульбу ў агародзе капала б, а не ў лодцы сядзела.

А рукі дзяўчыны зноў цягнуліся да вастрамордага шэрага сабакі з прыўзнятымі на храшчах вушамі, і зноў гаварыла яна Сільве нешта хуткае, прасіла, каб абазвалася, гладзіла і абуралася, калі сабака наступаў мокрай лапай на панчоху.

Нехта з двух, з кармы папытаўся раптам у яе:

— А ты чаго, Галка, гэтак доўга развітвалася? Чакалі цябе, чакалі...

— Нічога я не развітвалася,— адазвалася дзяўчына.

— Не развітвалася? Губы ж як у лася распухлі...

Шкельцы на яе вачах бліснулі сурова і жыва, яна з гонарам страпянулася, але прамаўчала.

У моры плавалі чайкі, лёгкія, як камячкі пены, і былі яны быццам прыўзнятыя над вадой, слізгалі па ёй. Лодка папяла напорыстым цяжарам вадзяную роўнядзь, плыла цяпер ніжэй, чым плавалі чайкі, і мора злёгку ўзвышалася перад ёй. Чайкі ўзляталі, калі набліжалася лодка, і больш не апускаліся на ваду, ляцелі прэч, цяжкія, стомленыя, маўклівыя і таму, здавалася, вялізныя.

Злева за бортам, быццам у вымытым шкле, час ад часу ўспыхвала сонца, а справа Гусеў бачыў у каламутна-зялёнай, прасвечанай вадзе свой сутулы цень, які трымцеў і матляўся ў імклівым струмені. І толькі калі глядзеў на гэты цень, ён разумеў хуткасць лодкі, яе нястомны рух наперад да туманных астравоў.

— Галь, а Галь, дастань нам сыру з сумкі,— пакрыўджаным баском сказаў нехта за Гусевым.

Дзяўчына ахвотна і, як здалося Гусеву, паспешна расшпіліла «маланку» на сумцы, пахілілася над ёй, як трусіца над морквай, і раптам заклапочана падняла галаў.

— Якога табе сыру? — спыталася яна.— Няма тут ніякага сыру.

— Ну, чаго-небудзь закусіць...

Але яна знайшла ўрэшце ў сумцы кавалак вэнджанага сыру, зачырванелася, прыўстала ў лодцы з гэтым лакіраваным сырам у руцэ, абаперлася на Гусева, падала людзям.

— Эх ты, Галюха-сляпуха! — сказаў басок на карме.— І чаму цябе хлопцы любяць? Ты хоць акуляры здымай, калі з хлопцамі цалуешся. Хочаш з намі, Галь?

— Не-е, што ты... Я гарэлкі не п'ю,— адказала яна.

Гусеў напружыў худы плячук, на які абаперлася дзяўчына, а сам увесь раптам сцяўся ад шкадавання гэтае «Галюхі», ад жадання неяк развеяць гэты непатрэбны жарт.

А Галя засмяялася. У яе былі вялікія, шырокія і белыя зубы. Скарыначка сыру паляцела ў яе, яна прыкрылася рукой і заплюшчыла вочы. Потым умасцілася зручней, дастала з сумкі кнігу, разгарнула яе, пагартала і задумалася, уцягнула галаў у каўнер паліта. І ў гэтай халоднай задуменнасці, з падручнікам хіміі ў руках, яна здалася Гусеву дзіўнай і зусім незнаёмай.

Задраны нос лодкі з іржавым бычыным кольцам быў нацэлены на далёкі востраў, але раптам човен пайшоў убок крута і рэзка. Гаспадар лодкі моцна кашлянуў, аддаў шклянку і сказаў:

— Нашто ты бутэльку выкінуў? Прыб'е да берага, а нехта ногі пакалечыць...

— Патоне...— упэўнена адказаў басок.

На лодку быў начэплены магутны матор, і Гусеў паверыў канчаткова, што будзе штыль, што не здарыцца нічога, пазіраў на востраў і пачынаў верыць у цвёрдую руку рулявога — лодка ішла ходка і дакладна.

Гусеў адчуў лёгкі штуршок ззаду і адвярнуўся.

— Ты ў Новае да каго? — крыкнуў яму хлопец з гарбатым носам і лупатымі вачыма, жорсткімі і нерухомымі. Хлопец амаль ляжаў, прытуліўшыся плячыма да кармы, і Гусеў зразумеў, што штурхнуў ён яго нагой.— Сваякі там, ці работа?

Гусеў хацеў таксама грубавата адказаць яму, што, вядома, не па чай едзе — што табе да гэтага! — але падумаў і адказаў:

— Я там у школе на рабоце. Першы год. Нават не год,— папраўіўся ён,— а ўсяго два тыдні.

Хлопец мірна кіўнуў галавой, глядзеў, быццам абмацваў лупатым позіркам вастраносыя запыленыя чаравікі Гусева.

«Настаўнік, вядома, табе не фігура,— падумаў Гусеў,— тым больш новы... Ды ладна. Здаецца, больш пытацца не будзе».

— Ну і як? — запытаўся хлопец.

— Што як?

— Слухаюцца?

Гусеў засмяяўся.

— Альбы слухалі, а слухацца потым будуць.

Ён даўно адчуваў ужо плячом сонечную пранікліваю цеплыню і радаваўся ёй, і здавалася яму, што многа будзе гэтакіх ясных і чыстых дзён і заінелых ранішнікаў у пажоўклым лесе, з пахрумстваннем прымёрзлага лісця, і, магчыма, ён яшчэ сходзіць у лес з кошыкам і набярэ яго поўны баравікоў. А паездкі дадому, у Маскву, незвычайная вячэра і чай, усмешка маці, люстра, якая плавае над сталом, і лёгкае цяпло ў пакоі, па падлозе якога ён некалі поўзаў,— усё гэта трэба пакінуць, думаў ён, слухаў сонца і асенні холад астылай вады, яе прэсны і снежны пах. І, вядома, пара прывыкнуць да таго, што Масква не побач і што яму ўсё ж пашанцавала на размеркаванні, і думаць ужо не пра дом, а пра школу і пра новы свой дом, які пакуль што здаецца яму часовым жытлом, і пра свой пакой, які трэба неадкладна абклеіць шпалерамі. І трэба заняцца ўчасткам вакол школы: забрукаваць сцяжынку і абавязкова вясной павешаць на бярозах шпакоўні.

А сцежку трэба забрукаваць, пакуль не пачалася гразь; панасіць з берага каменне і — як добра — у любое надвор'е чыста і моцна. Усё трэба абдумаць, зрабіць трывала, каб людзі радаваліся.

Гусеў усміхаўся і думаў пра будучыню, калі маці пой-

дзе на пенсію і яны разам з вясны да глыбокай восені будуць жыць на беразе прэспага мора.

Чорт вазьмі, як добра ўсё можа зладзіцца ў жыцці! І ён паўтараў сам сабе, ці то некалі пачутае, ці то прыдуманае зараз: «Птушаняты пе вяртаюцца ў свае гнёзды».

Людзі на карме маўчалі, быццам паснулі, дзяўчына задуменна глядзела на ваду, забыла пра разгорнутую кнігу на каленях. Чым больш прыглядаўся Гусеў да яе, усё больш адчуваў прывабліваець яе слабых вачэй, якія глядзелі на свет праз шкельцы; шэрых вачэй, падобных на далёкія астравы, да якіх патрэбна плыць.

«Хоць не ў вачах справа,— думаў Гусеў.— Дабро пазнае і сляпы, калі ён чакае яго ад людзей, а відушчы можа прайсці міма. Дзяўчына бачыць, мабыць, толькі добрае ў людзях. Можа, бачыць лепш за многіх, у каго ўсе сто працэнтаў...»

А востраў, на які яны кіравалі, наблізіўся, а потым праплыў узбоч. Вада лепа пераважоўвала жоўтыя адлюстраванні, а дрэвы, якім пашанцавала вырасці на пясчаным адхоне і не загінуць пад вадой, расхінуліся вольна на гэтым востраве і, здавалася, гатовы былі затрубіць сонцу і сіняму небу на ўсю сваю асеннюю святочную медзь...

Застылыя, як шкло, пляжы цягнуліся ўздоўж борта, дубы, як слапы, шэра і цяжка паўсталі на палянах.

Сабака пачуў зямлю, устрапянуўся і заскуголіў папешна, жаласліва. Але зямля праплывала збоч, нямая, быццам расстраляная трэскам матора, які Гусеў перастаў ужо заўважаць, які стаў ужо нечым натуральным і нават неабходным.

Бег і вывіваўся ў тонях бязважкі вадзяны контур, які аблямоўваў пляжы; слізкія пні тырчалі з вады — падгнілыя, чорныя астаткі дрэў, некалі магутных і рослых,— а наперадзе зноў ужо раскрывалася мора...

Лясны востраў, падобны на кавалак старога парка, непачуты і незразуметы, парадзеў, замільгала між дрэў вадзяная раўніна на той бок вострава, і чайкі паляцелі прэч, і белы бакен выплыў ужо з-за вострава, і адступілася пенная водмель, прасвечаная сонцам да дна, калі раптам пачуўся гэты нечаканы, фантастычны выбух.

Быццам мільёны маланак успыхнулі разам, і ў цішыню, якая наступіла, рынуліся зямныя гукі.

Стала чуваць ваду пад бартамі і віскліві крык чаек. Нос лодкі паволі апусціўся. Хлопец з кармы скрозь доўгае пазяханне спытаўся неразборліва:

— Што там, Мы-ыш?

Хваля, якая кацілася на пляж недзе далёка ззаду, набегла раптам на пясок, захліснула і, каламутная, зноў накацілася і пайшла далей па водмелі, пакрывала чорныя, быццам жывыя, пні. Усё навокал спынілася, толькі хвалі шумелі і заціхалі.

— А хто яго ведае,— адказаў гаспадар.— Заглух нечага...

Сказаў ён гэта непрыемна гучна, быццам правяраў мікрафон. У вушах звінела да прапізлівага свісту ўзмоцненая цішыня.

Потым Гусеў сеў на вёслы і павалок цяжкую лодку прэч ад вострава. Ён даўно ўжо зразумеў, калі глядзеў на мазутныя рукі людзей, што напр авіць матор не ўдасца. Цяпер ён чакаў, калі хто з гэтых двух сядзе на яго месца... І хлопец нарэшце падмяніў яго, сеў на вёслы і рвануў лодку.

Ехалі да нейкага Палубаянава, які, Гусеў так зразумеў, жыў на востраве № 2 і які мог памагчы.

Часта мяняліся месцамі, разгойдваючы лодку. Дзяўчына сядзела на носе і моцна трымалася пальцамі за папярочку. Акуляры яна зняла, і вочы яе здаваліся стомленымі і бездапаможнымі.

— А направіць можна? — спытаўся Гусеў.

— А як жа...

— І многа часу зойме?

— Не знаю.

— А можа, па вёслах дацягнем?

— Ха!

— А чаму?

— Далёка.

— А што ўсё-такі?

— Размеркавальнік...

— Што размеркавальнік?

— Паломка.

— Да вечара направім?

— Ну чаго ты прыстаў? Адкуль я знаю... Направім, мабыць.

— Ладна,— сказаў Гусеў,— давай награбу. Не бубні...

Ён зноў сеў на вёслы, шырока замахнуўся, апусціў доўгія лапаты ў ваду, пацягнуў іх на сябе і ўвесь аддаўся рабоце.

— Ты з Масквы? — спытаўся хлопец.

— З Масквы.

— А дзе там жывеш?
— На Садовай.
— Гэта па Садовым кальцы?
— Ага.
— Пасля інстытута сюды?
— Угу.
— Накіравалі ці сам захацеў?
— Накіравалі.
— Не пашанцавала табе.
— Чаму?
— Калі б дачакаўся катэра, усё было б нармальна. Сам вінаваты, мы цябе не звалі.
— Вядома.
— А ў мяне цётка ў Чаромушках жыве,— сказаў хлопец,— не езджу я да яе.

Было зусім ціха, і вада за бортам, да глыбіні прасвечаная каламутным карычневым святлом, была бяздонная і халодная, хоць пяўмольна плавілася ў гэтай цёмнай вадзе і аддавала ёй жар адлюстраванае сонца. Выпадковымі здаваліся пажаўцелыя берагі, якія абступілі мора бярозкамі, і гэтая звонкая цішыня, якую парушаў толькі стук уключын і крыкі нябачных чаек.

«Усё гэта няпраўда,— думаў Гусеў.— Выдумка: лодка, дзяўчына, я ў гэтай лодцы, мужчыны, руская гаворка, вада, падобная на неба, і касмічнае сонца ў цемры... Дзе гэта я? Які цяпер век? І якая планета сустрэне мяне?.. Зямля! Вы чуеце мяне? Дзе я? У мяне не стала сувязі, я выйшаў, відаць, у сферу прыцяжэння невядомай планеты...»

На востраве № 2 матор да вечара адрамантаваць не ўдалося. Усе стаміліся, доўга адмываліся, чысціліся. Палубаяпаў, які выціраўся на хаду шэрым ручніком, завёў Гусева ў пусты паляўнічы домік, сказаў: «Выбірай любы ложак, акрывайся хоць трыма коўдрамі, а заўтра ранень-ка — дадому».

Ноч была прыўзнята электрычнасцю, і ў хісткім шатры гэтага святла, народжанага рухавічком, лятала бясшумная птушка з круглымі крыламі. Яна то зніжалася, то быццам разам са струменем цёплага паветра ўзлятала да зор і прападала.

І калі яна нячутна апускалася і плыла ў святле, быццам сатканая з пылу, па мяжы святла і ценю, калі раптам невыразна і ледзь улоўна чарнела над бяздоннем мора і знікала, каб зноў таямніча з'явіцца, Гусеву здавалася, што не адна, а многа соў, палахлівых і цікаўных, разглядалі

яго, прыляцелі да святла з забалочаных лугоў. Было дзесяць гадзін вечара. Гусеў ведаў, што наперадзе доўгая бяссонніца ў прасторным пустым доме, які гарэў цяпер над вадой пранізлівым белым святлом, адбіраў у ночы рабінкі з апалым лісцем, гронкамі барвовых, як вяргіні, ягад. І з-за таго, што гэтак ярка і шчодра, без музыкі і людскога шуму глядзелі ў цемру пустыя, голыя вокны, з-за таго, што шэрыя совы лупалі ў небе, дом здаваўся пакінутым людзьмі...

З тупым адчаем і трывогай азіраўся Гусеў на гэты святочны дом.

Сава знікла, але Гусеў адчуваў, што яна тут, у бяскопцай цемры, над ім, што глядзіць на яго... І кружыць над старымі вербамі, над тым няяркім з трыма вокнамі домікам, дзе цяпер людзі. Ці, можа, над морам, з якога цугам выйшлі на бераг разложыстыя вербы.

Мора ўгадвалася ў цемры шчыльнай, цяжкай вільгаццю, і недзе зусім далёка міргаў бакен. Усплёскі яго святла адбіваліся ў вадзе і коратка прастрэльвалі цемру, як жоўтыя пікі ў кірунку да вострава.

Дом, які стаяў пад вербамі, глуха і невыразна бубніў, смяяўся, і чуваць было, як плакала дзіця і як калыхаліся за вокнамі цені. І Гусеву хацелася быць там, у гэтым шумным і пад'етым доме, у накураным пакоі, у духаце і ў поце...

Маленькая і жылістая жанчына, з крывой і хітрай усмешкай, прывалакла і ўсперла на пліту вялікі «арцельны» чайнік. У яе былі набрынялыя і сонныя, як і ў самога Палубаянава, і адначасна рэзкія вочы, з жапочай весялінкай і глыбінёй, а рукі моцныя, мужчынскія і хваткія.

Гусеў бачыў, як яна выняла з зямлі адшліфаваны плуг і страсянула яго, сціснуўшы зубы, заваліла набок, пакуль муж з лаянкай заводзіў каня ў новую баразну. Потым, калі ўжо Палубаянаў распрог каня і ён хістаўся пад хамутом, жанчына выбірала з зямлі бульбу, не разгіналася, доўга, сярод белых курэй, бруднымі сваімі зямлістымі кулакамі, здавалася, біла і біла ў зямлю. Яна і чайнік прынесла з кіпнем, аднабока ўсміхалася і хавала ў маршчынках доўгі і тонкі шрам ад скроні на шчаку, Гусеў адчуў раптам яе дамашні, хлебны пах, які знік, як толькі яна пайшла, і ён падумаў пра зімовыя ночы, пра адзіноту, пра дзіцячы плач і пра цяпло гэтай жанчыны, у якой доўгія ночы над астылым морам з немаладым ужо і, відаць, не першы раз жанатым пасівелым мужчынам.

І магчыма, думаў ён, калі-небудзь будзе таксама зіма, будзе плакаць дзіця і гэтакая ж цёплая жанчына ўстане сярод ночы з ложка і заспявае калыханку. Тая жанчына будзе разумная і дужая, яе не спалохае замёрзлае мора і бясконца доўгая зіма. І абавязкова будзе прыгожая тая далёкая жанчына.

Гусеў наліў у шклянку кіпню і паспрабаваў піць нясмачную вывараную ваду. Нічога не атрымалася. Калі вада астыла, ён зараз, як гарэлку, выпіў яе і выйшаў з хаты. Было надта светла ў ёй аднаму чалавеку і надта ціха, і занадта многа танцавала на стале мух.

Пра яго больш не ўспомнілі: ён быў чужы. Яму далі ложак, тры коўдры, кіпню і цяпер гаманілі ў напаленым доме, а ён выйшаў, каб паслухаць чалавечы смех.

...Ля вады трашчаў маторчык у дашчатай будцы, табуніліся на пяску лодкі, і цугам адыходзілі ў цемру вербы, старыя, дрымучыя вербы, з-за якіх уставала і ніяк не магла ўзысці электрычная поўня. Усюды ляжалі цені — як чорныя ямы, Гусеў сышоў да лодак, не ведаў, што рабіць далей, і глядзеў на дом, у якім весяліліся людзі. Што яны святкавалі, чаго весяліліся?

Ён падумаў раптоўна, быццам ветрыкам прынесла гэтую думку, што вербы, прыцярушаныя святлом, раслі некалі ў невядомай затанулай вёсачцы, у затанулым некалі горадзе Кіцежы і што пні, якія тырчалі каля берага,— гэта таксама вербы, былыя дрэвы, альбо сляды, якія вядуць у глыбіню прэснага мора, дзе раней жылі людзі, а цяпер жывуць рыбы...

З мора, з цемры пацягнула, як з пограба, холадам, калі ён так падумаў. І яму не хацелася цяпер угледзець саву, адчуць маўклівую варажбу яе круглых вачэй, але ён угледзеў яе. Пагойдвалася ў прыцемку, яна вісела над самай галавой, шэрая і лёгкая, злавіла раскінутым крыллем пад'ёмныя паветраныя струмені.

— Ну што? — спытаўся Гусеў.— Ну?

Ён усміхнуўся. А сава раптам кінулася ўніз, слізганула над зямлёй і знікла ў моры, у той цемры, якая здавалася бездаццю над морам, з якое несупынна страляў у бок вострава адзінокі бакен.

— Дура! — сказаў ён услед.

Ён усміхнуўся і зусім паволі пайшоў дадому, угору, абсыпаючы нагамі жорсткі і халодны пясок. Яму не хацелася глядзець на мора цяпер, калі ён падумаў пра людзей, якія нарадзіліся і памерлі там, дзе цяпер пачынасцца пяс-

чанае дно і рыбы; не хацелася глядзець на вербы, якія былі пасаджаны тымі людзьмі...

За сценамі плакала дзіця. Цяпер, калі Гусеў дайшоў да тэрасы паляўнічага доміка, дзе ні гаспадара, ні гасцей, чуваць быў толькі гэты плач і нейкае аднатоннае завыванне.

Ён лёг на ложак, хоць і ведаў, што не засне ў гэтым пустым доме, калі побач, за агародам, пад старымі вербамі, бражнічалі людзі і дзяўчына весялілася разам з імі. Яму нясцерпна хацелася да іх, хацелася весяліцца, смяяцца, гаварыць і бачыць гэтую дзяўчыну.

«Адкуль яны, гэтыя людзі? — падумаў ён.— Хто яны? Мне цяпер жыць разам з імі не год і не два. І вучыць іхніх дзяцей. Мне б пайсці цяпер да іх і сказаць... Але яны цяпер выпілі, і ўсё сказанае мною здасца ім недарэчным: пра школу, пра дзяцей... Каб я ведаў, каб знаў і ўмеў сказаць гэтым людзям патрэбныя словы!»

— Ну ладна,— сказаў ён уголас і падумаў: «Пара спаць ужо... Хутка адзінаццаць. А заўтра раненька ўставаць і ехаць, ехаць да далёкага берага з бярозавымі лясамі... Ім таксама, мабыць, на работу... як і мне... Усім заўтра на работу...»

Ён не пачуў крокаў, не чуў, як адчыніліся дзверы, а адразу ўбачыў на парозе хлопца з жаночым грабянцом у валасах. Той стаяў ссутулена, прытуліўся да вушака, п'яна і добра ўсміхаўся.

— Педагог,— сказаў ён,— у цябе сухі паёк, ці што?

Гусеў спытаўся здзіўлена:

— Які паёк?

— Ну, які, які! Рублі ў цябе толькі? А есці няма нічога?

— Не,— сказаў Гусеў.— Не, на жаль, нічога... На жаль, нічым не магу пачаставаць. У мяне і сапраўды,— ён засмяяўся,— сухі паёк рублямі.

Хлопец стаў у дзвярах, вялікі і нейкі аселы, абмяклы, круціў галавой і ўсміхаўся.

— Не я да цябе,— сказаў ён,— а ты да нас... ідзі... Ты зразумеў? Ідзі да нас... павячэраць. Павячэраць жа трэба.

Ад нечаканае радасці ў Гусева пахаладзелі, пацяклі мурашкамі шчокі. Удзячны, ён ступіў да хлопца і сказаў яму:

— Дзякуй. Я з задавальненнем...

— Дзякуй, калі пад'ясі... Дзякуй потым, а цяпер пайшлі, педагог... Ты педагог, а?

Ён абняў Гусева, абапёрся на яго плячо гарачай рукой, ішоў з ім па заараным агародзе, па рыхлай, пахучай зямлі. А калі зняў руку, Гусеў доўга адчуваў яшчэ нейкую цеплыню, якая прапікала ў яго, падобную на цеплыню гарачага металу.

Яго шумна і клапатліва пасадзілі за стол, налілі ў шклянку гарэлкі, яго частавала жонка Палубаянава, нагамінала, як малому, пра ежу, пра тое, каб выпіў гэту гарэлку, каб не крыўдзіў гаспадароў, а Гусеў, збянтэжаны і разгублены, трымаў у руцэ шклянку, глядзеў на людзей, убачыў Галю, якая гарэла ўся і паблісквала зубамі, вачыма, губамі і потным ілбом, убачыў яе такую, не адвёў воч, выпіў гарэлку, закашляўся, націклі слёзы. Але нехта ўжо соваў яму ў рот кавалак варанай кілбасы.

— Нічога, педагог, нічога... З'еш вазьмі, з'еш... Маша, налі яму капусты! Будзеш капусту?

А Маша перабівала:

— Ну чаго ты пытаеш! Вядома, будзе.

Гусеў засмяяўся, завярнуўся да хлопца, сказаў яму:

— Вы неяк дзіўна мяне завяце — «педагог». Мяне Мікалаем завуць, Колем.

Тады ўсе пачалі зваць яго Коля: і гаспадар лодкі, і хлопец з прыколатымі грабянцом валасамі, і добрая Маша.

А яму, ап'янеламу і шчасліваму, пад'етаму, хацелася таксама называць іх імёнамі, хацелася быць сваяком гэтых даверлівых людзей, якія быццам зусім і не п'янелі, быццам і нарадзіліся гэтакія вясёлыя на свет, і ён з любоўю думаў тады, як бы радасна было і сапраўды мець іх сваякамі, гэту жанчыну, якую б тады ён называў проста Маша.

І ён называў так яе ў тую ноч, калі прыйшоў спаць адзін у пусты, шчодра асветлены дом, і калі раптам зайшла ўслед за ім гэтая жанчына. Ён, ап'янелы, узяў яе руку і пацалаваў. Ён тады сказаў ёй:

— Маша, я люблю ўсіх вас тут...

Ад гэтага пацалунка, ад таго, што Маша дзіўна неяк і радасна, быццам на маленькага, паглядзела на яго, усё паплыло перад вачыма, тысячы яркіх лямпаў з мухамі, і між гэтых лямпаў смяялася і кружылася маленькая жанчына з цяжкай рукой, з добрай, хлебнай цеплынёй у целе — усё закружылася вакол маладой жанчыны, якая жыла доўгія ночы з немаладым пасівелым мужам над астылым морам і якая прыйшла да яго ў пусты і вялікі дом па халодны чайнік, як быццам у хаце, дзе ўжо спалі, мабыць,

госці і сам гаспадар з попелам на шчоках, грузны і цвярозы, быццам у той хаце не было другога чайніка.

Яна нячутна смяялася, адмахвалася рукой, якую Гусеў пацалаваў, глядзела на яго з нейкаї таямніча прывабнай весялосцю. Гэтак здавалася яму, і ён гаварыў ёй раптам аселым голасам:

— Ты харошая... Ты нават сама не ведаеш, якая ты харошая.

І дзіўна было чуць свой аддалены, бубнівы голас, які быў надта моцны ў пустой хаце, як быццам не сам Гусеў, а нехта другі, схаваны за белай печчу, гаварыў гэтыя словы, у якіх была і нейкая просьба: «Ты харошая, Маша, ты вельмі харошая», быццам і зусім не гаварыў ён гэтых слоў у бліскучае, хісткае святло, у цэнтры якога стаяла жанчына, якая па-свойму, па-жаночаму чула гэтыя словы.

Яна сказала яму, як сястра:

— Дурненькі,— сказала яна,— што ж ты харошае ўгледзеў?

Голас яе плыў у мігатлівым святле, і Гусеў любаваўся ёй, не адважваўся нават дакрануцца да яе, палохаўся аднае думкі, што незнарок можа зняважыць яе ў западта вялікім на дваіх пустым доме, у якім віселі, як у майстэрні, голыя лямпы.

Калі яна пайшла з халодным чайнікам, Гусеў з нерастрачанай радасцю кінуўся на ложак, засмяяўся і падумаў: «Харошая! Жыве наводшыбе, і дзіця нарадзіла тут, далёка ад людзей, і, мабыць, любіць свайго мужа».

Яму было радасна думаць гэтак пра гэтую худзенькую, жылістую жанчыну, якая ўдзень на вачах у яго вырывала з зямлі цяжкі і да сіні адшліфаваны плуг, абтрасала яго і завальвала набок, а потым хадзіла, сагнуўшыся, і кідала ў кучу брудную ружовую бульбу. І якая потым стаяла ў нейкім ззянні ў пустым асветленым доме і пыталася ў яго збянтэжана: «Што ж ты харошае ўгледзеў ува мне?» — насцярожана пыталася, быццам баялася, што ён жартуе, ці не проста так гаворыць усё гэта, відаць, менавіта так разумела яна ўсе яго словы, хітра, па-бабску.

Ён доўга яшчэ не спаў, з усмешкай думаў пра гэтую моцную жанчыну, пра цеплыню яе чэрствай рукі і пра яе вочы, гарэзныя і добрыя, з нейкім крутым захлёстам у пазірку,— быццам пасля навальніцы, чорныя, як вугальны пыл, і белыя аблокі сутыкнуліся, змяшаліся ў небе і адбіліся ў яе вачах, пераменлівых, як гэтае плывучае неба, і

крыху раскосых. I пра людзей думаў, якія не забыліся пра яго.

Рухавічок раптам сціх, і святло паволі патухла, заціхлі мухі, і Гусеў пачуў крокі, якія пахрумствалі па пяску... і пазнаў па іхняй дзелавітай паспешлівасці Машу. Ён прыўстаў на ложку, прыслухаўся, але крокі прапалі ў начы.

Яму ноччу сніўся дзіўны і амаль рэальны сон. Сніўся вялікі магазін з блакітнымі квадратнымі калонамі і люстранай столлю, падобнай на тую, якая ззяе ў харчовых аддзелах. Ён недаўменна стаяў, азіраўся па баках, і раптам з натоўпу да яго выйшаў хлопец, і, хоць было лета, на галаве ў яго адзета футравая шапка. Хлопец вёў да яго траіх дзяцей, узяўшы за руку дзяўчынку, а за дзецьмі ішла худзенькая жанчына. Усе яны ішлі да яго і глядзелі гэтак шчасліва, як глядзяць толькі на немаўля. Ён глядзеў на іхнія радасныя твары і ніяк не мог успомніць, дзе ж бачыў гэтага хлопца і гэту маленькую жанчыну, якая нарадзіла траіх дзяцей. А калі яны падышлі зусім блізка і калі было нават чуваць цёплае, душнае хлопцава дыханне, тады хлопец сказаў яму на вуха з радасцю, як змоўшчык: «А мы ж з табой парадніліся...» I калі ён сказаў гэта, усе яны — дзеці, жанчына і сам хлопец — заківалі галовамі і паволі пайшлі, не перастаючы ківаць на развітанне...

Потым Гусеў добра пачуў над сабой хрыплы голас:

— Уставай, дарагі... Пара ехаць.

Гусеў расплюшчыў вочы, адчуў боль у скронях, прамовіў:

— Ага. Зразумела. Устаю.

Сонца яшчэ не ўсходзіла. У малінавым небе стылі брудныя, пляскатыя воблакі. Мора слалася пад гэтым небам, шызае, і не магло адлюстраваць колеру світання.

У лодцы сядзела заспаная дзяўчына, і калі Гусеў павітаўся з ёй, яна адказала здзіўлена і недаўменна: «Здрас-с...» — быццам угледзела ўпершыню.

Каля ног у яе сядзеў той самы сабака і жаласна скуголіў. Гусеў прайшоў на нос, разгайдаў лодку, і па вадзе пайшлі мяккія кругавыя хвалі. Сабака заскуголіў мацней, і Галя лёгенька ляпнула па ім, сказала шэптам:

— Чаго пішчыш? Бач, які нецярплівы!

Яна сядзела плячыма да Гусева, і яму было спакойна цяпер не бачыць падслепаватых воч дзяўчыны. Ён з адча-

ем успамінаў раптам учарашні яе адчайны позірк, калі ён выпіў гарэлку і разбалбатаўся пра сяброўства, пра мужнасць, пра роднасць... Цяпер яму было сорамна, быццам ён абмануў яе, калі назваўся наставнікам, цяпер было лепш не бачыць яе вачэй, у якіх было асуджэнне.

«Дзіўная яна,— думаў ён, пазіраў на яе, ссутуленую, на нагі ў карычневых туфлях.— Жанчына цяпер, мабыць, бліжэй да ідэалу, калі гаварыць пра дабрату, пра ласкавасць... Наогул, многа яшчэ ўсяго рознага добрага трэба ўвапхнуць у чалавека. А я ўчора не змог. Забыўся, чаго прыехаў на гэтае мора, у гэтае сяло Новае на бярозавым беразе. Але што ж я павінен быў рабіць? Адмовіцца і прамармытаць нешта пра шкоду алкаголю?»

Ён сядзеў у чаканні ў халоднай і нейкай аслізлай за ноч лодцы і перажываў за ўчарашняе.

Ён успомніў свой дзікі сон, Машу ўспомніў і свой пацалунак. І цяпер ён ведаў, што каб не электрычнае святло і відната ў доме, то была нейкая грань між імі, за якой была небяспека раптам стаць ворагамі: яму з сорамам успамінаць сябе, а ёй, харошай, пагарджаць ім.

«На шчасце, нічога не здарылася,— падумаў ён.— Усё добра! Я быў смешны, і ўсяго. Але гэта яшчэ не бяда. Я шчыра цалаваў ёй рукі, як сястры, за добрае... І хопіць пра гэта! Усё добра...»

— А чаго мы чакаем? — спытаўся ён у Галі.

— Не знаю,— сумна адказала яна.— Мабыць, пахмяляюцца.

Гусеў прысаромлена памаўчаў і спытаўся...

— Вам учора было непрыемна? Я разумею. Было надта сумна аднаму ў вялізным доме... Таму і не змог адмовіцца.

Дзяўчына азірнулася, здзіўлена паглядзела на Гусева:

— А хіба вам было дрэнна? Яны добрыя... І Сашка, і дзядзька Міша.

Гусеў засмяяўся, незразуметы ёю і не асуджаны.

— Я знаю,— сказаў ён.— Знаю, што добрыя. Хто ж гаворыць! А вы... вы будзеце добрай жонкай, мабыць... Зайздроснай жонкай!

— Толькі я мужу свайму піць не дам,— сказала яна.— Мне хочацца плакаць, калі я бачу п'яных.

Потым прыйшлі заклапочаныя і дзелавыя, упэўненыя ў сабе людзі. У іх была работа: кіраваць лодкаю ў моры. Дзядзька Міша сеў на карму да застылага матора, а хлопец сапхнуў нагружаную лодку на ваду і з вады ўваліўся

ў яе. І пакуль не загрымеў матор, ён спытаўся ў Гусева:

— Пахмяліцца хочаш?

— Не, не,— сказаў паспешна Гусеў.— Не-е!

А гаспадар лодкі прабурчаў:

— Яму ж у школу ісці, да дзяцей. Хіба можна. Думаць трэба! Гэта нам з табой быццам можна, мы з зямлёй маем справу...

Гусеў затуліўся ў пінжак, паставіў каўнер і вымушан быў замоўкнуць. А яму цяпер хацелася пагаварыць адкрыта з гэтымі людзьмі, якіх ён сустрэў выпадкова, з добрымі гэтымі і надзейнымі людзьмі, якія мелі справу з зямлёй і з якімі ён пабратаўся пад затопленай вёскай. І спытацца хацелася ў іх па-сяброўску:

«А нашто, нашто вам патрэбна гэта? На вас жа таксама глядзяць дзеці!»

Ён падумаў зноў пра школу, пра свае ўрокі, пра званок... І глыбінны гук матора здаўся яму бясконцым званком на ўрок. Але было ў яго такое адчуванне, што ён не падрыхтаваўся да гэтага ўрока і яму яшчэ няма чаго сказаць людзям і дзецям, з якімі гэтак хацелася пагаварыць шчыра.

## Васіль Шукшын

# ВЫПАДАК У РЭСТАРАНЕ

У вялікім рэстаране горада Н. сядзеў маленькі стары з голай акуратнай галавой, чысценькі, ціхі, адпрасаваны. Сядзеў і задуменна глядзеў у акно — чакаў, калі прыпясуць вячэру.

— Гэта вольнае месца, баця? — пачуў ён ззаду магутны голас.

Стары ўздрыгнуў ад нечаканасці, падняў галаву.

— Калі ласка, сядайце.

Сеў вялізны малады чалавек у вялізным каверкотавым касцюме, на пінжаку ў якога надта блішчалі повенькія чорныя гузікі. Стары ўгледзеўся хлопцу ў вочы — чамусьці прыемна было глядзець у іх: нейкія яны вельмі даверлівыя.

— Што, баця? — запытаўся дзяцюк.— Хапанём?

Стары далікатна ўсміхнуўся.

— Ведаеце, я не п'ю.

— Чаму гэта?

— Гады... Маё дзела хіліць да вечара, сынок.

Падышла афіцыянтка, таксама залюбавалася хлопцам.

— Пляшку «Сталічнай» і якую-небудзь закусь,— заказаў малады чалавек.— Шашлычкі ёсць?

— Гарэлкі — толькі сто грамаў.

Дзяцюк не зразумеў.

— Як гэта?

— Можна толькі сто грамаў.

— Вы што?..

— Што?

— Мне трэба больш.

Стары, паглядаючы на хлопца, не вытрымаў, ціхенька засмяяўся.

— Ведаеце, мне ж таксама належыць сто грамаў. Дык прынясіце яму дзвесце.

— Гэтага нельга... Шашлык... Што яшчэ?

Дзяцюк бездапаможна паглядзеў на старога.

— Не разумею... Яна жартуе, ці што?

Стары стаў ужо больш сур'ёзны і загаварыў да афіцыянткі:

— Вы ж ведаеце: правілаў без выключэння не бывае. Бачыце, які ён!.. Што яму тыя сто грамаў?

— Нельга,— спакойна сказала афіцыянтка і зноў з задавальненнем, весела паглядзела на хлопца.— Што яшчэ?

Той зразумеў яе вясёлы позірк па-свойму.

— Ну, міленькая, хоць бы трыста,— папрасіў ён.— М-м? — і какетліва павёў магутным плячом.

— Нельга. Што яшчэ?

Хлопец пакрыўдзіўся.

— Сто бутэлек ліманаду!

Афіцыянтка загарнула блакноцік.

— Падумайце, пасля паклічаце,— і адышла ад стала.

— Вось дык выпіў,— горка сказаў дзяцюк, праводзячы яе позіркам.— Гм...

— Бюракратызм, ён, ведаеце, раз'ядае не толькі ўстановы,— спачувальна загаварыў стары.— Вось тут,— ён пастукаў маленькім белым пальчыкам па белым абрусе,— тут ён выяўляецца ў найбрыдчэйшай форме. Калі вас не прыняў які-небудзь начальнік, вы яшчэ можаце падумаць, што ён заняты...

— Што ж рабіць усё-такі, га? — спытаўся дзяцюк.

— Вазьміце каньяку. На каньяк нормы няма.

— Праўда?

— Ага.

Хлопец паклікаў афіцыянтку.

— Я перадумаў,— сказаў ён.— Дайце бутэльку каньяку і два... Баця, шашлык будзеш?

Стары пакруціў галавой.

— Я ўжо сабе заказаў.

— Два шашлыкі, пару салатаў якіх-небудзь і курыцу ў табаку.

— Табака,— папраўіла афіцыянтка, запісваючы.

— Я ведаю,— сказаў дзяцюк.— Проста жартую.

— Усё?

— Бадай, усё.

Афіцыянтка пайшла.

Дзяцюк з дакорам пакруціў галавой.

— І праўда бюракраты. Каньяк жа мацнейшы. Яны што, не ведаюць?

— Каньяк даражэйшы, вось у чым справа,— растлумачыў стары.— Вы, напэўна, нетутэйшы? Прыезджы?

— Ага. Па запчасткі прыехаў. Сёння атрымаў — трэба ж замачыць.

— Сібірак?

— З Урала.

— Падобна...— Стары ўсміхнуўся.— Некалі быў у Сібіры, бачыў...

— Дзе?

— Ва Уладзівастоку.

— А-а. Не даводзілася там бываць.

Зайграла музыка. Хлопец паглядзеў на аркестрантаў. Да мікрафона падышла дзяўчына, адзетая ў бліскучую вузкую сукенку, усміхнулася ў залу... Дзяцюк спакойна адвярнуўся — яму такія не падабаліся. Дзяўчына заспявала, ды такім нечакана нізкім, густым голасам, што дзяцюк зноў паглядзеў на яе. Дзяўчына спявала пра «добрага, не сустрэтага яшчэ». Дзівосна спявала, нібы расказвала. І ў такт музыкі паводзіла клубамі. Дзяцюк заглядзеўся на яе...

Наплывалі даўкія пахі кухні; гоман рэстарана глушыла музыка і песня дзяўчыны. Утульна і добра стала ў вялікай зале з фікусамі.

Хлопцу ўсё больш і больш падабалася дзяўчына. Ён паглядзеў на старога. Той сядзеў спіной да аркестра — уцягнуў галаву ў плечы і глядзеў патухлымі вачамі ў стол. Ніжняя губа адвісла.

— Прыйшла,— ціха сказаў ён, калі адчуў на сабе позірк хлопца. І ўсміхнуўся, нібы апраўдваўся, што на яго так моцна дзейнічае песня.

А дзяўчына ўсё спявала, усміхалася... Ва ўсмешцы яе праглядвала нешта не зусім прыемнае. І ўсё-такі яна была прыгожая і задужа смелая.

Дзяцюк абхапіў галаву вялізнымі рукамі і глядзеў на яе.

— От зараза! — сказаў ён, калі дзяўчына скончыла спяваць.— А?

— У мяне не такая ўжо вялікая пенсія,— даверліва загаварыў стары,— і я яе, ведаеце, усю прамотваю ў гэтым рэстаране — слухаю, як яна спявае. Вам таксама падабаецца?

— Ага.

— І заўважце: яна ж зусім яшчэ дзіця. Хоць нафарбаваная, хоць, ведаеце, гэтая сіняватасць пад вачамі, і ўсміхацца навучылася, але ж усё роўна дзіця. Мяне іншы раз сляза праймае.

— Яна яшчэ будзе спяваць?

— Да без чвэрці адзінаццаць.

Прынеслі каньяк, шашлык, салаты. Старому прынеслі рысавую кашу.

— Вып'еш, баця? — прапанаваў хлопец.

Стары паглядзеў на бутэльку, падумаў, махнуў рукой і сказаў:

— Налівайце. Грамаў дваццаць пяць.

Дзяцюк усміхнуўся, наліў у сінюю чарку — палову, сабе пабухаў у фужэр і адразу, не разважаючы, выпіў.

— А божухна! — здзівіўся стары.

— Што?

— Здорава вы...

— Між іншым, я яго не паважаю — смярдзючы.

— Зайздрошчу я вам... Вы хто па прафесіі?

— Брыгадзір. Лесаруб.

— Зайздрошчу вам, далібог! Прылятаеце сюды, як арлы... З нейкага вялікага жыцця, і вам цесна тут. Цесна, я адчуваю.

Дзяцюк еў шашлык, слухаў.

— Пі, баця.

Стары выпіў, крэкнуў і заспяшаўся закусваць.

— Даўно не піў, гады тры.

— Вы што, адзінокі, га?

— Адзінокі,— стары кіўнуў галавой.

— Дрэнна.

— Нічога. Я неяк не думаў пра гэта. Мне вось яна,— кіўнуў у бок аркестра, дзе толькі што спявала дзяўчына,— дачкой, ведаеце, здаецца. Люблю яе, як дачку. І вельмі баюся за яе лёс.

— Яна ведае цябе?

— Не. Адкуль?

— Добра спявае. Я не люблю, калі пішчаць.

— Праўда, праўда...

Дзяцюк адхіліўся ад стала, гучна стукнуў далонню сабе ў грудзі. Шумна ўздыхнуў.

— Добры шашлычышка.

— Вы — нейкія гаспадары жыцця. Я не ўмею гэтак,— сумна сказаў стары.

Аркестранты зноў узяліся за інструменты.

Зноў выйшла дзяўчына, направіла мікрафон.

Хлопец закурыў.

— Прыйшла,— паказаў ён вачыма на яе.

Стары павярнуўся, зірнуў на дзяўчыну.

— Я не бачу. А ў акулярах глядзець... Неяк не магу, не люблю. Рэдка гляджу.

Дзяўчына заспявала. Песенька была пра тое, як яна закахалася ў маўклівага хлапца, пакутавала, але кахала.

Лесаруб слухаў, задумсна ўсміхаўся. Стары зноў паглыбіўся ў сябе, зноў патух яго позірк і адвісла губа.

Дзяўчына жартавала, расказвала, як яна кахала нейкага ідыёта, які мог вымаўляць толькі «ага» і «ого». Добрая песенька, гарэзлівая. Здавалася, дзяўчына пра сябе расказвае — так проста ў яе атрымлівалася. І ад таго, што яна расказвала гэта ўсім, не баялася, здавалася яна такой роднай, любай...

Хлопец адчуў у грудзях дзіўную, гарачую радасць. Жыццё з усімі сваімі клопатамі і справамі адышло далёка-далёка. Засталіся толькі гукі яго, песня. Можна было ісці ў прасторы, робячы вялізныя крокі — так лёгка зрабілася.

— Давай яшчэ, баця! — Хлопец наліў старому і сабе.

Стары пакорна выпіў, паматаў галавой і сказаў:

— Што ж гэта будзе са мной?

— Нічога не будзе... Мне таксама нешта шкада яе,— прызнаўся сібірак.— Спявае тут п'яным мордам.

— О!..— Стары нацэліўся на яго белым пальчыкам.— Ажаніся з ёю! І забяры куды-небудзь! У Сібір. Ты ж можаш... Ты вунь які!..

— Па-першае, я жанаты,— запярэчыў дзяцюк.— А потым... ці ж паедзе яна ў Сібір? Ты падумаў...

— З табой паехала б.

— Наўрад.

Старога прыкметна размарыла. Ён выцер рот, кінуў скамечаную хустачку на стол, загаварыў горача і павучальна:

— Ніколі не трэба так разважаць: паехала, не паехала. Бачыш, што чалавеку трэба дапамога,— бяры і дапамагай. Не пытайся. Тым больш бог цябе нічым, здаецца, не пакрыўдзіў — ты ж дужы!

— Я жанаты! — зноў запярэчыў дзяцюк.— Ты што?

— Я не пра тое. Я пра тэндэнцыю... Налі мне яшчэ. Нешта мне сёння надта добра.

Сібірак наліў у сінюю чарку. І сабе таксама наліў у фужэр.

— Ты мне нагадаў аднаго добрага чалавека,— пачаў расказваць стары.— Ты моцна крычыш?

— Як — крычыш?

— Ну, зараві,— папрасіў стары.

— Навошта?

— Я паслухаю. Зараві.

— Нас жа выведуць адсюль.

— Га-а... Плявацы! Зараві па-мядзведжы, я прашу.

Хлопец паставіў фужэр, набраў паветра і зароў.

Тыя, што танцавалі, прыпыніліся, ад усіх столікаў павярнуліся ў іх бок.

Стары ўлюбёна глядзеў на хлопца.

— Здорава!.. Быў у мяне таварыш, таксама настаўнік малявання... Ростам вышэй за цябе... Ох, як ён умеў раўці! Пасля ён стаў тыграловам. Ты ведаеш, як тыграў ловяць? Іх ровам палохаюць. Яны ад нечаканасці садзяцца на заднія лапы...

Выйшла спявачка і заспявала нейкую незнаёмую песню. Сібірак не мог разабраць слоў, ды і не хацеў разбіраць. Зноў аблапіў галаву і сядзеў, слухаў.

— Давай забяром яе? — прапанаваў ён старому.— Яна ў нас у клубе спяваць будзе.

— Давай,— пагадзіўся стары.— У мяне на душы спакайней будзе. Давай, Ваня!

— Мяне Сямёнам завуць.

— Усё роўна. Давай, сынок, выратуем чалавека!

Хлопец слухаў старога, і вочы ў яго сталі вільготныя. Пудовыя кулакі яго самі па сабе сціскаліся на стале.

— Ты таксама паедзеш са мной,— заявіў ён.

— Я? Паеду! — Стары стукнуў слабым кулаком па стале.— Мы з яе спявачку зробім! Я разумею ў гэтай справе.

Да іх падышла афіцыянтка.

— Таварышы, што тут у вас? Крычыце... Вы ж не ў лесе, напэўна?

— Спакойна,— сказаў сібірак.— Мы ўсё разумеем.

— З вамі можна разлічыцца? — загаварыла афіцыянтка да старога.

— Спакойна,— сказаў стары.— Рабіце сваю справу.

Афіцыянтка крыху здзіўлена паглядзела на яго і пайшла.

— Я ўсё жыццё хацеў быць дужым і дапамагаць людзям, але ў мяне не атрымлівалася — я слабы.

— Нічога,— сказаў хлопец.— Ты бачыш? — Паказаў кулак.— Са мною не прападзеш: з ходу любога ўкакошу.

— Эх, як я бяздарна пражыў, Ваня! Як шкада... Я нават не кахаў — баяўся кахаць, далібог.

— Чаму?

Стары не слухаў яго, далей казаў:

— А была вось такая ж і таксама спявала... Прыгожа спявала! І я таксама сядзеў і слухаў. Яе таксама трэба было выратаваць. Там былі тры афіцэры... Даўно гэта было. Вельмі прыгожая! Цьфу!..— Стары затрос галавой.— Няхай бы я лепш памыляўся, хай бы лепш піў,— магчыма, смялейшы быў бы. Я ж ні разу ў жыцці не памыліўся, Васьня! — Ён стукнуў сабе ў грудзі, памаргаў вачамі.— Ніводнага коніка за ўсё жыццё не выкінуў. Ты можаш гэтаму паверыць?

— І што ж тут дрэннага?

— Ніводнай правільнасці — гэта агідна. Гэта жахліва! Калі мяне шкадавалі, мне здавалася — кахалі, калі сам кахаў — я разважаў і баяўся.

— Лішку выпіў, бацця,— сказаў хлопец.— Закусвай.

— Ты не разумееш — гэта добра. Але трэба разумець такія рэчы.

— А ў Сібір паедзем?

— Паедзем. Я дап'ю гэта?

— Пі,— дазволіў хлопец.

Стары дапіў каньяк, бразнуў чарку аб падлогу. Яна са звонам разляцелася. Сам лёг грудзьмі на стол і заплакаў. Да іх століка ішлі афіцыянтка і швейцар. Сібірак, прыжмурыўшыся, спакойна глядзеў на іх. Ён быў гатовы абараняць старога. Яму нават хацелася, каб яго трэба было абараняць.

— У чым тут справа?

— Як справа, так злева. Мы едзем у Сібір,— пагражальна сказаў дзяцюк.

— Добра. А навошта ж хуліганіць?

— Мы не хуліганім, мы слухаем, як тут спяваюць.

— Яна ж бяздарна спявае, Ваня! Гэта жахліва, як яна спявае,— сказаў стары праз слёзы.— Ты равеш лепш. Больш таленавіта. Яна ж не ўмее спяваць. Але не ў гэтым справа. Зусім не ў гэтым.

— Хто будзе плаціць за чарку?

— Я,— адказаў сібірак.— Я разлічваюся за ўсё.

Пакуль афіцыянтка разлічвалася з хлопцам, стары, апусціўшы на рукі сваю паліраваную галоўку, ціхенька плакаў. І мармытаў:

— Эх, Ваня, Ваня... Звер ты мой любы... Як ты здорава равеш. Арол!.. Паляцім у тайгу. Паляцім... у Сібір!

— Хто гэта, не ведаеце? — ціхенька спыталася афіцыянтка.

— Гэта...— Хлопец задумаўся.— Гэта вядомы інтэлігент. Ён цяпер на пенсіі.

Афіцыянтка з жалем паглядзела на старога.

— Ён часта бывае тут, але ніколі не піў. А сёння нешта... Забярыце яго, а то трапіць куды-небудзь.

Хлопец нічога не адказаў на гэта, устаў. Стары не супраціўляўся, толькі спытаўся:

— Куды, Ваня?

— Да мяне, у нумар. А заўтра ў Сібір.

Дзяжурная паверха заўпарцілася, не хацела пусціць у нумар са старым. Хлопец трымаў старога; павярнуўся да яе бокам і сказаў:

— Вазьміце ў штанах, у кішэні, грошы. Вазьміце колькі трэба, толькі не вякайце.

Дзяжурная глыбока абурылася, дала ключ, але папярэдзіла:

— Заўтра ж вас тут не будзе!

— Заўтра мы ў Сібір паедзем.

— У Сібір, Ваня!.. Я хоць памру, як чалавек,— мармытаў стары.— Ведаеш, не трэба ключом,— дай нагою разок,— папрасіў ён.— Вельмі прашу цябе: адзін разок, нагой... Мы пасля заплоцім.

— Спакойна,— гудзеў яго сябра.— Спакойна, баця. Ну разышоўся!..

Хлопец адчыніў нумар, клапатліва паклаў старога на ложак, зняў з яго туфлі, хацеў зняць пінжак, але стары чамусьці запярэчыў.

— Не трэба, я так... Не шкадую, не хлушу, не плачу...

— Добра,— згадзіўся хлопец.— Спі.— Выключыў святло і лёг на канапу.

— У Сібір, Ваня? — спытаўся стары.

— Заўтра. А сёння трэба спаць.

— Спім. Эх, Ваня, Ваня...

— Спі, баця.

Раніцаю сібірак знайшоў на стале запіску:

«Ваня, я не магу з табою, у Сібір. Дзякую за ўсё. Бывай».

Старога нідзе не было. Сказалі: пайшоў рана, вельмі рана.

## Віктар Астаф'еў

# ГЕМАФІЛІЯ

Я надумаўся заначаваць там, дзе вечарам ганяў рабчыкаў — на крутым яловым пагорку, які быў нібы абрэзаны з бакоў вузкай далінай, дзе вышэй чалавека цесна стаялі збляклая крапіва, падсохлы вятроўнік, малачай, цыкуха і рознае дуддзё, якое толькі што прыціхла ад першых халадоў, але яшчэ ўпарта зелянела і напорліва расло. У вузкай даліне густа, клубамі кусціўся альшэўнік і лазняк. Па схілах цесна, у рады, наступалі асіннік, бярэзнік, ліпы, але, упёршыся ў густую яловую сцяну і нібы апёкшыся аб гарачую рабіну, якая апяразвала вогненнай стужкай змрочны соснік, яны спыняліся, пакорліва і ціха замікалі і нібы адцякалі ў вярхоўе да крыніц, у цёмныя прэлыя лагі.

Пагорак быў амаль голы, як выдма, толькі верас, глог і вятроўнік разрозненай, патрапанай у баях ротай наступалі знізу, ад рэчкі, і чым далей у цемру, тым больш кусты, больш за ўсё пад'ялоўцавыя, былі падобны на людзей. Сваім падалом, на край якога напамывала і панавальвала камення, пагорак упіраўся ў раку Усьву, за якой шырока і ціха дагарала вячэрняя зара, і крыніцы, выціснутыя пагоркам з імшаных і камяністых шчылін, блішчалі слязьмі, разразаючы поперак узбярэжжа, а сама рака, нібы цяпер толькі вылітая ў спрадвечнае рэчышча, астывала, пакрываючыся акалінай ля зямлі, але пасярод усё яшчэ пераліваласся, ярка мігала апошнімі чырвонымі водсвітамі полымя з сіваватай просінню. Над цяжкай свінцовай вадой дрыжала і ўсё гусцей асядала апошняе гарэлае паветра і гарачыня.

Я яшчэ завідна прынёс з берага Усьвы сена са стога, засіліў кацялком вады, паламаў смуродніку, заварыўшы, напарыў чаю, не спяшаючыся, павячэраў і, павёўшы парадак ля агню, прываліўся спіной да піхты, якая пахла чадам, густа сплятаючы ўгары над галавой лапкі, грэў разутыя ногі, лашчыў іх, патруджаныя, з назызлымі жы-

ламі, і чуў, як адпускае ўсё цела, і косці, нібы выверпутыя ў суставах ад цяжкай работы, выпростваюцца, кладуцца кожная на сваё месца, і ўвесь я нібы адмакаю, нібы нават трохі аддаляюся сам ад сябе, акунаючыся ў ціхую даверлівую дрымоту, толькі спіна, мокрая ад поту і гарачага чаю, яшчэ корчыцца, уздрыгвае, ціснецца ў сена, шукаючы зручнага месца.

Я драмаў, не спяшаючыся засынаць: ведаў, якая доўгая і спакойная ноч наперадзе, які ў мяне вялікі начны адпачынак і якая радасць — ведаць гэта і нікуды не спяшацца. Можна глядзець, глядзець і кожную хвіліну бачыць наўкола ў прыродзе змены і адчуваць разам з ёю ціхае насцярожлівае сутонне перад ноччу. Усё яшчэ відаць, як унізе астывае рака; за ёй сталі лепш вылучацца стагі сена па лугах; узлескі за лугамі, якія яшчэ добра былі знаць на апошнім святле па краі неба, зусім пацямнелі, счапіліся, як ад ціхага спалоху, і ствалом і лісцем. Нічога не чуваць, і таму, мусіць, у мяне ў вушах усё яшчэ пераліваецца свіст рабчыкаў. Ужо без азарту і злосці ўспомніў я, як хітрылі рабчыкі, не падпускаючы мяне блізка; набоі былі старыя, слабыя; сцёбнутыя шротам рабчыкі, як ад удару, падскоквалі ўгору і адтуль, нібы мячыкі, каціліся ў даліну. Кусалася крапіва, калоліся сучкі, я спяшаўся ўніз, дзе на дуддзі і на ягадніку яшчэ свежа калыхаліся тры-чатыры лёгенькія, стракаценькія пёркі — пух застаўся, мяса паляцела!

За ўвесь вечар я падбіў трох рабчыкаў, хоць смалянуў разоў шаснаццаць — аслабеў хвалёны бяздымны порах. Э-эх, вось быў старасвецкі чорны порах! Грыміць, з дымам, затое — сячэ адразу. І нават калі порах той ляжаў год ці два, а то — і дзесяць, стрэліш — дзічына ў сумцы, а за гэтай яшчэ колькі бегаць трэба. Але нічога, у мяне ў патранташы ёсць яшчэ штук пяць патронаў з дымным порахам, і заўтра раніцай я пакажу гэтым хітрунам! Хай адсыпаюцца... Сяду ў ельніку ля драбналесся, каб была відаць вузкая даліна да самага дна, каб чуць і злева і справа і бачыць на рабінах птушак, што прылятаюць пажыраваць. Вось я ім ужо...

Хутчэй бы днела! Хутчэй бы ішоў заўтрашні дзень...

Доўгая асенняя ноч прыяе, прыяе перш за ўсё тым, што ні камар, ні муха цябе не ўкусяць, спіш па холадзе як пшаніцу прадаўшы, асабліва пад раніцу, ды так моцна, што чуеш: ззяб, змёрз, трэба было б устаць ды падкінуць дроў у агонь, на вуголле, але не можаш адплюшчыць ва-

чэй, не можаш варухнуцца, каб вылезці з цёплага, абжытага, зробленага табой жа гнязда на ядраны холад, які, калі выпаў іней, прабірае да касцей, вось і нацягваеш вышэй на сябе, як дзіця, апратку, якой накрыўся, ціснешся ў сена, скручваешся ў абаранак — тут, у лесе, чым яшчэ добра: ты адзін і можаш рабіць усё, што хочаш, ніхто на цябе пальцам не пакажа.

Можа, наяве, а можа, праз сон я раптам пачуў нейкі рух, знізу, ад ракі. Мякка і шархатліва пакаціўся быў камень, узяў разгон, падскочыў на карэнні, ляснуў аб камень на беразе раз-другі і плюхнуўся ў ваду. Па цёмнай вадзе паволі гнала пешта яшчэ больш цямнейшае і круглае. «Рыбак, нябось, варочаецца дамоў, у горад». Я зноў супакоіўся і пачаў засынаць, але каменьчыкі ўсё часцей і часцей сыпаліся ўніз і булькалі ў ваду, усё бліжэй трашчалі сучкі, чуваць было ўжо, як нехта моцна дыхае — я паддягнуў да сябе ружжо. Зусім блізка пачуўся голас:

— Не трывожцеся, калі ласка, я — рыбак.

У той час, а гэта было ў канцы саракавых гадоў, у тайзе можна было баяцца толькі беглых арыштантаў: лясы, рэчкі, лугі і горы былі яшчэ не асядланыя, не растаптаныя і не замардаваныя нашэсцем гараджан, якія прыязджалі адпачыць. Я добра ведаў у нашым невялічкім гарадку ўсіх лепаляўнічых, рыбакоў і тых, хто проста любіў збіраць у лесе ягады і грыбы.

Голас у чалавека быў незнаёмы. Я чакаў, не падымаючыся з сена, ад агню, а чалавек марудна варушыўся паміж цёмных копак пад'ялоўцу, усё набліжаючыся і набліжаючыся. Нарэшце ён узнік у святле ад вогнішча, наблізіўся да яго і сеў — амаль паваліўся на зямлю.

Чалавек сядзеў доўга і нерухома, заплюшчыўшы вочы і апусціўшы ад слабасці галаву. Я яго не чапаў і ні пра што не пытаўся — ёсць такі няпісаны закон: калі чалавек прыйшоў у лесе да цябе, ён сам скажа, чаго хоча, і папросіць, што трэба.

Чалавек быў акуратна апрануты ў напошапы, адбеленыя на дажджы і ветры плашч, з-пад якога былі відаць пецелькі на фуфайцы; няголены падбародак упіраўся ў разношапы каўнер самаробнага цёплага світэра. Гумовыя боты з высокімі халявамі былі акуратна заклеены ў пад'ёмах і на згібах халяў. Збоку ў яго вісела ладная брызентавая сумка, і ад яе дыхнула пахам той рыбы, які не зблытаеш ні з чым: ледзь улоўны, як бы заквашаны на белым ляс-

пым снезе, ён аддаваў свежымі агуркамі і яшчэ нейкай духмянаватай рэдкай траўкай, але ўсё гэта разам пахла проста ракой, добрай, горнай, імклівай ракой.

«Харузятнік!» Доўгая палачка, на якую абапіраўся рыбак, была зусім не палачка, не сучок, а вудаўё, верх у якога бамбукавы, наканечнік жа з тонкай, аскобленай шклом чаромхі; палавінкі вудаўя злучаны бляшанымі трубачкамі. Вудаўё — дык і зусім бедненькае, паплаўка на месцы не было. Але я толькі міг-другі глядзеў, у што апрануты рыбак і што ў яго руках... Згледзеўшы, што правы рукаў, у які чалавек увесь час уцягваў руку, цяжка набрак і скарабаціўся, я спачатку падумаў — ад макраты і слізі, але, прыгледзеўшыся, заўважыў, што абшлаг плашча і петлі ад фуфайкі, якія выставіліся з-пад яго, нават гузік у нейкім чырвоным налёце, нібы ў засохлай глiністай жыжы. І раптам мне зрабілася горача: «Ды гэта ж кроў!»

— Што з вамі? — адхінуўшы хутка плашч, прыўзняўся я.— Вас параніла?

— Не-не! — хуценька азваўся чалавек і, адплюшчыўшы вочы, выставіў у мой бок тоўста закручаную руку.— Гемафілія.

Я не разумеў, маўчаў і глядзеў на рыбака.

— Кроў не гусне. Хвароба такая ёсць.

Калі б не бадзяўся па тайзе змалку, не пабываў на фронце, не пагледзеўся ўсякіх і мук, і цудаў, так і сказаў бы, напэўна: «Якія ж чэрці носяць цябе па лесе з такой хваробай?» А тут хутчэй устаў, пакратаў вогнішча, падкінуўшы ў яго сухіх сучкоў, каб ярчэй гарэла, паставіў на вуголле кацялок з чаем — тым, што астаўся,— і спытаўся:

— Чым я магу вам памагчы?

— Можа, ёсць сухая і чыстая анучка?

Я дастаў з кішэні пасавую хустачку: падаў яе рыбаку, ён кіўнуў галавой — згодзіцца. Успомніў пра хлеб — ён у мяне быў у палатняным мяшэчку,— выняў мяшэчак з рукзака.

Доўга і асцярожна раскручваў я руку пезнаёмага і чым далей раскручваў, тым макрэйшыя і цяжэйшыя ад крыві рабіліся анучкі, і я чакаў, што ўбачу вялікую рану на руцэ, але, раскруціўшы кісць і выцершы пальцы, нідзе нічога не знайшоў.

— Ёрш,— чуць-чуць вінавата ўсміхнуўся чалавек.— Клюнуў, пракляты. Як я ні асцерагаўся, усё-такі ткнуўся, і вось...

Асцярожна, не вельмі туга, я закручваў руку ў рыбака і дзівіўся з такой аказіі: па брушку вялікага пальца ўскочыла маленькая, не згледзець, пацерачка, налілася са спелую бруснічку, акруглела, лопнула і цененькай нітачкай пацягнулася па запясці пад рукаво.

— І вось жа, калі стараешся, каб не ўкалоцца, не зачапіць скуры, усягды ўколешся і зачэпіш яе,— сказаў ужо весялей чалавек, нібы апраўдваючыся перада мной.

— Гэта ўжо так,— падтрымаў я яго,— рабчыка клічаш — хоць бы не кашлянуць, хоць бы не кашлянуць, а цябе душыць дурны кашаль, а цябе душыць... Ну і забудзеш... Рабчыка — як і не было...

Рыбак, не спяшаючыся, выпіў чаю, салодкага, добра ўпрэлага, і, крыху прагнаўшы смагу, расказаў мне пра тое, што хвароба ў яго гэта ад параджэння, што сам ён з Ленінграда, тут, на Урале, жыве яго сястра, і ён кожны адпачынак ездзіць да яе, ды і не так да яе, як падзівіцца на ўральскую, такую магутную старадаўнюю прыроду, дзіўную і ціхую восенню. Нідзе болей няма такой восені. Але галоўнае — страсць сваю пацешыць: няма для яго большай радасці, чым харузаванне, асабліва ўвосень, калі харыус коціцца з мелкіх рэчак. Забягаючы мне наперад, каб я не спытаўся: як жа з такой хваробай адзін па тайзе? — падбадзёраны трохі чаем, рыбак шчыра і ўсё гэтаксама трохі вінавата ўсміхнуўся:

— Ну а што? Лепш памерці дома? У бальнічнай палаце? Не, не! Я хоць надыхаюся, нагледжуся, нарадуюся на ўвесь век, які мне адпушчаны. Хай ён і нядоўгі век, але нагледзеўся я і пекнаты і радасці зведаў столькі!..

Што з імі, такімі вар'ятамі, зробіш? Не могуць яны жыць без прыроды. Сам такі! Пакуль мой новы знаёмы гаварыў пра лоўлю рыбы, пра Урал, рэкі і лясы якога ён, падзіва, ведаў куды як лепш за мяне, хоць я і пражыў тут пяць гадоў, я перабіраў у памяці, стараючыся ўспомніць сродак, якім можна было б спыніць кроў,— маю хусачку і абкручаны зверху палатняны мяшэчак ужо прабіла з сярэдзіны шчаціністая, як галоўка дзеда, плямка, але нічога, апрача крапівы, не ўспомніў.

Я зрабіў з бяросты невялічкі факел, выліў чай да кроплі з кацялка ў кружку і спусціўся ў даліну, дзе і парваў лясной крапівы, вымакшы па самы каўнер. Пакуль хадзіў у цемнаце і рваў крапіву, успомніў пра змяёўнік — здаец-

ца, ён спыняе кроў, асабліва корань. Яшчэ б святаянніку хоць кусцік знайсці — ад усіх бед і хвароб трава, ну а падарожнік дык усюды знойдзецца.

Доўга шнырыў я пад засенню піхтаў, якія каля пакосаў па-бабску вольна расселіся ў сваіх зялёных спадніцах, шукаў ва ўцалелых ад літоўкі куточках траву, паўтараючы раз за разам, каб не забыцца, пачатак вясковай замовы: «Гарчак, гарчак... Птушыны, змяіны... знайдзіся, акажыся...»

Але адгарэла, адцвіла трава — восень усё ж, паспрабуй без кветак і прыкмет знайсці траўку, ды яшчэ ўпоцемку — уся пажаўцела, зблякла. Але ўбачку сярод апоўзлага маркоўніку і звітай у мачалку травы я знайшоў усё-такі стрэлачкі змяёўніку з бляклымі кветачкамі і побач яго брата — разлапістага гарчака,— для пэўнасці пажаваў у зубах і пачуў з малых гадоў не забытую кіслю, як ад шчаўя.

За піхтамі, якіх наўкола абтапталі калгасныя каровы, на маленькай палянцы, каля прыціхлага мурашніка знайшоў я і кусцік святаянніку з адцвілымі васковымі кветкамі. Падарожнік рваў вобмацкам ля ракі каля сцежкі.

Па́рыў я траўку ў кацялку, студзіў адвар, рабіў ножыкам кашку з падарожніку. Мой новы сябра сачыў за мной і расказваў мне пра Ленінград, глядзеў на мае клопаты, як на самае звычайнае ў жыцці — было відаць, што ён сам многа памагаў людзям.

— Вайна скончылася,— як пра што звычайнае гаварыў рыбак.— Знікаюць беды. Людзі, прырода, усё-ўсё нібыта нанава, новай дабратой павaрочваецца да нас... Жыць бы ды жыць...

Я прамыў яму руку цёплым адварам; асцярожна і ў той жа час уздрыгваючы ад разгубленасці і ад холаду ўсярэдзіне, выцер кропельку крыві з брушка на вялікім пальцы, заляпіў пракол велічынёй з вушка іголкі кашкай з падарожніку, убінтаваў руку адарваным ад кашулі акраўкам і паказаў на кацялок.

— Піце. Як можаце больш піце — гэта павінна памагчы...

Ён паслухаў, піў цёплы адвар; з нейкай вялай пастойлівасцю з'еў хлеб з маслам, разышоўся і проста з шалупінамі з'еў пару маіх перапечаных на вуголлі бульбін. Я тым часам яшчэ раз схадзіў да ракі з кацялком, вярнуўся з вадой, і рыбак, улагоджаны, сказаў:

— Прычапіўся вось...

— Нічога, нічога, высплюся. Паспею. Мае рабчыкі ад мяне не ўцякуць. Побач, чэрці! — кіўнуў я ў пізіну.

— А мае харыусы ў рацэ. Дзіўна, праўда? Спяць недзе і не ведаюць, што мы тут напагатове...

— Ага-а...

Я шырэй растрос сена, падсунуў яго ад піхты ў галовы. Рыбак лёг тварам да агню, выставіўшы завязаную руку да цяпла, і скора заціх. Спаў ён, як дзіця, ціха, не варушачыся, і я час ад часу падымаў галаву — ці жывы хоць? Яшчэ адзін сустрэчны, яшчэ адно здзіўленне нядоляй чалавека, яго сілай, веліччу перад немінучай смерцю.

Звыклае яшчэ з вайны, са шпіталя, вечнае пачуццё віны перад асуджаным на смерць гняло мяне. Ішло гэта яшчэ і ад таго, што чалавек быў спакойны і зусім не крыўдзіўся на свой лёс. І ад гутаркі з ім не было цяжка на душы. Я нічога не мог сказаць супроць яго звычайнай шчырасці, гэты чалавек быў без істэрыкі, без зайздрасці і без нянавісці да тых, хто жыве і хто будзе жыць пасля яго — прыкмета здаровай натуры, цвярозага розуму і лагоднага характару.

Я падкідаў дроўцы ў агонь, адграбаў палачкай вуголле на край вогнішча, каб грэла рыбака роўным цяплом і ў позні час, і халоднай доднiцай, сам пасля мігам заснуў мёртвым сном.

Прачнуўшыся, я адразу чуць не аслеп: усюды было бела — на лузе, на стагах, на зялёнай атаве ўздоўж берагоў Усьвы, на ельніку, на апошнім лісці на асінах і бярозах ляжаў іней. Кожная лапка на піхце з таго боку, дзе не даходзіла цяпло ад агню, была нібы намочана ў срэбную фарбу. Унізе, у даліне, звонка і бесклапотна пішчаў рабчык, ля ракі траскалі драздзы і, пацяжэўшы ад намоклага пер'я, нядоўга пырхалі над зямлёй, ціснуліся ў ельнік, асыпаючы іней,— цягнула іх да рабіны.

Я ўскочыў ля агню, які зырка гарэў ад ссунутых у кучу галавешак, і не знайшоў вачыма рыбака. На сене ляжаў лісток у клетачку, вырваны з блакнота, і на ім было напісана: «Дзякуй, брат!» Я паглядзеў на лісток з аднаго і з другога боку — ён быў чысты, без крыві. «І дзякуй богу!» — сказаў я сам сабе, збіраючыся хутчэй наісці. Пад піхтай, воддаль ад вогнішча, нешта бялела, як срэбра. Я нахіліўся: тры адборныя вялікія харыусы былі чуць-чуць накрытыя сырым мохам і лапкай піхты.

Пад гарой, недалёка ад краю вострава, відаць была чорная постаць чалавека — ён зайшоў на плынь, стаяў і рэдка, паволі махаў вудаўём — мастак, лавіў на падман.

Я падумаў, што паснедаю пасля, на хаду сербануў з кружкі цёплага чаю, спяшаючыся, закінуў за плечы рукзак і паспяшаўся з ельніку на ўзлесак, да белалесся, уздоўж якога пелі ўжо, заліваючыся, задзірыстыя маладзенькія пеўні і маці-рабчыха дарэмна злавалася і шыпела з зямлі, асцерагаючы малых.

Ядраная, белая сонечная раніца звінела прымарожаным лісцем, нібыта лес біў у званы, абуджаючы да жыцця ўсё жывое на зямлі.

12 Зак. 219

# Валянцін Распуцін

## РУДОЛЬФІО

Першая сустрэча адбылася ў трамваі. Яна кранула яго за плячо і, калі ён расплюшчыў вочы, сказала, паказваючы на акно:

— Вам выходзіць.

Трамвай ужо спыніўся, і ён, праціснуўшыся, выскачыў адразу за ёй. Яна была зусім яшчэ дзяўчынка, гадоў пятнаццаць-шаснаццаць, не больш, ён зразумеў гэта адразу ж, убачыўшы яе круглы твар, які яна павярнула да яго, чакаючы падзякі.

— Дзякую,— сказаў ён,— я ж мог праехаць.

Ён адчуў, што яна гэтым не задаволена, і дадаў:

— Сёння быў шалёны дзень, я вельмі стаміўся. А ў восем мне будуць званіць. Так што лічы, што ты мяне здорава выручыла.

Здаецца, яна ўзрадавалася, і яны разам пабеглі праз дарогу, аглядваючыся на машыну, што імчалася побач. Ішоў снег, і ён заўважыў, што на ветравым шкле машыны рухаўся «дворнік». Калі ідзе снег, вось такі мяккі, пухкі, нібы дзесьці там, зверху, скубуць нейкіх дзіўных снежных птушак,— няма ніякай ахвоты ісці дадому. «Дачакаюся званка і зноў выйду»,— вырашыў ён, павярнуў твар да яе і задумаўся: што ж ёй сказаць, бо маўчаць было ўжо няёмка. Але ён зусім не ведаў, пра што можна з ёй гаварыць і пра што нельга, і ўсё яшчэ разважаў, калі яна сказала сама:

— А я вас ведаю.

— Няўжо! — здзівіўся ён.— Гэта адкуль жа?

— А вы жывяце ў сто дванаццатым, а я ў сто чатырнаццатым. У сярэднім два разы ў тыдзень мы разам едзем у трамваі. Толькі вы, вядома, мяне не заўважаеце.

— Гэта цікава.

— А што тут цікавага? Нічога цікавага няма. Вы, дарослыя, заўважаеце толькі дарослых, вы ўсе вялікія эгаісты. Мо не?

Яна павярнула галаву і глядзела на яго злева, знізу ўверх. Ён хмыкнуў толькі і нічога не адказаў ёй, таму што ўсё яшчэ не ведаў, як паводзіць сябе з гэтай дзяўчынкай, што можна, а што нельга ёй сказаць.

Нейкі час яны ішлі моўчкі, і яна глядзела проста перад сабой і, гэтак жа гледзячы проста перад сабой, нібы між іншым, сказала:

— А вы яшчэ не сказалі, як вас зваць.

— А табе гэта трэба ведаць?

— Трэба. А што? Чамусьці некаторыя лічаць, што калі я хачу ведаць, як завуць чалавека, то абавязкова выяўляю да яго нездаровую цікавасць.

— Добра,— сказаў ён,— я ўсё зразумеў. Калі гэта так неабходна — мяне завуць — Рудольф.

— Як?

— Рудольф.

— Рудольф? — Яна засмяялася.

— Ты чаго?

Яна засмяялася яшчэ гучней, і ён, прыпыніўшыся, здзіўлена глядзеў на яе.

— Ру-дольф,— яна выцягнула губы і зноў зайшлася ад смеху.— Ру-дольф. Я думала, што так хіба толькі слана ў звярынцы могуць зваць.

— Што?!

— Ты не крыўдуй,— яна кранула яго за рукаў.— Але смешна, далібог, смешна. Ну што мне рабіць, калі смешна?

— Дзяўчо ты,— пакрыўдзіўся ён.

— Вядома, дзяўчо. А ты дарослы.

— Колькі гадоў табе?

— Шаснаццаць.

— А мне дваццаць восем.

— Я ж кажу: ты дарослы, і цябе завуць Рудольф.

Яна зноў зарагатала, весела паглядваючы на яго злева, знізу ўверх.

— А цябе як завуць? — спытаўся ён.

— Мяне? Здагадайся! Ніколі не здагадаешся.

— А я і не буду.

— А калі б і захацеў — не здагадаўся б. Мяне завуць Іо.

— Як?

— Іо.

— Нічога не разумею.

— Іо. Ну, «і» і яшчэ адна галосная «о». Іо!

Адплата адбылася імгненна. Ён ужо не мог стрымаць

сябе і рагатаў, хістаючыся то ўзад, то ўперад. Дастаткова было яму толькі паглядзець на яе, і смех пачынаў разбіраць яго ўсё больш і больш.

— І-о,— булькала ў яго ў горле.— І-о.

Яна чакала, паглядваючы то ў адзін бок, то ў другі, і, калі ён крыху супакоіўся, пакрыўджана сказала:

— Смешна? Нічога смешнага. Іо — звычайнае латышскае імя, а я латышка.

— Прабач,— усміхаючыся, ён нахіліўся да яе.— Але мне сапраўды было смешна. Вось цяпер мы квіты, згода?

Яна кіўнула.

Першы быў яе дом, а пасля — яго. Прыпыніўшыся каля пад'езда, яна спыталася:

— А як званіць табе?

— Не трэба званіць мне,— сказаў ён.

— Баішся?

— Не, не таму.

— Дарослыя ўсяго на свеце баяцца.

— Гэта праўда,— згадзіўся ён.

Яна выцягнула з рукавіцы сваю маленькую ручку і падала яму. Рука была халодная і ціхая. Ён пацісну́ў яе.

— Ну, бяжы дадому, Іо...

У дзвярах яна спынілася.

— А цяпер ты пазнаеш мяне ў трамваі?

— А як жа, вядома, пазнаю.

— Да сустрэчы ў трамваі... — яна ўзняла руку над галавой.

— ...у якім мы разам паедзем,— дадаў ён.

* * *

Праз два дні ён паехаў у камандзіроўку на поўнач і вярнуўся толькі праз два тыдні. Тут, у горадзе, ужо адчуваўся востры пах блізкай вясны. Пасля паўночных туманаў усё тут было ярчэйшае і званчэйшае, нават трамваі.

Дома жонка траха не адразу сказала яму:

— Тут табе кожны дзень нейкая дзяўчынка звоніць.

— Што яшчэ за дзяўчынка? — абыякава і стомлена спытаўся ён.

— Не ведаю. Я думала, ты ведаеш.

— Не. Не ведаю.

— Яна мне надакучыла.

— Цікава,— неахвотна ўсміхнуўся ён.

Ён мыўся ў ваннай, калі зазваніў тэлефон. Праз дзверы было чуваць, як жонка адказвала: прыехаў, мыецца, калі ласка, пазней. І ён ужо збіраўся класціся спаць, калі зноў зазваніў тэлефон.

— Алё,— сказаў ён.

— Рудзік, прывітанне, ты прыехаў! — пачуўся ў трубцы чыйсьці радасны голас.

— Добры вечар,— асцярожна адказаў ён.— Хто гэта?

— А ты не пазнаеш? Эх ты, Рудзік... Гэта я, Іо.

— Іо,— адразу ўспомніў ён і міжвольна засмяяўся.— Добры вечар, Іо. Ты, як я бачу, знайшла мне больш адпаведнае імя.

— Ага! Табе падабаецца?

— Мяне так звалі, калі мне было столькі ж, колькі табе цяпер.

— Не задавайся толькі.

— Не, што ты...

Яна замоўкла, і ён, не вытрымаўшы, спытаўся:

— Ну, дык як жыццё, Іо?

— Рудзік, хто яна — твая жонка?

— Ага.

— А чаму ж ты мне не сказаў, што жанаты?

— Прабач,— жартуючы, адказаў ён,— я не ведаў, што гэта так важна.

— Вядома, важна. Ты што — кахаеш яе?

— Ага,— сказаў ён.— Іо, паслухай, калі ласка: не трэба мне больш званіць.

— На-пу-жаў-ся,— нараспеў вымавіла яна.— Ты, Рудзік, не падумай што-небудзь. Ты, вядома, жыві з ёй, калі хочаш, я не супраць. Толькі так таксама нельга: не звані. А калі мне па справе якой трэба будзе?

— Па якой справе? — усміхаючыся, спытаўся ён.

— Ну як па якой! Ну... ну, напрыклад, з аднаго рэзервуара ў мяне вада ніяк пад адказ не выліваецца ў другі,— не разгубілася яна.— Тады ж можна?

— Не ведаю.

— Вядома, можна. А яе ты не бойся, Рудзік, нас жа двое, а яна адна.

— Каго? — не зразумеў ён.

— Ды жонкі тваёй.

— Да пабачэння, Іо.

— Ты стаміўся?

— Але.

— Ну, добра. Пацісні мне лапу і кладзіся спаць.

— Цісну табе лапу.

— А з ёй нават не размаўляй.

— Згода,— ён засмяяўся.— Не буду.

Усё яшчэ ўсміхаючыся, ён растлумачыў жонцы.

— Гэта Іо,— сказаў ён.— Гэтак завуць гэту дзяўчынку. Цікавае імя, праўда?

— Ага... — адказала яна і паглядзела на яго, нібы чакала, што ён скажа яшчэ нешта.

— Яна не змагла рашыць задачу з двума рэзервуарамі. Яна вучыцца ці то ў сёмым, ці то ў восьмым класе — не памятаю.

— І ты дапамог ёй рашыць задачу?

— Не,— адказаў ён.— Я ўсё пазабываў, а рэзервуары — гэта сапраўды складана.

* * *

Раніцай, на золку, раптам зазваніў тэлефон. Увесь горад спаў апошнім перадсвітальным сном. Падхапіўшыся, Рудольф паглядзеў на дом, што стаяў насупраць,— ні ў адным акне яшчэ не было святла, і толькі пад'езды, як губныя гармонікі, зззяючы металам, свяціліся чатырма роўнымі радамі. Тэлефон не пераставаў званіць. Падыходзячы да яго, Рудольф паглядзеў на гадзіннік: палова шостай.

— Слухаю,— сярдзіта сказаў ён у трубку.

— Рудзік, Рудзік...

Ён раззлаваўся:

— Іо, гэта ж чорт ведае што...

— Рудзік,— перапыніла яго,— паслухай, не злуй, ты яшчэ не ведаеш, што здарылася.

— Што здарылася? — астываючы, спытаўся ён.

— Рудзік, ты ўжо больш не Рудзік, ты Рудольфіо,— урачыста паведаміла яму.— Рудоль-фіо! Здорава, праўда? Гэта я толькі што прыдумала. Рудольф і Іо — разам атрымліваецца Рудольфіо, як у італьянцаў. Праўда, га?

— Рудольфіо.— У яго голасе змяшаліся адчай і лютасць.

— Правільна. Цяпер у нас з табой адно імя — цяпер мы неразлучныя. Як Рамэо і Джульета. Ты Рудольфіо, і я Рудольфіо.

— Паслухай,— стрымліваючы сябе, сказаў ён.— Ты б не змагла другім разам паведаміць мне маё новае імя, у зручнейшы час?

— Ну, як ты не разумееш, што я не магла чакаць. Вось.

І яшчэ, табе пара ўставаць. Рудольфіо, запомні: а палове восьмай я чакаю цябе на трамвайным прыпынку.

— Я сёння не паеду трамваем.

— Чаму?

— У мяне адгул.

— А што гэта такое?

— Адгул — гэта нечарговы выхадны, я не пайду на работу.

— А-а,— сказала яна.— А я?

— Не ведаю. Едзь у школу, і ўсё.

— А ў тваёй жонкі таксама адгул?

— Не.

— Ну, гэта яшчэ нічога. Толькі ты не забывайся: нас цяпер завуць Рудольфіо.

— Я шчаслівы.

Ён паклаў трубку на месца і, вылаяўшыся, пайшоў гатаваць чай. Заснуць цяпер ён усё роўна не змог бы. Да таго ж у доме насупраць ужо свяціліся тры акны.

* * *

Апоўдні ў дзверы пастукалі. Ён мыў падлогу і, адчыняючы, трымаў у руках мокрую анучу, якую чамусьці не здагадаўся пакласці.

Гэта была яна.

— Добры дзень, Рудольфіо.

— Ты! — здзівіўся ён.— Што здарылася?

— Я таксама ўзяла адгул.

Твар, як у святой — ні кроплі таго, што называюць дакорамі сумлення.

— Бач ты! — мужна заначыў ён.— Значыць, гуляем. Ну, заходзь, калі прыйшла. Я зараз скончу мыць.

Не распранаючыся, яна села ў крэсле каля акна і глядзела, як ён, схіліўшыся, водзіць анучай па падлозе.

— Рудольфіо, мне здаецца, ты нешчаслівы ў сямейным жыцці,— сказала яна праз хвіліну.

Ён падняў галаву.

— Адкуль ты ўзяла?

— Гэта вельмі лёгка заўважыць. Напрыклад, ты без усялякага задавальнення мыеш падлогу, а ў шчаслівых бывае не гэтак.

— Не выдумляй,— усміхаючыся, сказаў ён.

— Мо, скажаш шчаслівы?

— Нічога не скажу.

— Ну вось.
— Ты лепш распраніся.
— Я цябе баюся,— паглядаючы ў акно, сказала яна.
— Што-што?
— Ну, ты ж мужчына.
— А... вось яно што.— Ён засмяяўся.— Як жа ты адважылася сюды прыйсці?
— Ну, мы ж з табой Рудольфіо.
— Так,— сказаў ён,— я ўсё забываюся на гэта. Вядома, гэта накладвае на мяне пэўныя абавязкі.
— Безумоўна.

Яна замоўкла і, пакуль ён грукаў вядром на кухні, сядзела ціха. Але калі ён вярнуўся ў пакой, паліто ўжо віседа на спінцы крэсла, а твар Іо быў задумены і сумны.
— Рудольфіо, а я сёння плакала,— раптам прызналася яна.
— Што здарылася, Іо?
— Не Іо, а Рудольфіо.
— Ну, Рудольфіо?
— Гэта ўсё вінавата мая старэйшая сястра. Яна ўчыніла скандал, калі даведалася, што я вырашыла ўзяць адгул.
— Мне здаецца, яна мае рацыю.
— Не, Рудольфіо, сястра не павінна ўмешвацца ў мае справы.— Яна ўстала з крэсла і стала каля акна.— Адзін раз можна, як вы не разумееце. Ведаеш, якая я цяпер шчаслівая, што з табой размаўляю...
Яна зноў змоўкла, і ён уважліва паглядзеў на яе. Праз сукенку, хвалюючыся, у яе праступалі грудзі, як два маленькія гняздзечкі, якія лепяць невядомыя птушкі, каб выводзіць у іх птушанят. Ён заўважыў, што ўжо праз год твар у яе падоўжыцца і будзе прыгожы, і яму зрабілася сумна ад думкі, што пройдзе час і ў яе будзе свой хлопец. Ён падышоў да яе, узяў за плечы і, усміхаючыся, сказаў:
— Усё будзе добра.
— Праўда, Рудольфіо?
— Праўда.
— Я табе веру,— сказала яна.
— Ага.
Ён хацеў адысці, але яна пазвала:
— Рудольфіо!
— А-а!
— Навошта ты так рана ажаніўся? Яшчэ б два гады, і я пайшла б за цябе.

— Не спяшайся,— сказаў ён.— Ты і так выйдзеш замуж за якога-небудзь вельмі добрага хлопца.

— Я хацела б за цябе.

— Ён будзе лепшы, чым я.

— Няўжо,— недаверліва зазначыла яна.— Ты думаеш, бываюць лепшыя?

— У тысячу разоў бываюць лепшыя.

— Але гэта будзеш не ты.— Яна няўмела ўздыхнула.

— Давай лепш піць чай,— прапанаваў ён.

— Давай.

Ён пайшоў на кухню і паставіў чайнік на плітку.

— Рудольфіо.

Яна стаяла каля паліцы з кніжкамі.

— Рудольфіо, у нас з табой самае прыгожае імя. Вось паглядзі, нават у пісьменнікаў няма лепшага.— Яна на момант прыціхла.— Мабыць, толькі вось у гэтага. Эк-зюперы. Праўда, прыгожае?

— Ага,— сказаў ён.— А ты не чытала яго?

— Не.

— Вазьмі і пачытай. Толькі без адгулаў — дамовіліся?

— Дамовіліся.

Яна стала апранацца.

— А чай? — успомніў ён.

— Рудольфіо, я лепш пайду, добра? — усмешка ў яе стала сумная.— Ты толькі не кажы жонцы, што я тут была. Добра, Рудольфіо?

— Добра,— паабяцаў ён.

Калі яна выйшла, ён адчуў, што яму зрабілася чамусьці сумна, яго ахапіў нейкі зусім незразумелы, яшчэ не адкрыты сум, але які тым не менш існуе ў прыродзе. Ён апрануўся і выйшаў на вуліцу.

* * *

Вясна прыйшла неяк адразу, амаль без папярэджання. Людзі за некалькі дзён падабрэлі, і гэтыя некалькі дзён здаваліся ім пераходным перыядам ад пары чакання да пары здзяйснення, таму што вясеннія сны з майстэрствам вопытнай гадалкі наваражылі ім шчасце і каханне.

У адзін з такіх дзён, ужо ўвечары, калі Рудольф вяртаўся дадому, яго спыніла пажылая жанчына.

— Я маці Іо,— пачала яна.— Вы прабачце, вас, здаецца, зваць Рудольфіо.

— Ага,— усміхнуўшыся, згадзіўся ён.

— Я ведаю вас ад дачкі. У апошні час яна шмат гаворыць пра вас, але я...

Яна сумелася, і ён зразумеў, што ёй цяжка спытаць у яго пра тое, што трэба было ведаць ёй як маці.

— Вы не хвалюйцеся,— сказаў ён.— У нас з Іо самыя добрыя адносіны, дружба, і нічога дрэннага ад гэтага не будзе.

— Вядома, вядома,— хвалюючыся, заспяшалася яна.— Але Іо — узбаламучаная дзяўчынка, яна нас зусім не слухаецца. І калі вы зможаце паўплываць на яе... Разумееце, я баюся, узрост такі, што трэба баяцца, яна можа нарабіць глупства. І яшчэ мяне палохае тое, што ў яе зусім няма сябровак сярод аднакласніц і наогул сярод равеснікаў.

— Гэта дрэнна.

— Я разумею. Мне здаецца, вы маеце на яе ўплыў...

— Я пагавару з ёй,— паабяцаў ён.— Але, па-мойму, Іо добрая дзяўчынка, дарэмна вы так непакоіцеся.

— Не ведаю.

— Да пабачэння. Я пагавару з ёй. Усё будзе добра.

* * *

Ён вырашыў адразу ж пазваніць ёй, не адкладваючы, тым больш што жонкі не было дома.

— Рудольфіо! — ён пачуў яе ўзрадаваны голас.— Які ж ты малайчына, што пазваніў, Рудольфіо, а я зноў плакала.

— Нельга так часта плакаць,— сказаў ён.

— Гэта ўсё «Маленькі прынц». Мне шкада яго. Праўда ж, ён быў у нас на зямлі?

— Па-мойму, праўда.

— І па-мойму, таксама. А мы не ведалі. Гэта жахліва, праўда? І калі б не Экзюперы, ніколі б не даведаліся. Невыпадкова ж у яго такое прыгожае імя, як і ў нас.

— Ага...

— А яшчэ вось пра што я думаю: добра, што ён так і застаўся Маленькім прынцам. І вось чаму: а раптам потым ён стаў бы самым звычайным. А ў нас і так вельмі многа звычайных.

— Не ведаю.

— А я ведаю, гэта так.

— А «Планету людзей» ты прачытала?

— Я ўсё прачытала, Рудольфіо. Па-мойму, Экзюперы вельмі мудры пісьменнік. Нават страшна робіцца, які ён

мудры. І добры. Памятаеш: Барка выкупляюць на свабоду, даюць яму грошы, а ён іх траціць на туфлікі дзецям, а ў самога нічога не застаецца.

— Ага,— сказаў ён.— А памятаеш Банафуса, які рабаваў арабаў, а яны яго ненавідзелі і разам з тым любілі.

— Таму што без яго пустыня здавалася б ім самай звычайнай, а ён рабіў яе небяспечнай і рамантычнай.

— Ты малаічына, калі ўсё гэта разумееш,— сказаў ён.

— Рудольфіо,— яна замаўчала.

— Я слухаю,— напомніў ён.

Яна маўчала.

— Рудольфіо,— чамусьці хвалюючыся, сказаў ён.— Прыходзь цяпер да мяне, я адзін.

* * *

Аглядваючыся, яна падышла да крэсла і села.

— Што ты такая ціхая? — спытаўся ён.

— Яе праўда няма?

— Жонкі?

— Ну, яе.

— Не.

— Мымра яна ў цябе.

— Што?

— Мымра — вось што!

— Дзе ты ўзяла гэта слова?

— У вялікай рускай мове. Там ёй нічога больш трапнага не знайшлося.

— Іо, ну нельга ж гэтак.

— Не Іо, а Рудольфіо.

— Ага, так.

— Нядаўна я названіла і трапіла на яе. Ведаеш, што яна мне сказала? Калі ты, кажа, наконт рэзервуараў, то лепш папытайся ў настаўніка. Мне здаецца, яна раўнуе цябе да мяне.

— Не думаю.

— Рудольфіо, а праўда, я лепшая за яе? Я ж яшчэ не афармілася як след, у мяне ўсё наперадзе.

Ён усміхнуўся і кіўнуў.

— Вось бачыш. Па-мойму, табе пара з ёй развесціся.

— Не кажы глупства,— спыніў ён яе.— Я табе задта многа дазваляю.

— Кахаючы, гэтак?

— Не, з дружбы.

Яна, пасупіўшыся, змоўкла, але па ўсім відаць было, што гэта не падоўга.

— Як яе завуць?

— Каго — жонку?

— Ну, яе.

— Клава.

— Нішто сабе нагрузачка.

Ён раззлаваўся:

— Хопіць.

Яна ўстала, на момант заплюшчыла вочы і раптам сказала:

— Рудольфіо, я вар'ятка, прабач мне, я не хацела...

— Толькі не плакаць,— папярэдзіў ён.

— Не буду.

Яна адышла і павярнулася да акна.

— Рудольфіо,— сказала яна,— давай дамовімся так: я ў цябе сёння не была і нічога гэтага не казала, добра?

— Добра.

— Лічы, што гэта «да пабачэння» я табе сказала па тэлефоне.

— Ага.

Яна пайшла.

Праз пяць хвілін зазваніў тэлефон.

— Да пабачэння, Рудольфіо.

— Да пабачэння.

Ён пачакаў, але яна паклала трубку.

* * *

Яна ўжо больш не званіла, і ён даўно не бачыў яе, таму што зноў ездзіў у камандзіроўку і вярнуўся толькі ў маі, калі на сонечных шалях лета канчаткова пераважыла вясну. І ў гэты час у яго заўсёды было шмат працы; успамінаючы пра яе, ён усё адкладваў: пагавару заўтра, паслязаўтра, але так і не пагаварыў.

Яны сустрэліся выпадкова — зноў у трамваі. Ён убачыў яе і стаў таропка прасоўвацца, баючыся, што яна сыдзе,— магла ж яна сысці і на іншым прыпынку, а ён, напэўна, не скочыў бы ўслед за ёю. Але яна засталася, і ён злавіў сябе на тым, што ўзрадаваўся гэтаму больш, чым трэба было, напэўна, пры іх сяброўскіх адносінах.

— Добры дзень, Іо,— лёгка дакрануўшыся рукой да яе пляча, сказаў ён.

Яна спалохана павярнулася, убачыла яго, на момант

разгубілася ад нечаканасці, пасля твар яе засвяціўся радасцю, і яна кіўком галавы адказала на прывітанне.

— Не Іо, а Рудольфіо,— як і раней, паправіла яна.— Мы з табой усё яшчэ сябры, праўда?

— Безумоўна, Рудольфіо.

— Ты некуды ездзіў?

— Ага.

— Я аднойчы званіла, цябе не было.

— Я ўжо цэлы тыдзень тут.

Людзей у трамваі было многа, і іх увесь час штурхалі. Прыйшлося стаць зусім блізка аднаму да аднаго, і яе галава дакраналася да яго падбародка, а калі яна падымала твар і ён, прыслухоўваючыся, нахіляўся, даводзілася адводзіць вочы — гэтак блізка яны былі.

— Рудольфіо, хочаш, я табе нешта скажу? — спыталася яна.

— Вядома, хачу.

Яна зноў падняла твар, зусім блізка да яго твару, так блізка, што яму захацелася зажмурыцца.

— Я вельмі сумую без цябе, Рудольфіо.

— Дурненькая ты,— сказаў ён.

— Я ведаю.— Яна ўздыхнула.— Але ж не сумую я па ўсялякіх хлапчуках, яны мне сто гадоў не патрэбны.

Трамвай спыніўся, і яны выйшлі.

— Ты поедзеш да сваёй Клавы? — спыталася яна.

— Не, давай пагуляем.

Яны павярнулі да рэчкі, туды, дзе пачыналася пустэча, ішлі без сцежкі, пераскокваючы цераз купіны і кучы смецця, і ён узяў яе за руку, дапамагаючы перабрацца цераз завалы.

Яна маўчала. Гэта было так не падобна на яе, але яна маўчала, і ён адчуваў, што яна, таксама як і ён, поўная хвалявання — моцнага, нястрымнага і зусім непадуладнага.

Яны выйшлі да кручы і, усё яшчэ трымаючыся за рукі, глядзелі на рэчку, і кудысьці за рэчку, і зноў на рэчку.

— Рудольфіо,— не вытрываўшы, сказала яна.— Мяне яшчэ ні разу ніхто не цалаваў.

Ён нахіліўся і пацалаваў яе ў шчаку.

— У вусны,— папрасіла яна.

— У вусны цалуюць толькі самых блізкіх людзей,— разгублена сказаў ён.

— А я?

Яна сцепанулася, і ён спалохаўся. У наступны момант

ён раптам зразумеў — не адчуў, а менавіта зразумеў,— што яна закаціла яму самую сапраўдную аплявуху і кінулася бегчы, зноў туды — цераз пустэчу, цераз купіны — праз хваляванне і чаканне.

А ён стаяў і глядзеў, як яна ўцякае, адчуваў, што не можа нават пазваць яе, не можа кінуцца за ёй і дагнаць яе. Ён яшчэ доўга стаяў — спустошаны, ненавісны сам сабе.

* * *

Гэта здарылася ў суботу, а ў нядзелю, вельмі рана, яму пазваніла яе маці.

— Рудольфіо, прабачце, калі ласка, я, відаць, падняла вас...

Голас у яе быў нейкі блытаны, дрыжачы.

— Я слухаю,— сказаў ён.

— Рудольфіо, Іо сёння не начавала дома.

Яму трэба было нешта адказаць, але ён маўчаў.

— Мы ў роспачы, мы не ведаем, што рабіць, гэта ўпершыню...

— Перш за ўсё супакойцеся,— сказаў нарэшце ён,— магчыма, яна заначавала ў сяброўкі.

— Не ведаю.

— Хутчэй за ўсё, так гэта і будзе. Калі гадзіны праз дзве не прыйдзе, будзем шукаць. Толькі супакойцеся, праз дзве гадзіны я пазваню вам.

Ён паклаў трубку, падумаў і сказаў сам сабе: ты таксама супакойся, відаць, яна засталася начаваць у сяброўкі. Але супакоіцца ён не мог, наадварот, ён адчуў, што яго пачынаюць біць нервовыя дрыжыкі. Каб супакоіцца, ён стапайшоў у каморку і, насвістваючы, пачаў корпацца ў старых, яшчэ школьных падручніках. Задачнік па алгебры недзе падзеўся, шукаючы яго, ён трохі супакоіўся.

Тэлефон маўчаў. Рудольф зачыніў за сабою дзверы і пачаў гартаць падручнік. Вось яна: калі з аднаго рэзервуара дзве гадзіны перапампоўваць ваду ў другі рэзервуар...

Зазваніў тэлефон.

— Яна прыйшла.— Не стрымаўшыся, маці заплакала.

Ён стаяў і слухаў.

— Рудольфіо, прыходзьце, калі ласка, да нас.

Яна зноў заплакала і ўжо пасля дадала:

— З ёй нешта здарылася.

* * *

Не пытаючы дазволу, ён зняў плашч, і маці моўчкі паказала яму рукой на дзверы яе пакоя.

Іо сядзела на ложку, падабраўшы пад сябе ногі, і, хістаючыся, глядзела проста перад сабой у акно.

— Рудольфіо! — паклікаў ён.

Яна павярнулася да яго і нічога не адказала.

— Рудольфіо!

— Хопіць,— грэбліва зморшчылася яна.— Які ты Рудольфіо, ты самы звычайны Рудольф. Самы звычайны Рудольф, разумееш?

Удар быў такі моцны, што боль ахапіў адразу ўсё цела, але ён прымусіў сябе застацца. Ён падышоў да акна і прытуліўся да падаконніка.

Яна ўсё хісталася ўзад і ўперад і ўсё глядзела перад сабой, міма яго, і ціха рыпелі пад ёй спружыны ложка.

— Ну, добра,— згаджаючыся з ёй, сказаў ён.— Але растлумач, дзе ты была?

— Ідзі ты к чорту! — не глянуўшы на яго і не мяняючы паставы, стомлена адказала яна.

Ён моўчкі зняў з вешалкі свой плашч і, не адказваючы на маўклівае запытанне яе маці, спусціўся з лесвіцы і пайшоў к чорту. Нядзеля толькі яшчэ пачыналася, людзей на вуліцы было мала, і ніхто яго не спыніў. Ён прайшоў цераз пустыр, спусціўся да берага і раптам падумаў: а куды ж далей?

## Яўгеній Носаў

# ШАПЭН, САНАТА НУМАР ДВА

Пасля першых восеньскіх дажджоў шэры пыльны гасцінец счарнеў, пругка ўтаптаўся і быў да глянцу выгладжаны аўтамабільнымі коламі. Цукровазаводскі грузавік бяжыць па ім ходка, амаль не бразгае бартамі, быццам бы па асфальце. У шафёрскую кабіну ніхто не захацеў падсаджвацца, ехалі ўсім аркестрам у дванаццаць чалавек у кузаве на клубных адкідных крэслах. Тут, на вольным ветрыку, можна было курыць, слухаць, як Ромка, валтарніст, бясконца, травіць свае анекдоты, і жартаваць са студэнткамі, якіх прыслалі выбіраць цукровыя буракі. Машына, якая блішчала нікелем труб, вабіла дзяўчат, што працавалі ўсюды на працягу нашае дарогі. Яны разгіналіся над бурачнымі кучамі і з цікаўнасцю глядзелі з-пад далоняў, запэцканых зямлёю, на франтаватых музыкаў.

— Эй, спакусніцы! — зачаплялі іх хлопцы. — Можа, зайграць вам па-дэ-дэ? Каб весялей працавалася?

Ромка хапаў з каленяў валторну, надзімаўся на ветры плашчом-балонняй і рваў сцюдзёнае восеньскае паветра адрывістымі прарэзлівымі гукамі «Лебядзінага возера»: «Лата-та-та-та-а-тара- та-а-а...»

У адказ ляцелі буракі, грукалі па машыне, хлопцы з рогатам прыгіналіся, хавалі свае галовы за высокія барты, а Пашка схапіў талеркі і спрытна, па-тэнісняму, са звонам адбіваў імі буракі.

— Паволі, паволі там! — крычаў ён з азартам, папраўляючы збітую кепку. — Навошта дабро раскідаеце!

— А вы ўзялі б ды памаглі! — Крычалі дзяўчаты. — Бач, паўбіраліся! Дармаеды!

Машына праносілася міма, а наабапал яе, распальваючыся жартаўлівай лаянкаю, ужо беглі да дарогі, да грузавіка, новыя чародкі дзяўчат і дружна бамбілі кузаў буракамі.

— Эх, саскочу! — рагатаў Пашка. — Ох, злаўлю кірпа-

посую! Пад градам буракоў ён ужо не адбіваўся, а толькі прыкрываў твар талеркамі, тады як Ромка высунуў за борт адзін толькі раструб, утрапёна дудзеў, падахвочваў студэнтак: «Ці-та-та-та-та-а-а...»

Шафёр нечакана тармазнуў, у закратаваным заднім акне з'явіўся яго злы твар.

— Вы што, падурнелі? Шыбы паразбіваюць!

Дзяцька Саша, старэйшы ў аркестры, ад самага завода ехаў стоячы, абапёршыся аб кабіну, і таксама ў час дзявочага налёту вымушаны быў прыгінаць галаў. Тут і ён павярнуўся і пачаў уціхамірваць хлопцаў:

— Досыць ужо вам! Павел, ты як гэта з інструментам абыходзішся!

— Усё, старшой, усё!

Хлопцы неахвотна рассаджваліся на свае крэслы.

А дзяцька Саша бурчаў:

— Разбэсціліся... Не на вяселле ж едзем. Разумець трэба.

— Ну ўсё, адбой. Мір-дружба!

Шэранькая, у дробныя крапінкі кепка «старшога» была насунутая да самых броваў. Ад сустрэчнага ветру фіялетава сінелі ўпалыя шчокі, чыста паголеныя перад самым ад'ездам. З кішэні жорсткага шавіётавага плашча лейкаю ўгору тырчала яго сольная труба ў чорным сацінавым чахольчыку. Паводле даўняй звычкі, ён заўсёды трымаў яе пры сабе.

Ромка зноў узяўся за свае байкі, хлопцы абступілі яго, віслі на плячах адзін у аднаго, рагаталі з усяе сілы. А дзядзька Саша расшпіліў плашч, з-пад якога заблішчала на пінжаку чырвоная ордэнская зорка, дастаў з бакавой кішэні цыгарэту, закурыў яе ў зацішку, за кабінаю, і абыякава глядзеў на бягучую насустрач дарогу.

Побач з глухім ровам і чаднымі выхлапамі прайшоў «КрАЗ». У кузаве, надточаным грубымі негабляванымі дошкамі, і ў двух яго прычэпах дзядзька Саша паспеў разгледзець шэрыя кучы яшчэ не прасохлых буракоў. Следам прамчаліся два блакітныя блізнюкі-самазвалы — таксама з буракамі, і ў абодвух на дзверцах па белым знаку аўтатранса. Калгасы спяшаліся, пакуль спрыяла надвор'е, управіцца з самай надакучлівай культураю.

Вялікая руская раўніна ў гэтых мясцінах паступова пачынала падымацца ўзгоркамі, надпіраць імі неба, адзнакі вышынь, бадай што, выходзілі за дзвесце метраў і вышэй. У глыбокай старажытнасці гэтую граду ўзгоркаў

так і не змог адолець ляднік, што рухаўся са Скандынавіі. Ён раздзяліўся на два языкі і папоўз далей, на поўдзень, абцякаючы граду злева і справа.

І, магчыма, не выпадкова на гэтых вышынях, не асіленых леднікам, без малога ледзь не трыццаць гадоў таму назад разгарэлася небывалая бітва, ад якое, як думалася дзядзьку Сашу, выратаваныя народы маглі б пачаць новае летазлічэнне. Вораг, што пагражаў Расіі новым аледзяненнем, быў спынены спачатку ў міжрэччы Дняпра і Дона, а пасля разбіты і скінуты з водападзельных вышынь. У жніўні сорак трэцяга тады яшчэ малады лейтэнант, проста Саша, на некалькі дзён заскочыў дамоў і паспеў захапіць сляды гэтага пабоішча на паўднёвым фасе. Да маленькай станцыі Прохараўкі, куды быў нацэлены адзін з клешчавых варожых удараў, сапёры сцягвалі з навакольных палёў знявечаныя танкі — свае і чужыя. Яны мёртва насупіліся, смярдзелі яшчэ перагарэлай саляркаю, зеўралі рванымі прабоінамі; побач стаялі «фердынанды», «тыгры», «пантэры», нашы самаходкі і «трыццацьчацвёркі», саюзныя «чэрчылі», «шэрманы», груваснкія шматвежавыя «вікторы». Усё гэта ўтварыла гіганцкі могільнік з многіх сотняў машын. На гэтым пагосце можна было і заблудзіцца.

Дзядзька Саша курыў на ветры, аглядаў вышыні, якія цяпер драмалі над мірнымі палеткамі, а ззаду ў яго хлопцы шумна абмяркоўвалі нейкую пасялковую навіну.

— Зойка прыехала? — чуўся ўзбуджаны Пашкаў голас.— Хлусіш!

— Сам бачыў,— расказваў Раман.— Спадніца — во! Да пятак. З якімсьці флоцкім.

— Хахаль нябось.

— Ды, здаецца, муж. Ва універмазе дыван глядзелі. Я падыходжу: прывітанне, Зоя. А яна чорнымі акулярамі зірк-зірк: «Гэта вы, Рома? Я вас і не пазнала. Багаты будзеце».

— Пра мяне не пытала? — неяк няёмка выскаліўся Пашка.

— Надта ты ёй патрэбны!..

Тады, у Прохараўцы, чакаючы спадарожнай машыны дахаты, на цукровы завод, дзядзька Саша доўга хадзіў сярод танкавых завалаў. Спякотны жнівеньскі вецер надрываў у напіклых гарматных ствалах, арганна і сумна гудзеў у стальных, распаленых сонцам чэравах. Але і мёртвыя, з парожнімі вачніцамі трыплексаў, танкі, здавалася,

па-ранейшаму ненавідзелі адзін аднаго. Дзядзька Саша аглядаў прабоіны, намагаючыся вызначыць, хто і як знайшоў свой канец, пакуль не наткнуўся ў адным месцы на моташна-салодкі смурод, які ішоў ад «тыгра» з адарванай гарматаю. Відаць, нашы сапёры, перш чым адцягнуць танк з поля бою, з-за сваёй пядбайнасці не адшукалі ўсярэдзіне, прагледзелі труп нямецкага танкіста. А магчыма, у той момант ён яшчэ і не быў трупам...

— Іду ў заклад, што адаб'ю! — усё крычаў, гарачыўся Пашка за спіною ў дзядзькі Сашы.— Што, не верыце?

— Каго, Зойку? Ад гэтага марачка? Сядзь, не рыпайся.

— Давай на пляшку каньяку. Жорык, будзь сведкам!

— Кінь, дохлая справа,— супакойваў Ромка.— Марачок — што трэба. Бумажнік выцягнуў, каб за дыван заплаціць,— адны чырвоненькія.

— Пляваў я на чырвоненькія. Толькі адно пальцам кіўну. Я ж з ёю першы любіўся.

— Ты першы? Ну й трапло!..

Цяпер гэтага танкавага могільніка няма. Ён разараны і засеяны, а жалезны лом вайны даўно праглынулі мартэны. Зраўнавалі і згладзілі воспіны-калдобіны ад мінаў, фугасаў, і толькі на пагорках засталіся брацкія магілы.

Дзядзька Саша часам наведваў гэтыя палі са сваёю стрэльбаю і заўважаў, як трактарысты бокам абводзяць плугі, пакідаючы някранутыя рудыя плехі сярод раллі. І як пастухі, выганяючы чароды на пожню, не даюць жывёле таптаць курцінкі магільнай травы. Толькі зрэдку калі пратупае між збажыны да такога месца старэнькая бабулька з навакольнай вёскі, пастаіць схілена ў нямым роздуме і, адолеўшы скруху, возьмецца палоць на ледзь прыкметным узгорку жорсткі чарнобыль, пакідаючы траўку ласкавейшую, далікатную: белы павой, рамонка, сінія кветкі цыкорыі, а пасля, пакідаючы ўзгорак,— перахрысціць гэтую траву ссохлай рукою. Здаралася, што дзядзька Саша і сам знянацку натыкаўся на такі астравок, дзе ў жухлай восеньскай траве сярод раллі ахвотна туліліся перапёлкі, і надоўгу затрымліваўся перад іржавай каскаю, што вянчала магільнае ўзгалоўе. Часам сядзеў тут, стомлены, да самых прыцемкаў, сам-насам са сваімі думкамі, глядзеў, як сумна капаюць дні над гэтымі пагоркамі, і здавалася яму, нібыта закапаныя ў зямлю косці спакваля прарастаюць то тут, то там белымі абеліскамі і быццам бы сам ён толькі што цудам не загінуў тады ў рове, прарастае адным з іх...

— Дзядзь Саш! — не адразу пачуў «старшой».— А, дзядзь Саш!

Ён павярнуўся і ўбачыў гранёную буфетную шклянку, якую падаваў яму Сева-барабаншчык. Круглы Севаў твар з роўнай грыўкаю, якая вылазіла з-пад берэта, быў дзелавіта заклапочаны. Ад хады грузавіка гарэлка плёскалася і падмачыла палову салёнага гурка, якую ён прытрымліваў вялікім пальцам зверху на шклянцы.

— З намі за кампанію,— падтрымаў Іван, па мянушцы «Бейны», высокі нязграбны хлопец з белаватым казіным пушком на скулах, што іграў у аркестры на бейным басе.

Дзядзька Саша ледзь быў не сарваўся, ледзь не крыкнуў на Севу: «Ах ты паршывец! Ты яшчэ ў дзевяты клас ходзіш, яшчэ малако на губах не абсохла! Выганю к чортавай матары з аркестра!» Але не вытрываў яго хлапечаяснага, добрага, цярплівага пагляду, памякчэў і толькі сказаў:

— Я не буду. Дзякуй.

— Дзядзь Саш! Ну, дзядзь Саш! — навыперадкі загаманілі хлопцы: і Ромка, і альтавік Сохін, і другі тэнар Бялібін.

Дзядзька Саша незадаволена маўчаў.

— Хопіць табе, шэф! — з крыўдаю ў голасе сказаў Пашка.— Холадна ж. Аж да касцей прадзьмула.— Ён зябка пацёр далоні.— А калі ты не будзеш, дык і мы не будзем.

— Не буду, хлопцы,— цвёрда сказаў дзядзька Саша.— Вы як сабе хочаце, а я не магу і ў муштук дыхаць гарэлкаю. Мне Гімн сёння іграць,— і адвярнуўся.

— Дык і нам таксама іграць! — чамусьці ўзарваліся хлопцы.— Выходзіць, цяпер трэба за борт выліць?

— Ды сціхніце вы! — абарваў Ромка.

— Сеўка! — пакрыўджана крыкнуў барабаншчыку Пашка.— Дай сюды шклянку! Давай, кажу табе,— і, збянтэжана скрывіўшыся, пачаў цаляць са шклянкі ў горла бутэлькі, заціснутай між каленяў, і, абліваючы штаны, пераліваць гарэлку.— Ну й чорт з вамі! — бурчаў ён невядома на каго.— Усе такія ідэйныя сталі. Яшчэ папросіце, але ж не дам.

Уехалі ў знаёмую Ціхую Варажбу. Нанава адбудаваная вёска больш не пудзіла саламянымі стрэхамі. Перад хатамі за весела размаляваным штыкетнікам барвова кучаравілася вішнёвая моладзь. На зялёнай яшчэ вулічнай траве хлапчукі, пазначыўшы цаглінамі футбольныя вароты,

азартна гапялі чырвона-сіні мяч з запалымі бакамі. Убачыўшы грузавік з аркестрам, яны ўсёй ватагаю са свістам і крыкам памчаліся следам. І доўга яшчэ гнаўся за імі рыжы сабачка і з хрыплым брэхам падкочваўся пад заднюю кола. Сева перавесіўся цераз борт і, каб падражніць яго, замахваўся барабаннай булавою.

— Ну, далібог, як маленькія,— з прыкрасцю адвярнуўся дзядзька Саша.

Яму амаль зусім не верылася, што па гэтай ціхай вуліцы, па яе мураве, калісьці цягнуліся гліністыя, гнойна-жоўтыя рубцы акопных бруствераў, бразгалі пад нагамі стрэляныя гільзы і сухі вецер рассяваў попел з яшчэ гарачых папялішчаў.

Загрукацеў пад коламі расхістаны масток, унізе зябка заблішчала восеньская вада, усыпаная апалым лісцем, і адразу ж па тым баку, па пагорку, паказаліся хаты, але ўжо другое вёскі, Заполля, што таксама ўваскрэсла з праху.

Звярнулі з гасцінца, праехалі яшчэ нейкія вёскі і разы два перасеклі падобныя адна на адну рачулкі. Безліч іх пачыналася тут, сярод гэтых водападзельных вышынь, і разбягаліся яны на ўсе бакі свету: адны — на захад, да Дняпра, другія — к Дону, іншыя ж зліваліся з прытокамі і неслі сваю крынічную свежасць далёкай Волзе.

За апошняй вёскаю, за вільготным куп'істым лугам, выступіў чарговы пагорак. Скрозь рэдкі алешнік чарнеў ён восеньскім ворывам, быў круты і голы, як і ўсе тутэйшыя вышыні, на якіх з-за вятроў і бязводдзя не заведзена было ладзіць жыллё, а толькі ставіліся ў колішнія часы ветракі, якія бясследна загінулі ў полымі апошняй вайны. Млыноў там ужо больш не будавалі, а толькі пад восень ставілі стагі саломы, каля якіх пасля, па снезе ўжо, мышкавалі галодныя лісы. Адсюль, знізу, здавалася, што настылыя аблокі шызым пузам закраналі непрыемную хрыбціну, і там, па ветраным зыры, раптам стаў відаць на перааранай чорнай глебе вялікі стракаты натоўп. Людзі ўдалечыні маўкліва кішэлі, як мурашкі, перамешваліся на адным пятачку, і таму часам сляпуча ўспыхвала пад нізкім сонцам шкло аўтамашыны, якая там стаяла. Гледзячы на гэтых людзей, на іх маўклівае тантанне ў пустынным полі, прыбраным ужо на зіму, дзе не павінна было быць ніякай працы, ніякай прычыны збірацца гуртам, хлопцы ў кузаве міжвольна сцішыліся, зразумеўшы, што гэта і ёсць якраз тое месца, куды іх вёз старшой.

Моўчкі з'ехалі палявой дарогаю на крутую гару, па свежых каляінах звярнулі на багністую раллю. Крыху далей ад натоўпу, за сціртаю саломы, стаялі матацыклы, грузавыя машыны, на зямлі ляжалі веласіпеды. Каля кінутай сеялкі бялела «Волга». Людзі тоўпіліся на лапінцы някрапутага жоўтага ржышча, вакол накрытага брызентам невысокага конуса. Тут жа, каля п'едэстала, валяліся рэшткі кладкі — бітая цэгла, дошкі апалубкі, заляпаныя цэментам. Школьнікі ў яркіх гальштуках і белых аднолькавых пілотачках старанна збіралі ўсё гэтае смецце.

Да машыны з аркестрам падышло некалькі чалавек, і дзядзька Саша адразу пазнаў былых франтавікоў з тутэйшых вёсак, з якімі не раз сустракаўся ў райбальніцы, на ўтэкаўскіх камісіях. Проста цераз борт ён абрадавана паціснуў руку Сцяпану Холадаву з Даўгушоў, Ціхану Аляпіну з чыгуначнага раз'езда, аднапалчаніну Фёдару Бабкіну, яшчэ двум-тром незнаёмым мужчынам і дзеду Васілію, які, хоць і кульгавы, жвава мітусіўся вакол грузавіка.

— Давай, хлопцы, струмент сюды,— клапатліва распараджаўся дзед Васілій, далоншю выбіваючы кручкі задняга борта. На ім была артылерыйская фуражка тых гадоў, яшчэ свежая, незаношаная, мабыць, ён ашчаджаў яе і адзяваў толькі з нагоды якіх-небудзь урачыстых выпадкаў. А на грудзях у яго, зусім не па статуце, проста па новенькай сіняй фуфайцы, пагойдваліся белыя і жоўтыя медалі.— На траўку струмент нясіце, на траўку.

Ён прыняў цераз борт самую вялікую, што асляпляла ўсіх нікелем, трубу і асцярожна панёс яе прад сабою, як гарачы самавар. Ціхан і аднарукі Сцяпан пацягнулі за расцяжкі барабан. За імі следам панеслі, бліжэй да абеліска, усе астатнія дудкі і трубы. Тут жа, на ржышчы, былі расkладзены радком яловыя вянкі з яркімі папяровымі кветкамі.

— На траве яно мякчэй,— паважна прыгаворваў дзед Васілій.— Струмент усё-такі. Рэч каштоўная...

Па ўсім было відаць, што, апрача аркестра, чакалі яшчэ кагосьці. Пад сціртаю ў зацішку сядзелі жанчыны. Каля іх гаманілі дзеці, паладзілі бегатню ў квачыкі вакол саломы. Тут і там праходжваліся напрыбіраныя ў святочнае хлопцы з дзяўчатамі. Пашка, а за ім і астатнія заводскія, нібыта непаўмысна, падышлі да мясцовых. Пасля цырымоніі поціску рук хлопцы адразу закурылі, і вось ужо Раман пад прыхільныя смешкі пачаў травіць свае байкі.

Некалькі мужчын, мабыць, старшыні калгасаў, усе ў кароткіх плашчах і капелюшах, адасоблена трымаліся каля светлай «Волгі». На загарэлых шыях бялелі неэластычныя каўнерыкі нейлонавых кашуль. Яны таксама пакурвалі без патрэбы і былі неяк скаваныя нязвыклай урачыстасцю сваёй адзежы і чакання будучага.

Франтавікі пастаялі каля складзеных труб, паразглядалі хітраспляценні бліскучых кален і клапанаў, пасля, як заўсёды пры сустрэчах, узяліся ўспамінаць, хто і дзе ваяваў, дакуль дайшоў, дзе застала перамога.

— У цябе, Фёдар, помніцца, быццам бы «Слава» была? — спытаўся дзядзька Саша.

Фёдар махнуў рукою, журботна:

— Ды не знайшоў. Кінуўся ў куфар — вось гэтыя ляжаць, а «Славы» няма. Нябось упук, дэманёнак, забаўляўся з ёю і кудысьці падзеў. Памятаю, прыставаў: дай панасіць, дай панасіць. Ну на, кажу, памерай, пабудзь у героях. А ён, бач, і запраторыў невядома куды.

— А то, чаго добрага, прамяняў сябрукам на якуюнебудзь свістульку,— смяяўся дзед Васілій бяззубым ротам.— Аніякага разумення няма, чым за гэта плацілася.

— Дык яны, медалі гэтыя, быццам бы без патрэбы былі,— сказаў незнаёмы дзядзьку Сашу мужчына ў літых гумовых ботах.— Перамогу і тую як след забыліся адзначаць. Сама падыходзіць для ордэнаў дзень. Шмат хто адвык, нібыта і сорамна выйсці «пры поўным парадзе». Гэта вось цяпер зноў надзяваць пачалі.

Старыя салдаты, сарамліва неяк, спакваля разглядалі адзін на адным баявыя ўзнагароды — у каго колькі і якія.

— Прышпіліць медалі — не штука,— сказаў Сцяпан Холадаў, зірнуўшы на новую фуфайку дзеда Васілія.— Ад іх на вопратцы ніякіх слядоў не застаецца. А калі, да прыкладу, Чырвоную Зорку, дык ад яе вунь якая дзірка! Пад май я купіў сабе новы касцюм, і адразу задача: надзяваць яе ай не? І надзець ахвота, і касцюм дзіравіць шкада.

— Яно калі б як раней: навінціў, ды і насі без здыму,— згадзіўся франтавік у гумовых ботах.

— Ну але, але,— кіўнуў Холадаў.— Не будзеш жа пасля кожнаму тлумачыць, што дзірка гэта не проста, а га初аровая.

Салдаты пасмяяліся з гэтага немудрагелістага жарту, і Холадаў спытаўся:

— Ты, Фёдар, за «Славу» колькі атрымліваў?

— Ужо і не памятаю... Рублёў трыццаць, здаецца. Яшчэ старымі.

— Атрымліваецца, траячка па-цяперашняму?

— Дык цяпер і зусім нічога не даюць,— заўважыў Ціхан Аляпін.

— Ведаю, што нічога. Гэта я так сабе, разважаю. А наогул дык трэба б зноў плаціць узнагародныя. Раз ужо пачалі насіць ордэны.

— Усім плаціць — ого, колькі трэба!

— Ды ўжо ж колькі? Усяго-то нейкі рубельчык за «Адвагу».

— Табе рубель ды другому рубель — мільён і набяжыць. Адной «Адвагі» і то ведаеш колькі?

— Ну, не скажы. Цяпер жа не надта густа засталося,— запярэчыў Холадаў.— Шмат яе, «Адвагі» гэтай, на чырвоных падушачках занеслі. Адных толькі маршалаў колькі праводзілі. У газетах гляджу: то адзін, то другі ў чорнай рамцы. А ўжо нашага брата непараўнальна большы ўкос. Дык вось лічы: тагачасным навабранцам і то ўжо будзе па пяцьдзесят...

— Так-то яно так. Кашчавая па чыны не глядзіць...

— Дык вынік які? А во які: казне цяпер лягчэй стала. Можна б і адшкадаваць які-небудзь мізар салдату, што яшчэ выжыў.

— Ну і тарбахват ты, Сцёпка! — сплюнуў Фёдар.— Дай узнагароду табе ды яшчэ «мізар які» за яе ў кішэню. Ды хіба мы наёмнікі якія, ці што? Не чужое абаранялі, а сваё, кроўнае. Да цябе, дапусцім, у хату зладзеі палезлі, а ты іх узяў дый набіў. А пасля маці сваёй кажаш: «Я зладзеяў прагнаў, геройства праявіў, давай, маці, траячку мне за гэта!» Не станеш жа ў сваёй маці патрабаваць? Не станеш! Таксама і гэта трэба разумець.

— Ну і падкінуў, ну і падкалоў ён цябе, Сцёпка! — засмяяліся франтавікі.— Нічога не скажаш!

— Ды я пра што? — таксама засмяяўся Холадаў.— Мне хіба грошы патрэбны, дзівак-чалавек! Траяк — якая пажыва? А калі раней іх плацілі, быццам бы драбяза, тытунёвыя грошы, а прыемна! Вось я пра што. Ідзеш, кніжачку паказваеш,— табе чаргу ўступаюць, глядзяць з павагаю.

— Табе і цяпер уступаюць, вунь рукаў пусты.

— Ды не дужа рассоўваюцца.

— Э-эх, мужычкі! — выгукнуў дзед Васілій.— Якую

гаворку завялі! Скажы дзякуй, што жывыя засталіся. Сам бы ад сябе асабіста плаціў бы!..

Да франтавікоў падышоў старшыня мясцовага калгаса Іван Кузьміч Селіванаў. Ён быў грузны, пакутаваў ад задышкі і таксама быў увешаны ордэнамі, што ляпіліся ўздоўж абодвух у пінжаку лацканаў. І нават на блакітнай стужцы гайдаўся нейкі іншаземны «леў», які з-за нястачы месца размясціўся ледзь не на самым жываце. Здавалася, што Селіванаў таму так цяжка дыхаў і адсопваўся, што непрывычна нагрузіў сябе адразу такім мноствам рэгалій.

— Прывітанне, гвардыя! — сіпата прабасіў ён і расплыўся ва ўсмешцы сваім добрым праставатым тварам, і таксама як і ўсе раней, мімаходзь, раўніва, прабег жывымі шэранькімі вачамі па чужых узнагародах.

Дзед Васілій хітравата прыжмурыўся:

— Увапрэў, аднак, Кузьміч! Жартачкі хіба: такі іканастас прывалок. Ніякіх грудзей не хопіць — наядай, не наядай.

У іншым месцы так і не пасмеў бы пасвавоаліць дзядок, а тут, у асяроддзі бывалых акопнікаў, дзейнічаў свой закон брацтва, які адхіляў усякія чыны, і колішні ездавы без усякага падкузьміў колішняга камандзіра палка, а цяпер — свайго старшыню. Ды і ўсе ведалі: Кузьміч — мужык свой, не чыноўны, з ім можна. Калі, канешне, дарэчы.

Іван Кузьміч таксама не застаўся ў даўгу перад дзедам Васіліем:

— А свае ты, напэўна, гусцей начысціў? Блішчаць, што ажно з таго канца поля відаць.

— Не-е, Кузьміч, не ўгадаў! — зарагатаў дзед Васілій.— Гэта не я. Гэта мне баба падраіла.

Франтавікі засмяяліся.

— Далібог, не хлушу. Я хацеў было так ісці, а яна: нядобра, кажа, з такімі нячышчанымі на народ.

— Ай ды малайчына баба! — весела пахваліў Іван Кузьміч.— Во каму ордэны насіць — жанчынам нашым!

— Гэта точна! Калі па справядлівасці, дык у самы раз напалам падзяліць. Адну палову нам, а другую ім. Нам за тое, што ваявалі, а ім за тое, што тылавалі. А гэта ніколечкі не саладзей за вайну.

— Значыць, гэта старая табе так наблісціла?

— Яна, яна! Дый як не наблісціць? — развёў рукамі дзед Васілій.— Ну, каторыя там медныя,— ладна. А то ж, бач на іх, з срэбра ёсць, а вось, скажы ты, таксама псуюц-

ца, цямнеюць. Я іх і ў сухое месца хаваў, на камінак,— усё адно гаснуць. Няма таго бляску, як было.

— Час, бацька, час працуе,— сказаў Іван Кузьміч.

— Што там медалі! Мы і самі, паглядзі, якія цьмяныя сталі, патраціліся,— заўважыў Фёдар.— Ва ўсіх вунь сівізна з-пад шапак.

— А ў мяне дык і саўсім волас упаў,— дзед Васілій сцягнуў фуражку і засмяяўся.— Во, як каленца! А ў Будапешт гэтакім малайцом уступаў.

— Ну ты, Васілій Міхайлавіч, і цяпер яшчэ герой.— Іван Кузьміч патрэс старога за плячо.

— А я і не наракаю! — з гатоўнасцю кінуў дзед Васілій.— Кукарэкаю памаленьку. А то вунь некаторых і зусім ужо няма.

— Ох, і праўда, мужыкі, бяжыць час! — Ціхан Аляпін прыкра перасунуў на сівай галаве пуцейскую фуражку з молаткамі.— Збяромся калі вось так, салдаты, глядзіш, таго няма, гэты не прыйшоў... Зусім мала нас застаецца...

— А што ж ты хацеў,— сказаў Фёдар.— Ты думаў, уцалеў, дык вайна цябе і мінула? Не-е! Сядзіць яна ва ўсіх у нас. Грызе, падточвае. Каго раны даконваюць, каго прастудныя хваробы, а хто на жывот пакутуе. Дарма не прайшлі гэтыя чатыры гады.

Дзядзька Саша дастаў дзюралевы партсігар і адчыніў яго перад сабою на далоні. Усе моўчкі пацягнуліся па цыгарэты.

Нарэшце падкаціў райвыканкомаўскі «газік» і спыніўся каля белай «Волгі». Прытрымліваючы капялюш, з машыны выйшаў сам Засекін. Ён таксама быў у свежай кашулі з гальштукам, але ў юхтовых ботах, густа запырсканых гразёю. Мабыць, па дарозе заязджаў яшчэ кудысьці. Услед за ім выбраўся райваенкому крыху і прыпазніўся. Услед за ім выбраўся райваенкам, пажылы хударлявы капітан з плашч-палаткаю, прытарочанай на раменьчыках. Трэці быў інструктар ДТСААФа Бадэйка. Засекін наспешна паціснуў рукі тым, хто стаяў каля белай «Волгі» і, клапатліва зірнуўшы на гадзіннік, адразу ж накіраваўся да абеліска, збіраючы за сабою, нібыта нябачным брадніком, хутка пагусцелы натоўп. Зухаваты інструктар з дагледжанымі траякураўскімі бакамі, з фотаапаратам цераз плячо, забягаючы наперад, гучна абвяшчаў:

— Таварышы, таварышы! Давайце падыходзьце блі-

жэй! Давайце, давайце! Жанчыны, што каля сцірты, вас таксама гэта датычыць!

Пакуль вакол абеліска збіраліся людзі, тоўпіліся шчыльным колам, дзядзька Саша падышоў да хлопцаў, якія паспелі ўжо разабраць інструменты. Ён і сам дастаў з кішэні сваю маленькую трубачку, падобную на піянерскі ражок, зняў з яе чахол і паводле звычкі слабенька, бязгучна падзьмуў у муштук і праверыў клапаны. Музыкі паглядалі на неба, пераміналіся, прытанцоўвалі ў сваіх лёгкіх модных плашчах. І сапраўды, было халаднавата. Аднекуль набеглі нізкія шэрыя хмары. Яны накрылі сонца, і стала ветрана, няўтульна на адкрытым і голым узгорку.

— Значыць, так...— дзядзя Саша агледзеў строй аркестрантаў.— Як толькі здымуць брызент — адразу Гімн. Прашу нікуды не адыходзіць.

— Ды не хвалюйся, шэф.— Пашка разглядваў сябе ў бліскучую талерку, як у люстэрка.— Злабаем, што трэба!

— Вы мне кіньце гэтае «злабаем»! — дзядзя Саша насупіўся.— Ты, Павел, талеркамі не надта звякай. Толькі цябе і чуеш.

— А што? Я ўсё з розумам. І ў нотах паказана: фортэ.

— Фортэ, фортэ... Слухаць трэба. Мелодыю трэба адчуваць. І ўвесь аркестр. А ты лупіш, як вартаўнік у рэйку.

Пашка пакрыўдзіўся:

— Дарэмна прыдзіраешся, старшой.

Тым часам народ вакол прыціх: зачакаўся, і ваенком выйшаў да падножжа помніка, каб пачаць мітынг. У раённым ваенкамаце ён служыў ужо даўно, і ведалі яго многія, асабліва франтавікі. З рассечанай асколкам ніжняй сківаю, якая зраслася не зусім добра, скрывіўшы яму рот,— ён выглядаў панура, але быў ціхі, непатрабавальны чалавек. Яшчэ ў самым пачатку вайны, у час эвакуацыі Шапятоўскага ўмацаванага раёна, ён страціў сям'ю — жонку і дзвюх дзяўчынак і з таго часу жыў бабылём са старэнькаю маці, і на яго вокнах заўсёды можна было бачыць клеткі з чыжамі і шэранькімі чачоткамі.

— Сябры мае! — загаварыў ён, схіліўшы галаву, і па сваёй звычцы пачаў пагладжваць, засціць далоняю пачварны шрам.— Мацяркі і бацькі... браты і сёстры... дзеці і ўнукі! Усе мы сабраліся тут, каб ушанаваць памяць тых... хто аддаў свае жыцці...

Магчыма, пад гулкімі скляпеннямі залы голас прамоўцы, узмоцнены мікрафонамі, і гучаў бы як след. Але тут, сярод пустыннага поля, пад неабсяжным восеньскім не-

бам, словы яго здаліся далёкімі і бяссільнымі. Натоўп варушыўся, яшчэ больш ушчыльняўся, а дзятва прашмыгвала між нагамі дарослых, каб прабрацца ў пярэднія рады, дзе лепш чуваць. А Пашка ўсё гудзеў пакрыўджана:

— Вечна на мяне бочку коціць. Вунь Курачкін прачытаць ноты правільна не можа, дык яму, бач, нічога...

— Памаўчы, калі ласка! — павярнуўся незадаволены дзядзька Саша: ён намагаўся засяродзіцца, каб улавіць прамову ваенкома.

Наляцеў вецер і стаў лапатаць рогам брызенту па абеліску, і часам гэты лопат заглушаў прамову, і тады толькі абрыўкі фраз даляталі да дзядзькі Сашы:

— ...дажджы змылі з гэтых вышыняў кроў тых, хто загінуў на іх, вы сваімі рукамі пазараўноўвалі ямы і акопы, засеялі палі збажынаю, і мірнае сонца свеціць цяпер над вамі... Але нічым немагчыма змыць наш смутак, зараўнаваць нашы душэўныя раны, прытупіць нашу памяць...

Ваенком забыўся і зняў руку з падбародка, нават узмахнуў ёю, рассякаючы паветра, і ўсе ўбачылі, як нервова напнулася нейкая жыла пад яго шчакою, як пацягнула яна ўвесь правы бок твару ўніз.

— Вось вазьму і пайду! — Пашка сапраўды адышоў убок.

— Павел,— гнеўна прашаптаў дзядзька Саша,— стань у строй.

Пашка маўчаў і ўпарта глядзеў на свае новыя чаравікі. Нехта павярнуўся ў іх бок.

— Стань, кажу! — таксама шэптам паўтарыў старшой.

Хлопец кісла паглядзеў у поле і неахвотна падпарадкаваўся. І тут, перабіваючы ваенкома, узвысіў свой абурany голас інструктар Бадэйка:

— У задніх радах! Перастаньце балбатаць, далібог. Людзей трэба паважаць, нарэшце.

Хутка ваенком закончыў сваё выступленне і адышоў убок. Бадэйка пашаптаўся з Засекіным і ўзяўся раскручваць вяроўку, якая сваімі віткамі падтрымлівала пакрывала. Вызвалены ад вяровак брызент яшчэ гучней залапатаў, пасля пухіром узняўся ўгору. Бадэйка прытрымліваў яго няспрытна, бездапаможна. Некалькі чалавек падбеглі дапамагчы. І калі брызент уціхамірылі і сцягнулі, перад усімі ўзнік шэры цэментны конус, месцамі яшчэ не прасохлы, са слупком прозвішчаў на металічнай жоўтай таблічцы:

Агапаў Д. М., радавы
Анікін С. К., радавы
Барвянкоў В. В., мал. сяржант
Вяткін К. Д., радавы
Гаркуша І. С., радавы
Захар'ян А. Ш., сяржант
Іваноў І. П., сяржант
Махаў А. Я., старшына

Гэта былі імёны людзей, нікому тут не вядомых і ўжо даўно не жывых. Яны зазірнулі ў сённяшні свет цераз шмат гадоў у выглядзе знакаў алфавіта [1].

Макракоў Т. С., радавы
Мурзабекаў Б., радавы
Нечытайла Х. І., радавы
Нагаткоў С. С., мал. лейтэнант
Нурыеў А., радавы
Абрэзкаў П. С., радавы
Парфёнаў А. М., мал. сяржант

Дзядзька Саша надумаў, што ў гэтым спісе яго месца было б адразу за Парфёнавым, таму што прозвішча яго таксама на «п» — Паласухін. Ляжаў бы ён, канешне, не побач з гэтым самым Парфёнавым А. М., а можа, зверху яго, можа,— над ім. Гэта ўжо як паклалі б. Там жа клалі не паводле алфавіта...

Яму ўжо махалі рукою, рабілі знакі, каб аркестр пачынаў, і дзядзька Саша, спахапіўшыся, паспешліва паклаў пальцы на клапаны трубы.

— Тры-чатыры! І-і...— ён увабраў у сябе паветра і кіўнуў хлопцам ужо з прыслоненай да вуснаў трубою.

Медзь дружна рванула: «Саюз непарушны рэспублік свабодных...» Ён не пачуў свайго карнета, а толькі адчуў пальцамі напружанае дрыжанне інструмента. Сотні разоў на сваім вяку іграў ён Гімн з таго самага часу, як упершыню развучыў яго на фронце. Але калі зноў і зноў браўся ён за трубу, яго прыймалі нейкія дрыжыкі. Ён узняў пагляд на хлопцаў, ужо адчужана-стрыманых, сур'ёзных, і ўсхвалявана прыкрыў вочы.

Засекін першы зняў капялюш і схіліў галаву. Услед за ім то тут, то там замільгацелі рукі, сцягваючы шапкі. Жанчыны з прыліплымі да ног хлапчукамі таксама знялі з іх

[1] Тут і далей пры пераліку прозвішчаў захоўваецца рускі алфавіт. *(Заўвага перакладчыка.)*

кепачкі і ў журботнай панурасці перабіралі на голых галоўках хлапчуковыя валасы. І толькі ваенком не зняў сваёй фуражкі, а, прыклаўшы руку да малінавага аколышка, стаяў навыцяжку, напружана мігаў, і пальцы ўздрыгвалі каля яго сівай скроні.

«...Мы ў бітвах рашалі лёс пакаленняў...» — мысленна вымаўляў словы тэксту дзядзька Саша і прыслухоўваўся, як гладка і своечасова адсякалі рытм звонкія ўсплёскі Пашкавых талерак. «Малайчына! Вось жа і ўмее, калі захоча».

Перабіраючы клапаны, дзядзька Саша слухаў аркестр і ўспамінаў, як летам сорак чацвёртага пад Быхавам ён упершыню развучваў Гімн. Маладых афіцэраў выклікалі спецыяльна ў штаб дывізіі, дзе пад баян знаёмілі з напевам, каб пасля яны навучылі сваіх салдатаў. Музыка выдалася таксама вельмі цяжкая, і, вяртаючыся са спеўкі, камандзіры, каб не забыць мелодыю, каб данесці яе да акопаў, усю дарогу напаўголаса напявалі яе. Напэўна, дзіўна было ў прыфрантавой паласе бачыць афіцэраў, якія рознагалоса і нястройна мармыталі. Многія, пакуль ішлі, непрыкметна для сябе перабдыталі ніць напеву, перайначылі на свой лад, і таму ў акопах салдаты спярша выконвалі Гімн уразнабой — адзін узвод так, другі — гэтак. Але затое словы ведалі ўсе назубок.

Дзядзька Саша даў адмашку, і музыка змоўкла. Увогуле, мелодыю прайгралі ніштавата, і нават навічок Курачкін прабасіў упэўнена, без збояў.

— Дзякуй, хлопцы,— падзякаваў старшой, выціраючы муштук сацінавым чахлом.— Малайцы!

— Ну вось, а ты ўсё бурчаў,— кінуў Пашка.

Да помніка скрозь натоўп, пара за параю ўжо ішлі піянеры ў белых пілотачках, неслі вянкі ў чорна-чырвоных стужках. Шэсце ўзначальвала маладзенькая важатая з высокім начосам каштанавых, напэўна, падфарбаваных, валасоў, і таксама ў чырвоным гальштуку.

Дзяўчына ступала ўрачыста, ні на кога не глядзела, малады твар яе палаў і таксама быў урачысты, нават строгі.

Падножжа з усіх бакоў абклалі вянкамі. Двое школьнікаў — хлопчык і дзяўчынка — замерлі справа і злева з падпятай у салюце рукою. Астатнія адышлі і выстраіліся радамі, выразна падкрэсленымі белымі шапачкамі.

Мітынг пачаўся.

Спачатку прамову трымаў старшыня тутэйшага калга-

са Асінкін, на чыёй зямлі быў пастаўлены гэты помнік. Невысокі энергічны здаравяк, на якім, як на маладым качане з марозу, усё парыпвала і пахруствала — і навенькі сінтэтычны плашчык з поясам, і моцныя, на высокіх абцасах чаравікі,— ён жвава падышоў на змену ваенкому каля п'едэстала, зняў вузкі тырольскі капялюш і абвёў усіх жывымі цыганскімі вачыма. Яго калгас славіўся сваім вакальна-танцавальным ансамблем, аздобаю якога лічыўся славуты «Цімоня». Ён быў інструментаваны старадаўнімі ражкамі, сапёлкамі, куглікамі і кожны год браў першыя прэміі на абласных аглядах. Гэты ансамбль, усе ведалі, з'яўляўся Асінкінавым захапленнем. Ды і сам старшыня рады пры нагодзе і паспяваць і станцаваць. Асінкін лічыўся душою розных злётаў і раённых мерапрыемстваў пад адкрытым небам, накшталт Дня трактарыста альбо свята Ураджаю, і нязменна выбіраўся ва ўсякія журы. Але пры ўсім пры гэтым гаспадарку вёў руплiва, нават скупавата, не любіў рызыкаваць, траціць капейку «на вецер», і перш чым завесці якую-небудзь новую машыну, скажам, дажджавальную ўстаноўку альбо суперзернесушылку, спярша паглядзіць у суседа, вартая яна таго ці не вартая. Гаварыў ён заўсёды без усякіх паперак, па памяці называў шматзначныя лічбы разараных пад зябліва гектараў, надоеных цэнтнераў малака, здадзеных яец, нарыхтаванага сіласу, унесеных угнаенняў, называў сумы прыбыткаў і затрат, капіталаўкладанняў, непадзельных фондаў. Словам, любіў лічбу і ўмеў яе падаць, а таму і слухалі яго заўсёды з ажыўленай увагаю.

Тут, на адкрыцці помніка, Асінкіна таксама слухалі з цікавасцю. Ён расказваў, як было разгорнута спаборніцтва на ўборцы ўраджаю за асабістае права пакласці першую цагліну ў падмурак абеліска і што ў выніку іх калгас здаў ужо больш паловы цукровых буракоў і, нягледзячы на аддаленасць ад прыёмнага пункта, заняў па вывазцы трэцяе ганаровае месца ў раённай зводцы.

А дзядзька Саша ўсё глядзеў на цэментны конус. Ён шукаў на таблічцы месца, на якім яго перапынілі.

Праведнікаў Г. А., радавы
Праскурын С. М., радавы
Пыжоў А. С., лейтэнант
Рагачоў М. В., мал. сяржант
Радзіёнаў Н. І., радавы

Як і ўсе астатнія тут, дзядзька Саша таксама не ведаў

нікога з гэтага спіса, але імёны няўхільна прыцягвалі да сябе.

— ...вынікі падводзіць нам яшчэ рана,— гаварыў Асінкін,— але тое, што мы зрабілі, гэта ўжо важка. Гэта, таварышы, ні многа, ні мала, а трыццаць шэсць цэнтнераў сыравіны для нашай цукровай прамысловасці, альбо, калі ўлічыць, што з аднаго цэнтнера буракоў можна атрымаць пуд цукру, дык — мільён дзвесце пачкаў рафінаду, можна сказаць, паклалі ўжо на прылаўкі нашых магазінаў. А каб вам гэта паказаць нагляднеи, дык уявіце сабе, што гэта атрымаецца па пачку цукру на кожнага жыхара такіх гарадоў-гігантаў, як Харкаў ці Новасібірск.

Раманаў Ф. С., мал. сяржант,—

ціхенька чытаў дзядзька Саша,—

Салямаў М., радавы
Санько А. Д., радавы

— ...Вось зараз скончым свае справы ў полі,— натхнёна казаў Асінкін,— падчысцім там сёе-тое і вернемся канчаць новы клуб. Грошай мы на гэта не пашкадуем: трэба мільён — адпусцім мільён, спатрэбіцца паўтара — дамо паўтара. А як жа інакш? Добра папрацавалі — будзем культурна адпачываць, правільна, дзяўчаты? А адпачываць у нас таксама ўмеюць. Вось быў наш ансамбль на ВДНГ — калі ласка, яшчэ адзін дыплом прывезлі.

Прамаўляючы, Асінкін час ад часу касіў карыя вочы ў бок Засекіна, які прывык на актывах і нарадах кідаць позіркі ў прэзідыум.

Сырамятнікаў В. С., радавы
Ціхаміраў П. К., радавы
Тугарынаў М. З., радавы

Учытваючыся ў гэтыя прозвішчы, дзядзька Саша неяк і не заўважыў, калі Асінкіна змяніла піянерважатая. Прытрымліваючы канцы адпрасаванага гальштука, якія вецер сюд-туд закідваў ёй на плячо, яна пачала звонка і выразна рапартаваць пра поспехі школьных следапытаў. Старшой слухаў гэтую чысценькую кемлівую дзяўчынку, а перад ім узнікла раптам у памяці карціна, якую бачыў ён усё там жа, пад Быхавам.

...Зімою яны змянілі пяхотную часць на плацдарме па той бок Дняпра. Яна была моцна парадзелая, выматана шквальным агнём. Непрыкметна яе адвялі назад за раку.

І дзядзька Саша, які ў той час камандаваў ротаю, убачыў у бінокль перад запятымі пазіцыямі забітага байца. Ён ніцма вісеў на калючым нямецкім дроце, з паніклай пасінелай стрыжанай галавою. З рукавоў шыпяля тырчалі голыя ледзь не да локцяў, ссохлыя рукі. Здавалася, гэтымі выцягнутымі рукамі ён прасіў зямлю прыняць яго, беспрытульнага, схаваць ад куляў і асколкаў, што ўсё ўпіваліся ў яго цела, крамсалі яго. Але дрот, відаць, моцна ўчапіўся ў салдата і не пускаў да зямлі. За зіму на ім нарос горб снегу, недарэчны, пачварны. Гэта, мабыць, быў наш сапёр альбо, магчыма, разведчык. Ён, лейтэнант Саша Паласухін, двойчы начамі пасылаў сваіх людзей зняць забітага. Але труп быў прыстрэляны немцамі, і толькі дарэмна страцілі яшчэ двух чалавек. Больш па таго забітага ён ужо не пасылаў. Так салдат правісеў да самай вясны, і ўсім было балюча і сорамна глядзець у той бок. А ў красавіку труп адтаў, пазваночнік не вытрымаў, пераламаўся, і забіты абвіс на дроце, склаўшыся ў дзве столкі... Толькі ў чэрвені была прарвана варожая абарона. Ён, Паласухін, павёў роту цераз праробленыя праходы ў драцяной загародзе, і раптам яго ўсяго аж скалапула: ён убачыў, што ў шынялі, які вісеў, каўнер быў пусты і вецер гайдаў пустыя рукавы...

Узлякоў С. Н., радавы
Умеранкоў К. Г., радавы
Федунец М. С., старшына

Хто ж быў той, на дроце? У яго ж таксама былі прозвішча, імя і імя па бацьку...

І дзядзька Саша падумаў: як па-рознаму можа скласціся салдацкі лёс. Нават калі ён загінуў смерцю храбрых. Гэта яшчэ добра, калі яго своечасова падабралі з поля бою, калі апазналі пры гэтым і калі ротны, складаючы спісы забітых, у спешцы не пераблытаў, не прапусціў яго прозвішча. Гэта добра, калі дапясенне трапіла ў патрэбны штаб і калі той штаб не акружылі потым, не спалілі, не разбамбілі з паветра разам з пісарскімі скрынямі і сейфамі. Калі... Ды ці мала гэтых «калі» па шляху салдацкага імя да такой вось таблічкі па брацкім абеліску! А яшчэ па тым шляху і балоты, і чорная твань, рэкі і рачулкі, залівы і пралівы, абваленыя бліндажы, абвалы дамоў, згарэлыя танкі і эшалоны і шмат чаго іншага... А яшчэ — прамое пападанне, калі па тым месцы, дзе салдат толькі што бег з аўтаматам, праз імгненне ўжо чорна і смуродна дыміцца

яма і камякі выкінутае зямлі, падаючы, мяшаюцца з камялкамі вопраткі, якая нават не паспела закрывавіцца...

Фамічоў В. А., мал. сяржант
Ходаў С. М., сяржант
Цуканаў А. Ф., мал. сяржант

У гэты час піянерважатая выкрыкнула:

— Ніхто не забыты, нішто не забыта!

Яна вымавіла апошнюю фразу асабліва звонка, і задаволеная, што нідзе ні разу не запнулася, палаючы шчаслівым тварам, на пальчыках перабегла ад абеліска да школьнікаў, што непадалёк стаялі ў страі.

Выступіла і яшчэ некалькі чалавек: загадчыца мясцовага клуба — пажылая ўжо жанчына, але яшчэ рухавая, у штучнай дасе пад леапарда і з вельмі моцным пахам духоў; нядаўна дэмабілізаваны хлопец, які з такое нагоды надзеў зусім яшчэ новенькі мундзір з яркаю нашыўкаю на рукаве і, паводле нядаўняй армейскай звычкі, выцягнуў рукі па швах і адчаканіў аб пераемнасці баявых традыцый; пасля яго на той пятачок выйшаў, абапіраючыся на самаробную мыліцу, згорблены настаўнік гісторыі з бліжняй вёскі. Пачаў ён з Аляксандра Неўскага, з Лядовага пабоішча, перайшоў да Куліковага поля і тут хацеў з выпадку прадэкламаваць верш і ўжо прачытаў было першыя тры радкі:

Уткнуўшы дзіду, ён скінуў шлем і лёг.
Курган быў цвёрды, выбіты. Кальчуга
Калола грудзі, а спіну поўдзень пёк...—

але нечакана збіўся і змоўк. Старэнькі пакутліва паціраў пальцамі васковую скроню, намагаўся ўспомніць, усё паўтараў апошнія словы: «а спіну поўдзень пёк...», «а спіну поўдзень пёк...», аднак так і не ўспомніўшы прадаўжэння, збянтэжана махнуў рукою і, разгублена ўсміхаючыся, са словамі: «прабачце, прабачце», — адступіў у натоўп.

Выйшла і яшчэ жанчына, відаць, з калгасніц — у зімовай суконнай хустцы, з абветраным тварам. За ёю пабег было хлопчык гадоў шасці, але на яго зацыкалі, і пацягнулася адразу некалькі рук: «Няможна, няможна туды! Ты што ж гэта?» Аднак хлапчук выслізнуў, прашмыгнуў-такі да помніка і стаў побач з жанчынаю, упарта насупіўшыся.

— Нічога, няхай пастаіць,— стрымана ўсміхнуўся Засекін.— Бачыш ты, які герой!

Жанчына і не заўважыла малога і яшчэ не вымавіла ні

слова, а адразу, як толькі апынулася каля помніка, уся пабялела і толькі пасля выгукнула высокім запальчывым голасам:

— Я вам так скажу, таварышы: маіх палегла двое. А я хоць і жывая, а таксама параненая на ўсю жысць...

І раптам засланіла твар рукамі, грубымі пягпуткімі пальцамі, якія бываюць ад буракоў і стылай восеньскай зямлі.

Пастаяўшы так у здушанай немаце перад прыціхлым народам, яна, нарэшце, адняла рукі, люта агледзела людскі натоўп, шукаючы ў сабе ўсярэдзіне тыя словы, якімі хацела выказаць свой даўні боль, і, не знайшоўшы такіх слоў, раптам падхапіла хлопчыка, падняла пад пахі і, павярнуўшы яго да абеліска, выкрыкнула ледзь не ў плачы:

— Глядзі, Віцька! І запомні! Вось яна якая, вайна.

Хлопчык, нічога не разумеючы, прыціх, напалохана глядзеў на гранёнае вастрыё абеліска.

Ад імя франтавікоў узяўся сказаць некалькі слоў Іван Кузьміч Селіванаў.

— Ну што тут можна дабавіць? — цяжка, задышліва пачаў ён, уздымаючы грудзьмі ўвесь цяжар сваіх ордэнаў.— Ну вось пастаўлены яшчэ адзін помнік таварышам па зброі. Гэта добра, гэта патрэбна. Цяпер усе разам будзем ахоўваць яго, клапаціцца, каб час не сцёр іх імёнаў. Ну, канешне, помнік не вельмі ўжо адмысловы, так сабе. Рабілі яго нашы мясцовыя майстры. Слоў няма, Асінкін мог бы запрасіць лепшых спецыялістаў, паставіць і вышэй, і капітальней, скажам, з мармуру альбо з граніту: грошай у яго на гэта хапіла б — у мільянерах жа ходзіць.

Асінкін, што стаяў непадалёку, нецярпліва пераступіў з нагі на нагу, парыпеў рыпучымі чаравікамі.

— ...А ён жа як прыкінуў? Магіла гэтая не ў людным месцы, у баку ад турысцкіх дарог, паломніцтва не будзе, можна і сціпла.

— Кінь, кінь, Кузьміч! — не стрымаўся Асінкін.— Помнік тыпавы, не горшы, чым у іншых. Мы ў Тарасаўцы глядзелі: там таксама такі, наш нават вышэйшы.

— Справа, урэшце, не ў мармуры, не ў вышыні помніка,— казаў далей Селіванаў,— а ў нашай памяці. У нашым разуменні таго, якой цаною заплачана за перамогу над самым лютым з ворагаў, якія калі-небудзь нападалі на рускую зямлю.— Селіванаў перавёў дыханне.— Мой полк прайшоў ад Варонежа да Белграда. Былі моманты, калі ў палку заставалася толькі трыста з нечым чалавек, і то ра-

зам з паранепымі. А калі мы ў канцы вайны разам з начальнікам штаба падлічылі, колькі прайшло праз наш полк людзей, дык самі сабе не паверылі. Дваццаць дзве тысячы! Дваццаць дзве! Вы папытаеце, куды яны дзеліся? А вось яны! — Іван Кузьміч паказаў на абеліск.— Тут! Праўда, многія засталіся ззаду палка па шпіталях і лазарэтах. Але многія вось так — у чыстым полі. Полк ішоў на захад, а за намі — ад вёскі да вёскі, ад горада да горада ланцужком цягнуліся магілы — шлях да нашай перамогі. За гэты час я сам вось гэтымі рукамі падпісаў і адправіў многія тысячы пахавальных паведамленняў. І дзесьці, ва ўсіх куточках нашай зямлі, атрымлівалі іх і нячутна для нас захлыналіся горам тысячы аўдавелых жанчын і асірацелых дзяцей... Полк мой не праходзіў па гэтых мясцінах, але тут ішоў нечы іншы полк, іншая дывізія. І шлях яе быў такі самы!

У натоўпе нехта выкрыкнуў, а Іван Кузьміч, пастаяўшы ў роздуме, зноў падняў галаву:

— Канчаю, таварышы... Я не буду вас заклікаць прыкладна працаваць на гэтай зямлі. Вы пра гэта і самі ведаеце. Я толькі хачу, каб вы, мужчыны і жанчыны, былыя салдаты і салдацкія жонкі, удзельнікі і відавочцы, пакуль яшчэ жывыя, пакуль гэта не стала яшчэ набыткам адных толькі гістарычных кніг і архіварыусаў, перадалі сваім дзецям і ўнукам свяшчэнную памяць пра тых, хто загінуў, перадалі з рук у рукі, ад сэрца да сэрца. Вось гэта я хацеў сказаць.

Яму дружна напляскалі.

Больш ахвотнікаў выступаць не знайшлося, хоць былыя франтавікі падбадзёрвалі адзін аднаго: дзед Васілій — Фёдара Бабкіна, а той падштурхоўваў у спіну Ціхана Аляніна, які сарамліва ўпіраўся і пасылаў Фёдара:

— Які з мяне гаварыльшчык. Ты граматнейшы за мяне. Ды і што казаць? Вунь Кузьміч усё сказаў.

Так яны спрачаліся ціхенька, а тым часам слова было дадзена самому Засекіну.

Засекін выйшаў у кола і зірнуў на гадзіннік...

Сёння дзядзька Саша чуў у заўкоме, што на завод павінны былі прыехаць чэшскія спецыялісты. Іх чакалі пад вечар, але з раніцы ўжо дзяўчаты драілі сталоўку, і было чуваць, як у заводскай гасцініцы гудзелі пыласосы. Летам, у той час падрыхтоўчага рамонту, чэхі ўстанаўлівалі ў цэху свае новыя дыфузійныя апараты павышанай магутнасці і цяпер, калі завод пачаў сезон, павінны былі

прыехаць зноў, каб праверыць абсталяванне пад поўнай пагрузкаю. Засекіну трэба было іх сустракаць, аднак мітынг зацягваўся, дый пачалі яго позней, чым намячалася, і старшыня райвыканкома, відаць, хваляваўся.

Наконт чэхаў дзядзька Саша толькі меркаваў, а магчыма, у Засекіна маглі быць іншыя тэрміновыя справы: усё-такі на яго плячах цэлы раён, ды яшчэ ў такі напружаны час, калі то тут, то там ламаўся графік уборкі цукровых буракоў.

Гаварыў ён, аднак, без прыкметнай паспешлівасці, грунтоўна і талкова, характарызаваў міжнароднае становішча, расказваў пра дасягненні раёна і яго цяперашнія задачы, называў перадавікоў. Слухалі і глядзелі на яго з асаблівай цікавасцю, таму што многія бачылі Засекіна вось так блізка ўпершыню.

Але тут, у самы разгар яго выступлення, атрымалася непрадбачаная замінка. П'янаваты мужычок, раскудлачаны ветрам, у расшпіленай да пупа кашулі, уцякаючы ззаду людскога натоўпу ад некага, зачапіўся аб басовую трубу, што ляжала на ржышчы, шлёпнуўся на зямлю і плаксіва заенчыў:

— Ты дамоў мяне не гані! Няма чаго мяне гнаць. Я таксама ваяваў. Я, можа, цверазейшы за цябе!..

Засекін спыніў прамову, на мужычка засыкалі. Хлопцы-аркестранты падхапілі яго пад рукі і без цырымоній, волакам, пацягнулі па раллі да грузавіка. А той, заграбаючы нагамі зямлю, усё віскліва крычаў:

— З якога такога права? Я таксама ваяваў!

— Но, но! Раскудахтаўся! — весела пакрыкваў на мужыка Пашка, карыстаючыся выпадкам размяцца, заняцца хоць якім-небудзь дзеяннем.— Будзеш выёгвацца — мухаю на пятнаццаць сутак падстрыгу. Жора, давай нажніцы!

— А чаво ана, зануда... Указчыца. Сёння наш дзень. Хачу — гуляю!

Жанчына з хусткаю, што ўпала з яе галавы на плечы, напура ішла следам да грузавіка, па дарозе падняла на раллі мужчынскі чаравік.

Засекін маўчаў, стрымана кашляў — чакаў.

— Гэта твой артыст? — спытаўся ён нарэшце ў Асіпкіна.

— Ды тут адзін... У прымах жыве.

— Навошта такога прывезлі?

— Ды хто ж мог ведаць? Пакуль везлі, быццам бы ні-

чога быў, непрыкметна. Гэта ён ужо тут, напэўна, з якім-небудзь... Прыеду — мы з ім разбяромся. Во шэльма!

— Кепска атрымліваецца, таварыш Асінкін.

Хлопцы дружна паднялі і кулем перавалілі шумлівага мужыка ў кузаў цераз борт, і жанчына закінула туды чарвік. Гэта падзея ажывіла публіку, натоўп заварушыўся, загудзеў, мужчыны закурылі. А з кузава хвацка неслася:

И всё отдал бы за ласки взор-а.
Лишь ты владела б мной одна-а...

— Перабраў, перабраў Нікіціч! — паблажліва дакаралі ў натоўпе мужыка.— Вунь жа і пячнік добры, а — з такім недахопам.

Засекін пасля гэтага гаварыў нядоўга, і хутка мітынг абвясцілі закрытым. Аркестр зноў прайграў Гімн. Але і калі змоўклі трубы, натоўп усё яшчэ стаяў вакол абеліска, і мужчыны не надзявалі шапак.

— Усё, таварышы, усё! — ускінуў рукі Бадэйка.— Дзякуй за ўвагу.

Людзі, нібыта і не разумелі, што ўжо ўсё скончылася, разыходзіліся неахвотна — азіраліся, аглядваліся, быццам чакалі яшчэ чагосьці.

Засекін, бегла развітаўшыся, на хаду напомніў:

— Дык заўтра сесія, таварышы! І — ніякіх спазненяў! — і накіраваўся са сваімі спадарожнікамі да «газіка», які сустрэў іх буркатаннем матора, і адразу ж паехаў. Хутка разышліся па машынах і старшыні.

— Васілій Міхайлавіч! — аклікнуў са сваёй «Волгі» Селіванаў.— Садзіся, падкіну.

— Ды вось не ведаю...— разгубіўся дзед Васілій.— Тут хлопцы маракуюць таго... Я, бадай, яшчэ пабуду крыху... Дык і ты, Кузьміч, давай да нашага салаша.

— Дзякуй, браткі! Мне гэтага цяпер — ні-ні!..— Іван Кузьміч паклаў руку на ордэны.— Барахліць нешта...

— Ну, калі так, дак канечне...

Іван Кузьміч, пасадзіўшы поўную машыну спадарожнай дзятвы, таксама паехаў, і было відаць, як скасабочылася на адзін бок перагружаная старэнькая калымага.

Поле паступова пусцела. Хутка памчала машына з вясёлымі піянерамі. Уніз па адхоне пакаціліся матацыклы, веласіпеды. Няспешна пабрылі і пешыя, тыя, каму ісці было недалёка, да бліжэйшых вёсак, што адсюль, з узгорка, відпеліся як на далоні.

— «Всё отдал бы за ласки взора-а...» — не пераставаў выкрыкваць мужычок. Ён пры тым то высоўваўся з-за борта, то зноў асядаў на дно кузава.— «И ты б... и ты б...»

Падышоў Фёдар Бабкін, узяў дзядзьку Сашу пад локаць:

— Аб чым, салдат, задумаўся? Хадзем, пасядзіш з намі.

Пад сціртаю ўжо ўладкаваліся Сцяпан Холадаў, Ціхан Аляпін, дзед Васілій і яшчэ некалькі чалавек.

— Во, яшчэ адзін аролік! — ажывіўся дзед Васілій.— Садзіся-прысаджвайся. Якую ні ёсць, а памінку справім. Паводле даўняй нашай звычкі.

Франтавікі ахвотна рассунуліся, вызваляючы дзядзьку Сашу месца ў коле на саломе. Аднекуль аб'явілася чарка, налітая дапаўна, у дзядзькаву Сашаву руку ўшчамілі памідор.

— Давай, таварыш лейтэнант,— кіўнуў дзед Васілій.— А то пагаварыць пагаварылі, а добрыя словы не замацавалі. Яны і адляцяць дымам, словы тыя.

Старшой на гэты раз не адмаўляўся і, падняўшы чарку, зірнуў на абеліск.

— Ну, прабачце, браткі! Няхай будзе вам пухам...

— Вечная памяць... Вечная памяць,— нястройна і спехам загаварылі і астатнія, зноў зняўшы шапкі.— Вечная вам памяць.

Дзядзька Саша маўкліва выпіў у акружэнні старых салдатаў, што схілілі свае сівыя журботныя галовы.

Нечакана з'явіўся Пашка, хацеў нешта спытаць, але, убачыўшы схіленых людзей, у нерашучасці спыніўся.

— Што табе, Павел? — узняў голаў дзядзька Саша.

— Ды... хацеў даведацца... Іграць болей не будзем?

— Не.

— Тады нам таксама можна падрубаць?

— Садзіся, калі ласка,— адсунуўся Фёдар.

— Ды не, дзякуй. У нас свая кампанія.— Ён пастаяў, разглядаючы мужчын, пасля з крыўдаю сказаў: — З намі дык не захацеў, старшой.

— Ідзі, Павел,— папрасіў дзядзька Саша.— Я зараз прыйду.

— Ды чаго тут ужо,— сказаў Пашка,— сядзі. Я ж толькі папытаць хацеў, будзем іграць яшчэ ці пашабашым ужо.

Штосьці насвістваючы, Пашка пайшоў да хлопцаў, дзе на паваленым плазам барабане стаяла бутэлька, і Жора, шастаючы папераю, раскладваў закуску.

Фёдар Бабкін, пагля̃даючы на жанчын, што расселіся

ўжо ў грузавыя машыны, крадком наліваў, засланяючыся крысом, і падаваў чарку па парадку.

— Давай, Сцёп, бяры... Ціхан, твая чарга...

Франтавікі наспешна выпівалі, тыцкалі скрылямі памідораў у размоклую ружаватую соль і, не дажаваўшы яшчэ, лезлі ў кішэні па курыва. А з машыны нецярпліва гукалі:

— Эй, мужчыны! Вы што там вядзьмарыце? Паехалі!

— Ды зараз,— адмахнуўся Фёдар.— Зараз паедзем.

— Чакаць не будзем! — крычалі з машыны.

— Ох гэтыя бабы! — злаваўся дзед Васілій, устаючы.— Ніякага разумення. Ці ж часта збіраемся вось гэтак. Можа, і не пабачымся болей.

Франтавікі нехаця пачалі падымацца.

— Дык няхай сабе едуць,— сказаў дзядзька Саша.— У мяне тут свая бартавая. Табе, Сарокін, куды?

— Ды мы вунь з ім, з Хмызовым, з Бярозаўкі. А Фёдару во з Ціханам у Махоціна трэба. Далей, за намі.

— Ну, не хвалюйцеся, усіх паразвозім.

Узрадаваны Фёдар пабег сказаць, каб іх не чакалі. Машыны пачалі раз'язджацца.

Вярнуўшыся, Фёдар выкапаў са сцірты яшчэ адну бутэльку, узяўся дзяліць па новым заходзе. Тая акалічнасць, што цяпер не трэба было нікуды спяшацца, выклікала ўспаміны, і Сцяпан Холадаў ажыўлена ляпнуў сабе па калене:

— А вось, браткі, быў у нас адзін выпадак!..

— Ну, ну, давай.

— Бралі мы пад Арлом адну вышыню. І вышыня ж не надта якая, а не падступішся: усё адкрыта, ні кусціка, ні задзірынкі, а ўнізе — багна. Ну, адзін раз сунуліся — не выйшла, другі — і не падступіцца. Строчыць і строчыць з дота. Спрабавалі біць па ім з мінамётаў — дым, пыл, ну, думаем, усё, накрылі! Сунемся, а ён зноў: тра-та-та-та... Жывы, гад! Яно б, каб пальнуць з артылерыі, можа, што і атрымалася б, ды не было пры нас ніякай артылерыі. Адны ротныя мінамёты. Ну, а ў тых сілёнкі аказалася малавата: фук-фук, а немец цэлы. І страты ў нас ужо не малыя. Камандзір батальёна па тэлефоне нашага ротнага мацюкае: каб да такой-та гадзіны вышыня была захоплена, дый толькі!

— Ну, дык вы яе б уночы, цёмначы...

— Пачакай ты: «уночы»... Да ночы вунь колькі трэба было чакаць. Та-ак... Сядзіць наш ротны ў траншэі, ку-

рыць, на боты плюе — злосны-злосны. Мы таксама маўчым, адсопваемся пасля атакі. А што скажаш? Хоць бачыць вока, ды дастаць далёка. І вось табе падсаджваецца да яго адзін салдацік, дзіця дзіцём. Таварыш камандзір, кажа, адпусціце мяне вунь у тую пакінутую вёску. Калі я знайду тое, што мне трэба,— даю слова, пасля абеду скалупнём немца.

— А што ж яму патрэбна было такое?

— Не перабівай. Сказаць, дык нецікава будзе. Слухай... Ну, адпусціў яго, папоўз хлопец. Глядзь — вяртаецца, валачэ штосьці ў мяшку. Паўвёскі, кажа, абшнарыў, а знайшоў. Толькі цяпер трэба пачакаць, пакуль сонца немцам за спіны зойдзе...

— А! — засмяяўся Фёдар.— Разгадаў — люстра!

— Ну, разгадаў — няма чаго цяпер і расказваць...

— Давай, давай!..

— Падрыхтаваліся мы да новай атакі, чакаем. Толькі сонца пачало да немцаў паварочвацца, хлопец і дастаў з меха сваю хітрасць. А шкло во якое, з газету! Давай наводзь, кажа яму камандзір. Ну і нацэліў ён не абы-куды, а ў самую амбразуру. Немцу, вядома, гэта не спадабалася, а што ён можа зрабіць? Кінуліся мы ўсе як адзін, немец давай пуляць, ды стральба ўжо не тая, а куды папала. А хлопец наш яму люстрам ды ўсё ў морду, у морду! Ну, вядома, там, апрача кулямётчыка, яшчэ ж былі, але мы тут хутка ўжо з імі расквіталіся. Так пасля і вазілі з сабою люстра, як вока бераглі. Як сакрэтную зброю.

— Дак гэта ж на Одэры так пражэктарамі асляплялі.

— Э-э, братка, па Одэры калі было? А то яшчэ пад Арлом. Яно, можа, пасля пра наш фокус і да генералаў дайшло, да самай Стаўкі. Ну, дык, зразумела, у генералаў уся тэхніка ў руках. А выдумка, атрымліваецца, салдацкая.

— А то вось адзін раз было...— пачаў франтавік у гумовых ботах.

І пайшло, і пайшло... Загаварылі мужыкі, пачырванелі іх твары, заблішчалі вочы — не ад гарэлкі, не! Што там гарэлка, калі няма чаго ўспомніць! А ўспомніць ім ужо хапала чаго — і геройскага, і горш за горкае...

Каля абеліска не засталося цяпер ніводнага чалавека, і ён, шэры, цэментны, адзінока ўзвышаўся сярод чорнай перадзімовай галізной палёў.

— Колькі ж іх там ляжыць? — у роздуме спытаўся Сцяпан Холадаў.

— Сорак дзевяць,— адказаў дзядзька Саша.

— Ай-яй-яй... Недзе сорак дзевяць двароў асірацела. Цэлая вёска...

— Дык яны ж з розных мясцін, папэўна.

— Ну, гэта я так, для прыкладу.

— Сорак дзевяць яшчэ нямнога.— Холадаў палез па новую папяросу.

— Бывала, і па сотні, а то і больш у адну яму клалі. Наш полк за тры дні цэлы батальён страціў.

— А, кажуць, быццам бы толькі ў нашай мясцовасці чатырыста помнікаў будзе пастаўлена,— сказаў Холадаў.— Лектар адзін прыязджаў, дык расказваў...

— Можа быць.

— Колькі ж тады па ўсёй Расіі? — прыкідваў дзед Васілій.

— А вось і лічы...

— Ды яшчэ па Польшчы, ды па розных іншых краінах. Пад Берлінам адным трыста тысяч палегла.

— Сказана ж: усяго дваццаць мільёнаў.

— А немца тады колькі?

— Недзе мільёны чатыры з нечым,— сказаў дзядзька Саша.

— Усяго столькі? — здзівіўся Холадаў.

— А што, мала?

— Як жа гэта так, білі-білі, а толькі чатыры мільёны натаўклі? Атрымліваецца: мы яго аднаго, а ён нашых пецярых...

— Дык, дзівак-чалавек,— сказаў Фёдар,— мы адных толькі іхніх салдатаў, а яны — каго натрапяць: і баб наўных, і дзяцей. Вунь у ваенкома — і жонку, і абедзвюх дзяўчынак... А колькі ў Германію загнаў, у лагерах згнаіў. Вось дваццаць мільёнаў і набралася.

— Ох, гора-гора,— уздыхнуў дзед Васілій.— Не заесці, не запіць гэтага. Не заесці, не запіць...

Дзед Васілій памаўчаў, але раптам, перасеўшы спрытней, сказаў неяк натхнёна з прасветленым тварам:

— А ўсё-такі, браткі мае, памерці салдатам у баі з непрыяцелем — святая справа, што ні кажы! З усіх смерцяў смерць! Ну вось што я? Ну яшчэ патлею на гэтым свеце гадкоў тры — чатыры дый памру на печы. Занясуць за вёску і закапаюць. І ўсё. Таму што памёр ад старасці. А вось каб я там, салдатам смерць прыняў — гэта ўжо смерць вунь якая! Глядзіш, і мне помнік паставілі б.

Доўга дымілі цыгаркамі. Было чуваць, як каля барабана пра нешта спыталіся музыканты:

— Не, Жорык, млынкамбінату нічога не свеціць. Каму там іграць, дзе ў іх форварды? Там выпівакі адны.

— Не скажы! Вось убачыш, уваткнуць.

— Слабо! Яны нават спажыўсаюзу прайгралі.

Сцяпан Холадаў паправіў пусты рукаў ватоўкі, які выбіўся з-пад пояса.

— Ты кажаш — чатырыста...— сказаў ён.— Яно, калі ўсе помнікі паставіць, як трэба, па тых баях, што тут ялі, дык і араць не будзе дзе.

Дзед Васілій, прыжмурыўся, агледзеў дальнія пагоркі, нібыта прыкідваў, дзе яны павінны стаяць, гэтыя не пастаўленыя яшчэ абеліскі.

— Трэба было раней пачынаць ставіць,— сказаў Фёдар,— па свежых слядах. Маладняк вунь падрос, павінен бачыць і ведаць, чым мы плацілі. А то ўжо і зарастаць пачало. Хіба доўга: плугам прайшоўся — і ўсё. Роўна, гладка, як нічога і не было.

— Я вам так скажу.— Дзед Васілій абцёр далоняю вусы.— Гэта вось пешку, напрыклад, збілі ў гульні, а ў другі кон зноў стаў яе, зноў перасоўвай. А ў салдата жыццё адно-адзінае. Салдата не вернеш. Ну, а калі ён сваю галаву паклаў, цаны ёй няма.

Каля барабана дружна смяяліся хлопцы.

— Во дае! Залівае!

— Чаго? — гарачыўся Пашка.— У іх адзін Зюзя чаго варты!

— Дрэнь твой Зюзя.

— Зюзя — дрэнь? Ха-ха! А ты бачыў, як ён штрафны біў? Вось як ад сцірты да таго помніка. З трыццаці метраў. Як урэжа! Пад самую планку.

Мужыкі памаўчалі, прыслухоўваючыся, як спрачаюцца музыканты.

— Та-ак...— Ціхан пачухаў пад чорнай пуцейскай фуражкай.— Я неяк на параду ў Белгарад ездзіў. У дыстанцыю пуці. А там, мабыць, бачылі, на плошчы Вечны агонь гарыць. А над ім жанчына гаротная такая. З каменю. Начаваць я не застаўся, думаю, паеду якім-небудзь таварняком. Іду так прыкладна а другой гадзіне ночы цераз плошчу, гляджу, хлопцы каля Вечнага агню весяляцца. Гадоў па шаснаццаць. Рагочуць, па гітары дрынькаюць. І дзяўчаткі з імі, усе ў белых сукеначках. Гляджу, на граніце бутэлька, шклянка. Ах, кажу, паганцы вы гэтакія! Ды хі-

ба дзеля гэтага агонь тут запалілі? А што, кажуць, мы такое робім? Мы ж нічога не псуём. Марш, кажу, па хатах! Раззлаваўся я. А яны і слухаць не хочуць. Мы тут да раніцы будзем. Світанак сустракаць. У нас, кажуць, выпускны.

Во як!

Скрозь хмары нізка, каля самага небакраю, прабілася сонца. Яно сыпнула барвянымі пучкамі па дальніх пагорках, што адзін за адным неабсяжна разбягаліся, знікаючы з поля зроку. Яго промні адшукалі сярод гэтых пагоркаў непрыкметную дагэтуль царкаўку. Трапяткое, бягучае святло хутка перамяшчалася з аднаго месца на другое, касілася ўсё бліжэй і бліжэй, і вось ужо агнём шуганула мажавы лапцуг таполяў на суседнім схіле, медным адлівам зачапілася ралля, і пасярод яе радасна зазелянелі ніўкі рупні.

Франтавікі прываліліся да цёплага боку сціртьі і міжвольна загледзеліся на гэта нечаканае прасвятленне сонца, на шпаркі бег яго прамянёў па асветленай імі зямлі.

І раптам на фоне цёмнага неба, загрувашчанага хмарамі, ярка, нібы ўспышка, высвеціліся кінжальна вострая грань абеліска. У гэты перадвячэрні час ён выглядаў неяк сам па сабе, ні з чым на гэтай зямлі не звязаным, вольным ад надзённай мітусні, і, магчыма, таму пышная гара вянкоў вакол п'едэстала — гэта стракатасць папяровых кветак, сасновай зелені, чорных і чырвоных бантаў — здалася дзядзьку Сашу нейкім марным і непатрэбным упрыгожаннем. Як стары музыка, што не раз меў справу з пахаваннямі, ён не любіў вянкоў. Хутка яны пажоўкнуць, асыплюцца хваёвыя лапкі, дажджы змыюць са стужак нетрывалыя словы, напісаныя зубным парашком, і няма нічога больш сумнага, чым бачыць пасля на магільнай пліце гэтае пажухлае смецце.

Сонца пасвяціла крыху і зноў зацягнулася хмарнай навалаччу, а на краі разлілася барвовая паласа сонечнага захаду.

А неўзабаве перадвячэрняя сінь і зусім тужліва ахутала пагоркі.

— Пара, аднак, па дамах.— Дзед Васілій агледзеў неба.— Каб дажджу не нацягнула. Другі дзень нешта нынешняга, акаянная.

Астатнія, відаць, адразу ўспомнілі пра розныя свае справы і таксама пачалі збірацца, і дзядзька Саша пайшоў

сказаць свайму шафёру, які спаў у кабіне, каб той развёз франтавікоў па дамах.

І неўзабаве, хістаючыся і чмыхаючы на ўхабінах, машына павезла і дзеда Васілія, і ўсіх астатніх.

Пад вечар прыціхла. Хмары супакоена збіліся ў адно месца і непрапікальнай тоўшчаю павіслі над галавою. Пачало імжыць — спярша адным толькі мокрым пылам, а пасля пасыпала і зусім сур'ёзна. Аркестранты пакінулі на пожні свае інструменты, а самі схаваліся пад застрэшкам абскубанай сцірты.

Ужо некалькі разоў дзядзька Саша выходзіў на край раллі, падоўгу глядзеў у бок гасцінца, адкуль вось ужо дзве гадзіны чакалі машыну. Але вакол было глуха, як бывае толькі ў такую непагадзь у шэрым восеньскім полі.

— Ну што, старшой? — нецярпліва аклікалі яго аркестранты.

Дзядзька Саша моўчкі вяртаўся да стога.

— Нябось, самагон трэскае,— выказаўся пра шафёра Пашка.— Гэта — напэўна.

Хлопцы панура дымілі цыгаркамі. Было чуваць, як у душнай вантробе сцірты пішчалі і вазіліся мышы. Нехта прыгадаў, што сёння нашы гуляюць на кубак з іспанцамі і што цяпер не ўдасца паглядзець, таму што гульню будуць трансліраваць а сёмай, а ўжо сёмая пачалася.

— А ў мяне сёння верная дзесятка гаўкнула,— сказаў альтавік Сохін, да самага падбароддзя аброслы бакенбардамі.— А то, мабыць, і больш.

— А табе куды? — пацікавіўся Іван-Бейны.— На «жмурыка»?

— Ха, на «жмурыка»...— Сохін грэбліва паморшчыўся.— На «жмурыкаў» я ўжо даўно не клюю. Гэта ты, мабыць, траякі там збіраеш. На вяселле ў адно месца запрасілі.

— Вяселле — гэта тое, што трэба,— пагадзіўся Іван.— Я быва-аў. Толькі іграць памногу прымушаюць.

Іван-бейны пачаў выскубаць салому, ад якой адразу пайшоў пах зляжалага, пасля ён доўга, па-сабачы, мяў яе, падтыкаў пад бакі і, нарэшце, заціх. Хутка раздаўся яго мерны храп.

— Гамы прайграе,— усміхнуўся Ромка.

Дождж прыкметна павялічыўся, зачасціў па плашчах, хлопцы, падбіраючы пад сябе ногі, усё шчыльней ціснуліся

да сціртьі. Адзін Іван-Бейпы бесстурботна хроп, не зважаючы на вільгаць. Адпекуль паляцела чарада гракоў, густа ўсеяла неба і паляцела гамапплівай паласою на ўсход, мабыць, на начлег. Гракі хутка расталі ў шэрай смузе дажджу і зусім зніклі. З пралётам гракоў вечар канчаткова загусцеў, блізка абступіў сцірту сваім змрокам, і таму час пацягнуўся яшчэ марудней. Пашка зняў з сябе сваю курпатую балонню, паспрабаваў накрыцца, але не ўлежаў пад вільгаць і раздражненне, якога ўжо дагэтуль назбіралася досыць, падпялі яго, ён шпурнуў плашч і, як зацкаваны тхор, люта зыркнуў па баках.

— І на які хрэн трэба было аддаваць машыну?! — сплюнуў ён і люта скалануў рыжай кудлатай галавою.— Цяпер вось прыпухай.

— Але, тут старшой перамудрыў,— адгукнуўся Сохін, непрыязна паглядаючы, як дзядзька Саша сюды-туды хадзіў вакол стога.

Астатнія стрымана маўчалі.

— Усяго ж толькі пару разоў і сыгралі. Варта было пераціся ў такую далечыню! — распаляўся Пашка.— Іншага аркестра хіба не маглі знайсці? Ды цяпер у кожным калгасе поўна духачоў.— Ён рыўком зноў нацягнуў на сябе плашч, тыцнуўся галавою ў салому і ўжо з-пад балонні выгукнуў: — Нябось, старшой напрасіўся!

— Ды памаўчы ты! — абарваў яго дзядзька Саша.

Стрымліваючы сябе, ён паплёўся да інструментаў, што цьмяна паблісквалі на пожпі. У прыцемку ледзь не спаткнуўся аб барабан, плазам перакінуты воддаль. На скуранай дэцы вакол апарожненых бутэлек моклі шматкі газеты, шалупінне ад яек, рэшткі недаедзенай хамсы. Старшой увесь закіпеў ад гневу: хоць бы прыбралі за сабою гэтае паскудства, чорт вазьмі. І, адчуваючы, што ўжо не валодае сабою, раптам крыкнуў:

— Разабраць інструменты!

Хлопцы, не зразумеўшы, што здарылася, затоена заставаліся ляжаць.

— Устаць усім! — глуха вымавіў дзядзька Саша, адчуваючы, як нямеюць сківіцы.

Музыканты яшчэ крыху памарудзілі і пасля неахвотна завазіліся ў саломе.

— А што здарылася, старшой? — з пядбайнай расцяжкай пацікавіўся Сохін. І, не атрымаўшы адказу, паціснуў плячамі.— Што гэта ён, а?

Сцепаючыся ад дажджу, па хаду вытрасаючы з пінжа-

коў мякіну, музыкі папура пабрылі разбіраць трубы. Пачуліся раздражнёныя галасы:

— Чыя альтуха?

— Ды цішэй ты, казёл, валторну раструшчыш. Глядзець трэба!

— Заткніся!

— Іван, забірай сваю іерыхонскую!

Дзядзька Саша, не чакаючы, першы ступіў на камякаватую, добра прамоклую ўжо глебу. Аркестранты, грузнучы ў гразі, уразнабой пляліся следам. На прасёлку старшой спыніўся і, калі выбраліся ўсе астатнія, скамандаваў:

— Па тры разбяры-ысь!

Хлопцы незадаволена запратэставалі:

— А навошта? Што мы, навабранцы, ці што? Каму гэта патрэбна?

— Спыніць размовы!

Парадак пастраення аркестра ўсе ведалі добра: карнеты — наперад, за імі тэнары, альты, басы... Але незразумела было, навошта ісці строем, ды яшчэ ў дождж.

— Ды кінь фасоніць, старшой,— зноў паспрабаваў адгаварыць Сохін.— Ну, чаго ты?

— Стаць у строй! — голас дзядзькі Сашы гучаў непрывычна катэгарычна і па-чужому.

— Ого!..— адхіснуўся Сохін і з недаўменнай усмешкаю ўшчаміўся паміж Курачкіным і Бялібіным.

— Барабан тут? — аклікнуў дзядзька Саша, панура аглядаючы збянтэжаных аркестрантаў.

— Тут! — падаў голас Сева з задняй шарэнгі.

— А бейны бас?

— Ну, вось ён я...— неахвотна адклікнуўся Іван.

— Шагам ар-рш! — Дзядзька Саша крута павярнуўся і пакрочыў уніз.— І не адставаць!

Ішлі ў злосным маўчанні, было толькі чуваць ліпкае чмяканне падэшваў на аслізлай палявой дарозе ды бразганне труб, якія датыкаліся адна да адпае. Часам хто-небудзь чыркаў запалкаю, захінаючыся ад дажджу, закурваў на хаду. І толькі Пашка незадаволена бубніў, лаючы шафёра, дарогу, надвор'е і свой горкі лёс.

— І куды гэта мы? — з'едліва спытаўся Сохін.

— Куды, куды! — перадражніў Пашка.— З кудыкінай гары — у тартарары.

— Зразумела: цяпер да грэблі,— гадае Жора.

— Нічога сабе! Кіламетраў дзесяць! Ну, а там што?

— А там — на спадарожны грузавік.

— Плявацць! — пырхнуў Пашка.— Ідзём да першай вёскі.

— А па працу? — разгублена спытаўся Курачкін.— Мне заўтра ў першую заступаць.

— За гэта старшой адказвае. Наша справа цялячая.

Схіл быў стромкі, ногі ступалі нібы ў пустату. Па баках усё вышэй дыбіліся гарбы суседніх узгоркаў, і ўсё менш заставалася над галавою цьмяна-шэрага неба. Схіл бясконца збягаў і збягаў уніз, дарогу ужо ледзь можна было распазнаць, і аркестранты на крывых нагах коўзаліся быццам бы ў апраметную, заслоненую дажджом і цемраю.

Дзесьці ніжэй раптам ахапіла падвальным холадам, патыхнула застаялай вадой, жухлай асакою. Пад нагамі чвякала жыжа.

— Усё! Набраў у корачкі,— кісла абвясціў Пашка.— На тым тыдні трыццатку аддаў, цяпер хана ім.

— А ты хадзі па каменьчыках,— усміхнуўся Ромка.

— Па якіх каменьчыках? — ашчэрыўся Пашка.— Якія тут каменьчыкі — суцэльная багна.

Дарогу абступілі чорныя грамадзіны ракіт, пад якімі адразу стала цёмна, як у пячоры. Дождж глуха шумеў дзесьці над галавою, аднак ён заблытваўся ў гушчары галін, і толькі некаторыя яго кроплі разрэджана і важка білі па спінах. Строй канчаткова рассыпаўся, аркестранты брылі як папала, намацваючы цвярдзейшыя месцы. Пад нагамі захрусцеў слізкі хмызняк, напэўна, паваленны шафёрамі ў гразкіх калдобінах. Галінкі спружынілі, чапляліся за штаны, балюча хвасталіся, з-пад іх пры кожным кроку з хлюпатам пырскала гразь. Іван-Бейны разам са сваім басам заляцеў у нейкую канаву і доўга шамацеў кустамі, шукаючы кепку. Апынуўшыся на цвёрдым, ён пачаў даказваць, што яны ідуць зусім не туды, не па той дарозе, і наогул дарэмна зрушыліся з месца.

— Вось убачыце, улезем куды-небудзь,— бурчаў ён, цыбата і нягегла скачучы па затопленых ужо латах.— Днём, калі ехалі, ніякай жа дрыгвы не было.

— Гэта правільна! — зларадпічаў Пашка.— Завёў Сусанін! І каб я яшчэ куды паехаў! Матаў я такую самадзейнасць!

Дзядзька Саша спыніўся, пачакаў Пашку.

— Ты вось што, Павел,— сказаў ён, прытрымліваючы хлопца за рукаў.— Вазьмі у Севы барабан.

— А чаму гэта, цікава ведаць, я?

— Ды таму, што ў цябе толькі талеркі.

— Няхай Курачкін нясе, любімчык твой. З яго мордаю толькі барабан і цягаць.

— Не, панясеш ты,— жорстка сказаў дзядзька Саша.

— Усё Павел ды Павел,— перадражніў Пашка.— Цэлы дзень прыдзіраешся.

— Ну добра. Не возьмеш барабан — панясу я.

Пашка панура маўчаў, спрабуючы вызваліць рукаў, які моцна трымалі дзядзькавы Сашавы пальцы. І раптам раўнуў:

— Сеўка, паразіт, давай сваё грукала!

— Ладна, дзядзь Саш, я сам,— адклікнуўся Сева.— Мне яшчэ не цяжка.

— Аддай, аддай! — строга дамагаўся дзядзька Саша і, адпусціўшы Пашку, пайшоў наперад.— Няхай паднясе.

Пашка сарваў барабан з Севы, які апынуўся побач, сунуў яму талеркі і, злосна мацюкнуўшыся, даў хлопцу выспятка.

— У, аглаед!

Хлопцы гуськом праходзілі міма Пашкі, не ўвязваючыся ў спрэчку. А Пашка сеў на барабан і закурыў, курыў прагна, доўга, і, калі ўсе прайшлі, паплёўся ззаду, каб ні з кім не ісці побач.

Трымаючыся за кволенькія парэнчы, вобмацкам прайшлі нейкі масток, які невядома ці быў, калі ехалі сюды, ці не.

Нарэшце скончыўся ракітнік, і паступова пачаў угадвацца пад'ём. Неба пашырылася і, здавалася, нават крышачку пасвятлела. Усе чакалі, што вось-вось з'явіцца вёска. Але расчаравала, пачала злавацць і непакоіць дарога. Яна раптам яшчэ больш раскісла, паналівалася вадою па каляінах і калдобінах, усё некуды цягнулася з сумнай прамізною, усё маячылі надакучліва тэлеграфныя слупы ў шэрай бездані цёмнага неба, і нічога не чуваць было, апрача дажджу, што хвастаў па спінах і трубах. Хлопцы натапырана брылі за дзядзькам Сашам, не абмінаючы ўжо ні лужын, ні калдобін. Дванаццаць пар чаравікаў, яшчэ раніцай начышчаных да франтаватага бляску, нястройна і абыякава чмякалі, коўзаліся, хлюпалі ў вязкай жыжцы, і ў гэтай бязладнай таўхатні ног старшой улоўліваў прыхаванае нездавальненне самалюбівых хлапчукоў, якія яшчэ ў сваім жыцці нічога не бачылі і лічылі сябе пакутнікамі на гэтым шляху, ахвярамі несправядлівасці і дэспатызму. А ўвогуле, канешне, атрымалася даволі няскладна, і дзядзька Саша зазнаў прыкрае пачуццё віны перад

імі, але павінны разумець і яны тое галоўнае, дзеля чаго ён гэта зрабіў — аддаў франтавікам машыну.

...У сорак трэцім з запаснога палка вывеў ён сотні тры вось такіх самых зялёных, неабстраленых хлопцаў. І таксама лілі дажджы, і непралазныя былі дарогі. Ішлі толькі начамі: асцерагаліся варожай авіяцыі. Да світання рабілі трыццаць — сорак кіламетраў. Важкія кірзачы, мокрыя, набрынялыя шынялі, якія не паспявалі прасыхаць за час кароткіх днёвак, мізэрны паёк і сон не ўволю. Хлопцы ўсыхалі на вачах, змарнелі, пачарнелі з твару. Пад канец тыдня засыпалі на хаду: глядзіш, ідзе, схіліўшы галаву, трымаецца за суседа, як сляпы. Некалькі хвілін такога неадольнага забыцця — і зноў тупае, месіць бясконцую гразь прыфрантавой дарогі. Апошнія трыццаць вёрст ужо не ішлі, а літаральна дамучвалі. Помніцца, як у світальнай імгле нарэшце паказаліся збудаванні пункта прызначэння. Ва ўсіх білася толькі адна думка: дайсці, паваліцца і спаць, спаць — усё роўна дзе, на чым...

І раптам конны пасыльны: новае папаўненне будзе сустракаць сам камандзір палка. Па калоне панеслася: «Падцягнуцца! Разабрацца па чатыры! Паправіць абмундзіраванне!» На скрыжаванні ў адкрытым «вілісе» стаяў стары вусаты падпалкоўнік. Ён падняў руку да забінтаванай галавы, аддаў чэсць роце, што ледзь-ледзь плялася. «Віншую з уступленнем у дзейную армію! — хрыпла выкрыкнуў камандзір палка.— Усім прысвойваю званне гвардзейцаў!» І ў той самы міг аркестр за яго спіною грымнуў святочны вясёлы марш: «Утро красит нежным светом...» А сапраўды тое «утро» было хмарнае, кашлатае, у глiністых лужынах пухірыўся д'ябальскі надакучлівы дождж. Панурыя, запырсканыя граззю салдаты як маглі падраўнялі нястройныя, разарваныя шарэнгі, прыпаднялі свінцова-важкія галовы, першыя рады паспрабавалі нават адбіць страявы крок — так радасна, бадзёра грымела музыка, так клікала яна да чагосьці прыгожага і надзвычайнага! «Кипучая, могучая, никем не победимая!» — звонка, сярэбрана спявалі трубы, і рота ачуняла, злілася ў адно цэлае і адгукнулася на гэты спеў сваім важкім і грозным крокам. «Добра маршыруеце, таварышы гвардзейцы! — перакрываючы аркестр, крыкнуў стары падпалкоўнік, у якога ў гэты час задрыжаў твар.— Дзякуй за службу, сынкі!»

У тую раніцу днёўкі не было. Роце выдалі зброю і ўру-

чылі загад на повы трыццацікіламетровы фарсіраваны кідок. У тої самы вечар дзядзька Саша вадзіў іх у першую контратаку. Вораг быў спынены, прарыў ліквідаваны, але ж многія з іх тады не вярнуліся...

— Падцягнуцца! — падбадзёрыў хлопцаў дзядзька Саша, прыслухоўваючыся да парадзелых крокаў па дарозе.

На ўзгорку каля крайняе хаты старшой спыніўся. Скрозь праліўны дождж з вокан біла яркае і роўнае электрычнае святло, што выхоплівала з цемені мокры пачарнелы штыкетнік, за якім у агародчыку, аж захлёбваючыся, булькала перапоўненая кадушка. Адзін за адным да хаты моўчкі падыходзілі ўсе астатнія. Іван-Бейны зняў з пляча сваю «іерыхонскую», перакінуў раструбам уніз і выліў «назапашаную» там ваду. Адчуўшы за брамаю чужых, на двары бразнуў ланцугом, замітусіўся сабака. На яго хрыпаты, раз'юшаны брэх у калідоры пачулася шлёпанне, відаць, жаночых ног. Грукнула драўляная засаўка, і ў асветленых дзвярах паказалася дзяўчына ў доўгім халаце.

— Ой, хто гэта? — адхіснулася яна, убачыўшы бліскучыя на святле трубы.

— Брэменскія музыканты,— штучным басам адгукнуўся Ромка, заўсёды гатовы памянціць языком з дзяўчатамі.

— Ой, нічога я не ведаю! Ма, а ма! — дзяўчына пабегла, кінуўшы дзверы адчыненыя.— Ма, там прыйшлі-і...

У расчыненым калідоры былі відаць цыратавая канторская канапа з высокай спінкаю, лапушысты фікус, белыя цынкавыя вёдры на драўлянай лаўцы. Шэры кот клубком спаў на дыванку з абрэзкаў, што быў паслапы каля парога на чыстай пафарбаванай падлозе. Патурбаваны кот выцягнуў пярэднія лапы ў салодкім позеху, падрапаў свой дыванок і са здзіўленнем утаропіўся на незнаёмых людзей, што збіліся каля ганка.

Выйшла жанчына, круглатварая, таўставатая, у цёплай хустцы на плячах. Дзядзька Саша сказаў, хто яны і адкуль.

— Вой, гора, гэта ж у такі пролівень! — спачувальна спалохалася яна, выглядаючы за парог.— Дык чаго ж вы стаіцё? Праходзьце ўжо, чаго дарэмна мокнуць.

Аркестранты пачалі было складваць інструменты пад акном на святле, але гаспадыня запратэставала:

— І музыку заносьце. Прапасці не прападзе, а хто ж

яё ведае... машына пезнарок коламі паедзе альбо яшчэ што... Навошта ж кідаць?

Хлопцы пашаравалі аб траву чаравікі, абтрэслі плашчы і пачалі падымацца па ганак. Адразу ж калідор напоўніўся пахам дажджу і мокрай апраткі. Кот прадбачліва шмыгнуў на кухню. Не ведаючы, ці заставацца ім тут, ці можна ўвайсці ў дом, хлопцы пяёмка тоўпіліся і азіраліся па баках.

— Праходзьце, праходзьце ў пакой,— падбадзёрыла іх жанчына.— Машына міма пойдзе, нікуды яна не дзенецца. Па такой дарозе не надта праскочыць. Яна і ў доме будзе чуваць.

Хлопцы пакінулі ў калідоры плашчы і чаравікі і пакорліва, гуськом прайшлі цераз кухню ў пакой.

Каля кафлянай грубкі, «грэючы» за спіною рукі, стаялі чатыры дзяўчыны, насцярожана пазіраючы на няпрошаных гасцей.

— Яшчэ раз здрасьце,— ліслівa сказаў Ромка. Ён падышоў да дзяўчыны, што адчыняла ім дзверы, энергічна падаў руку і назваўся:

— Рома.

Дзяўчына зардзелася, нейкі час збянтэжана глядзела на Ромкаву далонь і, нарэшце, адважылася пацiснуць яе, ціха сказаўшы:

— Вера.

— Вельмі прыемна! — задаволіўся Ромка і перадаў далонь другой дзяўчыне:

— Рома.

— Серафіма,— ахвотна назвала сябе другая дзяўчына, у чорным спартыўным касцюме.

— Рома.

— Надзя.

— Рома.

— Нопа.

— Вельмі прыемна. А гэта ўсё мая ахова.— Ромка павёў рукою, паказваючы па аркестрантаў, якія абступілі іх.— Ведаеце, як пяецца ў адной песні: «Ох рапо встаёт охрапа!»

Дзяўчаты засмяяліся. Няёмкасць першых хвілін была пераадолена, і вось ужо Ромка, падкладваючы галлё у гэты, пакуль яшчэ маленькі, касцерчык бяседы, дапытваўся:

— Значыць, усе чацвёра — родныя сёстры?

— Ага, сіямскія блізняты,— пацвердзіла Серафіма.

— Зразумела.

— Бурачныя пабрацімы,— удакладніла Надзя.

— А гэта ўжо незразумела.

— Што ж тут незразумелага? Прыехалі ў калгас буракі капаць.

— Значыць, студэнты! Дык гэта вы ў нас буракі кідалі?

— Калі? — здзівіліся дзяўчаты.

— Дзе? — спытаўся Ромка.

— Што — дзе? — пераглянуліся дзяўчаты.

— Гэта ж вы пытаецеся — дзе.

Дзяўчаты, нарэшце, разгадалі падвох і зарагаталі.

Дзядзька Саша застаўся на кухні з гаспадыняй, якая толькі што прынесла з двара вядзерца з прасаваным вугалем.

Яна грукала шуфлікам, падкідваючы брыкеты, што доўга шыпелі на агні, скардзілася на дождж, якому можна было і пачакаць, бо на полі яшчэ многа буракоў. Ёй дык дождж не шкодзіць, яна працуе пад дахам, на ферме, а некаторым жанчынам цяпер дастаецца: хіба добра вазіцца з буракамі на такой зямлі! Вось і дзяўчаты з горада ў яе кватаруюць, прыслалі на ўборку. Тая вунь, у халаціку,— яе дачка Вера, а астатнія прыезджыя. Толькі вярнуліся з поля, ледзь паспелі памыцца, пераадзецца, а заўтра амаль досвіткам зноў ісці. І Вера з імі ходзіць, адарвалі ад заняткаў. Сёлета дзесяты канчае, клас адказны, а таксама не паглядзелі, адправілі на буракі.

Гаварыла яна ахвотна, з той гасціннасцю і прыветлівасцю, якую міжвольна засвоілі бязмужнія вясковыя жанчыны.

— Ды вось вырашыла вугальком абагрэць хату, прасушыць дзявочую адзёжку, а то прамоклі да ніткі. Можна б і рускую печ распаліць, дзевак цяплом парадаваць, ды небяспечна — дымець пачынае, столькі часу не цепліліся. Ды цяпер і рэдка хто паліць у печы, усё болей плітамі абыходзяцца. Меней клопату. Гэта ж раней самі хлеб пяклі, ды жывёле ўсялякага варыва на кожны дзень рыхтавалі. А цяпер усё гэта адпала. Я думала нават зламаць гэтую печ, у доме параскашнела б, але нияк варухнуць яе шкада, прывыклі. Яшчэ дзяўчынкаю на ёй сядзела, ох ужо ж і гадоў той печы!

— Дом дык нібыта новы,— заўважыў дзядзька Саша, аглядаючы роўную столь і свежыя бэлькі.

— Дык дамок-то, правільна, новы, пасля вайны пастаўлены, а печ старая, яшчэ ад тоі хаты. Гэта ж як немец спаліў вёску, дык адны печы і тырчалі. На нашай уся цэгла

кулямі і асколкамі насечана, такія шчарбіны былі! Пасля, праўда, гліпай пазамазвалі, а калі замазку адкалупнуць, дык на ёй, беднай, жывога месца не знойдзеш. Яна ў нас геройская печ, хоць медаль чапляй,— усміхнулася гаспадыня.— Шкада разбураць цяпер.

З бакоўкі, абапіраючыся аб вушак, выпаўзла старэнькая кабета ў падшытых валёнках, ціха, без усякай цікаўнасці, прывіталася.

— Ды вось, мам, пра нашу печ загаварылі,— трохі гучней загаварыла да яе маладзіца.— Як яе кулямі тады пасекла.

— А-а.— Старая, прытрымліваючы адпой рукою паясніцу, трымаючыся за стол, павольна апусцілася на табурэтку.— Было, было,— яна ўжо неяк жывей паглядзела на новага чалавека.

— Ад печы ўсё і пайшло. Усё наша жыццё цяперашняе. Як немец гэта пайшоў,— сказала жанчына з дабрадушнай весялосцю,— вылезлі мы са склепа на свет божы, а свету божага і няма. Ад нашай сядзібы — ні кала, ні двара! Адна чорная печ! Паглядзела — а комін жа без даху да таго высокі, аж страшна зрабілася. А глянулі навокал — і вёскі няма. Адна дарога. І поле — вось яно, зусім блізка.

— Пра боршч скажы, Пелагеюшка, пра боршч,— напомніла старая.

Жанчына засмяялася:

— У нас боршч перад тым у печы гатаваўся. Яшчэ да пажару. Ну, скалупнулі накрыўку, а там адна сажа.

Старая слабенька ўсміхнулася:

— Упарыўся.

— Ага... Ну дык што было рабіць, з чаго пачынаць? Як жыць? Пачалі мы нашу карміцельку плятнём аплятаць ды гліпаю пляцень абмазваць. А зверху нібы дах змайстравалі — бур'яну пакідалі. Ні паветка, пі адрына, а зацішак быццам бы атрымаўся. З таго і пачалі.

У кухню выскачыла пачырванелая Вера, гаспадынін дачка, і спыталася:

— Мам, можна яблыкаў хлопцам даць?

— Ды хіба шкада? — з гатоўнасцю пагадзілася Пелагея.— Свае ж, не куплёныя. Схадзі, дачушка, набяры.

Дзяўчына выйшла ў сенцы, хутка вярнуўшыся назад з рэшатам буйных антонавак. З пакоя цягнула цыгарэтным дымам, дзядзька Саша чуў, як Ромка, відаць, ужо ас-

войтаўся і заліваў там з усяе сілы, і дзяўчаты час ад часу пырскалі смехам.

— Можа, і вы чаго-небудзь з'елі б? — папыталася ў дзядзькі Сашы гаспадыня.— Нябось цэлы дзянёк у полі ігралі.— І, не чакаючы адказу, замітусілася каля паліцы, дастала хлеб, наліла з гладыша малака ў кубак, абцерла донца і падала госцю.— Яно лепей бы чаго-небудзь гарачанькага, але дзяўчаткі прыйшлі, усё падмялі.

— Еш, еш,— папрасіла і старая і, памаўчаўшы, папыталася: — Гэта ж па якім полі ігралі, не расчула я?

— Ды вось там, за вашай вёскай,— кіўнуў дзядзька Саша.— Як масток перайсці.

— Ага, ага...

— На заяружнай пожні, мама,— растлумачыла Пелагея.

— Ага, ага, па заяружнай...— паўтарыла за дачкою старая.— Дык там ого-го, якія моцныя баі былі. Некалькі тыдняў біліся: ён — нашых, а нашы — яго, ён вунь як паліць, а нашы не ўступаюць. Каса на камень. Ужо так раскапаная пожня была, так раскапаная! А ўжо гранатаў гэтых ды ўсякага іншага смерцезабойства пакінута там — як дзеці бягуць туды, аж сэрца заходзіцца. Колькі пакалечыла неразумных. У дзікае поле ператварылася, вясны дзве не радзіла, усё, бывала, галодныя сабакі туды бегалі.

Дзядзька Саша падсунуў кубак, і, пакуль еў, абедзве жанчыны неяк раптам змоўклі, засумавалі і з ціхай увагаю спакваля глядзелі, як сядзіць ён у іх за сталом, гэты немалады, стомлены мужчына, як есць хлеб і хлёбае малако.

— Ох-хо-хо,— уздыхнула нейкім сваім думкам старая і цёмнаю рукою пагладзіла па стале сурвэтку. А ён, запіваючы хлеб малаком, адчуваў на сабе іх пагляды і думаў, што, напэўна, даўно за гэтым сталом не кармілі мужчыну і даўно, мабыць, жыве ў гэтым доме туга па гаспадару.

Вера зноў выбягала ў сені з апарожненым рэшатам, і ў святліцы весела загаманілі і наперабой захрабусцелі яблыкамі.

— А чым разлічвацца будзем за такі сервіс? — чуўся Ромкаў голас.

— Ды што вы! Нічога і не трэба,— адказвала Вера.— Вы ўжо лепей сыграйце што-небудзь.

— Гэта калі ласка, заўсёды гатовы.

Старэнькая, схіліўшы галаву, нейкі час тугавуха прыслухоўвалася да гаворкі ў пакоі, пасля сказала:

— Наш Ляксей, бывала, таксама па гармоніку граў. Во гэтак, як яны, збяруцца, і давай шумець.

— Дык і Коля таксама іграў,— ажыўлена заўважыла Пелагея.

— І Коля, і Коля,— згодна заківала старая.— Коля таксама вясёлы быў. Яны абодва вясёлыя былі.

— Гэта вашы сыны? — папытаўся дзядзька Саша.

— Сыно-очкі, сыно-очкі,— зноў заківала бабулька.— Во яе, Пелагейчыны браты. Прынясі, Пелагея, картачкі, пакажы чалавеку.

Пелагея схадзіла ў цёмную, без святла, бакоўку, вынесла невялічкую рамку з фатаграфіямі, памаляваную блакітнай алейнай фарбаю, такой самай, як і вазоны на падаконніку, як умывальнік у кутку, і, на хаду праціраючы шкло фартухом, нібы просячы выбачэння, сказала:

— Вісела ў свяцёлцы, а Верка: здымі ды здымі. Кажа, быццам не вешаюць цяпер усіх заадно ў адной рамцы, не модна. Цяпер, маўляў, у альбомах трэба трымаць. Ну, я ўзяла і зняла, перавесіла да мамы ў цёмную.

Гаспадыня паставіла рамку на стол і прысланіла да сцяны. Бабулька пачала жмурыцца, твар яе зрабіўся сур'ёзны, і яна пацягнулася да фотакартак:

— Я дык цяпер і не адрозніваю, дзе з іх тут каторы. Гэта вось, здаецца, Ляксей? Ну, Пелагея, паглядзі, ты відушчая.

— Гэта Коля з сябрамі. Яшчэ ў эмтээсе здымаліся.

— Ага, ага... Дык а гэта хто ж тады, не зразумею?

— І гэта таксама Коля.— І ўжо дзядзьку Сашу растлумачыла: — Колевых тут цэлых тры картачкі. Вось яшчэ ён. З Васілём. Гэта наш, вясковы. Яны ў адной часці былі. А Лёшава адна-адзіная. Лёша наш, вось ён. Як жа гэта ты, мама, забыла? Ён заўсёды ў нас з гэтага краю быў.

— Дык, можа, пераставілі калі...— апраўдвалася старая.— А так, як жа, помню... Ляксей... сынок.

Яна дрыготкімі пальцамі кранула шкло ў тым месцы, дзе была ўстаўлена малюсенькая фотакартка з чыстым ражочкам для пячаткі. Дзядзька Саша і сам ледзь адрозніў на ёй ужо слабыя абрысы твару, дрэнна праяўленага нейкім франтавым фатографам і ўжо размытага часам. На здымку відны былі адны толькі вочы ды яшчэ салдацкая пілотка, якая коса сядзела на стрыжанай галаве. Вось-вось знікнуць з гэтага кавалачка паперы апошнія чалавечыя рысы, ахутаюцца жоўтым палётам небыцця. І дзядзька Саша падумаў, што, мабыць, старэнькая пад-

слепаватая маці, што сама згасае, ужо не звяртаецца да гэтай карткі: яна даўно для яе бляклая пустата. І нават памяць, напэўна, усё цяжэй і менш упэўнена ўваскрашае далёкія, гадамі заслоненыя рысы. І толькі мацярынскае сэрца застаецца вернае.

— Ляксея-та помню...— неяк здалёк, быццам гэта не яна, а нехта іншы, прамовіла бабулька.— Як жа, першынец мой. Ужо зубкі рэзаліся, а я ўсё сваім малачком яго песціла. Ужо так прыкусіць, бывала...— Старая правяла па пустой паркалёвай блузцы і, намацаўшы гузік, супакоіла на ім дробнае трымценне сваёй рукі.

— Ну, а гэта мы тут са Сцёпам,— устрывожана кінуўшы позірк на маці, паспешліва і нават весела сказала Пелагея.— Адразу як пажаніліся. Гэта ўжо апасля вайны...— Пелагея затрымала ціхі і сумны погляд на фатаграфіі, дзе яна, просценька, на прабор прычасаная дзяўчына, радасна-насцярожаная, ледзь даставала да пляча строгага, ужо ў гадах мужчыны. І пачціва, ледзь уздрыгнуўшы голасам, дадала: — Са сваім Сцяпанам Пятровічам...

Яна памаўчала, даючы магчымасць дзядзьку Сашу паглядзець на сябе маладую і на свайго Сцяпана.

— Ну, а гэта ўсё дваюрадныя ды цёткі. Увесь наш бакавы корань. Толькі таты нашага тут няма. Да вайны неяк не паспеў зняцца, а пасля прасілі-прасілі, каб з фронту прыслаў, ды так і не дачакаліся. Усе ёсць, а яго няма...

Гаспадыня ўзяла са стала рамку, зноў занесла яе ў цёмную бакоўку і, вярнуўшыся, падвяла вынікі:

— Чацвёра палегла з нашага дому. А колькі ва ўсёй вёсцы, дык і не падлічыць.

— А чацвёрты хто ж? — спытаўся дзядзька Саша.

— А чацвёрты Сцёпа мой. Мы з ім ужо апасля вайны ажаніліся. Ён да самай Германіі дайшоў, а гэта пасля смерць і яго знайшла, ужо дома дастала. Раны ў яго адкрыліся. Мацаваўся, мацаваўся, лёг у бальніцу ды так і не выйшаў адтуль...

Пелагеін твар уздрыгнуў, і яна хутка прайшла да пліты, высыпала з вядра астатняе вуголле. Пасля доўга цераз канфорку шуравала качаргою, разграбала, раўняла брыкеціны.

— Сцёпа мой дык хоць у сябе ляжыць, дагледжаны,— уздыхнула яна, не адварочваючыся ад пліты.— І агароджу мы яму паставілі, і здымкі мяняем. Я адразу дзесяць штук павялічыла, каб надоўга хапіла, пакуль сама жывая. Ды і так калі сходзіш, паплачаш, бабская справа... А ўжо як

тыя мае роднепькія ляжаць, і дзе яны... Ездзіла я гады два таму пашукаць татаву магілку. Паведамлялі, быццам бы пад Вялікімі Лукамі ён. Ну, паехала. У ваенкамаце нават раён назвалі. Каля станцыі Локня. І праўда, стаяць там помнікі. Дык пад каторым жа наш? Вечная памяць, а каму — не напісана. А можа, і ні пад якім. Мясцовыя людзі кажуць, нібыта і цяпер яшчэ з імшараў косці дастаюць... Так я і вярнулася... Ну, а Коля ў марской авіяцыі служыў.— Пелагея папізіла голас: — Таго і шукаць няма чаго... А Лёша наш і па сённяшні дзень без пахавальнай... Я раней таксама чакала, ды што ж цяпер... Столькі гадоў мінула... Адна мама ўсё спадзяецца.

Старая раўніва прыслухоўвалася, пасля спыніла вочы недзе ў кутку пад столлю і выдыхнула сумны шэпт:

— Ох, святы бацюхна! Ох непрыбраныя ляжаць пакутнікі нашы!

— Што ты, мама! — палахліва пярэчыла Пелагея.— Як жа так можна? Непрыбраныя. Выдумаць такое.

Дзядзька Саша моўчкі курыў, пазіраючы на чорныя шыбы начнога акна, па якіх, падсвечаныя з пакоя, коса чыркалі трасіруючыя кроплі дажджу. І зноў ён уявіў сабе таго невядомага салдата на дроце пад дажджом і кулямі, што сінімі рукамі прасіўся да зямлі. І як пасля асыпаўся ён са свайго шыняля касцямі і прахам... А бабулька паклала абедзве рукі на каленях і маўкліва сядзела, гледзячы ў малінавае паддувала, сядзела так, як, напэўна, прывыкла за доўгія гады сядзець у цярплівым чаканні цуду.

У суседняй святлёцы дзяўчаты зноў пачалі прасіць Ромку пайграць што-небудзь:

— Ну чаго вы, праўда? Што вам, паветра хіба шкада?

— Шэйк? Боса-нова? — нібы між іншым кінуў Ромка.

— А іграеце? — узрадаваліся дзяўчаты.

— Га, пытаеце!

— Ой, шэйк, хлопчыкі, шэйк!

— Ну як, братва, злабаем?

— Рванём!

— Ой, давайце, давайце! — студэнткі запляскалі ў ладкі.

На парозе ў кухні з'явіўся Ромка — па-гаспадарску наваліўся на вушак і ўзбуджана сказаў:

— Дзядзь Саш? А дзядзь Саш? Пайграць можна?

Тут падала голас бабулька, яна пачула хлопцава пытанне і, пакратаўшы за рукаў дзядзьку Сашу, таксама папрасіла:

— Сыграй, мілы, сыграй! У нас колісь у хаце заўсёды весела было. Ляксей музыку любіў. Ён гармонік і на фронт забраў. Я яго папракаць: Лёша, сынок, куды ж ты ношу такую, замінку такую? Ці ж будзе табе там калі іграць? А ён смяецца: згодзіцца, мама, згодзіцца. Ну, ды ён і там знойдзе сабе час, ён такі... Дык і Коля таксама любіў... Сыграй, мілы, сыграй.

Дзядзька Саша пільна ўгледзеўся ў старую і пачуў яе. У роздуме павярнуўся, паглядзеў Ромку ў вочы, сказаў нягучна:

— Давай, праўда, сыграем, Раман.— І дадаў: — Нясіце інструменты.

У пакоі прыціхлыя было хлопцы адразу загаманілі, загрукалі крэсламі, выйшлі ў сені па трубы. Падалі і дзядзьку Сашу яго чорны чахол, і ён следам за Пелагеяй пайшоў у святлічку. І старая прычыкільгала, села ўбачку каля акна. Дзяўчаты паспешліва рассоўвалі да сцяны стол, крэслы, вызвалялі месца пад танцы.

— Ты што ж, Сім, так і будзеш у трэніровачным касцюме?

— А што? Гэта ж шэйк! Вунь і Вера ў халаце.

— Я не буду,— сумелася Вера.— Я не ўмею такіх.

— Ну што ты! Што тут умець. Хадзем, хадзем, я таксама туфлі абую.

І дзяўчаты схаваліся за фіранкаю.

— А ты чаму не ўзяў інструмента? — дзядзька Саша пакасіўся на Сохіна, які ўбаку жаваў яблык.

— Ды я патанцую. Хопіць вам і аднаго альта.

— Ты мне якраз патрэбны. Ідзі вазьмі.

Сохін перасмыкнуў плячыма і незадаволена выйшаў.

Хлопцы, кожны са сваім інструментам, акружылі старшога, падрыхтаваліся і пазіралі, як ён расшморгваў на чахле завязку, як спакойна аглядаў свой чысценькі карнет. Рабіў ён гэта як ніколі ўрачыста, засяроджана, быццам нявідушчы. Папрыбіраныя дзяўчаты стрымана пераговорваліся, займаючы месцы каля Пелагеі, і тая спагадліва аглядала іх прычоскі і сукенкі.

Дзядзька Саша пастукаў пазногцем па карнеце.

Трубы замерлі ў гатоўнасці.

І, гледзячы ўніз, на свае пальцы, што ўжо ляжалі на клапанах, дачакаўшыся паўзы, ён абвясціў, раздзяляючы словы:

— Шапэн... Сапата... нумар... два...

Нейкі час аркестранты разгублена глядзелі на старшо-

га, вачамі, нематой сваёй нібы пытаючыся: якая саната? пры чым тут саната? Нехта здзіўлена шапнуў: «Чаго гэта ён?» Дзяўчаты таксама пераглянуліся. І толькі Пелагея, нічога не зразумеўшы, усміхалася і радасна чакала музыкі.

Дзядзька Саша зноў пастукаў па трубе:

— Іграем частку трэцюю. Вы яе ведаеце.

— Ну, ведаем, канешне...— стрымана кіўнуў за ўсіх Ромка.

— Папрашу ўважлівей.

Ён яшчэ раз агледзеў аркестр.

— Пачалі!

І, усё яшчэ не разумеючы, спадзеючыся, што адбылася памылка, аркестранты з нейкай наканаванай непазбежнасцю грымнулі сі-бе-мольны акорд, нізкі, цягучы, як глыбінны падземны выбух.

Пелагея, для якой словы «саната», «Шапэн» абазначалі проста музыку, а значыць і весялосць, пры першых гуках скаланулася, як ад удару. Яна з разгубленай усмешкаю пакасілася на старую, але тая толькі прыкрыла вочы і выгаднейй паклала адна на адну раматусныя сухія рукі.

Дзядзька Саша кіўком галавы ўхваліў уступ і зрабіў знак паўтору. Хлопцы ўсе разам перавялі дух і ўзялі крыху вышэй ужо больш упэўнена, захоплена паўтарылі гэтыя басавыя ўздыхі медзі. Ён бачыў, як Іван-Бейны, што ўладкаваўся ззаду астатніх, старанна надзьмуў шчокі і ўтаропіўся ў адну нейкую далёкую кропку. Побач з ім маленькі круглатвары Сева, даючы адлік тактам узмахамі калатушкі, выбіваў цяжкі павольны поступ жалобнага марша. І Пашка з яшчэ не прасохлымі пасля дажджу ўскалмачанымі валасамі тураваў яму талеркамі, якія ўсплёскваліся сярод басоў і барытонаў трывожным медным звонам.

Гукі пакуты цяжка біліся, стагналі ў цесны свяцёлцы, удараліся аб сцены, у шыбы, што палахліва падрыгвалі.

Калі была сыграна басовая партыя, ускінуліся адразу тры бліскучыя карнеты, якія напоўнілі пакой пяўцешным плачам.

Прыбраныя дзяўчаты апусцілі вочы долу, разглядаючы свой абутак, бязвольна апусціла плечы Пелагея, і толькі старая, трымаючы цёмныя рукі на каленях, сядзела нерухома і роўна. Шэры яе твар, увесь у зморшчынах, заставаўся спакойны, і можна было падумаць, што яна заснула пад музыку і зусім не чуе гэтага плачу трубаў у яе драўляным удовіным доме. Але яна чула ўсё і цяпер, адышоўшы далёка ад іншых і ад самой сябе, затоена і дабратворна

убірала ў сябе гэты смутак і гэтую журбу параненай душы невядомага ёй Шапэна такім самым раненым сэрцам маці.

І дзядзька Саша прыгадаў, што менавіта пра гэтую вялікую санату хтосьці, таксама вялікі, сказаў, што смутак у ёй не па адным толькі героі, што загінуў. Тут такі боль, быццам загінулі воіны ўсе да аднаго і засталіся толькі дзеці, жанчыны і старыя, якія журботна схілілі галовы перад незлічонымі ахвярамі...

І тут Вера, упучка, раптам закрыла рукамі твар і кінулася за фіранку.

Дзяўчаты таксама ўсталі і адна за адной, ступаючы на пальчыках, пайшлі да яе. І як праліваецца апошні дождж пры ўмытым сонцы — ужо без хмараў і важкіх раскатаў грому,— так і дзядзька Саша павёў мелодыю на сваім карнеце ў ціхім суправаджэнні адных толькі тэнараў: без літаўраў, басоў і барабанаў.

Гэта было такое высокае сярэбранае сола, што, супакойваючы, гучала і пяшчотна, і ўсхваляванa, і выплакана, і прасветлена.

Хлопцы з-пад басоў і барытонаў ужо вызваліліся ад ігры і ў немай зачараванасці сачылі за гэтым незвычайным дзявоча-чыстым спевам карнета. А ён гучаў усё цішэй і цішэй. Смутак нібыта раставаў, танчэў, і калі ён вычарпаўся зусім, завяршыўся быццам бы лёгкім уздыхам і ператварыўся ў цішыню, дзядзька Саша адняў ад вуснаў мунштук. Бледны, спацелы, ён паспешліва, амаль непрытомна палез у кішэню па хусцінку. Ён чамусьці вырашыў не вяртацца да басовага пачатку, які ў Шапэна паўтараўся ў самым канцы шэсця. Відаць, яму не хацелася заглушаць святло гэтай супакойнай і ачышчальнай мелодыі цяжкай эпітафіяй.

І калі ён выцер твар і хутка, стомлена пачаў зачахляць трубу, у свяцёлцы ўсё яшчэ маўчалі. Было толькі чуваць, як зрэдку ўсхліпвала за паркалёвай фіранкаю Вера.

Старая нарэшце ўстала і, адхіліўшы рукою Пелагею, якая кінулася была падтрымаць яе, пакульгала сама, шоргаючы падшытымі валёнкамі.

— Ну, вось і добра...— прамовіла яна.— Добра сыгралі... Вось і праводзілі нашых... Дзякуй.

І, спыніўшыся пасярэдзіне пакоя, перахрысцілася на покуць.

Аркестранты моўчкі закурвалі.

Яны ішлі да гасцінца беспрасветным начным бездарожжам. Усё, як і раней, ліў і вызвоньваў на трубах халодны нябачны дождж, усё яшчэ груздлі і раз'язджаліся мокрыя чаравікі.

Праходзілі праз набрынялыя вадою нізіны, праз глухія ўзараныя палі, праз сонныя вёскі, адкуль павявала апалым садовым лісцем і рэдкім дымком з печак. Нідзе ўжо не было ні агеньчыка, і толькі пядрэмныя вясковыя сабакі, патрывожаныя чмяканнем ног на дарозе, брахалі, аж захлёбваліся з глыбінь сваіх двароў.

Ішлі моўчкі, засяроджана, перакідваючыся рэдкімі словамі, і старшой чуў блізка, адразу ж за сабою, цяжкае і ўпартае дыханне строю.

Як тады, у сорак трэцім...

І дзядзька Саша, прытрымліваючы рукою сэрца, што цяпер нечакана разбалелася і глуха ныла, хоць яно даймае наогул яго ўсе апошнія гады, гучна падбадзёрыў аркестр:

— Нічога, хлопцы, нічога. Хутка датупаем...

## Юрый Трыфанаў

# СМЕРЦЬ У СІЦЫЛІІ

Што можна зразумець за некалькі дзён у чужой краіне? Ці можна здагадацца пра тое, як жывуць людзі? І як паміраюць? Вось ужо тыдзень я разглядаю Сіцылію як у павелічальнае шкло. Я мог бы сказаць: Сіцылія — гэта гарачы пакой з вокнамі на мора, дзе з самай раніцы трэба апускаць жалюзі, бо неўзабаве не будзе чым дыхаць. Але ў другой палове дня ў Сіцыліі можна цярпець, бо сонца адыходзіць на другі бок дома. Ноччу ў Сіцыліі несціхана грукоча мора, яно побач, пад балконам, пад скаламі. Спачатку ад шуму мора не спіш, потым прывыкаеш. Цяжэй прывыкнуць да траскатні рыбацкіх лодак, яны чамусьці асабліва бойка і аглушальна трашчаць ноччу, гойсаюць паблізу берага, але жыхары не пратэстуюць. Яны любяць есці рыбу. А без начной траскатні матораў рыбы, відаць, не бывае. Гадзін з шасці вечара ў Сіцыліі ўсталёўваецца цудоўная прахалода і яснасць у паветры — выразна відаць уся вялізная сінеблакітная затока, керамічны схіл гары на процілеглым баку і далекаватая вяршыня на небасхіле, якая бялее трохвугольнікам, як ветразь. Жыхары Сіцыліі размаўляюць на англійскай і нямецкай мовах, ходзяць па вестыбюлі босыя, у купальных халатах, паказваючы голыя, не вельмі прыгожыя ногі: пераважна яны людзі пажылыя. Ноччу над морам вісне чырвоны месяц, і тады ўспамінаеш, што побач Афрыка.

Кажуць, што сезон закончыўся. У жніўні тут было ўсё па-іншаму. Тут было шмат людзей, шумна, дарага, пакутліва горача, невыносна. Я здзіўляюся: яшчэ больш пакутліва? У Мандэла, рыбацкай і адначасова курортнай вёсачцы за дванаццаць кіламетраў ад Палерма, адбываецца сустрэча пісьменнікаў, прысуджэнне мясцовай прэміі, так званай прэміі Мандэла, і дыскусія на нейкую імпазантную тэму. Нешта накшталт аб гарызонтах прозы. Я ўпаў у гэты гарачы пакой з рыпучымі жалюзі — калі іх падымаеш,

яны, патрэскваючы, чамусьці павольна, але пяўхільна спаўзаюць уніз, выклікаючы ўражанне невядомай жывой істоты, магчыма, таямнічай рыбы з акіянскага дна, якая выкінута на бераг, прыбіта да майго акна і дажывае тут апошнія хвіліны,— я ўпаў сюды проста з маскоўскага аэрапорта, дзе было холадна, хмарна і ліў дождж.

Калі пісьменнікі збіраюцца разам для размовы на ўзвышаныя тэмы, напрыклад, аб тым, што азначае мастацтва і навошта яно патрэбна, яны звычайна гавораць агульнавядомае. Рэдкія каштоўныя думкі, якія ёсць у кожнага, яны стараюцца прыберагчы для паперы. Я таксама гаварыў агульнавядомае. Наконт таго, што раман не памёр і не памрэ ніколі. Пісьменнікі пяцідзесятых, шасцідзесятых і сямідзесятых гадоў на ўсіх сваіх сустрэчах абараняюць раман, гэта нейкім чынам пісьменніцкая малітва, абавязковая, як «Pater noster» перад сном у каталіка, і я вырашыў не адставаць ад другіх. Дрэнна ўяўляючы сабе, хто менавіта нападае на раман і пагражае яму пагібеллю, я цвёрда і недвухсэнсоўна заявіў злачынцам, што яны гэтага не дачакаюцца. Раман будзе жыць! Нельга дапусціць, каб раман знік з нашага ўжытку. А як жа людзі будуць бавіць час у прамежках паміж тэлевізійнымі перадачамі? І яшчэ я сказаў, што людзі, якія абвясцілі аб крызісе рамана, уяўляюць сабе гэта нечым накшталт нафтавага крызісу: як нафта канчаецца ў нетрах зямлі, так уяўленне знікае ў розумах чалавецтва. Прыйшлося стаць на абарону не толькі рамана, але і чалавецтва. Я сказаў, што ўяўленне людзей невычэрпнае. Са мной не спрачаліся. Усе гаварылі прыкладна тое ж самае. Пад канец я заўважыў, што мяне цікавяць не гарызонты прозы, а яе вертыкалі.

Увечары, спусціўшыся ад нашага атэля, які стаіць на пагорку і на мысе, па вузкай набярэжнай да плошчы, дзе ўсё асветлена, як у свята, дзе кавалкамі прадаюць васьміногаў, дзе бадзяецца гультайскі натоўп, дзе пясмела гудуць аўтамабілі, што завязлі ў натоўпе, як у смале, дзе густа вісіць у паветры вострый смурод рыбы, як у гастраноме каля «Сокала», калі туды прывозяць у грузавіках-халадзільніках сырую рыбу і п'яненькія рабочыя пхаюць па жолабе ў падзямелле цяжкія скрынкі, у якіх трапечуцца хвасты, а гаспадыні з сумкамі ўжо становяцца ў чаргу каля прылаўка,— і вось, гуляючы па набярэжнай, дзе нічога, акрамя паху рыбы, не нагадвае вуліцу каля метро «Сокал», я думаю пра тое, пра сёе, напрыклад, пра прыем-

нае адзінства, якое папуе паміж пісьменнікамі: ніхто адзін з адным не спрачаецца і ўсе гавораць агульнавядомае. Я стараюся думаць пра тое, пра сёе, але на справе мяне мучыць адна подлая задняя думка. Рашэнне прымуць праз дзень. Прэмія Мандэла ўручаецца штогод за самую лепшую кнігу замежнага аўтара. У мінулым годзе тут выйшлі дзве мае кнігі: маскоўская трылогія «Доўгае развітанне» і «Дом па набярэжнай». Ну і выдатна. Навошта ж яшчэ прэмія? Тое, што кнігі выйшлі, гэта і ёсць прэмія. І тое, што я ўпаў па гэты востраў паблізу афрыканскага ўзбярэжжа, таксама прэмія. Не трэба пра яе думаць. Яна не патрэбна. Не, патрэбна, вядома, але ў той жа час не патрэбна. Патрэбна і не патрэбна разам, адным зліткам. Недарэчна пра яе думаць. Чалавек не можа сябе прымусіць не думаць пра глупства. Нейкае блюзненне: ідзеш цудоўным трапічным вечарам у натоўпе каля мора, сярод пахаў сырой і смажанай рыбы і не можаш адкараскацца ад глупства! Ты ж на востраве фінікійцаў, карфагенян, рымлян, арабаў, астготаў, нарманаў, Рожара Спулійскага, крывавай Сіцылійскай вячэры, але не можаш ні на чым засяродзіцца, цябе разбірае мука, ты пакутуеш праз пустое, і ты больш няшчасны за любога ў гэтым натоўпе, каму нічога не пагражае. Але справа вось у чым: яны мяне завабілі. Сказалі, што прэмія забяспечана, але трэба абавязкова сюды прыехаць. Божа, ды я паехаў бы з радасцю без усякай прэміі! Яна не патрэбна мне задарма. Я іх ненавіджу. Усялякая прэмія глупства. Адпак подласць у тым, што глупства — неадчэпнае. Цяпер адны мяне віншуюць, другія шэпчуць, што яны з колаў, блізкіх да журы, даведаліся, што прэмія будзе выдадзена чэху, які жыве ў Парыжы, а трэція глядзяць на мяне з маўклівай і патаемнай спагадай, як на хворага, які асуджаны, але яшчэ не ведае свайго лёсу. Усе нервуюцца куды больш, чым я. Я не разумею, як трэба сябе паводзіць. Напэўна, я павінен паводзіць сябе як чалавек, які напружаны і ўзвінчаны да крайнасці, але мужна валодае сабой. Вядома ж, справа ідзе аб прэміі Мандэла — не жартачкі! Тут, у Мандэле, гэта прэмія гучыць выдатна. Праўда, у Рыме пра яе мала хто чуў.

Мяне аклікае чалавек, якога завуць Маура. Ён з рымскай газеты. Ён таксама глядзіць на мяне як на хворага, пра якога толькі што даведаўся кепскае ад доктара, але доктар наказаў не паказваць выгляду, і Маура весела пытае: ці не хачу я шклянку віна? Мы сядаем за столік пад

адкрытым небам. Маура невысокі, пляччсты, кароткашыі, усмешлівы, з астматычнай задышкай. Ён пытае: што мяне цікавіць у Сіцыліі? Ці не збіраюся я паехаць у Сіракузы? У Агрыджэнта? Наведаць катакомбы капуцынаў у Палерма, дзе спачываюць зусім як жывыя набальзаміраваныя мерцвякі? Там ёсць дзяўчынка двух гадоў. Разалія Ламбарда, яна ўражвае дзівосна жывым тварам. Я разумею Маура. Ён добры чалавек. Але ў Сіцыліі мяне цікавіць іншае — мафія. І гэта якраз тое, пра што нельга даведацца і што нельга ўбачыць. Тут не любяць гаварыць пра мафію. У Палерма я спрабаваў размаўляць з рознымі людзьмі: яны адмоўчваюцца або паведамляюць што-небудзь усім вядомае. Па іх намёках атрымліваецца, што мафія іспуе, але вырадзілася і размаўляць пра яе нецікава. Маура, задыхаючыся, пасміхаецца.

— Чаму вы шукаеце яе тут? Ды яна ўсюды. І ў навукі, і ў літаратуры. І ў складзе журы. І вы самі мафія.— Ён торкнуў у мяне пальцам і падміргнуў.

— Не,— кажу я.— Я не мафія.

— Не? Ну няхай сабе. Тады не вы, а я.— Ён торкнуў пальцам у сябе.— Я мафія.

Мы размаўляем па-англійску і разумеем адзін аднаго, таму што размаўляем дрэнна. Міма праходзіць жанчына ў чорнай шаматкой сукенцы, у карункавай чорнай хустцы, якая закрывае твар — я заўважаю толькі доўгі нос і чорнае вока, што прамільгнула ў сіняватым бялку і здалося мне вогненным,— і робіць Мауру прывітальны знак абыякава, як добраму знаёмаму. Жанчына аддаляецца, пахістваючы клубамі. Відаць, яна маладая, прыгожая. Маура падхапіўся і пабег яе даганяць. Ён дагнаў яе каля аўтамабіля. Яны размаўляюць. Жанчына азіраецца на мяне. Мне відаць худы, з упадзінамі твар старой і востры, зіхатлівы позірк. Аўтамабіль пачаў праціскацца праз натоўп, выруліў з плошчы, знік.

— Я ведаю яе,— гаворыць Маура.— Яна таксама піша кнігі — гісторыі пра каштоўныя камяні. Нешта падобнае да thrillers. Я браў у яе інтэрв'ю ў газету тры гады таму назад.

— Яна не мае адносін да мафіі?

— Магчыма. Усе маюць адносіны да мафіі.

Ён здзекуецца. Але раптам гаворыць сур'ёзна:

— Ведаеце, што такое мафія? Яна як гэтыя горы. Вы цяпер іх не бачыце, яны закрыты цемрай, але вы ведаеце, што яны ёсць. Яны акружаюць горад.

Я гляджу туды, дзе павінны знаходзіцца горы, там непраглядна чорна, без агнёў, без зорак.

Назаўтра Маура гаворыць, што ўчарашняя дама — яе завуць Маргарыта Мадалоні — запрашае нас на кубак кавы а пятай гадзіне. Яна любіць рускую літаратуру, сама размаўляе па-руску. І наогул яна руская. У спякотнае паслябеддзе, калі пакой з апушчанымі жалюзі нагадвае душную, не прыдатную для жыцця камеру, я ляжу пластам голы ў прыцемку і не магу ні чытаць, ні спаць, прыязджае на сваім арандаваным «фіяце» незразумелы Маура — навошта ён са мной так валаводзіцца? Я скачу пад душ, хутка адзяюся, і мы едзем у горы. Трэба праехаць кіламетраў пятнаццаць на захад. Мора ляжыць унізе сляпучае і пустое. Рэдка сям-там бялеюць лодкі. Няўжо на гэтай абвугленай керамічнай скале можна пражыць усё жыццё? Сіньёра Мадалоні жыве ў старажытным замку, які, зразумела, перабудаваны і прыстасаваны для жыцця. Яго заспавалі нарманы, потым ён быў разбураны ў час апошняй вайны і цалкам адбудаваны нябожчыкам сіньёрам Мадалоні, прамыслоўцам і суднаўладальнікам. Сіньёр памёр адзінаццаць гадоў таму назад. Вось з таго часу ад тугі і жаху перад адзінотай яна пачала пісаць кнігі і напісала восем раманаў. Яе заўсёды цікавілі каштоўныя камяні, але не як багацце, а як містычная сіла, што кіруе лёсам людзей. Кожны знакаміты алмаз хавае дзівосныя сюжэты, з ім звязаныя. Адзін з раманаў прысвечаны Расіі, імператрыцы Кацярыне і графу Арлову.

Мы сядзім на верандзе на зацененым баку дома. Смуглявы, з кучаравымі бачкамі, у белых пальчатках Сільвіё прыкаціў каляску з напіткамі, садавінаю і пячэннем. Я папрасіў куфаль соку. Я не разумею, навошта мяне запрасілі. Пачынаецца размова аб гарызонтах прозы. Сіньёра Мадалоні гаворыць, што дыктуе раманы на дыктафон, потым іх крыху правіць. Па сутнасці, яны пішуць утраіх: яна, Сільвіё і дыктафон. Сільвіё запісвае тэкст з дыктафона, яна рэдагуе, на ўсю работу ідзе паўтара месяца. Затое якая пякельная падрыхтоўчая праца! Прыходзіцца ездзіць у бібліятэкі? У Палерма? У Неапаль? Не, не прыходзіцца нікуды ездзіць, у яе цудоўная бібліятэка, набытая мужам у саракавых гадах. Усё, што патрэбна, пад рукамі: даведнікі, слоўнікі, кнігі па гісторыі, геаграфіі, мінералогіі, актуальных навуках, алхіміі, мараплаванні. Дарэчы, мяне як рускага цікавіць, напэўна, рэвалюцыйная тэма: муж сабраў безліч кніг па гісторыі карбанарнага руху...

Мы спускаемся на ніжні паверх. Сільвіё ідзе ўслед, несучы паднос з напіткамі. Бібліятэка змяшчаецца ў круглай зале, пасярод стаіць вялізны старадаўні глобус, пра які я даведаўся, што ён з Венецыі, XV стагоддзе. Тут халадок. Мы сядаем у крэслы, а Сільвіё стаіць побач, трымаючы паднос. Яго смуглявы твар нерухомы. Ні ён, ні Маура не разумеюць, аб чым мы размаўляем. Але Маура з усяе сілы стараецца хоць што-небудзь зразумець, ён глядзіць на губы сіньёры Мадалоні, на мае, яго твар выказвае нямое і пачціваe захапленне.

— О, я нічога не разумею! — ускрыквае ён радасна па-англійску і ляпае сабе па каленях.— Але мне падабаецца руская мова!

Сіньёра Мадалоні гаворыць па-руску чыста, але з прымессю двух акцэнтаў: паўднёва-рускага і італьянскага, які выяўляецца хутчэй у інтанацыі, чым у вымаўленні. Па-паўднёва-руску яна хакае і гаворыць «бібліятэха», а па-італьянску мякка, напеўна прагінае сярэдзіну фразы. Чамусьці я доўга не адважваўся запытаць: хто яна такая і як трапіла сюды? Мне здаецца, гэта нясціпла. А яна не гаворыць. Як быццам звычайная справа: сустрэцца двaім рускім у Сіцыліі ў нейкім пірацкім замку...

Калі сіньёра ўстае і некуды выходзіць у суправаджэнні Сільвіё, Маура, нахіліўшыся да мяне, шэпча:

— She is very rich!

— Really?

— O! — Ён падымае вялікі палец.— О-о-о-о! — Маура абдымае галаву далонямі і пахіствае яе, даючы зразумець, што багацце неапісальнае, фантастычнае. І пасля гэтага з разгубленым выглядам махае рукой і ўздыхае.— O, my god!..

Сіньёра вяртаецца. Сільвіё ўрачыста, прыўзняўшы, нясе ў абедзвюх руках дзве сумкі з тоўстай паперы, напоўненыя нечым цяжкім. Гэта падарункі мне і Мауру: у кожнай сумцы па стосіку кніг у яркіх вокладках, абгорнутых у цэлафан. Мы атрымліваем па пяць раманаў Маргарыты Мадалоні. Сіньёра па-маладому ўзбіраецца ў крэсла з нагамі, яе поза свабодная, рухі элегантныя, лінія бядра крутая і выпуклая, яна трымае кубачак тонкай рукой, але твар сіньёры — высушаны, карычневы, у сетцы зморшчын, і толькі ззяюць вочы. І вось яна пытае: адкуль я? З Масквы. Яна не была ў Маскве. Так шкада, такая крыўда: пабачыла ўвесь свет і ніколі не была ў Маскве. Жыла ў Растове, у Новачаркаску, выехала ў дваццатым, ёй было тады сем-

наццаць гадоў і яна была прыгожая. Таму ўсё страшнае было яшчэ страшнейшае. Выдатна памятае тыя гады. Бацька быў стэпавы пан з казакоў, маці — актрыса. На поўдні ў дзевятнаццатым кіпела нейкае недарэчнае вясёлае жыццё, туды з'ехалася шмат цікавых людзей, артысты, пісьменнікі, выходзіў невялікі часопіс «Данская хваля». Рэстараны ў Новачаркаску былі поўныя. Усё ўжо трашчала і абрушвалася, але людзі не разумелі.

— Памятаю вершы тагачаснага паэта Віктара Сеўскага з «Данской хвалі». Божа мой, шэсцьдзесят гадоў мінула, а лухта помніцца! Калісьці паўтарала з захапленнем... Хочаце, прачытаю? — І, не чакаючы адказу, з запалам:

Аб дзецях Дона цяпер натхнёна,
Нібы з бітона, радкі пральлю,
Аб дзецях Дона, сын Апалона,
Прашу пардона, што так раблю.
Ў краі Маоры жыў я ў фаворы,
Забыўшы гора й лухту жыцця,
Тут у тэроры, крывавым моры,
Зладзейскі нораў пабыў і я...

Пародыя на Бальманта. Вы ведаеце, вядома, гэтае імя? Далей, прашу прабачэння, магчыма, вам будзе не вельмі прыемна слухаць, але ўсё гэта было так даўно, ці не праўда? Далей нешта такое:

Не жыць бы лепей нам пры саўдэпе.
Жывём мы ў склепе! Над намі крэп.
Мы ў голым стэпе, два сорак — рэпа,
Жыццё — капейка, трынаццаць — хлеб.
А там як казка, ў Новачаркаску!
Ў блакітным бляску жыццё кіпіць!
Хлеб — нібы ласка, жанчыны — краскі.
Там без апаскі магчыма жыць.
Любоў паэта! Рулет! Катлета!
І цыгарэты! І штось яшчэ...

Потым мы перабраліся ў Растоў. І не паспелі ўцячы, калі адступала армія. Мама яшчэ спадзявалася неяк прыстасавацца да новай улады. Бацька загінуў у васемнаццатым. Але прыстасавацца не ўдалося. У мяне закахаўся адзін грэк і вывез нас у Крым, адтуль у Батум. Мама памерла ад тыфусу. З грэкам я выехала ў Канстанцінопаль, потым у Салонікі, потым апынулася ў Берліне — ужо без грэка,— у трыццатых гадах жыла ў Парыжы, а з сорак пятага тут, вось ужо трыццаць тры гады...

Я слухаю з ашаламленнем — Растоў? Новачаркаск? Дваццаты год? Міронаў? Дуненка? Генерал Гніларыбаў? Гэта якраз тое, чым я цяпер жыву. Што было маім — пра-

маім — мінулым. І гэтая казачка, што ператварылася ў старую, кафейнага колеру сіньёру,— якім загадкавым, нябесным шляхам мы даткнуліся адно да аднаго!

— Мой бацька з Новачаркаска. Дзядзька вучыўся ў Атаманскім вучылішчы. Быў ваенным камендантам Новачаркаска ў дваццатым годзе. А цётка пражыла там усё жыццё.

— Ды што вы! На якой жа вуліцы?

— На Чырвонаармейскай. Раней называлася Ратная.

— Ратную добра памятаю. А ў якім доме?

— Я быў у яе толькі аднойчы, пасля вайны. Нейкі трухлявы флігельчык, на другім паверсе, а калісьці ўвесь дом належаў архітэктару Кокараву Сяргею Васільевічу, цётчынаму мужу. Ён, між іншым, дабудаваў сабор...

— Я вучылася з яго пляменніцай у гімназіі. Ён памёр, вядома?

— Памёр трагічна. Будучы ўжо старым, не мог рухацца, застаўся ў горадзе пры немцах. На яго ўзвялі паклёп. Там цэлая гісторыя. Ведаю толькі, што жанчына, якая ўзвяла на яго паклёп, сама аказалася здрадніцай і была расстраляна.

— Божа мой! — шэпча сіньёра.— Як бы я хацела адным вокам...

Яе твар моршчыцца, куткі рота апускаюцца, і мне відаць — на секунду — на гэтым індзейскім твары-масцы даўні, невылечны след гора. Яна зноў таропка выходзіць, прыносіць старую, дарэвалюцыйнага выгляду папку, развязвае тасёмкі, рукі яе дрыжаць.

— Усё, што засталося ад мамы...

— Можна?

— Паглядзіце...

Дзве пажаўцелыя фатаграфіі: на адной маладая дама з дзяўчынкай у белай сукенцы. Знаёмы дзяўчынчын празлівы позірк. На другой тая самая дама, прыгажуня, у тэатральным убранні, з пышнай высокай прычоскай. І нейкія паперкі, выразкі з газеты. Можна прачытаць? Можна. Гэта апошні захад у Растове, перад тым як паехаць у Крым. Тры папяровыя старажытнасці: «П а с т а н о в а. Дэкрэтам СНК ад 15 красавіка 1920 г. адменены ўсе пастановы, распараджэнні і правілы аб выдачы былым уладальнікам каштоўнасцей, што ім належаць, з пазыковай казны і сейфаў, якія дзейнічалі да выдання дэкрэта, а самі каштоўнасці аб'яўлены дзяржаўнай уласнасцю», «З а я в а. У сейфа-ламбардную камісію. На квітку скрынкі сейфа

Таварыства ўзаемнага крэдыту за № 1025 у мяне знаходзяцца: адзін срэбны сервіз і адзін кулон з брыльянтам. Я артыстка музычнай драмы і аперэты, і рэчы гэтыя дарагія мне як бенефісныя падарункі, а пры неабходнасці як сродкі для існавання жыцця, а таму пакорліва прашу выдаць мне. Артыстка і сапраўдны член прафсаюза Е. С. Малышава», «С в е д ч а н н е. Я ведаю кулон з брыльянтам, з адным маленькім падвескам, які быў паднесены ў г. Тыфлісе ў 1916 г. у дзень бенефіса Е. С. Малышавай у летні сезон у т-ры Артыстычнага Таварыства. Артыст кааперацыўнай мастацкай аперэты Давыд Сафронавіч Давыдаў».

— Мілы мой,— сіньёра Мадалоні накрывае маю руку сухенькай далонькай,— ваш бацька быў на другім баку. А дзядзька, камендант Новачаркаска, мажліва, праследваў майго брата. Усё гэта гісторыя... І яна мала каму цікавая — мне, вам... Але самае страшнае ведаеце што? — яна глядзіць унутр мяне пранізлівым бяссільным вокам.— Смерць у Сіцыліі...

Ртутным бляскам гарыць чорная зорная ноч.

Я зноў не сплю з-за траскатні рыбацкіх лодак. На другі дзень за снеданнем знаёмы паляк, які заўсёды пад чаркаю, радасна кідаецца да мяне: «Я вас віншую!» Праз гадзіну робіцца вядомым: прэмію атрымаў чэх з Парыжа. Мы сядаем у аўтобус і едзем у Палерма на прыём да мэра. Пасля мэра паедзем глядзець мерцвякоў у катакомбы капуцынаў. Тут усе ганарацца гэтымі катакомбамі, дзе мерцвякі стаяць у позах жывых людзей у сваім струхлелым адзенні. Бедная спроба ашукаць смерць. Але нельга ашукаць тое, што самае страшнае ў свеце,— смерць у Сіцыліі. Аўтобус дасягае белых дамоў Палерма, яны здаюцца сляпымі з-за апушчаных жоўтых жалюзі. Аўтобус павяртае на вуліцу, абсаджаную пальмамі. Сонца плавіць асфальт. Маура, які сядзіць побач, падсоўваецца і шэпча:

— Паглядзіце на гэтую вуліцу ўважліва. Дзесьці тут ляжыць Раберта Мадалоні. Я ўчора не сказаў? — шэпча зусім нячутна: — Яе муж быў адным з верхаводаў мафіі. Адзінаццаць гадоў таму назад ён знік. Кажуць, ляжыць тут, пад асфальтам гэтай вуліцы. Але, зрэшты, ніхто дакладна не ведае.

*1981*

# Віктар Ліханосаў

## БРАНСКІЯ

Увосень на сяле цямнее рана, усё прыкметней карацее дзень. І такая запусцелая цішыня тады вакол іх хаткі, што стаіць на гары, высока над нашаю нізінаю, у акружэнні лесу, адкуль завідна бачыцца ўсё кучаравае рабое наваколле.

Пакуль я мінаю памярцвелае поле, скачу па камянях і па мелі цераз рэчку, пакуль кружляю, апускаюся і падымаюся па хутарской дарозе міма хатак і лесу, што ўзбіраецца на горку, пакуль паволі іду, хаваючыся ў густой сцежцы, атрасаючы з голля на плечы, на галаву асенняе лісце, і выходжу да іх хаты на святло акенца,— ужо полагам сцелецца ноч, такая пустая, пахаладнелая, і над нізінаю, на тым баку, павісае цяжкі чырванавата-смуглявы месяц.

Так добра ў іх, такая любата ісці цераз двор, агароджаны штакетнікам, зноў бачыць карову пад шаўкоўніцаю, бабулю на ўслончыку з даёнкаю, дзеда на зямлі, змoранага за дзень на пашы, здаровацца, садзіцца побач або валіцца спіною на траву, бачыць густа ўсыпанае зоркамі неба, а пасля браць вядзерца і, некалькі разоў ступіўшы, нагінацца пад голлем, намацваць сцежку да крыніцы каля белалісткі і, чэрпаючы ваду, удыхаць сыры пах спадыспаду.

Здаецца, ніколі не пакінуў бы гэтай мясціны, ні на якае гарадское хараство не памяняў бы гэтай цішыні і адзінокасці лесу, іх пакоя з кіслым пахам, з двума акенцамі на гарод і ўніз, на даліну.

Калі я іду да іх, заўсёды думаю, што згадзіўся б купіць у іх гэтую хату і пажыць на адзіноце хоць бы да вясны, пакуль што-небудзь не пераменіцца і пакуль не наспяцца ў тужлівыя ночы іншыя мясціны.

Але ўсяго ў жыцці не прадбачыш, і вось іду я да іх гэтаю восенню апошні раз — пап'ю малачка, пачастую дзеда цыгарэтамі, напішу пад дыктоўку пісьмы іх дзецям. І ўсё.

Знаёмыя мы даўно, гаварылі ўжо мала, скупа, і ўсё роўна мне ўтульна бываць у іх. Бо мы амаль свае, і ўсё нам зразумела адным у адных. Я звычайна сяджу і нейк удзячна-радасна гляджу на бабулю: як яна цэдзіць у збанок вячэрняе малако, зрэдчасу абзавецца пра дзень, пра пісьмы, то пасмяецца, то памаркоціцца, то здзівіць слоўцам бранскім, а дзед дрымотна вычэквае на ложку, бясконца чадзіць махоркаю і пра нешта думае.

— Пра што думаеце, Цярэнцій Кузьміч?

— Ні пра што, Іванавіч,— проста адклікаецца ён.— Ні пра што.

Яму семдзесят чатыры гады, ён сухарлявы, далікатны з твару, вочы сінія, былі дзіцячыя, але яны стомленыя, ужо векавыя. Родам ён з Браншчыны і толькі пяты год, як прыехаў на Кубань — спачатку пагасцяваць да дачкі-ўдавы, але потым, агледзеўшыся, астаўся назусім. І да гэтага часу не выпускае з рук пугі, пасе калгасных кароў, ганяе іх увесь дзень па найлепшых мясцінах, абедае каля рэчкі, пакуль каровы стаяць да чэрава ў вадзе, а старая сядзіць побач, падсоўвае яечак, гуркоў, адубелае бульбы.

Рэдка і неахвотна расказвае ён пра Браншчыну.

— Добра жылося там?

— Туга, Іванавіч. Туга. Апошнія гады вось палягчэла.

— А на Кубані?

— Падабаецца. Падабаецца, Іванавіч.

Два гады хадзіў да іх, прывучалі, як сына, казалі: нагадваю ім нечым малодшага Мішу, нават рука ў яго такая самая «кашчэлая», і есць ён таксама мала, і гаворыць ціха, і ўвогуле вельмі мы з ім падобныя.

— Ды вось ён, от зірні — падводзіць бабуля да картачак на сцяне.— А гэта самы старэйшы, брыгадзірам у Юраве. Летась не паяўляўся, пазалетась быў на пакровах. Гэты настаўнічае там, у вас, у Сібіры. Гэты чыгуначнік у дэпо. А гэта дачка мая, яшчэ дзяўчынаю, у Бранскім на заводзе. Я кажу: ці даўно за мацерыну спадніцу трымалася, а цяпер у самое дзеткі. І мы са старым увесь век думаем пра іх, дзе яны там, ці не хварэюць?

Яны радыя кожнаму стрэчнаму, кожнаму прыхожаму, пагаворацца колькі ўлезе, усё жыццё сваё перакажуць. Цягучыя і дажджлівыя на поўдні зімовыя ночы, не спіцца, стогне пад мокрым ветрам лес, ліе пад парог з даху, і стары ўжо пачынае тужыць па вясне, па працы.

А то як-небудзь пад вясну зазірнуць да іх госці з ста-

ніцы. Тады бабуля замітусіцца, забегае, дакарадь пачне: чаму ж яны раней не прыйшлі, яна і хлеб свой пякла — такі свежы быў, а цяпер ацеслівы,— і яечак колькі было, і тварог, і смятана, а сёння і пачаставаць няма чым. А сама бяжыць у скляпок, цягне паўвядра гуркоў салёных, памідораў, дастае кілбаскі, запальвае керагаз, торкае старому кашулю «пад бараду» і мытыя штаны, ён выходзіць за дзверы і там пераадзяецца, доўга яго няма, потым запаяўляецца, моўчкі ставіць пляшкі на стол, налівае і запрашае:

— Ну, падымайце. Будзем жывы. На тым свеце не дадуць.

Госці так загаворваюцца, што і аставацца пара, але не, заўтра клопату многа. Бабуля з дзедам праводзяць іх уніз да дарогі і развітваюцца.

— Ну, не крыўдуйце, госцейкі дарагія, можа, што і не гэтак, але чым багатыя, тым і радыя.

— Што ты, што ты, цётка Дуня, дзякуй, добра пасядзелі.

— Заходзьце яшчэ.

— Заходзьце вы цяпер да нас.

— Будзем жывы — зойдзем,— абяцае дзед.

— А то аставаліся б,— просіць бабуля.

— Ды не ўжо, там дома кароўка, гаспадарка.

— А месяц які!

Месяц высока-высока, і лясная дарога, па якой яны вяртаюцца дадому, дыміць бледным паўночным святлом.

І толькі задрэмле стары, як нацягнецца трэцяя гадзіна ночы, шарэе ў акне двор — пара і ўставаць. Глядзіш, бабуля ўжо поркаецца на дварэ, быццам і не клалася, чуеш праз дзверы яе хаду і гамонку. Дзед спускае ногі на падлогу, скрабе, чухае пальцамі грудзі, адчуваючы ўсярэдзіне чадны асадак курыва, шукае вады, п'е, моцна і часта кашляе, доўга ўсцягвае, быццам прымярае, боты, закурвае нашча і выходзіць на двор.

Раніца яшчэ дрэмле, яшчэ песціцца, але ўжо прачынаецца, неахвотна раствараецца цемра. У такія раніцы я быў з ім не адзін раз і вельмі радаваўся прабуджэнню да світання, калі чакаеш, пакуль не забялеюць скрозь зелень сцены хат, калі ўсе пахі лесу і поля адстаяліся і свежа, непаўторна церпка пахнуць на сцежках, калі яшчэ сырая дарога і выразныя на ўсходзе і мутнавата-мяккія на захадзе краі гор, калі яшчэ дажывае сваё паўночнае жыццё і ўжо пачынаецца новае, калі нікога, апрача цябе, няма,

хіба што затарабаніць падвода ўнізе, праедзе, разваліўшыся ў возе, мужык, і зноў нікога. Толькі пабялее, мы ўжо з косамі, чуткі шорсткі звон, халодны росны бляск сталі, па целе разліваецца цяпло, ужо хочацца піць, і, стаўшы на калені, падаеш тварам да крыніцы, разгінаешся, охаеш, чуючы прысмак лісця ў роце. А неба ўсё бялее, бялее, і ўжо крычаць на тым баку каля магазіна галасы: прадавец збіраецца ў нядзелю на кірмаш у станіцу.

Ехаць мне ўсё жыццё ў вёску, ехаць і вяртацца, ехаць і вяртацца. І ўжо ніхто не пераменіць ува мне гэтага жадання, ніхто не спыніць.

— Іванавіч, не адставай! — гукае дзед і шырока запускае касу ў траву.— У-ух!

Толькі мы дакошваем, ідзе, касалапіць да нас вартаўнік Гаўрыла, рабы, касавокі, несусветны гультай.

— Косіце? — пытаецца ён заспана.

— Пазнавата вартаваць ты выйшаў,— кажа дзед.

— Абышоў з Гудзімавым укруга склада, Гудзімаў коней выгнаў, гаворыць: я па той дарозе пайду.

— Вось як людзі хлусіць прывыклі,— абураецца дзед ужо дома за чаем.— Спаў жа, рабы, усю ноч. А яшчэ ў калгасе кіраваў. Га? Турнулі, хопіць, нагаварыў прамоў, праўда, праўда, нагаварыў — хопіць. А я ж, Іванавіч, не паверыш, увесь век працую. Увесь век на нагах, досвета ўставаў.

— А ці хутка адпачываць будзеце?

— Ды вось да снежня, як травы не будзе. Вясною зноў. Восень сёлета моцная.

Восень добрая, ужо лістапад, яшчэ светлыя далечы, яшчэ сонца жаўціць наваколле, і нават не верыцца, што на Бранішчыне цяпер снег, белыя прасторы, ездзяць цяпер на санях па дровы, хутка астываюць хаты, а раніцаю з кароўнікаў валіць пара. Да Бранішчыны цяпер так далёка, і ўсё жыццё там асталося, і, як ні кінешся ўспамінаць, адно лезе ў галаву: хата каля калодзежа, поле да лесу, дзеці, бабуля, якая незаўважна старэла, і каровы, каровы, каровы...

— Іванавіч! — гукае дзед.— Малады ты яшчэ, а мы час пражылі.

Малады я яшчэ, але блізкія мне словы яго: я вырас сярод такіх, і мама мая такая, і суседзі былі такія, і заўсёды я буду прывязаны да іх.

— А што, Іванавіч,— сказаў ён апошнім разам,— колькі мы з табою знаемся, а яшчэ і не выпілі.

«Ой ты, чорт вазьмі,— думаю я,— як жа мы яшчэ не выпілі? Як жа гэта я забыўся, што выпіць з такім дзедам — адна ўцеха?»

І вось я іду, у сумцы віно, вып'ем, пасядзім, але ўжо напаследак.

— Мы думалі, ты ўжо паехаў,— сустракае бабуля.

— Добрага здароўя, Іванавіч,— кажа дзед.— Закурым? Дай закурыць, Іванавіч.

Бабуля садзіцца пад карову, ласкава ўгаворвае яе стаяць.

— Зорка, Зорка, стой, стой. Зорка, Зорка, стой. Зорачка, стой. Дзед, вазьмі адгані камароў.

— Ды адкуль яны?

Потым мы садзімся за стол.

— Успамінаць будзеш? — пытаецца дзед пасля першае чаркі.— Мы цябе часта ўспамінаем.

— Пісьмо хоць якое прышлі,— просіць бабуля. Ды ты закусвай, закусвай добра.

— Іванавіч,— лопае дзед далонню пасля другое чаркі,— дзе ні будзеш — заходзь. На Новы год заходзь, япрука павалю. Напраўду, Іванавіч.

— Закусвай, закусвай.

— Старая,— крычыць ён, захмялеўшы,— давай песню загукаем!

Бабуля развязвае касынку, горача ёй, і такая яна цяпер проставалосая, сардэчная, як усе вясковыя жанчыны, калі вып'юць.

Солнце ни-изко, вечер бли-изко...

— Пачакай.

— Ну, ну, пачні...

Дзед апускае локаць на стол, падпірае галаву, пачынае сіплым голасам.

Бачыцца мне поле, і па ім, па далёкім полечку, тры розныя дарожкі. Ідзе хлопец да дзяўчыны, ой, і чаго ён ходзіць так позна?..

— Гэта даўнейшая песня,— заўважае бабуля, перадыхаючы.— Калі Мішу нашага праводзілі, я гукала.

А девчонка да и никакой, ох, и никакой славушки
не боится, ждет у двери:
ах, попочуй, друг, со мной, попочуй, друг, со мной
да хоть почечку,
а я — я, девка молодая, я зарями встаю,
тебя рано сбужу...

— Іванавіч! Ня крыўдуй! Ня крыўдуй, Іванавіч!

— Ды ну!

— Ня крыўдуй, Іванавіч.

Віно, песня, дзедавы словы, апошні вечар, ноч зябне ў лесе — журботна мне. Вось паеду, буду да пары да часу гуляць па горадзе, і раптам сумна мне стане, туга па прасторы і дарогах страпянецца ўсярэдзіне, і ўспомню я і дзяўчат па ферме, і раннія вогкія раніцы, і дзынканне званочкаў у кароў на шыях, і пах куфаек у клубе, дзе дзеўкі хіхікаюць, калі цалуюцца на экране, і ўспомню, як добра мне было па гары, у аддаленай цішыні, сярод роднай прастаты гэтых бранскіх старых, якія спявалі мне пра тры розныя дарогі, пра маладосць і расстанні... І пацягне мяне да іх.

— Іванавіч,— развітваецца дзед у прысадах,— не крыўдуй, заходзь да нас, калі будзеш недалёка. На Новы год заходзь, япрука павалю, праўда, заходзь.

Я абяцаю, але куды там, доўгая дарога, наўрад ці звядзе нас яшчэ жыццё. Я раптам востра адчуваю, як хочацца і немагчыма аб'ехаць мне ўсіх, каго я пакінуў у розных мясцінах, хто не выходзіў з мае душы ўсе гэтыя гады.

## ЗМЕСТ


Міхаіл Шолахаў
**Лёс чалавека** . . . . . . . . . . . . . . . 3
*Пераклалі Янка Шарахоўскі і Алена Шарахоўская*

Сяргей Антонаў
**Цётка Луша** . . . . . . . . . . . . . . . 33
*Пераклала Таццяна Зарыцкая*

Сяргей Варонін
**Расказ пра каханне** . . . . . . . . . . . . 45
*Пераклала Алена Шарахоўская*

Юрый Казакоў
**Арктур — гончы сабака** . . . . . . . . . . 49
*Пераклаў Алесь Жук*

Аляксандр Твардоўскі
**Печнікі** . . . . . . . . . . . . . . . . . 67
*Пераклаў Алесь Жук*

Сяргей Залыгін
**Бліны** . . . . . . . . . . . . . . . . . 92
*Пераклала Таццяна Мартыненка*

Рыгор Бакланаў
**Пачым фунт ліха** . . . . . . . . . . . . . 110
*Пераклала Галіна Шарангові*ч

Уладзімір Цендракоў
**Пісьмо, якое спазнілася на дваццаць гадоў** . . . 124
*Пераклаў Анатоль Кудравец*

Юрый Нагібін
**На ціхім возеры** . . . . . . . . . . . . . 140
*Пераклаў Фёдар Янкоўскі*

Уладзімір Багамолаў
**Сэрца майго боль** . . . . . . . . . . . . . 174
*Пераклаў Барыс Сачанка*

Павел Нілін
**Стары Завееў** . . . . . . . . . . . . . . 176
*Пераклаў Алесь Жук*

Уладзімір Дудзінцаў
**Навагодняя казка** . . . . . . . . . . . . 181
*Пераклаў Іван Пташнікаў*

Аляксандр Яшын
**Частую рабінамі** . . . . . . . . . . . . 210
*Пераклаў Анатоль Кудравец*

Яўгеній Еўтушэнка
**Чацвёртая Мяшчанская** . . . . . . . 221
*Пераклаў Іван Чыгрынаў*

Фёдар Абрамаў
**Мацярынскае сэрца** . . . . . . . . . 233
*Пераклала Алена Васілевіч*

Васіль Бялоў
**На радзіме** . . . . . . . . . . . . . . . . . 238
*Пераклаў Іван Пташнікаў*

Эмануіл Казакевіч
**Прыязджаў бацька ў госці да сына** . . . . . . . 240
*Пераклала Алена Васілевіч*

Гаўрыіл Траяпольскі
**Каля крутога абрыву** . . . . . . . . . . . . 268
*Пераклаў Янка Брыль*

Сяргей Нікіцін
**Серпанцін** . . . . . . . . . . . . . . . . . 297
*Пераклаў Барыс Сачанка*

Юрый Бондараў
**Зброя** . . . . . . . . . . . . . . 305
*Пераклаў Іван Чыгрынаў*

Уладзімір Лідзін
**Старая яблыня** . . . . . . . . . . . 307
*Пераклала Таццяна Зарыцкая*

Уладзімір Салаухін
**Дзяўчынка на марскім урэзе** . . . . . . . . . 312
*Пераклаў Янка Брыль*

Георгій Сямёнаў
**Ноч пад Кіцежам** . . . . . . . . . . . . . . 323
*Пераклаў Алесь Жук*

Васіль Шукшын
**Выпадак у рэстаране** . . . . . . . . . . . . 338
*Пераклала Таццяна Мартыненка*

Віктар Астаф'еў
**Гемафілія** . . . . . . . . . . . . . . . . . 346
*Пераклаў Іван Пташнікаў*

Валянцін Распуцін
**Рудольфіо** . . . . . . . . . . . . . . . . . 354
*Пераклала Таццяна Мартыненка*

Яўгеній Носаў
**Шапэн, саната нумар два** . . . . . . . . . . 368
*Пераклаў Міхал Дубянецкі*

Юрый Трыфанаў
**Смерць у Сіцыліі** . . . . . . . . . . . . . . 415
*Пераклаў Уладзімір Шахавец*

Віктар Ліханосаў
**Брanскія** . . . . . . . . . . . . . . . . . 424
*Пераклаў Валянцін Рабкевіч*

Рускае савецкае апавяданне: З рус. мовы.
Р 88 У 2 т. Т. 2 /Уклад. Б. Сачанкі.— Мн.: Маст. літ., 1988.— 431 с.
ISBN 5-340-00363-9 (т. 2)
ISBN 5-340-00361-2

У другі том увайшлі апавяданні М. Шолахава, А. Твардоўскага, С. Антонава, Ю. Нагібіна, В. Бялова, В. Шукшына, В. Астаф'ева, В. Распуціна і інш. Напружаны пульс часу, пільная ўвага да чалавека і яго месца ў жыцці, маральнае аблічча савецкага народа — заўсёдная тэма, якую распрацоўваюць рускія савецкія празаікі.

Р $\frac{4702010200-029}{М 302(03)-88}$ 145—87 ББК 84 Р7-44

*Литературно-художественное издание*
РУССКИЙ СОВЕТСКИЙ РАССКАЗ
В ДВУХ ТОМАХ
ТОМ 2
Составитель
Саченко Борис Иванович

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

*Літаратурна-мастацкае выданне*
РУСКАЕ САВЕЦКАЕ АПАВЯДАННЕ
У ДВУХ ТАМАХ
ТОМ 2
Укладальнік
Сачанка Барыс Іванавіч

Рэдактар *В. І. Рабкевіч*. Мастак *І. М. Андрыянаў*. Мастацкі рэдактар *А. І. Цароў*. Тэхнічны рэдактар *Г. П. Тарасевіч*. Карэктар *Л. М. Маслоўская*.

ІБ № 2593
Здадзена ў набор 05.03.87. Падп. да друку 11.12.87. Фармат 84×108¹/₃₂. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 22,68. Ум. фарб.-адб. 23,10. Ул.-выд. арк. 24,64. Тыраж 7000 экз. Зак. 219. Цана 2 р.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

2 p.